# Я з вогненнай вёскі...

**Алесь Адамовіч**
**Янка Брыль**
**Уладзімір Калеснік**

Мінск
Мастацкая літаратура
1975

Пра фашызм чалавецтва ведае, здаецца, усё. Попел мільёнаў ахвяр яго стукае ў сэрцы людзей.

І ўсё ж сям-там спрабуюць зноў і зноў абяліць гэтую чуму XX стагоддзя — у вачах новых пакаленняў, якія самі не перажылі жахаў другой сусветнай вайны. Вунь колькі «навуковых прац» друкуецца на Захадзе пра Гітлера і ягоную зграю, колькі кніг і артыкулаў, аўтары якіх, хто як можа, стараюцца надаць чалавечыя рысы нацызму, падмяняючы памяць народаў рэваншысцкай тугой генералаў, настальгіяй былых халуёў фюрэра.

Аднак жа ёсць яна, жыве народная памяць — непадкупная памяць пра фашызм гестапаўскі, канцлагерны, хатынскі. Суд народаў не закончыўся ў Нюрнбергу. Ён працягваецца — у памяці народнай. Суд гэты ідзе не толькі дзеля гістарычнай справядлівасці. Ён жывым патрэбен дзеля жыцця. Бо нездарма гаворыцца, што той, хто не памятае свайто мінулага, асуджаны зноў яго перажыць.

І таму так важна, жыццёва важна, каб на ўвесь свет гучала народная памяць, праўда пра фашызм.

Хатыні — вёскі, спаленыя, забітыя разам з людзьмі,— гарачая, балючая, гнеўная праўда і памяць Беларусі. Жыхары больш як двухсот нашых разбураных у вайну гарадоў і больш за дзевяць тысяч спаленых вёсак, многія сотні якіх знішчаны разам з жыхарамі, — маюць што сказаць свету. Не толькі пра той фашызм, які бачылі і іншыя краіны, але і пра той, які яны ўбачылі б, калі б нацыстам удалося прыступіць да «канчатковага ўрэгулявання ў Еўропе».

Дваццаць мільёнаў чалавечых жыццяў каштавала гэта савецкаму народу— паламаць той «канчатковы план», вырваць перамогу з рук расістаў-нелюдзяў.

У гэтым усенародным змаганні велізарную ролю адыгралі адданасць сваёй Радзіме, чалавечая мужнасць партызан і падпольшчыкаў, усіх тых нашых людзей, якіх фашысты маглі толькі забіць, але не здольныя былі ператварыць у нявольнікаў. Сотні тысяч савецкіх партызан і падпольшчыкаў (у Беларусі — каля 450 тысяч) і мільёны тых, хто быў для народных мсціўцаў рэзервам і тылам,— гэта перашкодзіла гітлераўцам ажыццявіць на ўвесь размах «Генеральны план Ост», па якому дзесяткі і дзесяткі мільёнаў адных толькі славян было асуджана на знішчэнне.

Аднак «план» дзейнічаў, жорсткасць расістаў усім сваім, нечуваным у гісторыі чалавецтва, цяжарам абрынулася перш за ўсё на дзяцей, на жанчын, на нямоглую старасць...

«Я з вогненнай вёскі...» дакументальная трагедыя, кніга-памяць, жывы голас людзей, што былі спалены, забіты разам з сям'ёй, разам са сваёй вёскай, і якія — жывуць.

Паслухайце ж , што гавораць, як памятае пра тое народ.

Дзесяткі кіламетраў магнітафонных запісаў — расказы больш як трохсот непасрэдных сведкаў хатынскіх трагедый — склалі змест гэтай кнігі. Тысячы

кіламетраў дарог — асфальтаваных, палявых, лясных — звязваюць іх, ахвяры фашысцкіх зверстваў.

Жывуць яны, гэтыя цудам ацалелыя людзі, па ўсёй Беларусі, у тых 147 вёсках, у якіх мы на працягу 1970-1973 гадоў пабывалі, аб'ездзіўшы трыццаць пяць раёнаў рэспублікі.

Вёсак, што падзялілі трагічны лёс Хатыні, у нас значна больш. Ды толькі не ўсюды мы маглі знайсці непасрэдных сведкаў. А запісвалі толькі тых, што *самі* перажылі жудасны лёс сваіх аднавяскоўцаў. Нямала бачылі мы і такіх забітых вёсак, дзе не засталося *ніводнай* жывой душы. Толькі старыя дрэвы, часта абгарэлыя, самотны калодзежны журавель, трава, што пакрыла дарогі і сцежкі...

На старонках гэтай кнігі сабраліся людзі, што выйшлі з агню, з-пад зямлі. І гэта — у самым рэальным, не пераносным сэнсе. Людзі з вогненных вёсак сабраліся тут, каб сведчыць, пытацца, судзіць, каб расказаць тое, пра што ведаць — страшна, а забыцца — небяспечна.

Сваю задачу мы бачылі ў тым, каб зберагчы, утрымаць, як «плазму», невыносную тэмпературу чалавечага болю, недаўмення, гневу, якія не толькі ў словах, але і ў голасе, у вачах, на твары; утрымаць усё тое, што, як паветра, акружае чалавека, які расказваў нам, а цяпер, са старонак кнігі, звяртаецца да чытача — да вас звяртаецца.

Дык няхай жа і вам будуць адрасаваны словы, пачутыя на шматпакутнай Асвейшчыне ад жанчыны з вёскі Латыгава Ганны Грабоўскай:

«...А што і ў нас такое гора было, як і ў Хатыні, дык ніхто і не ведае. Добра, што вы прыехалі, бо я ж сама... Вось і расказваць не магу — плачу...»

## БАРБАРКА

Палессе. Брэстчына. На ўсход ад Івацэвіч. Чэрвень 1970 года.

Азёры. Лес, пералескі. Буйная зеляніна лугоў і палёў. То сонца, то цярушлівая хмарнасць, то зноў грымоты і лівень.

Замест вёскі Красніца — проста лес, ужо немалады. І помнічак каля дарогі — па цэлай вёсцы людзей. Замест Тупічыц і Вяды — ні лес, ні поле, ні луг.

Дзе былі Тупічыцы, там стаяць самотныя грушы і ледзь не да жудасці незвычайныя, абгарэлыя дубы, што будуць дажываць свой доўгі век ужо без людзей. Сюды мы, выйшаўшы з лодкі, ад возера дабіраліся па глыбокім пяску, здорава патужэлым пасля многіх сёлета навальніц.

Тое месца, дзе была калісьці вёска Вяды і дзе цяпер пясок, трава і рэшткі дрэў, якія калісьці раслі ў садах і на вуліцы, мы бачылі здалёк, з узгорка, на якім стаіць самотны абеліск са словамі і лічбамі.

Пасля зноў было возера Бабровіцкае. Невыказна ласкавая шэрасць цёплай, амаль зусім спакойнай вады. Навокал — пена пасля нядаўніх баранчыкаў, белаістракатымі на цёплай шэрасці палоскамі. Мы вярталіся ў імклівай маторцы, над намі тарахцеў верталёт геолагаў, знаёмых старшыні калгаса, які вадзіў нас па гэтых мясцінах.

Там, дзе раней былі Бабровічы, цяпер растуць маладыя бярозы, буяе трава. З-за купіны выскачыў заяц. Пустэча.

У новых, адбудаваных на другім месцы, Бабровічах мы зноў, як і ў іншых паселішчах, як і ўчора і пазаўчора, запісвалі расказы ацалелых.

Высока зверху — над светлым пакоем калгаснай бібліятэкі, дзе мы слухалі людзей, над новай вялікай вёскай, над усім гэтым азёрна-лясным кутком заходняга Палесся — да самых касмічных арбіт жыве, бушуе ў сонцы наша перамога, у свеце наспяваюць новыя небяспекі, ідзе змаганне за тое, каб яны не прыйшлі.

А ўнізе, у глыбінях народнага жыцця, у жыццядайнай прастаце яго крынічаць раны памяці, якія нічым не загоіш...

Вось і яшчэ адна з гэтых народных ран.

Расказвае Барбарка, шасцідзесяцігадовая **Барбара Адамаўна Слесарчук.** Гаворыць з дзіўнай і сцішнаватай усмешкай — нібыта страшную казку, незвычайна далёкую, перажытую вельмі даўно. Гаворыць часамі амаль што зусім як казачніца — нараспеў, з паўторамі, што не здаюцца лішнімі, і па-мясцоваму — на трох ці на чатырох мовах адразу: беларуска-ўкраінска-руска-польскай.

«...Гэто як нас білі? Білі... Ажно цяжко расказваць...

Хазяіна ўпэрэд забілі. Зажглі ў клуні. Я так перабалела. Чацвёра дзяцей, пятым была бярэменна. Запалілі часоў у пяць, пад вечар. Немец прыйшоў, выгнаў. Адзін мой хлопец пасвіў скаціну, а трое са мною. Мая хата была туды далей, дзе цяпер калгасны двор. Немец прыйшоў, выгнаў. Сабраліся мы ў хату, баб пятнаццаць. Немцы ідуць, абгледзелі. Бабы сядзяць, як бы оўцы, у хаце. Думалі: можа, толькі мужыкоў пабылы, а жанчын не будуць біць. Адна, Астапава маці, кажа:

— Нас жывых запаляць. Не схацеў нас пабыты немец. Жывых папаліць.

А я выйшла з хаты:

— Уцякайма, жанчыны, уцякайма!..

А дзве дзевачкі ў мяне і мальчык. Оны, бабы, не схацелі ўцякаці, а я і пайшла.

Немцы стаялі, кругом сэло цэп'ю абнялі, тут цэп і там цэп, і па сяле хадзілі немцы. Так много. Я выйшла на кусты ў Багацце. Я не думала жыць. Але думала, куб ён не глядзеў, куб нам от так чэрапа паздымала, куб мы сваю смерць відалі.

— Бяжэдм туды, куб мы не бачылі смерці! Дзе куля ў галаву люб у плечы, — кажу, — нам пападзе, то легчэ нам, а то так трудна дажыдаць вот, каб нас білі. От, каб мы відалі сваю смерць...

Ніхто не схацеў, а я ўзяла і сама пабегла. Я пабегла, пачала бегчы з Астапавага двара, нашага суседа. Ад таго суседа пабегла, а ўжо людзей кулямётам сякуць — і з таго канца, і з таго, людзі падаюць, падаюць... Ужэ і ногі мае не пабяжаць, куды ўжэ мне бяжаць — узяла я пад сараем лягла.

Так сарай, і так сарай, і так, а я лягла за калодцэм. Дзяцей панакутвала лебядой, панакутвала, вот і ляжу я, і ляжу... Ажно немцы там ці паліцыянты, толькі вады нап'юцца ды: «А-а-ах!» — скажа. А я ляжу, ляжу, ляжу... Кулі свішчуць, ляцяць. Ну, мяне ўбіла! Слышу — не, ніц не больна. І ляжу, і ляжу...

І вот дзеці мае. Мальчык — два гады было Васілю. Не заплакаў! Маленькі — два гады, тыждзень было на трэці.

— Мамо, — кажа, — уцякаймо, уцякаймо! Нас, мамо, не заб'юць!

— Ох, — кажу я, — сынок, зараз бегчы пакінем, адкінем ногі ў тую старану і ў тую, пакінем белы свет, святая нядзелька. Зара паб'юць, зара.

— Не, мамо, нас не паб'юць!..

Гэта ж два гады!.. О, ён і сёння слесарам у мяне на ГРЭСе работае. Такі чалавек!..

А тая дзевачка, шэсць год, кажа:

— Вот відзіш, мамо, дажэ мальчык гаворыць, што нас не паб'юць. Убэгаймо!

От і пабеглі. Пад сараем ляглі...

От так, цямнець стало. Як огні, лямпы запальваюць. Ляжымо. Немец одного сарая падпаліў. Спічкамы. Опяць одного, бачу я, спічкамы. У сіняй адзежы два немцы стаяць. Ляжу, ляжу, ляжу, ляжу... З дзецьмі ляжу,

ляжу, і — маўчаць! Это так от! — абы мне не пагібнуць, ці што? Малы хлопец і не заплакаў! О!..

І так от ляжу! Ажно там гарыць крыша. Згарэла. І немцы стаяць два. Бы стаўбы сінія. І сцены пачалі гарэці. І пачала ўжо зямля гарэці. Гэто каля самай зямлі тое зелле пачало гарэці. А я ўсярэдзіне ляжу. І студава мне пячэ, і студава мне пячэ. Гэто благадара, што, бывала, тчэм сукно з авэчак, зам'ятае. Такэ, было, пальто злажыла. А колі б я ў кофтачцы была — згарэла б. Толькі платка скінула, косы ўсе абсмаліліся. А тут от мне пальто шкварыцца, гарыць, а я яго то пяском, то так. Дзевочка, чатыры гады, вішчы-ьщь! — спэклася. А я ўжэ то так, то так. От-от-от погыбаю! От я погыбаю. А воны стоящь, немцы. Не хацела, каб забыло мяне ляжачую. От, мусово мйе на немца ўзайці, каб мяне ўжэ гэта ўбіў. Ужэ няма спасення — пэчэ. Хай, думаю, заб'е. Толькі ўстану на немца ісці — о, два стаяць, — дзеці завішчалі, а я — бух, упала. Так і ляжу.

І так от, памаленьку, так от і гляджу: чы воны пайшлы, чы не. Ужэ пачало вот-вот гарэць полымя, і студа, і студа. Сматру гэто — пайшлі, пайшлі немцы! А я яшчэ мінутачку паляжала, думаю, хай дальшэ адойдуць. І я за адзежу ўсіх дзяцей як узяла і дзёрнула далей, у канец агня... У-у-у!..

Ляжым на поплаўцы Астапавым. Ужэ так от трэсло, трэсло сільно нас, о!.. А я ўжэ думала: «На ўсёй дзярэўні адна я асталася». Давай я ўжэ ўзяла за дзеці, то аднэ сюда пасадзіла, два гады, а то, чатыры гады, дзевочку, сюда, а там яшчэ ззадзі ідзе. Пошла, пошла, пошла...

А куды от я?

От, на выганаўскую дарогу цаляю, да Выганішч. Куды мне, думаю, дзецiся? Мая матка з Выганішч. Думаю: там у мяне дзядзька е. Мо возьме мяне? Бо і дабівацімуць нас, ужэ думаю, у нашай дзярэўні. Можа, нада ўжэ нас выбіці. «Партызан!..» Мо зашчыталі ўжэ, што ў саракавом гаду ў калхозе былі. Усё гэта казалі на нас: «Камуніст!..» Можа, нас загэтым дабіваюць. Вот!.. Ужэ ўзяла я, пошла, пошла да Выганішч.

Не зайшла.

Сяду дзе-небудзь на пянёк... Іду, іду... Як упаду — як паляцяць мае дзеці цераз галаву ўсе. «А-ах!» — адно галаву пачэшуць. І не плачуць. От гора пазналі!..»

У расказ жанчыны ўрываецца вельмі нядаўні ўспамін. Сёння ўранні ў Целяханах пачутыя словы. Скупыя, мужчынскія. Гаворыць калгаснік-пенсіянер Андрэй Куратнік:

«...А сын у мяне астаўся. У трупах. Маці мая, калі яе расстралялі, упала на яго, і так трохі закрыла. Ранілі хлопца ў бок. Адсунуўся ён метраў пяцьдзесят ад ямы і заснуў. Назаўтра прыйшлі — яшчэ пяць выстралаў па яме далі. А ён дванаццаць дзён праляжаў у стажочку. Дзевяць гадоў было. Не піўшы, не еўшы. Партызаны знайшлі яго, мне наказалі...»

Цётка Барбара гаворыць далей:

«...Зайшлі мы да Выганішч. Ужэ васкрасенне. Другое васкрасенне настала, той тыдзень ужэ прайшоў. Прыйшла я, а ўжо майго дзядзьку, мае мацеры брата, застрэлілі.

«От, — думаю, — і мая жалаба, от ён мяне і пажалее...»

Дзядзіна кажа:

— У-у-ужэ так табе, можэ, не надо жыці на свеце, ужэ табе самой у агонь надо бегчы. Дзяцей у цябе многа, да ты бярэменна яшчэ — дзе табе проці зімы!

Самі ў лес выязджалі, хаваліся, а мяне не бралі. А я ў той хаце ляжу да ўжэ, як мы, па-старыннаму, памалюся:

«Дай мне, госпадзі, сладкі сон! Ці ўжэ як жывая застануся, ці каб я не слыхала, каб я ўжэ пагібла з гэтымі дзецьмі, заснула ўжэ навек...»

От ужэ партызаны выйшлі адтуль, з Бярэзіны, сільны, сільны одряд. З Вяды быў знаёмы чалавек, пагаварыў са мною, пагаварыў.

— Не бойцеся, — кажа, — не дапусцім немцаў, каб вас пабіці...

Даждаліся мы другога васкрасення.

— От, цётко, — кажу я дзядзінай, — мне сон які сніўся. Плохі, плохі! Я ўжэ, здаецца, у старцах пахадзіла, хлеба насабірала сумочку. Іду, іду, у глазах пачарнела. У тую хату зайду, а пяць хат міну і опяць зайду. Так жалко, што столькі свайго хлеба многа пакінула. Да хазяіна, да скаціну. Лошадзі не было, быкі былі. Тры каровы былі, дзве каровы і цёлка. Да Хаценіч пагналі, на Ганцавічы, у тую старану. Наплакалася я, наглядзелася... От як!

Ну, а дзядзіна мая кажа:

— А мне харашо спалася...

От, чэсна вам гавару, жанчына! Трэсачок тых не дае, зварыць. «Ідзі ў кусты», — кажа. От людзі якія ёсць, Госпадзі! Урэдна была, багата, сільна багата была! Чыгуніка просіш — чыгуніка не дасць.

У Красніцу хадзю ўжэ, мэду нанасіла я, і табе, і сабе. Ужэ думаю: «Хай мяне пчолы... Можа, памру». Яй-богу. Закручуся ў якія латы. А мёду, мёду, мёду, мёду было!.. У вядры нясу, нясу, нясу з Красніцы. Гэта — як яе спалілі. Я ўжо сабе туды прайдуся. Можа, заб'юць. Як не дабівацімуць, то не дабівацімуць. А ўжэ по тры дні кончылася дабіванне. Ужэ я мэду нанасіла і ўжэ сабе кватэру шукаю. Мы ўжэ тыждзень сядзелі там, ужэ яна, дзядзіна, кажа:

— Шукай кватэру. З-за цябе, недабійку, і каб нас не пабіл і немцы...

У Лабановіча кватэру найшла, у Аляксеевай маткі, у беднае жанчыны вынайшла.

Сабе думаю: «Пайду я картошкі, хвасолі прынясу».

Пайшла я сабе за тымі прадуктамі, сабе ў Красніцу. А дзеці тама, у Выганішчах.

Нясу я, да гары даходжу — у-ю-юй! — ужэ Выганішчы гарацъ! Ужэ гарацъ Выганішчы, з палімёта строчаць!.. Выганішчы га-а-арацъ!.. Сільны такі вецер, што чалавека з ног валяе. Яны

зайшлі ад Бабровіч, з таго канца, о, ад моста. Ужэ вецер і ко-оціць! Цераз дзесяць хат кідала агонь. Я плачу:

— Ужэ мае дзеці рукі мне апрасталі. Дзе мае дзеці?..

Ужэ пабегла я ў Бярэзіну, куды ўсе людзі пабеглі. Нашла адну жанчыну, кажу:

— Мо мае дзеці відалі?

Гаворыць:

— Відалі. Пабеглі. Гэта Насця на плечы Васіля пасадзіла, панесла ў Бярэзіну. Далёка!..

І я туды. Шукала, шукала, мо ад дванаццаці часоў, знайшла — ужо сонца заходзіла. Знайшла я. І сваіх, і Бартановых дзяцей знайшла, пяць штук. Ужэ знайшла, сарай згарэў — картошкі напякла, накарміла іх, тыя чужыя і свае...

І вот я думаю: «Куды мне дзеціся?..»

Пайшла ў балота. Сяджу. Ужо знайшла спічкі, надрала палосся, лапці плесці. І сяджу я там, у Надлеві, ад Выганішч кіламетраў тры, ад Бабровіч — чатыры. Я ўжэ знайшла, дзе з мужам касіла, дзе нашы пакосы. Ужэ не магу, так мне абідно... Ужэ, думаю, пайду пад чужыя стажкі, бо вельмі мне жаль... Дзе касілі, дзе граблі з мужам сена...

Пайшла пад чужыя стажкі. Сяджу.

Ужэ давай картошку чысціць... А тут — зара немцы бягуць!.. Людзі гукаюць, гукаюць на балоце.

Думаю: «Чаго-то яны гукаюць? Гэта так, можа. Можа, маці дзеці пагубіла, можа, дзеці маці загубілі ды шукаюць?..»

У-ух!.. Ажно вылятаюць да мяне два паліцыянты. Выскачылі з-за куста, за мяне — цап! Ужэ мяне ўзялі. Да ўжэ майго хлопца, восем гадоў:

— Сынок, дзе твой бацька?

— Няма, забілі бацька майго. Ужэ забілі немцы Рамана майго.

— Паночак, я сама з голаду, з холаду загіну, адно вы мяне не беце. Я не хачу, каб вы мяне білі. Хай я сама прападу з дзецьмі...

Ён кажа:

— Дзе больш людзі?

— Пабеглі на лес.

— Ідзі на воз! А самі пайшлі.

Каб я пайшла на той воз, да таго бабровіцкага паліцая, што ўсіх дабіваў, што паказваў, дзе хто захаваўся, — ён застрэліў бы мяне, убіў бы. Сільно бабровіцкіх людзей ён выбіваў. Я-то не папала да яго. Яны пайшлі за кусты, а я тожа за кусты. Вы мяне не бачыце, а я вас! І я ў такі цё-ёмны пабегла луг — такі луг, што чарот там, папаратнік, усяго там. Я туды пабегла і ляжу там. Ляжу ўжэ. Яны ўсіх людзей вызбіралі, ужо ціха стала...

Толькі партызаны беглі. Беглі партызаны, маім дзецям мяса варанага далі. Наеліся мае дзеці — вады!.. Ужэ гэты, што два гады:

— Вады, вады, вады, вады!..

А вада павысыхала, мо на метар, нідзе няма напіцца. Цямнее. Ужэ гэты мальчык, што восем лет.

— Вазьмі, — кажу, — мачы свае ў чыгунчык.

Напаілі.

— Не, — кажа, — мамо, не ўкусная вада. Ідзі, шукай смачнае вады! Ідзі!..

Няма нідзе вады. Плакаў той, плакаў... Лягла я. І спічкі е, агню наклаў бы. Ой!.. Ды вады плача. Я вот чэсна гавару вам. Выкапала такую ямачку, выкапала во. «Як на сырой зямлі чалавек паляжыць, — думаю, — то ўмрэ». Выдрала мох, выдрала. Бо малыя. «Як жа я вас накармлю, як адзену?..» От, я ямачку выкапала ў балоце, да самай тарфы, усе мы на яе і пакладіся. Вот ужэ забалеюць, васпаленіе возьме, ужэ яго і не будзе на свеце, хоч адно мне рукі асвабодзіць...

І от жыве! Дажэ ні чуць-чуць не забалеў!

І выйшла я апяць з таго балота.

— Хадзем, — кажу, — дзеці, у Целяханы, хай нас дабіваюць.

Дзеці не схацелі.

— Куды хочаш, мамо, нас у свет вядзі, адно не ха- дзем да тых немцаў і да паліцаяў!..

У Вялікай Гаці кватэру нашла. Сталі паліці Гаць... Гэто ўжэ я тады ў парцізанах была. Сядзела, сядзела, сядзела, траву сушыла, дзетак травой ахутвала. Здароўе пацярала, раўматызм дастала. От як!..

Дзеці пагадавала, пагадавала. Пайшлі па гасударскай рабоце ўсюды. Дзеці па свеце, а я сабе... Вот, спасіба, пенсію даюць ужэ. Оўцы даглядала, тысячы авэчок нагадавала, дзесяць лет на ферме стаяла. Дзеці работалі.

От, усё сваё страданіе пераказала. Можа, я і залішне што сказала? Я няграматная. Ізвініцца».

## МАЦІ І СЫН. СЫН І МАЦІ

### 1

Капыльшчына. Рулёва — нават і вёскай няёмка назваць: тры хаты на ўзлеску, пасёлачак, аднак і ён адзначаны помнікам ахвярам яшчэ адной экспедыцыі 1943 года.

**Лізавеце Іосіфаўне Кубрак** шэсцьдзесят шэсць гадоў. Жанчына нямоглая, з кульбай. Расказвае нібы спакойна. Папярэдзіла толькі: «Не бойцеся, калі я буду ўскрыкваць ад болі: у мяне адлажэнне солей...»

«...Кажуць, што едзе карацельны атрад. З Пясочнага многа людзей сюды прыехала, на сахраненне. А яны, немцы, ехалі не па дарозе, а балатамі: хацелі захваціць усіх. Прыехалі, знайшлі, значыцца, многа чужых людзей. А гэтыя людзі рашылі, што калі едзе карацельны атрад, дык мы будзем з гэтай дзярэўні. Было вялікае гумно калхознае, а зямля тады ўжо была падзелена, дык яны вырашылі, што мы гэта ўсе малоцім тут. Пайшлі нашы мужчыны малаціць туды, і гэтыя пайшлі, з Пясочнага.

А немцы як прыехалі, дык у кожным доме спрашываюць сям'ю, жыцялей дома. Мы памяшчаліся ў цёткі, у нас свайго дома не было. Муж, сын і я. А ў цёткі было дзве дачкі.

Мой муж з сынам таксама пайшоў туды малаціць. У гумне людзі хацелі хавацца па норах, але не паспелі. Немцы адчынілі дзверы. Хто ўспеў цэп хапіць, той нібы малоціць, а хто і не...

А ў дамах яны, немцы, пыталіся: «Дзе мужчыны?» А мая цётка кажа, што малаціць пайшлі. А дзве з Пясочнага, настаўніцы яны былі, сядзяць на печы. Я ўжо ім казала: «Хоць бы вы што вязалі...» Немцы пытаюцца:

— Дзе хазяйка?

А цётка кажа:

— Гэта ў мяне дзве дочкі, і яшчэ пляменнік з жонкай жыве, а ў іх сын.

— А гэтыя хто дзве?

Яна кажа, што гэта людзі з Пясочнага.

— А чаго яны тут у вас?

Яна кажа:

— Тут мае дзяўчаты, і яны прыехалі, скудзельніцамі. Што ж іначай гаварыць?

Яны ка мне:

— Дзе муж?

Ім мужчыны трэба былі.

Я кажу:

— Малоцяць там у гумне.

— Пайдзі пазаві.

Я пайшла пазвала.

— Партызан? — пытаецца. А ён кажа:

— Пан, які ж я партызан? Вось спытайцеся ў хазяйкі, мы сумесна жывём.

А былі і немцы, і былі паліцаі.

— А гэта хто? Ён кажа:

— Гэта з Пясочнага. Вот у цёткі дочкі, яны падругі, дык яны прыйшлі да яе.

І немцы ў мужа спрашываюць:

— А калі яны прыйшлі?

Ён кажа:

— Сёння.

А тыя кажуць:

— А мы тут цэлую нядзелю жывём.

Ужо не ў адно пайшло. Ім вераць, а яму не. А бярозавая палка добрая, лепшая, як у мяне во, ды з балдавешкай. І давай яны яго біць... І настолькі білі, што прама ён чорны ўвесь быў. А той палку ў сторану адставіў і на другога кажа:

— Застрэліць.

Бачу я, што бяда, давай прасіцца:

— Пан, гэта няверна, яны сёння прышлі. Пайдзіце вы паглядзіце: яны з Пясочнага, да ўсіх наехалі, не толькі да нас. У некаторых хатах па дваццаць чалавек, па пятнаццаць, і коні стаяць пазапраганыя, і ў гумне многа...

Яны і пайшлі глядзець.

І прышоў ужо вечар.

У цёткі дом вялікі быў, і іх сабралася чалавек з пяцьдзесят. Нанасілі саломы. А мы на кухні памясціліся. На палу каля печкі паселі і мы, і падводчыкі, што іх прывезлі. Я ў аднаго гэтага чалавека і пытаюся, падводчыка:

— Дзядзька, дзе яны што робяць?

Дык яны кажуць:

— Нічога.

А другі кажа:

— А ў Пясочным? Адну дзевачку ўбілі і дом спалілі... Ну, у мяне ўжо мысль плахая, калі яны так сказалі. Доўга не чакаючы, прыходзяць і пытаюцца па-польску:

— Гдзе господа ж?

А ён жа сядзіць радам са мной. Ён кажа:

— Я.

— Ану ўпярод!..

Паколькі яны гаварылі, што застрэляць, дык я ж і пашчытала, што бяруць застрэліць. Ён падняўся і кажа:

— Пращчайце ўсе.

Куды забралі — не ведаю...

Пачакаўшы, — дзетдом гарыць. Думаю я: відаць, туды яго завезлі. Там забілі...

Яшчэ ціха было назаўтра, але я ўсё чуствавала, што будзе плоха.

А там у нас сарайчык быў, дзе стаяла цёлка і кабанчык.

Дык я кажу на сына:

— Ідзём туды. Случайна што, дык мы ў лес.

Не ўспелі мы дайсці туды — ужо стрэл палучыўся. У нас была ў сене, у сарайчыку, нара прабіта, дык сын кажа:

— Мама, я палезу туды.

А дале я гавару:

— Не, ты лепш лезь на гару, і я за табою.

Ён лезе, а два немцы ўваходзяць якраз... Дык я яго — за ногі. Гергечуць яны, чорт іх знае што. А я ім гавару:

— Пан, я даю есці карове.

А яны гаворацць па-нямецку. І давай нас штурхаць, сына і мяне. Так во сарайчык наш стаіць, а так во тое гумно вялікае, дзе яны малацілі, мужчыны. Ужо дзверы адкрыты. І стаў такі вялікі снег ісці! Дык яны, немцы, адзін за яго, а другі за мяне. Упіхнулі ў

тое гумно. І далі два выстралы. Сын пабег, а я ўпала. Так упала, не ранілі. Мне не больна. А ў сына, відаць, папалі, што і не войкнуў. Такая мысль у мяне пабегла...

Пытанне: — А колькі яму гадоў было?

— Чатырнаццаць гадоў.

Стала гумно гарэць... А там сем гаспадароў складалася. Збожжа. Дык там усё перамешана... Як я ўпала, дык яшчэ і саломы на сябе нацягнула. Калі салома стала гарэць, дык я падумала, што я ляжу пры сценцы, пры акенцы, праз якое ішоў пас малацілкі. Падымаюся к гэтаму акенцу і гляджу — яны стаяць. А наперадзе будынак гарыць, і гэтае ж гумно гарыць... А там яшчэ з гумна ў манеж, дзе малатарня, вялікае акно, і яно калючай провалакай закрыжована. Папробавала я адну столку — яшчэ во раны засталіся, — адна столка была з гваздом, дык адарвалася, а другая — з прабоем, ніяк. Усё — не вылезеш. Дык каб гэта чалавек нармальна, а то ж увесь...

І ў гэты момант мой сын:

— Мама! Ты жывая? (Плача.)

Я кажу:

— Жывая.

Ён вырываецца бегчы. На ім быў кажушок — ён скінуў. І шапка гарыць на ім, і пінжачок гарыць... (Плача.) Набрала я снегу, стала церці, яго тушыць. А ён вырываецца бегчы. А я гавару:

— Сынок, яшчэ стаяць!

Пытанне: — А вы ўжо выйшлі з гумна?

— Не, у гумне. Вецер клоніць, дзверы адкрытыя, снег вялікі кідае, і мы пры самых дзвярах...

І вот у той момант яны адыходзяцца, гэтыя немцы, бо другія будынкі гараць, і на іх дым вялікі.

І мы за імі выходзім, — вось так, як ад мяне да вас. Як яны маглі не аглянуцца? Судзьба нейкая ёсць на свеце... Манеж каля гумна не крыты. Гумно згарэла, а манеж застаўся. І мы зайшлі туды. І толькі крык чулі, стрэл вялікі і крык...

Сын можа бегчы, а я не. «Мамачка, ты раненая». А я кажу, што не. Але адкуль жа кроў? А ў мяне гэтая рука парваная была ўся. Не чуствавала я. Ну, ён можа бегчы, а я не. Там было такое дзерава вялікае, зрэзаная ёлка. Снегу многа надула. Ён мяне цягне хоць у гэтую ёлку, у снег. Ну, куды ж ён мяне дацягне! Чатырнаццаць лет было. Дык я кажу:

— Сынок, спасайся, а мне ўжо ўсё роўна як будзе...

Дайшлі мы яшчэ дальша, паляжалі там трошкі, у яме, дзе пясок бралі. І вот у гэты лясок, сюды. Гэтак во зранння хадзілі мы дзень, ноч начавалі... Ён жа таксама раздзеты, толькі пінжачок на ім. На мне была цёплая кофта такая, дык я яе скінула і яму надзела.

Дзіця. Хадзілі мы, хадзілі, куды ні пойдзем — немцы... Іх няма, але яны нам усё роўна ў белых халатах

паказваюцца. Пад раніцу — пеўні спяваюць. А выйдзем на бераг лесу — немцы. А іх жа ж не было! Толькі людзі прыходзілі, трупы сабіралі, а іх не было... І ўжо так усё даходзіць, што толькі спаць, і ўсё. Ад холаду. Спаць. Але я ведаю, што як сядзем — усё... Лапак наломім, на снег паложым, я саджуся, а яго бяру на калені. Як ён толькі засынае, дык я яго во так во... (Паказвае, як будзіла.) А толькі сучча на дрэвах трашчаць ды падаюць. І таго мы пугаемся.

Пад раніцу выйшлі на бераг, і, куды ні пагля-дзім, — усюды нам немцы ходзяць...

Мужа майго яны не забілі. Узялі на падводу, каб паказаў, дзе Свінка, дзярэўня такая. Там былі гэтыя самаахоўцы. І там, у Свінцы, мая мама родная жыла. А яны яшчэ хацелі туды, дзе недзе Кашэчы Брод ёсць, каб ён туды вёў. А ім сказалі, што не едзьце, бо вас ноччу заб'юць партызаны. І тут яны мужа адпусцілі, і ён пайшоў да мае мамы. І мама яго адтуль не пускала, бо ўжо наша Рулёва гарэла...

Гэта ўжо мама мне расказала, калі мы з сынам у Свінку прыйшлі.

Мама казала, што мой муж, калі ён пайшоў са Свінкі глядзець, ці мы жывыя, гаварыў: «Калі іх няма, дык і я не вярнуся...» Жанчына адна ў панчохах толькі па снезе з Рулёва прыбегла і сказала, што бачыла, як нас павялі і чуваць былі два выстралы, а дзе мы падзеліся — невядома... Ён касцей нашых пашукаў і не знайшоў...

А мама мая запрагла каня і ў Рулёва прыехала. Ён плача, а мама кажа:

— Яны жывыя, яны прыйшлі ўжо да нас!..

Потым мы жылі ў мамы. Я была чорная, цёмная. Больш года была ненармальная. «Немцы, немцы!..» Куды я ні хавалася, куды я ні хадзіла — усюды немцы былі... У белым, у белым... Унаклонку нічога не магла рабіць, толькі стоячы. Грэчку на воз падаваць... Палучыўся ў мяне менінгіт, гіпертанія, і так усё сваё жыццё пакутую...

А сын ужо дзевяць год, як памёр. Мой Росця. Шасцёра ўнукаў пакінуў... Яны ў дзетдоме, чацвёра меншых...»

**2**

У Новым Сяле на Барысаўшчыне **Міхась Верхаводка** расказваў нам пра тое, як вясной 1944 года забівалі яго родныя Будзенічы.

Міхасю Мікалаевічу сорак гадоў. Ён быў адзін у ха-це, аднак па малюнках, наклееных на сцены, тут адчу-валася прысутнасць дзяцей. Зрэшты, ён і сказаў нам пасля, што гэта дачка так хораша малюе.

Чалавек характару мяккага, ледзь не з жаночаю ласкай у голасе. Можа, таму і памятае ўсё так падрабязна. Расказваў ахвотна, нібы нарэшце дачакаўся выпадку.

«...Два дні дождж ліў... Ну, тут усе выйшлі... Есці ні ў кога не было нічога, галодны народ быў. Паселі, сонца прыгрэла — усе тут і паселі на месцы.

А я сядзеў, не задрамаў, нічога. Ведама, яшчэ дзіцёнкам быў. Гляджу — немец ідзець. Я толькі сказаў:

— Ай, немец ідзець!.. Вялікі ідзець, з аўтаматам.

Мая сястра была. Брата забілі тут жа, на месцы. Як я сказаў: «Немец ідзець!», дык сястра драла ў лес. Тут нашлася яшчэ братавая, — яна тоже ў лес. А дзеці заёй.

Ну, а мы толькі пасталі ўсе. Стаяка пасталі.

Карова была прывязана. Ён даў вочарадзь у гэтае месца. Папала гэтай карове. Карова гэтая — па лесе. І паваліласся. Як пачала нагамі... Пакуль яна кончылася.

Ён надумаўся і ракету ўверх — жах! Тут іх аж чорна стала. Павыбягалі з лесу. Акружылі нас поўнасцю, з усіх бакоў. Ну, хлопцы такія былі — хрэст[1] во на рукаве і ў чорным адзеты былі.

Нас пастроілі. Пачалі здзекі. Мужчын адзельна пастроілі, а баб адзельна. І пачалі лупцаваць гэтых мужчын.

— Дзе ваша, бандыты, аружыя?

Сюды падставіць, пад бараду... карабін там ці чорт яго тады ведаў.

А я за спадніцу ў мамы дзяржуся. Я ўжо ж трошкі ладны быў, першы клас кончыў ужо.

Так гэтых мужчын пабівалі, колькі ім нада было, метраў пяцьдзесят адагналі, лёг пулямётчык. Мінамётчыкі ляглі з бакоў...

А ў мяне яшчэ дзецкі розум быў — глядзець, як міна ляціць. Адзін ляжыць, а другі зойдзе збоку — кідзель! Я відзеў гэта — міна ляціць і плёх там, зваліцца. Туды, у бярэзнічак. Я тое месца знаю і цяпер. Толькі цяпер яно змянілася, канешне, многа лет прайшло.

Пабілі гэтых мужчын — бабы наробілі енку. Пулямётамі пабілі — дзе ж яны на чыстым поплаве дзенуцца? Тры пулямёты. Як кашанулі!.. Там і мой брат быў, Васіль. Жонка яго з намі была і дзеці.

Прылятае адзін сюды, гэты немец. Хацелі нас у бярэзнічак, тут ражэчак тады застаўся. Нейкі старшы пад'ехаў і кажа: «Не!» Ці як ён там сказаў. Яны змянілі план. Як сталі з мінамёта біць — два хлопцы ідуць. Маладыя хлопцы, мо ім тады па сямнаццаць было, па васемнаццаць. Сяйчас нас астанавілі. Тут плач, тут дзеці гэтыя плакалі...

А я не плакаў, як-та дзяржаўся. Інцерасаваўся проста... І знаў жа, што на смерць іду!..

Добра. Заняліся з гэтымі хлопцамі. Пабівалі яны, колькі хацелі, іх. Ведама ж, людзі пры сіле, а тут — бяссільныя. У гэты бярэзнічак, дзе нам трэба было легчы, гэтых хлопцаў... Так во неяк паклалі і пастрачылі іх.

Сяйчас падышоў іхні гэты, нейкі старшы, відаць, і кажа:

— На Будзенічы! Ну, нас пагналі.

Мы трошкі адышліся, і гэтай маёй братавай большы хлопец прарваўся. А

[1] Свастыка.

меншы, Генка, той застаўся. Вярнуўся сюды, дзе нас бралі.

А мяне як бралі з месца, то там пасцілка была ўвязана, хлеба краюшачак быў. Я завязаў на плечы. Дык ён мне сказаў:

— Сынок, не бяры, ён табе не нада. Я на месцы гэта і бросіў.

Прагналі нас метраў пяцьдзесят — выбег дзіцёнак. Ішоў ззаду канваір. Гаворыць... Старушка ззаду ішла, дык ён ёй кажа:

— Прывядзі яго!

Пацанёнка таго. Яна пайшла. Калі б разумная старуха, дык яна б за гэтага пацанёнка ды ў лес. Чорт бы за ёю пабег. Мы тут пачалі б разбягацца. А яна пайшла, за ручку таго дзіцёнка і прывяла сюды, у калону к нам.

Ідзём дальша. Маці на мяне кажаць:

— Сынок, лезь у куст.

— Мамачка, — кажу я, — штыхом як дасць!.. Парнёць усё роўна.

Я ўжо разбіраўся. Дзесяты год мне быў ці ўжо адзінаццаты. Я дзевяці год у першы клас пайшоў: малы быў нейкі.

Добра. Я не палез у куст. Прыгналі нас у зямлянкі. У першую зямлянку пайшлі старухі нейкія. Мы адышліся метраў трыццаць — ужо гэтая першая — др-др-др! — гарыць. Хто ў другую пойдзе? Сталбом сталі людзі. А ў іх палкі былі — ці яны павыразалі, ці ім давалі гэткія, чорт іх ведае. Лупцуюць ззаду там.

Гляджу — мая маці першая пайшла ў гэтую зямлянку. Ну, раз мама пайшла, мусіў і я. Я за ёю дру-гі — шмыг. Яна як ішла — было два перарубчыкі, паленцы такія. Нехта картошку сыпаў, ці што. Яна лягла туды так во нeяк. (Паказвае.) А я сеў. Тут яшчэ старушка... Ці яны ўкідалі іх — хто іх ведае. Мы не відзелі. Мусіць, маёй маме першай папала, дык яна і шмыганула сюды... Насела, насела, насела людзей — дзеці і бабы старыя. Я сеў, і мне думка такая цюк у галаву: «Я знаю, што заб'юць, дык няхай з мамай заб'юць». Ён толькі стаў у дзвярах... Нешта там стаў пароцца ў аўтамаце. Пачаў ён ляскаць, а я гэтым маментам брык за маму. Так во лёг і слухаю, як у мяне будзе пуля... Яшчэ не разбіраўся, — думаў, што яна будзе як чарвяк тачыцца, гэтая пуля. Можа, я так мінуту паляжаў. Ён — др-др-др! — пачаў страляць. Пастраляў... Толькі ў маёй братавай — а брата там забілі, на поплаве, — было дзіцёначка ма-лое на грудзях прывязанае, дык тое толькі «кува! кува!» закрычала...

Усё. Кончылася.

Прыносяць салому сюды, у гэтую зямлянку. Салома чуваць... Я ж то жывы. Салому — шарах сюды і запаліў. Дым гэты тут пайшоў. Ляжу я так во, зажымаюся. Згарэла гэтая салома.

— Ё. т. м., не гарыць!

І гергечуць па-нямецку.

Згарэла салома, адышліся, мінуты дзве — гранату сюды. Граната гэтая разарвалася. Тут усё гэтае — па-ленне, бочка нейкая ляжала, жалеззе — усё на нас узвярнула. У дзверы ён туды

папаў. Тыя, што былі пабітыя, тых паразрывала. Другую яны ўкінулі. Але гэта я ўжо мала чуў: як выстрал нейкі, як пісталетны. Я яшчэ пачуў гэта. Маці, не ведаю, чула ці не...

Добра. Праляжалі... Колькі мы там праляжалі?.. Я чую: матка дышыць, жывая!.. Я ўжо яе прашу:

— Мамачка, не дыхай. — Такі страх дзіцёнку, што я кажу: — Мамачка, не дыхай.

Добра. Тут падойдуць, палічылі гэта: «Айн, цвай, драй, фір, зэгс...»

Тут дзеўкі едуць... Каровы рыкаюць. Здаецца, устаў бы і пайшоў, каб толькі не чапалі... Яны адступалі гэта ўжо, немцы, на Усохі ехалі. І паліцаі з імі. Каровы рыкаюць, дзяўчаты пяюць ваўсю...

Пытанне:—А што за дзяўчаты?

— Адкуль жа я магу знаць? Я ляжу. Як толькі пачуў, што зямля дух-дух-дух, дык я пробаваў уставаць. Матка не ўставала. Я ўстану, толькі чую: зямля дух-дух-дух. Я кажу:

— Мамачка, ідуць ужо ізноў!

Я ўсё страх даваў ёй. І сам баяўся... Я раскажу вам яшчэ адно... Гэта я прапусціў. Падыходзяць да зямлянкі гэтай, дзе пабітыя.

Гаворыць:

— Тут міны наведзены.

А мне, маламу, думалася, што гэта яны яшчэ і міны пры гэтым навялі. Я чую. Якое ж тут расстаянне? Я глядзець толькі не магу: не кранусяніяк. Гэтыя немцы не заходзілі, пайшлі. Сяйчас прыходзяць два немцы яшчэ. Людзі пабіты. Гранаты парвалі. Усё. А яны там нешта ляп-ляп нечым. Жалеззе... І самі з сабой: «Гер-гер, гер-гер...» Але дыхання то мы не здзержым! Я ляжаў так во носам у зямлю, а маці трошкі бокам ляжала. Дзе ж ты здзержыш дыханне! Яны забавіліся неяк доўга. «Ляп-ляп-ляп!..» Маці вазьмі ды чхнула... І адзін пачуў.

— Што-та дышыць!.. — То па-нямецку гаварылі, а то па-руску: — Што-та дышыць!

Другі нечым — я не ведаю, жалеза якое ўзяў ці палку, — і засеклі, у якім месцы хто-та дыхнуў.

Матку гэтую чакаюць... Ну, я за маткай качнуўся. А другі гаворыць:

— Ё. т. м., хто тут можа дышаць? Сматры — рукі, ногі валяюцца, хто тут можа дышаць?..

Пытанне:

— Дык яны топа-нямецку, топа-руску гаварылі?

— Самі сабой па-нямецку, а гэтыя словы сказалі па-руску.

Добра. Я гэта чую, малы, ляжу. Сяйчас жа яны шмыг адгэтуль і пайшлі. Страшна ім стала, ці што?..

Ціха стала. Усё. Забягуць, паглядзяць... Тыя, што ехалі пазней. Падводчыкі гэта ці хто.

Ляжым мы. Стала вечарэць. Гэта пад абед было, як нас адтуль, з месца, узялі. Стала вечарэць. Яны, на-верна, пост кінулі ў Будзенічах, пулямётчыка ці са два. Ну, і некалькі партызан нарвалася на гэты пост. Яны тожа

тады, хлопцы гэтыя, ішлі насмела. Гэта ж лес быў такі. І нарваліся. Завязалася драка. Такая драка, што гэтыя самыя немцы — усе адтуль пачалі ў Будзенічы садзіць.

А мы ляжым. Усё баяліся гэта. Мама мая ўжо тут апомнілася. Гаворыць:

— Сынок, вылазь!..

А яны апомніліся, сталі з пушак біць, з Усох ці з Ікан там.

— Як пападзе снарад, сынок, дык і заб'ець нас. У мяне ў памяці другое:

— Мамачка, яны ж міны навялі! Я ж чуў, як яны гаварылі. Я ж не разбіраўся, што гэта за міны такія і як іх наводзяць. Кажу:

— Мамачка, яны міны... Я ўзарвуся... А яна:

— Лезь, сынок, снарадам пападзе, то і заб'е.

Ну, я і вылез. Па гэтых людзях грэб, грэб, грэб і пералез. Стаў каля вушачка і гляджу. А немцы гэтыя бягуць. «Гер-гер-гер...» Сюды гэта. Ужо цемнавата. Фанар во такі павесяць, ракету — відна, хоць ты шчытай... А я ля вушачка схаваўся, ля зямлянкі, і стаю. І кажу:

— Мамачка, скарэй! Мамачка, скарэй!..

Ну, мамачка старэйшая за мяне, разлежалася... «Паднімуся, — казала потым, — і павалюся, паднімуся і павалюся...» І мокрая. Мы ж мокрыя з дажджу. Потым раскраталася.

Як толькі яна вылезла, дык я і пабег. Проста ні страху ніякага... Дзе ж ты — ужо ўцякаеш ды будзеш баяцца? Пабег і якраз папаў у жыта. Метраў з дваццаць. У шнурок жыта. У жыце я ўжо жду.

— Мамка, скарэй! Мамка, скарэй!

А яна паўзець ды паўзець... Я пажду яе і далей. А яна мяне і дагоніць. Выскачылі мы зноў на гэты поплаў. Відна: ракету гэтую павесяць. А пулямёты рэжуць!..

Яна кажа:

— Заб'юць. Я кажу:

— Усё роўна ўжо, пабягу я. Як жа ж мяне заб'юць, дык ты сядзі тут!..

Я і пабег, як клубок пакаціўся цераз гэты поплаў. Дабег да лесу... І ўжо трывожуся, баюся. Якраз папалі мы на гэтае месца, адкуль нас бралі... І чаму гэтакі напрамак здаўся нам?.. Паждаў я мацеру, прыбегла маці. Пасцілкі, усё раскідана... Знайшла яна тут, на гэтым месцы, круглы кацялок, сухароў, мусіць, з пяць знайшла і солі такую во торбачку. У каго-та засталася. Яна ўзяла. А я ўсё пішчу:

— Мамачка, быстрэй! Мамачка, быстрэй! Са страху гэткага вырваўшыся.

Добра. Куды ж нам ісці?.. Лес чужы, а ноч ужо стала, цёмна. Метраў, мусіць, пяцьдзесят, а можа, больш мы прайшлі. А потым ляглі і спім во так...

Яшчэ ноччу як мы ішлі, дык крот гурбячок нароець, а мне ўжэ здавалася, што гэта міна... Кажу:

— Мамачка, міна!

Мы абыйдзем яго, гэты гурбячок. А потым ляглі пад ёлачкі.

Прасыпаемся, а ўжо абед — гэтулькі мы спалі. Добра. Я ўжо стаў казаць:

— Мама, есці хачу!

Дык яна мне сухар. Я яго трошкі пахрустаю. А куды ісці — не знаем, куды ісці. У лес, каб толькі ў лес, каб на край не папасці нідзе.

Вот прайшлі мы... А тут партызаны! Падыходзім.

— Адкуль вы? — кажа.

Дык я ўжо кажу: так і так, ад немцаў уцяклі.

Яны нам улілі круп трошачкі. Такая во сечка. Мы ўжо зусім другія людзі сталі — мы ўжо гарачага паспыталі.

І зайшлі мы на Гарэлы Востраў...

А потым і армія наша скора прыйшла.

Хадзілі мы з мамай і плакалі. Там, дзе пабітыя ў Будзенічах. Сказалі нам, што і брат мой забіты...»

**ГАРЫЦЬ РАЁН**

У музеі пасёлка Акцябрскі можна ўбачыць вось такія лічбы:

Перад вайной жыхароў у Акцябрскім раёне было — 32 тысячы. У канцы 60-х гадоў — 25 тысяч.

Нешта падобнае раскажуць вам і Міншчына, і Віцебшчына (былыя Лагойскі і Бягомльскі, Расонскі і Асвейскі раёны), і іншыя мясцовасці Беларусі.

Выконваць свой «план абязлюдзення», «вызвалення ад насельніцтва жыццёвай прасторы на ўсходзе» фашысты пачалі з першых дзён вайны.

Але асабліва злавесны размах набыло гэта напрадвесні 1942 года на Акцябршчыне.

Гомельскую вобласць выбралі мы для запісаў у 1971 годзе, бо лета было тады выключна сухое. Ведалі па такой жа працы ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, што прыйдзецца дабірацца да самых далёкіх вёсак. А яно, хай і падсушанае, прыўзнятае меліярацыяй, але ўсё ж такі — Палессе...

Хоць і ведаеш пра тое, што Беларусь — нафтавая рэспубліка, і ўжо не першы год, аднак калі на свае вочы тое бачыш, будзеш зноў і зноў шукаць вачыма вышкі, вялізныя бакі — такое ўсё незвычайнае сярод цустой палескай зеляніны.

Трохі ўбаку — абавязковыя газавыя факелы.

Ведаеш, што гэта дарагая, «нерэнтабельная» краса, але не глядзець — не можаш.

І глядзіш па-асабліваму: сваімі, але ўжо і не толькі сваімі вачыма. Такое адчуванне, што ты ўжо бачыў гэтае палыханне пад палескім небам — але палыханне начное, трывожнае. Адзін з нас партызаніў на Палессі, але не ў яго асабістай памяці тут справа. А ў той памяці, якую мы збіраем і з якой хутка і непазбежна зжываешся, як амаль што з уласнай.

Людзі з вогненных вёсак...

«Я не з гэтай, але таксама з вогненнай вёскі», — сказала нам віцебская сялянка. І колькі іх на Беларусі — вёсак, якія страшна, жудасна парадніў агонь! «Я — таксама...»

Не аднаму, мабыць, чалавеку начныя водбліскі мірных газавых факелаў нафтавага Палесся не даюць заснуць. Бо яму бачыцца тады і іншае, такое:

«...Знадворку запалілі нас. Вот узялі так, пырскнулі на гэты клуб, і гэты клуб пайшоў гарэць. І вот адзін наш... ён у акно, у раму як даў і вылецеў з сынам. Сын быў роўны з ім. І яшчэ жанчына... Яны як ляцелі ключэм цераз гэтае акно, дык немцы па іх вочарадзь выпусцілі — тыя, што каля жалезнай дарогі ляжалі. Яны беглі ўсе, як гусі якія, ключэм, так яны ўсе і палеглі, гэтыя людзі. А я ззаду ў акно выпала, і тут канаўка ж была, і кусцікі былі такія...»

(Тэкля Круглова з гарадскога пасёлка Акцябрскі.)

«...Запалілі Кавалі. На гэтым маменце. І гэтыя ж мужчыны паўзлазяць на крышу, глядзяць і бачаць, як лаваюць дзяцей і кідаюць у агонь...»

(**Матруна Грынкевіч** з вёскі Курын Акцябрскага раёна.)

«...Той канец дзярэўні заняты, а наш канец яшчэ свабодны. Мы і пайшлі на пасёлак, што каля самага лесу. Потым у алешнічак. І тут нас мо баб пятнаццаць ляжала ў гэтым алешніку. Ужо ўпалі і ляжалі. Не бачылі, як яны палілі... Толькі чутна — сільна крычалі, народ крычаў. Не чутна, што яна там адна гаворыць, толькі: «А-а-а-а!» Толькі голас ідзёт, ідзёт голас, а потым і ўсё — анямелі...»

(**Ганна Падута** з Лаўстыкаў на Акцябршчыне.)

«...Я адпаўзла так метраў, можа, са сто ад вёскі і ляжу ў жыце... Я далекавата была ад іх, адтуль, дзе іх палілі, — метраў, можа, з чатырыста... Ляжу я і слухаю, а іх там з аўтаматаў: та-та-та-та — строчаць, строчаць з аўтаматаў, як завялі ўжо ў хату... А потым бачу — гараць ужо хаты і вёску ўсю асвяціла. Відна стала, бо ўжо цямнець збіралася...

А потым, калі аціхла ўсё, я ў жыце ўстала, вярнулася на сваё селішча і пагукала, можа, дзе хто ёсць. Аніхто не адзываецца, толькі тавар раве, ды каты мяўкаюць, ды сабакі брэшуць...»

(**Кацярына Крот** з Лозкаў Калінкавіцкага раёна.)

Гэта ўсё ў нашых людзей вельмі ж блізка, на самым кончыку памяці:

«Калі так цягнецца, — гаварыла нам жанчына ў мазырскіх Касцюковічах, — дык думаеш, мо гэта ўжо скончылася. Аяк зноў, вось так напомняць... здаецца, што зноў пачынаецца...»

Тыя тысячы кіламетраў, якія малады шафёр Мікола Сулейка накруціў на колы абкомаўскага «газіка», пакуль мы ездзілі па Гомельшчыне, калі перанесці іх на карту, выцягнуцца ў ламаную лінію, на канцах і вуглах якой Гомель — Рэчыца — Калінкавічы — Мазыр — Лельчыцы — Петрыкаў — Капаткевічы — Азарычы — Акцябрскі... І калі гэта палічыць ствалом дрэва, дык галіны і галінкі яго — ужо тыя вёскі, куды нам якраз і трэба было ўвесь час адгаліноўвацца: Горваль — Глыбаў — Першамайск — Крынкі — Ліскі — Алексічы — Лозкі — Прыбылавічы — Вялікія Сялюцічы — Тонеж — Капцэвічы — Навасёлкі — Вялікае Сяло — Лучыцы...

Асабліва многа такіх вёсак вакол Акцябрскага — больш за трыццаць.

«Фільтрацыя», «акцыя», «экспедыцыя» — па-рознаму яно называлася ў розных раёнах Беларусі, але азначала адно: масавае знішчэнне насельніцтва, запланаванае загадзя.

І Гітлер і яго памагатыя па разбоі і расісцкім канібальстве многае гаварылі адкрыта. Але яшчэ больш хавалі да той пары, «калі можна будзе» (пасля перамогі над галоўнымі праціўнікамі) прыступіць да «канчатковага ўрэгулявання».

Гітлер:

«Цяпер важна, каб мы не раскрывалі сваіх мэт і ўстановак перад усім светам. Да таго ж гэта і непатрэбна зусім. Галоўнае, каб мы самі ведалі, чаго мы хочам... Матывіроўка перад светам нашых дзеянняў павінна зыходзіць з тактычных меркаванняў. Значыцца, мы зноў будзем падкрэсліваць, што мы вымушаны былі заняць пэўны раён, навесці там парадак і ўстанавіць бяспеку. Мы былі вымушаны ў інтарэсах насельніцтва клапаціцца пра спакой, харчаванне, камунікацыі і г. д. Адсюль і ідзе наша рэгуляванне. Такім чынам, не павінна быць разгадана, што справа датычыцца канчатковага ўрэгулявання. Тым не менш мы ўсё ж будзем ужываць усе неабходныя меры — расстрэлы, высяленні і г. д.».

І яшчэ:

«Рускія ў сучасны момант аддалі загад аб партызанскай вайне ў нашым тыле. Гэта партызанская вайна мае свае перавагі: яна дае нам магчымасць знішчаць усё, што паўстае супраць нас».

Борман:

«Пагроза, што насельніцтва акупіраваных усходніх абласцей будзе размнажацца хутчэй, чым раней было, вельмі вялікая... Менавіта таму мы павінны прыняць неабходныя меры...»

Меры?.. Страляць кожнага, хто хоць бы коса глянуў! — крычыць яфрэйтар Шыкльгрубер — Гітлер. А Кейтэль перакладае гэта на генеральскую мову загаду:

«Фюрэр распарадзіўся ўсюды пусціць у ход самыя крутыя меры... Пры гэтым трэба ўлічваць, што на адзначаных тэрыторыях чалавечае жыццё нічога не значыць, а запалохаць можна толькі незвычайнай жорсткасцю... »

І вось нямецкія рэгулярныя войскі пачалі тут, на Акцябршчыне, рэалізоўваць тую «зручную магчымасць»: пад выглядам барацьбы з партызанамі выконваць даўні і галоўны свой «план».

Для ваенных і гаспадарнікаў «зручна» было, што і партызан, як яны спадзяваліся, паменшае, мясцовасць стане «чыстай», даступнай. Але галоўнае — наогул менш будзе гэтых славян, гэтых беларусаў, рус-кіх, украінцаў... Яшчэ ў пачатку 1941 года, выступаючы ў Вевельсбургу, Гімлер выклаў мэту «рускай кампаніі» ў такіх лічбах: расстрэльваць «славянскае насельніцтва» — кожнага дзесятага, каб паменшыць іх колькасць на трыццаць мільёнаў. Чаму б загадзя, не чакаючы канчатковай перамогі, не пачаць на справе «зніжаць біялагічны патэнцыял» усходніх народаў? Справа гэтая ўжо распачата — у канцлагерах і ў лагерах для ваеннапалонных. Перанесці гэта і ў вёскі, адкуль кожная нацыя чэрпае найбольш «чалавечых рэсурсаў».

«Згодна з планам, — гаварылася на адной з нарад у стаўцы Гітлера, — прадугледжваецца высяленне 75 працэнтаў беларускага насельніцтва з тэрыторыі, якую яны займаюць».

І «высяленне» пачалося. З першых дзён вайны, акупацыі. Масавае знішчэнне і высяленне людзей з раёна Белавежскай пушчы, карная аперацыя «Прыпяцкія балоты» ў ліпені — жніўні 1941 года. Яшчэ больш жудасны размах набыло гэта ў Акцябрскім раёне, дзе пачалося з вёскі Хвойня. Праўда, належала гэтая вёска да суседняга Капаткевіцкага раёна, але на нямецкіх картах быццам лічылася за Акцябрскім. І таму з яе пачалі. Расклад, інструкцыю, план выконвалі са злавеснай дакладнасцю. Прыехалі і забілі 1350 чалавек. За што? Бо на іхняй карце Хвойня — Акцябрскага раёна. Так і тлумачылі гэта і паліцаі і самі немцы. Тлумачэнні павінны былі падтрымліваць у насельніцтва веру, спадзяванні, што знішчаюць, караюць «за віну», а не «ўсіх падрад». Фашыстам, вядома, не хацелася, каб людзі кінуліся ў лясы. Дастань іх потым адтуль! Вось і «тлумачылі». Забілі Алексічы, вялікую вёску каля Хойнікаў, і пусцілі чутку: памылкова, не тую хацелі, а зусім у іншым раёне — таксама Алексічы, але тыя сапраўды «вінаватыя»! Знішчылі Лозкі і зноў: мы хацелі Галявічы, бо каля іх партызаны цягнік падарвалі, да іх гэта бліжэй

было. А тут, у Лозках, памылачка выйшла!

Не толькі іх жудасныя справы, але і гэтыя ідыёцкія «тлумачэнні» лішні раз паказваюць, што і Хвойня, і Лозкі, і Алексічы, і ўся Акцябршчына, і сотні іншых вёсак у другіх раёнах знішчаны, забіты за адну-адзіную «віну». У вёсках гэтых жылі савецкія людзі, якіх «перавыхаваць» на пакорлівых няволь-нікаў фашысты не спадзяваліся. Таму галоўная задача: «высяляць». А што азначала гэта — адна з самых першых адчула Хвойня, а за ёю — амаль усе вёскі Ак-цябршчыны.

Было тады ў Хвойні больш за трыста двароў. На іх месцы цяпер — шэсцьдзесят. Бязладна рассыпаліся гэтыя шэсцьдзесят хат па пясчаных узгорках. Па сыпучым пяску ідзеш і да брацкіх магіл, у якіх пахавана былая Хвойня — 1350 чалавек...

Што з імі зрабілі, з тымі людзьмі, расказваюць нам муж і жонка **Рэпчыкі — Мікалай Іванавіч** і **Вольга Піліпаўна.**

«...Значыцца, рана мы ўсталі і зірнулі ў акно, — пачынае Мікалай Іванавіч, — як цёмная хмара яны былі на той бок рэчкі. Куды яны едуць — чорт іх ведае. Многа народу кінулася ў лес, мужчыны найбольш. Бабы з дзецьмі засталіся. Ну, і мужчын засталося многа. Што робіцца? Прыехалі яны, ахапілі вёску, занялі з канца і гоняць — і дзяцей, і малых, і вялікіх, і старых. Хто не можа ісці, з хаты не выганяюць. Астаюцца. Я тады акалечаны быў, мне перабіла нагу, і я ў гіпсе ляжаў. Ну, думаю, што будзе, то будзе. Бачу, пагналі людзей. Мужчын аддзялілі і дзяцей з жанкамі. Мужчын загналі ў гумно і запалілі — я ўжо бачу, што агонь гарыць. Бачу — з гары гоняць пачкамі жанок, дзяцей. А гумно гарыць. Тое гарыць, каторае далей. А іх гоняць у другое. Канчылі гнаць сюды — раз, дзверы закрылі, аблілі бензінам і падпалілі. А мне ўсё гэта з акна відна. Я гавару на сваю сям'ю:

— Ведаеце што — хто куды! Не хавайцеся толькі ў будынку, а дзе якое калоддзе або карчы. І ў стагі не ха-вайцеся, бо ён запаліць, будзем гарэць.

Гэтыя бабы што робяць? Папужаліся! А ў мяне зямлянка была. Так во хата, а ад хаты так во зямлянка. Я сказаў ім, а сам па іх слядах іду, бо забыліся яны на мяне, што і я тут. Дык я ўзяў тады повад пачапіў — быў у мяне повад такі, — спусціўся з ложка, нагу сяк-так уматаў і пайшоў. Перапоўз я парог, гляджу, куды яны пайшлі. Бачу — у зямлянку. Дапоўз я туды. Але ўжо к маёй хаце немцы не падышлі. Так мы і засталіся.

Хто быў дзе ў хаце, тых пабілі, запалілі, гараць у хаце. Увойдуць у хату — людзі ляжаць, а хто ўцякае — страляюць. Валы ходзяць, каровы ходзяць, свінні пішчаць, а вёска гарыць. Людзей няма, а тавар па сяле гоняць, скот павыганялі.

Мужчын спачатку па пяску ганялі, патамілі іх, а тады ўжо загналі ў гумно. Жанок гналі пасцяпенна, пачкамі. А

мужчын ганялі, каб аслабелі яны, каб не маглі супраціўляцца.

Палілі нас у сорак другім годзе, напрадвесні. Гэта эсэсаўцы былі. З чарапамі».

У жонкі, Вольгі Піліпаўны, свой тон, свая ўсяму афарбоўка: вельмі жывая, непасрэдная ў яе натура. Так, сапраўды забылася яна, цётка Вольга, пра свайго мужа. І сама пра гэта кажа: бо калі ўбачыла, што робіцца, а на руках — дзеці!.. Не, яна ўсё ж крыкнула мужу, мужчынам, і зусім не жаночымі словамі: «Такія-сякія, што ж вы сядзіце-ляжыце, немцы ж вунь!..»

— А ў мяне ж двое дзяцей, адно на руку і другое на руку. Адкрыта скажу: і не гляджу на таго мужыка. Дзяцей схапіла і на мужыка забылася. А ён прышоў ды лаецца...

А потым мы доўга слухалі **Вольгу Андрэеўну Мініч,** трагедыя якой у той жудасны дзень у Хвойні толькі пачалася. Працягвалася яна ўжо не ў Хвойні і не адзін дзень.

Курын, Вежын, Акцябрскі, Кавалі, Зацішша... — пакутлівы шлях Вольгі Мініч і пакуты тых вёсак зматаліся ў адзін клубок. Праз усю палаючую Акцябршчыну прайшла, прапаўзла яна, ратуючы дарагога ёй чалавека.

Цяпер жанчыне гэтай трошкі за пяцьдзесят.

А было ў свой час і дваццаць адзін. Была яна шчаслівая сваім замужжам, чакала першага дзіцяці. І ўсё было б добра, нармальна...

Было б... Але была вайна, фашысцкая акупацыя...

Жанчына расказвае.

Гаспадыня хаты, цётка Рэпчык, што спачатку больш перашкаджала, чым памагала свайму павольнаму «дзеду» Міколу расказваць пра той сакавіцкі дзень, а потым і сама, ужо адна, спяшалася гаварыць, цяпер маўчыць, поўнасцю давяраючы талковасці маладзейшай суседкі.

Суседка гаворыць і час ад часу плача.

Гаспадыня схадзіла ціхенька за перагародку, у спальню, вярнулася з чысценькім ручніком і палажыла яго суседцы на прыпол...

«...Дзве калоны ідзе ў нядзелю: адна калона, бальшушчая, з Капацэвіч, а другая — з Лучыц. Тая калона там, а тая — там, яны сышліся, згаварыліся пра ўсё і сталі ісці ў сяло. Паставілі пасты — проста на дзесяць метраў адзін ад аднаго. Усю дзярэўню абставілі. І тады ўжо сталі заходзіць у кожную хату.

І да нас зайшлі. Колькі нас было чалавек? У Мікіты дзве дзеўкі, у нас... Восем чалавек было ў хаце. І мы тады тыфам былі бальныя. Адзін толькі бацька папраівіўся, так во, як і я, каля стала сядзеў. Яны ўжо як увайшлі, дык усе мы ляжалі покатам. Яны гавораць:

— Ціф? — Ды на старога... Як гэта? Ага: — Цурык! Адзявайся, выходзь!..

Яшчэ ён, бедны, сабраўся, пайшоў. Наша крайняя хата была. Бачым: суседка мая, Уладзімірава Каця,

вынесла дзіцятка груднoе, а ён ёй кажа, немец:

— Нясі назад дзіця.

Панясла яна ў калыску, а гэтыя дзеткі ўзяла з сабою. Большыя, каторыя маглі ісці.

І ўсё ідуць ды ідуць нашы людзі... І ўжо нікога няма людзей, а толькі паставыя стаяпь. А потым падводчыкі паявіліся.

Ідуць, адкрываюць хаты, забіраюць, што там засталося ў хаце.

А мы з жанчынай адной гаворым:

— Выйдзем за сяло, пабачым, куды гэтыя людзі падзеліся.

Мы толькі пачалі ісці, падняліся на горку, а ўжо людзі там крычаць і агонь паявіўся. Чалавек трох было ў партызанах з Хвойні. Дык мы думалі, што гэтых партызанскіх сямей паляць. Прайшлі мы далей — не! Сільны вельмі крык. Крычаць людзі так, што мы здагадаліся...

Прыбегла я ў хату і гавару:

— Спасаймася як хто можа! Бо людзей знiстажаюць!..

Бегаем мы па хаце — хто хворы, а хто так прытварыўся, — а выйсці няма як, бо пост ужо кругом. Нікуды з хаты не дзенешся — стаіць пад самым акном. Бачым мы, што ўжо і падводчыкі скрыліся, і ідуць да нас чатыры мужчыны — высокія, і косці на іх проста нарысаваны. Як ішлі — так у хату.

Свякроў мая, мужыкова маці, выбегла з хаты прасіцца:

— Ох, паночкі!..

Хацела папрасіцца, а яны яе перад акном і застрэлілі. З нагана. Мы пабачылі, што яе застрэлілі, так і пападалі ўсе сюды, у адну кучу. А было ў нас два чалавекі, што і не маглі ісці, з тыфу. Сільна бальныя тыфам, не маглі нават устаць. Мы ўсіх іх на адну падушку пасцягвалі.

А яны зайшлі ў хату:

— Ціф? Ціф?..

Тут жа адразу завярнуліся назад.

А тут ужо запалілі нас. Бутэлька нейкая чорная. І не падпальвалі — аблілі, і загарэлася. Закрылі дзверы, выбілі акно і давай сюды гранаты кідаць. Кінулі адну, другую, трэцюю... І гарыць маё цела ўсё. Цяпер пазажывала, а тада абгарэла я многа... Спачатку граната першая Мікіце ў галаву. Падушкі ляжалі, дык яго неяк падкінула — аж ногі ўгару! А мяне... Во асколкам тут ранена. Бачу я, што дзе хто, пабіла каго, раніла, дагарае ўжо... Госпадзі!.. Я падцягнула стол да акна, яго на стол усцягнула, а пасля вылезла сама праз акно. У хаце, у агні — пакуль ты дойдзеш!.. Я не то што, дарагія мае, — не думала, што буду жыць, я думала, што выцягну яго на двор — хутчэй нас даб'юць. Бо ўся ў агні, уся паабгарвала, раненая... І пападалі мы тут каля акна. А тады, як я яго выцягала, якраз выганялі худобу нашу. Сарай запалілі, а худобу не пабілі, усю выганялі. Адвязалі яны тую скаціну, ідуць, бачаць: старая ляжыць забіта і мы ляжым, паабгарва-ла на нас усё...

Яшчэ адна выскачыла, мужыкова сястра, раненая, з гарачкі выскачыла, і дайшла перад акном.

І ляжу я там, і не чуствую нічога, ужо і памяць пацярала. На некаторае ўрэмя я зусім адключылася. Пачалося ў нас у вёсцы ў дзесяць гадзін, да нас яны прышлі ў гадзіну, а прачнулася я аж на захадзе сонца. Помніла, што я жывая, паднялася, паварушылася, паглядзела, што і ён жывы. А суседка нашая як уцякала, дык выкінула клуначак. А маё ўсё пагарэла, усё пагарэла...

Адна дзеўка ў хаце засталася, а страха як згарэла, як асела ўсё, дык яна толькі: «Ы-ы-ы!» — стагнала там. Храпяне. І зноў храпяне... Доўга даходзіла... Бо яна не ранена была. Доўга храпла, яй-богу. Ужо ўся хата абгарэла, а яна ўсё храпла...

Ну, я паднялася, паглядзела, тут жа два крокі і — яе хата. Узяла я той суседчын клуначак, развязала. Ну, мы ж голыя. А я чуствую, што тут я ранена, тут у мяне вырвала. Развязала я той клуначак, знайшла яму штаны, з падцяжкі зрабіла вяроўку і падвязала іх, ручніка знайшла, перавязала яму тут. А яму граната ўпала вот тут пад коленкі: і вены, і ўсё яму тут папярарывала, ён ніяк не мог устаць. Дык я вазьму вось так на адну руку палажу і на другую і так яго цягла. Цягла я тры кіламетры яго на сабе. Працягну, астанаўлюся, а патом і змаглася, не магла цягчы. І такія чуствы былі, хлопцы, і такія чуствы!.. Чуствавала я, што яны будуць ісці. Я ў хмызнячок яго, наламіла галля, зняла з сябе адзяяльца, я тое адзяяльца на два перарвала: палавіна сабе на галаву, а другую — яго накрыла. А потым я тую палавіну адзяяльца, што на мне, яшчэ раз напалавіну перарвала, падаслала яго, палажыла і пайшла.

«Ну, — думаю, — яшчэ кіламетры два да атрада, дабяруся туды, там дадуць помач».

Камандзір атрада быў Міхайлоўскі...

Сані далі, запраглі каня. І Міхайлоўскі прыказаў мне:

— Сядзь. А калі будуць яны прадзвігацца сюды, немцы, дык ты тады з лошаддзю не ўцякай, кідай лошадзь, а сама — у лес, каб не злавілі цябе.

Я папрасіла, каб мне каго-небудзь далі — ехаць пад Хвойню.

— Ну, — кажуць, — калі ты ўжо данесла яго, то цяпер і давязеш.

Але паехалі мы, майго ўзялі. Сейчас жа яму і матрац з печы гарачай, і валёнкі. Я і сама голая была, абрываная ўся, кроў цячэ...

Мой нічым не ўладзеў. Не бачылі, дык думалі, што ён хоць што-небудзь памагаў мне ісці. Ён прыходзіў у памяць, прыходзіў, ну, а як на печку яго палажылі, дык там нейкае зярно ляжала. Бедны, так і сплыло тое зярно. Да грамачка кроў выскачыла, усе жылы парваліся. Дык ён усё прасіўся. Скажа два словы... Адключаўся ўсё ўрэмя. Прыходзіў у памяць, казаў:

— Хлопцы, спасайце мяне, я ваш брат буду.

Ну і што, ужо назаўтра партызанскі атрад далажыў, што дзвіжуцца немцы на гэтую дзярэўню. Куды мне? Мяне адправілі, далі мне партызаны падводу. Не далі, а проста прыказалі людзям адвезці мяне ў Курын. Там быў тожа атрад, і Лапцейка быў, урач. Штоб здзелаў майму перавязку, аказаў помач. Прывезлі мяне туды, ён паглядзеў, гаворыць:

— Мая ты міленькая, ён жыць не будзе. У яго ні аднаго грама крыві не асталося...

Пака тое-сёе, за пяць мінут вот далажылі, што нем-цы ў Доўгіх Нівах і нада з Курына выязджаць.

Пака я выйшла, усе людзі да аднаго чалавека ў лес пабеглі. Ну, дзвіжуцца немцы, а людзей асталася я адна ў хаце. Урач мяса тое паабразаў з яго, перавязку зрабіў, абінтаваў. Не знаю, што мне рабіць, не знаю, куды ўжо і бегчы. І толькі ўжо выю, выю... Гавару: «Госпадзі, лучша б я пагібла ў гэтым, у сваёй дзярэўні...» Не знаю, што і рабіць. Сяджу.

Дзякуй богу, бог нанёс мужчын хваенскіх. Ішоў гэта Рамецкі Рыгор, Уладзімер Міхалкаў... Багата, багата мужчын ішло. Пазналі мяне, сяйчас мне тут помач аказалі. Пабеглі па дварах, знайшлі саначкі мне. Палажылі, гэта, мой матрац, палажылі яго і давезлі да Глебавых Палян. Немцаў дажыдалі ў Курыне, дык мяне ўжо дальна туды павязлі. Давезлі мяне да Глебавых Палян, там людзі былі, але ўсе начаку. Усе гэта ў лес выбіраюцца. Пераначавала я, мне саветуюць людзі:

— Едзь у Вежын, там сорак двароў толькі ў лесе. Там немцы, можа, і не нойдуць.

Заехала я ў Вежын. Ужо ўсе людзі былі на вуліцы. Яны ўжо чулі, што Хвойню спалілі і ў Курыне пабілі, папалілі.

— Едзь, — сказалі мне, — цераз поле, там будзе дзярэўня Грабнікі. Ты ў тую дзярэўню едзь — тожа дзярэўня ў лесе...

Толькі я ад'ехала ад Вежына, ну, да Грабнікаў не даехала, як палучыўся стрэл у Вежыне... Потым расказвалі людзі з Вежына, хто жывы астаўся, што вывелі ўсіх людзей на вуліцу, пашчыталі і вось так паставілі ў вочарадзь. І цераз два, цераз тры чалавекі — аднаго сюды, другога туды, аднаго сюды, другога туды. Дзве лінейкі зрабілі. Адну лінейку павялі ў хату, запалілі, а гэтая стаіць сярод вуліцы. Коржычыха... яна была з хлопчыкам і дзевачкай. Дзевачка асталася пры ёй, а хлопчыка ў хату: у другую вочарадзь яго паставілі. З тых дзеравень, дзе людзей папалілі, скот астаўся. Сорак чалавек іх аставілі, з Вежына, каб скот гнаць.

Ну, а я даехала да Грабнікаў. У Грабніках тожа ніводнага чалавека няма ў хаце. Праехала я праз усё сяло, няма куды зайсці... Адна жанчына толькі. Прышла, нейкіх каржоў

напякла, бедная, сваім дзецям у лес. І гаворыць яна мне:

— Мы ўжо трэці дзень, як выехалі. Як Курын спалілі, дык і мы выехалі з сяла. Усе жывом у гэтым, у лесе.

А ў мяне цёця была, родная маміна сястра, у Акцябры[2]. Я думаю: «Ну, Акцябр яшчэ стаіць». Партызаны сказалі, што немцы ў Рабкоры, на станцыі. А яшчэ ў Акцябры іх не было. Паеду, думаю, туды, бо падыходзіць на трэці дзень... на другі, праўда, а я яшчэ нічога не ела, не піла... З Грабнікаў я паехала на Акцябр.

Прыязджаю я ў Акцябр, гэта зімой, у тры часы. Ужо цераз два часы будзе цёмна. Мая цётка, як угледзела, што я абгарана ды ранена, ды на майго мужыка паглядзела.

— О, госпадзі, — гаворыць, — куды ты мне яго прывезла! Гэта ж ты прывезла мне, каб маю сям'ю уністожыць. Немцы агледзяць ды скажуць, што партызанская сям'я, партызана хаваем...

Цямнее... Яй жа богу, што б я не ўстала!.. Цямнее, аянакажа: «Ідзі...»

Пытанне: — Яна — ваша цётка?

— Родная цётка, маміна сястра. Во людзі як напалоханы!.. Я гавару ёй: «Цётка, дайце мне платок вязаны, бо ў мяне з адзяяла касыначка, разарвала на дзве, холадна. Я, — кажу, — дабяруся дзе-небудзь, дык я вамвярну».

— А куды ты дабярэшся? Немцы цябе зараз жа ўністожаць. Куды ты з гэтым раненым дабярэшся. Ты вот едзь у лес, а то цераз яго ты і людзей пагубіш...

Паехала я ў лес. Еду, а куды — не ведаю. Надаела ўжо. Думаю: «Хоць бы які канец ужо!..» І сілы няма. Была я бярэменная, два месяцы да родаў было. І такая абгарана... Еду я, еду... Да, мяне папярэдзілі ў Акцябры, што ў Рабкор не заязджай. Язджай лесам кругом, і там казарма ў лесе, пуцявыя жывуць. Дык там, гавораць, пяць сямей, туды едзь напач... А ў Рабкоры немцы стаялі. Гэта было тры кілометры, а можа, і не было. Вязу яго санкамі, а ён кідаецца, бедны, брэдзіць — з гарачкі гаворыць. Даехала я, гэта, да казармы, тожа ўваходжу — стаіць на крыльцы жанчына.

— А мая ж ты, — кажа, — залатая жэншчынка! Не заязджай сюды, бо нашых ужо мужчын пабралі ў падводы. Учора, — кажа, — немцы пабралі ў падводы мужчын і сказалі: «Еслі ў вас, гэта, хто паявіцца... Сняжок чысты, і калі трапіначка будзе, дык гэта, кажуць, у вас партызаны былі. І вы іх корміце. Каб ні слядочка!» — І гаворыць тая жанчына яшчэ: — Яны вось, немцы, толькі што паехалі, на засаду паехалі. У нас тут между Дзёменкамі і Рабкорам цёмны ёсць гэтакі лес... Ну, дык на табе, — кажа, — спічкі, і вось так едзь. Там гумно, і там накладзеш агню. Адкрыта не кладзі, бо, — кажа, — немцы паехалі туды, на засаду ў Цёмнае. Ну, я ўжо ўзяла гэтыя спічкі, ехала, ехала... Стамілася — госпадзі! — нідзе мне не

[2] Гарадскі пасёлак Акцябрскі

давялося перадыхнуць... Тады снег бальшы, бальшы быў, і дзяржала повярху, па сарачу[3] Стаіць ёлка. Я туды спусцілася — пад тою ёлкай снегу няма, знізу яно сухое, галлё, наламіла я галля і ўжо наклала агню. І сяджу. Што мяне ўжо стрэціць — то і дзякуй богу. *Не баялася смерці. Я думала, што ўсіх падрад уністажаюць. Ужо і не баялася*».

«Я думала, што ўсіх падрад уністажаюць», «не баялася смерці» — звярніце ўвагу на гэтыя словы. Словы такія не раз будуць гучаць у расказах многіх, і яны шмат што тлумачаць. Чалавек, бачачы *такое,* пачынае думаць, што ўжо ўсюды, «на ўсім свеце» так...

«...Я сяджу, ажыдаю, ужо трохі і прыдрамала. А яму ў нагах агню наклала. А ён увесь халодны... Знаеце, і жывы, а ўвесь вот так дубам падымаецца. Усё патаму, наверна, што, гэта, кроў вышла. Увесь адубеў, як нада сагнуць, дык ён як прут, як кій.

Ну, гэта, сяджу, а патом чую шорах. Гляджу я — у белай простыні з вінтоўкай хто-та ідзе ка мне. Падышоў так недалёка, к самаму агню не ідзе. Спрашывае:

— Хто такі?

Ну, мне ўжо прышло ў чуства, што па-рускі гаворыць. А адазвацца я не адазвалася: проста адняло ў мяне мову. Ён пабачыў, што я хачу падняцца, а не падымуся. Ён падышоў, гаворыць:

— Жэншчына, вот жа радам гумно.

А ў гумне гэта былі партызаны. Ён падышоў, той партызан, да мяне, узяў мае санкі. Сказаў, што гумно ўжо вон радам, што будзем умесце. Прыцяг мяне туды, далі мне місачку, натапіла я снегу, трохі прапіталася. Есці-то нічога не ела, у мяне ўжо засохло. «Ну, — думаю, — дзякуй богу, што я ўжо к людзям прыбілася».

Ну, тут іх камандзір даў каманду збірацца. І я хацела саначкі прычапіць к возу. Не разрашыў той камандзір. Гаворыць:

— Нельзя. Мы паедам у разведку, узнаем, дзе ўдобнае месца на дзень, і тады прыедам, абагрэемся і па- едам умесце. А з намі цяпер нельзя, атдыхай.

Я і падумала: «Я так стамілася... Калі яны прыедуць, дык чаго ж мне? Я аддыхну за гэтае ўрэмя». Гаворыць:

— Не тушы агню, агонь пускай гарыць.

Агонь бальшы-бальшы!.. Гэтыя паехалі партызаны, а мяне, дарагія, страх такі ўзяў!.. Ад'ехалі яны метраў трыццаць, а я стала гэтыя галавешкі выкідаць з гумна. Павыкідала, павыкідала... Гэты дым ідзе з галавешак. Увесь агонь гэты затаптала. Снегу місачкай нанасіла, затаптала агонь, у куточку села на санках у яго і сяджу сабе смела, ужо не баюся. Гэтак, можа, час пасядзела, факт той, што скора і дзень быў. Чую: гаворыць...

[3] Сарач *(дыял.)* — шарон.

Думаю: «Ну вот, зра я агонь раскідала, стушыла. Едуць ужо мае друзья».

Пад'язджаюць вярхом і на лыжах. Немцы!.. І галавешкі гэтыя падкідаюць нагамі. Дым ідзе... Чэснае слова, не ўстаць мне вот!.. Падкідаюць гэтыя галавешкі, гергечуць, герчечуць. Глядзяць, куды след, і гэтыя следам, цёплымі слядамі — за партызанамі!..

Госпадзі, а ўжо Акцябр гарыць!.. Калі я выехала з Акцябра, у тую ж мінуту немцы — туды...»

Вольга Мініч далей пацягнула тыя саначкі, і мы з ёй яшчэ сустрэнемся — каля іншых вёсак, у іншым лесе...

А пакуль што нас затрымае памяць **Тэклі Кругловай,** затрымае ў пасёлку Акцябрскім, а потым павядзе па другім крузе пакут — у суседнюю вёску Рудню. Бо *двойчы ў той дзень* забівалі гэтую жанчыну, а яна за-сталася жыць, адна з тысячы... Цяпер ёй шэсцьдзесят пяць гадоў.

«...У мянераненыя, у маім доме, ляжалі. Партызаны. Ну, стаў калавур тут, ля нас. Ага, ляцеў самалёт тут вось, на Бунёў, забраў гэтых раненых. Партызаны мне сказалі:

— Ты глядзі, атрад выбіраецца, і ты за атрадам едзь, бо цябе разарвуць, як прыдуць, гэтыя немцы.

Ну, а я так думаю: «Як жа я пайду за імі, куды я пайду? Тут, кажуць, абнялі нас кругом, ацапілі...» Ну, я не пайшла з імі ды асталася дома.

Я не на гэтым месцы жыла — проціў завода жыла. Дык я выбегла ў гэты завод і ў дымавую трубу палезла. Ну, палезла я, там сядзяць нашыя мужчыны, у трубе ў той, чатыры чалавекі. Дажа адзін партызан быў, а тры такіх было. Муж мой на фронце, а дзяцей у мяне не было — дык я адна. Я ў тую дымавую трубу. Пасядзела я там, і прыходзіць, праўда, сусед. Грыб яго звалі. Прыходзіць ды гаворыць:

— Вы, — гаворыць, — вылазьце адсюль, немцы ахфішкі кідаюць і давацьмуць, гэта, нам чай і хлеб. Павылазьце, бо такія яны добрыя, гавораць, закурыць даюць. Вылазьце адсюль.

Гэтыя мужчыны ўзялі і вылезлі. Пайшлі яны, а іх там забралі ды ў клуб...

Я сядзела, сядзела ў той дымавой трубе, а далей думаю: «Пайду я перабяруся ўжо ў свой сарай». А нашы рабочыя сарайчыкі ўсе ў рад былі за заводам. Як я ўжо к гэтаму сараю падышла, так і немцы ўжо там, тавар прыгналі і паставілі. Між тых сараяў, цэлы табун. Ага, дык я думаю: «Пайду я стану каля гэтых кароў, што яны прыгналі». А там ужо чатыры мужчыны стаяць, што тыя каровы глядзяць. Дык я думаю: «І я паганю гэтыя каровы. Штоб хаця мяне не ўбілі, штоб яны мяне не пазналі, што я гэтае хаты хадзяйка». Бо яны пыталі многа ў каго і ў мяне таксама пыталі: «Не бачылі хадзяйкі вось гэстае хаты?» Гэта калі я бегла ў завод хавацца. Дык я сказала:

— Яна пайшла ўжо, гэстая хадзяйка, ужо няма яе. А тут я сама іду. Бо страшна ў той трубе, думаю,

прыдуць немцы, бомбу якую кінуць, узарвуць гэты завод — і я тут пагінула. Так хоць дзе пагіну, дык будзе хаця слабадней, а то ў гэтым залезе...

Пайшла я ў сарай свой — немец! Толькі я ў сарай, ногу на бервяно паставіла лезці на вышку, захавацца ад іх, а немец — ка мне! Дык я ўжо за гэтую сваю кароўку, выгнала яе і стала ля тавару, думаю, што ён мяне не пазнае, дык і я паганю гэтыя каровы. У Глуск яны іх гналі. Але немцы падышлі, забралі мяне і па-гналі перад сабою. Я думаю, куды ж яны мяне гоняць. Прышлі ў клуб і загналі мяне туда. Ну, у клубе мы сядзім, сядзім...

П ы т а н н е:

— А колькі вас было ў тым клубе?

— Сто дзевяноста. Гэта мужчыны так лічылі. Я ўжо ўзяла і кажу:

— Бабы, тут немцы нас паб'юць.

— Ой, не!

І Грыб гэты самы, што вызываў нас з трубы, тут ужо быў запёрты. Я і кажу:

— Яшчэ гэты Грыб прыходзіў быў, і сына свайго вызваў, і нас павызываў адтуль.

Дык ён кажа:

— Не бойся, твой муж на фронце. Сказалі, што ў каторых на фронце — тых не будуць расстрэльваць. Толькі партызанскіх сямей будуць. Будзе сабранне.

Ну, чакаем таго сабрання, калі яно будзе... Вот ужо і пяць часоў, а няма таго сабрання. А немцы ляжаць на адкосах жалезнай дарогі. І аўтаматы дзяржаць на гэты клуб. Дык мы во глядзім, глядзім у вокны, а яны ляжаць. З чарапамі... Тут у іх белае нешта такое, і вось тут такія нейкія нашыўкі, і такія во бутылачкі па баках, жоўценькія, як чацвяртушкі, былі. Яны бутылачкамі па гэтым клубе — шах! Клуб і загарэўся наш! Ніякага сабрання няма! Знадворку запалілі нас. Вот узялі так, пырскнулі на гэты клуб, і гэты клуб пайшоў гарэць. І вот адзін наш, ён у канторы работаў бухгалцерам, дык ён у акно, у раму як даў і вылецеў з сынам. Сын быў роўны з ім. І яшчэ жанчына. Нас пяць душ выскачыла. Ага, дык яны як ляцелі ключэм цераз гэтае акно, дык немцы па іх вочарадзь выпусцілі — тыя, што каля жалезнай дарогі ляжалі. Яны беглі ўсе, як гусі якія, ключэм, так яны ўсе і палеглі, гэтыя людзі. А я ззаду ў акно выпала, і тут канаўка ж была, і кусцікі былі такія. А пад акном вада, а зверху снег. Дык я, як ляцела, у канаўку і ўпала. І ляжала ў гэтай канаўцы. Каб на мяне гэты агонь быў, вецер, дык я б згарэла, усё роўна згарэла б у той канаўцы, але вецер кланіў туды, на склады, склады таксама гарэлі. Дык я і аста-лася.

А далей ляжала, ляжала, гэтыя ўжо людзі пішчаць, выюць, сабакі брэшуць... Даходзілі ўжо... Ой, на розныя галасы, не можна!.. Вот ужо зноў мяне пачало калаціць!.. Крычалі

людзі на розныя галасы. Так ужо, гэта, у тым клубе...»

Пра самыя жудасныя хвіліны людзі з вогненных вёсак найчасцей гавораць адной-дзвюма фразамі: «Пішчаць, выюць... брэшуць...» Тут усё ў адно спяклося: і людскія крыкі, і трэск агню, і брэх аўчарак...

Ці раптам, пра тое ж:

«Тыя людзі — як заплакалі! Усялякімі галаскамі, як пчолы». **(Марыя Кулак,** Баравікі Слонімскага раёна.)

Ці яшчэ як... І замаўкаечалавек. Тутперапытваць, распытваць не будзеш. Толькі — доўгая паўза (як спазма), толькі вочы і твар чалавека, якога нанава пеканула памяць, а ён яшчэ і прабачэння просіць: «Вот ужо зноў мяне пачало калаціць!..»

«...Я ляжала, ляжала дый думаю... Пайду я ў Рудню, там жа ў мяне знаёмыя, можа, мяне хто скрые. Ці мо там жывыя людзі засталіся...

*Устала я. Каб дзе кот, ці які верабей, ці што на свеце — усё... Гэта такая цішыня... А можа, я толькі адна на свеце асталася?.. Дык я думаю — няхай гэтыя немцы ці прыстрэляць мяне, ці што ўжо... Бо як я буду жыць адна на свеце».*

Такое дзеецца, што чалавек ужо не верыць, што гэта толькі тут: мабыць, усюды, на ўсім свеце! І куды ні кінецца — сапраўды, тое ж, усюды сцяна з агню, са смерці...

«...А далей думаю: «Пайду я ў Рудню». Ні немцаў, нікога няма. Ужо ўсе паекалі адсюля, з Акцябра, — запалілі і паехалі.

Іду я туды цераз поле, уся мокрая, хустка мая асталася ў клубе, асталіся галошы мае з валенцаў у клубе, а гэта свае работы валенцы, дык яны ў вадзе расцягліся... З мяне пара ідзе ўжо, такая пара ідзе з мяне, усё роўна як з-пад воўны, як дым. Дык я думаю, мо я гару дзе, мо дзе ўпала на мяне гэта, галуза гэтая, з клуба. Я і так, і кругом сябе — не, анічога нямашака!

Прышла я туды без хусткі. Толькі я прышла, пад нейкі падышла сарайчык, і там маленькая хатка з краю. І стаю, чую — крык... Такі крык там, што, божа мілы, які крык! А яны ўжо з таго канца ўзялі і адтуль — гоняць ужо на гэты канец, пад саўхоз. Гоняць ужо гэтых людзей, бабаў усіх. І самалёты сталі па зямлі страчыць...

Я стаю пад гэтым хляўком, а далей, думаю, пагляджу, што яны тут робяць, што такі крык. Толькі я голаў тык з-за вугла, а немец якраз глянуў сюды, калі я зірнула. Дак ён ка мне ляціць: «А-а-а!» Як стаў мяне прыкладам! Шчоку рассек і губу ўсю парассякаў, і зубы ма? адзін за адзін заходзяць. Поўны рот крыві. Я ўжо вазьму так гэтую кроў, выграбу рукамі, ой, каб хаця дыхнуць!..

І пагналі мяне ў калхозную канцылярыю. Дык гэтыя людзі рудзеньскія таксама кажуць, як у нас казалі, што немцы будуць выбіраць: каторыя партызаны — расстрэльваць, а такіх будуць выпускаць.

Дык я кажу:

— Мае вы бабкі, ужо ў нас, кажу, зрабілі сабранне, ні аднае, кажу, няма. Усе, — кажу, — пагарэлі ўжо, канчаюцца там людзі. Ужо каторыя пішчаць, гавару, даходзяць, так што, кажу, не беспакойцеся, усім будзе адно.

Ну, і там нас дзяржалі, дзяржалі... Раней узяліся за мужчынаў, за тых, што ў другім будынку былі. У аднаго паліцэйскага немцы пытаюць:

— Дзе ў вас такі мужчына е, што ён можа па-нямецку гаварыць?

Вызываюць па імені, па фаміліі таго ўжо мужчыну. Падышоў гэты мужчына, з немцам нешта сказаў па-нямецку, а потым так яго ўзяў пад паху ды паставіў ракам. Немца таго. Дзед, а такі, знаеце, крэпкі! Дык яны: «А-ла-ла-ла!» А іх толькі тры немцы каля хаты было, каля нашай. Патрулёў, што нас пільнавалі па падвоканнем. О, ляцяць гэтыя немцы і таго дзеда ўзялі і забілі.

— Давайце другога, які можа па-нямецку гаварыць.

Вызвалі другога. Той — таксама, яшчэ ў старую вайну, быў у Германіі. Той гаварыў, гаварыў, дык яму трах! — пулю ў лоб.

Вот тады ўжо мужчыны ламанулі ў дзверы!.. Каб яны тады ламанулі, калі ён таго немца ракам паставіў, ды выхвацілі гэтыя вінтоўкі! Калі б яны зналі, што іх гэтак мала!.. Дык мужчыны ламанулі, і пяць чалавек выскачыла і жывыя асталіся. Па полі паля-целі.

Ну, пабілі мужчын, а тады скамандавалі возчыкам — мы ўсё чуем:

— Знімайце казачынкі, валенцы новыя і галошы новыя і шапкі.

І знімалі яны з пабітых шапкі і гэтыя казачынкі, наклалі тры вазы.

А далей давай нас... Паставілі, прывезлі яшчык і паставілі на яшчык пулямёт. На скрыню, што бульбу возяць. Прыдзе немец, вупхне якіх, значыцца, душы тры, чатыры, пяць — сколькі ён адсюль вупхне. Хто ж гэта хоча ідці пад расстрэл? Ну, матка, гэта, забірае сваіх, сем'ю вот ахватвае і падае, бо яны крычаць: «Падайце!» Матка сваіх дзяцей, якая там радня, — абнімуцца і падаюць. І яны з пулямёта строчаць...

Я ўсё так ззаду стаяла, не выходзіла, ага.

Так усе бачаць, глядзяць у акно, кажуць:

— Вунь мая дочка гарыць і ўнукі гараць!..

І вы скажэце — каб хто заплакаў...

Вот яны так тут расстрэльваюць, а тут калхозная пажарная была. Дык там мужчыны сядзяць. Жанчын аддзельна замыкалі паліць, адных, а мужчын аддзельна. Такіх хлапцоў, што большыя, дык туды, з мужчынамі, а малыя дык з намі былі. Многа ж бежанцаў было з усіх... Даже каторыя з Бабруйска былі. Гэта ж ехалі сюды на

схованы, дзе партызаны жывуць. Ну, вот яны і папрыязджалі.

Ужо асталося нас толькі сем чалавек — усіх павыпіхалі. У палу шчэлі вялікія. Я гэта прышла ды рукі ў шчэлі ўсадзіла, ды раз — падняла гэту памасніцу.

— Бабы, сюда, — гавару.

І сама ўжо ў яме. Етыя бабы ўсе і ўбеглі ў яму.

Прышоў немец па нас ужо, па астальных, а мы закрыліся, у яме ў гэтай. Па астальных прышоў, а нас ні аднае душы няма. Гэтыя дзеці ў яме... божа мілы, — нарабілі крыку там! Еты немец адкрыў яму і прыкладам:

— Вылазьце!

Не хочуць. Хто хоча пад пулю лезці? Крычаць.

— Вылазьце!

Не хочуць, ага. Ён гэтым прыкладам у галовы біць. Вот і сталі вылазіць. Катарая не можа выйсці на двор, дык тут, над гэтай ямай, і папрыстрэльвалі, гэтых бабаў.

А я і яшчэ тут адна — у Рудні яна, і цяпер жыве, ага. У яе была дзевачка, такая маленькая яшчэ, паўтара года. І мы ўзялі падлезлі далей сюды пад брус. Я ўжо ўся ў крыві была, у пяску была, твар — у пясок, каб нам не кашлянуць... Вот мы ляжым ужо, нам чуваць — яма адкрытая, а яны ўжо ўсунулі галовы сюды, паглядзелі, ці, можа, яшчэ хто ёсць. Не відна ўжо, цёмна. Толькі месяц свяціў — добра помню. Дык яны паглядзелі ды тады на звозчыкаў на гэтых гавораць:

— Бярэце салому, кладзеце касцёр.

Гэтыя звозчыкі — яны ж падчыняліся, ведаеце, са страху, — сюды наклалі саломы, і ў гэтае памяшканне, і ў тое. А тады:

— Выдзірайце вокны!

Яны выдзерлі, сталы, дзверы пакідалі на салому.

— Запальвайце! Ага, запалілі.

— Вярчыце вярчэ![4]

Яны парабілі гэтыя вярчэ.

— Запальвайце і кідайце ў яму!

Ён думае, а мо там людзі е, каб ета яны ўжо там пазадыхаліся. Асмальваецца на тых вярчах салома, а дым да нас не заходзіць. З ямы ўсё на хату выходзіць. І вот яны запалілі гэты касцёр...

Мы сядзім, сядзім усю ноч, а тут яны ракетамі свецяць — відна там у нас у яме, хоць іголкі збірай, такая відната. Што нам, бедным, рабіць? Божа мой мілы!.. Яны запалілі, і мы чуем, што страха ўпала. Але гэта не наша — гэта пажарная, а наш агонь узяў і патух...»

А побач, у пажарнай, адбывалася тое самае... У той пажарнай, і яшчэ ў двух дамах у Рудні, і яшчэ ў дзесятках, а потым у сотнях іншых вёсак Беларусі... Страшна перамнажаць такія лічбы, бо за кожнай з іх — чалавек і яго сям'я, яго маці, яго дзеці, браты, сёстры. Бо за кожнай — невымерны чалавечы жах, боль. Іх тысячы і тысячы — тых, хто ўжо ніколі не раскажа, за якіх расказваюць вось

[4] Вярчэ *(дыял.)* — жгуты.

гэтыя людзі, вельмі і вельмі нямногія. А ў кожнага з тысяч загінуўшых было *гэта,* было так і яшчэ, магчыма, страшней, і ўжо не змогуць жывыя ўзяць на сябе хоць бы частачку тых пакут...

Пажарная стаяла недалёка ад калгаснай канцылярыі, дзе схавалася пад падлогу Тэкля Круглова, і вось што рабілася ў той пажарнай. Жыве ў новай, адбудаванай Рудні жанчына, якая і была там, у тыя страшныя гадзіны і хвіліны.

**Ганна Іосіфаўна Гошка,** пяцьдзесят гадоў.

«...Нас паставілі прама ў шарэнгу, на калхозным двары. Тады гэтых мужчын аддзельна. Тады за гэтых мужчын — раз, пагналі ад нас зусім, пагналі ў канюшню. А нас у пажарную набілі, біткам набілі. Пальца не ўсунуць туды. Загналі нас і паставілі немца над намі. Тых ужо мужчын ганяюць, бяруць па дзесятку і вядуць у другі сарай. З аднаго сарая ў другі вядуць... Немец сядзіць. І паставілі на лаўках пулямёт — прама сюды ў дзверы... Дык мы сядзім ужо ў гэтай самай... Там не сядзець — там не было як сядзець, там паздушваліся ўжо... А я на самых дзвярах. А са мной маленькая сястрычка. Я яе дзяржала з сабой на руках. Так сціснулі...

Праўда, я ўсё бачыла, як тых мужчынаў вадзілі. Тады мужчыны бачаць, што іх расстрэльваюць, і яны прама як выйдуць — дык і ў ход! Уцякаюць. Адзін у нас калека быў, кульгавы, дык немец, гэта, яго лу-піць-лупіць!.. Каторых назад пазаганялі, а каторыя па полі пабеглі, уцяклі.

Тады жанчыны на гэтага немца:

— Пан, што гэта нас — будуць страляць?

Дык ён адразу махнуў. Нейкі немец быў, чорт яго... А потым:

— Не, матка, не, не, не!..

Ужо здагадаўся, мабыць, што людзі будуць уцякаць, ці чорт яго ведае...

А бабы гэтыя галосяць, крычаць. А гэтых мужчын ужо як пабілі, дык сталі там па вуглах чым-та ліць. І ўжо раптам загарэўся той сарай. Тады яны ўсе сюды, к нам. Падходзяць. Былі там, праўда, і паліцэйскія. Са Смыковіч тут у нас быў адзін такі, чорт яго... Дык адна жанчына ў яго пытаецца:

—Андрэечка, што гэта нам будзе?

—Нічога не будзе вам, — так гэты паліцэйскі. Праўда, ён за сваю матку, і той другі паліцэйскі таксама: забралі сваіх, з хлява, і з сабой павялі.

А нас, шасцярых дзевак і адну жанчыну, якая была ў нас дэпутатам, — павялі ў пустую хату. І іх прышло з намі тры немцы. Два, а трэці ззаду ішоў. Ну, мы ідзем туды... Ужо буду я гаварыць усё... Гаварылі, што яны здзекуюцца з дзяўчат. Ну, мы ідзем і пазгіналіся, каб не такімі маладымі здавацца. А той жанчыне, дэпутату, ён паказвае: «Садзіся!» Яна, праўда, не хоча садзіцца. Яна і сюды і туды, гэтая баба. А ўсе астатнія паўскаквалі: о божа, пращчаюцца са сваімі! А гэтай

жанчыне як далі сюды ў затылак, так зразу яна і кончылася. А я ўзяла і ўпала зразу на падлогу.

Адстралялі нас і пайшлі абратна. Другіх прыгналі.

У трэцюю вочарадзь ужо я пачула — сястрычка мая ідзе. Яна ўжо так плача: відна ж ёй — я наверсе яшчэ. Яна прама мне сюды на ногі ўпала... Забілі ўжо ў трэцюю вочарадзь.

Тады я ўжо ляжала, чакала, не ведаю — чаго... І тут ужо столькі набілі! А потым — раз! — вокны павыбівалі і з кулямёта давай сюды біць. Ну, усё роўна мне нідзе не папала, толькі мне тут смальнула руку і рукаў прасмаліла. А людзі так ужо стогнуць! А я думаю, што мне рабіць, — ці мне вылазіць?

*Я думаю, што ўжо ўвесь свет — нідзе на свеце нікога няма. І відна было, як Акцябр гарэў. Дык думалася, што ўжо ўсё...»*

І зноў тая ж думка, што апаноўвала і Вольгу Мініч, і Тэклю Круглову. Калі гарыць усё навокал і такое робяць з людзьмі!.. Думка, адчуванне, што гэта, што гэткае, мабыць, усюды, на ўсім свеце пачалося, робіцца. Бо не ўкладваецца ж у розум — у нармальны, чалавечы. Не ведаючы пра той «план», што сапраўды быў для ўсяго свету складзены і прыхаваны, людзі інстынктыўна адчувалі яго дзікі замах. Побач, навокал пачынала працаваць страшная машына забойства, і простая жанчына з Палесся раптам адчула пагрозу цэламу свету, усім добрым людзям, і сваё нязмернае гора, сваю бяду вымярала ўжо тым, усечалавечым маштабам. Бо яна ж за ўвесь свет, за ўсіх людзей так зблізку ўбачыла, што гэта такое — фашызм, які пачаў на практыцы рэалізоўваць свае далёкія мэты...

«...Я гляджу ўжо — цёмна, так толькі месячко ўсходзіць, толькі пачынаў усходзіць. Тады, вот тут у нас старая была адна (яна памерла, здаецца, запрошлы год), дык яна:

— А мая ж ты, — галосіць, — дачанька, за што ж цябе забілі, хай бы лепей мяне!..

Гэта яна над сваёй дочкай. А я, праўда, тады адзываюся. А яна мне:

— А мае дзетачкі, ці гэта ты цэлая?

А я не ведаю, бо я ног не чуствую сваіх: народу столькі на мне. Знаю толькі, што галава мая цэлая. Ну, праўда, гэта жанчына, спасіба ёй, дапамагла мне вылезці.

А тут з намі ў гэтай хаце быў хлопчык адзін. Бацьку яго забілі ў тым хлеве, дзе былі мужчыны, а яго адзелі за дзяўчынку: бо гаварылі, што хлопчыкаў забіваюць. Дык яны ўзялі яго сюды, адзеўшы дзевачкай. А яго, беднага, параніла крэпка: растрапалі тут во, жывоцік, усё, усё... Дык ён, бедны, просіцца:

— Выміце мяне, каб я не гарэў.

А тут ужо ўсё гарыць. А ён просіцца... Мы, праўда, за яго і — цераз акно. І самі праз акно вылезлі. З гэтай самай жанчынай. І што ж — па нас яны сталі страляць, а мы так за дым гэты захіліліся і пайшлі. А тады

былі хлявы, гумны, даўнія яшчэ. Старая гаворыць:

— Давай пабяжым у лес. А я гавару:

— Э, не, хадземце сюды, да вашай брацíхі.

За рэчкай там яна жыла. А старая ўсё ў лес. Сядзім мы за гумном гэтым, і я гавару:

— Нікуды я не пайду, буду тут.

А потым бачым: людзі бягуць, дзяцей на плячах пруць — ужо з другой дзярэўні. У лес бягуць. Тады і мы...»

Згарэў пасёлак Акцябрскі, згарэла больш за восемсот чалавек у Рудні, а Вольга Мініч, а сотні такіх, што кідаюцца ад вёскі да вёскі, ад дрэва да дрэва, бачаць, як успыхнула ўжо і там, дзе Смуга, дзе Кавалі, дзе Лаўстыкі...

«...Каровы рыкаюць, — працягвае свой расказ Вольга Мініч, — тавар гэты, што застаўся дзе, сабакі брэшуць».

А ў Курыне, куды яна спачатку, пасля Хвойні, бегла ратавацца, адбывалася такое:

«...Як немцы былі ўжо ў Хвойні, дык нам сказалі, што яны паляць людзей, — расказвае жыхарка вёскі Курын **Матруна Трафімаўна Грынкевіч.** — Мы вышлі ўсе ў лес: і мацеркі нашы, і бацькі. А потым пабылі ўжо ў лесе да вечара. Ну што ж, ціха, ніхто не ідзе і не едзе. Прыходзім у дзярэўню, нас было трох: дзеўкі, дык іх няма ні аднае, а я толькі адна асталася. Мы ідом, і гэта ж яшчэ мо па шаснаццаць нам лет было, мы ішлі, паглядзеліся ў люстэрка на гарэ, а немцы ўжо кармілі коней. Мы яго з сабой неслі. Узялі ж у лесе і неслі. Ну, вядома, дзяўчаты. А люстэрка вялікае, — паглядзеліся... Падводчыкі потым казалі, што немцы бачылі, як мы на гары спыніліся і глядзеліся. Ну, дык мы і прышлі ў дзярэўню, а мая матка была дома. Яна кажа:

— Донька, уцякай, бо маладых забіраюць у падводы. Ну, ідзі, — кажа, — на Смуту. Не ў лес, а ў Смуту.

Ну, я і пашла. А там быў бацька. Мы пераначавалі там. Што ж, паўставалі, усе глядзяць. Кажуць:

— Хто ў Курыне дома, тых не займаюць. Ну, дык я кажу:

— Бацька, я пайду дадому, бо мацеры ж багата работы. Дык я ёй там што-небудзь памагу.

Пайшлі мы, нас шэсць чалавек пайшло. Мы прыходзім, у нас тут былі склады недалёка ад дзярэў-ні. Там стаіць ужо дзевяць немцаў, часавыя. Яны нас прапусцілі ў гэтую дзярэўню. *Як мы ўжо ідом, дык мы бачым, што на свеце нідзе ўжо ні аднаго чалавека, акрамя немцаў, няма.* Ішла жэншчына (яе потым спалілі, а сын яе інвалід і цяпер жыве), дык яны з яе знялі і галошы, наверна, шкада ім было, што ў яе былі гэтыя галошы на нагах. Ну, і яны ўжо вядуць нас у нашую кварціру. Мы прыходзім, і няма ўжо нікога-нікога. Я зайшла ў хату, дык віжу, што маці была ў хаце. Дык толькі вісіць яе хвартук на вешалцы.

— Недзе, — кажу, — людзей падзелі, бо іх няма.

А тады прыводзіць к нам пяць мужчын, нашых, курынскіх. Майго дзядзьку. Мы пытаем:

—Дзядзька, а дзе ж нашы мацеркі?

Ён кажа:

—Скора прыдуць.

Ён знаў усё, але ён нам не сказаў. Ну, а немцы аднаго старыка тут вельмі білі. Б'юць, б'юць, а ён сам быў з Хвойні, такі старэнькі дзядок, і з унучкаю. І паставяць яго ў куток, што малое дзіця. Старога гэтага.

А потым чэх[5] падышоў і кажа:

— Паненкі, яны вас паб'юць і папаляць. У іх, кажа, пастанова такая. Я б вас не біў.

Так нам кажа часавы. Дык мы заплакалі. Дык ён сабраўся і пайшоў. Пайшоў проста на дзярэўню. Ну, дык я кажу:

— Знаеце што, давайце будам уцякаць. Хай нас лепей паб'юць на ляту, як нам гэтае ўжо бачыць.

А яны, як ужо людзей палілі, — вывелі іх вон туды за гору, дзе вон гэты памятнік стаіць. А ў нас зачынілі аканіцы, у нашай той кварціры, каб мы не бачылі, а тады як загарэліся гэтыя людзі, дык ён прышоў:

— Ідзеце, кажа, ідзеце глядзеце, як гараць людзі. Гэта чэх быў.

[5] Мабыць, славак. На Акцябршчыне славакі былі. Пачалі потым пераходзіць да партызан, дык немцы іх вывезлі ў хуткім часе.

Ага. Дык мы паглядзелі, заплакалі. Я кажу:

— Зачэм жа нам гэта яшчэ бачыць, як яны нас будуць жывых паліць, ды біць, ды яшчэ здзявацца будуць з нас. На ляту хай паб'юць.

Ну, і мы сталі ўцякаць... І нас уцякло шэсць чалавек. Толькі мой дзядзька, які нам гаварыў, што мацеркі прыдуць, ён ужо не змог уцячы... Сталі ўцякаць, і мы нікуды не ўцяклі, толькі два чалавекі забеглі на кладбішча, дык аднаго ранілі, а адну ўбілі на могілках і вяроўкай зацяглі ў агонь. А мы ўцяклі ўдваіх з гэтаю вот дзеўкаю. (Паказвае на немаладую сяброўку-суседку Любоў Мордус.) Ну, куды мы ўцяклі? Як сараяў у тыя гады было многа, — гэта цяпер у мяне толькі адзін сарай, а ў бацькі было чатыры, і клець, і стопка, і дзве хаты, — так такое ўжо было цеснае страенне, дык мы як выскачылі, па нас як сталі страляць!.. На хаце быў кулямёт. Пулі як ляцяць — дык яны ўдаль ляцяць, тут блізка ўжо не білі. Мы пакруціліся ўжо на гэтым на дварэ. Ды і за хлеў, ды і паселі. Адтуль хлеў, адтуль — суседні і наш. А адсюль такая куча гною. Немцы глядзелі і ў сене вілкамі шу-калі. Бо яны зналі, што не ўсе. А мы за хлявом, як на смех, паселі. Уцякалі мы ў абед і даседзілі да ночы. Даседзілі, і ўсё адно ж нам ноччу няма ніяк уцякці. Крэпка месячная была ноч, і часавыя стаялі ля гэтых могілак — вот цераз тры шагі стаяў часавы. Мы выйшлі так вот із-за плота,

паглядзелі: ну, мы ўцякці не ўцяком! А патаму што ў нас яшчэ не было і вопыту. Было б цяпер, дык мо б яшчэ, мо б паўз які хлеў, мо б далей прайшлі. А то мы сядзім. І я, мабыць, са спуду праспала ўсю ноч. Яна мяне будзіць. Кажа:

— Моця, не спі. А я кажу:

— Я не буду.

А як толькі скажу — і сплю. Наверна, са спуду. Ага, яшчэ ўвечары (яшчэ ж забыла!), увечары, калі сцямнела, прывялі расстрэльваць гэтых самых людзей, што ў хаце былі: мужчын, шэсць чалавек. Ну, і іх ужо стралялі, дык як выстрал дадуць, ну, дык мы сядзім, толькі так рукамі ўзялася за вочы. Гэта ж пуля, бывае, ляцецьме, бо іх расстрэльваюць у гэтым хляве, каля якога мы сядзім.

А потым прынеслі дзіця, можа, два годзікі. Што засталося ў нашай хаце. Такое, як наш вось гэты хлопчык. Дык тое дзіця, на яго ўжо выстралу не было. Што яны яму зрабілі, я вам ужо сказаць не магу. Яно ўжо толькі дзяціны голас правяло... А выстралу не было. Яно і згарэла ўжо ў том нашым хляве. І тыя мужчыны.

А мы даседзілі да рання. І ўжо ранне, стала развідняць, і сталі выязджаць яны і загадалі падводчыкам лавіць курэй. І гэта кура як бегла — паміж нас. І сядзіць. І мы сядзім. Ну, мы прытварыліся за ўмірушчых ужо, мы жывыя не былі ўжо, як гэтыя ішлі. Яны былі свае людзі, але мы ім не аб'ясніліся, што мы жывыя. Вот так адна сядзела навалена з адной стараны, другая — з другой. Тады ўжо дыханне прыцішылі і сядзелі, як яны прышлі. Яна ўзялі гэтую куру паміж нас, ну і пайшлі. Пайшлі, а тады вядзе другога. Вядзе другога, дык я на яе і кажу:

— Люба, вот цяпер ужо наша смерць будзе, вядзе ўжо немцаў.

Яны прыходзяць, пасталі дый кажуць адзін на аднаго:

— Вот,— кажа, — валяюцца бедныя людзі! Дзе ні зірні, дык там і ляжаць.

Ну, мы ўсё роўна нічога не сказалі. Мы як ляжалі, ну, ім не аб'ясніліся.

Ну, немцы сталі выязджаць. І як даедуць ужо сюды да кладбішча, дык ужо выскажуцца і ў ладкі пачэпаюць. Што ўжо спалілі партызанаў, давольныя. А тады наязджаюць ужо другія, тыя ад'язджаюць, а гэтыя наязджаюць і ўсё: выкажуцца і ў ладкі гэтак. Яны выязджалі да абеду. Так іх было многа.

Ну, а патом яны ўжо выехалі, дык мы ўсталі, дык я мо тры разы ўпала. Ведама, усю ноч сядзелі, наверна ж, ногі і пазаклякалі, дык я ўпала тры разы, покуль адышла ад гэтага месца. Сабраліся мы і пайшлі. Паціхоньку апяць на тую Смугу, дзе і былі. Мы не зналі, куды ісці. Ну, і пайшлі. А яны ехалі вакруг і не займалі нас, хоць і бачылі, што мы ішлі. Ну, яны тожа думалі:. «Ідзеце, вы апяць пападзецеся. А ў гэты самы агонь».

Ну, мы і пайшлі. Прыходзім мы ў тую Смугу, там быў мой бацька. Ну, усе пытаюць, мы ім расказалі, што людзей ужо спалілі, ужо ўцякайце ўсе. Ну, дык ніхто ж не змог: усюды паляць... Запалілі Кавалі. На гэтым маменце. І гэтыя ж мужчыны паўзлазяць на крышу, глядзяць і бачаць, як лаваюць дзяцей і кідаюць у агонь... І не змаглі ніхто ўцякці. Ну, мы яшчэ там адну ноч пераначавалі з Любаю, гэтай самаю... Яна цяпер жанчына, тады мы былі дзеўкі. І бацька мой з намі. Ну, ноч пераначавалі... Патом уранне ўсталі, і я кажу:

— Знаеш што, бацька. Пайду ж я зноў пабачу, дзе маш згарэла.

Ён кажа:

— Не ідзі, ты ўчора пайшла, дык у такую бяду папала.

— Не, — кажу, — пайду. Пайду, не буду тут... Што-та ў маёй душы чуствуецца, што не хочу я быць тут.

Ну, дык ён кажа:

— І я пайду.

— Не ідзеце, тата, бо вы слабыя, вы не ўцячэце, а я ўсё адно ўцяку.

Усю вайну жыла і чуствавала ў сэрцы, што я ўцяку ад немцаў. Ну, і пайшла. Кажу на гэтую дзеўку, Любу:

— Хадзем зноў з табою, ці мо застанемся, ці нас паб'юць, але хадзем зноў.

Толькі мы прыходзім сюды на гэтае селішча — тут і яе бацька быў, і мой, на краі жылі. Не прайшло мінут пятнаццаць, як гэтыя немцы акружылі Смугу і спалілі ж на гэты мамент.

Ідуць партызаны. Мы пасталі: думалі спачатку — немцы, зірнулі — пазналі, што гэта ідуць партызаны. Вось гэты мельнік Парфім, ён і цяпер жывы, ён за лесніка. Ён прыбягае к нам і пытае: як, што, як уцяклі? Ён ускочыў тут на драбіну і кажа:

— Дзеўкі, не ідзеце, бо гарыць Смуга з людзьмі, а ідзеце ў такое і такое месца, у лес. Ідзеце, — кажа, — вось за тым мужчынам, ён вас завядзе, дзе нашы сем'і.

Мы толькі выбеглі з ёю на гэтую вось гору і бачым — бацька мой бяжыць з лесу, са Смугі. Ну і разам пабеглі мы...»

Хвойня, Курын, Смуга, Акцябр, Кавалі... У Кавалях па два, па тры чалавекі бяруць з хаты, каля хлява: «Раздзявайся!», затым: «Лажыся!» — і ўсё, каб радочкамі, каб галовы людзей ляжалі на спінах забітых раней... Агонь, смерць, жудасць коціцца па вёсках усё далей — Лаўстыкі, Карпілаўка...

Частка людзей у лесе, іншыя, не ведаючы, як лепей, куды ім кінуцца з дзецьмі — бо ўсюды, здаецца, тое ж, па ўсім свеце! — трымаюцца хаты, суседзяў. Спрадвеку так больш надзейна было. Але тут пачалося, абрынулася на свет, на людзей нешта такое, да чаго нармальны чалавечы вопыт ужо не стасуецца...

«...Яны з Курына прыехалі к нам, — успамінае Ганна Сяргееўна Падута з

вёскі Лаўстыкі. — Ну, мы дома сядзелі,. гадалі, а потым партызаны нам сааб-шчылі, што паляць, што ў Курыне спалілі ўсіх людзей, жыўём. Ну, мы паўцякалі ў лес. Пастаялі ў лесе. А патом ужо... Дымы з печак, з труб ідуць усюды — у Акцябры, у нас. Ну, дык мы вярнуліся назад, бо страшна ж у лесе, што зловяць, і холадна. Толькі мы дадому — і немцы сюды, разведка іхняя. Ну, у нас мужчыны былі старыя, дык яны:

— Вынесці стол, тое-другое. Можа, пакаянне ўжо будзе.

Ну, нашы бабы... Дзе ж тут, як бабы. Вынеслі стол, а яны кажуць:

— Маткі, вунь яшчэ войска ідзе. А гэта разведка была.

Прыехалі потым — як цьма, і распалажыліся ў нас. А частка паехалі ў Акцябр. І ў Кавалях распалажыліся. Якраз нас захвацілі ў сяле тут з жэншчынай адной (яна ўжо ўмерла). Нам адзін возчык падказаў, што з намі будзе тут. Мы стаім на вуліцы ля стала, дык некаторыя нічога не гавораць, а ён падышоў да кажа:

— Дайце, цётачкі, малака. Мы гаворым:

— Пажалуста. Дык ён кажа:

— Ох, цётачкі мілыя, усё роўна вас, — кажа, — усіх жыўём спаляць. У сарай загоняць...»

У вайну фашысты дэманстравалі ў Германіі і ў іншых краінах «дакументальную» кінахроніку: «савец-кія партызаны», шмат «партызан» стаяць на каленях перад нямецкімі салдатамі... А кіназдымкі такія рабі-ліся проста. У вёсцы Вялікая Воля Дзятлаўскага раёна нам расказваў пра гэта Аляксей Ламака. (Яго расказ у раздзеле «Звыш дзесяці».) Натоўп вяскоўцаў акружлі кулямётамі, прымусілі людзей стаць на калені і запусцілі спачатку кінакамеру... Мелі фашысты і іншыя «кінадакументы»: як «радасна», з хлебам-соллю сяляне сустракаюць на Усходзе нямецкага «салдата-вызваліцеля»... Ці не тут працавалі тыя «кінадакументалісты» — ці не ў Лаўстыках?.. Усё, як бачыце, ёсць: і стол сярод вуліцы, і «хлеб-соль». А яны ідуць, ідуць — «вызваляць» усходнія тэрыторыі, ад людзей вызваляць.

«...А яны ідуць, гады гэтыя. Як ішлі, так і крычаць:

— Убірай!

Сталы, значыць. У белых халатах у гэтых, з гэтымі чэрапамі, ну, гэтыя немцы.

Ну, мы і разбегліся, хто куды, па хатах, калі возчык нам сказаў пра тое. Я да суседкі прыбегла, кажу:

— Што ж мы будзем рабіць? Дык яна кажа:

— Выйдзі паглядзі на вуліцы, ці е немцы, ці не. Той канец дзярэўні заняты, а наш канец яшчэ свабодны. Мы і пайшлі на пасёлак, што каля самага лесу. Потым у алешнічак. І тут нас мо баб пятнаццаць ляжала ў гэтым алешніку. Ужо ўпалі і ляжалі. Не бачылі, як яны палілі, як забівалі,

толькі чутна — сільна крычалі, народ крычаў. Не чутна, што яна там адна гаворыць, толькі: «А-а-а-а!» Толькі голас ідзёт, ідзёт голас, а потым і ўсё — анямелі...

Пытанне: — А той возчык, што сказаўвам, ён адкуль?

— Гэта проста селянін. Паліцай не сказаў бы. Адзін паліцай да нас прыйшоў хлеба ўзяць, дык мы спрашываем, што ён з народам робіць. А ён нам (мы яму паўбулкі адрэзалі): «Давай усю булку!» — і нічога не сказаў. А гэты вось — такая душа знайшлася, што сказаў.

Дык яшчэ вось хоць трохі нехта застаўся. Ён на хаду — дзяржыць стакан і сказаў...

Тут франтавыя былі немцы, мо б яны і болей палілі, але партызаны націснулі, і яны пайшлі...

Да вайны ў нас мо сто дваццаць двароў было. Багата ў нас было, і сем'і вялікія, дзяцей многа. Усіх, усіх пабілі. Яны казалі: «У вас і курыца партызан, не то што дзіцёнак!» Пашчады не давалі, гады гэтыя...»

Ну як жа, гэтулькі «партызан» знішчылі! У адной Рудні — восемсот. Ды ў Курыне — амаль столькі ж. У Лаўстыках. У Смузе. У Кавалях... Па ўсім раёне агонь пракаціўся. Перастралялі, папалілі дзяцей, жанчын, мужчын вясковых і ў ладкі — плясь, плясь, плясь! Самі сабе папляскалі, як ля тых курынскіх могілак. Нешта ж і гаварылі ў тых прамовах — вядома, пераймаючы сваіх берлінскіх фюрэраў. Плясь, плясь, плясь! — выканалі задачу, свой план. А там, вышэй — свой план, шырэйшы, агульны, і свая арыфметыка — ужо на мільёны жыццяў вядзецца падлік. На дзесяткі мільёнаў, калі не на сотні. Бо замахнуліся ж на цэлы свет! Там свае мітынгі, свае прамовы, «святы» рыхтавалі — калі будуць знішчаны, нарэшце, разам з жыхарамі Масква, Ленінград і іншыя гарады, якія берлінскаму маньяку здаваліся «лішнімі». «Каб не карміць іх паўднёвым хлебам». Бо яны ўжо лічылі сваім той, разбоем узяты, украдзены, хлеб.

А пакуль што — як частачка ўсё таго ж вар'яцтва і таго ж «плана» — забіваюць Карпілаўку. Усё на той жа Акцябршчыне.

Гэта бачыў, пра гэта расказвае **Павел Лявонцьевіч Пальцаў,** які памятае ўсё з іншымі, чым звычайна жанчыны запамінаюць, падрабязнасцямі, дакладнасцямі. Ён па-партызанску помсліва трымае ў памяці справы, аблічы, прозвішчы, таксама і памагатых нямецкіх фашыстаў, мясцовых і немясцовых «бобікаў»-паліцаяў.

«...Напрадвесні 1942 года яны прыехалі сюды. Партызаны пайшлі. Асталося мірнае насяленне. Ну, і сабралі людзей у клуб, і сталі спрашываць пра партызанаў. Ніхто не выявіў, народ не сказаў.

— Нет у нас партызанаў, і ўсё. Партызаны былі быўшыя пленныя, акружэнцы, яны пайшлі, а наш народ увесь дома.

Патом адзін паліцэйскі, ён з бабруйскага быў гарнізона, ну, значыць, ён сказаў:

— Еслі так, партызанаў нет, дык вы — партызанскія, бандыцкія морды!..

А я таксама ў клубе стаяў. Жэншчынаў па адну сторану паставілі, а мужчын — па другую. Там чалавек шэсцьдзесят мужчын было, рознага ўзросту: і старыя, і маладзейшыя. Ну, ён спісак трымае, а там былі прозвішчы, у спіску. Вот ён пытаў:

— Кавалевіч Грыша?

А жэншчыны гавораць:

— Кавалевгч Грыша ў арміі.

Той Кавалевіч, які партызанам хлеб малоў. Ён інвалід быў. Дык жэншчыны:

— Ён у арміі. А паліцай:

— Какой... у арміі, калі ён хлеб партызанам меле! Дык жэншчыны змоўклі, бачаць, што ведае... Дык ён за гэты спісак — у карман і пайшоў к каменданту, пагаварыў там. І той, наверна, даў прыказ Страляць. Ну, тады заходзіць і зразу пачынае панямецку шчытаць: «Драй, фір...»

Адшчытаў дзесяць чалавек і павёў на вуліцу. Паліцай адшчытаў, але панямецку. Адкуль ён — не знаю, фамілія яго Шубін. Потым ужэ гаварылі, асталіся некаторыя паліцаі, выпівалі, дык гаварылі, што яго Шубін фамілія. Залаты зуб у яго быў... Адшчытаў гэтых дзесяць чалавек і павёў. Ну, куда павёў, думалі, можа, куды так, дапрос, ці што. А потым чуем, што страляюць у канюшні. Ну, а патом у другую партыю ўжо я пападаю. А ён толькі здае: выводзіць на двор дзесяць чалавек, здаў немцам — і тыя павялі... Жана мая ў клубе таксама была, а дзеці — аднаму чатыры годы было — на печцы схаваліся дома. Ну, я і папаў у другую дзесятку. І дзесяць немцаў ідуць з намі, з вінтоўкамі. Дзесяць немцаў вядуць дзесяцярых. Ну, прывялі ў канюшню і камандуюць:

— Станавісь к сценке галовамі.

Ну, мы пасталі, нахіліліся. У мяне палушубачак быў, дык я так варатнічок наставіў, глянуў, дык яны ўжо ў канал патроны загналі і на ізгатоўку ўзялі. А я ці са спуду, ці хто яго знае — ногі падкашваюцца... І так выстралілі. Дзесяць вінтовак залпам ды ў памяшчэнне — дык гул глушыць, як з пушкі. Мне зазвінела ў вушах, я ўпаў і не помню: ці я ўбіты, ці жывы. Ну, і ляжу. Патом вушы сталі адлягаць, адлягаць вушы, стаў чустваваць і сам сабе не веру: жыў я ці не? Сам сабе не веру, але глаза пазіраюць. Патом чую разгаворы. Паліцаі два стаяць і разгаварваюць па-руску. Немцы — гергель, пастраляюць і пайшлі. А гэтыя... Цішыня, дык чуваць, што паруску хто-та разгаварвае. Ага, дык я ляжу. Не помню, колькі я ляжаў — часдва... Проста ўжэ і заснуў, сэрца, наверна, слабее, я проста заснуў.

Патом чую — яшчэ вядуць партыю. Яшчэ партыяў пяць расстралялі мужчынаў. Патом ужо жанчынаў. Там і мая жана галосіць, крычыць:

— Пан, у мяне дзеці!

Ну, і прывялі ўжо жэншчын тожа, наверна, ужо беспарадачна стралялі, як папала, бо гэта жэншчыны — яны бягуць. Ну, перастралялі — часа два-тры прайшло. Цішыня, хоць бы што, на канюшні. Я так ляжаў, ляжаў і ў чуства ўжо настаяшчае прышоў, у чуства, што я ўжо жыў. Цэлы, не ранены нічога. Ага, а далей чую: хто-та па мне ёрзае па спіне. Убіты, але ёрзае па мне — ранены, мабыць. Толькі я падумаў, што немец будзе яго стралядь і мне пападзе, толькі ж падумаў, а немец, наверна, ішоў і ўбачыў. Дабіваў яго, і мне пуля вот сюды папала, у сцягно. Праўда, не ў косць, па мякішы. Пеканула, а я як ляжаў — ляжу. А чую — кроў так пабе-е-гла. А той перастаў ёрзаць...

Ну, а потым я паслухаў і ўстаў: няма нікога. А дзярэўня была ад канюшні метраў пяцьдзесят, ну, шэсцьдзесят. На дзярэўні немцаў поўна — поўная вуліца. А тут няма нікога. Думаю, выбягу я — кругом жа немцы, стралядь будуць. Пачакаць, пакуль запаляць, каб па дыму бегчы. Было не было! Я, значыць, па канаўцы, вот жалезны мост, ён і цяпер на рэчцы. Я пад гэты мост, скінуў гэты паўшубак і — драпака! Бягу, ніхто не страляе ў мяне. Тады я падбег да рэчкі — вот рэчка Нератоўка, вады напіўся і гляджу: не бяжыць ніхто. Я ўжо думаю так: калі за мной будуць гнацца лыжнікі ці кавалерысты, скіну ўсё з сябе, голы, але ўдзяру. Быць жа не можа! А там недалёка кусты ўжо. Ну, праўда, ніхто не гнаўся.

Жэншчына адна відзела, як я бег. Яна і цяпер жыва, Рулега Мар'я.

Ну, і пайшоў у лес...

Спачатку аружыя ў нас не было, а пасля гэтага разгрому аружыя мы сталі даставаць, хто хацеў, і пайшлі ўсе ў лес.

У асноўным немцы былі тут, калі забівалі, але і паліцаі былі, нават мясцовыя былі. З Рудні былі паліцаі. Адзін паліцай быў са Смыковіч, па фаміліі Лось. Я знаю, разам з ім работаў да вайны. Ну, вот прасцілі яго, ён дажа прыязджаў у шляпе. Смыкоўскія хацелі яго забіць, дык дагадаўся, удраў. І цяпер жыве, я не знаю, мо на пенсіі ён жыве цяпер. З Зазер'я Гавароўскі тожа быў. Вот ён прадсядацелем калхоза да вайны быў.

Я сам відаў іх на свае вочы.

Гэты Лось дык есць сала на возе і ўсміхаецца — у акно я відзеў. Яму дажа радня там была. Просяць:

— Максімка, спасай!

Матруна такая была — яго радня. У-у, ён дажа ўніманія не звяртае... Ён цяпер работае ў Комі АССР, у Смыковічах яго мачаха, дык дабівалася нават нейкай спраўкі на пенсію для яго. Ён ужо там здароўе пацяраў, ці што, я не знаю, толькі спраўку брала... Цяпер ён прыязджаў,

але я яго не бачыў, а бачыў адразу пасля вайны, калі я з арміі прыйшоў. З вёдрамі ён ішоў: печкі там рабіў, ці што. Я яму кажу:

— Сволач ты... Так і так...

Ён голаву ўніз апусціў, ні слова проста. Яму ж некрасіва, панімаеце. Вот такое дзела...»

Бачыце, ужо «некрасіва» ім, гэтым, сярод нашых людзей. І, вядома, боязна людскіх вачэй. Але жывуць, і не каб асіну шукаць, а пра пенсію ў яго думкі...

А ўжо тыя саўдзельнікі злачынстваў, вылюдкі з вылюдкаў, што лічылі сябе нават «ідыёлагамі» гэтых, а цяпер схаваліся за спіну заходніх разведак, тыя нават галоў, вачэй не апускаюць. Вунь як гучна крычаць (каб перакрычаць, мабыць, той нязмоўчны жудасны крык дзяцей і жанчын...), што яны хоць і служылі ў фашыстаў, але былі «трэцяй сілай» і нават «народ ратавалі»...

Як жа ім не хацелася б усё гэта бачыць у люстры народнай памяці! І там — побач са звярыным выскалам прыблуды-фашыста — бачыць і сваю фізіяномію. Такую вось, такія вось! І яшчэ страшнейшыя, яшчэ больш агідныя...

Мы забеглі наперад, ажно ў пасляваенны і ў наш час...

А Вольга Мініч сярод тых жахаў, у пекле тым усё яшчэ хоча выратаваць бездапаможнага, дарагога ёй чалавека — цягне тыя санчкі праз усю Акцябршчыну.

Спалілі вёскі, не схавацца людзям ужо і ў лесе. Партызаны, дзе могуць, як могуць, ратуюць насельніцтва ад таго самага «плана», аднак — малая яшчэ сіла, слабая зброя, а супраць іх і супраць жанчын, старых, дзяцей — франтавыя дывізіі. Гэта потым, у канцы 1942-га і ў 1943-м Акцябршчына, легендарная Рудабелка, стане недасягальнай для эсэсаўцаў і «бобікаў».

А пакуль што працягваюцца жудасныя блуканні Вольгі Мініч — адной з тысяч жанчын з падобным лёсам.

«...Паехалі партызаны, а за партызанамі немцы трапінаю гэтай, а я ззадзі памалу за імі еду. Прыдзе дзень — будзе відна, куды я выеду...

І вось я выехала на пуць, на жалезную дарогу. Сонечка ўсходзіць. Я астанавілася: пуцею дарожка ідзе. І па адзін бок пуці дарожка ідзе, і па другі бок, але я думаю: «Паеду пуцей, бо вышэй і відна». Праехала я метраў пяцьсот ад пераезда — чалавек дзесяць ля кастра, жанчыны сядзяць. Я напрасіўіх села аддыхаць.

— Мае цётачкі дарагія, — кажу я, — мо ў вас ёсць што есці? Я ўжо трэці дзень так, ужо не магу, дажа вады ў роце не дзяржала.

Яны кажуць:

— Нашы мужыкі пайшлі ў Зацішша, мо што там дастануць, а пры нас нічога няма. Будзь з намі.

Двое дзяцей і дзевяць было жанчын. Я падумала: «Яны пайшлі, а ці дастануць, а калі прыдуць?..» А мой, бачу, — ужо ўсё, ужо і не кідаецца, ужо

і рот не закрыўся, і на зубах такое... Я вазьму рукавіцай і сатру. Пашці што ўжо не жывы.

У мяне сястра ў Дзёменцы была. Думаю: «Паеду пуцёю туды». Я не рашылася каля іх атдахнуць.

Праехала я метраў мо пяцьсот. Бачу: ах, божа ж мой, немцы мне напярод едуць! Тыя, што ехалі на засаду...

Калі б я кінула яго на пуці, дык я б не ранена была, а то я з санкамі — убок. Бачу, што немец адзін кінуўся за мной. І я санкі кінула. Бягу, бягу, путаюся, а па мне яны не маглі страляць, таму што яны ўгледзелі тых, ля агню. І калі б яны па мне выстралілі, дык тыя б уцяклі ўсе. Пака яны тых не абцапілі, дык па мне не стралялі. А потым немец выстраліў некалькі разоў. Пабачыў, што я пабегла і кроў за мною па снезе. І не чула, што пуля вот прарэзала руку, — ні болі, нічога. Калі б не пабачыла, што кроў, не чула б, што і ранена. Немец прайшоў за мною следам і вярнуўся. Пайшоў к санкам маім...

Што яны ўжо там рабілі, дык хто іх знае, бо ён пашці што мёртвы быў...

Ну, я ўжо ішла ў гэты лес, ішла, ішла і найшла ўсіх тых, той атрад, што сядзеў у гумне. Ну, расказала, як было, што не іх тады прыждала, а немцаў. Усё, як было, расказала. А камандзір мне не верыць... Даў каманду двум хлопцам:

— Пасадзіце яе і адвязіце ў Заціша!.. Прывезлі яны мяне ў Заціша, пакінулі на сяле.

Зайшла я ў некалькі хат: пуста, вада пазамярзала ў вёдрах, нічога не найду. «Ну, гібель, — думаю, — госпадзі? Дзе гэтая смерць? Дзе мне яе стрэціць, гэтую смерць?..» Ужо і людзей не магу знайсці, нікога няма.

Я ішла, ішла, перайшла Заціша, прышла ў Бубнаўку. У Бубнаўцы адна баба нясе малако. Падаіла кароўку, нясе ў лес малако. Я папрасіла, яна мне стаканчык наліла. Я выпіла стаканчык, але мяне тут жа сарвала. Хто яго ведае чаго, тры дні ўжо не ела... Я папытала, ці цэла Дзёменка.

— Сказалі, — гаворыць яна, — што партызаны былі ўчора, і сказалі, што два двары толькі немцы спалілі. Партызанскіх. А то ўся дзярэўня цэла. Сабралі людзей, падзяржалі і пусцілі.

Ну, і мне так хочацца ўжо атдыхнуць. Сесці мне на дарозе, дык я чуствую, што не знаю, цераз якое ўрэме я падымуся... Я сышла ў поле, пад хвою, села, пасядзела, а падняцца не магу. Ужо што ні паднімалася — ніяк не магу падняцца. Сілы няма, руку ўжо не магу падняць. Я і заснула там...

І знаеце, што яшчэ мне гэта жыць была судзьба. Ішлі партызаны з нашай дзярэўні, гэтай Дзёменкі. Пазналі мяне, будзілі і не разбудзілі. Пайшлі ў дзярэўню, узялі санкі і завезлі мяне сястры. Завезлі мяне сястры, знеслі,

сталі будзіць, дык казалі, што я гаварыла нешта без памяці.

Я суткі спала. А праспалася, апомнілася — рвала ўсё на сабе!.. Потым папрасіла ўжо партызанаў, завезлі мяне на тое месца, дзе я кінула яго. Падышлі мы. Санкі там, дзе я кінула іх. А тых усіх, усіх ля агню пабілі. Казалі людзі, што дзеткам галовы пазавярналі. Дзве дзевачкі, дык ім пазавярналі, як пяўнём, галовы, паказнілі іх... Закопваў іх усіх нейкі Гарбуз з Курына. Ён і цяпер жывы. І яшчэ людзі былі. І майго закапалі там недзе. Я так і магілкі свайго не знаю...»

Вольга Андрэеўна, расказаўшы пра тое жахлівае прадвесне 1942 года, не можа супакоіцца. Бо пакуты яе на гэтым не скончыліся. Памяць яе, яе расказ пераносяць нас на два гады наперад, у не менш страшныя дні апошняй пад акупацыяй зімы.

«...Ну, жывом ужо ў Дзёменцы, і зноў тут стала блакіроўка. Такая блакіроўка, што не можна было ні ў лесе, ні дзе схавацца. Папаліся мы ў куранёх, нас палавілі. А потым мы паўцякалі, усё спалілі ў нас, усё — да грама, нічога не засталося. Мы другі зрабілі ўжо курэнь.

А потым аднажды такі стрэл далёка паявіўся.

Мы сабраліся: куды ж нам усім з вострава? Ужо людзі саветуюцца: стаім на грэблі — куды ж мы пойдам?.. І вот толькі мы панадзявалі торбачкі, у каго што было, як на нас:

— Стой, руская!..

І па матушцы.

Хто мог — пабег. А ў мяне тады дзіця ўжо было на руках, хлопчык паўтара года. У Дзёменцы, у сястры першае сваё і нарадзіла. І сястры маёй хлопчык застаўся са мной.

Дзямян хацеў з канём уцячы, а немец каня застраліў, а Дзямяна за варатнік і сюды.

У вочарадзь паставілі нас, сорак чалавек у вочарадзь, і давай страляць.

Гэтага самага чалавека, Дзямянаў хлопчык уперадзе стаяў на вочарадзі. Маці яго, гаспадыня з дачкою, стаяла ззаду за людзьмі. Як сталі страляць, дык Дзямяна першага. У патыліцу — ён і ўпаў, ні славечка не сказаў, ні славечка.

А хлопчык ужо ідзе, бедны, ідзе ды ўсё: «Ой, баюся, ой, баюся!» А як стрэлілі, дык ён яшчэ крыкнуў: «Ой, не баюся!» — і ўпаў.

Пытанне: — Так і крыкнуў?

— Крыкнуў. Спачатку: «Ой, баюся!», а потым: «Ой, не баюся!» Яму гадоў дванаццаць мо было.

Ну, як застрэлілі хлопчыка, дык яна, маці, што ў самым канцы стаяла:

— Ой, падажджэце, паночкі: няхай ужо сямейка за сямейкай. І я прыду.

Прышла тая ўжо маці ды на дачку:

— Ідзі, Волька, і ты.

Дзевачку гэта застрэлілі, тады яна падышла:

— Я сама.

Ды так вот узялася за галаву ды падшылася пад забітага мужа. Дык ёй у шыю — як дасць, яна галавою як

матане і нагой... Тры разы страляў у яе, а і тры разы янанагой...

Мы стаім усе, а ў мяне сястрын хлопчык, гадоў, можа, сем, і майму паўтара года. Вот усё тут гарыць, кажацца, разрываецца, — што мне рабіць?.. Ці гэта дзяцей упярод, ці самой?..

І прышоў такі, у ачках. І пракраціў расстрэл. Пракрацілі расстрэльваць. Пагаварыў ён па-рускі, абыскаў нас па карманах.

А яны, гэта, уехалі ў такую твань, — яны коньмі, верхам ехалі, — што коні лёд не могуць паламіць, бо ногі парэжуць. Дык яны — нас. Мы ідом, рукамі лёд ломім, а яны за намі коньмі едуць, вярхамі. Дык я свайго пацана на лёдзе падсуну ды і ламлю той лёд. Ды даламілі ўсю даліну рукамі, ды паабразалі рукі. Выбраліся мы з гэтай даліны, дык у каго якая сумачка была, дык пераабуўся. А суседчына маці, яна стараявя была, выйшла яна, бедная, з вады, а ў яе ніякай клуначкі. Яна не пераабулася і так акалела, так акалела, на калені так і ўпала. А ён падышоў, немец, каленам у плечы — яна так і заткнулася. Ён яшчэ і стрэліў у яе.

Ну, а нас ужо гоняць, гоняць... А хлопчык адзін... І штонікі ўпалі, голенькі. Ідзе голымі ножкамі, ужо не можа ісці, замерзлі ногі так. Дык немец з разрыўное пулі... Кішачкі выматала, ён енчыць, ён енчыць, а нам аглядацца не даюць на таго хлопчыка. Пайшлі, а яно чутно — як хлопчык енчыць той...

Чуствую я, што вот-вот партызанскія курані. А немцы ж не знаюць...

І вот лартызаны ўгледзелі з кураней, што гэта... А яны нас першых гналі. Едуць немцы на конях, а нас наперадзе — жанок з дваццаць яшчэ было засталося, а чалавек дванаццаць застрэлілі.

І тады гэтыя партызаны сталі страляць па тых немцах. Дык мы пападалі ды паўзём к кураням. А немцы таксама пападалі, і іх дваіх тады забілі, немцаў, на Рудніцкім балоце.

Прыпаўзлі мы ўжо к партызанскім кураням, і так ужо засталіся мы жывыя...

Пытанне: — Аяк ваш хлопчык той, малы?

— Хлопчык мой, бедны, памёр, не вытрываў...

Пытанне: — А сям'я ў вас якая цяпер?

— Цяперашні мой муж перад вайной пайшоў у кадравую, аставіў жонку, матку і сына, а прышоў — ужо не застаў нічога. І мы з ім пабраліся, пажаніліся сіротамі. І займелі шэсць сваіх дзяцей. Дзеці ўжо нашы павучыліся, самаму меншаму вот ужо трынаццаць гадоў. Усе дзеці ўжо, слава богу, жывыя: тры дочкі і тры сыны. Двое ў Бабруйску, адна работае за эканаміста па связі, а адзін, гэта, кончыў лесатэхнікум у Бабруйску, а адна дзеўка ў Пінску, на трэцім курсе педвучылішча. А хлопец у арміі адзін.

Кончыў адзінаццаць класаў. Адна ў дзесятым класе, а самы меншы — у пятым.

Пытанне: — А першы ваш муж быў таксама мясцовы?

— Мясцовы. Зайцаў. Гэта цяпер я Мініч. Яго брат брыгадзірам у нас. Дружылі мы, я тры гады з ім дружыла. Я сагласна была ўмесце... Я ж і прасіла таго партызанскага ўрача, каб ён нас з мужам разам атравіў... І ваабшчэ я такая душэўная: гінуць, дык умесце гінуць...

Ручнік яшчэ ўсё ляжыць на каленях. Ды слёз ужо няма...

Закончыўшы сваю аповесць, Вольга Андрэеўна маўчыць. І мы маўчым.

І ў гэтым маўчанні яна схамянулася:

«...Божа, божа, яшчэ ж адно забылася я!.. Такое праісшэсцвіе было, што я проста на сябе віну бяру. І гэта тады яшчэ, у першую блакіроўку, у сорак другім. Яй-богу, і крлькі я жыцьму, я буду столькі віну на сабе імець!..

Адна жанчына — у яе пляменнік быў у партызанах, а меншыя хлопчыкі, яго брацікі, дома. Калі яны сталі нам, немцы, гранаты кідаць у хаты, дык гэтая жанчына і свае дзевачкі, і гэтых хлопчыкаў... Выскачыла з хаты і крычыць:

— Дзеткі, бяжыце куды вочы глядзяць!..

Гэтыя дзевачкі, большанькія яны, дык яны пабяжалі за мацерою, а тыя хлопчыкі, меншанькія ўдвох, — па колькі ім было годзікаў, не прадстаўляю, — дык яны прабеглі трохі з цёткай ды ўжо і не ведаюць, куды яна пайшла...

Я цягла мужыка, ужо вечарам гэта, і, вы знаеце, што вот так, метраў трыццаць, яны ад мяне ішлі назад, за рукі пабраліся хлопчыкі, ішлі назад у сяло. І чаму мне розуму не было — яй-богу, ну, проста непрасціцельна! Чаму мне было не сказаць: «Дзеткі, вяртайцеся назад!» Мне неяк на вум... Проста я расцерана была. А патом ужо, назаўтра, я апомнілася. І вот на сягоння, вот, дзе пабачу двое дзетак роўных, дык абязацельна я напамяну тых дзяцей. І я вот на сябе віну бяру: чаму я іх не вярнула, тых дзетак... І пайшлі яны, і так ніхто не знае, дзе яны дзеліся. Ці яны іх таксама, немцы, у агонь пакідалі?..»

Гэта праўда — душэўны вы, Вольга Андрэеўна, чалавек!

І як ні добра, як ні ладна жывецца вам сёння — не забыцца ніколі пра тое ўсё, што было.

І тыя хлопчыкі маленькія, пабраўшыся за ручкі, будуць ісці ды ісці па снезе... Крывавым снезе вашай памяці.

Цяпер — . ужо не толькі вашай...

## Я ТАКСАМА З ВОГНЕННАЙ...

Успаміны людзей, якія тут прагучалі і будуць зноў і зноў гучаць, мы збіралі чатыры гады. А збіраць паехалі амаль тры дзесяцігоддзі пасля саміх падзей.

Што ж яны такое — гэтыя людскія ўспаміны, расказы, запісаныя на магнітафонную стужку, калі мінула ўжо столькі часу? Наколькі гэта дакумент? І які гэта дакумент?

Мы не баімся самі задаць такое пытанне, бо нам, хто бачыў, чуў усіх гэтых людзей, вельмі розных і ў той жа час у нечым вельмі падобных, нам адказ вядомы.

Так, гэта дакумент. Псіхалагічны, сацыяльны. І не толькі дакумент таго, як сёння, у 70-я гады, народ памятае ваенныя Хатыні, аднак і надзвычай важкі дакумент аб праўдзе саміх падзей. Хоць і прайшло з тых часоў больш за чвэртку стагоддзя.

Праўда гэтых расказаў перш за ўсё псіхалагічная. Што і як было з ім самім, як адчуваў, успрымаў, бачыў тое ён сам — чалавек помніць настолькі дакладна, што праўда гэтая не толькі пераконвае цябе, але гучыць часам проста невыносна. Настолькі зблізку глядзіць памяць на тыя жудасныя падзеі і набліжае да цябе іх так раптоўна, адразу, такім «буйным планам», што сам ты робішся нібы сведкам — не слухачом ці «гледачом», а сведкам падзеі...

«Я не з гэтай, але таксама з вогненнай...» — пачулі мы на Віцебшчыне, у Шумілінскім раёне.

Жанчына гаварыла пра вёску, але ж і пра памяць: *вогненная!*

Псіхалагічная праўдзівасць гэтых расказаў — немалая гарантыя і ўсякай іншай дакладнасці, фактычнай таксама. Тут магчымы, вядома, і памылкі, правалы памяці (калі што адбывалася, прозвішчы людзей, паслядоўнасць падзей). У такіх выпадках мы стараліся ўдакладняць расказы.

Былыя партызаны расказалі нам, як на шашы Магілёў — Бабруйск была знішчана група карнікаў. Частка тых самых эсэсаўцаў, што забілі ў Борках тысячу восемсот мірных жыхароў.

**Ананіч Аляксей Андрэевіч.**

«...Было іх так чалавек шэсцьдзесят. Эсэсаўцы. Але што характэрна — характэрна было тое, што калі мы бралі іх штыкі, то яны былі ў крыві. Гэта была адна з груп, што ўчаствавалі ў Борках».

**Ананіч Іван Сяргеевіч.**

«...Возьмем іх вешчмяшок, дык там дзіцячае барахло было. Дажа вынімалі іх гэтыя фінкі, дык у крыві былі. Яны людзей прыразалі і кідалі ў агонь».

На магнітнай стужцы засталіся нашы настойлівыя (можа, нават і занадта настойлівыя) пытанні: як яно ўсё-такі было, як адбывалася? Эсэсаўцаў было шэсцьдзесят, партызан — сто з нечым, ды з засады — можна было знішчыць фашыстаў, нават

нікога не страціўшы. Аднаго толькі партызана паранілі. Але ж, як мы даведаліся пазней, той бой пачаўся не зусім удала.

Ананіч Іван Сяргеевіч.

«...Не даехалі машыны метраў пяцьсот — некаторыя нашы сталі патроны заганяць у патроннікі. І нячаянна адзін партызан выстраліў. Немцы пачулі выстрал. Яны спешыліся, шафёр адкрыў дзвёрку і паціхонечку ехаў. А немцы куветам ідуць...»

Пры такіх акалічнасцях ды такі бяскроўны для партызан бой? Ці не легенда гэта трохі? Шчыра кажучы, мы засумняваліся, што ўсё тут дакладна:

— А колькі іх было ўсіх?

— Іх, гавораць, чалавек шэсцьдзесят было.

— Усіх пабілі?

— Усіх.

— А машын колькі?

— Тры, здаецца.

— І адзін толькі ранены ў вас?

— Так. У нас адзін ранены быў толькі.

— А яны, мабыць, не ўсе па гэтай дарозе пайшлі, бо Боркі вельмі ж вялікія і немцаў больш прыязджала?

— Так, можа, на Магілёў пашлі часць. А мы ляжалі ў сторану Бабруйска.

Потым, распытаўшы добра яшчэ людзей, мы ўпэўніліся, што так і было: сапраўды, надзіва ўдала правёў бой Аркадзь Анцюх, які камандаваў партызанскай ротай. Усё так і адбывалася, як расказваюць Ананічы Аляксей і Іван.

Працягвае расказ Іван Сяргеевіч.

«...Аддае загад: зрабіць не простую засаду, а трымаць сапраўдны франтальны бой. Агню ў нас, мы адчуваем, хопіць — мы рашылі прыняць бой. Для гэтага мы размясцілі ўзводы буквай «Г». А самаму правафланговаму ўзводу камандзір даў каманду: як толькі завяжацца бой, перасякаць шашу і — цэп'ю, для таго каб лягчэй было расправіцца...

Ну, завязаўся бой. Адтуль нашы ўжо сталі перабягаць, каб абкружыць, але — тут біў кулямётчык нямецкі. Я перабег у канаву, дзе немцы, і пакуль падбеглі нашы — развярнуўся і ўбіў кулямётчыка і другога номера таксама, і тут жа, у гэты момант, і мне ў нагу ўдарыла... Я сеў, пакуль мяне перавязалі, прайшло пяць мінут, і бой, аперацыя была закончана. Рабята падбеглі і змялі іх, буквальна за пяць мінут...»

Вядома, так дапытвацца пра ўсе абставіны, «муштраваць» (хай яны нам даруюць!) мы маглі па-сяброўску толькі хлопцаў-партызан. Удакладняць расказы жанчын ці старых, што прайшлі праз усе жахі, не станеш вось такім «адкрытым спосабам». Тут ужо мы стараліся апытаць як мага больш людзей, спецыяльна звяртаючы іх увагу на той ці іншы факт (дату, колькасць ахвяр, прозвішчы,

паслядоўнасць падзей і г. д.), шукалі матэрыялы ў мясцовых музеях, глядзелі дакументы ў райкомах і райвыканкомах, звярталіся да дакументальных кніг і спецыяльных прац.

Але гэта — што датычыцца «знешніх фактаў». А пра тое, што чалавек сам перажыў, адчуў, што ён рабіў і што з ім нелюдзі выраблялі, — пра тое вам Тэкля Круглова ці Вольга Мініч так і такое раскажуць, што іх успамінамі можна удакладняць многае. І ўжо не ў маштабах вёскі, ці раёна, ці нават Беларусі. Цэламу свету маюць што сказаць яны — гэтыя жанчыны.

Жывуць сярод іншых, сённяшніх людзей — таксама сённяшнія, тыя, каго мы шукалі, ездзячы з вобласці ў вобласць, з раёна ў раён, з вёскі ў вёску... Па спісах абкомаўскіх, аблвыканкомаўскіх, потым — па райкомаўскіх і райвыканкомаўскіх, а далей — па жывым ланцужку чалавечай памяці: назваў чалавек факт, прозвішча, вёску — едзем туды, а там — новы ланцужок да іншых фактаў і людзей, якія, можа, нідзе, ні ў якіх паперах і не абазначаны. Ланцужок гэты вядзе да ўсё новых і новых людзей, успамінаў, трагедый чалавечага болю і жорсткасці нелюдзяў, адразу перакідаючы цябе, а разам з тым і сонца, і вуліцу з дзіцячымі тварыкамі і галасамі, і дамы, і лес, і дарогу — туды, за тры дзесяцігоддзі назад.

Вось спыніўся наш «газік» сярод пясчанай, нейкай занадта шырокай вуліцы. Пасля пажараў і ад пасляваеннага бязлюддзя ўзнікла такая «прасторная» планіроўка.

Трэба распачынаць гаворку з жанчынамі, што па-нядзельнаму сядзяць каля старых, яшчэ даваенных, бяроз. Тут, вядома, і дзеці круцяцца, хоць і не вельмі многа іх сёння ў вёсках.

Па-рознаму ў розных умовах пачынаем размову — найчасцей адразу з тлумачэння, хто мы і чаго ездзім.

— Ой, успамінаць гэта ці лёгка!

— Яшчэ адзін толькі раз раскажыце, — пераконваеш чалавека, як прабачэння просіш, — мы запішам, надрукуецца гэта, хай людзі ведаюць...

Але часам адцягваем такую размову надалей, бо самім хочацца звычайнай, сённяшняй гутаркі, каб і сонца сённяшняе заставалася, і смех, і галасы дзіцячыя не знікалі...

Пачынаеш з іншага, здалёк:

— Гэта — Пагулянка? І цяпер так вёска ваша называецца? Мабыць, вясёлыя людзі былі дзяды і бабкі, што так назвалі.

— А чаму ж! А мы хіба сумныя?

Ну вось, мы нечакана самі сабе ўскладнілі задачу. Цяпер паспрабуй перайсці да таго.

— У вайну ў вас тут...

І жанчыны, быццам і тону не мяняючы, гучна — пра тое, што «было, а як жа, хапіла ўсім!». Але ўжо некалькі твараў як бы аддзяліліся ад астатніх. Гэта заўважаеш адразу. Найперш вочы бачыш — спыненыя на нечым там, у мінулым...

Жыве чалавек, як усе, у многіх і сем'і новыя, і дзяцей часамі шмат — але ўжо другіх, таксама «новых». Не, неабавязкова твары, вочы гэтыя будуць сумныя ці строгія (хоць такіх большасць). На некаторых блукае нейкая незразумелая ўсмешка. Якой сам чалавек, здаецца, і не адчувае. Не, чалавек зусім нармальны. Ненармальна тое, што ён ведае, што памятае гэты чалавек, штб памятаюць людзі з вогненных вёсак.

**Эмілію Карлаўну Партасёнак** мы спачатку не засталі дома. І суседзі дапамагалі — не знайшлі. «Толькі што была ў нас, а куды пабегла — хіба, можа, у той канец!» Хлопцы, што гулялі са старымі аўтамабільнымі шынамі, аўтарытэтна растлумачылі:

— Бабка Аміля дома не сядзіць!

А калі, вяртаючыся з другой вёскі, мы зноў завярнулі ў Засоўе — (гэта — на Лагойшчыне), Аміля Карлаўна ўжо чакала нас ля сваёй хаты.

Трохі збянтэжаная, з недаўменнем: каму і нашто яна так спатрэбілася, што і раз да яе заехалі, і паабяцалі (праз суседзяў) яшчэ раз спецыяльна прыехаць. Першае, што пачулі ад яе:

— Жыву адна, бо не магу, каб хто крыкнуў, каб стукнуў.

Не можа. Але не можа і без людзей, а таму і не сядзіцца ёй у ціхай хатцы.

«...Я як стану расказваць, дык уся калачуся...» (Смяецца.)

Нечаканы той смех бянтэжыць, нават, здаецца, палохае яе самую. Чорная маршчыністая рука, згорнутая ў кулачок, старэчыя вусны ўсміхаюцца. І кулак той і губы дрыжаць, як у малога дзіцяці. Што вось-вось закрычыць ад болю, ад крыўды...

«...дык уся калачуся... »

У Літвічах немцы прыехалі маладзёж браць у Германію, а партызаны падпаўзлі і сталі там іх ужо біць... А яны зноў у нядзелю раненька прыехалі ў Літвічы. А ўжо тады прыехалі к нам у дванаццаць часоў. Тады ўжо загадалі яны... У нас быў Жаваранак, староста, мясцовы. Як партызаны падойдуць, дык ён збіраў ім, што нада, а як немцы падойдуць, дык ён і немцам таксама. Ну, яны загадалі старасту гэтаму, каб сабраў яйца... Ну, людзі ж баяцца моцна... Я тожа адна была з дзвюма дзевачкамі сваімі, дык тожа баялася. Я і з хаты не пайшла. Моцна іх, гэтых немцаў, баялася. (Смяецца.)

Яны хадзілі там па хатах. І к нам прыходзілі. Мае былі дзяўчаты невялікія. На гэтым месцы брат мой дваюрадны жыў, дык я пайшла к яму. Пытаюся, што будзе, можа, у Германію будуць браць. Дзяўчаты мае... Адной ужо шаснаццаць было. Дык ён кажа:

— Нас не будуць браць нікога. Тут з нашага Засоўя няма нікога ні ў партызанах, ні ў паліцыі, нідзе...

Ну, я пашла дамоў і лягла з гэтымі сваімі дзяўчаткамі спаць. Назаўтра я адну пабудзіла. Выпусціць карову. А там, дзе мая цётка жыла, я сеяла бульбу, там быў мой прыўсадзебны ўчастак. Там быў на ўчастку паграбок такі выкапан і будачка, зямлёй абсыпаная. Дык я кажу дочцы, каб ішла к карове, а я пабягу картошкі вазьму. Узяла пасудзінку нейкую... (Смяецца.) Ажно яны стаяць там, ля цёткі маёй, пяць чалавек. Адна жанчына падышла к ім, папыталася нешта. А я потым падышла да яе і ціханька кажу:

— Вікця, што яны табе сказалі?

— Я, — кажа яна, — пыталася, ці можна выгнаць карову ў поле, дык яны сказалі, што толькі на выган.

Я тады скоранька ўзяла ды бегам, ды бегам каля іх. А яны мне нічога не сказалі. Прышла я к цётцы ў хату. Дык яна кажа, што, можа, паб'юць, бо ў Літвічах людзей білі, хлопчык адзін казаў. Гэта ўжо сродсценнік яе. На печы ляжыць, з Літвіч прыбег. Уцёк. Ён і карову вёў сюды. Дык і карову забілі. Тады, як сталі там біць людзей. Я тады скоранька ў той паграбок — нагарну картошкі і пабягу к дзяцём. Адну ж пабудзіла, а другая спіць...

Толькі я стала вылазіць... А быў мой брат дваюрадны, у цёткі жыў: там у іх голад быў на Украіне, дык ён сюды пераехаў. Дык ён ідзе і кажа пахахлацку:

— Аміля, што-та там страляюць. Дык я кажу:

— Лезь сюды, схавайся...

Там у яе пограбе перагародка такая. Ён туды ў гэты катушок залез, а я гэтак во прысела. Паграбок глыбокі, а ў мяне кажух быў доўгі. Але босая я. Дык я во так прысела і сяджу. Ля дзверцаў сяджу. Ціханька. Тады віжу я, што суседняя жэншчына нешта гаманіць. Прыадчыніла я дзверцы і кажу яму:

— Гайдучыха, мусіць, просіцца, каб у Германію...

У яе было адзінаццаць душ сям'і, а яе гоняць у хату біць...

Я сяджу каля дзверцаў, а ён тамака, у катусе. І кашляе. Дык я кажу:

— Не кашляй, сядзі ціханька.

А як ты ў зямлі сядзіш, дык у хаце такі глухі выстрал. Чую — у цёткі маей два разы выстралілі... А ён усё на мяне:

— Глядзі, што там робіцца.

Бачу — два немцы ідуць з гары — Жаваранак там жыў, дык мы ўсё звалі Жаваранкава гара. З гары той ідуць сюды. Калі ў цёткі выстралілі два разы, дык тады я чую — дух-дух — ідуць па двары. Адзін падышоў, дзверцы гэтыя адчыніў. Я яго і цяпер віжу...»

І зноў пасміхаецца старая жанчына, закрываючыся маленькім, як у дзіцяці, але чорным ад старасці кулаком. Быццам няёмка ёй за ўсё, што з ёю было. І за ўсіх. За тое, што так

недарэчна хавалася, так поўзала і нічога не разумела, а незнаёмыя людзі, што аднекуль прыехалі, бегалі, шукалі яе, каб забіць...

«Няхай бы ён мяне забіў...

Дзяржыць ён вінтоўку ў руках, а я гэтак сяджу. Паглядзеў на мяне, а я на яго... Дык ён прычыніў гэтыя дзверцы і пайшоў.

А я ўсё сяджу. А той хлопец усё:

— Глядзі, што робіцца!

Дык я адчыню, паслухаю, пагляджу... А потым бачу, што ўжо крайняя хата гарыць, дык і кажу:

— Ай, браток, ужо ж гэта немцы людзей б'юць, ужо Сцяпана Грамовіча хата гарыць.

Тады ўжо і я к яму ў гэты катушок перакацілася, ужо каля дзвярэй не сядзела. Хату спалілі, а сарай астаўся, а проціў сарая — наш гэты паграбок. Тады другі ўжо ўскочыў у паграбок. Але ўжо ён нас не бачыць — бо ўжо мяне няма, я ўжо перакацілася ў катушок. Запяяў ён сам сабе пад нос, выскачыў і падпаліў той сарай. Як загарэўся ж гэты сарай — бо цёпла, суха, — дык сталі на нашым пагрэбніку дошчачкі ды лапачкі гарэць, якім ён быў абстаўлены. Полымя і пакацілася па дошках. Я б сама, дык я б там згарэла са страху, а ён усё ж ужо мужчына (с м я е ц ц а), дык ён на мяне кажа:

— Аміля, давай уцякаць!

Ускочыў, ужо дзверцы гараць... А там стаяла ў нас бочка з буракамі, наскобленымі на квас, дык я ўзяла пасудзінку, каб лінуць на дзверцы ды вылезці... Але абгарэлі мы — і нашы рукі, і твар абгарэў — і яго, і мой... Выскачылі мы за сарай, а сарай той ужо згарэў.

Паляжалі мы ў бульбе, што была пасаджана. А ён кажа:

— Мы тут відны...

Пятухі пяюць, каровы, каторыя пазаставаліся, равуць, зязюлька на дубе — тут дуб стаяў — кукуець...

Ну, мы тады папаўзлі паўзком па балоце.

Сусед гэта дзевачку вынес... Па ёй два разы стралялі і толькі хустку пабілі, а яна засталася, за печкай схавалася. Яны дымам выскачылі, як гарэла. А тады яны нас увідзелі, нас пазвалі. І мы гэтак разам сядзелі там.

Пытанне: — А дзевачкі вашы?

— Адну спалілі. Як пакінула я яе сплючы, так і забілі ў хаце. А гэтая сядзела на выгане ля каровы. Дык па гэтай стралялі, але не папалі. Там быў зруб, зрублены на хату, дык яна там пад зруб падкацілася.

Немцы як звечара прышлі, дык яны ў людзей начавалі. Пісары там былі, пісалі. Пераначавалі, а раненька, з сонца ўсходам, пачалі людзей заганяць і біць...»

Так, ёсць, мабыць, пачуцці, перажыванні, калі звычайныя праяўленні іх (плакаць ці смяяцца) робяцца нібы неадпаведнымі. Другіх жа, «адпаведных», прырода чалавеку, можа, і не дала. Не ведала маці-

прырода, з чым сустрэнуцца некалі яе найразумнейшыя дзеці...

На некаторых зробленых намі фота жанчын — такая вось нечаканая ўсмешка. Яе разумееш, толькі ўбачыўшы не на здымку, а на жывым твары, калі чуеш голас чалавека. І тады нават як быццам пагаджаешся з ёю: чалавек, які перажыў, на свае вочы бачыў такое, мае права на словы і вывады, ад якіх няхай сабе нават і холадна робіцца.

«...Немцы ішлі да нас так — адна партыя з Капцэвіч, а другая вунь з таго канца. А мы на вуліцы былі. На вуліцы нас і пабралі, пагналі вунь туды, у канец сяла. І там стаяў такі на калёсцах... Я не ведаю, што гэта. Мы думалі, што нас будуць расстрэльваць. А яны — за нас, групамі заганялі ў сараі, у хаты. Я папала ў другую групу. Адна я была і са мною залвіца мая. Дзеўка. Дык яе ў першую групу загналі, паранілі ў ха-це, яна выпаўзла і ў калодзеж упала. А можа, яе ўкінулі туды? Я не ведаю. А я ў сарай папала, а потым Павел адбіў дзверы, і мы ўцяклі. Гарэлі ўсе, і сарай той гарэў. Сталі ўцякаць, а янынас давай біць. Мы шасцёх уцякалі: Лукашэвічыха старая — Сяргеева маці, Веры Такалінай маці разам са мною ўцякала з сарая, цётка Дар'я ўцякала... Тых пабілі, а мы ўтрох асталіся. Я за такую во копачку забегла і села. Шаптала тая копачка — так стралялі па ёй. І я засталася жывая. Я з дваццатага года сама, а дзеці мае былі тады ў лесе, двое дзяцей было ў мяне. Не разумела я яшчэ, думала: хаты ў нас харошыя, новыя, дык буду прасіць, каб яны іх не палілі. Бо пагаворвалі, што паліць будуць, але ж ніхто не думаў, што людзей будуць паліць ды расстрэльваць...

Як я падняла з-за капы сваю галаву, дык яны стралялі, але я пабегла, а потым убачыла, што за капой сядзіць Ева Горбань. Вось яна (паказвае на суседку). Я хацела ўзяць яе, а яна кажа: «У мяне няма ног». Я яе і кінула. Мне ж не шкада было нічога, я і дзяцей сваіх не шкадавала, кінула, я і сама сябе не шкадавала. Не ведаю, хто іх, маіх дзяцей, пабраў. Сама пабегла ў лес».

Гэта і гэтак гаварыла нам **Вера Цімафееўна Какора** ў вёсцы Вялікія Сялюцічы Петрыкаўскага раёна.

А мо яна нагаворвала на самую сябе? І дзяцей, бачыш, «не шкадавала», і «сама сябе не шкадавала», і суседзяў.

Можна спытацца: а навошта гэта чалавеку — так на самога сябе нагаворваць?

Насуперак логіцы быццам бы.

Але ж ці многа (мог бы спытаць такі чалавек) «логікі» ў цэлым свеце? Дзе такое рабілася, дзе такое магчыма. Вось і гаворыць, сапраўды не шкадуючы ні сябе, ні тых, хто будзе слухаць. І тады расказ чалавека гучыць жорсткім выклікам: можаце жахацца, можаце абурацца! Свет вунь які, дык не патрабуйце і ад мяне!..

Людзі, якія такое перажылі і якія сёння жывуць сярод нас, — гэтыя з ліку наймацнейшых.

Большасць адразу ці праз нядоўгі пасля вайны час адышла ад нас — услед за болем сваім, услед за дзецьмі, бацькамі, што так жудасна загінулі.

А гэтыя ўсё трымаюцца ў жыцці: адных трымае новая сям'я, новыя дзеці, праца, старэчыя клопаты каля ўнукаў; другіх, адзінокіх, трымае ў жыцці, магчыма, якраз памяць пра страчанае, бо чалавек супраціўляецца, не хоча, каб самае дарагое знікла канчаткова — разам з ім. Бо і мёртвы для чалавека таксама часам яшчэ раз памірае. «Яшчэ больш» памірае — ужо канчаткова. Нават мёртвае дзіця сваё маці будзе ратаваць (калі трэба, ахвяруючы сабой) ад другой, ад новай смерці — вось як **Марыя Фёдараўна Кот** з вёскі Вялікія Прусы на Капыльшчыне:

«...Схапіла меншую, ёй было дзевяць год... Гарыць і на ёй плацце, і на мне гарыць... Замчала ў тую яму, дзе там глінабітку рабілі, палажыла... І зноў жа лезу па тым агні — па большую... Хай то пабілі — дык яшчэ і згараць! Пацягнула, падняла. Дык яно такое маладое, мяккае!..»

Маці схавала застрэленых дзяцей у яму. А потым яшчэ раз, жыццём рызыкуючы, вярнулася да дзяцей. І кажа нам пра гэта, *пра забітых:*

— Прыпаўзла да ямы. Ці *жывыя,* ці не паелі свінні?..

Так, чалавек можа жыць дзеля адной памяці: каб у ёй і дзеці яго жылі — забітыя, спаленыя. Можа, таму многія і жывуць — сілай любові чалавечай, мацярынскай: тая памяць, якая іх спальвае, яна ж іх і трымае на свеце.

Людзі з вогненных вёсак — як і ўсе, могуць быць заклапочаны і пенсіяй, і тым, што ўнучка не паступіла ў інстытут, і шыфер ім патрэбен, і сена для каровы. І нам, ездзячы, слухаючы, запісваючы, трэба было прымаць самы практычны ўдзел у гэтых іх клопатах. Бо, на жаль, не ўсе і не ўсюды яшчэ разумеюць, што да гэтых людзей адносіны павінны быць — ну, хоць бы такія ж, як да ветэранаў ці інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны.

Аднак жа там, дзе праходзіць балючая мяжа іх памяці, там усе клопаты і практычныя інтарэсы знікаюць. За той мяжой клопат адзін: каб сказаць адну толькі праўду, каб людзі ведалі яе. Нават здзіўляешся, наколькі шчыра чалавек можа гаварыць, расказваць *усё* — і тое, што, здавалася б, гучыць яму не на карысць...

Многія расказы не проста праўдзівыя, а нават палохаюць сваёй бязлітаснай праўдай. Ужо і хочацца міжволі, каб яе менш было. Але ж чалавек гаворыць, сапраўды не шкадуючы самога сябе.

«...Мая адна дочка была ў Германіі, забралі маю дочку, а адна дома была. Ну, дык ён прыйшоў, мой хазяін, і

дачка прышла з лесу, і трое дзетак прывезлі яшчэ. Дык я кажу:

— Анупрэй, ты ведаеш што, бяры ты гэтыя дзеці ды ідзіце ў лес назад.

— Эх ты, такую-растакую, будзеш хавацца мне ўсё!..

Не слухае, не слухае мяне мой дарагэнькі! Тады ж не было ні пасцілак, ні коўдраў, дык я кажу яму, што давай у дзяругу дзіця ды пойдзем у лес. І зноў ён лаецца. А тут ужо немцы ідуць. Дык я яму і гавару:

— Хваробу мы цяпер з табою ўцячом. Хаця цяпер ты ўжо вядзі маю гэтую доньку!

А яна харошая была, ужо сем класаў кончыла.

— Дзе вунь людзі ўцякаюць — там і ты! Ён, праўды, — за яе.

І пайшлі яны. А цяпер — адкуль ужо немцы ўзяліся! — абнялі нас кругом. От табе ты і ўцёк!.. Паліцэйскі гукае яго. Ён вярнууся, дык яны яго тут у дварэ і застрэлілі. Ён ідзе гэтак во ў двор, а я крычу:

— А божа мой! А куды ж ты? А ўцякаў бы ты, дык трасцу б яны ў цябе папалі.

Сама сабе ўжо, не на яго. Спачатку яго, а потым маю доньку, дык я — ох! Няхай жа яны мяне ў плечы, а не ў вочы!.. Два хлопчыкі: аднаму чатыры гады, а другому шэсць. Яны бягуць за мной. А ўжо немец... Гэта бабы, каторыя потым расказвалі: «За табою, Парася, беглі!..»

А яны мяне, немцы, во і так, пуля тая во і так, госпадзі родненькі, ужо паранілі мяне, дык ляціць кроў... І як я віляла тады! І хто мне даў бегчы не прама, а ўсё віляю, віляю!.. І не ўбілі. Там у нас далей копанка, дык я ў тую копанку ўпала. Дык яны, паразіты, туды і не пашлі. А я ў гразі ляжу. А яны думалі, што ўжо ўбілі. А я потым устала мокрая і пайшла. Пайшла ды кажу: «Божа мой, божа, дзе ж мае сынкі?» А ў мяне яшчэ тры хлопцы, дык гэты старэйшы тавар пасвіў, а меншыя — свіней. Дык я ім казала, як яшчэ жывыя былі ўсе: «Ганіце, дзеткі, а то немцы пабяруць. І парасяты паб'юць і свінню». Дык яны ўжо і пагналі. І прышла я да іх. А я ж не ведала, дзе тыя дзеці ў лесе. Але прывяло мяне — во! Яны сядзяць у лесе пад купінкамі, панакрываліся, як я прышла.

— Во, сынкі мае родныя, да ўбілі ж і бацьку, да ўбілі ж і Любку, да ўбілі ж і Ваньку, да і Кольку ўбілі!

Дык яны:

— Ой, мамка, добра хоць, што ты жывая. Аднаму было восем, другому было дзесяць, а трэцяму, што цяпер у яго цагляны дом, васемнаццаць было. Ну, добра. А потым ужо і было... Э-э-эх, каб гэта ўсё расказаў, дык гасподзь мілы!..

Мне ўжо семдзесят другі год. Калі па хазяіну, то **Параска Іванаўна Луцкая,** а як па бацьку, то Скакун».

Было гэта ў вёсцы Першамайск Рэчыцкага раёна.

Старая, хворая, з прастрэленым на тым полі тварам жанчына кончыла расказваць і зноў скардзіцца на непаслухмянага мужа, што вось так загінуў, на тое, што аж да Масквы немец дайшоў, на нявестку і сына, якія яе папракаюць, што жыве ў гэтай старой хатцы адна і не хоча да іх перайсці. І ўсё гэта гаворыцца з такой усмешкай на аднавокім твары (вока выцекла ад ранення) і такім голасам, такімі словамі, што міжволі ўяўляецца: «Ну вось, я бегла, на ўсё, на ўсіх забыўшыся ад жаху, а нікуды ж не ўцякла, усё яно працягваецца — ва мне! Дагнала старасць, даганяе смерць...»

Новыя, іншыя твары, імёны, галасы, лёсы. І раптам зноў — тая ж горыч на самым дне расказу. Ужо новая сям'я ў чалавека, дзеці, іх найчасцей роўна столькі ж, колькі забілі, і ўсё ёсць, што патрэбна жывому, але раптам пасля расказу вырвецца: «Засталася я, а навошта? Пасля таго?..»

Тыя, што ў Іспаніях, у Аргенцінах хаваліся, а цяпер у Заходняй Германіі жывуць як дабрачынныя «дзелавыя людзі» і «любячыя бацькі сем'яў» — вунь як крыўдліва яны (і іх абаронцы) упэўнены ў сваім праве не толькі на жыццё, на «тэрмін даўнасці», але і ў сваім «абавязку» прысутнічаць сярод новых пакаленняў.

А гэтыя, іх ахвяры, ахвяры нялюдскай жорсткасці, людзі з вогненнай памяццю, нясуць у сабе — таму што яны людзі! — праклятыя пытанні, якія мучылі ўсіх вялікіх пакутнікаў за чалавека і чалавецтва: ад Дантэ і Шэкспіра да Талстога і Дастаеўскага.

Дык што памятае і што можа памятаць чалавек праз столькі год?

Надзіва многа і надзіва, аказваецца, падрабязна — калі гэта датычыцца *такіх* падзей. Былі б толькі словы — перадаць перажытае. Але і словы ёсць, знахо-дзяцца, асабліва ў жанчын. У мужчын, як правіла, словы не так дакладна прылягаюць да балючай памяці. Але таксама не ва ўсіх, аб чым сведчыць расказ **Івана Максімавіча Савіцкага**[6].

Карнікі ўварваліся ў вёску Збышын Кіраўскага раёна, а малады партызан Савіцкі якраз з лесу прыйшоў, трэба было наведацца да сястры. Зброю ён схаваў на ўзлеску. Кінуўся ў хлеў на гарышча і адтуль назірае, бачыць. І вось што помніць, як запомніў чалавек:

«І мне цераз франтон відна, што цераз рэчку бягуць дзве жанчыны. А вось так перада мной сарай стаяў. І там стаіць станкавы кулямёт, і яны цераз рэчку страляюць у гэтых бягушчых жанчын. І вось уяўляеце! Мне вось гэты сектар з-за дошак франтона відзён, дзе бягуць жанчыны, а далей за дошкай не відна. А выскачыць яны павінны вось тут — там зноў мне відна. Там я іх зноў убачу. І калі жанчыны вось тут з-за

[6] Гл. раздзел «Збышын».

дошкі не выскачылі, я зразумеў, што забілі, што ў Збышыне б'юць людзей...»

Ці тое месца з расказу Івана Савіцкага, як чалавек стаіць у запаленым будынку і не можа адразу выскачыць, бо забойцы нёдзе блізка, стаіць у самай сярэдзіне і трывае, пакуль можна, і сам здзіўлены, што трывае:

«Ну, знаеце, калі свечка гарыць, дык па краях жарка, а ўсярэдзіне — не. Гарыць хлеў кругом мяне, а я стаю. І калі мне ўжо не можна было стаяць, мяне пекчы пачало, я і палез пад сцяну...»

Часамі, асабліва калі жанчын слухаеш, пачынае здавацца: вось толькі што чалавек *адтулы* Вырваўся і прыбег да людзей і гаворыць, гаворыць пра тое, як і што было з ім, у яго вёсцы, і сам здзіўлены, амаль не верыць, што жывы. І што яно сапраўды было, ужо быццам не верыць, бо вось тут усё па-ранейшаму, а яму ж здалося, што ўсюды, што ўжо назаўсёды — *гэта, так.* («Думала, ужо ўсіх забіваюць, на ўсёй зямлі...»)

**Домна Васільеўна Шчамялёва**[7] расказала нам, што калі яна знайшла сына сярод трупаў (жывога, параненага), цягнула на спіне тры ці больш кіламетраў у лес, дык пасля таго хадзіла, жыла, не выпрастаўшыся. Доўга, некалькі год спіна такой заставалася. Быццам усё яшчэ несла жанчына на сабе жудасны цяжар таго дня...

Дык не дзіва, што такое не дазваляе і памяці чалавечай выпрастацца да канца, скінуць усё з сябе. Не можа так чалавек. Бо ён — чалавек.

Спачатку некаторыя самі не вераць, што ўсё памятаюць, што так блізка яно. «Ой, хлопчыкі, аж калі было гэта!..» Але скажа слова, другое, кране, дакранецца, і раптам такія падрабязнасці ўспомніць, на такія вострыя вуглы памяці пачне натыкацца... І разумееш, што чалавек помніў усё і заўсёды, але ёсць памяць, дакранацца да якой боязна, балюча.

А быў жа некалі першы расказ пра гэта — самы балючы. Калі толькі чалавек вырваўся з пекла, прыбег да людзей ці яны яго выхапілі з рук катаў, смерці.

І вось здаецца, і вельмі часта, што і мы слухаем — іменна той расказ, самы першы. Столькі там першага пачуцця, першай слязы, першых, самых праўдзівых, слоў.

Некаторыя спачатку і надоўга анямелі.

Як кажа **Макрына Кавальчук** з Княжаводцаў Мастоўскага раёна: «Я тады, можа, пяць дзён не піла і не ела... Усё пабілі, усё папалілі, нават і вароны не каркалі. Такі быў страх...»

А потым (а хто і адразу) расказвалі людзям. І як тады, упершыню і першым людзям, расказалі, так яно, мабыць, і трымаецца, запісалася ў памяці. У памяці самога расказчыка, на вогненнай «стужцы памяці» ягонай. Так здарылася, што некаторых людзей

[7] Гл. раздзел «Трыццаты».

(у Борках Кіраўскіх, у Вялікай Гарожы і Брыцалавічах Асіповіцкага раёна) аднаму з нас запісваць давялося двойчы. Чатыры гады прайшло, а здавалася, што слухаеш — як на магнітную стужку запісанае. І інтанацыя, і дэталі, і словы — усё амаль тое ж. І разам з тым — па пачуццю, непасрэднасці — як упершыню расказанае. Найчасцей, за некалькімі выключэннямі — так. Адзіны на ўсё жыццё расказ, але кожны раз гучыць ён, як упершыню, — бо праз такі боль прарываецца, праз такую пакуту душы!..

Адчуваецца, што некаторыя многа раз расказвалі суседзям, можа, дзецям (новым дзецям — пра іх забітых сястрычак, брацікаў). Але тут прыехалі да іх незнаёмыя людзі здалёку, з рознымі апаратамі, і просяць успомніць усё і як мага больш падрабязна, а суседзі таксама тут, слухаюць, што не раз ужо чулі ці нават самі на свае вочы бачылі: і дапоўняць, і напомняць...

І тады бывае, што ўключаецца як бы яшчэ адна «секцыя» чалавечай памяці: пра тыя ночы без сну, калі ты зноў і зноў гэта ўяўляў, бачыў, успамінаў — усё да найменшай драбніцы.

...Як суседка, бачачы немцаў, што акружылі вёску, і пачуўшы крык: «І нас паб'юць!» — раптам сказала свайму васьмігадоваму хлопчыку: «Сынок мой, сынок, што ж ты ў гэтую разіну абуўся. Твае ж дужа будуць ножкі доўга гарэць. У разіне».

**(Анастасся Касперава.** Боркі Кіраўскага раёна.)

...Ці як людзі сядзелі, схаваўшыся ў жыце, а забойцы бегалі, шукалі іх, а каскі звінелі аб каласы... **(Пётр Малашчанка.** Лозкі Калінкавіцкага раёна.)

...Ці як, перастраляўшы суседнюю блізкую вёску, карнікі схаваліся ад дажджу, стаўшы пад страху, стаяць каля сцен хаты, а ў хаце той — людзі, і чуюць, як цвёрда каскі немцаў стукаюць аб сцены...

**(Алена Жарчанка.** Рудня Расонскага раёна.)

...Як думалася сярод забітых, як баяліся тыя, якіх куля абмінула: «Снег на забітых не тае, а на мне — тае. Заўважаць!..» Або: «Пачаў я дрыжэць ад холаду і ду-маю: убачаць!..»

Памяць зноў і зноў выцягвае са сваёй глыбіні тое, што здзівіла чалавека нечаканасцю, жудаснай неадпа-веднасцю абставінам.

Еве Тумаковай з вёскі Красніца Быхаўскага раёна вельмі ж запомнілася, як яна, тады падлетак яшчэ, убачыўшы, зразумела, што забіваюць усіх падрад: «...У дом ускочыла расцераная, панімаеце. Але мыслі такія... Яшчэ жыць думалася. Ляжаў вузялок адзёжы, дык думаю: «Вазьму я хоць вузялок, спаляць жа, дык пераадзецца нечага, я ж у адной адзёжы». А тады думаю: «Яшчэ

засмяюцца, скажуць: убіваюць, а яна вузёл какой-та!»

І сёння помніць, як дзіўна тады паводзілася, як дзіўна думалася. Кожную думку аб уласнай думцы памятае.

Пачуўшы ў вёсцы Курын на Акцябршчыне мімаходзь сказанае, што дзяўчаты, ідучы, ратуючыся ад смерці, неслі з сабой вялікае люстэрка і глядзеліся ў яго (дзяўчаты ж, па семнаццаць гадкоў!), мы яшчэ раз спыталіся пра гэта: «Так і было — з люстэркам уцякалі?»

«Вы пра тое люстэрка пытаеце? Ага, эта калі спалілі Хвойню, дык нашы людзі ўсе выехалі ў лес. Пабылі да вечара ў лесе, і — холадна. Я кажу:

— Хадземце, дзеўкі, дадому, нічога не будзе!

Нас трох было. Ну, ішлі мы ўжо дарогаю, узялі ж у лесе вялікае люстра — бо гэта ж дзеўкі, ыам не трэба, каб чаго-небудзь там набраць, а ў люстра ж паглядзецца... Ну, мы ішлі, на горцы пасталі, дык ужо расказвалі падводчыкі, што немцы бачылі, як мы глядзеліся ў люстра».

**(Матруна Грынкевіч.** Курын Акцябрскага раёна.)

Такое чалавек памятае і не можа не запомніць назаўсёды. Бо гэта было за крок да смерці, калі ўсё набывае асаблівы маштаб і асаблівы сэнс.

Фашызм, яго рэальнае аблічча, рэальнасць яго «планаў» такая, што прырода чалавечая «адварочвае свае вочы» ад усяго гэтага. Жудасць такая, што людзі раптам... засыналі. (Тое, што называюць «замежавым тармажэннем». Псіхіка чалавека, ратуючыся ад зрыву, ад вар'яцтва, адключаецца.)

Пра той раптоўны сон нам столькі разоў казалі, расказвал і столькі люд зей...

«...Ну, мы ўсе папаўзлі па картошцы... Мужчыны, ужо на фронце былі каторыя, панімаюць, гавораць:

— Ну, гэта ўжо ўбіваюць.

Чутна, што выстралы, а патом далі гудкі. Мужчыны гавораць:

— Ну вот, сяйчас будуць паліць дзярэўню.

Пытанне: — А вы ў жыце?

— А мы ў жыце сядзім.

Пытанне:— У жыце яны не шукалі? З хаты ў хату хадзілі?

— Не, не шукалі. З хаты ў хату. Можа, бліжэй дзе шукалі, а нас — ніхто. Толькі было такое цяжолае... страх, спаць хацелася. Ну, кагда ўжо запалілі...

Пытанне:

— Спаць хацелася?

— Ну, ад страху. Так вот ад страху спаць хацелася! Знаеце, на нас вецер ішоў, гэты дым, панімаеце, гэтакая мятная... Людзі ж гарэлі, запах цяжолы быў».

**(Ева Тумакова.** Красніца Быхаўскага раёна.)

Прырода «заплюшчвае вочы» — чалавек раптоўна засынае. Часта ў самы небяспечны момант.

«...Расказаць вам, як гэта ўсё пачыналася? — перапытвае жыхарка вёскі Алексічы Хойніцкага раёна **Антаніна Лазараўна Касабуцька.** — Ну вот, я жала на селішчы. Я ячменю жала, а жыта стаяла, і там пабі-лі дванаццаць душ. А як сталі яны людзей тых біць, дык я во так легла ніц і заснула. Я не чула, як іх білі, не чула ані піску, ані крыку. А далей ужо, як паднялася я — уго! — ужо мая хата ўпала, ужо і суседскія. Усё трашчыць, і свінні пішчаць, і ўвесь тавар пішчыць, раве тутака ў суседскім двара. Дык я ўстала і стаю, а суседка ідзе і кажа:

— Чаго ты тут стаіш? У нас жа ўсіх пабілі.

А я думаю: божа, хай бы ж і мяне ўбілі, навошта ж я тут засталася!»

Такое здаралася з жанчынамі, з мужчынамі. І самі яны расказваюць пра тое — са здзіўленнем. І са спалохам нават.

Дзіцячая ж псіхіка, прырода яшчэ хутчэй адварочваліся ад такой рэальнасці. І тут нечаканы, раптоўны сон быў часта ратункам — ужо ў простым, у фізічным сэнсе. Сон хаваў дзяцей ад забойцаў. І некаторых — выратаваў.

«...Прыязджае на кані той, каторы дабіваў. Відзіць, што чалавек жывы, — дабівае. Я вочы прыадкрыла і ціхонька гляджу на яго.

Пытанне: — А дзеці?

— А дзеці мае не варушацца, спяць. Заснулі». **(Соф'я Скірманд.** Збышын Кіраўскага раёна.)

«...Калі так, дзве хаты засталося да нас — яны падходзяць, бачым: расчынілі дзверы і выстралілі раз. Там адна старушка была. І кінулі дзверы адкрытымі. А там ужэ паследняя хата. У тую, а тады ўжэ — і к нам. Там, гэта, стараста жыў. У той хаце. Яны ішлі туды, дык ён вышаў, а ў яго мо чалавек дваццаць у хаце. Ён думаў, спросяць што ды і пойдуць. І вышла яго старая, таго чалавека, і дзевачка — ён, той стараста, не паганы быў, яго заставілі быць старастам. Ён не хацеў, а заставілі. Ні тое ні сёе, ні туда ні сюда быў. Ну, і яны яго так за варатнік — да ў дзверы. І за тую старую, за дзіця — і пачалі з аўтамата біць там ужо. А нам ужо няма дзе дзецца, мы ўжо расцяраліся. У мяне чатыры душы. І саседскіх дзяцей пяцера было ў хаце ў мяне. Куды ж дзецца. Яны хацелі сюды во схавацца, пад падлогай, а я гавару:

— Уцякайма, бо прыдуць і яны нас ці запаляць, ці паб'юць. Бяжым, няхай страляюць, ды і ўсё.

Дык мы кінуліся на могілкі, дзеці тыя і мы. Мы пападалі — там яма была. Трое дзяцей уздоўж дарогі бы к Раманаўцы пабеглі, а двое ўпалі: вецер з хвоі зламаў шчытка, дык яны залезлі ў той верх. Ды і пазасыналі там. А мы ў той яме былі. Бачым, што стаяць немцы ўвакруг могілак. Паднящца нам няма як: яны ходзяць і гамоняць, чутно. Ну, не ўстаём. Ужэ яны і пайшлі адсюль, а нам удае, што стаяць там. Спяць дзеці...»

**(Улляна Казак.** Казіміраўка Мазырскага раёна.)

Вось так псіхіка чалавечая ратавалася ад вар'яцтва (і часам ратавала дзяцей ад смерці). І паказвала, што адбываецца нешта такое, на што прырода чалавечая «не разлічана», «не запраграмавана».

Нягледзячы на ўвесь мінулы вопыт, які пакінулі чалавеку і чалавецтву тамерланы і чынгісханы ўсіх вякоў і народаў.

Калі так памятаюць, такія дакладнасці — верыш у праўдзівасць усяго. Сядзіць жанчына — трывожны, запытальны, гатовы да пакуты твар, погляд — як у бальніцы перад сур'ёзнай аперацыяй. Тут не да прыдумак!..

Некаторыя расказваюць з такой гатоўнасцю, быц-цам яны тут чакалі гэтага ўсе тры дзесяцігоддзі — каб вось так некаму, хто ад далёкіх людзей прыехаў, паскардзіцца, усяму свету паведаміць, што тут рабілі з імі.

**(Акуліна Панкратаўна Габрусь.** Казулічы Кіраўскага раёна.)

«...Ну, у мяне была дзеўка, два гадкі, на руцэ, во тут во. Праўда, у мяне дакумент быў, узяла я дакумент. Ну, гналі, прыгналі. Я думаю, божа ж мой, дзе ж мая сям'я? Толькі адна дзевачка ў мяне на руцэ. Прыгналі. Хто гаворыць, што будуць у бежанцы гнаць, а хто гаворыць, што будуць біць, а хто яго ведае! Я думаю, куды мне, божа мой? Потым пагналі людзей па шляху. А суседка ідзе ды гаворыць:

— Ат, Куліна, пайшлі, куды людзі, туды і мы! Дайшлі мы толькі да крупадзёркі, з-за хаткі выходзім, і немцы выносяць тыя вясы. Дык я гавару:

— Ну, маладзічка, нам ужо бог даў.

А нам было слышна, што ў Люціне загналі ў мельніцу і спалілі людзей. Я гавару:

— Ну, Аўгіння, нам ужо бог даў. Яна гаворыць:

— Ага, ужо.

Ну, іх абнялі кругом, адзін паўз аднаго стаялі — кругом! І пальцам не прасадзіш — ад шляху і да шляху, кругом гэтага будынка. А людзей поўны ж двор. І вот іх пруць у гэтыя дзверы, душаць, гоняць у етыя дзверы, а там — у крупадзёрку. А ў мяне дзевачка на руках во тут во. І ў мяне дакумент. Я як зірнула — ужо мама там і тата. Етых людзей ужо так душаць, так б'юць! Адзін тут стаў прасіцца, дык яго — прыкладамі. На штысе і паперлі туды. Гэта мужчына быў. Мала-ды папаўся. А я з етай дзевачкай. Азірнулася во гэтак назад — мама стаіць мая.

— Мамка, — гавару, — ужо ўсё наша!

Я яе цалую, дык яна як лёд. А тата ўжо далей трошка. А ўжэ... А тут адна, знаеш, жанчына — дзве дзевачкі і яна. Яны к немцу аднаму, папрасіліся — ён пусціў. Гэта во, Улляніха. Прапусціў. Тады я зірк — божа мой, трэба было і мне з мамайісці! І мне ўжо цёмна

ўваччу стала, я нічога не бачу. Толькі бачу цень чалавека, каторы ўжо пусціў етых. Дык я падышла ды: «Пан!» — во гэтак перахрысцілася, а тады ета мая дзевачка — у мяне во тут дакумент быў, я і забылася на яго — ета маё дзіця выцягла гэты дакумент. «А божа ж мой, дык гэта ж у мяне дакумент!» Я ж ужо забылася...»

За нішто маглі забіць цэлую вёску. Бо мардавалі — лішне не разбіраючы, хто там які, ёсць у яго іхні «аўсвайс» ці няма. І раптам жанчына паказвае нейкую там палерку, і тая ратуе ёй і дзіцяці жыццё... Выпадковасць, якая толькі падкрэслівае, наколькі ўсе іхнія «прычыны» і «абгрунтаванні» злачынстваў прыдумваліся на хаду, не вельмі каб і стаpанна.

Пытанне: — Колькі вашай дзевачцы было?

— Два гады.

Пытанне: — Яна сама ўзяла гэтую паперку?

—Ну, яна гэтак во... Я яе дзяржала, я на яе забылася, ужо мне цёмна было ўваччу, нічога, толькі бачу, як цень чалавека ідзе. Я — яму, а ён, праўда:

— Матка, туды!

Я перабегла на гэты бок, упала. Упала з гэтай дзевачкай. Потым прыпаднялася. І ідуць наперадзе — адзін шарэнак[8], другі шарэнак. Думаю — усё роўна — тыя пусцілі, етыя заб'юць. Не. Не кранулі. Тут даходжу толькі да гэтага, да шляху, ідзе чалавек. Нясе дакументы, збегаў і ўжо дакумент гэты ўзяў, і жонка, і двое дзетак. Клуначкі яшчэ адзежы нясуць. Я думаю: «Госпадзі, куды ж вы, людцы!» Думаю, скажу — другія ж прайшлі і не сказалі ім, — думаю, скажу, дык і мяне заб'юць. Іх ужо як давялі, дык убілі там...»

Забілі, хоць таксама «дакумент» меў чалавек. Які ўжо тут дакумент, калі дзейнічае «план»!

«Я як азірнулася: «Э-э, ужо дым!» Толькі пулямётам, чутна была: тр-тр-тр! Як пхалі там, так адразу і білі. А тады ўжо і запалілі. А гэтага немец вёў, што з дакументам, каб жа не немец, дык я б сказала, што забіваюць.

Тры гады яно мо ў мяне з воч не сходзіла, стаяла ўваччу і стаяла...»

І цяпер яно не «сходзіць з воч» у Акуліны Панкратаўны — тое, як забівалі Казулічы — яе родных, суседзяў.

Знайшлі мы і тую жанчыну, пра якую гаварыла Акуліна Панкратаўна — **Дрозд Улляну Пракопаўну.** Яна таксама на свае вочы бачыла ўсю жудасць расправы над жыхарамі Казуліч.

«...Ну, мы ўжо сталі... Усіх акалацілі, толькі адны хаты асталіся. Бацька і маці мае і дзве сястры меншых. Яны к шляху, а я асталася і яшчэ свіней двое і дзве каровы панакрывала саломай. І сабака на цапе. Яны падышлі:

— Авек, авек, авек!

[8] Шарэнга.

Я сабралася і пайшла к шляху. Выходжу — усе стаяць се-ем'ямі! І плачуць. Стаяць навыцяжку і плачуць...

І павялі нас. Дзе вот гэтае кладбішча, тут стаяла мельніца, крупадзёрка, жыў мельнік. Так старая хата яго была, а так новая. Ну, вот туды заходзяць:

— Заварачвайце направа!

Заварачваем. Мельніцу расчынілі на дзве палавінкі, і ля дзвярэй стаяць вясэ мельнічныя.

— Захадзіце, вынасеце вясэ! Нямецкая адзежа, а па-руску гавораць:

— Захадзіце! Ніхто ж не ідзе.

— Захадзіце!

Ніхто не ідзе ў гэту мельніцу. Яны — такія плёткі разінавыя, цераз руку во гэтакі рамень — і гэтай плёткай цераз галаву, цераз галаву! У раду ішлі сем'ямі, дык вот так мужчыны пазакрываліся. Кінулі біць. Кінулі, крупадзёрку гэту расчынілі — а крупадзёрка на дзве палавіны, шырокія дзверы, завал быў. Яны адкрылі гэтыя дзве палавінкі дзвярэй:

— Ану-ка, захадзіце сюда!

Ну, хто ідзе, хто не. Яны самі зайшлі:

— Ану-ка, захадзіце, захадзіце!

— Авек, авек! — немцы. А гэтыя па-руску:

— Захадзіце, захадзіце!

Людзей і ўпіхнулі ў гэтыя дзверы. У гэтую крупадзёрку. А я, значыць, — стаіць у нямецкай адзежы — я кажу:

— Пусціце мяне, — і нейкая ў мяне была справачка. У Любонічах давалі. Я гавару: — Пан, пусціце мяне.

Паглядзеў на гэту... паперку, за руку мяне, цераз шлях перавёў мяне:

— Садзіся і сядзі тут, — па-руску. — Сядзі, пакуль я не прыду, не ўцякай нікуда. Еслі пабяжыш — уб'юць цябе.

Ну, што будзе, то будзе. Я села і сяджу. А мама мая дый кажа:

— На хусту і хлеб ужо, у бежанцы сабірайся.

Два кускі сала з сабой яна ўзяла, дзве булкі хлеба — гэта ж трое дзяцей ужо і самі ўдваіх, — думалі ж, што пагоняць у бежанцы. Я махнула: «Не нада!»

Пытанне: — А маці ваша дзе?

— У крупадзёрцы ўжо. Дык думае, што хоць, можа, мне спатрэбіцца. Хоць мне.

Пытанне: — Яна вам гэта перадае?

— Мне не далі ўзяць, не пусцілі мяне к ёй, а яе ка мне. Ну, я махнула: «Мама, не нада. Мне, гавару, хваціць дома».

Пытанне: — З мамай хто яшчэ з вашых быў?

—Дзве дзеўкі меншых, мае сёстры. Ну, немцы за людзей — у крупадзёрку, зачынілі гэтым завалам. А я сяджу, ногі спусціла вось гэтак у канаву і сяджу. Так, як во цяперака на лаве. Падходзіць гэты самы, што мяне перавёў цераз шлях. А яны бегаюць, бегаюць, каністрамі — жах-жах-жах, паабліваалі каністрамі. А гэты самы падходзіць да мяне:

— Сабірайся — шагам марш!

І шляхам, кажа, паўзбок, толькі не бяжы, будуць страляць, гэта, кажа, не па табе. Так ён. Ну, я і пайшла. Іду, што будзе, то будзе! Іду, іду, а там чалавек ідзе: яго пусцілі дамоў, каб дакументы гэтыя ўзяць, і двое дзяцей з ім. Немец павёў іх, тых людзей, тога чалавека з жонкай і з сям'ёй. А я пайшла і пайшла. Прыходжу на шлях сюды, а тут стаіць гэты часавы. А гэтыя ўжо стаяць, а машыны так равуць, так равуць усе. Падходзіць мая сястра (ёй цяпер семдзесят два гады):

— А дзе тата з мамай?

А іх ужо, пакуль я адышла, запалілі, гарыць ужо крупадзёрка. Кажу: — Вот, ужэ гараць!

«Гэ-э-э!» — паднялі людзі крык.

Пытанне: — Усе гэтыя людзі? Каторыя засталіся?

— Ага. — Я гавару: — Ціхаце... Падскаквае адзін ды па-руску:

— Успакойцеся, а то і вам ета будзе!

Праўда, сці-іхлі ўсе, як вады ў рот набралі! Змоўклі. Падбягае Канавалаў гэты самы — той, што ў крас-нўю суботу быў...

Пытанне: — Яго тады партызаны пераняли так-сама?

— Пераняли і ранілі, а нехта казюліцкія яго ў уборную захавалі. А праз ноч на жарабку завезлі ў Кіраўск.

Пытанне: — Ён быў начальнік паліцыі?

— Начальнік самы галоўны, етай кіраўскай, ну, там. Атрадам ужо іхнім камандаваў. Ну, дык ён падходзіць:

— Ну што — ету сторану на вугаль зжэгці, а ета старана пусць стаіць!

П ы т а н н е: — На вёску паказвае?

— На вёску. Етыя немцы ўжо як беглі, а сюды вецярок, як беглі па захлеўю, па захлеўю — цераз адну, цераз адну запалілі. Гэта ўжо і гарыць усё. «А вы, кажа, расхадзіцеся». Усе тады і пабеглі, і я пабегла. Пытанне: — У вас многа людзей засталося?

— Наша дзярэўня бальная была. Трыста васемнаццаць ужо спалілі з малымі, ну а яшчэ вёска вялікая.

Я прыбегла, яшчэ выгнала карову, цялёнка і двое свіней выгнала. Стаяла вядро, міска і лыжак сем, — я за ета, на руку і пайшла з хаты. А так у хаце ўсё згарэла. Ну, пайшла, села на вуліцу і сяджу ўжо. Немцы па шляху едуць — усё ўзад-уперад, узад-уперад. Некаторыя пахаваліся, а я сяджу, думаю — адна смерць, калі я ўжо адтуль ушла!.. Усё згарэла, назаўтра прыду і на двор яшчэ не магу зайсці. Як гляну — не магу, паверыце! Тады адкрыла пограб, зірнула на гэту адзежу, татава, маміна ляжыць... Я, вы паверыце, абамлела ў тым пограбе. Ну, і што пражыла... А забыцца не забылася. Тады сніцца гэтая мая сястра, самая меншая, яна такая кудлатая была! Хадзіла ў другі клас. Дык я кажу:

— Вот, Алена...

Знаю, што яна спалена. А яна мне:

— Ох, Улляна, да балела ж мая галава, пад палена хавала галаву, так прыпякло ўжо цяпло!..

Прыснілася. І пад палена яна хавала сваю галаву. Так у сне яна мне гаворыць...»

Вогненная памяць, вогненныя сны... Пра сны свае, ваенныя, пасляваенныя, нам расказвалі многія. Бо ў снах тых — працяг іхніх пакут. Зноў і зноў, як самую рэальнасць, перажываюць людзі ўсё тое — разам з загінуўшымі і як бы за іх ужо.

Нават «калектыўныя» бывалі сны ў людзей — пасля таго агульнага жаху. І такія, што людзі ў лесе, пагаварыўшы, перагаварыўшыся раніцой, раптам беглі на свае папялішчы — настолькі рэальным загадам былі для іх начныя, у сне, уяўленні пра пакуты родных, блізкіх...

Мы — каля вёскі Лазавой у Асіповіцкім раёне. Некалькі жанчын каля сянажнай ямы, даведаўшыся, хто і чаго прыехаў, гавораць з намі, перабіваючы адна адну: і пра ўчарашняе ўсё, і, яшчэ больш, пра клопаты сённяшнія. І адно з другім сплецена: жыццё ў чалаве-ка адно і памяць таксама адна. Як на дрэве: раней чым дойдзе сок ад каранёў да самай апошняй, наймаладзейшай галінкі, павінен ён прайсці праз увесь ствол. А гэтыя жанчыны яшчэ і досыць маладыя, моцныя, таму і сённяшнія клопаты для іх маюць значэнне большае, чым для тых, для многіх, каго старасць «адсадзіла ўбок». Людзі, што жывуць усімі практычнымі справамі, інтарэсамі. І вось яны нам — пра сны. Пра свае, такія рэальныя, сны. Бо сама ж рэальнасць, рэчаіснасць тады выглядала жудасным сном, кашмарам. Адно пераходзіла ў другое, невядома дзе канчаючыся...

«...Мы былі ў лесе, — гаворыць **Вольга Рыгораўна Грышановіч,** — ну і прышлі з лесу, калі нашых спалілі. Паглядзелі, сабралі попел: дзеці ляжаць — здаецца, жывое. Возьмеш — папялок рассыплецца. У адной хаце мы сабралі ўсіх. Дзевяць цаброў — адны беленькія костачкі. А ў другой — там ужо была гара. І кроў — відна была, іх, мусіць, білі. Таму што яны ў кучы, і кроў была. Па куточках былі, пад печам. Цераз год адзін дзед... Яму прыснілася жонка: «Чаму ты мяне не пахаваеш? — кажа яна ў сне. — Я ж пад печам, у мухаморы». Ну, ён нікому не сказаў, доджадж ідзе, ён ціхонька гэту печ раскідае. Прыходзім, кажам:

— Дзедушка, што ты робіш?

— А мне, — кажа, — Алеся прыснілася: «Што ты мяне не пахаваеш, я ўжо цэлы год ляжу пад гэтым печам, а ты мяне не пахаваеш».

Праўда, ён раскідаў гэту печ, а там костачкі, галёнкі, толькі костачкі асталіся.

Пытанне: — А як прозвішчагэтага дзеда?

— Пракаповіч Віктар. А яго жонка звалася Алеся. Ну, мы пазбіралі гэтыя костачкі і зноў закапалі... А так, як

гэтых хавалі, прыдзем у лес, нагалосімся ў лесе, зноў на папялішча прыбяжым — прысніласяя нам: «Што вы нас не пахавалі?..» Станем гэтую цэглу разломваць... Колькі раз прыбягалі. Раскапаем, нойдзем, апяць гэту магілку прыкопваем. Зноў пойдзем у лес, ляжам: які там сон! Але зноў сняцца: «Вы нас...» Што ўсіх не пахавалі. Зноў прыдзем і станем гэтую цэглу разломваць, шукаць... Ну, так і асталіся. А як палілі — ніхто не знае. Ні адной душы ў нас не ўцякло. Вот ужо у суседняй дзярэўне, у Лозку, там у Германію адбіралі. А ў нас такія былі жанчыны маладыя — ні адной душы не пакінулі. Там, дык з дзецьмі каторыя, тых палілі, а маладых — у Германію.

Пытанне: — А яны потым, немцы, паставілі тут гарнізон?

— Гэта потым было. А калі палілі, мы хаваліся ў балоце. Трое сутак сядзелі. Узлезем на сасну, глядзім: ніхто ні печы не паліць, ні вады не цягаюць. Ну, мы рашылі, што забралі, можа, і пагналі ў гарнізон. Тады — сонейка заходзіла — мы гаворым:

— Давай пабяжым, паглядзім, што робіцца... Пытанне: — Колькі тут загінула?

— Сто пяцьдзесят чалавек нашых толькі. А тут, кажуць, прыгналі з Лочына трыццаць чалавек. І тых, што ў лесе лавілі, тожа ў агонь кідалі.

Ну, што ж, асталіся па сягонняшні дзень. З усёй вёскі засталіся: вот нас трох, яна са сваімі дзецямі і яшчэ адна жанчына з дзецямі асталася — тры сям'і...»

...Трэба памяняць у магнітафоне стужку, спыніць расказ, і баішся: а ці зможа чалавек, ці хопіць у яго сілы вярнуцца зноў *туды*. Бо і здаралася, што пасля такога перапынку чалавек ужо не мог па-ранейшаму поўна, дакладна расказваць. Але часцей было такое адчуванне, што ты магнітафонную стужку спыніў, а ён «спыніў» сваю. І што сапраўды ўсё гэта ў ім «запісана». Адзін раз і назаўсёды. Адзін на ўсё ж.ыццё расказ. І знікне ён толькі разам з жыццём, з памяццю чалавека. Сапраўды бачыш — калі так многа, як мы, праслухаеш гэтых людзей, — што гэта незвычайная паўната, дакладнасць — агульная асаблівасць «вогненнай памяці». *Такое* чалавек не можа расцярушыць, пагубляць па дарозе жыцця — нават і праз тры дзесяцігоддзі, нават калі б і захацеў...

Аднак праяўляецца гэта агульная памяць па-рознаму. Ужо ў залежнасці ад чалавечай індывідуальнасці. Што ні чалавек — то і расказ.

Сярод усіх вылучым пакуль што два тыпы, вобразы расказчыкаў, а дакладней — расказчыц, бо жаночыя ўспаміны — найбольш эмацыянальныя, вобразна дакладныя.

Пра адзін тып расказчыц мы ўжо гаварылі — пра тых, што і гавораць, і глядзяць, і нават пры гэтым усміхаюцца неяк дзіўна спакойна, расказваюць нечакана «эпічна». З непрывычкі і пакуль зразумееш, што

за гэтым схавана, заціснута — робіцца нават страшнавата. Не да месца пявучы голас (Барбара Слесарчук з Івацэвіцкіх Бабровіч) ці гучна бясстрасны (Ева Тумакова з Быхаўскай Красніцы) перашкаджае спачатку нават адчуваць, разумець, пра што чалавек расказвае.

Затое, калі нарэшце дойдзе да цябе праўда і гэтага спакою, і гэтай бясстраснасці, і гэтай дзіўнай усмешкі, яшчэ больш невыноснай і жудаснай робіцца праўда самой падзеі, самога факта.

«…Праз вуліцу пераходжу, — расказвае жыхарка Красніцы **Ева Тумакова,** а ў вачах яе, на шырокім твары яе — запытанне, як бы неразуменне: што ж гэта было, ці праўда, што было? — гляджу, ляжыць сродсцвеннік, дваццаць трэцяга года раджэння, і ляжыць, і ў яго кішкі вывернуліся… Ну ўсё, жывот яму парвала, усё… І ён гаворыць:

— Ева, дай мне вады. Я гавару:

— Ай, Ігнат, дзе я табе вазьму вады, усё ж пагарэла.

— А вы ўсе жывы?

— Убілі маю мацъ, абрат і бацька асталіся жывы… А вашых?

— Надзю, гаворыць, убілі, а Касціян папоўз уяр…»

Нейкае раздваенне з чалавекам і ў чалавеку адбываецца: сам расказвае і сам як бы пытаецца: ці было з ім гэта, ці праўда, ці магло быць? А калі праўда, дык што ж гэта і як можна, каб такое было?..

І гэтае раздваенне відаць не толькі на твары, у вачах, у інтанацыі, у голасе (гучна-бясстрасным), але і на словы кладзецца. І словы, а не толькі інтанацыя, быццам ужо «не тыя», «не пра тое». Гарыць усё, б'юць людзей, забіваюць, можна ўявіць, які жах, крык над вуліцай, а чалавек расказвае, што ён не пабег, не папоўз, не кінуўся ў жыта, а «пайшоў» («пайшлі і селі ў жыта»). Ці тая ж размова дзяўчынкі (Еве Тумаковай было тады трынаццаць год) з цяжка параненым сваяком. Быццам і сапраўды так: «Ай, Ігнат, дзе я табе вазьму вады…» — быццам гэта звычайная гутарка дзяўчынкі з хлопцам сярод вясковай вуліцы, у звычайны, а не ў той дзень.

Побач з вобразамі такіх расказчыц, пасля такіх расказаў, паўстае з ліку многіх'і зусім іншы. У той жа Красніцы, у тым жа красніцкім клубе запісвалі мы **Ніну Міхайлаўну Князеву.**

Падышла, прысела да стала прыгожая жанчына, зусім яшчэ маладая, і загаварыла ціха, амаль шэптам. Не, не ад няёмкасці ці сарамлівасці перад суседзямі, што сядзяць каля сцяны, ці перад намі, незнаёмымі людзьмі, сцішыла яна так голас, а таму што кожнае слова для яе — боль, пакута. Не *тая,* не *там* пакута, а вось тут, цяпер.

Жыццё для яе не падзелена рэзка на дзве палавіны: тое, што было, што ў яе

памяці, — працягваецца. Та-кая гэта натура, істота. І з такой рэальнай вастрынёй усё ў ёй працягваецца, што любая жыццёвая няўдача, крыўда (муж кінуў — сказала і пра гэта) б'е па тым жа пякучым месцы. Такі чалавек усё, нават дробязі, перажывае ўтрая... А на кранутым куляй твары — прыгледзьцеся! — колькі душэўнай мяккасці ў гэтых вачах, у гэтых дзіцячых губах, душэўнай напоўненасці, чалавечай красы.

Кожным словам свайго расказу яна нібы дакранаецца да ўсё таго ж пякучага, жывога болю — і сцішвае міжволі голас да шэпту. Быццам заціскае ў сабе той боль. І голас ужо зусім прападае — толькі ціхі, бязгучны плач... Ціхая жаночая краса, ціхі голас, ціхія слёзы, а здаецца, што стаіць тут той немагчымы крык...

«...Ну што я знаю. Знаю толькі, як у нашу хату заганялі людзей. Як білі Красніцу, мы стаялі на вуліцы. Тут дзярэўня была, а мы жылі туды пад нізінку — на пасёлку. Мы стаялі, сабраўшы, глядзелі, што тут ужо дым. І дождаліся, што саседні, што саседзей ужо... І падходзіць да нас...

— У хату!

Загналі ў хату. Нас было тры сям'і. Наша сям'я — сем душ...

Пытанне: — Вы стаялі і бачылі, як ужо суседзяў забіваюць?

— Ну, усё, саседзей ужо, вокны б'юць і гранаты брасаюць... А мы яшчэ ля свайго дома стаім. Мама, ацец і я. Ацец быў бальны, толькі што прышоў з аперацыі. На вайну яго не ўзялі. Ну, стаялі, дастоя- лісь — прыходзіць:

— У хату!

Загналі нас. Ну, а ў хату прышлі — што дзелаць? Адзін за аднаго сталі хавацца. Мама кружыцца, тут і ўсе за ёй — ніхто нікуда. Ну, а яны стаялі.

— Так, доўга з вамі чыкацца? Лажыцеся! Толькі ніц. Лажысь!

Ну, мы — хто куды! Мама хацела пад печ — тута бацька крыкнуў:

— Згарыш жывая!

Яна сяйчас — на печ. Ну, і мы — скок, скок за ёй на печ — сем чалавек. Ну, і баба была наша гэта. Яна ўзлезла ўжэ на печ і загарадзіла нас усіх, лягла з краю. Ну, яны пачалі біць: зразу на палу хто ляжаў. Бацька на палу там, дзед, брат, там яшчэ адна жэншчына з дзіцёначкам пад койку залезла. Тых пабілі: я ўсё гляджу, як яны ўсё гэта б'юць. Я ўсё бачу. Ну, тады і мне — я ж у тое ўрэмя і ранета — зразу мне папала сюды во, у ліцо, у адну, во ў другую выскачыла.

Пытанне: — І вы бачылі таго, што страляў?

— Я ўсё глядзела, пака яны на палу пабілі. Тады ўжо — да мяне! Ну, тут мне папала ўжо, я прылягла. І брат мой меншы за мяне — тут ля коміна прытулёўшы — яго не раніла. А матка — первая, дык яна так во лягла, за комін галаву. І ёй — як білі, ляцела — галаву, гэта, абчапала ёй мясам. Ну, і білі на печ усё. Тую старушку пасеклі — яна ўсё жыва. Матку ранілі, там

пабілі ўсіх... Сем чалавек, а мы толькі ўтрох — мама і я з братам сышлі потым з печы. Ну, тады ўжо разы тры — паб'юць і ўвойдуць: слухаюць, ці жыў хто. Яшчэ раз — пачуюць — б'юць. Вышлі трэці раз. Дыму ж надзелаюць! Вышлі, апяць уходзяць — слухаюць: ну, ужо ўсё, ніхто не дыша! Хто ўжо жыў — прытаіўся.

Пытанне: — І гаворацъ пра што-небудзь, калі заходзяць?

— Гаворацъ самі ціхонька, ці дыша хто, слухаюць. Ну, вышлі ўжо апошні раз, кажуць, што «капут». А мы ж чуем. Мы ўжо прытаіўшыся ляжым. Ну, што. Не чуць. Сяйчас хату запалілі. Там на паталку сена было, ці што — яно стала кідацца ўжо. Мама ўстае. Тут бітыя навярху ляжаць. Рвель ногі гэтыя! — яна пачула ўжо, што ў нагу папала — стала вырывацца.

— Ну, яшчэ раз папробую — калі вырвусь, то пойдзем, а не, то гарэць будзем.

Дык мы кажам:

— Мамачка, мы лучша гарэць будзем!..

Ды зразу з сябе ўсё здзяваць. Яна пракраціла нам раздзявацца, кажа:

— Не, падажджыце, можа, выйдзем.

Ну, і сталі выпаўзаць. Ну, мы выйшлі. Мама прайшла яшчэ.

— Хто жыў — за мной.

Ну, мы ўдваіх ідзём. Дзеці. А брату было восем гадоў, што лі. Ну, вышлі. Яна кажа:

— Хто жыў — за мной!

Мы вышлі, бачым, бацька вышаў. Ранены. Рука правая, і тут во ў шыю яму паранілі. Ну, выпаўзлі, жыта было ў нас на ўсадзьбе — па жыце. Мама ўжэ стала сазнанне цяраць: стала ад нас уцякаць. Дык мы па крыві найдзем... (Плача.)

Я не магу расказваць...

Яна жыць хацела яшчэ. І сазнанне цярала... Хаты гараць, сонца заходзе... У ляску хата адна асталася — дык ужо ў тую хату ўсе спаўзаліся, хто жывы.

Дык мама кажа:

— Ужо ідзіце, мо дзе калёскі якія, мяне завязіце. Пайшоў брат гэты меншы — ну, гэта ж дзяцёнак — пайшоў у тую хату, там і сеў. Пайшла я. Мне ўжо таксама не відна свету: я ж у ліцо ранета. Калёсак там няма. Мама згарэць хацела — падпаўзла да агню, а яе нехта аднёс. Аднёс на дарогу — ну, што ж, цяжка нес-ці — сама папаўзла. Пассоўвала каленкі, паўзучы. Ішоў Бікасаў Якаў (ён жывы цяпер) — ён яе нёс, да дарогі пранёс. Гэта з кіламетр будзе ад той хаты. А тады другі данёс, ну і сабраліся ў тую хату. Усе ранетыя. У каго быў род, тыя забралі сваіх. А ў мамы сёстры былі далёка: яны пакуль пачулі... Па лесе мы скіталі-ся. Тады ўжо калёскі нашлі: уцякаюць у лес, і мы яе на калёскі. А бацька ранеты цяжка, ён аставаўся адзін у тым доме. Ну, тут ужо гаворацъ, што немцы ідуць, танкі па лесе — дзявацца няма куды. Бягуць куды хто, у балота... Ну, мы пайшлі ўсе, а ён... Ён сам сабе смерць зрабіў... Трэба плакаць нам

зноў... Засталіся мы. Мама ж ранета, а яшчэ і пацаначка радзілася пас-ля таго. Сядзець некуды, я кажу:

— Мамачка, пойдзем у Вароўскае. Я ўжо дарогу запомніла.

Ноччу схадзіла раз і запомніла. Іх завяла ў Вароўскае. Толькі завяла, і ў тое ранне немцы ў Вароўскае прышлі. Ну, і нас выгналі. Выгналі ў бежанцы, гналі, а мы яшчэ ўцяклі. За Кузькавічамі, у лес. Паўцякалі. Жылі там з тыдзень, ці што. Акоп выкапалі. Ну, усё адно нас немцы палавілі ў лесе. І пагналі. Жылі мы ў Ямным — за Быхавам. А затым у Падклённі, а потым у бліндажах. І зімой. Пакуль і вайна закончылася...»

Голас расказчыцы — усё цішэйшы, а боль крычыць усё мацней...

## ТРЫЦЦАТЫ

«Канашы — вёска ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобласці, на беразе воз. Плаў. Цэнтр сельсавета і калгаса «Радзіма». 100 жыхароў, гаспадарак 34. Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

З вёскамі Малгаці (43 ж., гасп. 18) і Гарадок (67 ж., гасп. 19) фактычна ўтварае адзін населены пункт.

У Вял. Айч. вайну каля К. базіравалася 1-я Беларуская партыз. брыгада (камандзір М.П. Шмыроў). У час карнай аперацыі 1.5.1942 ням. фашысты расстралялі 30 жыхароў в. Гарадок, у в. Малгаці спалілі жывымі 69 жыхароў...

*В. І. Шчамялёў».*

У Канашы мы дабраліся познім ранкам 14 чэрвеня 1972 года. Пяты том Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, адкуль узята нататка пра гэтую вёску, тады яшчэ толькі друкаваўся.

Пра Канашы мы наогул упершыню пачулі ў той дзень у райвыканкоме і ведалі толькі, што там з расстраляных карнікамі жывы застаўся адзін чалавек, цяперашні старшыня сельсавета В. І. Шчамялёў.

У скупой нататцы, як цяпер нам вядома, напісанай для энцыклапедыі гэтым чалавекам, не сказана, што сярод трыццаці расстраляных трыццатым быў іменна ён сам, Васіль Іванавіч.

Ад Віцебска да Канашоў, цераз раённы цэнтр, — восемдзесят кіламетраў. Аднак у словах «мы

дабраліся» — няма перабольшання: на ўвазе маюцца апошнія кіламетры нізкай дарогі, лясной, палявой ды вясковай, страшэнна разбалочанай за некалькі дзён залішне шчодрых дажджоў.

На такой дарозе мы і сустрэлі патрэбнага нам старшыню сельсавета. Ехаў кудысьці на матацыкле.

І вось сядзім у яго кабінеце, быццам апусціўшыся ў светлую цішыню, пасля дажджоў зноў залітую сонцам. Цішыню гэтую яшчэ больш падкрэслівае час ад часу далёкі гул якога-небудзь наземнага або, яшчэ радзей, нябеснага матора. І не чуваць з альховых кустоў салаўінае песні, якая і тут нас сустрэла, быццам усё адна, тая самая ўсюды. Усё гэта цяпер за вокнамі, дзе млеюць у парнасці старыя сосны і густа буяе над балацінкай алешнік.

А ў нашай светлай цішыні нябачна зудзіць разгубленая аса і шархаціць на стале магнітафон.

**Васіль Іванавіч,** чарнявы, спаважны мужчына, расказвае.

«...Першага мая раненька акружылі нашу дзярэўню з гэтай стараны і адтуль, адкуль вы ехалі. Свабодны выхад быў нам тока ў возера. Двароў тады было больш: цяпер з Малгацямі семдзесят адзін, а тады было каля ста. А ў нас на ноч аставаліся начаваць партызаны. Правялі мітынг 30-га, а ноччу зняліся і пайшлі. Немцам была тут свабода. Усіх людзей сабралі там, дзе я вас сустрэў, дзе цяпер калгасны двор. Ну, а патом пачалі там расстрэльваць. Партызанскіх сямей, такіх людзей, каторыя былі звязаны з партызанамі. Пастроілі ў дзве шарэнгі і — кулямёты.

Пытанне: — А вы тады дзе былі?

— Стаялі каля плота. Усё на маіх вачах было. Адводзілі толькі ад нас і расстрэльвалі. А патом яшчэ аднаго дзядзьку ўзялі і расстралялі. І прыйшла вочарадзь да мяне. Ну, мне тады было яшчэ толькі трынаццаць лет. Прыходзіць адна жанчына, звязана была каторая з немцамі, і паказвае:

— Гэты імеець звязь з партызанамі. Ён мяне бярэ за варатнік і туды, дзе пабітыя. Немец, пераводчык дажа, але ў форме нямецкай. Таўкнуў мяне і ззаду вочарадзь з аўтамата па мне. Я ўпаў. Сначала я, канечна, не знаў, жыў я ці не — пакуль гэта нямножка прышло ў сазнанне. Папалі мне ўсе тры кулі во ў гэтае месца, у паясніцу. Пачуствеваў я, што ўродзе нічога, не больна, жыў яшчэ. А патом слышу, што пачалася ў мяне боль, паявілася. Нага не слышна стала. Паляжаў я так нямнога — ідзёць немец ззаду. Падышоў, кругом мяне абышоў, сагнуўся — чую — сапіць нада мною. Відаць, слухаў, жывы я ці не жывы. Паслухаў ён, а я, канечна, чакаў, што ён пачуе, што я жывы, і заб'е мяне. А ён, відаць, пасчытаў, што я ўжо забіты, і пайшоў далей. Далі каманду капаць яму.

Пытанне: — А вы чулі, што яны там гаварылі? — Тут жа радам, дзе мы

ляжалі, там і яму нам капалі. Капаць, канечне, заставілі нашых мужчын, сваіх. Маладыя ўсе былі ў партызанах або ў арміі. Адны старыя дома, такія, што ўжо былі нягодныя служыць. Ну, чую, што вот ужо нас будуць укладваць у яму. Думаю: тут жа свае будуць укладваць, папрашу я іх, каб хоць наверсе палажылі. І каб паменш прысыпалі...

А патом — ракета! Аказваецца, у Малгацях нехта праізвёў на іх выстрал. Нас там так і кінулі пабітых, каманду далі старым — закопваць, а самі ў Малгаці. І там поўнасцю ўсіх спалілі. Каго ў кварціры ўбівалі, каго жыўцом.

А патом я чую — пачалі ўжо жанчыны плакаць, крычаць. Думаю: што-та тут не так, верна, іх ужо, немцаў, тут няма. Ляжу я і спачатку думаю, што, можа, мяне і не закапаюць. Удасца, то папрашуся ў лес мяне занесці, калі гэта ўжо можна будзе. Усе крычаць, плачуць... І тады я ўжо адчаяўся павярнуць трохі галаву. Туды, дзе ўсе гэтыя людзі ляжалі пабітыя. Людзі вот так ляжалі, а я вот так — наўпоперак, а ззаду за мною — яшчэ адзін пацан, разам у школу хадзілі, у нагах маіх ляжаў, забіты быў. Бацька яго быў у партызанах. А тут гляджу — бягуць нашы суседкі. Я прашу:

— Скажы маме маёй, няхай хоць піць прынясе.

Яна не паслухала: у яе тады забілі бацьку, яна прама туды бегла. Патом другая бяжыць суседка. Гэтая, праўда, паслухала, пабегла і сказала мацеры маёй. Прынеслі мне піць, а я кажу:

— Нясіце мяне куды-небудзь быстрэй. Немцаў няма, паехалі ў Малгаці.

Пытанне: — А мама ваша дома была?

— Не, усе стаялі там, і кулямётамі абстаўлены былі. І немцы сабе там выбіралі, хто ім трэба. Каб ніхто не разбегся. І выбралі тых, каторыя ім трэба былі.

Пытанне: — І маці бачыла ўсё гэта?

— Не, не бачыла. Маці стаяла з гэтай стараны хлява, а мы — з гэтай. Я відзеў усіх, калі білі, бо білі ў агародзе пад акном.

Ну, яна мяне ўзяла... Я быў ужо ладны, а маці — старая, лет пад шэсцьдзесят было, — ну і несці. І брат быў дваюрадны ў мяне. Той памагаць ужо ёй. Нясуць. Я ж ладны ўжо. Тады ж не было ніякіх падвод, хоць бы на тачку якую ўзялі.

А тут, кажуць, немцы вярнуліся назад. А я тады крычу:

— Дзявайце мяне куды-небудзь!..

Ну, куды ж мяне дзяваць? Поле, дзярэўня. А яны мяне тады ў адрыну ды пад сена. А там наверсе яшчэ адзін хлопец ляжаў, схаваўшыся. Чую — там разгавор: «Паляць дзярэўню». На вышках гаворацць. «Прыдуць, — думаю я, — запаляць, і я згару».

— Нясі мяне, — кажу на маці, — хоць назад на тое самае месца...

А патом падалася каманда, і яны, немцы, паехалі.

І мяне тады панеслі ў лес. Маці, брат, і сястра была яшчэ старэйшая. У яе былі малыя дзеці, дык ёй трэба было дзяцей насіць. Трое дзяцей было. І мяне памагаць несці. Тады занеслі і ў байню[9] палажылі. У лесе байня стаяла ў нас. А самі пайшлі туды, дзе ўсіх пабілі. У мацеры маць мацерыну забілі, патом дзядзьку з пяццю дзяцьмі, сястру з мужам, другую сястру, пляменніцу... Пабілі нашай радні многа. Усе пайшлі туды, дзе трупы. Патом ужо, калі ўсё ўспакоілася, началі кожны сваіх закопваць. А я там і астаўся, адзін у той байні.

Патом мне стала плоха. Назаўтра прыйшлі і мяне знайшлі — я ўжо ляжаў на палу. Урачэй жа не было. Кроў ішла, сколько яна ўжо магла... Назаўтра толькі адну перавязку зрабілі мне зноў — вот і ляжы. Больш былі ў лесе. Ноччу ў лесе, а после абеду дамоў. Таму што экспедыцыя была, нападалі немцы больш зранку. После абеду яны не ездзілі. Медыкаменты партызаны даставалі.

Пытанне: — А што гэта за жанчына была, што на вас паказала?

— А яе няма, яе расстралялі. Жыла тут у нашай дзярэўні такая, відзіма, думала нешта, настроена так была. Патом яе расстралялі немцы, бо яна ўказала сястру аднаго паліцэйскага. У той жа дзень яе забілі, як і ўсіх, але яе паследнюю: паліцэйскія настаялі...»

Маці Васіля Іванавіча, калі яна несла яго, ледзь жывога падлетка, было, ён сказаў, каля шасцідзесяці. Нам і не падумалася, што яна яшчэ можа жыць, таму і не спыталіся пра гэта. Васіль Іванавіч прагаварыўся сам. Жыве, здаровая. У сваёй хаце, побач з ім.

Домне Васільеўне восемдзесят восьмы. А яна яшчэ, як спрадвеку гаворыцца, дай бог усім добрым. Засталі мы яе ў сынавым садзе, каля вулляў, у цянёчку, які ўсё-такі не ратаваў ад паўдзённай парнасці.

— Пчол пільную, — сказала бабуля. — Нікога дома няма. Камары тут заелі.

Рой не ўцячэ — старая гаспадыня на пасту. Яшчэ надзіва рухавая і гаваркая. Васіль Іванавіч застаўся ў садзе, а яна павяла нас у сваю хату, што трохі воддаль ад сынавай.

— Усё я вам, хлопчыкі, раскажу, усё падробна.

І расказала. То седзячы трохі, то ўстаючы, жэстыкулюючы, мяняючы голас, калі пераймала кагосьці, то павышаючы яго, то пераходзячы амаль на шэпт, калі ёй зноў было горка і страшна — так, як *тады.*

«...Быў сход перад гэтым днём, перад Першым маем, парцізане яго праводзілі. Атрад Данілы Райцава. Сход правялі, парцізане пайшлі, толькі нашы засталіся.

Назаўтра чуць свет... Я заўсёды выходжу і ўсё слухаю, што дзе стукаюць, дзе страляюць... Выйшла і думаю: «Госпадзі, што гэта такое, што

---

[9] Байня *(дыял.)* — лазня.

нешта блішчыць перад намі?» Разгледзела, ажно гэта немцы ў касках сваіх, і светлая адзежа на іх. Прабяжыць і заваліцца, прабяжыць і заваліцца... Цераз нескалька ўрэмя яны мяне замецілі і началі паліць. Я назад у хату.

— А дзеткі, кажу, а немцы прышлі! А стары мой крычыць:

— У цябе ўсё немцы! Сядзі ты, калі сядзіш. У цябе ўсё немцы.

А я крычу:

— Скарэй, немцы!

А яны з гары і адтуль вунь началі паліць — якраз у нашу хату... У мяне ж была сям'я: я, тры мальцы, адна дочка была ўжо замужам.

— Лажыцеся на палу каля печы!

І праўда — палягглі ўсе. І ляжалі. А яны ўжо так збілі хату, так збілі — усё пасеклі, і печку... Білі з двух старон з пулямёта. А тады яны відзяць, што не выбягаюць, не бягуць, а так прама да нас у хату. Мы тады яшчэ там жылі, дзе школа, дзе ліпы растуць.

— Матка, парызан, парызан!..

А я рукі сашчапіла, стаю, во так і кажу:

— Няма парцізан.

Яны і на хату, яны і ўсюдых, пад палом — усюдых лазяць іскаць. А што тут іскаць, калі поўная хата дыму.

— Выбірайцеся, выбірайцеся!

Выгналі нас на дарогу і паставілі. Кругом акружылі, кругом. Пагналі. Старыка прыкладам у спіну, прыкладам у спіну. Мяне, праўда, тады не білі — не буду гаварыць дарма. А старыка білі. Толькі мы падходзім туды на гару, дзе магазін там быў, гляджу — бя-жыць баба і крычыць:

— А людцы ж мае, а таткі ж мае, а што ж вы нарабілі, а вы ж маю дачку забілі!..

Тут адзін падбег ды трах ёй сразу, дык яна брык і ляжыць...

І вядуць людзей, і вядуць, і б'юць напавал. Каго ад азяра вядуць. Тады хаваліся ў азяро.

Гляджу: ажно, госпадзі, мой стары каня запрагае! Запрог стары каня, палажылі пулямёт на калёсы яму, а тады да воза яго за руку прывязалі. І пагналі. Тут пагляджу — кароў турацъ, турацъ адсюль, забіраюць, забіраюць...

Тады ракеты сталі кідаць. Ракеты пакідалі — кінулі расстрэльваць ужо. І пабеглі. А там ужо, у Малгацях, запалілі. І людзей, людзей, — каго жывога спалілі, каго ўбілі — усіх рашылі, усю дзярэўню рашылі.

Пытанне: — Вас усіх паставілі, сын гаварыў? А мужчын адвялі ад вас?

—Усіх, усіх паставілі. Сыноў адвялі, каля другое пастройкі паставілі. А я вот так села. (Бабуля паказвае, рухава сеўшы на падлозе.) Аднаго ўнучка ўзяла во сюды, а другога, меншага, во сюды палажыла. І сяджу. І прыказ нам далі: «Еслі не будзеце даваць знаць у Смалоўку, калі парцізане прыходзяць, — усіх рашым». Ну, хто ж яму будзе што гаварыць?.. Я відзела, як маю матку, родную маю, нявестку з тром дзецям... І была ў палажэнні, паследнюю нядзельку хадзіла ўжо. І

матка. Стаіць на дарозе... Адзін паліцай, з Загуззя, хлопае па плячы яе, нявестку:

—Проска, гавары, дзе твой Яўхім?

А яго забралі па ўтарой мабілізацыі, нет дома. Адзін брат быў у парцізанех, меншы, а той, старшы, Яўхім, пайшоў. А гэта жонка старшага. Не сына майго, а брата. Я ж думала так, што не будзе ён ёй нічога рабіць, — свой жа, з Загуззя. А ён будзе біць іх. Старуху, ужо семдзесят год было, і нявестку... Ну, за што ён іх?..

А сама я з месца не злезу — нікуды. Мы сядзім каля сцяны, а яны на дарозе. Тады тыя, хто застаўся жывы, пабеглі, а я з месца не злезу. І ўжо бачу, што мае ляжаць. Во, падбягаець ка мне адна жанчына:

— Дамнутка мая, а твой жа Васютка жывы! Просіць піць.

А я гавару:

— А ці жыва мая мамка?.. (Плаа.) А што дзелаць мне?

А я не ўстану. У мяне спічкі: як хацела печку затапляць, так і дзяржу іх усё ўрэмя ў руцэ. І я папаўзла, і папаўзла, і слёзы тыя ліліся... (Бабуля — проста надзіва лёгка — лажыцца на падлогу і паказвае, як папаўзла.) Прыпаўзла, а ён паднімаецца, галаву падняў. А так і з вушак кроў, і з носа кроў, і з рота кроў — і ўсё. І так во:

— Ма-а... Ма-а... Вазьмі мяне адсюль... Даб'юць немцы...

— А сынок жа мой, а куды ж я цябе вазьму?.. Але тут дзве дочкі было, падскачылі, паднялі і ўнеслі ў хлеў яго. Ды саломай закрылі. А ён крычыць:

— А мяне тут даб'юць! І спаляць хлеў, і мяне тут спаляць! Вазьмі мяне!..

Ну, узялі адтуль. Палажылі мне во сюды на спіну, на плечы, і я во тут... А ён:

— Мама, нясі мяне ў балота! Даб'юць немцы!.. Нясу, нясу, і мяне як сагнула во так... (Паказвае.) Можа, паверыце, а можа, не паверыце — усю вайну во такая хадзіла. Палачка ў мяне была, і ўсю вайну хадзіла сагнутая. А ўжо тады после вайны я распravілася, цяпер ужо, бачыце, не такая.

Ну, і панясла я ў лес, палажыла. І пайшла. Палажыла і пайшла. Я так хадзіла — ці я ў памяці, ці я без памяці?..

Зноў крычыць:

— Мяне ваўкі тут з'ядуць, мама! Вазьмі мяне!.. Тады мы яго ў байню. Парэзала на ім адзежу, штаны парэзала, сапагі папарэзвала. Дык у яго крыві так... Пад ім... Ён, як стралялі, ляжаў у бульбоўніку, уваліўся туды ліцом, дык затое — і застаўся жывы. Дык у яго тут кроў спяклася — такі блін... Я той блін змахнула, а яго голага пакінула, ды апяць пайшлі. Апяць пайшла, сагнуўшыся, — туды, дзе стралялі.

Прыходжу — што гэта такое? — мая маці ляжыць...

— Мама, гавару, што ты ляжыш?

Ляжыць. Адвярнулася я дальша — і Проска ляжыць, нявестка.

— А чаго гэта вы тут?

Ляжаць. Ага, яны ўжо ляжаць на тым свеце.

Матка мая лягла... Большая ўнучкабыла, дык тую ўнучку во так палажыла. (Лажыцца на падлогу і паказвае.) Во так во на яе лягла. А другую сюда прывалакла. А трэцюю — сюда к сабе. Во так. Ну, яна яшчэ была і жывая троха... Дзевачка маленькая не скора памёрла...

Мужчыны старыя яму капалі. Яны заставілі ямы капаць во такія. Вот такіх квадратных дзве ямы. Дваццаць дзевяць чалавек — трэба ж палажыць. Мой гэта ўжо трыццаты быў. І астаўся жывы цяпер. А там іх... Хто бокам, хто як, хто — божа мой!..

Дык мама мая прасіла мужчын:

— Мужчынкі мае, скажыце немцам, няхай даб'юць. Мне дужа худа...

Дык ён як даў, падышоўшы, дык разрыўная во так і выскачыла...

А другая жанчына дарогай ішла. Ішла дарогай і аднаго несла на руцэ, а другі каля яе бег і трэці. Гляджу — ляжыць яна на дарозе, як гара, а радам рабяткі малыя... (Бабуля пачынае гаварыць чамусьці шэптам.) Ляжыць... а етат, што з маім Васем ішоў радам, дык забіты. Той быў малодшы за майго, а мой вышэй, — ён сам расказваў после, калі апомніўся, — што той бег за ім, за Васем маім, і ўсё прасіўся:

— Дзядзенькі мае, страляйце мяне з маёй мамкай! Яна ляжыць з тым двум рабятам на дарозе, а ён усё адвернецца к ім і так крычыць, і так крычыць, дык яны яму — у рот...

А майго як страляў, дык у яго, відаць, рука павярнулася ніжэй...»

Цяжка слухаць такое. А як жа насіць яго ў памяці — столькі гадоў? Ды жывое, што адплывае часамі, потым вяртаецца зноў?..

Зноў у сынавым садзе, дзе сонечна звоняць руплівіцы пчолы, вось-вось збіраючыся раіцца, зноў у сваім цянёчку Домна Васільеўна нават спыталася — амаль што поўным жаху шэптам:

— А тое, Васіль, расказаць? Пра тыя боты з нагамі?

— Усё расказвай, мама. Трэба, каб людзі ведалі ўсё. І яна расказала, як суровай зімой сорак першага — сорак другога немцаў і паліцаяў зайшло аднойчы ў іх вёску вельмі многа. У хату іхнюю зайшло іх некалькі. І вось адзін з іх бразнуў на падлогу ногі ў ботах. Жаночыя. У боціках жаночых, хромавых. Адсечаныя па калені. Мёрзлыя. І сказаў ён, той немец, па-руску — на Аньку, меншую бабуліну дачку, тады студэнтку, што з-за вайны не вучылася:

— Смотри, красавица, — это мы взяли у тети твоей, бандитки!

Бабуліна сястра, і праўда, была тады ў партызанах.

Пазней, праз тры дні пасля Канашоў, у Віцебску мы наведалі Ганну Іванаўну Ігнаценка, тую Аньку, бабуліну найменшую дачку. Выхава-

цельніца дзіцячага сада, прыемная, інтэлігентная жанчына, у вайну партызанская сувязная, яна расказвала нам пра той жах больш падрабязна.

Гэта былі ногі партызанкі Палубінскай. Ужо мёртвай адсеклі. Акружаная, яна адстрэльвалася, а апошнім патронам — сябе.

— Божа мой, колькі тады было ўсяго, колькі было!..

Гаворачы гэта, бабуля Домна ведае, што ў іншых людзей, у іншых сем'ях было яшчэ горш, чым з імі, Шчамялёвымі. Стары яе, прывязаны тады да воза, каб не ўцёк, уцёк-такі са Смалоўскага гарнізона. Вайну пераажыў і памёр сваёй смерцю, у сваёй хаце. Жывыя абедзве дачкі, Анька і старэйшая, Александрына, таксама ў Віцебску, пры сваіх дзецях жывуць. А з ёю і меншанькі, яе Васіль, якога яна двойчы — калі малым, а калі параненым — вынасіла на руках. Жыве сынок, добра жыве, і людзі добрыя паважаюць, і ў хаце, што ў вуллі, людна ды весела — пяць дачок! Тры ўжо ў людзі пайшлі, але ж лета во пачалося святое — зараз усе тут да бабы збяруцца — і дзеці, і ўнукі, і праўнукі.

— Дзевяць праўнукаў у мяне, — з гонарам кажа бабуля. — А ўжо ўнукаў!..

Адно рукой махнула — колькі іх.

Пакуль мы сядзелі ў бабулінай хаце, запісваючы яе расказ, Васіль Іванавіч не проста пільнаваў свае пчолы. Удвух з нашым шафёрам яны пагаспадарылі каля аднаго вулля, і, калі нас пасля, ужо з саду запрасілі ў сынаву хату, — на стале быў гарачы мёд у вашчынах і халоднае, з пограба, малако. Быў чорны хлеб, дыхала парай бульба, быў халаднік, было масла, тварог. У хаце, як добры дух, незаўважна з'явілася, прыйшоўшы з поля, гаспадыня, маладжавая маці пяці дачок, дзве з якіх, меншыя, што яшчэ пры бацьках, былі ў школе.

Было і галоўнае ў гэтай зацішнай, светлай беларускай хаце — такі жаданы, так дорага куплены мір, была не проста гасціннасць, а мудрая чалавечая шчырасць, пра што, вядома, не гаварылася, што адчувалася душой.

Бабуля Домна зноў была на пасту, каля пчол. Гаспадыня таксама з работы і зноў на работу. Людзей пакорміць і пойдзе. І гаспадар павінен жа быў кудысьці сёння паспець, толькі па справе з намі застаўся.

Некалькі слоў яшчэ пра яго — ягоных слоў, скупых і сціплых:

«...У сорак трэцім годзе, летам, злавілі нас у полі, сабралі зноў у дзярэўні. І тут адзін з паліцэйскіх зноў паказаў партызанскія сем'і. Нас тады, Шчамялёвых, дваццаць чалавек забралі. Мы з братам, маці з бацькам, сястру з трыма дзецьмі і цётку. І яшчэ адна цётка была, таксама з трыма. І завязлі нас у Гарадок, у турму пасадзілі. Хто быў маладзейшы, сястра і цётка, тых адправілі ў канцлагер, а нас, старых і малых, у паліцэйскі гарнізон. І жылі мы там да зімы сорак

трэцяга года, пакуль нас не асвабадзіла Красная Армія.

А после вярнуліся і сталі жыць. Мне было тады пятнаццаць год, але людзей не было — мяне паставілі брыгадзірам. І дванаццаць жанчын было трудаспасобных людзей. Ні тых коней, ні таго нічога больш не было. Так падымалі калгас...»

Коратка, суха, амаль як у той даведцы, з якой мы пачалі расказ пра трыццатага.

## БЕЗ ДЗЯЦЕЙ

### 1

Усходняя, лясная частка Случчыны. Дзве невялі-кія вёскі з аднолькавай назвай — Адамова, першае і другое, непадалёку адна ад адной. Едучы на гэты раз з раённым праважатым, мы не блукалі і ў гэтых мясцінах, у нас былі дакладныя адрасы патрэбных людзей.

У Адамова другое заязджалі двойчы, першы раз не застаўшы чалавека дома. У Адамове першым нам назвалі «яшчэ адну жанчыну», якое не ведаў наш малады праважаты, — яна жыве якраз у Адамове другім. І мы паехалі туды трэці раз.

Пакуль мы шнуравалі прасёлкам паміж дзвюма вёсачкамі — дарэчы, іх тут завуць засценкамі, — на ўскраіне Адамова другога, на лужку, старая жанчына спачатку грабла, а потым капіла сена. А сонца ўжо заходзіла, і яна спяшалася. Трэці раз уязджаючы ў гэтую вуліцу, мы спыталіся ў жанчыны, дзе тут жыве **Марыя Тарасаўна Хоцька. І** вельмі просты цуд адбыўся — гэта была якраз яна, той патрэбны нам чалавек, якога мы маглі не ўбачыць зблізку, не пачуць, нават і не падумаць, праязджаючы міма, што і яшчэ адна старонка народнай трагедыі тоіцца іменна ў гэтай душы.

Калі мы сказалі Марыі Тарасаўне, што нам трэба, яна прыперла граблі да незавершанай перадапошняй капы і павяла нас у хату,

Мы прыселі каля стала.

«...Я, мае дзеткі, трохінедачуваю... Явамбудурас-казваць, як было.

У мяне было дзве дзевачкі, адной было два годзікі з палавінай, а другой — паўтара. А мая сястра во тут жыла, цераз вуліцу. У яе таксама была дзевачка, у школу хадзіла ўжо. І яна рабіла маёй дзевачцэ чулочкі суконныя. Прыйшла чулочак мерацы маёй дзевачцэ ды кажа:

— От, дзядзька, — на майго мужа, — немцы ў Случы мост робяць, перапраўляюцца сюды.

Я кажу:

— Няўжэ? А яна:

— Праўда! Гаварылі ж на засценку.

Ну, і гэтая дзевачка памерыла гэты чулок і пайшла. Я кажу на свайго чалавека — ён Міша зваўся:

— Міша, а каб нам дзе з дому з'ехаў? Ну, вот жа кусты радам...

І толькі, мае вы дзеткі залатыя, як гэта во мы з вамі гаворым, — ужо стрэл! Ужо людзі — хто на конях, з таго ўжо Адамова, з першага, ляцяць сюды. З гравейкі выстрал. Тут упаў адзін... Ён так упаў, яго не забілі... Ой! Пулі свісцяць... Пабілі мне акно ў хаце. Пуля пабіла. Усё ўжо — немцы тут. Акружылі...

Але мой чалавек з засценка запоўз у лес. От.

Прыходзіць мая сястра ды кажа:

— Знаеш што, Манька, — на мяне, — дзеці твае будуць там з маімі меншымі. — Там у яе хлопец быў і дзяўчына, тая, што я гаварыла, чулочак прыносіла мерацы. — Няхай, кажа, яны будуць там.

—Няхай будуць, — кажу я.

Гэтыя дзеці яна забрала к сабе, дык яны тама-ка... Дома яны не згарэлі, там іх пасля пабілі, у сястры...

Ой! Выходжу я на двор са свае хаты. Думаю: выйду ж я пагляджу, што, дзе, куды людзі, што яны робяць?.. Ужо гарыць! З таго канца, адтуль, ад балота — усё гарыць! Толькі тая хата, мае сястры, і мая засталіся цэлыя. Я — пайду да сястры. Бачу — ідзе немец і паліцэйскі. Ка мне ідуць на двор. Немец па-перадзе, а паліцэйскі ззадзі ідзе. А я іду па пагоначцы[10]. Дык ён як стрэўся, дык мне — з аднае і з другое. Дык я пад плот брык і ляжу... Яны пайшлі ў хату. У нас стаяў зруб новы, а хата ў мяне была з варывенькі, урамяначка маленькая. Дык мы ўжо дасталі лесу тады, ды ўжо зрубілі дом новы, накрыты быў... Яны пайшлі тую хату паліць, а я тады — у склеп. Такі быў склеп выкапаны і плашкамі абстаўлены. Картошка была, усё... А я ў тую картошку, у тылавой сценцы, залезла і там сядзела. От.

Чую я — стрэл, плач суседні... Ну, — усё, няма дзяцей. Ні маіх, ні сястры. Сястра дома была. І ў яе двое дзяцей...

Засценак увесь спалілі, ужо згарэў. А яны ж прыйшлі правярацы... У нас тут доўгі свінарнік быў, мо метраў пяцьдзесят. Свінні стаялі калхозныя. Дык яны ўжо гэты свінарнік пасле дні

[10] Пагоначка *(дыял.)* — прагон, дарога для жывёлы.

запалілі, акружылі яго кругом, стаялі, думалі, мо хто адтуль выходзіць будзе... Ну хто ж, калі ўсе людзі былі дома і ўсіх яны па-палілі, усіх пабілі!..

Прыйшлі ўжо яны і на мой двор правярацъ. Гергенулі нешта... А што я панімаю? У склеп гэты — адчынілі. І яшчэ стаяў пук канапель у тым маім новым зрубе, дык яны запалілі тыя каноплі, нечым аблілі, і такі во быў прысклепнічак, такі небальшэнькі, каб снег дзвярэй не завяваў, — запалілі і ўкінулі мне туды. Ой, ой, дзеткі мае! — як найшло дыму, і склеп гарыць!.. Сценка ж дзераўляная. Гэтыя, што дошчачкамі абабітыя, тожа гараць...

Пайшлі яны. Думаю: што ж рабіць? А гэта ж яшчэ, мае дзеткі, на жызню, дальбожа ж што! Думаю: згару ж я і ніхто мяне не знойдзе або затхнуся з дыму... Як мой чалавек мераў катух, дошкі гарадзіць, дык стаяла тут палка. Я выпаўзла, узяла гэтую палку... Вядома ж, жара гэткая, папалілі ўсе будынкі, дык лужына вады каля парога склепа стаіць. Дык я гэтыя каноплі як адкінула сюды, дык яны ўпалі ў гэтую ваду і патухлі...

Прыйшлі яны зноў, гергенулі нешта... Я толькі паняла, што яны кажуць: «Ніц нема».

Але не закрывалі яны гэтага склепа і пайшлі адгэтуль. І паехалі.

А я ўжо да раніцы сядзела там. А сабака ў маёй сястры быў, дык ён усю ноч — ой-ой! — ні то ўжо брахаў, ні то ўжо брахаў!.. І што ж я знаю — ці ўжо яны паехалі, ці мо, думаю, засталіся... І сядзела ўсю ноч.

Ды ўжо ўранку прыходзіць мой чалавек. Ужо гэты сабака забрахаў на яго, а дале — вядома ж, свой чалавек — ён яго пазнаў. Падыходзіць пад дзверцы, а я кажу:

— Міша, гэта ты?

— Я, — кажа. — Можа, тут і дзеці?

— Не, кажу, няма...

— А дзе?

— Не ведаю дзе. Былі ў сястры маёй, у Лупіновіча... Кажа:

— Нешта ляжыць у яго на таку, у гумне. Мусіць, карова і конь згарэлыя.

Я кажу:

— Не, Мішачка, гэта пабралі ўсё немцы ды паліцэйскія, пазабіралі з сабою ўвесь скот. Гэта, — кажу, — можа, сям'я яго і дзеці...

Гэтак жа ж і было... Двое яго гэтых дзетак большых... А мае як сядзелі на палу... Вядома, маленькія, а каля печы полічак быў такі... Хата была новая, харошая. Як згарэла, дык яны... Іх кірпіч і заваліў там... Яны ўжо там і папякліся... Мы после іх толькі костачкі такія пазнаходзілі. І з плаццічаў пугавічкі... А то згарэлі яны ўжо...

Гэтыя трупы мы паўбіралі, пазакопвалі. Трун не рабілі. Так палаценцамі пазасцілалі і пазакопвалі. После ўжо іх пазносілі на кладбішча.

Вот якое палажэнне.

...У сястры другое хлопчык згарэў, і сама згарэла. А мужыка ў сястры...

Ехаў па сена на Вароніска, па сваё, дыкяго зарэзалітам навостраве... Немцы. Тудэю ішлі па лесе, там яго запынілі і там яго зарэзалі. Я не бачыла, але казаў мой мужык, што ўвесь быў спораны, нельзя было нідзе, кажа, пальца палажыць.

От як здзекваліся з народа!..

Мой быў пасля ў партызанах. А пасля прышоў з вайны з гэтае і забалеў ён, і памёр. Яшчэ, знаеце, няшчасце якое палучылася — карову ў нас укралі з хлева, пасля вайны. А ён трошкі быў заболены на беркулёз, ды вылечыўся, ездзіў правярацца, і ўрач слуцкі сказаў, што маладзец ты, вылечыўся, толькі рубчык, як валасочак, застаўся. Шануйся, гаворыць. Адале, як укралі карову, дык ён папахадзіў за гэтаю каровай, шукаючы, ды папанудзіў — дзеці былі малыя, да пасля ж вайны, гэта ж во, недастаткі былі, ды ўсё пагарэла, і адзёжа, і ўсё на свеце, — дык ён як папанудзіўся, дык і памёр, малыя дзеці пакінуўшы...

Гэтак во я жыла, мае дзеткі. Хадзіла ў калхоз на работу... Ды ой, ой, — пасля ж вайны нічога на свеце не было... А я ж патом неяк, гэта во, іх вучыла і павывучвала вот... Стаяла на штаце, адных цялят, можа, дванац-цаць, ды начлег, ды ўсё на свеце...

Ды ўжо лесу далі. Хлопец быў у арміі. І раз, і два далі, ды я ўжо гэтую халупінку вот перасыпала... Дзе-ці параз'язджаліся, і жыць няма каму...»

«Халупінка» ў Марыі Тарасаўны ніштаватая, знадворку спраўная, усярэ-дзіне чыстая. Толькі пустая яшчэ, як гаспадыня кажа: «Новае абстаноўкі няма». Стол і тры крэслы. Ложак — у кухні. А на вялікай, без мэблі, чыстай падлозе хаты параскіданы лялькі, цац-кі, анучкі... Учора ўнучкі гасцявалі, дзеці пасляваеннай дачкі, з суседняй вёскі прыходзілі, — свята на бабіну адзіноту.

Рада людзям Марыя Тарасаўна, ледзь адмовіліся мы ад пачастунку, найдаражэйшым у хаце заманьвала: «Я вам і сала, хлопчыкі, нарэжу...» І правяла на вуліцу, шчыра жадаючы добрай дарогі.

**2**

Жавалкі — вёска на паўночнай Капыльшчыне, бліжэй да тае лясной ды лугавой красы, дзе пачынаецца Нёман.

Дзеда і бабу **Кузьмічоў** засталі мы ў хаце. Стары адпачываў, прыгнаўшы з ранак каровы, а старая краталася ў кухні.

Як водзіцца, пачалі мы з гаспадара. **Іван Трафімавіч** спакваля разварушыўся, пачаў расказваць, трохі збіўся, трохі расплакаўся, а потым махнуў рукою: «Няхай лепш яна раскажа!..» Тым больш што яна і памыкалася раз-поразу дапамагчы яму.

І вось **бабуля Агата** прысела да магнітафона.

«...Яго я адправіла, мужа, з сынам. Кажу:

— Едзьце вы дзе-небудзь хавайцеся ў Кудзінавічы, а я ўжо буду тут пільнаваць.

Бо так было, што хто ўцёк, дык усё пазабіралі ў тых, а хто не ўцякаў, дык у таго нічога не бралі. Палі-цыя, немцы і нейкія мадзяры былі. Дык я ўжо рашылася:

— Вы ідзіце, а я пажыла ўжо, хоць мяне і заб'юць, буду я ўжо дома. А як не заб'юць, дык забяруць усё, і мы ні з чым застанемся.

Ён пайшоў з малым хлопчыкам у Кудзінавічы, а после немцы гэтыя як паехалі, дык яны і вярнуліся назад. Дык я кажу:

— Госпадзі, чаго ты вярнуўся? Ідзі ты зноў з гэтым дзіцем.

Ен тады ўзяў і зайшоў к майму брату дваюраднаму. Яны — не партызанскія сем'і. Бо сказалі, што будуць сем'і партызанскія забіваць, а астальныя не будуць.

— Вы, дзеці, разыйдзіцеся па гэтых сем ях, што не партызанскія, дык, можа, застанецеся жывыя. Ніхто ж не выдасць.

Ага, мяне засталі ў хаце. Гаворыць:

— Партызан, партызан Кузьміч, у цябе сын у партызанах.

Вынялі такую во бумагу, а там папісаны сем'і партызанскія. Нехта ж напісаў! І гаворыць:

— Вот Кузьміч Міхаіл у партызанах, тры дні як забраны мабілізацыяю.

— Што я вам, пан, скажу... — трэба ж неяк ратавацца. — З аружыям мы ўсе прымяняемся: з аружыям прыдзе партызан, з аружыям прыдзе і немец... А мы ні пры чым, не вінаватыя мы.

— А-а, — кажа, — сволач ты партызанская! Партызанская маці!..

Ды мне лявольверам у грудзі. Не страляў, а стукнуў. Так балела!..

— Падвесіць яе! Ідзіце вяроўкі шукайце!

А ў мяне сядзіць у хаце многа так гэтых паліцаяў, у халатах у белых, афіцэры, з пагонамі, цэшкі, высокія, а гавораць і па-руску, і па-нямецку. І крычаць яны на мяне:

— Прызнавайся! А я кажу:

— Пан, я няграматная, я спалоханая. Пытайцеся, мо мужчыны вам ціто скажуць.

Яны мяне мучылі, мучылі, а я нічога не сказала. Так ён пісаў, пісаў нешта ўсё, адале пабег, начальства гэтае. Астальныя сядзяць у кухні. А мяне так сасма-жыла — хоць бы мне вады кроплю выпіць. Не магу ўжо, як дзеравяная. Пра дзеці я ўжо і забыла, што яны ў мяне ёсць. Ну, што дзеравяная. Я думаю: пайду вады нап'юся. А яны на мяне:

— Куды? А я кажу:

— Дзеці, ці ж я ад вас куды ўцяку? Вас столькі, якая маса сядзіць, а я адна, ды вы думаеце, што я ўцяку. Дайце мне вады.

Яны мяне прапусцілі, я вады глынула і зноў на гэтым месцы села пайшла. Сяджу, чакаю смерці... Тут адзін чалавек з нашай вёскі прыбег і кажа:

— Ідзі на сход. Выклікаюць аддзельна партызанскія сем'і.

Я скарэй, гэта, на сябе паўшубачак і ў дзверы. Так і бяжыць гэты напроціў — гэты, што быў на-чальнік.

— А куды? — гаворыць.

А другі яму гергануў па-нямецку, што «ў групу».

Як ён мяне пусціў, дык я пайшла да гэтае суседкі — хоць з дзеўчынай сваёю развітаюся пайду. Ды кажу:

— Надзька, дачушка мая! Мяне заб'юць, а ты хавайсядзе!.. (Плача.)

Я выходжу з іхняй хаты. Як мяне што пхнула — я ўвайшла ў каморку, і там лескі на гору, дык я туды. Думаю: не хочацца ж пападацца ў рукі, каб мяне забілі, ды дзіця маё будзе бачыць мяне... Залезла я на гору, у куток, ды сяджу сагнуўшыся. Холадна, я пачці голая...

Ужо мяне шукаюць: пытаюцца ў таго хазяіна, дзе гэта Кузьміч Агата... А ён сказаў, што яна пайшла па вёсцы.

А потым узлазіць гэтая хазяйка:

— Ідзі адгэтуль, бо цераз цябе і нам будзе... Я прашуся:

— Сястрыца, галубка родная, дай мне пасядзець, пакуль яны ад'едуць... Ты скажы, што не бачыла, няма мяне нідзе...

Злезла яна, скрушылася[11]. Я думаю: зарыюся ў скрыню аўса, што там стаяла. Улезла ў авёс, легла, на сябе нагрэбла... Холадна мне, бярэ... Усё роўна змерзну... Хай лепш заб'юць. Вылезла і зноў сяджу.

Ну, і рашылася я выйсці і пайсці сярод вуліцы ў той канец. Думаю: мяне ж гэтыя немцы не знаюць.

Пайшла я туды, дзе мая дачка замужам была, у яе маленькі радзіўся, два месяцы... не, два тыдні. І муж яе быў у партызанах, а яна хавалася. У чужой хаце хавалася. Я папрасілася да іх у гумно, дык гаспадыня кажа:

— Ідзі сабе, хавайся. Я ж не шкадую вам. Заб'юць, то я нявінна буду, а не заб'юць, то ваша шчасце.

Тут яна мяне пусціла ў гэты сарай, мая дачка дала мне адзеяла, у тым сараі саломы многа было, бо там складалася многа людзей, — я залезла, выскубла ад дзвярэй задніх, залезла ў самую сярэдзіну, у яму, і сяджу гэтак во.

Бяжыць ка мне маёй дачкі залоўка.

— Цётачка, я да вас!

— Ідзі, — кажу, — удзвёх весялей будзе і цяплей.

Яна ўз'ехала там на мяне, у тую самую яму, і мы ўдзвёх сядзелі. І гэты дзень, і ноч, і зноў дзень...

Прыйшла хазяйка гэтага сарая, прынесла кумпяк. Мы кажам:

— Што там чутно? Прынясі нам хоць па кроплі вады! Мы тут сасмаглі.

Дык яна кажа:

— Ой, мае галубкі, я вось у печы падпалю, дык я вам прынясу чаго-небудзь цёплага.

— А што там чутно? А яна кажа:

— Ходзяць па хатах, ваеннага адзення шукаюць. Дык у мяне, калі

[11] Скрушыцца *(дыял.)* — змірыцца.

будуць шукаць, забяруць гэтае мяса, а што я есці буду.

Яна ўдава была. І вось прынесла хаваць сцягно тое. Гэта цётка тае дзяўчыны, што сядзела разам са мной.

І не ідзе яна...

А дзеўчына кажа:

— Пайду я, дык разарву там яе. Ужо вады кроплю пашкадавала. Сасмаглі мы ўканец...

А я кажу:

— Не ідзі, бо, можа, там што случылася. Пачакаем, тады мы ўжо, можа, як-небудзь.

І ўсё страляюць з кулямёта: та-та-тах! та-та-тах!.. Ужо і відно, ужо і сонейка. А мы нічога не знаем. Я кажу:

— Разгарнем гэтую салому ды праз шчыліну паглядзем, што робіцца на свеце.

Прадралі — дык ужо гарыць! Каровы гоняць, каровы равуць... Я кажу:

— Усё ўжо! Няма ўжо маіх ні дзяцей... ні гаспадара — нікога... (Плача.) Асталася я адна. Што мне рабіць? — кажу.

А после што?.. Там у гэтым гумне кабыла стаяла. Дык яна ні піла, ні ела. Іржэ!.. Як пачне біць капытамі! Чуствуя, што на свеце робіцца... І яны прышлі, пачулі. Многа іх. Гер-гер, гер-гер... Адвязалі гэтую кабылу, падпалілі салому і пайшлі. Туп-туп, туп-туп — кабыла пайшла, і яны пайшлі...

А ўжо ў гэтым сараі — ж-ж-ж-ж! — салома гэтая ажно гудзе. Я гавару:

— Што ж нам рабіць? Уставайма ды як-небудзь выбіраймася.

А тут уперадзе гарыць. Ззаду яшчэ не гарыць. І мы там ззадзі сядзімо. Яна кажа:

— Мы будзем гарэць. Пакуль мы дойдзем, будзе вельмі больна. Давайма вылазіць!

Вылезла яна. А там шчыт. Я гавару:

— Бі нагой, можа, дошку адаб'еш.

Яна б'е, а страшна, каб не пачулі. Ніяк не адаб'еш нагою.

— Нічога мы не зробім, — гаворыць яна. — Давай- це цераз агонь!..

Яна малодшая ды, вядома, яшчэ здароўшая... (Плача.) І нічога няма ў яе, — вядома, дзеўчына. Як пусцілася яна цераз агонь, узялося ўсё на ёй, і хустка, і ўсё, а яна ўкацілася ў снег — патухла!..

А я гавару:

— Госпадзі, пранясі хоць мяне! І мне ж не хочацца пагібаць!..

Я ўзяла паўшубачкам накрылася, пабегла! Папякла рукі... (Плача.) Уцякла цераз агонь. Скарэй тожа ў снег...

Паляжалі мы там, паляжалі. Чуствуемо, што яшчэ жывыя. Глядзімо — яшчэ яны тут, зладзеі гэтыя, усё роўнапаб'юць...

Ляжалі мы, ажно звечарэла. А ноч відная, мароз. Пачалі мы паўзці. Яна ўперад, а я за ёю... А тут у нас клуб стаяў. Дык яны пулямёта яшчэ з клуба не знялі. Як згледзелі нас, што мы паўзём, дык з пулямёта па нас — тэ-тэ-тэ!.. А пулі свішчуць! Перастане

страляць, мы апяць паўзём, як тыя салдаты. А яны зноў па нас. З калень кроў ідзе, з рук кроў ідзе. Памерзлі. Без рукавіц. Зіма. Снегу тады многа было...

— Госпадзі, хоць бы які-небудзь куст!.. Канец нам скора... Выпаўзлі мы ў канец сяла.

— Давай,— кажу я,— стоячы пойдзем.

Усталі, пабраліся за рукі і пайшлі. І кроў ідзе, і мерзне гэтая боль...

Пайшлі мы на пасёлак, зайшлі ў адну хату. Дзе ж мая сям'я? Ні дзяцей няма, нічога — пагарэла ўсё!.. Я назад у агонь, а яны мяне не пускаюць. Нашто ж я жыць буду адна!..

Вот мяне не пусцілі. Я сяджу на печы. Боль невынасімы. Плачу.

А потым — мой ідзе! Дзякуй богу міламу, што хаця ён застаўся!..

Шкада ж дзяцей усіх: а дзе ж Фаня з дзіцем, а дзе ж Надзька? (Плача.) А Толік дзе мой?.. Забілі хлопца, забілі дзеўчыну, семнаццаць год, гэтакую красавіцу... (Плача.) Не магу расказаць вам... На жызню я выбралася. Няхай бы лепш я пагібла!..»

Расказваючы, бабуля Агата раз-поразу нервова стукала то кулакамі, то далонькмі па стале. Калі мы папрасілі не псаваць такім чынам магнітафонны запіс расказу, яна паслухалася і потым ужо ляпала рукамі на прыполе, раздзельна, а то і злажыўшы іх, як на малітву.

Дзед слухаў яе, час ад часу згодна ківаў галавою, а слёзы то выціраў, то забываўся пра іх...

Калі ж бабуля дайшла да таго моманту, дзе ёй трэба было ў гумне кінуцца цераз полымя, яна зала-мала рукі над галавой і з выгукам «Госпадзі!» разрыдалася. Іван Трафімавіч таксама тузануўся ад плачу, ужо не толькі нямоглы, але амаль па-дзіцячы безабаронны.

«...А дачка мая з дзіцем у лес уцякла, — сказала бабуля, сяк-так пераходзячы на спакой. — Адзін сынок застаўся... Вярнуўся ранены тады. Лячыла я яму тую нагу, купала ў зёлках і цалавала ад радасці, што засталося ў хаце хоць адно дзіця...»

## МУЖЧЫНЫ

У мазырскай вёсцы Касцюковічы, дзе мірных, безабаронных людзей знішчалі «тэхнічна» — душагубкамі, мужчын аддзялілі на вуліцы ад жанчын, дзяцей пакінуўшы з жанчынамі. Адзін хлапчук ад маці кінуўся да бацькі... Карнік схапіў малога за руку і хацеў яго кінуць у калодзеж. І вось бацька, Сафрон Каменскі, — ад плота, дзе стаялі мужчыны, — ірвануўся да карніка, паспеў ударыць яго і нават самога ў калодзеж укінуць.

Аднавяскоўцаў, што самі бачылі гэты выпадак, нікога не засталося. Пра гэта пасля вайны, на судзе, расказваў выкрыты паліцай. Па наваколлі пайшла легенда пра бацькаву горкую мужнасць...

Прадаўшчыца аднаго са слуцкіх магазінаў **Зоня Багдановіч,** расказваючы пра трагедыю сваёй роднай вёсачкі Гандарэва, успомніла, між іншым, і такое:

«...Янік Аліноўскі з сынам неслі цэбар, каню сечку даваць, а ішлі гэтыя немцы... І немец сына застрэліў, а Янік выхваціў з-за пояса тапор і забіў гэтага немца.

Як забіў ён гэтага немца тапаром, дык і пайшлі яны астатніх забіваць. Усё!.. Усіх пабілі, запалілі і пай-шлі...

Аліноўскі — Ян, але яго і да пяцідзесяці гадоў называлі Янікам. А сыну, Людвісю, было гадоў семнаццаць. У Яніка тапор быў за поясам, і ён немцу па галаве. Забіў гэтага немца, а другі немец яго забіў.

Пытанне: — Вы сама гэта бачылі?

— Мы ўсе бачылі. Мы ж на вуліцы стаялі. Ён так з сынам як ішоў, дык немец сыну — трах! А гэты, тапор выхваціўшы, ды яму! Немец упаў. А яго адразу тады ў кажух, у розныя посцілкі — забіралі ж тады ў нас — увярнулі, увярнулі, на воз палажылі і павезлі з сабою, гэтаганемца...»

«Мы ўсе бачылі», — гаворыць Зоня Міхайлаўна. Аднак, апроч яе, ніхто ўжо не засведчыць гэтага, бо ўсіх жыхароў маленькага Гандарэва ў тую раніцу памардавалі (дзеля таго ж яны і прыязджалі, карнікі), а з тых дзяўчат, якіх адабралі для адпраўкі ў Германію, сёння жыве адна яна. Удалося ўцячы ад расстрэлу і аднаму з яе меншых братоў, дванаццацігадоваму Мікалаю, але выпадку з Аліноўскім ён не бачыў — быў ужо за хлявамі. (Расказ яго — у раздзеле «Звыш дзесяці».)

Далей расказваюць самі мужчыны.

**Іван Карпавіч Сакавец.**

Знайшлі мы яго ў адным з завулкаў гарадскога пасёлка Крупкі, дзе ў чалавека грады каля акон драўлянага доміка. У градах мы Івана Карпавіча і засталі. Пасля дажджліва-пахмурнага дня ясна заходзіла сонца, а чалавек, які ўжо на пенсіі, аказаўся вясёлым, прыязным, — павёў нас у кватэру і расказаў пра тое, што адбывалася ў яго роднай вёсцы Узнаж увосень 1942 года.

«...Я быў жанаты, у мяне жонка і трое дзяцей было. Немцы калі ацапілі Узнаж, то я застаўся дома. Пераначавалі. І немцы ў нас начавалі. А я к бацьку перайшоў. Мая хата самая з канца была, але я баяўся. Бо партызаны ў мяне стаялі перад гэтым. Тады не ўцячэш. Усе ў лес пойдуць, а я з дзецьмі... Дык я к бацьку перайшоў. Ён сярод дзярэўні жыў.

Пераначавалі, а рана нас сабралі сярод дзярэўні — усіх, і старых, і малых, і бальныя каторыя — вынеслі. Вынеслі і паставілі. І дапрос. Бургамістр з Выдрыцы — Карань яго фамілія, Рыгор Васільевіч, — ён знаў мяне яшчэ змалку: мая маці з Выдрыцы была, я там у дзеда ўсё быў, калі быў меншы. Ну, вот ён захацеў Узнаж выбіць. У нас партызаны стаялі, а ў іх там, у Выдрыцы, доты былі. Партызаны наступалі і доты гэтыя разбілі. І гэтыя паліцаі... Там некалькі французаў было. Усе паўцякалі ў Крупку. Некалькіх паліцэйскіх забілі яны, а гэты бургамістр уцёк. А жонку яго — убілі. І хату яго спалілі. Ну, у яго было шэсцера дзяцей, кажацца, але дзяцей яго не чапалі.

А патом ужо, калі яны ў Крупку ўцяклі, атрад бальшы выехаў да нас, і да нас гэтыя немцы, гэты карацельны атрад прыехаў.

Дапрос ішоў. Там следавацель нейкі быў, рускі. Па-руску чыста гаварыў, але ў нямецкай адзёжы. І мяне вызвалі там па спіску. Бургамістр мяне прывёў. Адзін немец з палкай стаіць, збоку, у хаце. І вот ён прывёў мяне і гаворыць:

— Чаму ты нарыхтоўку не здаеш?

— Гумна ў мяне свайго няма. А ён гаворыць:

— А партызанам чаму даеш? Я кажу:

— Партызаны з аружыем, самі зойдуць, возьмуць, а што я ім магу здзелаць.

— Што мне гаварыць? А бургамістр кажа:

— У яго два браты ў партызанах. На мяне. А я кажу:

— Спрасіце ў сялянства. Мае браты ўзяты ў кадравыя.

Ага. Ну ён так і піша. Запісаў, а патом бургамістр гаворыць:

— Ён мае звязь з партызанамі. — На мяне. — Мы, — кажа, — партызанку паймалі ў Выдрыцы, і яна гаварыла, што ён звязь імеець.

Запісаў ён і: «Вядзі!»

Мяне прывёў. Партызанскія сем'і там. Паставілі. Каля варот якраз. Чалавек сем стаяла, я так восьмы быў. Я стаў з краю так, ля каліткі. Калітка была адкрыта. Партызанская сям'я тут з намі стаіць. І мяне сюды паставілі. Ну, я знаю, што браты ў партызанах, — мяне ўб'юць усё роўна. Я тады думаю: «На ходу уб'юць, дык уб'юць». Я не шчытаў, што маю сям'ю выб'юць. Дык я як стаяў ля варот, а калітка адкрыта, а немец нас асобна ахраняець ужо, з аўтаматам... Каб ён проціў мяне стаяў, дык я, канечне, не ўдраў

бы, а то ён прахаджваўся — шагі чатыры туды і сюды. Ён як пайшоў, а я тут жа каля каліткі стаяў, ён не павярнуўся, а я — раз у гэтую калітку! Двор загароджаны быў. А метраў семдзесят — кусты там, балота. Ну, я малады быў, гады трыццаць два. Я толькі так шапку падхапіў, думаю: «Ну, уб'юць на хаду». Цераз плот! Ні выстралаў, нічога. Ён павярнуўся і не замеціў мяне. А там не было заставы, а застава была кругом, а каля балота тут не было.

Так я і ўцёк.

А ўсіх папабілі.

Я прыйшоў тады, пасматрэў — нікога нет. Дзе мой бацька жыў, на тым гародзе яма выкапана, і ў гэтую яму — усіх... І малых, і старых, усіх...

Трыста шэсцьдзесят чалавек...»

* * *

**Мікалай Паўлавіч Бранавіцкі.** Вёска Рахавічы на поўдні Салігорскага раёна.

На даляглядзе — навакол — былыя партызанскія лясы, а замест колішняга балота — ураджайная палеская раўніна, культурныя палі і сенажаці. Хаты, калі глядзець з высокан вуліцы-гравенкі, ажно топяцца з усімі платамі ды прыбудоўкамі ў зялёнай паводцы бульбы.

Мікалай Бранавіцкі расказвае:

«...Мы былі ў лесе — усё наша срадство. Разведку пасалалі мы, з нашых, паглядзець, ці спакойна дома. Ну, значыць, далажылі, што спакойна. Мы і паехалі дамой. Знаеце, дзеці малыя, трэба іх абагрэць, абсушыць...

Толькі я запаліў пліту — тут явіліся немцы на парозе. А куды ты дзявацца будзеш? Значыць, абшарылі ўсё. Паліцыя нямецкая. Адзін немец толькі крыкнуў: «Раўс!» Што такое «раўс», дык я трохі панімаю: выхадзі ці ўцякай, што-та такое. Пагналі нас — і жану, і дзеці...

Як толькі выйшлі мы на двор, адзін малады паліцай крычыць:

— Хазяін, давай вярніся і давай нам мэду!

Не мёду, а мэду. Ага, думаю, стой: раз «мэду», значыць, украінцы. Я гавару:

— Мёду ў мяне нет.

— Дзяры пчолы!

Стаў я выдзіраць сам пчолы свае, а тут ужо некагда, гоняць. Гоняць ужо ўсіх. І яны за мяне і туды. Усё маё срадство. Гэта нас сабралі дваццаць шэсць душ: старых, дзяцей... Загналі ў сарай і прыказалі:

— Маліцеся богу!

Хто моліцца, хто што...

— Прашчайцеся!

Ну, сталі прашчацца. Знаеце, там і плач, там і бяда... Ну, а патом гаворыць:

— Станавіцеся на каленкі, адварочвайцеся да сцяны!

Я, праўда, падняўся і гавару так:

— Вы людзі ці якія-та... ці якія-тазвяры, ці хто вы такія? За што вы нас страляеце? Ну, вы страляйце

партызан. Ну, я — партызан, мяне страляйце. Но зачэм вы груднога рабёнка будзеце страляць? Зачэм старыка, каторы ледзь ходзіць? Хто вы такія?..

Праўда, яны нічога не адвецілі на гэты мне вапрос. Яны пачалі з аўтаматаў страляць. Я ўпаў. А жынка ўчапілася за маю шыю і ўпала на мяне. І пападалі яшчэ трупы, і на блізкае расстаянне з аўтамата не праходзіла пуля, каб цераз трупаў і мяне дастацк. Толькі правая старана ў мяне як ляжала, во такое палажэнне, дык тры пулі папала, і яшчэ дзве сюды, і адна... — шэсць пуль.

Стралялі доўга. Адной жанчыне папала, яна ўпала на рабёнка, ён сільна плакаў...

Сярэдняя дочка мая, ёй пяць гадоў, стала плакаць. Кажа:

— Папка, папачка, сільна больна! Я кажу:

— Ціха, дочачка, не плач.

— Ой, папачка, я не магу цярпець!..

Як стала яна плакаць, дык ёй з аўтамата вочарадзь як запусцілі, дык чарапок зляцеў і мазгі брызнулі на сцену, і яна скончылася. Я гэта сваімі вачамі...

А жынку забілі зразу.

Ну, я і ляжу пад трупамі. Стала цішыня. Потым што-та гудзіць. Што такое гудзіць? Самалёт? Потым з-пад трупаў я паднімаюся. О-о-о! Страха падае ўжо, гарыць! Людзі гарацъ сінім агнём. Ці яны аблілі, ці яно ўгарэлася так. Знаеце, усё-такі жыр, цела людское. Як ні гавары. Гарыць прама сінім агнём, як бензін! Я на гарашчую сцену карабкаюся, на сена хачу. Калі карабкаўся — валёнкі з ног з'ехалі, і я астаўся басяком. Патом падняліся яшчэ дзве жанчыны — мая сястра дваюрадная і суседка. Некуды дзявацца, гарымо — поўнасцю ўжо страха падае. Я, значыць, сеў і гавару ціхонечка:

— Адно срэства — бегчы ў дзверы.

Яны закрылі дзверы. Мы ў гэтым вуглу былі, і бяжаць нам цераз трупы нада. Дык я як бросіўся!.. Гэтыя трупы гараць, курчацца — я перапрыгнуў і ўдарыўся рукамі ў дзверы. Дышаць ужо нечым. Я ўдарыўся так крэпка, што абедзве палавінкі раскрыліся. Я ўпаў і па-цягнуў сырога воздуху. Дым клубіцца. Сарай вялікі, гарыць і крыша, і сена... І я бяжаў у гэтым дыме. А дабяжаў я — немцы!.. Стаяць немцы. Абоз нямецкі. Я развярнуўся і апяць у дым. А там была братава варыўня і яма — ён абсыпаў варыўню. У гэтую яму я і ўскочыў.

Увесь у крыві, бо трупы ж на мне ляжалі...

Попелам сляды мае занясло на снезе. І я сядзеў прымерна да поўначы. Потым падняўся. Што ж дзелаць? Рук я не чустваваў — у мяне ажогі сільныя, паўсхватваліся банкі во такія на руках. І басяком. Трэба на ногі што-та. У брата вісела бялё на плоце, пасцірана. Я ўзяў пазавязваў рукавы ў бялі ў гэтым, нацягнуў на ногі і паціхоньку

патопаў да свайго дому. Было гэта метраў сто пяцьдзесят.

Праўда, раней я падышоў да трупаў. Жанчыны, што за мною беглі, ляжаць паабгарваныя, на парозе... Можа, у трупах, у адзёжы заблыталіся? А можа, іх немцы ўкінулі назад?..

Зайшоў я ў сваю кварціру, узяў адзеяла, узяў шнуркі такія харошыя, узяў простыні, узяў палаценцаў штук два, каб у случаі, калі я найду чалавека дзе свайго, штоб яму перавязку зрабіць. У кустах разарваў адзеяла, накруціў на ногі, пазавязваў і паціхоньку падаўся...»

Мікалай Бранавіцкі вярнуўся ў родныя Рахавічы інвалідам вайны. Ходзіць на мыліцах. Расказвае стрымана, але вочы ўсё-такі поўныя слёз.

«...Дачок пабітых успамінаю часта. Трэба ж так, каб адна нарадзілася 8 сакавіка, другая 1 мая, а трэцяя — на Кастрычніка. Добра было б дні нараджэн-ня адзначаць...»

А ў чалавека сёння і новая сям'я, і дом, і працоўны дастатак.

Памяць...

* * *

**Міхаіл Андрэевіч Казёл.** Вёска Краснае ў Шчучынскім раёне.

Крыў хату шыферам. Запрасіў нас у чысты пакой, застаўлены вазонамі, і раска-заў, як не раз ужо, відаць, за трыццаць год расказваў,— і без прыкрас, і з новым хваляваннем.

«Цяпер я жыву ў Красным, а тады жыў у Ляхаўцах.

Бацька раніцамі малаціў, а я шавецкую работу рабіў. Бацьку жывот забалеў нешта, дык ён прыходзіць, будзіць мяне:

— Падыміса — ідзі малаціць.

Я падняўса, абуўса, узяўса за ручку дзвярэй, а тут мяне — назад... Пагналі туды, дзе з усёй вёскі народ сабраны быў.

Сагналі ўсе Ляхаўцы. Спачатку стаялі без усякага парадку, а потым яі паставілі ў тры шэрагі. І праз нейкі час вь шаў іхні камісар і зачытаў, што забілі лесніка, значыщца,— усе тут «памочнікі бандытаў». Вось за гэта сёння і будуць расстрэлены дваццаць пяць чалавек. Тады ён дастаў сп сак і пачаў па спіску зачытваць: такі, та^ такі... Выклікалі нас і адразу акружылі кулямётамі.

Усе яны былі ў шэрай нямецкай форме, гаварылі па-нямецку паміж сабой, а да нас – па-польску. Цераз перагаворшчыка. А амтс-камісар сам троху па-польску гаварыў.

У хату нас Вераб'ёву загналі, а тады прыходзілі і не вычытвалі, а проста бралі papaдзецца — па пяць чалавек.

Калі мы ў хаце сядзелі — я сеў за стол, і вось мы ўсе, атабраныя, друзья і падругі, папрашчаліса паміж сабою... Калі павялі першую пяцёрку, нам у хаце было чуваць, як там затрашчалі аўтаматы... І як толькі затрашчалі аўтаматы — мінут праз пяць зноў прышлі немцы, зноў пяцёрку ўзялі –

павялі.

Я, канешна, мог бы пайсці і ў паследнюю вочарадзь, бо яны бралі першых ад дзвярэй. А каб вы ведалі, што ў гэтай хаце тварылаQa! Хаос цэлы! Я не плакаў, нічога... Пасядзеў я, падумаў. Расстралялі адну пяцёрку, павялі другую пяцёрку расстрэльваць. Мог бы я ў паследнюю вочарадзь пайсці, але думаю: «Колькі ні сядзі — ад кулі не ўцячэш». Я тады выходжу і кажу:

— Хто больш ідзе?

Кожны жмецца ў куток...

Немец астальных чатырох выкінуў у дзверы за мной.

Выйшаў я — адразу камісар стаіць. Пытаюса ў яго па-польску, за што мяне стрэльваць будуць. А ён:

— Лёўз![12] Бандытэ!

Пра ўцёкі я не думаў, бо куды тут уцячэш? З аднаго боку плот высокі, могілкі, а левага боку вуліцы — фельчараў высокі плот, штыкетнік. Куды тут уцячэш? Пасля падышоў я з метраў дваццаць, і штурханула мяне нешта: «Уцякай!» Але куды ўцякаць? На плот скочу — адразу ж заб'юць, бо хутка не пераскочыш. Тады я ішоў, ішоў... Направа вуліца. Думаю: сюды. Прама — заб'юць. Бачу, расстрэленых у яму кідаюць. Засталоса мне метраў дваццаць — трыццаць. А ў Мікалая былі вароты прыадчынены ва двор. Я параўняўса з варотамі і таму немцу, што справа ад мяне ішоў,— калі даў!— дык ён адразу і пайшоў куліка. А я — у вароты. А тут радам дом. Я — за вугал, а па мне стрэл... Не папалі. Я па загаццю і ў вуліцу. Цераз плот пераскочыў і — па вуліцы. А па мне — ад тых людзей, што стаялі сабраныя,— цераз могілкі пачалі з кулямёта біць. Дабег я ў самы канец вуліцы, да Любы, а там, дзе расстрэльвалі, стаяў станкавы кулямёт. Пачаў ён па мне біць. І яшчэ чалавек трыццаць б'юць... Ну, праўда, бег я, падаў. Нават не ранілі. Я помню: поўз, поўз, а кулі, як толькі пачнеш паўзці — цёх-цёх-цёх!.. Больш за ўсё біў па мне кулямёт. Ялавец рос. Я да таго ялаўца падпоўз, і — прыжок. І — у сасняк. Бягом, бягом па гэтым сасняку. Сасняк канчаецца. Направа хутар і поле ўжо. З левага боку ў мяне ўвесь час немцы, а справа, дзе хутар, немцаў няма. «Перасяку, — думаю,— гэтае поле». Азірнуўса, бачу — стаяць тры немцы! Але я ўсё роўна пру да хутара. Як пачалі яны па мне страляць!.. Дабег да хутара, забег за хутар — агонь спыніўса. На рэчачцы кладка ляжала, я па гэтай кладцы — як цудам нейкім, перабег. За рэчкай — метраў трыста алешнік, я туды і дабег. А немцы падышлі да самай рэчкі, пастаялі, пастаялі і вярнуліса назад.

З нашай вёскі ніхто больш тады не ўцалеў. Толькі Мікалай Стасюкевіч паспрабаваў уцякаць, але адбегса метраў дваццаць, і — на плоце — яго забілі.

Тады забіта было, здаецца, дваццаць сем чалавек.

Калі я ўцёк, тады тыя немцы, што

[12] Los! *(ням)* – Пайшоў!

гналіса за мною, вярнуліса. Старшы немец, каторы там камандзір,— людзі потым расказвалі,— даваў, даваў, даваў таму, што мяне гнаў.

А потым бацьку майго за мяне забралі і застрэлілі. Хацелі яшчэ матку забраць, але нешта яны паміж сабой пагаварылі, пагаварылі, і так яна засталаса...»

У свой час Міхаіл Андрэевіч, як «заходнік», быў салдатам польскай арміі, у верасні трыццаць дзевятага года сустракаўся з немцамі ў баю. Пасля расстрэлу ён, натуральна, стаў партызанам. Мужчына. А расказвае і... час ад часу плача, аж не можа гаварыць. З-за бацькі... Ці гэта проста крыўда і гнеў — чалавечая крыўда і справядлівы гнеў, якія не праходзяць, не заспакойваюцца нават помстай?..

* * *

На Клічаўшчыне, у вёсцы Усакіна.

Багаты домік, зялёна-таямнічы сад, злосны сабака. А гаспадар — высокі і мажны мужчына, вельмі прыкметна маладзейшы за свае «семдзесят з гакам». На руках — маленькая гарадская ўнучка. А дзед, хоць ён і калючы такі, і грымучы, відаць, і добры, і вясёлы.

**Макар Карпавіч Заяц.**

«...Тут у нас многа Зайцаў у вёсцы, але адзін я — Макар Карпавіч.

Пытанне: — Дык гэта вы — той самы Заяц, што немца забіў?

— Той, той! (Смяецца.) Адступалі нашы. І тут ішлі нашы. Дзівізія. А я жыў з канца. І ка мне ўсё прыходзіць начальства, пакушаць што-небудзь. У лесе мы жылі. Я раз даў, другі раз даў, а потым нет чаго даваць. І кажу я:

—Рабяты, я вас не выкармлю, а мае дзеці астануцца так. Вунь картошка ўжо падрасла калгасная. Чорт з ёю, што маленькая, падумаеш — жалець. Усё роўна хвашысты забяруць. Ну, а яны ў акружэнні былі. Яны картошкі накапалі.

— Лошадзь есць?

— Ёсць.

— Завязіце нам.

Завезлі. Назаўтра зноў прыходзяць, ужо больш. Лейценант, у гражданскую вайну ваяваў, Іван Мінавіч. Гэта яны ў мяне пра яго пыталіся: ці ёсць яшчэ хто-небудзь з акружэнцаў? Я павёў іх і паказаў, дзе ён хаваецца. Яны яго ўзялі. Мы два вазы картошкі накапалі, завезлі ім на палігон.

Ахрэм Бабовік узнаў — пайшоў у паліцыю і немцам данёс. А ўжо нашы прарвалі недзе каля Друці. Яшчэ фронт ішоў. А Ахрэм гаворыць:

— Вот гэты вазіў бандзітам есці. Ну, мяне ноччу забралі.

Пытанне: — У вас сям'я вялікая была?

— Чацвёра дзяцей і жана. І ўсіх нас забралі. Яшчэ з лесу людзей узялі: прачоска лесу была. Сталі расстрэльваць.

Мяне б'юць:

— Вядзі, дзе парцізаны! Вядзі, куды вы бандзітам есці вазілі!..

І Іван Мінавіч тут жа, і яго забралі. А вот яны мне гаворацць:

— Завядзёш, будзеш жыць, не завядзёш — расстраляем!

Вот я іх на край поля прывёў, і няма мне куды круціцца... Я ім так і гавару. А ён б'ець мяне. А я ўсё не даваўся: як ён замахнецца, немец, дык я ўсё ўбок, убок. Усё роўна як як-небудзь — каторыя б'юцца... баксёр. А потым па затылку мне прыкладам як ударыў — я ўпаў.

Тут жа і сям'я мая ўмесце. Бяруць дзіцёнка — расстрэ льваюць.

— Вот завядзёш — гэтых не будзем страляць!..

А я знаю, што, як завяду, — больша чужой крыві нап'юся, чым маёй разальюць. Я не павёў. Пытанне: — І тут застрэлілі ваша дзіця?

— Тут аднаго рабёнка застрэлілі, другога застрэлілі, а трэцяга падводчыкі схавалі. Чацвёртага, то есць самага большага. Ён і сяйчас жыве ў Ленінградзе.

Пытанне: — А як яны яго — у воз схавалі?

— Не. Далі пугу, і пайшоў коні адварочваць. У баразне схаваўся. Яму так сказалі падвод- чыкі. Вот ён і астаўся жывы, і сягоння жывой. А тады і хазяйку расстралялі. А патом і мяне вялі страляць.

Ну, мяне вядуць расстрэльваць, а я думаю ўцеч. Што ж тут здзелаеш? Адзін двох вядзець. Падходжу я наперад — немец. Як білі нас, то ён стаяў, па-нямецку разгаварываў. Тады зайшоў наперад, ідзе напроціў нас і па-руску гаворыць:

— Вы не знаеце, может, куды вас вядуць? Вядуць расстрэльваць.

Пытанне: — Ён так гаворыць, каб не пачулі іншыя немцы?

— Не, немец ішоў, але ён жа па-рускі не панімае. І гэты надзеты ў нямецкае, і наган у яго. Тады па-нямецкі з немцамі гаварыў, а цяпер з намі па-рускі. Гэта не пераводчык — пераводчык астаўся, а ён, як нас тронулі, то ён наперад зайшоў, уродзе яму прысесці трэба было... І ён тады напроціў ідзець.

— Вас, — кажа, — вядуць расстрэльваць.

О-о-о, госпадзі! Сям'ю расстралялі, і мяне рас-страляюць... Давай папробую ўцеч. Я так да краю вярну з гэтай сцёжкі, каб у лес. А ён мне аўтаматам р-раз у плечы. А я... Гэта ў мяне патом, на фронце, рукі пабіты, а тады я яму як вурзну! — дык ён дагары, і яго аўтамат адляцеўся. Я верхам, за аўтамат — шарах! — яго застрэліў. Іван гэты, Мінавіч, у адну сторану пабег, а я ў другую. Пад мяне гранату другі падкінуў, ну, але граната мяне не тронула нісколькі...

Пытанне: — Дык вы ў яго яшчэ і з аўтамата стрэлілі?

— А як жа! Калі б я яго нё застрэліў, дык у яго ж наган быў. А другі немец, кажаце? Многа іх, немцаў, было. Але ў

гэтым шуму... Я тры вайны праваяваўі ведаю, што ў шуму ніхто не знае нічога і не ведае. Яны пакуль агледзеліся... Гэта якіх-небудзь я быў метраў дзесяць ад немцаў адышоўся, недалёка, а гэта ж — шум!..

Ну вот, гэта мая ўся і гісторыя. Пытанне: — А потым вы куды, у партызаны пайшлі?

— Не. Мне зрабілася плоха. Плоха зрабілася. Ну, куды? Я ў Закуцце, у атрад. Гэта начальнік атрада быў знаком, дык я к яму. Іду, і здаецца — іграюць, пяюць... А нікога нідзе няма. Гэта ў мяне ў галаве. Расстроіўся. Да... І ён гаворыць мне:

— Знаеш што, вызаву я табе ўрача. Урач мне ўколы даваў і гаворыць:

— Ідзі ў ціхае месца.

Пабыў я ў ціхім месцы. А тады ўжо пры штабе і находзіўся. Я ў Лёшкі давер'е меў. Я забываю яго фамілію. Лёшкай завуць. Я яго так і назы-ваў. Ен у вашых гадах быў. І я там усё ўрэмя і находзіўся.

Пытанне: — У гаспадарчым узводзе?

— Не, як днявальны. Вобшчым, я яго ахраняў. Цела яго храніцель быў. Даверaны.

Пытанне: — Тады, у сорак другім, Сушу[13] два разы палілі?

— Не, першы раз партызаны не далі. Ведалі, што будуць Сушу паліць. Здзесь, як відзён лес, і на гарэ там — са станкавымі кулямётамі партызаны. Яны іх сільна многа перабілі, немцаў. Заяц, Бабовік па-вулічнаму, які вёў немцаў, стаў зваць іх: «Сюда!» — і рукой махаець, каб беглі ўслед за ім. Знае куды. Тут ён і радзіўся, толькі не здох тут...

Ну, гэта першы раз як ехалі. Другі раз ужо большай сілай... І ніхто ўжо не прыступіўся да іх. Пытанне: — І што яны тут натварылі?

— Ну піто, людзей перабілі. Два пасёлкі цалкам выбілі. Сем чалавек асталося, што дома не былі. «На сабранне! На сабранне! На сабранне!» — выгналі. Вот так пасёлак і во так пасёлак, а пасяродку на картапляніш-чы і пабілі...»

* * *

Ходзіць па лесе чалавек. Штодня. Зімою і летам. Ляснік — такая служба, такі хлеб. Хапае і клопату, калі чалавек клапатлівы, хапае і адзіноты, часу для роздуму, для ўспамінаў. Тым больш калі яму ёсць што ўспомніць.

Ёсць што ўспомніць, над чым пасумаваць і чым парадавацца **Аляксандру Заўэру,** былому партыза-ну, а цяпер лесніку ў тых самых родных мясцінах...

Аляксандр Карлавіч — латыш, адзін з тых латышоў, якіх на гераічнай і шматпакутнай Акцябршчыне пасля фашысцкага лютавання ў гады акупацыі засталося вельмі нямнога. У вёсках Перакалле, Булкава, Залессе.

«Калі мы, латышы, прыехалі сюды, — гаворыць Заўэр, — я не ведаю.

[13] Суша — суседняя вёска. Гл. «Дзве старасці».

Трэба ў старых людзей запытацца. Тут ёсць адзін, Фрыц Вінтарс, ён да вайны быў старшынёй наілага латышскага калгаса «Сарканайс араайс»[14], а цяпер ужо на пенсіі. Але і ён не раскажа, бо латышы прыехалі сюды даўно, відаць, больш за сто гадоў таму назад ».

У тым самым Булкаве, дзе жыве Заўэр, мы наведалі і названага ім Вінтарса. Харошы дзед, моцны яшчэ, былы партызан, цяпер саўгасны пастух, руплівы і талковы чалавек, пра што можна меркаваць хоць бы па доміку яго, багатым з працы рук і чыстым ад любасці да культуры.

Не памятае Вінтарс, з якога часу тут загняздзіліся латышы, бяда іх прыгнала сюды ці мандат які перавёз. Не памятае, хоць і пажыў нямала і ад старых калісьці сёе-тое чуў. Ліпы абапал вуліцы такія самыя магутныя былі ўжо і тады, калі ён быў малы, а іх жа — гэта ён ведае добра — садзілі продкі-латышы.

Добры дом і ў Аляксандра Заўэра. Па-летняму ён быў пусты, засталі мы ў ім толькі гаспадаровага сына, лейтэнанта-адпускніка, што рыхтаваўся ў нейкую сваю дарогу. Юнак сказаў, што бацька ў лесе, але зараз павінен прыйсці.

Ляснік неўзабаве прыйшоў.

Латышскі тып моцнага, не вельмі гаваркога, нібы нават пахмурнага работніка. Добрая беларуская мова. І дзелавая прыязнасць.

Спачатку — проста скупы і сціплы салдацкі расказ:

«Мне ўжо шэсцьдзесят другі год. У вайну быў у партызанах.

Калі палілі наша Булкава, дык я якраз быў у Акцябры, у Смукаве, — там мы сядзелі ў засадзе. Гэта калі немцы наступалі на Акцябр. У канцы студзеня сорак чацвёртага года. Мы іх тады адбілі, яны ў той дзень не ўвайшлі ў Акцябр, а дзён праз два прыйшлі і ўсё-такі занялі.

Нашы сем'і тут пабілі. Прыгналі з лесу, сагналі ў два гумны і там іх папалілі. Вось тут у нас, у вёсцы. Там усіх маіх... У мяне было шэсць душ сям'і: жонка, цешча, цешчына сястра і трое дзяцей. Нікога не засталося... Застаўся толькі брат — быў у партызанах. Сястрычку злавілі ў лесе. Яна была ў смерцьлагеры, пад Азарычамі. Пасля яе выручылі.

Заняўшы тут, немцы былі ў нас месяцы са два. Людзей пабілі, а самі жылі ў вёсцы. Тут яны былі каля Залесся зрабілі сабе... так сказаць, убежышча, каб партызаны не падыходзілі. Але мы падышлі. У нас была якраз дэсантная група, мы прышлі і зноў іх разагналі. І з Залесся выгналі. Дэсантная група і нашы, партызанскія, дзве групы былі. Мы абстралялі іх, некалькі разоў прайшлі па вёсцы, і ім здалося, што нас тут — тысячы.

Назаўтра яны выбраліся адтуль у Акцябр. А потым мы іх з Акцябра выгналі, і яны паехалі ў Парычы...»

[14] «Sarkanais arajs» *(латыш.)* — «Чырвоны араты».

Далей — пра асабістае. Аднак такое, што пра яго павінны ведаць многія. Аляксандр Карлавіч і пра гэта расказаў вельмі скупа. У адказ на нашу цікавасць — калі мы пачалі здзіўляцца, што на сценах вялікай светлай хаты так многа павялічаных фотапартрэтаў спраўнай ды вясёлай моладзі.

«...Я ўзяў жонку свайго таварыша. Мой таварыш быў беларус. Адзінец Мікалай. Яго забілі. Ён папрасіўся пайсці дамоў, у свае Касарычы. Прыйшоў, а там вёску акружылі і павялі на расстрэл. А з ім быў яшчэ Коўзун Пятро, таксама там папаўся. Дык той кажа:

— Мы што — скаціна? Давайце разбягацца!.. Пачалі яны разбягацца. Адзінец перабег цераз поле, ускочыў у лес, а тут разведка нямецкая... Забілі яго.

А мы з ім дагаварыліся раней: хто застанецца жывы — сям'і дапамагаць. Не ведаю, як ён зрабіў бы, але я зрабіў па-чэснаму: забраў яго трое дзяцей. Меншаму, Мікалаю, паўтары гады было.

Яна гаворыць:

— Хіба ж ты мяне возьмеш — трое дзяцей?.. А я кажу:

— Я не цябе бяру, але толькі дзяцей — трэба.

Але раз ужо мы сышліся па характару, то і жывём разам. Ужо дваццаць шэсць год. Жывем. Дзяцей павывучвалі, дзеці ў нас усе на рабоце. (Далей гаворыць, пераходзячы ад партрэта да партрэта.) Во гэтая дачка. Гэта во сын, каторы ў пары: вяселле было. А гэта во ўжо наша з ёю першая дачка. А гэта сын, каторы ў Ленінградзе вучыўся. А гэта во старэйшы сын, працуе ў Рызе. Во якая ў мяне сям'я!.. Чатыры дачкі і два сыны. Усе працуюць. Тамара сантэхнікам, Галя кранаўшчыцай, Ганна маляром, Ліда тэлеграфісткай, Мікола мулярам, а гэты во, Аляксандр, як вы бачыце, афіцэр. І сама яшчэ, мая Люба, ад маладзейшых не адстае — і цяпер у полі. І я працую. Лесніком з сорак восьмага года...»

Ходзіць па лесе чалавек. І многа думае, многае ўспамінаецца яму ў адзіноце, якое так многа. Адзіноты і цішыні.

**ЗВЫШ ДЗЕСЯЦІ**

«...Маленькіх хлопчыкаў, як і бабаў, яны тады не стралялі, а ўжо як катораму гадоў дзесяць — такіх разам з мужчынамі...»

**(Аляксандра Міхалап.** Стаўпішча Кіраўскага раёна.)

«...Жанчын аддзельна замыкалі паліць, а мужчын аддзельна. Такіх хлапцоў, што большыя, дык туды, з мужчынамі, а малыя дык з намі былі».

**(Тэкля Круглова.** Гарадскі пасёлак Акцябрскі.)

«...Немцы дзяцей любілі... Возьме на рукі, паносіць, а потым — у агонь...»

**(Віталь Шадура.** Зенякі Шчучынскага раёна.)

У двух першых выпадках — прыватная прыхамаць якога-небудзь «звышчалавека» ў паліцэйскай ці эсэсаўскай форме; у трэцім выпадку — яшчэ раз пацвярджаецца тое, што мардаванне дзяцей, ад немаўлят да падлеткаў, было на захопленых землях састаўной і неад'емнай часткай фашысцкага плана «перабудовы свету».

Гаворачы цяпер з мужчынамі, якія ў гады акупацыі пераходзілі з маленства ў самую першую сталасць, ужо саромеліся маміных пяшчотаў і яшчэ ўсё мужчынамі не былі, — нельга не хваляваца неяк па-асабліваму...

* * *

Вёска Байкі на Пружаншчыне. Чэрвень, раскошнае лета. Пасля кароткага ліўня — яшчэ больш ласкавае сонца, якое ўжо добра схіліла з поўдня. Раз-пораз магутна кукарэкаюць па заплоццю старыя пеўні. Здалёк чуваць працавіты трактарны грукат. Звініць сваёй нястомнай песняй жаўранак. Ці, можа, многа іх, толькі над намі — адзін.

І дзеці гамоняць, крычаць і смяюцца недзе зусім недалёка ад лаўкі каля плота, на якой мы сядзім, — мы іх не бачым, а толькі чуем.

Бачым адну дзяўчынку, што паміж намі і хатай на той бок вуліцы гуляе ў «класы». Сама з сабой, засяроджана, зусім, што называецца, для душы.

Бацькі гэтай скакухі, да якога мы прыехалі, яшчэ усё няма з касьбы.

Ідзём туды, адкуль чуецца хлапечы гоман і смех. Вось яны — маляўнічая група босай ды чубаценькай каманды «філосафаў і паэтаў», спакушаных многімі таямніцамі кніг, кінакарцін, футбольных і хакейных матчаў — «без адрыву» ад роднае хаты з тэлеэкранам, ад роднай вёскі з клубам і школай. Адпачываюць — хто на жэрдках агароджы, а хто і на слупе, каму дзе ямчэй пасля добрай палавіны доўгага і змястоўнага дня. Яшчэ не канікулы. Але гэтым мужчынам — па выгляду, чацвёрты, пяты, шосты класы — заканчэнне школьнага года асаблівых цяжкасцей не прыносіць: ні экзаменаў табе, ні клопатаў пра нейкі інстытут. Смех — іхняе паветра. Нават і перад аб'ектывам фотаапарата смех гэты цяжка стрымаць.

Шчаслівыя аднагодкі тых, каму ў чорныя дні гітлераўскай акупацыі было столькі, як ім цяпер, тых, што і тут, у гэтай вёсцы, гінулі разам з усімі — і меншымі, і большымі за іх...

Пагаварыўшы трохі з хлопцамі, вяртаемся да нашай лаўкі.

Дзяўчынка ўжо адскакала сваё і кудысьці пабегла. А бацькі яе і яшчэ ўсё няма.

Ён вернецца з касьбы, былы ваенны падлетак, ён нам раскажа, як вырваўся з агню, з-пад куляў...

Адно, што тым часам ведаем пра яго, адна дэталь, што загадзя ажыўляе незнаёмы вобраз, — гэта тое, што нам сказала сёння адна бабуля, таксама былая пакутніца. Ён, Мікалай Шабуня, у бацькі свайго быў не сынам, а пасынкам, але «дай бог, каб кожны родны бацька любіў роднага сына так, як Мікалая войчым».

І вось ён, Мікалай Сцяпанавіч, нарэшце прыйшоў. З касою на плячы, з павагай прывычнай стомы. Мужчына трохі за сорак, спакойны і дужы.

Адпачываючы на ганку, ён расказаў.

«...Ішлі мы раніцай у Ружаны, рэзаць дровы да бургамістра. Выйшлі на шашу, а тут немцы:

— Хальт! Падыходзяць:

— Цурык нах гавус! Пайшлі мы дадому.

Сказаў я бацькам, яны ўстрывожыліся. Глядзім у акно — едуць да солтыса на машынах і пешыя ідуць.

— Бярыце ўсе дакументы і выходзьце!.. Туды, дзе і цяпер вялікая ёлка стаіць.

Вынеслі яны сталы на вуліцу. У каго грошы, гадзіннік, кальцо сярэбранае або пазалочанае — усё чыста забіраюць і ў стол. Калідор з немцаў зрабілі, адзін немец ад аднаго на тры-чатыры метры, і людзей гоняць аднаго за адным — у гумно.

Прыгналі людзей з іншых вёсак, з Навасадаў і Колкаў. Капаць магілы...

А мы ў гумне сядзім. Той тое, той тое.

— Сёння, — кажуць, — сітка будзе густое. Прасеюць. Адных пабяруць, паб'юць, а другіх пусцяць. Паб'юць тых, у каго сваякі ў партызанах або каторыя самі сувязь маюць...

Сядзелі, сядзелі, чакалі, каб як праз тое сітка прайсці, каму гэта прыйдзецца, а тут папалі — усе без раз-бору.

Выводзілі з гумна — хто пад руку папаў. Мужчыны — не больш як па чатыры, пяць чалавек. Бывае ўсякі характар — можа супраціўляцца. А жанчын выводзіў — колькі выпара...

Гэта цяпер ужо, калі хадзяін з хадзяйкай жыве, то дзяцей у іх двое-трое найбольш, а тады было па пяцёра, сямёра.

Палепяцца за спадніцу і так валакуцца...

Вочарадзі былі кароткія. Толькі, было, раніць. А жанчын з дзецьмі —

працэнтаў на шэсцьдзесят жыўцом закопвалі.

Два чалавекі геройскі пагібалі — Шпак Даніла і Кава Сямён.

— Бі, — кажа, — сволач, у твар, а не ў патыліцу!.. Я спачатку прадраў страху і сам глядзеў. Бачыў.

Стаяла ахрана каля гумна. Калі не вылазіш, то не страляюць. Я памахаў рукою, што вылазіць не буду. «Глядзі сабе, вытрымаеш — глядзі...» І пакуль сёстраў і маці не забілі, і гэтых двух — я глядзеў. А цотым... нібы страх... Родных пабілі — страх авалодаў. А так чалавек проста стаўбом стаяў, без чусцвія...

Як цяпер гаворыцца, па маскоўскаму часу, з васьмі гадзін да шаснаццаці была праверка, а потым пачалі расстрэльваць. Дзве гадзіны расстрэльвалі, не больш.

У гумне сядзелі на сене і курылі, ніхто тады не асцерагаўся. Чулі, што страляюць.

— Люс! Люс! — хто крайні.

Не хоча — прыкладам, галава не галава...

Форма ўся нямецкая: і шэрая, і чорная. У чорнай больш стаялі на пастах. А немцы — выпорвалі, падводзілі. Расстрэльвалі тыя, што пайшлі... ну, паліцыя. З Івацэвіч прыехалі, з Пружан прыехалі, з Ваўкавыска прыехалі, са Слоніма прыехалі, з Баранавіч прыехалі.

А тыя, што забіралі дакументы, гаварылі па-нямецку, цераз перагаворшчыка.

Усіх пабілі, а мы з бацькам пад сена зарыліся. Бацька першы, а я яго закідаў сенам.

Даскубся я да сцяны, а каля сцяны вялікая бочка, на замок замкнёная, стаіць. Немцы прыйшлі, давай глядзець, што ў бочцы. Прыкладамі разбілі яе. А я якраз да яе дакапаўся. Сена было так на метр трыццаць сантыметраў, а як праскубці, каб чалавеку далезці, то палучаецца прагіб. На мне стаяў немец. Разбіў бочку, пачаў вакол яе пароць штыхом. Аж да адзежы мае дапорваўся.

«Ну, — думаю, — усё роўна не застанемся, не вырабімся жывымі».

Неяк так... Ці то чалавеку жыць паложана?..

Пайшлі яны. Потым адзін з сабакам зайшоў. Сабака — уядаецца!.. Потым чую — запалкі зашасталі. Чую — салома пачала гарэць...

Вылез я на ток. Уздумаў, што і бацька мой тут. Узяў сахор, парнуў — варушыцца. Выцягнуў я яго. Я абгарэў слаба, а ў бацькі ўвесь твар быў з паўгода абгарэлы, нельга было глядзець... Выйшлі мы з гэтага гумна. Гумны адно ад аднаго — метраў шэсць. Глядзім — чалавек перад намі. Спалохаліся, стаім, як стаўбы, адзін на аднаго пазіраем, а потым пазнаем: сусед.

— Гэта вы, дзядзька? — пытаецца. — І хлопец з вамі?..

Пайшлі мы ўтрох да дарогі.

А яны апошні дом, дзе сядзела начальства, падпальваюць.

Напароліся мы на немца. Нёс куль саломы. Метры два ад яго я рукі распасцёр, каб тых, што ззаду беглі, затрымаць. У дыме ён мяне не заўважыў, а двор вузенькі. Мы — назад. Я — цераз плот. У суседа вуллі былі на зіму састаўлены, я паміж імі, у лужыну — снег ад пажару растаў — лёг і ляжу...

Паехалі немцы.

«Давай, — думаю я, — пайду пагляджу на магілу...» Дзіцячы розум... Пазнаходзіў адзежу, мацерыну і сясцёр. Раздзявалі ўсіх да бялізны...

Тая магіла, дзе мужчыны, паднімалася няшмат, санціметраў на дваццаць. А кроў каля сценкі — фантанам. А дзе жанчыны... Клянуся... ісціным богам, што на жанчынах не менш як санціметраў на семдзесят зямля то паднімецца, то асядзе... Значыцца, яны толькі трохі прысыпалі, каб не відно было.

Потым людзей прыганялі, на трэці дзень, дабаўлялі зямлі...»

Пакуль ён расказваў, за спіной яго, на парозе, амаль увесь час стаяў хлапчук. Адзін з тых вясёлых «філосафаў» з плота. Ужо разумна прыціхлы. Калі адыходзіўся або вяртаўся зноў на парог — абавязкова асцярожна і, басанож, зусім нячутна. Меншы, чым бацька ў той час, калі яго забівалі, ды ўжо таксама звыш дзесяці...

Дзяўчынцы было нецікава. Толькі трохі паслухаўшы, скакуха пабегла з двара, шукаць новай забавы.

І ўсё над намі і навокал нас было ў спакоі яснага адвячорка.

* * *

Вялікая Воля Дзятлаўскага раёна.

Лясная вёска, з векавечнымі дубамі і гонкімі сос-намі — не толькі навокал яе, але і на вуліцах з кіпарысным ядлоўцам на палянах паміж рэдка раскіданымі сядзібамі, з драўлянай царквой на могілках, прыгожай і ў сваёй пашарэлай ды пахілай старасці. Добрыя хаты ў вялікавольцаў, амаль усе — пасляваенныя.

16 снежня 1942 года немцы забілі тут каля двухсот чалавек. Сярод вельмі нямногіх, каму пашанцавала ўратавацца, былі два падлеткі.

Адзін з іх, калгасны жывёлавод **Аляксей Ламака,** так расказвае пра той дзень.

«.. .У той час я яшчэ быў малы, мне было ўсяго адзінаццаты год.

Помню я — прыйшлі немцы, сталі нас выганяць з хатаў. Немец адчыніў дзверы і сказаў: «Выходзыце!» Мы жылі ў хаце дзве сям'і, бо наша хата згарэла і мы жылі ў падсуседзях. Вышлі мы з хаты і бачым, што тут ужо ўся вёска сагната. Падагналі нас метраў, можа, з пяцьдзесят, паставілі ўсіх у калону. Не памятаю, колькі там чалавек было ў калоне. Закамандавалі нам усім пакленчыць, і ззаду прыйшла машына. І сталі мы паміж сабой гаварыць, што, можа, паліць нас будуць жывых... А яны нас сталі фатаграфіраваць — з нейкім апаратам стаяла машына.

Сфатаграфіравалі яны нас, падалі каманду ўстаць, тады бралі па дванаццаць чалавек, адлічвалі па дванаццаць чалавек, і на метраў сорак ці, можа, пяцьдзесят адводзяць тых дванаццаць чалавек і камандуюць лажыцца ў такім во палажэнні, пад гару. (Паказвае.) І з кулямёта тады шуруе.

Я папаў тады якраз у другую групу, дваццаць чацвёрты чалавек. Я толькі помню, што я датуль быў пры памяці, пакуль камандавалі лажыцца. Упаў я — ужо стрэлаў не чуў, як па нас стралялі. Можа, і заснуў. Нешта палучылася.

Ужо потым, калі ўсіх перастралялі, устаў стары Васіль Ламака і гаворыць:

— Хлопцы, хто застаўся жывы, уставайце. Немцы паехалі.

А бацька мой быў цяжка ранены па жываце і, як пачуў гэты разгавор, пытаецца:

— Алёшка, а ты не ранены? Паварушыся...

Ой, я забыўся — я гэта адразу з бацькам гаварыў, як толькі яны перастралялі, яшчэ не хадзілі дабіваць. Бацька гаворыць мне:

— Ты, сынок, жыў?

— Жыў, — кажу.

— І не паранены?

— Не, не чуетвую.

— Не пячэ нідзе?

— Не.

Дык ён кажа:

— Не варушыся, бо ходзяць дабіваюць.

Праз мінут, можа, пяць падыходзіць немец да мае галавы, узяў нагою за маю галаву, а я гэтак во... (Паказвае.) І ён пайшоў далей.

А потым ужо гэты Ламака Васіль устаў і гаворыць:

— Хлопцы, хто жывы застаўся, уставайце. Немцы паехалі.

Устаў я, і пайшлі мы па трупох шукаць людзей, каторыя жывыя.

Яшчэ я застаў сваю сястру, ёй было тады сем лет. У яе была нага перабіта ніжэй калена. Я яе метраў, можа, сто, можа, семдзесят аднёс. Ну, тады ж я быў пацан, каб гэта, як цяпер, быў самастаяцельны... Яна стала прасіцца, што баліць, што палажы мяне, і я палажыў і пайшоў за тымі старыкамі ў лес.

Ну, у лесе мы таксама хадзілі двое сутак. Есці ў нас не было чаго, мы там абнаружылі партызанскі лагер. Прыйшлі мы ў той лагер, было там трохі пшаніцы і мяса нямнога. Узялі мы каструлю. Голыя ж мы былі, ніхто ж не знаў, што прыдзецца яшчэ доўга жыць. А ўжо зіма была. Знайшлі мы нейкага матэрыялу на парцянкі, адзеліся трошкі, узялі гэтую пшаніцу і мяса, наварылі там, пад'елі...

А на другую ноч рашылі: хадзем у сваю вёску.

Прышлі мы туды, дзе я палажыў сястру, — сястры ўжо не было. Дзе яна падзелася — ці яе забралі ды разам з людзьмі засыпалі, дабілі, ці яна сама

зайшлася, — хто яго ведае. У лесе яна ляжала, прама ў лесе, бо я яе метраў сто, можа, і менш, аднёс за прыгорак, яна стала прасіцца, і там я яе палажыў...

Ну, а потым узялі мы ў вёсцы хлеба, у каго дзе знайшлі ў каморцы, што-небудзь так, мяса якое-небудзь...

Падыходзілі мы потым і да магіл, але яны былі ўжо ўсе засыпаныя. Яны прыгналі з Малое Волі людзей і засыпалі.

Узялі мы прадуктаў з вёскі, дзе ў каго што знайшлі, — галодны ўжо не глядзіш, сваё не сваё, ліш бы дзе, — і пайшлі ў лес.

І думаю я: пайду дзе да людзей, шукаць людзей.

Ішоў, а там стаяла адрынка, гумно такое на балоце. Каторыя багачшыя людзі, то стаўлялі там гумна і клалі сена. Заходжу я ў тую адрынку — ляжыць Барыс паранены. Я гавару яму:

— Барыс, што рабіць, як цябе ратаваць? Яму ўжо гадоў дваццаць было. Ён мне кажа:

— Схадзі да Крупіцаў, да маёй сястры, скажы ім, няхай па мяне прыедуць.

Ну, я і пайшоў памаленьку, разглядаючы, каб дзе не нарвацца, і дайшоў аж да Крупіцаў, наказаў, і яны яго забралі.

І я сам астаўся ў Крупіцах, у цёткі, мамінай сястры...»

Другі **Ламака, Радзівон,** якраз быў тут, у роднай Вялікай Волі, — прыехаў з Ленінграда ў адпачынак.

Знайшлі мы яго на беразе Шчары, з малою Любушкай, дачкой, што ведае і любіць татаву вёску, вельмі ахвотна прыязджае з ім сюды, на сырадой, сон на свежым, духмяным сене, да быстрай і маляўнічай Шчары. Хоць і вузейшая яна за Няву, але ж такая празрыстая, цёплая. А лес — суніцы, чарніцы, лісічкі, баравікі!..

Працуе Радзівон у Ленінградзе «дзяжурным механікам у харчовай прамысловасці». Падаўся ён туды адразу пасля вайны, там закончыў рамеснае вучылішча, а потым тэхнікум.

У тым жахлівым снежні яму было адзінаццаць год, і ён, як сам гаворыць, «усё добра памятае».

«...Прыйшлі яны, немцы, сабралі ўсіх і выгналі на развілку дарог. Усіх паставілі, перш мужчын адагналі ў адзін бок, а тады жанчын і дзяцей — у аддзельны бок. І зрабілі кіназ'ёмку. Тады я не разбіраўся, што яны робяць, што гэта да чаго. Давалі каманду паднімаць рукі і здымалі нас, як ім наравілася.

Пасля першую парцію мужчын пагналі, жанчын адных аставілі. Пабілі мужчын — пагналі жанчын з дзецьмі...

Колькі там крыві, колькі енку было!..

Не ведаю, як гэта вышла так удачна, што ў мяне не папала ніводная пуля, ніводнай царапінкі не было.

Усе ляжаць, пабітыя, а немец — як сягоння помню — ходзіць з аўтаматам і дабівае...

А потым я падняўся. І не ведаў, што ж мне рабіць. Пайшоў яшчэ дадому схадзіў. Потым ізноў прыйшоў на гэтыя могілкі. А ў вёсцы ўжо няма нікога. Прыйшоў я на могілкі, а там адна жанчына яшчэ жывая. Узяла яна мяне за руку і кажа:

— Хадзем у лес!

Прыйшлі ў лес. Пасля мы знайшлі, на другі дзень, Ламаку Стася і Васіля. Ужо нас было чатырох. Ідзём далей. Потым знайшлі Ламаку Стэфу з дзяўчынкай Маняй, дванаццаць гадоў. Калі мы іх знайшлі, дык яны гавораць:

— Там вунь ляжыць Ламака Іван. Ён ранены. Гэта мой родны брат.

Пайшлі мы і прыцягнулі яго да партызанскага лагера, «пад вялікую яліну», як тады гаварылася. Лагер той быў пусты. Ранены стогне, перабітая нага... Пасля яму яе ампуціравалі.

Прабылі мы там шэсць дзён, бо немцы яшчэ кругом курсіравалі. Потым адзін кажа:

— Ці так, ці так паміраць — давайце брацца дадому.

Брат мне кажа:

— Ідзі дадому. Там у яме гарэлка стаіць. Каб мне не замерзнуць — нацерціся трэба.

Прыйшоў я дадому — ані душы. Прыпоўз я, у яму тую спусціўся, а ў хату не заходзіў. Схапіў там пару бутэлек тое гарэлкі і назад у лес да яго.

Прыйшоў у лес, дык ён узяў там ды рану сваю абмыў.

Пераначавалі мы яшчэ адну ноч, зноў ён гаворыць:

— Ідзі паглядзі, прынясі штонебудзь. Але асцерагайся.

А хаты нашыя — у лесе. Прыпоўз я, бачу — стаіць нейкі мужчына. Падышоў я бліжэй, давай прыглядацца, а гэта наш сваяк з Крупіцаў. Расказаў я яму пра ўсё, а ён запрог кабылу, і мы паехалі ў лес. Прывезлі брата ў Крупіцы, і там ён ляжаў...»

***

**Міколу Багдановіча** знайшлі мы ў Слуцку, на будаўніцтве мясакамбіната. Якраз канчалася змена, і саракатрохгадовы цесля, зачыніўшыся з намі ў прарабскай, за дашчанымі сценамі якое чуўся грукат і гоман, расказаў, як ён калісьці ўцякаў з роднай вёсачкі Гандарэва, калі яна была ў сваім апошнім агні.

«...Мы якраз былі ў хаце ўсе. Маці ставіла есці на стол, а тут немцы наляцелі на дзярэўню. Ніхто нікуды не паспеў уцячы.

Немец прыйшоў у хату і гаворыць:

— Матка, ідзі карову выганяй!..

Яна пайшла, а ён дастаў пісталет і ўбіў яе. На маіх вачах. У хляве. А потым вярнуўся ў хату. А я на дварэ схаваўся.

Брат быў другі. Ужо быў раздзеты, нібы хворы ляжаў — каб у Германію не ўзялі, — дык ён узяў і застрэліў яго ў

пасцелі. Меншага брата з печы зняў… Дзевачку таксама ўбіў…

І выйшаў з хаты.

А я потым убег, брата падняў меншага, Ваню, і — уцякаць з ім.

Выбеглі мы з хаты ўдвух, і я яшчэ пабег у хлеў, маму паглядзець. Думаю: калі брат жывы, дык, можа, і ў маму не папалі…

Брат пабег прама ў лес, і яго дагналі. У руку вышэй локця і ў галаву… Потым яго там знайшлі.

А я не пабег, я паміж двух хлявоў залез у завулачак. Дзядзькаў хлеў і наш. Сяджу там. А потым, як хлявы пачалі гарэць, дык я думаю, што яны будуць раскідацца і прыдавяць мяне… Я адтуль вылез і хаджу з аднаго боку на другі: каб ён і з дзядзькавага двара не ішоў, і з нашага. І яны мяне замецілі. З напраўлення Ціханя яны ехалі. І паслалі аднаго. Я бачу — ён ідзе… Думаю: яны мяне не відзяць. А потым ён галаву з-за вугла і я з-за вугла. Дык я на яго:

«Панок! Панок!..» Ды гэтым… выбачайце, мёрзлым конскім гаўняком з-за вугла папусціў. А сам бягом на свой двор, цераз калодзеж, цераз плот і паляцеў далей па вуліцы…

Пытанне: — А ён паслізнуўся, немец? Так нам ваша сястра расказвала.

— Паслізнуўся. Ну ён, можа, думаў — гранатай папусціў. Чорт яго ведае, што ён думаў, факт, што так было. Ён упаў, а я за гэты час — на трэці двор… А потым паўзком, паўзком, за капцы, за бурты… Там была канюшня калхозная, а ўжо ад гэтай канюшні да лесу — метраў пяцьсот было. Снег растаўшы быў ад пажару, снегу многа, — ніяк не магу бегчы. Поўз, поўз, а потым усхапіўся і — бягом. Дзе ўжо снег цвёрды. Дабег да лесу, і тут усё роўна як хто мне ў затылак ударыў — цёмна ў вачах… У адну нагу ранілі і ў другую… Пасля ачухаўся, чую — страляюць. І зноў пабег… У Старэве людзі мяне перавязалі, і я пайшоў у лес…»

Негаваркі Мікалай Міхайлавіч. Распытваць трэба было, падварушваць пытаннямі. І сарамлівы. Пра тую мёрзлую «гранату», якою ён, хлапчук, напалохаў дарослага з пагонамі і аўтаматам, ён наогул не думаў згадваць. Каб Зоня Міхайлаўна, сястра яго, да якое мы перад гэтым заязджалі, не расказала пра гэта, дык ён, як сам сказаў нам, «пасцясняўся б гаварыць...».

## ДЗВЕ СТАРАСЦІ

### «ГАЛОЎКА ЯГО БАЛІЦЬ...»

У нас быў перапынак, цэлы тыдзень, калі мы былі дома і жылі больш клопатамі і радасцямі свае надзённасці, і таму цяпер сонечны, зялёны чэрвень мы па хатняй інерцыі ўспрымаем яшчэ без страшнага глыбіннага падтэксту — без людскіх успамінаў пра кроў і агонь.

Вёска Альхоўка. Клічаўскі раён.

Спешыўшыся каля патрэбнай нам хаты, ідзём ад машыны да лаўкі перад гародчыкам, на якой сядзіць дзядок. Ціхенькі, сівы, шэры, маленькі. І не ў цяньку, хоць спёка, а на сонцы. Вітаемся, а ён не адказвае, пытаемся, а ён маўчыць. Ды не ад грубасці, мусіць, бо глядзіць ён на нас ці то прыязнымі, ці то бязгрэшнымі вачыма. Не ўсміхаецца — толькі зірнуў адзін раз, даўгавата і абыякава, і зноў глядзіць кудысьці, нібы наперад, нібы ўдаль.

Вартуе штосьці? Абдумвае? Проста любуецца тым, на што глядзеў столькі гадоў, а ўсё ж не наглядзеўся? Відаць, ні адно, ні другое, ні трэцяе: на ўсё на тое патрэбна нейкая актыўнасць, а ён, дзядок, проста глядзіць.

Зразумеўшы, адчуўшы, што гэта — не той, хто можа нам дапамагчы, ідзём у брамку. Ужо на дворыку нас сустракае шустрая, прыветлівая бабуля. Ды яшчэ і талковая — хутка ўцяміўшы, што нам трэба, запрашае ў хату, дзеда свайго з вуліцы не клічучы.

У хаце чыста і пуста, і, не пытаючыся, можна здагадацца, што дзед і баба, як ва ўсіх амаль казках, жывуць адны.

Прысеўшы да стала, бабуля, як і большасць тых, з кім мы ўжо сустракаліся і ў хатах, і на полі, на мікрафон не зважае — проста расказвае людзям, іўсё.

«...Як мяне, кажаце, завуць? Цмыг, **Грыпіна Паўлаўна Цмыг.** А колькі мне гадоў? Мне ўжо, хлопчыкі, два гады яшчэ і тады будзе восемдзесят. Ой, даўно ўжо жыву-у, ой-ой-ой!.. (Смяецца.) Аён у мяне, мой гаспадар, ужо саўсем... Ён старэйшы за мяне. Мусіць, на трынаццаць ці на чатырнаццаць год. А завуць Амял-лян Атрафімаў Цмыг. І той мой дзед быў Амяллян, першы мужык. Гэты мой дзед — удавец быў, у яго пятнаццаць душ забілі немцы, у яме ў той ляжаць. А ён застаўся, гэты дзед.

Ну, я засталася ўдава. Мой сын быў у партызанах. А ён, гэты дзед, ды таго майго дзеда кум. Дык ён кажа:

— Знаеш што, кума, давай мы будзем удваіх. Дык я кажу:

— Ну, давай.

Сын прыбег з лесу, і я спыталася: так і так, сынок, што рабіць?

— Мама, калі дзе прыхінуцца ёсць, дык ты тут і будзь. Можа, калі парцянкі дасі ці рубашку пераменіш мне.

Ну, вот мы і зыйшліся з дзедам, і гадоў, мусіць, трыццаць жывём.

Ужо не ў нашай вёсцы жывём, не ў Сушы, а тут.

А цяпер галоўка яго баліць...

Гэты дзед і гэтыя хлопцы збіраліся кучамі — ня-дзелька была. І жанчыны папрыбіраліся, старыя і маладыя. Сядзяць дзе-небудзь, сабраўшыся. Ну, і тады гэта дзед стаіць у куранi, а тая баба, яго першая, ды кажа:

— Збіраюць на сабранне! Ідзі, дзед.

— Я схаваюся. А яна кажа:

— Чаго схаваешся? — Гэта ж мы такія дурныя, бабы. — Што ты схаваешся — усе ж на сабранне пашлі.

Ну, на сабранне, дык на сабранне. Усе гэтыя бабы, і хлопцы маладыя...

А хат ужо не было — курані. Хаты папалены былі. Зямлянкі былі. Дзед хацеў у зямлянку пад нары, дык яна не пусціла.

Тады гэтыя немцы і кажуць:

— Вот тры чалавекі — гэты, гэты і гэты (старэнькіх ужо: маладых жа пагналі ў плен), тры чалавекі трэба кароў гнаць. І ганіце іх сюды пад раку, на луг, паласіце іх. А тады ганіце ў Кіраўск. А еслі не будзе кароў, дык і вас не будзе!..

Гэта дзед мне ўжо расказваў, калі мы з ім сышліся.

Дык яны пагналі ў Кіраўск.

А яны ўжо іх — немцы людзей тых, што засталіся, — паставілі ў шарэнак, на сабранне. Два пасёлкі было. Кіламетра не было — гэты пасёлак і гэты пасёлак. Дык яны адтуль і адтуль, а пасярод картошка. Выкапалі яму, загатавалі. І паставілі іх у шар, і піляметы пастаўлялі. І тады: «Столькі і столькі!» І бягом у яму. Гэта расказвалі падводчыкі.

Дык не выдзержаў чалавек адзін з Гарадца, які падводчыкам прыязджаў, — не выдзержаў, памёр.

Людзей у яму, у яму, а тады ён пілямётам пастрочыць, пастрочыць. А бабы возьмуць... як толькі ўжо галосіць, дык так во завязваецца, ды тады ўжо ў яму. Кідаецца. Завязаўшы твар хусткай. А тады ўжо, кажа, другія ўсе...

Адкопвалі потым. Мусіць, сто пяцьдзесят гэтых... чарапоў...

А як закопвалі іх у той яме, дык зямля, казалі, гэтак во дыша, дыша, дыша!.. Гэта падводчыкі расказвалі. Якраз Хвядотавых сваяк быў. Дык ён казаў: «Так усё на мне млела». Памёр той чалавек, ад гэтага і памёр, не выдзержаў.

Калі мы ўжо сышліся са сваім дзедам, дык пашукалі, пашукалі яго сямейных з тыдзень. Чуем — нейкі рой гудзе... А гэта ўжо не рой, ды ўжо мухі, авадні ўсё... А яны закапалі во так — тут дарога, а яны каля дарогі, блізкаў гэтым... Ну, бульбешнік бальшы. Гэты мой дзед і яшчэ чалавекі тры-чатыры: «Давай пойдзем адкопваць. Пахаваем іх аддзельна». Адкапалі. Як за руку возьмецца ўжо, дык і лезе кожа гэтая ўся. Сапрэлі. Ну, дык некаторыя казалі, каб выцягваць, але мой дзед кажа:

— Не буду я крата́ць іх — няхай дзе пакладзены, там і ляжаць.

Так мы іх і прыкапалі, і абгародку паставілі...

После таго ўжо галоўка яго забалела, у дзеда майго. Вот нічога ён так і не ведае... Хлопчыкі мае, як гэта дажыць? І купіць усё трэба, і яго даглядаць, як малое дзіця...»

Вось і казка — не казка пра дзеда і бабу.

Свеціць сонца, дзеці і птушкі шчабечуць, увесь наш свет жыве палетняму, бабка — вясёлая, шустрая, добрая — плача, а ціхенькі, сівы, маленькі дзядок глядзіць...

Толькі глядзіць і нічога як быццам не бачыць.

Калі і сапраўды нічога, дык добра хоць, што ён не бачыць таксама і рою лясной заедзі, і раскапанай магілы з усім сваім родам, з усёю вёскай — таго, ад чаго «забалела яго галава».

Назаўсёды.

## КНЯЖАВОДЦЫ

23 ліпеня — гадавіна трагедыі вёскі Княжаводцы, у Мастоўскім раёне. І выпадковасць прывяла нас туды іменна ў гэты дзень.

Дзень быў, магчыма, такі самы, як і дваццаць восем гадоў таму назад, — спякотны, мляўкі. Паветра трымціць пад гарачымі промнямі. Каласы апускаюць галовы. Дрэмлюць у нёманскіх поймах старыя дубы. Так і цягне ў густую засень, пад іх бухматыя кроны.

На котлішчах вялікай калісьці вёскі — пагарэлыя грушы выгналі пасынкі з-пад кораня, і тыя парасткі сталі ўжо дрэвамі. Млеюць на сонцы адроджаныя дзічкі, нудзяцца на бязлюддзі. Ім не хапае хат, свірнаў, адрынаў, гумнаў, каля якіх было так утульна расці. Ім не хапае вераб'ёў, што шалпаталіся б у лістоце, чубіліся б на пацеху паважным курам-сакатухам, кралі б у іх крупы, спакушаючы сваёй дзёрзкасцю катоў-паляўнічых.

Адна толькі сяліба ўстала з попелу на месцы вялікай вёскі. Адна — з двухсот. Простая драўляная хата. Неяк пачарнела яна... Можа, ад напамінаў пра тое чорнае гора, на якім стаіць? Прыткнулася хата да белай высокай бярозы. Цягнецца бяроза вяршалінай у неба, хоча адарвацца ад зямлі. У хаце часта гавораць пра той колішні вогненны жах, і не сціхае спалох у бярозы...

Хлопчык, які ўлетку прыязджае сюды з Гродна і выгульваецца над Нёманам, не вядзе пад дзічку сябрукоў, бо іх тут няма. Няма яму з кім сябраваць. Чорны Барс — адзіны хлопчыкаў сябар. Вярнуўшыся з ранішняй рыбалкі, хлопчык займаецца ў хаце нейкаю сваёй справай, з Барсам гуляе рэдка.

На парозе хаты стаіць гаспадыня, цётка **Ганна Барадаўка,** пажылая кабеціна ў чорным капоце і бе-лай хусцінцы, завязанай пад бараду. Яна падобная на манашку. Маршчыністы твар, сухія, засмяглыя вусны, трывожныя вочы, якія бачылі так блізка смерць.

Смерць стаяла над двума прытоенымі ў крапіве людзьмі — жанчынай і яе мужам. Смерць была ў мышастым шынялі, у тыгравай накідцы і зялёнай касцы.

Такою бачыла яе жанчына, і, мабыць, ад бабкі ўнук навучыўся ўяўляць смерць іменна так. Ён лепіць мноства фігурак з бура-зялёнага пластыліну. Фігуркі фашыстаў выцягвае, як быццам свядома, на манер старых гатыцкіх майстроў, і постаці іх выходзяць з-пад яго пальцаў доўгія, як нейкія чалавекападобныя чарвякі...

Гэта — ужо ў хаце, куды мы запрошаны, дзе гаспадыня расказвае.

«...Гаварылі ўвесь час, што будуць біць княжаводцаў, але мы ўсё не верылі. І вось раз мая свякроўка ўстала і гаворыць:

— Уставайце, ужо Княжаводцы ачапілі.

Мы ўсталі, глянулі цераз акно — немцы стаяць адзін ад аднаго, як ад сценкі да сценкі. Мой муж гаворыць:

— Пайду я Дзе-небудзь схаваюся, пайду, нібы па сечку каню...

А я яго і не спыталася, дзе ж мне дзявацца, што мне рабіць.

Потым я выйшла, пачала яго шукаць і нідзе не знайшла. Іду і клічу яго ціхенька. А ён кажа:

— Ідзі, ідзі, не спыняйся. Я ў крапіве тут ляжу. Ідзі, кажа, пад хату, ляж у разору і паўзі сюды да мяне.

І я так падпаўзла да яго. Леглі мы адно да аднаго і ляжым...

І чула я, лежачы ў разоры, як ішлі людзі. Адна суседка заплакала, але яны не крычалі на яе, а нешта ёй усё ціхенька гаварылі. А пасля яны зайшлі да мае свякроўкі, я чула, як яны бралі яе, свякроўку маю. Потым яшчэ адзін немец, як забраў свякроўку маю, загаварыў па-нямецку:

— Пайду фарзухан[15]

Зайшоў у хату, паглядзеў і пайшоў.

Тады прыгналі людзей з суседніх вёсак — браць наша дабро, якое засталося. Выгналі каровы.

Падышла наша карова, стала над намі і чмыша. А мы баімося, каб хто не заўважыў, чаго яна тут спынілася. Потым тыя людзі, што былі з лапатамі, прышлі адагналі карову, а нас — не заўважылі.

Антон мой кажа:

[15] Versuchen *(ням.)* — спрабаваць; *тут* — шукаць.

— Людзей закопваць пайшлі.

І яшчэ нам усё не верыцца. Чуем мы, як з нашай хаты ўсё бяруць, як сячкарню ўзялі на двары, плуг. Барану шукалі. Пасля паехалі, сціхла ўсё зноў, і мы думалі, што ўсё ўжо супакоілася. А пасля ўжо — стральба, стральба, стральба!.. І з кулямёта стралялі, і так па адным, і з аўтаматаў. Мы ляжым, а потым бачым — усё гарыць! Ужо наш дом гарыць і суседні за намі гарыць...

Адзін наш сусед, Коўш Мікалай, неяк увечары зайшоў да нас і гаворыць:

— Як будуць нас калі-небудзь запальваць, дык я залезу пад печ. Запаляць хату, разгарыцца добра, дык тады ў дыме я выскачу і пабягу, і ўсё будзе ў парадку.

Ён так потым і зрабіў. Калі запалілі ўсе хаты, каля таго дома, дзе ён пад печ схаваўся, сталі немцы нешта гаварыць. Бо яны так рабілі: дом запаляць і стаяць кругом, чакаюць. Коўш залез гіад печ, а немцы запалілі яго хату і стаяць. Тады ён выбег з агню, і яго злавілі. Гэта людзі расказвалі з другіх вёсак, каторыя падводчыкі. На ім былі гумовыя боты, немцы загадалі зняць іх. Сцягнуў ён адзін, сцягнуў другі, і тады яму ззаду ў галаву стрэлілі. Казалі людзі, што закапалі яго ў той вялікай яме, разам з усімі, але збоку.

Стаялі яны каля хат, пакуль усё дазвання не згарыць. Як жа там уседзіш, пад тым прыпечкам!..

Усе яны былі ў нямецкай форме, у плашчах, у такіх пярэстых, і ў касках усе.

Было гэта дваццаць трэцяга ліпеня — якраз сённяшнім днём. Нават і пятніца была таксама. У сорак трэцім...»

Хлопчык слухае апавяданне старое, слухае быль, страшнейшую, чым казка, а спрытныя пальцы яго машынальна лепяць даўгавязых бура-зялёных фашысцкіх салдацікаў. Яны пры кулямётах, у аўтамашынах, на самаходках. Ім цесна. У нейкай апантанасці саранчы яны ліпнуць адзін да аднаго, счэпліваюцца, звіваюцца, груваецяцца, як змяіны жмут ля карча, у ведзь-маковым воступе.

— Гэта ваш унук? — пацікаваліся мы ў цёткі Ганны.

— Не, Сярожа — мой пляменнік з Гродна, прыехаў на лета.

— А ты, Сярожа, умееш ляпіць птушак або жывёл ці так, звычайных людзей?

Хлопец маўчыць.

— Сумна дзіцяці аднаму, — стараецца ці то апраўдаць, ці то выручыць пляменніка гаспадыня.

У голасе старой адчуваецца туга па людзях, жыхарах вялікай, гаманкой вёскі, па такіх вось бойкіх падлетках, што ўмелі схаласопіць усе агароды, выкупацца па пятнаццаць раз на дзень і разам з тым пасвіць коней, кароў, гусей... Ёй сумна па суседзях — размашыстых нёманскіх плытагонах,

што ўмелі працаваць і гуляць на поўную душу.

Магло б такое жыццё плысці сабе прывольна і шырока, як Нёман, паўнаводны тут, у сярэднім цячэнні.

Магло б...

У смузе віднеюцца парослыя лазняком берагі. Яшчэ вялікія князі літоўскія, мабыць, трымалі ў гэтым месцы водную пераправу на шляху з Вільні ў Ваўкавыск і Бярэсце, а людзі, што ахоўвалі і абслугоўвалі княжацкую пераправу, названы былі княжаводцамі.

Пра тое даўняе-прадаўняе мала хто памятае. Расказваюць людзі навейшыя былі.

Ходзіць у ваколіцы паданне пра сабор у зусім недалёкай, таксама вялікай, вёсцы Дубна, якая ў вайну ацалела. Вялізны, груваскі сабор гэты. Паглядае сюды правалінамі ржавых купалоў і не можа ўцяміць, што ж адбылося. Былі на віду ў яго вялікія Княжаводцы, і пайшлі яны з дымам, няма іх. Гучала зычнымі званамі боская, царская, панская ўлада па Наднямонні, але змоўкла. Таемна збудаваны свет, дзівам пабудаваны і сам ён, гэты сабор. Кажуць, цар загадаў паставіць храм ва ўкраінскім горадзе Дубна, а выканаўцы яго волі нешта пераблыталі, перайначылі «повеле-нне», прыляпілі яго да аднайменнай беларускай вёскі...

Дзейнічала ў Наднямонні, як і скрозь на свеце, і другая, светлая, добрая воля — воля жыцця. Яна зыходзіла ад зямлі, ад людзей працы, ад патрэбы тварэння, увасабляла жыццё і свабоду, была іх разумнай праявай. Пад уплывам жыватворнай сілы святла і волі, імкнення да іх нараджаліся і тут, у чароўным кутку Наднямоння, сялянскія паэты. Як жаўрукі над нівай, яны спявалі гімн жыццю і тварэнню, клікалі наднямонцаў купалаўскім клічам «людзьмі звацца». Не далёка зайшлі галасы гэтых песняроў, але напевы іх тутэйшыя людзі чуюць, як чуе чалавек удары ўласнага сэрца. Паблізу ад гэтых мясцін гучала ў дні няволі і змагання сардэчнае, сціплае і дасціпнае слова паэта Міхася Васілька, а трохі ніжэй па Нёмане і значна раней па часе тут, сярод прыгнечаных беларускіх сялян, знаходзіла несмяротныя вобразы высакародная полька Эліза Ажэшка.

На краі зямлі, якую засявалі жыхары Княжаводцаў, у хлебнай даліне за сасоннікам, уцалела тры хутары. Наводшыбе за былою вёскай.

Вось прысеў каля надмагільнага помніка **Сымон Іванавіч Кая.** Засяроджана кладзе ён бронзу на высечаныя ў бетоне традыцыйныя літары «З. П.» — «здесь покоится». Гэтая праца стала пасля фашысцкага пагрому нібы новай прафесіяй земляроба. Ёсць нешта сімвалічна-жудаснае ў гэтым збегу акалічнасцей. Селянін, гаспадар, які цудам абмінуў сваю смерць, перажыў смерць родных і блізкіх, ніяк не можа ўцячы ад прысутнасці смерці... Яна — побач.

Але не смерць дыктуе яму словы «здесь поконтся», не яна загадвае высякаць адвечнае «З. П.». Дыктуе жыццё, бо яму належыць памяць. Што думае стары падзёншчык жыцця ў доўгія дні марудна-карпатлівай работы? Што думае пра тых, чыю памяць захоўвае залачонымі літарамі? Хіба расказвае ценям і гэтым камяням падзеі таго дня, які аддзяліў яго ад жывых і не злучыў з памёршымі.

«...Тады я, ведаеце, — расказвае ён, — прыйшоў з вяселля, з Сухініч, і лёг спаць у адрынцы. У гэтую ноч я неяк дрэнна спаў. Стала толькі трохі світаць, і я падняўся. Прыйшоў, пастукаў у акно, але жонка спала моцна, ледзь разбудзіў. Увайшоў у хату, ужо было трохі відна. Жонка выйшла на двор, а я яшчэ ўсё хаджу па хаце. Вядома, з вяселля, у галаве шуміць...

Дачка, васемнаццаць гадоў, спала на адной караваці, другая — на другой.

Гляджу я — жонка бяжыць назад у хату.

— Скарэй, — кажа, — немцы за агародамі і крычаць «хальт!».

Ну, ведаеце, яны да нас прыязджалі разў некалькі з Гродна. Набяруць машыну людзей і павезлі. Не на работу. Там іх білі, таўклі, каб гаварылі пра партызан... Адаб'юцьчалавека ад памяці, ён і гаворыць, што ім трэба...

Пачалі яны нашу вёску ачапляць. Пройдзе адзін метраў пяцьдзесят і стане. А некалькі нашых хат на хутарах былі за гэтай цэп'ю. Вось і мая таксама. Яны нас спачатку абмінулі, а потым партыя немцаў аддзялілася і пайшла нас з хат выганяць. Тады я выскачыў праз акно і — пад Нёман...

Калі расстрэльвалі, дык я быў ад гэтай магілы блізка, у лесе. Крыку не было аніякага. Толькі залп быў. І адзіночныя выстралы. Ад стральбы гэтай я пайшоў далей...

Мне расказваў адзін чалавек з Луннай, які быў тады падводчыкам. Памёр ён, гэты чалавек. Ён быў каля магілы. Каторыя застрэленыя падалі не ў магілу, а каля магілы, то гэтым людзям, падводчыкам, загадалі сцягваць іх у яму. Чалавек гэты чатыры дні нічога гаварыць не мог. Не аказваўся. Толькі потым прыйшоў да памяці. І расказаў, што там было...

У форме ўсе яны былі нямецкай. Сядзелі пасля ўсяго, як пастралялі людзей, елі сала, каўбасы, што награбілі...»

Калі вочы Сымона Каі пазіраюць на слухача рассеяным, невідушчым позіркам, а на губах блукае бесклапотная ўсмешка дзіцяці — робіцца холадна. Нарэшце — выраз ціхай скрухі на твары, і субяседнік можа ўздыхнуць з палёгкай — нічога, ён яшчэ нічога... Удару, які перажыў гэты чалавек, не мог сцерці руплівы, мірны час, так і не ачуняў, калісьці дбайны, гаспадар. Скончылася вайна, а ён усё блукаў па чужых вёсках — ні старац, ні работнік. Неяк натрапіў на гэты свой занятак... Рамяство?

Заробак? Ці «кара», а можа, плата за аца-ленне?..

Не вернецца ўжо Сымон Кая з таго пагранічча жыцця і смерці, на якое кінула яго тая хмельная ноч з вяселлем у Сухінічах і раніца з нямецкім ачапленнем у роднай вёсцы. Не паддасца ён спакусе дробных жыццёвых клопатаў, не ўсміхнецца людзям так дапытліва, прыветна і весела, як яго суседка, бабка **Макрына Кавальчук.**

Жыве калгасная пенсіянерка Макрына Іванаўна побач на хутары адна, але агарод развяла як на добрую сям'ю, — тут і бульба, тут і фасоля, тут і цыбуля, тут і мак. Корпаецца бабка Макрына ў. агародзе, як чарадзейка-зельніца на Купалле. Бушуе ў бабкі Макрыны гародніна, як быццам хоча здзівіць яе гарадскіх дзяцей ды ўнукаў, што неўзабаве прыедуць сюды на бабчыны ласункі.

Бабка Макрына малая ростам. З галавою хаваецца яна ў маку, а высокую збажыну, што абхапіла яе хутарок, называе то ласкавым словам «жыта», угадваючы сувязь гэтай расліны з паняццем «жыць», «выжыць», то на рускі манер велічае жыта сваім наватворам — «рошч».

Сапраўды, гэтая «рошч» даравала жыццё і ёй і яе дзецям.

Тады, у ліпені сорак трэцяга, Макрына Кавальчук павяла сваіх пяцярых дзяцей у жыта, нырнула ў жытнюю гушчыню і прапала на колькі дзён, як курапатка з вывадкам.

«...Якраз сягонняка тое самае чысло, як тады, калі нас білі...

Майго мужыка было зваць Змітрук. Яго ўбілі, майго мужыка.

Дзеці гэта я пабудзіла, старэйшыя, а потым гавару сама сабе: «Збегаю да суседкі». Суседка была старэй-шая, ёй было шэсцьдзесят гадоў, а мне трыццаць пяць. Я пабегла да яе і гавару:

— Цётко, ужо немцы ставяць цэп! Трэба ўцякаць. А яна гаворыць:

— Трэба што-небудзь схаваць. А я гавару:

— Нічога нам не трэба, вот уцякайма. Бягайма ў рошч або куды...

Але яна не слухае і сыну свайму кажа:

— Ты, сынок, уцякай; а я буду хаваць што-небудзь. Прыбегла я дадому, а мае дзеці ў сенях стаялі і кажуць:

— І тата пайшоў, і мама пайшла, мы ўжо думалі, што вы нас пакінулі...

Узяла я чацвёра старэйшых, а маленькая спала на ложку, дык я сабе думаю: «Няхай спіць». А потым вярнуласа я.

— Не, — гавару, — будзем, дзеці, пагібаць усе разам.

Узяла я тую дзевачку, і пайшлі мы ў жыта. І сядзелі мы ў тым жыце адзін дзень, сядзелі другі дзень. Немцы хадзілі па полі, крычалі, а мы ўсё сядзелі...

Хлопец адзін мой кажа:

— Я есці хачу. А я кажу:

— Еш жыта! А ён кажа:
— Я табе не варона, жыта дзяўбаць.

Чым я іх карміла, кажаце? Нічым не карміла, сядзелі, і ўсё. Я тады, можа, пяць дзён не піла і не ела, так перапалохаласа... Усё пабілі, усё папалілі, нават і вароны не каркалі. Такі быў страх...

Увечары прыйшлі толькі, на пажарышча паглядзелі. Усё ў нас пагарэла, нічога няма.

Мой муж раней за мяне з дому пайшоў, і там яго ўбілі. А я з дзецьмі асталаса...

Ніякіх жанчын са мною больш не было, толькі сусед наш жывы застаўса. Палазіць ён па жыще, па лубіне каленкамі, пашукае і кажа:

— Няма мае ні мацяры, ні жаны, ні дзетак...

Але яго цяпер няма: ён як пайшоў на фронт, дык немцы яго ўбілі. Звалі яго Юрык Шывілько. Ішоў на фронт, дык казаў: «Пайду сваіх ворагаў забіваць». А як пайшоў, дык і не прыйшоў...

Дзвесце хатаў спалілі.

Ды гэтак стралялі, гэтак білі!..»

Высокаю сцяною стаіць калгаснае жыта вакол агарода і хаты Макрыны Кавальчук. Звіняць, шчыруюць жаўрукі над нівою, весяляць збажыну: ганяй сокі, спей на радасць добрым людзям. Пад гэтую песню спялення адлягае ад сэрца ў старое жанчыны, успамінаюцца сыны і дочкі, зяці і нявесткі, унукі і ўнучкі, што жывуць у гарадах. Яна іх зберагла калісьці ў жыце. Яна іх чакае, прадчуваючы здзіўленне і радасць, што столькі дабра бабка вырасціла адна — чарадзейка на сваіх градах.

Усе бацькі ратавалі сваіх дзяцей. Кожны і кожная па-свойму. Як хто ўмеў. Калі б апісаць толькі тыя шчаслівыя спосабы, якія памагалі ўратавацца, — атрымалася б не адна кніга мужнай бацькоўскай і мацярынскай ахвярнасці, якая магла б з'рабіць гонар любому народу.

Страх скоўвае, страх губіць слабыя душы, страх вызваляе рашучасць у дужых.

Антон Кая, статэчны, акуратны княжаводскі гаспадар, разбудзіў у тую злавесную раніцу сваіх сыноў, чатырнаццацігадовага Васіля і адзінаццацігадовага Мікалая.

— Вы, хлопцы, выганяйце каровы. Ганіце іх, можа, хоць вы застанецеса жыць. А я ўжо стары... Куды дзенешса?..

Так запамятаў апошнія бацькавы словы Васіль.

Паслухалі сыны бацькаву параду, пагналі каровы ў канец сяла. Там іх запыніў вартавы і выкрыкам «направа!» загадаў заганяць жывёлу ў крайні падворак.

«...Падворак гэты, — успамінае **Васіль Кая,** — быў вельмі вялікі, абгароджаны добра. І яны пачалі заганяць туды ўвесь скот — і свінні, і коні, і каровы, — усё разам. А ў тога гаспадара былі вуллі. Скаціна іх разла-

мала. Вылезлі гэтыя пчолы — як нападуць на ўвесь гэты скот! І на людзей! І на немцаў! Яны шынялямі галавы пазакрывалі ды з гэтага падворка ходу. А мы гэтых пчолаў не чувствуям — ці яны кусаюць, ці не кусаюць. Выбеглі мы, падросткі, на вуліцу і думаем: «Куды бегчы, куды тут дзенешса?..» Пагаварылі і пайшлі назад у вёску, туды, дзе ўсе...

А камісар, каторы з Луннай, нямецкі, ён стаяў наперадзе, і мы яго пачалі чуць-чуць вось так абмінаць. А ён заўважыў, што гэта ўвесь скот пайшоў па полі, і кліча нас. Свішча — кліча да сябе. Мы вярнуліса. І паказвае ён нам: «Бярыце ўсё гэта і ганіце туды, дзе паром». Ну, добра. Мы гэта раз-два разбегліса, думаем, што, можа, так і ўцячэм. Ага, толькі мы паспелі туды-сюды, а немцы заўважылі нас, што гэта мы тыя, што паўцякалі з панадворка. Ён — за намі. Бяжыць, бяжыць, свішча. Страшна неяк. Мы спыніліса ўсе і назад. Толькі ўжо не на той падворак заганяе нас, а на суседні. Тады былі на хутарах, далёка двор ад двара.

Сталі мы на падворку, а той немец, каторы нас сюды загнаў, пайшоў. А потым пад'язджае камісар — ён ехаў на брычцы, — саскочыў з брычкі і да нас. Пачаў на нас крычаць нешта і паказвае зноў: «Паром!» І мы тады рассыпаліса хто куды. Я не ведаў, прымерна, дзе мой брат. Толькі мы засталіса з адным другам — мы разам з ім у школу хадзілі. Мы з ім пару кароў узялі — прэм па жыце: каб хоць яны не заўважылі, немцы, што мы ўцякаем. Брыцько Віктар друг мой звaўса. Дагналі мы гэтыя каровы да лесу і тады гэтыя каровы кінулі. У лесе мы зноў разбіліса з маім таварышам... І мы з ім сядзелі ў лесе — ён сабе, а я сабе — чатыры дні. Баяліса выходзіць... Ужо есці хацеласа, дождж, але куды ж там... Пады-дзеш да шашы — машыны едуць, зноў у лес уцякаеш...»

Разлучыцца з бацькамі, з братам, разбіцца, кажучы па-мясцоваму, з другам, адбіцца ад людзей...

Меншы **Кая, Мікалай,** таксама пакутаваў ад разлукі з бацькамі і братам і ад сваёй загубленасці ў гэтым знаёмым і раптам так ачужэлым, такім ашалелым свеце.

«...Як пачалі пчолы цяць гэты скот, — успамінае Мікалай, — некуды яму дзявацца. І пачаў ён, гэты скот, па нас таптацца... І не ведаем мы, куды нам дзявацца. Коні разламалі плот, і ўвесь гэты скот пайшоў, куды каму роўна па ўсім полі.

«Брат мой, відаць, ужо ўцёк, — думаю я. — Як бы гэта і мне да лесу дабегчы». Бачу, брат мой з таварышам да лесу дабег. Як бы гэта і мне!.. Дабягаю я ў лес, туды да Нёмана, і іду сабе, нібы карову ганю. Толькі я хацеў ужо схавацца, а тут мяне зноў той немец, каторы каравуліў, схапіў за каўнер і назад, у вёску. Што ж мне рабіць? Хто быў з маіх таварышаў — усе паўцякалі, а я

адзін застаўся... І яшчэ, гляджу, захапілі аднаго майго таварыша. Я на гэтага таварыша гавару:

— Косця, давай мы будзем прасіцца, можа, нас пусцяць.

А ён кажа:

— А я і прасіцца не буду, і гаварыць нічога не буду. Бо мы ўжо абодва абмерлі са страху. Прыгнаў нас той немец назад у вёску. Ужо ўся вёска гарэла. Машыны пачалі ўжо раз'язджацца. А цэп рабіла прачоску.

Бачым — адзін чалавек праз акно выскачыў, а немцы — за яго. І ўжо не стралялі, а жыўём у агонь кідалі. Ну, нічога я так не баяўся... Думаў, няхай ужо мяне заб'юць, але толькі б у агонь не кідалі жывога.

І ён мяне не страляў, той немец, а вёў туды, дзе гарэла, каб у агонь кінуць. Кажу я свайму таварышу:

— Косця, кіне ён нас жывых у агонь.

І прывёў ён нас на тое самае месца, адкулі» мы ўцякалі. А тут ідзе нейкі афіцэр, ці хто ён. Паклікаў нас пальцам да сябе. А ён умеў па-польску гаварыць. Гавару я яму:

— Пане, я не адгэтуль, я з Сухініч. Тут нас забіваюць, а мне трэба дахаты ісці.

Немец, каторы нас прыгнаў, зараджае вінтоўку, каб застрэліць мяне. А гэты, што сустрэў нас, патрос на яго кіем і пусціў мяне. Я адышоў трохі, а потым вярнуўся.

— Пане, — кажу, — гэта мой таварыш, Косця. Пусціце і яго. Ён таксама з Сухініч, Косця Барадаўка. Каровы пасвіў, наняты ў Княжаводцах...

І немец нас адпусціў. Калі мы ішлі, дык Косця ажно мне свой карандашык аддаваў... Цяпер ён далёка, у Расіі. Жаніўся тут. А чашнікам[16] мяне, нябось, не ўзяў...»

Бацька траіх дзяцей, знатны каваль і электразваршчык у калгасе «Светлы шлях», Мікалай Антонавіч Кая пасяліўся і жыве ў Сухінічах, у той суседняй вёсцы, якую ен назваў роднай у хвіліну смяротнай пагрозы.

Сядзіць ён з намі ў новым калгасным праўленні і нетаропка разважае:

— Цяпер людзі зайздросцяць, што дом харошы я сабе зрабіў. Але не кажуць, колькі я нагараваўся!..

Не трэба зайздросціць Мікалаю, яго залатым рукам, яго рупнасці, яго шчасцю. Хоць дом — і сапраўды як цацка, як нейкі казачны церам. Такое хараство, мабыць, неаднойчы снілася асірацеламу, загнанаму хлапчуку, які пасля тае навалы, як і брат Васіль, не мог жыць нават у замужняй сястры ў Сухінічах. На кожным доме былі вывешаны спіскі яго жыхароў. Па гэтых спісках паліцыя правярала людзей і хапала ўсіх, каго не было ў спісках, а гаспадароў карала за прытулак непрапісанага чалавека высылкай, смерцю. Доўгімі асеннімі начамі тулялася дзіця па кустах. Зімой зашывалася ў адрынкі і гумны. У ня-

[16] Чашнік *(дыял.)* — шафер.

шчаснае сіраты не было дома з дошчачкай, на якой можна было б напісаць імя. Гнаны пагрозаю смерці, забрыў Мікалай ажно пад Ваўкавыск, прытаіўся там пастушком. У тую пару бяздомнасці, непрытульнасці, жахлівай адзіноты як не сніць было яму пра ўласны дом? Можа, іменна тады апаленая крыўдай і горам фантазія і знайшла формы і фарбы гэтага казачна размаляванага дома. Свайго — назло ворагам — бяспеч-нага і ўтульнага гнязда.

Старэйшы брат, Васіль Антонавіч Кая, таксама асеў у Сухінічах, і жыве ён у абжытым, як старая моц-ная борць, доме. Акуратнасць у хаце такая, што боязна ступіць. Кухня чысцюсенькая, бялюсенькая, як аптэка. Спраўнаму муляру з міжкалгасбуда, відаць, падабаецца гэтая звышакуратнасць. І ён за той жахлівы дзень уцёкаў ад смерці і доўгія гады беспрытульнасці паспытаў удосталь агіды да ўсяго неразумнага, бязладнага, грубага і бруднага, што можа несці ліхалецце.

На ганку стаіць хлопчык — Васілёў сын, таксама акуратны, дагледжаны, упэўнены ў сабе падлетак. Ён усміхаецца і не адводзіць позірку, калі адзін з нас хоча яго фатаграфаваць.

«Калі ласка, здымайце, — гаворыць нам яго ўсмешлівы твар, — здымайце, я падабаюся не вам адным, незнаёмыя людзі, ну, што тут благога. Так быць павінна».

Калі мы, у калгаснай кузні, папрасілі Мікалая Каю адарвацца на хвіліну ад кавадла, на якім ён наклёпваў накладкі на тармазныя калодкі для трактара, адарвацца і пайсці на нейкі час з намі, ён, Мікалай Антонавіч, дабрадушна ўсміхнуўся і паслухаўся. Што ж, запішыце, калі гэта трэба.

Хтосьці з яго сяброў па рабоце пацікавіўся:

— Куды ты?

І каваль адказаў са сваёй прастадушнай усмешкай:

— На павышэнне!..

## ЗБЫШЫН

Мясцовыя людзі, на магілёўскі лад, гаворацць Збушын, а не Збышын, як завецца гэтая вёска афіцыйна. Вялікая вёска, свабодна раскіданая па лагодных узгорках дзесяткамі рэдкіх домікаў у садах.

Чэрвеньскі поўдзень, сонечны, але з выразнымі намёкамі на блізкі пералётны дождж. На зялёнай паляне ўзвышаецца некалькі старых ліп. На сонцы і ў густым цянёчку шуміць шматфарбны святочны натоўп. Самадзейны духавы аркестр час ад часу старанна выдзімае полькі, кракавякі, вальсы. Але танцаў няма... Прадаюцца напіткі, марожанае, кнігі. Малыя бегаюць з каляровымі шарамі на нітачках, шары і лётаюць і лопаюцца — на звонкую, шчабятлівую радасць. Старыя людзі то ідуць яшчэ ад хат, спакваля паспяваючы на свята, а то ўжо сустракаюцца з суседзямі, аднавяскоўцамі і з бліжэйшых вёсак, з прыезджымі землякамі — з раённага Кіраўска, з Бабруйска і, як тут гаворыцца, з Мугулёва. Няхай сабе — цяперашнім светам адусюль недалёка, а ўсё ж сустрэчы блізкіх бываюць не вельмі частыя. Усё спяшаемся, браток, кудысьці ўсё бяжым... Моладзь — як моладзь — паводзіць сябе або трохі бяздумна, або проста весела, то ходзячы групкамі, то стоячы, аднак жа і стрымана. І танцаў няма, і песень не чуваць, і кракавякі гучаць недарэчна...

Што ж, каб не помнік на ўскраіне паляны, на лёгкім узгорачку каля агародаў, ды каб не ведалі людзі, штб іх сабрала, можна было б лічыць, што весялосці тут малавата. А некаторыя нават і плачуць...

Сёння трыццатыя ўгодкі таго жахлівага дня, калі ўвесь Збышын быў расстраляны і спалены. Сённяшнія дзеці і моладзь — гэта падсада, якая ўзнялася на крывавых папялішчах ад таго, што трохі збышынцаў, цяпер ужо і ў сіле веку, і старых, вярнуліся з партызанскіх атрадаў, з франтоў, з няволі, з эвакуацыі. А яшчэ менш людзей, вельмі і вельмі нямнога, цудам ураталалася ад фашысцкіх карнікаў.

Тут, у натоўпе, нам іх, па адным, па два, паказваюць — людзей *з таго свету,* з-за той мяжы, што 21 чэрвеня 1942 года пралегла агнём і крывёю паміж былым і сённяшнім мірным жыццём.

Мы просім гэтых людзей, то аднаго, то другога, пайсці з намі ў далейшую хату, дзе не чуваць будзе свята, і расказаць пра тое, што было. Яны ідуць ахвотна, можа, і таму яшчэ, што тут, у натоўпе, іх не бярэ, не супакойвае сённяшні сонечны дзень, а хочацца, больш чым калі, гаварыць пра мінулае.

Недалёка ад паляны, дзе стрымана гамоніць святочны натоўп, над Збышынам, на абгарэлай ліпе, узвышаецца буслянка. Бусляняты яшчэ не лятаюць — яны бялеюцца на гняздзе, і іх далёка і здалёк відно.

Відно іх і праз акно той хаты, дзе на стале, які засланы белым абрусам і застаўлены кветкамі, ціхенька шуміць наш руплівы магнітафон, перад якім самавіта сядзіць **Соф'я Піменаўна Скірманд,** поўная і спакойная сямідзесяцігадовая бабуля.

«...Людзей, значыць, гналі ў хату — у маю. Я раньша за іх увайшла ў хату сваю, першая. Двое дзяцей са мной было, хлопчыку тры гады, дзевачцы восем месяцаў было. Я ўвайшла ў хату — бачу, што плоха. Я ўдарыла ў акно — яно вылецела. Я дзяцей высадзіла за акно.

Пытанне: — А яны яшчэ не акружылі хату?

— Яны ж яшчэ гоняць толькі. Бачу, што ўжо людзей гоняць. Куды гоняць? Я яшчэ не знаю, куды гоняць. Дзяцей кінула ў акно і сама адпаўзлася вот так, як да дзвярэй...

Я ляжу, двое дзяцей са мной. Гляджу і туды, і туды. А Збушын гарыць. І людзі ў маёй хаце... Што ж гэта людзей не чуць, а стрэлы ў маёй хаце? Ага! — яны людзей б'юць...

А я ўжо прызямлілася, і мне нічаго не слышна. Ляжала, ляжала — прылятае самалёт. Гэты самалёт пачаў нада мной кружыцца. «Ну, цяпер уб'ёць мяне!..» Гляджу на яго з-пад палы.

Ну, калі самалёт гэты праляцеў, прыляцелі буслы. Во тут, відзіце... Гнёзды ж гарацъ іхнія. Дзеці гарацъ! Яны так: зах-зах-зах!.. Нада мной лятаюць. Можа, яны не нада мной, а мне здаецца, што нада мной... Гэтыя дзеці... Згарэла гняздо іх, дзе і цяпер буслянка, толькі было бліжэй...»

Тут мы міжвольна глядзім у акно — на сімвал мірнай дамавітасці, які нерухома бялееццa яшчэ нясмелымі буслянятамі на высокім гняздзе — над зелянінай яблынь, вішань, бяроз.

«...Ну, гэтыя буслы паляцелі, — расказвае далей бабуля, — прылятаюць вораны. Чорныя-чорныя!.. «Ну, — думаю, — гэта мяне есці будуць!..» Абратна — уніз-уверх, уніз-уверх! Ляталі, ляталі і гэтыя паляцелі.

Праязджае на кані той, каторы дабіваў. Відзіць, што чалавек жывы, — дабівае. Я вочы прыадкрыла і ціхонька гляджу на яго... А дзеці мае не варушацца, спяць. Заснулі.

Можа, шагоў дзесяць не даехаў, павярнуўся і паехаў...

Я ляжала да самага вечара. Вечарам дзеўка ста-ла плакаць, маленькая, восем месяцаў. Я гавару: «На, дачушачка, грудзь...» Зашумелі машыны і пайшлі. Я думаю: «Падыму галаву». Так сяйчас жа машыны сталі. Бачу: яны з машын убачылі, што ў жыце дзеці схаваліся: матка з бацькам і чацвёра дзяцей. Спыніліся і пабілі. Там другі чалавек падняўся глядзець — яны і таго забілі. Даехалі да таго і забілі.

А я ляжу.

Стрэлы перасталі. Дзеці плакаць пачалі. Я паднялася і пайшла ў лес...»

**Мікалай Хадасевіч,** цяпер мужчына ў самай сталасці, тады

трынаццацігадовы хлапчук, які бачыў фашызм так зблізку, — свежым, чыстым позіркам дзіцяці, якое ўжо многае разумела амаль па-сталаму.

«...Спынілі мяне на вуліцы: «Ідзі на сабранне!»

Ну, я і пайшоў. Прышоў, тут мужчыны былі ўжо сагнаны ўсе. Ну, і за мяне і — сюды. Потым пагналі нас па вуліцы. Там быў сарай, вярней — гумно. Гналі немцы і паліцэйскія. Тут чорт іх паймеш: форма нямецкая, і ў рускай, у гражданскай.

Ну, потым стрэлілі ў страху з трасіруючых куль. Страха загарэлася.

Пытанне: — А што людзі паміж сабой?

— Нічога не гаварылі. Тут быў у нас адзін, Навуменка Андрэй, яго тожа спалілі, дык ён, відзіце, па-нямецку добра панімаў. Ён і гаворыць: «Будуць нас паліць». Чуў, як яны па радзіве... Сядзіць адзін з на-вушнікамі і гаворыць. Дык ён і чуў, той Навуменка, і гаворыць: «Шчас нас пагоняць у тое гумно і паліць будуць».

Калі загналі — зразу запалілі. Ну, кой-хто жыуцом выскачылі. Былі бакавыя вароты, іх, значыць, абвалілі, ну, і сталі выскакваць. Ну, а я, — там было дзе зярно сушыць, называлася ёўня, — я папаў туды і сядзеў, пака ўжо шапка на галаве не загарэлася. А брат мой раней выскачыў. Ён устае выскакваць, а мне крычыць: «Лажысь!» Я каля яго і лёг. Яго забіла, а мя-не раніла, метраў восем, не больш, ад хлява. Ну, потым гэта я і ляжаў. Стрэл быў сільны: не разабраць — дождж ці страляюць. Крык, шум!.. Стаў стрэл аці-хаць. Пайшла праверка. Вот яны, калі падышлі паўторна ка мне, я ніцма ляжаў. Яны, значыць, ствалом пад правую броў паднялі мяне. Вот так, як на рукі на выцянутыя. Што-та па-нямецку гэркнулі, пусцілі. Падумалі, што я ўбіт.

Ну, а што вот так раненыя крычалі, дык тых яны дабівалі.

У. часоў дзевяць яны паехалі. А ранілі мяне, значыць, у час дня. Я падняўся — сонца ўжо заходзіла. Я пайшоў па вуліцы, да свайго дома пайшоў. На вуліцы забітыя, у дамах — хто пагарэлі; дома ў мяне так-сама нікога. Сцямнела. Ногі мне стала падцягваць, раненыя, кроўю сышоў.

Пытанне: — Дык дзверы, кажаце, мужчыны выламалі?

— Ага, як толькі гумно запалілі, значыць, і выламалі...

І адзін яшчэ мужчына быў. Дзевачка ў яго была гады два. Яна вот так ручкамі як узялася за шыю, наперадзе, так ён яе і вынес. Яна і цяпер жывая...»

Што жывая яна і сёння, што яна будзе жыць, непераможна паўтараю-чыся ў іншых дзяўчынках і хлопчыках, — пра гэта радасна думаць, гледзячы на таго ж Мікалая Хадасевіча ў натоўпе, дзе побач з ім — пляменніца Галя, маладая мама, а на руках яе — адно з тых несмяротных паўтарэнняў — сын.

Усё выглядала тут проста, на гэтай паляне, звычайна, знаёма. І помнік, падобных да якога мы нямала бачылі ў розных кутках Беларусі. І трыбуна, якою стаў кузаў выходнага сёння грузавіка, акуратна пастаўленага куды трэба. І выступленні некаторых таварышаў, з чаго пачалося жалобнае свята. І жэрдзе агароджы адразу за помнікам, дзе сеў і раптам загалёкаў певень, дарэчы, нікога не насмяшыўшы. І дождж, што якраз тады і пайшоў, калі яму ўздумалася, не зважаючы на людзей з іх прамовамі.

І выступалі людзі проста.

Старшыня мясцовага калгаса імя Ільіча **Рыгор Захаравіч Каган.** Трыццаць гадоў таму назад — дзесяцігадовае яўрэйскае хлапчаня, сынок вясковага каваля, дзіця, што зведала безліч пакут ад ворага і ўратавалася ў сваіх людзей. Цяпер ён — аграном з вышэйшай адукацыяй, гаспадар, паважаны людзьмі, з якімі працуе. Гаворыць доўга, але і талкова, даючы агляд міжнароднага становішча, звязваючы мінулае з задачамі сённяшняга дня. І, між іншым, калі ён гаварыў пра тое, што адбывалася тут *тады,* міжвольна абраніў фразу, якую хочацца запісаць:

*«Мужчыны з пагонамі на плячах* забівалі жанчын, старых, нямоглых і дзяцей...»

Таксама — проста гэта сказана, але ж і прадумана, адчута па-свойму, на ўсю глыбіню той страшнай неадпаведнасці: мужчыны з пагонамі — не салдаты, а забойцы безабаронных.

Затым прамаўляў таварыш **Савіцкі, Іван Максімавіч,** тутэйшы чалавек, які працуе ў райсавеце, а трыццаць год таму назад прайшоў праз пекла збышынскага дня. У адрозненне ад старшыні калгаса ён напісаў сваю прамову загадзя, яе па службе перадрукавала ма-шыністка. Але дождж, што якраз тады прыпусціўся, перашкаджаў чытаць, а слёзы — туманілі вочы. Савіц-кі менш ураўнаважаны за Кагана, нашмат старэйшы за яго, больш стомлены і ўражлівы, і прамова ў яго не-як не атрымалася. А можа, нам так здалося яшчэ і таму, што ўранні, пакуль прыехаць у Збышын, мы з ім сустрэліся ў Кіраўску, дзе нам Іван Максімавіч расказваў пра *той дзень* — і многа, і на ўсю душу — слёзы хаваючы ў дыме папярос, якія ён прыпальваў адну ад адной.

...Замужняя сястра жыла на ўскраіне Збышына, метраў за трыста ад лесу, і ён, малады партызан, зайшоў да яе на досвітку, вінтоўку схаваўшы на ўзлеску.

Сястра рыхтавала снеданне, а Іван прылёг на ложку і забаўляўся з малымі пляменнікамі. І тут зайшлі паліцаі. Спыталіся, ці няма партызан. Яны былі не мясцовыя і яго не ведалі. Загадалі ісці на сход. (Злавесны «сход»! Амаль усюды карнікі пачыналі з гэтага...) З'елі нарыхтаванае не для іх і пайшлі.

Гаспадыня, узяўшы малых, пайшла, куды было загадана, а Іван — на ўсякі выпадак — залез на гарышча адрыны. Пачаў пазіраць праз шчыліны ў шчыце.

Трывога, страшнае прадчуванне пачаліся тады, калі сястру, што прыпынілася з дзецьмі каля брамкі, тры немцы, якія ішлі па вуліцы, прыкладамі і з лаянкай пагналі на той сход... Самі яны зайшлі ў яе хату, разбушавалі там усё (яму было чуваць з гарышча), а потым прыйшлі і ў хлеў. Іван загробся каля самай сцяны ў кастрыцу. Але яны толькі карову выгналі на двор, паганялі курэй і пайшлі.

«...І ў гэты момант, — расказвае Іван Максімавіч, — у вёсцы пачалася страшная страляніна...»

Юнак зразумеў, што страляюць людзей... І адбылося зноў тое дзіўнае, што мы чулі ад многіх, — у самай неадпаведнай, жахлівай сітуацыі чалавека схіліла на сон. «Пачынаю драмаць, засынаць пачынаю...» Ды тут пачуўся шум, запахла дымам... Выглянуўшы праз шчыліну, ён убачыў, што ўсе будынкі навокал падпалены, усё гарыць — хата, істопка, адрына. «Няхай яна, адрына, добра загарыцца, — падумаў ён, — тады я вылезу, тады немцаў блізка не будзе». Як ні затульваўся ў лаліто — пякло. Саскочыў з гарышча і выйшаў на двор.

«Што ж мне рабіць? Бегчы ў брамку — там гарыць істопка. Справа гарыць хата. А між адрынай і хатай, метраў так дзесяць, — частакол стаіць, і прытым метраў тры высаты. Ну, вапервых, тое гарыць і другое гарыць — можа збіць мяне агнём. Ну, мяне гэта не ўстрашыла. Мяне ўстрашыла тое, што я паднімуся на тры метры і немцы ўбачаць мяне. Думаю: легчы пасярод двара — пастройка густая, я не выдзержу... Ну, нейкая проста інтуіцыя. У гэтым хляве было трое дзвярэй. Я вышаў з адных і ў другія зайшоў. А ўсё гарыць нада мной. Потым я ў трэція дзверы — гляджу: дзірка! Пад сцяну дзірка! Хто яе выкапаў, гэтую дзірку, — ці то сабакі, ці то людзі для спасення?.. «Ну, — думаю, — я спасён!..»

Хлеў загарэўся. І я стаю там. Ну, знаеце, калі свеч-ка гарыць, дык па краях жарка, а ўсерадзіне — не. Гарыць хлеў кругом мяне, а я стаю. І калі мне ўжо не можна было стаяць, мяне пекчы пачало, я і палез пад сцяну. А там было жыта. Ужо хавала чалавека. А ўперадзе стаяла Лявонава гумно, мае сястры дзевера. Я так рашыў, што я вось дапаўзу датаго гумна, а там, дзе бульба пасаджана, па баразне ў лес. Там у мяне вінтоўка, і — я пайшоў!..

Не дапаўзаю я метраў пятнаццаць да гэтага гумна — гляджу: тры немцы і станкавы кулямёт!.. Мяне магічаскай сілай перавярнула назад да гарашчага хлева. І я ў баразну лёг. І думаю так: «Нойдуць — чорт іх бяры, хай страляюць! Ззаду...» А тут той хлеў: р-р-р-р! — абярнуўся. Згарэў і абярнуўся.

Я яшчэ бліжэй, але так, каб не зусім пякло. І ляжу. І тут... Такую дэталь трэба, відзіма, расказаць? І тут — свіння! І пачынае кружыцца вакол мяне, мажа, таму, што ба-чыць: жывы чалавек. Я думаю: «Божа ж мой, немцы ж стаяць! Яны прыдуць не з-за мяне, а з-за свінні і, значыць, абнаружаць!..» Я так, лежачы, пяску ўзяў і вот так! (Паказвае, як кідаў.) Яна і адышлася.

Страляніна к гэтаму маменту ўжо сціхла. Гадзін сем вечара. А я ўсё ляжу. Чую: машыны загулі і пайшлі на Чычэвічы... І тут — два выстралы! Выстралаў не было даўнавата, і тут — два выстралы. Я думаю: «Яшчэ каго-та знашлі...»

А гэта, як я пазней даведаўся, забілі суседку маю, Бараноўскую Алену, і дочку яе, чатырнаццаць лет, якія таксама ляжалі ў жыце. А немцы іх знайшлі і забілі.

Прайшло яшчэ гадзіны дзве пасля гэтых двух выстралаў. І тут — яшчэ адзін!

Я думаю: «Няўжо яшчэ каго-та знайшлі і забілі?..»

Гэтым апошнім стрэлам забіты быў Іванаў бацька.

Стары — яму было шэсцьдзесят сем гадоў — хаваўся цэлы дзень на ўзлессі, удвух з дарослым пляменнікам. Як той ні ўгаворваў ісці далей у лес, дзядзька не мог адарвацца ад страляніны і агню, дзе засталіся *ўсе*, усё ягонае. Калі страляніна сціхла, а потым і машыны пайшлі са Збышына, ён выйшаў з лесу і пайшоў у вёску. І сутыкнуўся з коннымі паліцаямі. Апошнімі...

Той стрэл — апошні ў Збышыне — Іван пачуў, але па кім ён — даведаўся значна пазней...

«...Апоўначы я падняўся, выйшаў на вуліцу, і тут мяне апанаваў жывотны страх. Вінтоўка стаіць трыста метраў адгэтуль, у кустах, а я баюся ісці ў лес... Думаю, не пайду я ў лес, а пайду ў другі канец вёскі, дзе наша хата. А па вуліцы я таксама баюся ісці. Цераз плот пераскочыў, па загароддзі пайшоў.

Іду я і — зачапіўся. Пазнаў: ляжыць свёкар мае сястры. Далей — гляджу — ляжыць яго жонка. Іду ў канец, дзе наша хата. А там адзін выкапаў сабе бліндаж. Думаю: можа, хто-небудзь там схаваўся... Ляжаць ручнікі, знаеце, навалачкі — кругом гэтага бліндажа. Я зразумеў, што тут жывых людзей быць не можа — гэта ўжо выграблі немцы ўсё. Я яшчэ галаву туды ткнуў і вокрык зрабіў. Чую: пахнець парахавым газам. Значыць, яны кідалі туды гранаты.

І тут я, значыць, далей пайшоў.

А там калхозны двор быў, чатыры адрышы. Дык тры згарэлі, а адна цэлая засталася. А далей, пад рэчку, мой бацька пасеяў проса. Я аб гэтым знаў. Бачу: ляжаць жанчыны, чатыры жанчыны — адна за адной. Па баразне ляжаць, бітыя. Я, значыць, думаю, мо там — маці... Ужо цёмна, паадзежы я апрадзяліў, што мацеры мае тут няма. Гляджу — і мужчына ляжыць біты.

Падбег я, думаю: бацька! Не, гэта ляжыць мой дзядзька.

У нашым дварэ ўсё згарэла, а засталася істопка. Там у нас бервяно ляжала. Я сеў, пасядзеў маленька і думаю: «Што ж мне далей рабіць?..» Аў вёсцы ўжо нічога няма, ядзінсцвенны брэша Антонаў сабака. Па голасе яго пазнаў...

Пайшоў я потым да нашай Вятранкі. Рэчка такая ў нас. Сеў на беразе, ногі спусціў... А потым чую, што па рачулцы нехта: цёп-цёп, цёп-цёп... Пераходзіць рэчку! «Ну, — думаю, — жывы чалавек!..» Я цераз гэтую рэчку. А старая, што ішла, увідзела і — уцякаць. Я малады, ёй гадоў семдзесят было — я яе дагнаў, і яна мяне хрысціць:

— А галубок ты мой!..

— Дзе вы былі? — пытаюся.

— А ў кустах, — гаворыць, — сядзела. Кругом мяне хадзілі немцы і не ўбачылі. І я жывая засталася.

Я яе за руку... У той мамент, вы знаеце, каб кот жывы быў — і то другое настраенне, а тут — жывы чалавек!.. Я за руку старую, і пайшлі мы ў лес.

Там ёсць так называемы Антонаў ельнік. І я па сілуэтах бачу: людзі паявіліся. Я гэтай бабе сказаў легчы, а сам прысеў і вокрык даў:

— Хто ідзёць?

Я як крыкнуў — усе ў лес! Ну, значыць, — свае. Каб гэта паліцэйскія, дык яны б затворамі пачалі клацаць. Я падняўся:

— Хлопцы, я такой-та, не ўцякайце!

Яны астанавіліся, сустрэціліся мы. Там быў і зяць гэтай старое. Я гавару яму:

— Вось што, Ціхан, ты бяры старую і ідзі ў лес. А мы, хлопцы, пойдземце ў вёску. А можа, дзе хто ранены, ды падбяром, ды вазьмём.

Паслухалі яны мяне, як камандзіра нейкага. І мы так ідзём, значыць, па рэчцы. Ну, рэчка, як правіла, ідзёць па нізе. Людзі ўцякалі па рэчцы, а яна ў нас такая, што, як кажуць, пятух перайдзёць. І вот ляжыць уначале Васіль Енаў. Тулавішча на беразе, на пясочку, а другая палавіна ў рэчцы. Мы яго выцягнулі на бераг. Ідзём далей па рэчцы — ляжыць Барыс Стасеў. І ў яго, значыць, дзве булачкі хлеба было: ён хватануў з сабой. Ну, а мы ж цэлы дзень не елі! Ну, мы гэты хлеб тут жа разламалі. Ну, і пайшлі так у канец вёскі. Прыходзім у канец, і мне здалося, што мае маці голас што-та гаворыць...

— Стоп, хлопцы, — кажу я, — астанавіцеся! Чую: точна, маці мая гаворыць. Я іх кінуў і, як хлапчук, пабег туды...

Прыбег — яны ўсе стаяць каля нашай істопкі.

Стаіць наша Каця (яшчэ цяпер жывая), Вольга (памерла ўжо) і — матка мая... І стаіць дзядзька мой Захар (ён, праўда, памёр ужо ў пяцьдзесят сёмым годзе). У яго ранена

во так рука і во так нага. Стаіць і ўвесь дрыжыць.

Я гавару:

— Мама, і ты, Каця, ідзіце, во там хата цэлая не згарэла. Замачыце мачою...

Другога выхаду няма. Я знаў, што гэта ўсё-такі прафілактыка.

Пайшлі яны ў хату, маці парвала кашулю, зрабілі ўсё, перавязваюць дзядзьку. А я тут успомніў, што бачыў каля аднаго кажух. І гавару, што пабягу вазьму яго, бо дзядзька ўвесь дрыжыць. Дык я цераз плот пераскочыў, а там у нас такая... называецца палудрабінка. І я так па сілуэтах бачу: людзі там! Шавеляцца пад той драбінкай. Я прыбягаю туды — сядзіць Ігнаціха Варка, ёй пад той мамент было таксама пад семдзесят, і Піліпіха, сляпая.

— Чаго вы тут?

— А сыночак наш, а немцы тут пахадзілі і сказалі: «Няхай жывуць — Савецкаму Саюзу на расплод будзе!..» І кажуць бабы: — А вунь там Міша ранены ляжыць. Можа, ён, дзеткі, яшчэ жывы.

Я пайшоў. Ноч, цёмна, але знайшоў. Нежывы. Тады я пабег, кажух той узяў, забраў гэтых старых. А яны не хочуць ісці:

— А дзеткі, а куды ж мы пайдзём? Нас ужо не пабілі, так ужо і не паб'юць.

Пакуль я прышоў, Захару раны перавязалі ўжо.

Па дарозе ў лес дзядзька мне расказаў, як ён уцалеў. Іх, мужчын, загналі ў гумно, а жанчын у Скірмандаву хату. Калі, значыць, запалілі гумно, мужчыны выламалі вароты і — хто ўцёк, значыць, уцёк, калі забілі, значыць, забілі, застаўся ў гумне — згарэў у гумне... Дзядзька Захар, значыць, калі загарэлася гумно і зламалі вароты, ён таксама выскачыў. На ём загарэлася фуфайка. Ён лёг у жыта, фуфайку зняў і ў радам стаяшчы двор пабег. А там стаяла — проста, па-нашаму кажучы, — бочка, і ён у гэтую бочку залез і сядзіць. Прышоў немец — зірк! — сядзіць. Р-р-раз туды! І ён як сядзеў у бочцы, дыкяму руку і нагу прабіла. А немец падпаліў гумно. Ну, а дзядзька ўсё-такі жывы. Ён тады павярнуўся бокам, бочку перавярнуў і пакаціўся з бочкай. І ў рэчку, пад карча. І так ён там сядзеў у вадзе да поўначы, ранены. Вот ён пагэтаму так і тросся...

З таго гумна, дзе мужчын зачынілі паліць, многія вырваліся. А жанчыны з дома — толькі дзве. Скірманд Соня. Гэта ў яе хаце жанчын палілі. І Вольга такая была. Мы яе, раненую, таксама ў лагер потым узялі. І Данілу Вараб'ёва знайшлі. Гэты Даніла быў шавец. І ў яго былі боты. Ён, праўда, трохі кульгаў. Паліцэйскі гаворыць яму:

— Здымай боты!

— Не, — гаворыць, — не здзену. Заб'еш — тады здзенеш.

— Заб'ю! — гаворыць той.

— Ну, на, страляй!

Ён яму — р-раз, тут жа і выстраліў. Прабіў яму лёгкія. Маці мая яго потым вылечыла. Яна ў бальніцы работала, разбіралася. І лячыла яго. Сям'ю яго ўсю ўністожылі — і дзяцей, і жонку...

Мой бацька...

Мне сказалі, што ён ляжыць забіты, і сказалі дзе. Ну, я, значыць, туды і пайшоў...

У яго такая барада была — красівая рыжая барада. Яшчэ я быў малы, калі ён, помню, пабрыўся, дык мы, усе дзеці, закрычалі на яго, каб ён не брыўся... З барадою ён быў сімпатычны такі. Барада ў яго залацістая была...

Яму сюды, у патыліцу, як далі, дык усю сківіцу, усю бараду і сарвала...

Я пабег у вёску, знайшоў, значыць, абгарэлую лапату, прыйшоў туды, выламаў кій, асадзіў сяк-так, значыць, выкапаў ямачку, зняў з сябе паліто, загарнуў яго і пахаваў. Прысягнуў я над ім, паплакаў з мамай, і пайшлі мы...

Калі мы прышлі туды, дзе палілі жанчын, — гэта было так страшна... Лоўж людзей!..

Мама пачала шукаць дачку, маю сястру.

А я яшчэ дзяржаўся, пакуль бацьку хаваў, а калі падышлі ўжо сюды, дзе жанчын палілі, мне стала дрэнна...

— Мама, — сказаў я, — шукаць не будзем.

І мы пайшлі туды, дзе палілі мужчын. Што засталося ў памяці на ўсё жыццё, дык гэта сын мае дваюраднай сястры. Там ёўня была, дык ён залез у печку ў ёўні і там згарэў. Ногі тырчаць адтуль, вы разумееце, абгарэлыя...

Майго сродства загінула ў той дзень дваццаць пяць душ.

А ўсіх у Збышыне забілі дзвесце дзевяноста шэсць.

Пытанне: — А якую прычыну яны прыдумалі, што гаварылі, калі сагналі людзей?

— Нічога не гаварылі. Прычына была, я думаю, толькі тая, што гэта — савецкія людзі...»

* * *

«Мы абавязаны знішчаць насельніцтва, — гаварыў Гітлер, — гэта ўваходзіць у нашу місію аховы насельніцтва германскага... Калі ў мяне спытаюцца, што я падразумяваю, кажучы пра знішчэнне насельніцтва, я адкажу, што маю на ўвазе знішчэнне цэлых расавых адзінак...»

Такі быў план. А потым ужо, у працэсе яго ажыццяўлення, прыдумліваліся нейкія прычыны. А то, бывала, і так — без іх.

Выконваючы гэты «план», фашысты спадзяваліся такім чынам атрымаць і спакойны тыл. Каго не заб'юць, не спаляць, той змярцвее ад жаху. Правялі каля ног у кожнага рыску: паварушышся — смерць табе і блізкім, і ўсёй вёсцы, а калі гэта горад — усёй вуліцы...

Але наўзабаве пасля «пераможных» рэляцый пра тое, колькі знішчана «партызан» (тых самых збышынскіх ці хвойненскіх дзяцей і жанчын), у стаўку фюрэра пайшлі зусім іншыя.

Фон Клюге: «А тут у тыле ў мяне ўсюды партызаны, якія ўсё яшчэ не толькі не разбітыя, але ўсё больш мацнеюць... А 400 гэтых праклятых дыверсій на чы- гунцы!»

«Тым лепш», — сказаў Гітлер у ліпені 1941 года, упершыню пачуўшы пра савецкіх партызан, бо разлічваў, што пад выглядам барацьбы з партызанамі будзе выконваць той самы «Генеральны план Ост». У 1942-м, а тым больш у 1943-м і ў 1944 гадах, калі фашысты трацілі апошнюю веру ў пераможны вынік вайны, а ў Беларусі не заставалася ў іх спраўных чыгунак, — тут ужо Гітлер не лічыў, што «тым лепш». Загадзя запланаванае знішчэнне народаў Савецкай краіны ўсё больш пачынала набываць характар помсты — садысцкай помсты жанчынам, дзецям за тое, што савецкія людзі не захацелі скарыцца і ў самых трагічных умовах працягвалі барацьбу.

1255 баявых партызанскіх атрадаў — такі быў адказ беларускага народа на разлікі «тэарэтыкаў» і «практыкаў» фашызму, адказ на тое, што беларусы, маўляў, «найбольш рахманыя, бяскрыўдныя» з усіх славян, што тут можна будзе ўладкоўвацца ў поўнай бяспецы, — арганізаваць «запаведнік» для людзей, для цэлых народаў. Бо ставілася такая мэта — усю Беларусь ператварыць у міжнародны канцлагер, дзе прайшлі б «асобую апрацоўку» (у газавых камерах, у печах крэматорыяў, каля магільных ям) тыя народы Еўропы, якія «перашкаджалі» фашысцкай Германіі пашырацца на поўнач, на захад, на поўдзень, на ўсход...

Вось як гэта сфармуляваў адзін з найбліжэйшых памагатых Гітлера, «тэарэтык» Розенберг, за два дні да нападу на СССР:

«Непасрэдна да гэтай граніцы *(перад тым размова ішла пра будучыню Прыбалтыкі. — Аўт.)* прымыкае беларуская — як цэнтр збірання ўсіх сацыяльна шкодных элементаў, цэнтр, які будзе ўтрымлівацца накшталт запаведніка».

Але спачатку, як ужо гаварылася, планавалі «выселіць» (знішчыць) 75 працэнтаў беларусаў, — каб спакайней было працаваць у тым «запаведніку».

І гэта рабілася: расказы ў нашай кнізе — іменна пра вёскі, якія былі забіты, пра цэлыя раёны, вынішчаныя, спаленыя разам з людзьмі.

Аднак за лёсам гэтых вёсак, гэтых людзей трэба бачыць і іншае: сотні тысяч дзяцей, жанчын, старых і нямоглых жыхароў нашых вёсак і гарадоў, людзей, якіх выратавала ад знішчэння ўсенародная партызанская армія, — выводзячы іх у лясы, за фронт, ствараючы ў варожым тыле савецкія раёны, абараняючы і атакуючы. Паўмільённую плойму

фашысцкіх забойцаў праглынула вогненная партызанская зямля...

Калі фашысты не здолелі, не змаглі рэалізаваць свой план «абязлюджання» Беларусі, стварэння на яе тэрыторыі вялізнага «запаведніка-канцлагера» для народаў Еўропы, дык гэта не таму, што яны перадумалі ці расхацелі. Узняўшыся на свяшчэнную барацьбу, савецкі народ, народныя мсціўцы — партызаны, Савецкая Армія зламалі гэты гітлераўскі план.

## ВЯЛІКАЯ ГАРОЖА

За добрым жытам — спакойная вёска, якая мела, мае і павінна мець права на мірную, працавітую цішыню.

Даўнавата дажджу не было, а пазаўчора і ўчора раздобрыўся. Цяпер пагодлівы адвячорак. А ў лесе, што сінеецца за жытам і за вёскай, пайшлі патроху першыя чэрвеньскія сыраежкі.

Двор, у які мы зайшлі, акуратны, роўна парослы чысценькай травой. Многа дроў, складзеных у стажок. Каля ганка бабуля чысціць грыбы. Сама ў гумовых боціках, яшчэ мокрых: толькі што з лесу вярнулася. Тут яно і прыйшло — адкрыццё штогадовай радасці: пасля дажджу — грыбы. І добрая зачэпка для размовы.

Бабулі Патапейка, Марыі Змітраўне, семдзесят другі год, хоць па выгляду столькі не даў бы. Рухавая, прыветліва вясёлая. Ажно яе вяртаць у даўняе, у страшнае не хочацца. Ды ёй і самой не ахвота. Вось пасумнела адразу...

«...Раненька я ў печы палю, бліны пяку, ну, а хлапчук быў у нас, сын, дык ён пабег на вуліцу — ужо гуляці к суседам. Ужо бег ён туды, бег — ой, нешта па вуліцы страляюць, пулі свішчуць!.. Ну, дык мы закрычалі на яго:

— Вот табе нада бегчы, сядзі ціхенька!

Ну, ідуць па сяле, ідуць — немцы, бачым, што немцы!.. Тут калодзеж быў, яны паставілі пулямёт. І каровы ўжо з

таго канца гоняць, гоняць, гоняць. Мой на мяне:

— Падаі.

Трэба б ісці пацвіркаць, дык баюся. Ён:

— А, чаго баяцца! Ідзі, бо во забяруць карову.

Ну, я пайшла, цвіркаю, цвіркаю...

Пытанне: —Падаіць напаследак?

— Ага. Даю. Страляюць. Страляюць па дварах, страляюць. К суседу вот сюды падышлі ўжо, страляюць. Я кінула даіць і іду. Толькі іду, вот тут стрэлася — бягуць! На двор бягуць, бягуць немцы. І пытаюцца, каровы ці ё, куры ці ё, гусі, коні, авечкі, усё. Ну, больш нічога ў нас не было, толькі карова яшчэ была, куры яшчэ былі... Конь быў, дык мы схавалі, схованы быў.

Пытанне: —У лесе?

— Ага, у лесе.

Ну, я кажу:

— Карова е, куры е, больш нічога. Вярнулі мяне, каб я карову выгнала.

Я выгнала ім карову. Тады іду, а яны бягуць за мной у хату, бягуць. Ну, убеглі і нас на двор гоняць, ага, да камендантa. Ну, а мы дзяцей ужо кінулі, кажам:

— Дзеткі, пабудзьце ў хаце, а мы, можа, адны сходзім.

Ну, мы пайшлі, а немцы пабеглі і павыганялі дзяцей з хаты, і яны зноў к нам прышлі. Мы ўжо ідзём па вуліцы, і ідзе немец. Адзін ды два яшчэ... Ідуць, халаты ў крыві-і... Стрэлі нас, пытаюцца:

— Партызаны ці былі? Ну, мы кажам:

— Былі. Што ж, былі.

— Колькі?

— Чатыры было падводы.

— А што бралі?

— Усё бралі, што ім нада. І хлеб, і картошку, і мяса.

Тады камендант адсюль, з етага канца, падышоў і на яго: «Гер-гер-гер». І сказаў каровы ўжо гнаць, ужо каровы ў Асіповічы гнаць.

Пайшоў мужык мой. І дачка. Але яна бачыць, што я не іду, дык і яна вярнулася. Кажу:

— Чаму ты вярнулася, чаму не бегла з бацькам? Ён там недзе схаваецца, і ты б схавалася. А пойдзем туды, дык там папаляць, паб'юць нас.

Яны і праўда пастроілі дзевачак, асобенна і нас асобенна. Дзевачак — каровы гнаць. І спрашваюць:

— Партызаны былі?

Першага спрасілі. Ён кажа:

— Не было, не бачыў.

Як не бачыў, дык немец яго за карак... Ён дзіцятка на руках дзяржаў. За карак і — пад хлеў, у снег, у гуру, і забіў.

Пытанне: — І дзіця забіў?

— Ну, і дзіця там з ім, і дзіця. Ага. Патом жонка ўжо з дзіцяткам большым за ручку і: «Э-э-э!..»— загаласіла, загаласіла. Ён і яе туды, і забіў. А хлопчык ля мяне стаяў — такі вот хлопчык...

Пытанне: — Іхні хлопец?

— Ага. Рвануўся бегчы к ім. А я за яго, кажу:

— Не бяжы, стой, стой!

Ён, праўда, стаў, стаіць. І цяпер жыве недзе ў горадзе, бог яго знае. Патапейка яго фамілія. А звацъ як — забыла...»

Мы гутарым у светлай, чыстай кухні. Каля акна ціха стаяць дзве гарадскія ўнучкі, госці на канікулах, адна падлетак, другая яшчэ дзіця. І дзед сядзіць, Кастусь Карпавіч, гаспадар. Ён вярнуўся з сельмага, яшчэ калі мы былі з бабуляй на двары. Ад брамкі павітаў нас вясёлым: «Здаровы, хлопцы-пратапопцы!..» Цяпер вось ён заслухаўся, маўчыць, а потым і сам пачынае:

«...Гэта Новы год быў, калі па старому стылю, у сорак трэцім годзе.

Раненька прыехалі якія-та і цягнуць пулямёт — вот тут калодзеж быў,— усе ў белых халатах.

Мы сядзім у хаце. Печка — жалезная, жасцяначка. Чацвёра дзяцей у мяне, малых,— самая большая дзеўчына хадзіла ў шосты клас. А то ўсе малыя былі. Ага. І слышым — страляюць з таго канца. Каровы бегаюць па вуліцы... Ага, а патом вот здзесь на вугле мой дзядзька жыў родны, бацькаў брат. І вот гэты дзядзька выгнаў карову сюды на вуліцу. Ён — раз, застрэліў!..

Ну, у акно мы бачым. Ага. Жонка дзядзькава гвалту нарабіла. І жонку застрэліў тут. Патом — дзве дзеўкі. І дзевак абедзвюх застрэліў. Тут жа ў варотах. Я і гавару, што гэта людзей б'юць. Ага. А патом яны ў другую хату. Толькі зашлі — у хаце страляюць. Ну, а мы сядзім так. Патом і ў трэцюю зайшлі — тожа страляюць... Ну, усё!

А патом — раз — прыехала легкавая машына. Вылазіць адзін, ужо без халата. Ну, афіцэр, камендант яны называлі яго. Ну, тут яны ўсе прыбеглі ўжо, сабраліся, дык ён ім скамандаваў, каб не біць ужо, значыць, астатніх людзей. А сагнаць у месца.

Яны прыбеглі да мяне і гаворыць:

— Ідзыце да каменданта.

— А што — з дзецьмі, браць мне дзяцей?

Дык ён махнуў рукой: як хочаш, хочаш бяры, хочаш — не. Яны знаюць, што ўсё раўно гэта... Ну, мы сабраліся з бабай:

— Вы, дзеткі, сядзіце, грэйцеся ля печкі, мы прыдам, тады забяром вас...»

Далей стары, паўтараючы расказанае жонкай, гаворыць, як той нямецкі камендант дапытваў яго, ці бываюць тут партызаны, і не застрэліў, як застрэліў таго суседа, які сказаў, што партызанаў не бачыў.

«...Дык немец мне,— расказвае дзед, — загадаў гнаць каровы ў той канец вёскі.

— А там, — кажа немец, — мы яшчэ людзей набяром і пагонім усе каровы ў Асіповічы, таму што тут партызанскі

лагер, вы тут снабжаеце партызан. А дзярэўню мы вашу уністожым.

Так вот сказаў — я і пагнаў гэтыя каровы.

А там мая сястра жыла — забег у хату да сястры. Забег: пабітыя ўсе датла!.. Свякруха, яна, мужык і дзіцёнак — чалавек чатыры душы.

Яны прыходзяць, гады, і камандуюць: «Лажыся!» І тагды вот так — у голаву каждаму страляюць, вот, паб'юць, паб'юць, усё...

А хто дык і асталіся. Вот і Невяровічава напроціў — хлапец быў на печы, пасцілкай накрыўся, убілі сястру, убілі матку і бацьку, а ён застаўся і цяпер жывы. Ён у Бабруйску работае. Таксама і ў тым канцы гэта было...»

Гэтай сям'і і яшчэ некаторым пашанцавала. Сагнаўшы злосць, карнікі сказалі недабітым:

«Можаце ехаць у Татарку, у Замошша, у Асіповічы... А калі тут каго зловім — значыцца, будам біць. А дзярэўню спалім усю».

І спалілі.

Кастусь Патапейка запрог каня, пабраў дзяцей і пераехаў у Замошша.

Мы ў іншай хаце.

**Марыі Міхайлік** было тады, у студзені 1943 года, васемнаццаць гадоў. І ёй таксама ўдалося ўратавацца. Аднак жа... Але няхай лепш раскажа яна сама.

«...Было цёмна. Яны акружылі сяло і давай страляць. Мама кажа:

— Дачушка, страляюць, уставай!

Я кажу:

— А што, партызаны?

Яна адказвае:

— Партызаны.

Пазіраем мы ў акно. Ідуць у белых халатах. Маці кажа:

— Пагубляліся, а цяпер страляюць. Бо ноччу ж яны былі ў нас, партызаны.

Думаем, што шукаюць адзін аднаго. Мама кажа:

— Схадзі вады.

Я іду вады ў калодзеж, а яны вярнулі назад:

— Ком дахаты.

Я вярнулася.

— Мама, яны не пусцілі вады. Ідзіце вы. Маму таксама вярнулі.

А пачалі яны біць з естага во канца.

Я кажу:

— Мама, ды там жа нешта гарыць ужо.

— Ну што ж, — кажа яна,— гарыць. Ідзі карову падой, бо каровы бяруць, курэй б'юць.

Ну, я пайшла, падаіла карову.

Тады мама кажа:

— Курэй б'юць. Памані ў хату куры. Ну, і сядзім у хаце. Прыйшоў пляменнік мой. Пытаецца:

— Былі ў вас партызаны?

Мама кажа:

— Былі, дала ім павячэраць, хлеба, малака дала, і пайшлі.

Расказваем. А тады яна кажа:

— Дзеткі мае, глядзіце, Прахора ж у нас б'юць!..

Гэта па-суседску, праз акно мама пазірае. Яшчэ сястра мая з дочачкай была ў нас. Мама гаворыць:

— Глядзіце!..

А там тры выстралы, і дзевачкі на стопку палезлі.

Ну, і тут жа к нам прышлі. Мы стаім усе каля печкі. Вот так ручачкі пасціскалі, а печачка гарыць. Ну, прышлі... Высокі-высокі прышоў, у акулярах. Вот, кажацца, я і цяпер яго бачу, пазнала б. Як прышоў, так хату і расчыняе. За мяне:

— Ідзі карову выпушчай! А брата — на вуліцу.

Пайшла я карову выпускаць. А яна ж не ідзе. Таксама баіцца, карова, аж на сцену лезе. Я на двор з хлява вышла, а ён мяне як варсане, дык я і паляцела. Ручкаю з аўтамата варсануў. Два разы. Першы раз я не паляцела, дык ён другі раз.

Мама з хаты выходзіць. Мама як вышла, маму ён і шахнуў — усю во тут шыю прадзіравіў, і ўсё во гэта адвалілася. І маці мая тут жа і лягла.

Ён і пайшоў. Яшчэ мне во так нагою даў, і нас на вуліцу — карову гнаць. Я гэту карову на вуліцу выперла. А там стары адзін— ён памёр ужо — стаяў... Карова стаяла, а ён так во карову абняў... А яго так білі, так білі!..

А я на свайго брата:

— Мой братка, кажу, мой братка, усе паскрываліся, а мы, кажу, вот і пападомся...

Пытанне: — А стары той карову абняў, каб не весці?

— Не, яго сільна білі, ён на карову абваліўся і стаяў. А тут каровы ідуць, коні іржуць — сумна, страшна было... Кажу:

— Не схаваліся, і ўсё наша і прапала, братачка. Пагібнам мы.

Ну, і стаім, куды ж ісці, стаім сярод вуліцы. Няма нідзе нікога — ну ні душы! Усіх ужо выбілі.

Падходзім во тут, пад край, на краю стаім. А тут немцы ляжаць з гэтымі кулямётамі. Нам няма куды. І ідуць яны к нам.

— Ну, кажу, братка, пагібнам мы. Да-вай уцякаць, каб уцякаючы нас, чым так...

Яны прышлі і гаворац:

— Не ўцякайце, а то паб'ём. Пагоніце каровы і паедзеце ў Германію.

І другі падышоў, таксама па-нашаму разгаварваў:

— Колькі вам лет?

Я кажу, што васемнаццаць, а брату — чатырнаццаць...

А я вышла, праўду вам сказаць, толькі галошы на мне былі, так во на босую нагу, і так во голая. Нічога на мне не было. Я кажу на свайго брата:

— Ну, давай убягаць, Іван!..

А ў хаце, што насупраць, у іх там дзетак было, як сем ці восьмерка. Дык там крыку! Так крычаць, так крычаць — слышна!..

Ну, усё, бяжыма! Ну, і пабеглі ў лес цераз сашу, па балоце. А снег во так,

да пояса. У балота ўлезла, ужо на нагах у мяне нічога нет. А яны па нас — так даюць, так даюць, вы паверыце... Але пуля ў нас ні разачку не папала!..

Мы леглі ў гэты снег, паляжалі, патом усталі і сядзелі ў лесе да вечара, пакуль не прымеркла.

Нашлі месца партызанскае: там яны, мабыць, начавалі, бо жарочак быў, яшчэ віселі вяровачкі. Ён тыя вяровачкі ўзяў, што партызаны пакінулі, а ў яго лапці былі і анучы, дык ён і мае абкруціў ногі. А за ноч у мяне ногі во такія былі, абмарозіла. Вось паглядзіце — і сёння пальцаў няма... Мы там пабылі, паначавалі.

Я ўжо ісці не магу... Брат мне дзве палкі выламаў...»

За добрым жытам — спакойная вёска... А ў вёсцы гэтай забілі ў той снежны дзень 297 чалавек.

## ДЗІЦЯ БЯЖЫЦЬ РАЗОРАЮ

З гэтай жанчынай мы сустрэліся выпадкова.

Былы партызан, інвалід, ужо і бухгалтар таксама былы, на пенсіі, Раман Драгун, параіцца з якім падказалі нам у райкоме партыі, аднёсся да справы сур'ёзна. Пакінуў кіраваць сямейным капаннем студні, памыўся, пераапрануўся і, цяжка спраўляючыся з пратэзам і кульбай, падсеў у наш «газік». Адтуль, з зялёнай ды зацішнай станцыі Капцэвічы, мы накіраваліся ў яго родныя мясціны, у заходні куток Петрыкаўшчыны. Справіўшыся там, дахаты мы вярталіся амаль што прыцемкам. І тады наш праваднік раптам успомніў яшчэ аднаго — у вёсцы Слабада. «Можа, і ён раскажа».

Яго знаёмы, Адам Стракач, таксама былы партызан, сам не бачыў таго, што адбывалася ў яго родных Беразняках: у Слабаду ён пераехаў пасля вайны. З чатырохсот аднавяскоўцаў, памардаваных у лістападзе 1942 года, цудам выратавалася некалькі чалавек. І сярод іх — Адамава сястра Алена. Жыве і яна ў Слабадзе, цераз некалькі хат...

**Алена Іванаўна Булава** нашмат старэйшая за свайго брата. Ужо зусім павольная, нямоглая бабуля, добра за семдзесят. Гэта мы спачатку толькі адчулі па яе стомленым голасе, па непрытворным кректанні. У хаце была шарая гадзіна, гаспадыня адпачывала,

прылёгшы на ложку, яшчэ не распрануўшыся. Энергічны Адам Іванавіч уключыў святло і сказаў ёй, што трэба вось, каб яна расказала, што было тады ў Беразняках.

Бабуля ўстала і, зразумеўшы, што да чаго, спакваля наладзілася, пачала.

«...У мяне і галава ўсё баліць, ды яшчэ я і сільна недачуваю...

Ну, як яно было. Там жа нашых усіх людзей пабілі. Там на другі дзень людзей столькі ляжала... А ваўкі як папрывыкалі, дык людзей лавілі потым. Людзей папрывыкалі есці...

Ну, абкружылі нас кругом, усю вёску. А я ў той час у хаце была. Вышла з хаты — не бачыла, што той немец з кукардай стаіць. Ён наставіў вінтоўку — вось так во на мяне. А гэты мой хлопчык малы, што на руках у мяне быў, Сашка, мяне за шыю ды:

— Ой, мамко, заб'юць нас!.. А я кажу:

— Не, не, сынок, пан не будзе біць, не, не!..

Як я так сказала, дык ён, праўда, і вінтоўку апусціў. Ды на мяне паказвае:

— Дахаты!

Увайшла я ў хату ды на сваю дзеўку кажу:

— Евачка, нас паб'юць.

— А што рабіць, мамо?

У мяне ж яшчэ і той хлопчык быў, Колька. Ужо быў, здаецца, у трэцім ці ў чацвёртым класе. Колька кажа:

— Мамко, я пабягу ў мох. А я кажу:

— Калі можна... А мо не праскочыш, сынок?

А мы не бачым, што яны там сядзяць, у касках. Панадзявалі гэтыя каскі, як пні якія, і не відно іх. Хлопчык мой — каб чуць, дык і прарваўся б. Хацеў, бед-ненькі, праскочыць, а яны яго — раз! — у грудзі сюды во. Толькі крыкнуў ён: «Мамко!..»

Дык дзе там — мацярынскае сэрца! Выскачыла я ды да яго. І Еўка мая выскачыла. Я за гэтае дзіця, за Сашку свайго, ды прыгарнула да сябе. Дык ён мяне — раз! — у руку раніў. І хацеў яшчэ раз, а Еўка ашчапілася за мяне і кажа:

— Мамко, няхай нас разам б'юць! Хай і мяне б'юць з вамі!..

А я хацела ўпасці, адале думаю: «Аяк жа дзеўка мая? І дзіця ж на руках...»

Ён хацеў у Еўку папасці, ды яшчэ раз мне ў руку. І сюды во. Дык у мяне рука апусцілася. І дзіця я пусці-ла. Пабегла малое. А Еўка — за мною. Я кажу ёй: «Падаймо!» І вось мяне ўжо зноў ранілі, а ў дзевачку не папалі. Во сюды мяне ранілі, а куля тут во выскачыла. Ужо ў мяне ўвяла ўсё, я і сама ўпала. Упала ды кажу на дзевачку: «А цябе ранілі?» Кажа, што не ранілі. А з мяне кроў аж ціўкае, так ліецца. Жылу тут мне, бачы-це, перабілі. Дык якажу:

— Падай разам са мною. А будзеш ляжаць — не торкайся. Упадзі і ляжы на месцы. Бо, можа, я і жывая буду, а

ты — ляжы. І глядзі — як-небудзь у бераг.

А я ўжо бачу, што хлопчык мой, Колька, — ляжыць нежывы...

А гэты, што малы быў, пабег разоркаю. Сашка. А ралля была высокая, дык яны і не пападалі ў гэтага хлопчыка. А кулі разрыўныя ляцяць. А хлопчык усё роўна жывы, усё роўна бяжыць разораю.

А там жанчына паўзла ровам. Ды так вось яна: «Хадзі сюды! Хадзі сюды!..» Яна за яго ды ў тую кана-ву. Застаўся хлопчык з тою жонкаю...

А я ляжу. І Еўка за мною ляжыць. А з мяне кроў ідзе. А яны ходзяць па двары, гергечуць. Павыпускалі мае каровы, дзве было, авечкі павыганялі на вуліцу, свінні. А я ляжу ды так во пазіраю. А яны падпалілі маю хату і пайшлі да суседа. А сусед той стаў на калені і просіцца. А яны яму ў грудзі — раз! А я ляжу ды сама сабе думаю: «Ну, усё». Маё дзіця пабегла, а я не ведаю — ці яно там жывое, ці нежывое... А потым, калі я ўжо бачу, што гарыць, што галавешкі ляцяць на мяне, дык я ўзяла як-небудзь уставаць. Я на адным калене, на адным калене — папаўзла ў тую канаву, дзе хлопчык мой там, з маладзіцай. Тая маладзіца спужалася і папаўзла. Я кажу: «Хаця ты мне руку перавяжы!» А яна — папаўзла...

Еўка мая таксама тады ўцякла і недзе голая ў стозе начавала. Выбрала дзірку ды палезла ў сярэдзіну, у стог, і там схавалася. Потым партызаны прышлі і гукалі, мо хто жывы, каб адгукнуўся, а людзі баяліся адгукацца. На другі дзень мая дзевачка вылезла са стога і пайшла...

Ляжу я ў той канаве, а тут бяжыць яшчэ дзве, гэта Кацярыніны, дзевачкі.

— Ох, ох, цётачка, ужо нашу мамку забілі і брацціка ўбілі! А мы толькі ўдвох засталіся, дзве дзевачкі!..

А ў мяне ў вачах цёмна. Кажу я:

— Донька, паўзіце вось гэтаю во канаваю ды туды ў мох. Можа, застанящеся. Калі я ўжо не буду гаварыць, то вы пасядзіце, пакуль немцы паедуць, дык мо тады хто азавецца, дык, можа, як куды-небудзь зойдзеце.

Яны пабеглі ў той мох, тым раўчуком. А я — ужо з тым малым дзіцем, з Сашкам маім. На адным калене ўскочыла і я ў тую канаву. Ускочыла, пацямнела ў вачах, папаўзла ў той мох. Блізенька ад хаты мох быў. Запаўзла я ў той мох, ляжу. І яны, тыя дзевачкі, палеглі ў карчах...

Ужо мы там чуем — людзі вішчаць, крычаць — ужо там людзей б'юць!.. У нас маладзёжы многа было. І, можа, ніводнага не засталося. Ні маладзёжы, ні дзевачак — усіх пабілі. Божа мой, дзеці плачуць!.. Страшна было, каб вы пачулі. Ну, проста страх! Некаторых у хаты загналі, а нас проста так білі, акружылі і так білі — на нашай вуліцы. А маленькае дзіця... Гэта Кацiна — узялі ды ўбілі Кацю, а дзіцятка яшчэ жывое. Яно поўзала, а яны ўзялі да штыхом жывоцік яму распорваюць. А яно, бедненькае, поўзае па той

мацеры, яшчэ жывое, кішачкі павылазілі. А яно поўзае...

Хлопчыка майго, Колька што быў, у сенцы ўцягнулі, і ён там згарэў. Костачкі толькі ляжалі. Як я прышла з бальніцы, то ўжо нікога... І там я яго костачкі ў сенцах нашла. Харошы быў хлопец...

Пытанне: — А гэта хто былі — немцы ці паліцыя?

— Паліцэйскія былі, і гэтыя, немцы, з гэтымі іхнімі кукардамі. Акружылі вёску так, што сядзелі адзін каля аднаго, адзін каля аднаго...

Пытанне: — А вы пра тое яшчэ, як вы ў канаве ляжалі.

— Ляжала. У мяне маленькі хлопчык, хоча плакаць, а я кажу:

— Не плач, бо і цябе заб'юць.

Не плача. Ляжаць яны, бедныя... Каціны дзевачкі і мой. Потым у мяне чуць вось так павесялела, ужо чую — сціхлі тыя, у сяле. Я за дзяцей ды гэта прывяла іх да канавы. Стала ў ваду і *нагою іх папераводзіла на той бок,* бо вада пасярэдзіне бяжыць. *Нагою паперацягала.* Пацямнела ў мяне ў вачах...

Дубікі прышлі, мяне забралі. Ужо як нежывую. Ужо тады я ляжала раненая, дык мяне адзін чалавек падабраў і павёз у бальніцу.

Каб не Яроміха, дык мяне там убілі б. На станцыі яшчэ ўбілі б. І майго хлопчыка...

Маленькі застаўся жывы, і цяпер жыве. У Гомелі. Я тады яго на руках дзяржала. Яшчэ як бацька ішоў у армію, а я яго праводзіла, дык на руках малога трымала. І бацька нёс яго на руках, маленькага. Такі пацанок — і застаўся жывы. Білі, так па ім білі, што паверце, кулі разрыўныя — гарацьǃ.. Я яшчэ чуствавала трохі, дык пазіраю і думаю: «Ну, усё!..»

А яно, бедненькае, кацілася па гэтай баразне. Ралля высокая, а яно малое...

Усіх нас пачці пабілі, гэта во толькі я раненая засталася. Дый то не ведаю, як я засталася. Ад мяне людзі ўцякалі... Гэта ў бальніцы той.

Здаецца, ляжу, і здаецца, што хлопчык мой крычыць. Чутно — крычыць!.. Я і не сплю, а ён — крычыць!.. Усхапіцца хачу, а няма як — крылы падаюць. Хачу схапіцца — вазьму ўпаду. Дык яны, што ў бальніцы ляжаць, глядзяць на мяне ды баяцца, уцякаюць ад мяне. Бабка там адна ляжала, дык яна мала была ранена, дык яна, калі я з ложка ўпаду, прыдзе, ды возьме мяне, ды на ложак. Яна не баялася. Есці тады не было што — тады ж быў немец, — а ляжалі так, на саломе. Ды хустачка толькі. На мне ж не было нічога — як з хаты выскачыла, так і была...

Пытанне: — А як вы трапілі ў тую бальніцу? І што гэта за Яроміха?

— Як я трапіла? Там саставы стаялі на станцыі, калі мяне той дзядзька вёз, і без пропуска не прапускалі нікога. Мяне ж вязе гэты чалавек, а я раненая ляжу. І гэты хлопчык каля мяне маленькі, Сашка, каторы застаўся

жывы. Дык мяне хочуць у камендатуру. Я думаю: «Ну, усё...» Крычаць яны:

— Падымайся, бабо! А чалавек той кажа:

— Яна не паднімецца, яна бальная.

А там бабушка была старэнькая, што з немцаў, якія тут даўно засталіся. Яна памерла ўжо. І вось тая бабушка ідзе. А яна была са мною знаёмая, начавала ў мяне не раз. Бедная была, хадзіла, то краску прадае, то штонебудзь. Я з яе нічога не брала, а так дам картоплі ці чаго. Бо жылі ж мы тады добра. Дык яна ў мяне і начуе тыя разы. Глянула яна ў воз ды кажа:

— Хто гэта цябе, Аленка? Якая ж ты нешчаслівая! Ды на мяне ўпала, ды стала галасіць, абняла мяне

ды стала цалаваць. Цалуе і плача. А ён пытае ў яе, немец, па-нямецку:

— Хто гэта? А яна кажа:

— Гэта мая родзічка, гэта мая фамілія[17].

Яна сама — з немцаў, засталася яшчэ ў колішнюю вайну. Ён работаў на заводзе, чалавек яе. Рабіў на заводзе нейкім старшым і астаўся тут на жыццё. А яна па-нямецку гаварыла. Дык яна ўпала на мяне і кажа: «Гэта мая фамілія!..» Пагаварылі яны па-нямецку, і яна кажа:

— Няхай ка мне вязуць.

Праўда, яна і павезла мяне. Я абамлелая была. А як добра трошачкі што ўбачу, дык я ёй рукі цалую і кажу:

— Мамко, ратуй мяне!..

— А што ж мне вам рабіць? — кажа яна.

А мой, гэта, хлопчык маленькі прыдзе ды ў рукі яе цалуе:

— Ах, цётачка, ратуйце маю мамку! Маленькі быў, а — бедненькі — цалуе ў рукі.

Яна пабегла і паклікала Казлоўскага, перавязаць мяне. А мяне, гэта, кроў кругом, ды застыла яна, ды мне ўжо так робіцца, што і не магу я. А Казлоўскі кажа: «Памыйце яе». Яна, праўда, запаліла ноччу грубку, памыла мяне, пераадзела ва ўсё сваё і палажыла.

На другі дзень рана прыбег той немец, правяраць мяне, ці я ў яе. А яна паставіла ложачак каля грубы і палажыла мяне каля грубы. Ён прышоў, паглядзеў, пагаварыў з ёю. Яна кажа:

— Яна зусім нічога не варта, можа, і памрэ.

Дык яны ўзялі мяне, і завёз мяне адзін чалавек у бальніцу, у Петрыкаў. І ўжо я ляжала ў тым Петрыкаве. А дзеці мае засталіся там, у чалавека...

Пытанне: — А што было з вамі пасля?

— Што было? Я рабіла на ферме, калі ўжо нашы прышлі, і палучала прэміроўку. І колькі ж год я рабіла! І ў Мазыр мяне выклікалі. Дзе я не была! Я і ў сельсавеце была — мяне ж пасля вайны членам сельсавета выбралі... Прыедуць, забяруць мяне легкавушкай...

---

[17] Die Familie *(ням.)* — сям'я.

Сталі мы там дзяліць дабро на сірат. Ну, я і думаю, што як мне дрэнна, то і другому ж таксама тое дрэнна. Адзін кажа, што каторае дзіця ад тых, што за немца былі, то яно — інакшае. А гэта ж усё роўна нашыя дзеці, а тое, што маці яго ці бацька немаведама дзе, то што ж яно, дзіцятка, вінавата. Я ўзяла ды ўступілася там за адну, бо яны бедныя, нічога ў іх не было, а іх, дзяцей, двое. Я і кажу:

— Ім трэба даць хаця б што-небудзь, ну, хоць цела прыкрыць. Бо дзеці — гэта дзеці, дзяцей шкода, яны не вінаватыя.

Я заступалася, і за дзяцей я заўсёды буду заступацца. За што ж яно будзе страдаць? Яны нашы, гасударсцвенныя дзеці. Яны ў нас васпітваюцца, у нас растуць, яны нам і будуць.

І я дзякую, што лягу ды сплю спакойна. Не то што каторыя: «Дай, дай!..» А я давольна, што лягу спаць ды пераначую спакойна. І благадару я нашаму гасударству, і нашым байцам, што нас аслабанілі і што ў мяне засталося хоць трошкі дзетак. Ужо і яны палягуць паспяць, і сама я лягу, добрыя людзі, ды пасплю...

А так жа я, хлопчыкі, не спала ў хаце. Калі пры немцах яшчэ.

Забралі мяне, праўда, партызаны ў лес. Сяду я на купіне ды прычытваю: «За што мяне так наказала? За што я так пакутую...» Пазаводзіліся ў мяне гэтыя на ранах, ізвіняйце, чэрві. Вазьму я іх так пальцамі павыграбаю ды вазьму так чым-небудзь перавяжу. Бо хадыром ходзяць, так і чутно, як яны ходзяць па мне, па руцэ. Што ж, ведаеце, жывая кроў. А лес, а заедзь гэтая! Нападаюць жа, не можна пераначаваць. І бінтоў жа няма. Трапачкай якою-небудзь завяжаш...

Потым прышла наша армія, ды паставілі арудзія, ды будуць, гэта, па Петрыкаве біць, немцаў з Петрыкава выганяць. Прыходзіць да мяне адзін ваенны і кажа:

— Што вы так, бабушка, сядзіце з дзеткамі?

— Сяджу, — кажу я, — а дзе ж дзецца?

— А чаго-та ў вас такі курэнь?

— Бо няма каму добрага зрабіць. Чалавека няма. Другія людзі то з дзядамі, то з бацькамі. А ў мяне быў гэты большы хлопец, дык і таго няма, у партызанах.

— Ведаеце што, — кажа ён, — будзе бой, і мы вас адгэтуль вывязем.

І праўда, прыехала падвода, забралі маіх дзяцей, ды забралі мяне, ды завезлі некуды туды, пад Буйна-вічы. На дварэ там нейкая сцёбачка[18] стаяла ў лесе, і сядзелі мы ў той сцёбачцы. Ну што ж, есці няма чаго, дзеці малыя, — што рабіць? Там ваенныя стаялі раней, і там куране, і ў тых куранях маленькія картошкі, якімі яны коней кармілі. Пойдзе мая дзевачка ды назбірае тых картопель, ды ў той зямлянцы мы ўжо як-небудзь спрышчым тую картоплю. А потым нас яшчэ далей адбросілі, гэта як біліся за Петрыкаў. Недзе нас аж

[18] Сцёбачка *(дыял.)* — варывенька.

пад Украіну туды. Там мы ўжо так і прабылі, пакуль нас не вызвалілі. У людзей мы там піталіся. Людзі жылі ў куранях, ніводнай хаты не было.

А потым прышло, што тыя, каторыя з-пад Петрыкава, каб ехалі дадому. Пашла я да таго начальства ды кажу, што ў мяне малыя дзеці, як жа я? Ды там жа дзве ракі, адна і другая, нам трэба перабірацца, а я не магу. Дзеці мае папрастуджваліся, ды ў дзевачкі нага нарвала. І хлопчык маленькі гэты...

І яны сказалі:

— Мы заўтра па вас падводу прышлем. Прыслалі яны назаўтра, а гэтыя петрыкаўцы — ведама, мужчыны — пазбягаліся ды пананосілі сваіх клункаў на тую падводу і не пускаюць мяне. А ён пытае фамілію, той чалавек, і кажа, што ён з месца не кранецца, пакуль яму не скажуць, дзе тая маладзіца, па якую ён прыехаў.

— Яна была раненая, і ў яе двое дзяцей, што ж яна з імі зробіць? Адно малое, а другое трохі большанькае. Яе трэба адвезці.

Паздымалі яны тыя клункі, ды ўзялі мяне, ды яшчэ адну там удаву, ды гэта падвезлі нас сюды. Каторы вёз, гэта быў не салдат, а проста сельсаветам назначаны. Нас везлі так — ад сельсавета да сельсавета: у кожным сельсавеце назначалі падводу. І давезлі нас так да ракі, а цераз рэчку лодкай перавозілі — ужо ваенныя.

Тожа прышла — ані хаты, ані дзе няма дзецца, хоць ты ідзі ў свет. Праўда, тут яшчэ адной маладзіцы хата засталася, дык мы пасабіраліся ў тую хату.

А потым пачалі людзі хаты будаваць. А я іду ды плачу. А ён, нейкі з Петрыкава, пытаецца:

— Чаго вы плачаце?

— Як чаго? Хто жывы, дык той будуецца, а я не ведаю, куды іду. І дзеткі мае. Няма ні хаты...

А ён кажа:

— Ведаеце што, не плачце. Хату як-небудзь зробім. Мы дадзім вам лес, у крэдыт.

Праўда, нашто казаць, — далі мне гэты лес, выпісалі і вызначылі падводў. І так гэта ў крэдыт давалі, а потым я аплаціла. І вось гэтую хацінку зрабіла.

А дзеткі выраслі, той у армію, той туды, паразыходзіліся.

Вот і кончана ўжо...

А цяпер я ўжо, хлопчыкі, не іду нікуды, я двор не магу перайсці. Ногі баляць, і недачуваю я, ужо зусім, зусім бальная. Ужо я нічога не варта. Ужо я і кароўкі не дзяржу.

Але я давольна, што вот і мае дзеткі ходзяць, і ўнучкі ходзяць, і вучацца, і бясплатна, і куды ты цяпер ні пойдзеш — усюды нашы, усюды ты вольны і нікога не баішся. Пры сваіх людзях я што хочаш скажу. А немец, каб ён пабыў тут трохі, дык вылупіў бы ўсіх, ніводнай душы не засталося б. Гэта толькі благадара нашым байцам ды нашым кіраўнікам, што яны яго адгэтуль як-небудзь выкавыралі. Я ўжо

казала ім, дзецям, і сваім і чужым: дзеткі, за гэтую ўласць стойце, як за сцену, бярыцеся, глядзіце і слухайце, і рабіце, і правільна ўсё рабіце, патаму што гэта не жызь, а цвяты. Праўда, праўда!

Пытанне: — А вы вучыліся трохі, Алена Іва-наўна?

— Не, я зусім невучоная».

Пакуль мы гутарылі ўвечары, у хаце нам час ад часу перашкаджала — здавалася, што знарок, — бабуліна госця, унучка, дарослая дачка той самай Еўкі, што ацалела і замужам далекавата. Госця збіралася некуды, хадзіла то з хаты, то ў хату, а потым і не пайшла нікуды, і цяжка было растлумачыць дзяўчыне, што ні груку дзвярыма, ні стуку абцасікамі нам на магнітафонную стужку — праз бабуліны словы — не трэба.

Назаўтра раненька, калі мы прыехалі ў Слабаду з Петрыкава зноў і папрасілі Алену Іванаўну на лавачку перад хатай, перашкаджалі нам пеўні, сабака і вераб'і. Проста шкада, што ў нашай «папяровай» перадачы бабулінага расказу не засталося гэтых «перашкод». На магнітафоннай плёнцы яны, вядома, ёсць — то кукарэканне раз-поразу, такое звычайнае і незвычайнае тут; то ленае, на ўсякі выпадак, пабрэхванне сабакі на суседскім двары, цераз вуліцу, занепакоенага тым, што наш «газік» стаіць каля іхняга плота; то сытае цвірканне вераб'ёў у роснай, сонечнай лістоце вішняку. А ўжо і на магнітафоннай стужцы няма ні сонца, ні расы, ні пахаў спелага лета. Такога не зловіць, не перадасць як след і фотаапарат.

Бо мы прыехалі сюды яшчэ раз, каб перш за ўсё зняць бабулю Алену. Для старое, якая яшчэ ўсё гаспадыня, было ўжо не зарана: яна ўжо корпалася на двары. А ўнучку, маладзенькую настаўніцу, бабулі прыйшлося будзіць. Пабудзіла. І сама прыадзелася, і Валі сказала прыбрацца. Зноў жа тое, народнае — трэба дык трэба. Бадай што і зусім не думаючы ці хоць не лішне задумваючыся — а пабачыць яна калі-небудзь тыя здымкі ці не пабачыць, будзе ведаць ці не будзе, што ж там яны, гэтыя людзі, у той сваёй кнізе напішуць.

Бабуля — з тых, нібы суровых з выгляду, але справядлівых і добрых жанчын, нястомных работніц, ад якіх заўсёды святлёй у жыцці. Пра гэта гаворыць і выгляд яе, выраз вачэй, суровы, мудры і добры, вачэй, так ужо стомленых, якія так зблізку глядзелі ў вочы смерці...

Колькі разоў памірае маці, у якой на вачах забіваюць дзяцей?..

Ну, а Валя — яна аказалася ўранні вясёлай дзяўчынай, якая проста не ведае цаны, значэння, зместу таго, што перажылі яе найбліжэйшыя, не ведае, якія адносіны мае тое *страшнае* да яе маладосці.

Нам было трохі трывожна, што ўчарашні расказ Алены Іванаўны мы маглі, чаго добрага, запісаць не вельмі

ўдала, а з другога боку, проста хацелася, каб старая расказала, удакладніла, праясніла сёе-тое на свежую галаву. Мы папрасілі яе асцярожна. Бабуля, магчыма, і не спала зусім, растрывожаная намі позна ўвечары, або спала не так і не столькі, як звычайна, але ж згадзілася яна і расказала, захапіўшыся, усё яшчэ раз — і сапраўды больш стройна і дакладна. Два расказы яе, знятыя з магнітафона на паперу, зведзены намі ў адзін, з патрэбным захаваннем усяго галоўнага.

Апошняе, што нам сказала бабуля Алена, не было адказам на наша якое-небудзь пытанне. Гэта быў голас яе душы, ачышчанай пакутамі, кароткае і яснае рашэнне горкага, настойлівага роздуму. Маленькі хлопчык, які — пад абстрэлам дарослых, выдатна ўзброеных і абвучаных забіваць — бег, каціўся глыбокай разорай, зноў, каторы ўжо раз за трыццаць год, вярнуўся ў матчына сэрца, на матчыны вочы...

«...Я гэта падумаю, дык мне страшна...

Я жыла ў тыя войны, як тыя войны былі. Ужо не маладая. Ну, то свіней бяруць, то што...

Ад звера дык хоць уцячэш, на хвойку якую, ці што. А гэта ж чалавек. Чалавек чалавека трапіць, дзе ўчуе.

Ой, што ўжо гэта! — гэта ж не вайна была, а проста так... Ну, той, што на фронце, ну, таго чалавека заб'юць — дык ён жа ваяваў, праўда? А дзіця тое беднае? Хлопчык — ён жа, бедны, нідзе не быў. Таксама білі... Гэтае дзіця маленькае бяжыць — зашто ж яго? Яно ж маленькае, яно ж дзіця, яно ж каціласа, як тое яблычка... А яны — б'юць. Іскры скачуць!..

Што гэта, што гэта за такое было ў іх — я не ведаю.

Гэта звярэ былі, а не людзі.

Гэта не людзі былі, гэта — звярэ былі».

## СЦІШНАВАТАЯ РАДАСЦЬ

«...Иванова Акулина Семеновна, 1908, белоруска, отношение к семье — мать. Проколот язык 2 раза, съела песку горсть и бита в голову, но выжила и вылезла сама из ямы, где была».

Гэта — са «Списка погибших семей от руки германского фашизма жителей д. Рудня, Руднянского сельсовета». Падпісана: «Комиссар парт. отряда им. Чапаева Дроздов. 8.VIII. 42». Заўвага, зробленая праз чвэртку стагоддзя: «Подлинник списка в партархиве ЦК КПБ, фонд 3904, вязка 1, дело 1, опись 1, лист 15».

Намі гэты дакумент заўважаны ў фондах Расонскага «Музея народнай славы».

«...Дапрашвалі, білі іх там. Яны ўсе ссінёныя былі... Забілі большага мальчыка, патом меншага на руках, патом яе — трэцюю. А з ямы яна вылезла сама. Пачуствавала, што нямнога пяску навярху, пачуствавала, што яна вылезець, і стала нагамі шавяліць, шавяліць — і выпаўзла з ямы. Но далына яна ісці нікуда не магла. Так і ляжала каля ямы. Яна баялася, што, можа, немцы ў дзярэўні, ды яна ўжо і не магла ісці. Патом прывялі яе к нам, палажылі на пол. Рвоты ў яе сталі такія сільныя: проста зелле і пясок...

А на другую ноч абратна немцы вярнуліся к нам. Экспедыцыя явілася. А ў яе сазнанне пацерана, яна стала крычаць... Дождж такі быў у тую ноч! Сабраліся ў нашу хату поўна людзей. Яна крычыць без памяці: «Ай-ай-ай-ай!» А мама і я суцішаем яе, што не крычы — кругом немцы. Заціскаем ёй рот.

А немцы кругом хаты — толькі каскі ляпаюць па сценках. Дождж лье такі, што страшна. І мы не можам выйці на двор, і яны, сволачы, не просяцца ў хату. Ні адзін не пастукаў. Так ціханька стаяць, слышым толькі: «Гар-гар-гар!» І каскамі па сценках ляпаюць...»

(З расказу Алены Жарчанкі, сваячкі Акуліны Івановай. Вёска Рудня Расонскага раёна.)

Тут быў знойдзены сённяшні адрас уваскрэслай жанчыны: вёска Баранава каля Полацка.

З ганка вялікага і ўжо старога драўлянага многакватэрнага дома відаць шырокая, зялёная даліна, густа, яшчэ не высока парослая алешнікам і лазняком. У гушчары ўгадваецца вада — рачулка або проста мокрая лагчына.

— У вас тут многа салаўёў.

Не пытанне, а нібы сцверджанне, упэўненасць. Бо хоць і чэрвень ужо, а салаўі тут, на зялёнай ды азёрнай Віцебшчыне, дружна праследуюць нас у кожным раёне, ад вёскі да вёскі.

— Чаго-чаго, а гэтага хапае,— адказвае жанчына тонам прыязнай гаспадыні.

У дом інвалідаў, што размяшчаецца недалёка адгэтуль, ёй, санітарцы, было пазвонена пра нас з раёна. Акуліна

Сямёнаўна, сёння выхадная, сустрэла нас на сцежцы, далекавата ад дома, у якім жыве.

У цесным, чыстым пакойчыку адзінокай жанчыны — швейная машына, ложак, шафа, столік, вялікае люстра. Пяці чалавекам — як павярнуцца. «Сядайце тут во, у мяне на ложку чысценька». Аднак сядзіць толькі адзін, з магнітафонам каля століка. Стаіць і гаспадыня, хоць ёй якраз і прысесці было б на краечку свае пышнае пасцелі.

Расказвае жанчына, а слёзы нібы не асмельваюцца паказацца. Нават як дзетак стралялі, яна гаворыць амаль што стрымана.

«...Муж мой быў у атрадзе. Мы малако збіралі, вазілі ў атрад. І гэта вярнуліся з атрада. Усе мы зносілі малако парцізанам. Завязлі і прыехалі дамоў. І толькі я пачала печку паліць — сяйчас прыбягае Шчадроў, сусед, і будзе гаварыць: «Немцы ідуць!» Тут я скарэй з хаты што-небудзь вынесла, а тут і пачаўся стрэл.

А яны абайшлі кругом па ляску, па акраіне, гэтыя немцы, і начаўся стрэл. А мы тады з лесу ды пад раз'езд. Селі там, паляжалі, і сяйчас немцы нас там акружылі. Узялі і паставілі.

Вот, — гаворацъ, — вот калі вашы муж'я не ў партызанах, дык па вас партызаны будуць стралять, а еслі ў партызанах, дык па вас стралять не будуць.

Партызаны сціхлі. Там пулямёты іхнія папсаваліся, ці што. Сціхлі стралять.

Немцы нас і пагналі...

П ы т а н н е: — А вас яны дзе, вы казалі, паставілі?

— Тут, дзе наш раз'езд. І вот так паставілі, на ўзмежак пры дарозе. Каб партызаны бачылі. А самі стаяЦь. І Паўтарэнка. Абняўся ён, пацалаваўся з тым, у каторага какарда бальшая... Паўтарэнка хто такі? Ён здох нядаўна. Каторы нас прадаў немцам. Наш, пуцявой быўшы абходчык.

І вот пагналі нас у Рудню. І загналі ў байню. І сядзелі мы там.

Сталі дапрашваць. І вот, каго дапро-сяць — выведуць туды і пачнуць сеч. Сякуць у Восіпавай хаце. Там і сястра мая была. Сястру маю паймалі назаўтра з каровай у полі і прывялі. І кароў прыгналі ўсіх, забралі. Адну дапрасілі, другую дапрасілі і пусцілі. Ну, думаем, пусцяць усіх. Нам з байні ў акошка відаць. А потым пабеглі за імі і іх вярнулі. Тут Дзюбенчыху вызвалі. Каждую сям'ю адзельна. І секлі плеццямі.

Дзюбенчыху вызвалі, Шарпенчыху вызвалі, Быхаўцаву вызвалі... Каждую сям'ю адзельна. І — нет. Вызавуць — і нет... І мне прышлося з рабяткамі. Вызвалі.

П ы т а н н е: — Колькі гадоў было вашым дзецям?

— Мальчык быў адзін з трыццаць трэцяга года, другой — з трыццаць сёмага. Ну, і вот, як толькі вызвалі туды, у хату, так сразу:

— Гавары, дзе твой мужык! Я гавару:

— Узят па первай мабілізацыі.

— Гавары, парцізанская морда! Дзе ты была сягоння?

— Нідзе,— гавару.— Рабятам есці гатовіла, бяллё сцірала. Нідзе не была.

— Гавары сяйчас жа!..

Цап за валасы — аб зямлю. Начаў лупіць. Прынеслі банку пяску, бальшую такую, сухога.

— Еш,— гаворыць,— парцізанская сабачая морда!

На стол насыпалі. І гэты пясок ела я. Сухой, не лезе. Там і навоз, і ўсё. Ніяк не з'ем. І ўсё ж ела — захліпалася, дышаць нечым. Усё з'ела. Шчэлачка там была. Расшчапіўшы стол, а там пясок. Ён як пачаў лупіць па галаве плёткай.

— Выліжы, сабачая морда, гэны пясок!

Языком вылізала. Тады:

— Высалопвай язык! На стол!

Я так стаю, а ён як матанець галаву за валасы, выцягнуў язык і шаршаткай пачаў калоць. Проста абамлела ўсё, не чуствую нічога. Тады — валасы... Палажылі... Адзін накруціці» і другі накруціць валасы — як дзёрнуць, як дзёрнуць!.. Вырвалі ўсе валасы з галавы. Тады палажылі, адзін стаў на галаву, другі на ногі і сталі сеч плёткамі. Секлі, секлі... Яны б засеклі да смерці, так, як і сястру, і Зыбенчыху... Дык прынеслі ім есці. Хлеб намазаны маслам і кацялочкі такія. Яны зграблі гэтую яду і пайшлі на вуліцу.

А немец і пацягнуў нас у хлеў. Ажно туды прыцягнуў і паказвае — накрыў трапішніцай[19] і паказвае: не падымайся. А сам пайшоў, і нет яго, і нет. Прыводзіць каня. Конь бальшушчы такі. Началі гэта вадзіць па людзях, таптаць. Рабят — гэтым канём... Афіцэр прывёў, пераводчык. Немец.

Яшчэ людзі будуць гаварыць:

— Вы няправільна дзелаеце... гаспадзін пераводчык!

— Пачаму,— гаворыць,— няправільна?

— Па первай мабілізацыі ўзяты мой... А што вы нас так казніце?..

—Патом пераводчык пачаў сматрэць, як хто ляжыць — хто жывой. Ужо было позненька так. А гэтым паліцаям... Як ужо яны здзякаліся з нас!.. Перва-наперва ўзялі Быхаўцаву Ліду і пацягнулі. І мальчыка штыком прабілі. І прама ў яму — і стрэлілі. Ну, а патом Шарпенчыху. Тады Дзюбенкіну сям'ю. А Дзюбенкіна дзяўчонка была, звалі Янінай, шаснаццаць лет ёй было. Прышоў немец, афіцэр, і будзе гаварыць:

— Еслі са мной сагласішся — будзеш жыць, а не сагласішся — уб'ем.

А яна:

— Біце!— За матку зграблася, ужо мёртвую.— Я нікуды не пайду!..

Вот тады іх павялі к яме і расстралялі.

---

[19] Трапішніца *(дыял.)* — дзяруга.

І вот мальчык гэты большы ідзець... А я ўжо не слышала нагамі — ці я па зямлі іду, ці па небе. Уся гару, іссечана ўся, валасы ўсе выдраны, язык распух. Вядуць к яме. А большы мальчык:

— Дзядзенькі, не страляйце!

І меншы... На руках несла... Не помню больш нічога... Ачуцілася ў яме. Толькі бліснула, агонь так... Большага мальчыка першага стрэліў, мяне тады, а тады меншага. Ну вот, зарылі — не помню нічога, а слышу — пясок уначале шу-шу, шу-шу, шу-шу... Пясок пачалі кідаць. Папаўзлі мурашкі ў рот, у нос. Плоха мне стала пад зямлёй. Яны закапалі, слышна: дух-дух-дух-дух — пайшлі...

Гэта я тады помніла ўродзе бы. А як вылезла і адпаўзлася, вот так як да тога доміка — нічога не помню. Помню, што вылезла: «Папаўзу тапіцца ў рэчку». Гэта я помню. А тады ўжо, як зваліласся, падніму галаву— не магу. Я ж не знала, што я прастрэлена. Не помню нічога. Кажуць, што прастрэлена: во ў патыліцу стрэлена, а пуля вышаўшы.

Прывазілі гэтага... урача з-за фронта, на Сяляўскі аэрадром. Ага. Я на дзевяты дзень прышла к памяці толькі. Мне расказвалі гэта, у каго я ляжала — Бялькова.

Ну, вот. Гэта немцы паехалі — парцізаны сюды. А я адпаўзлася, лягла, і так крові, гаворацъ людзі, як найшло... У крыві ў гэтай і ляжала. Слышу: дух-дух — нехта загаварыў. З Саснёў там жыў такой. Вашэнь іхняя фамілія, Вашнёвы. Прыбег старык і будзе гаварыць:

— Якая-та баба ляжыць, жэншчына забітая. Сямёнаўна! Калхознікі, сюды!

Прыбеглі. А я ўслышала ягоны галос, паднялася во так назад — ударылася, палілася кроў з рота, і з вушэй — усюды. Яны мяне падхвацілі на трапічніцу, паняслі к Бяльковым у хату.

Гэта патом ужо — урача. Мой прыбег з атраду — вызваў. Урач гэты прыехаў, пясок выкачаў з мяне. І рвала, а пясок ішоў. Ён усё выкачаў — і пясок і ваду... Раны гэтыя мае на языку памазаў, тады сюды рану гэтую... Прыходзілі медсёстры з атраду, каб загнаення не было ў ране. А ў галаве ў мяне ўсё бом-бом, бом-бом... Ніяк. А ён прыехаў патом, распёр гэты чэрап, і на маз-гавой абалочке была кроў, какой-та ложач-кай даставаў ён гэтую кроў. Как дастаў кроў з мазгавой абалочкі...

П ы т а н н е: — Урач з-за фронту прыляцеў?

— У Маляўшчыну на аэрадром. Яны мяне хацелі везці за фронт. Сам гаворыць, хірург гаворыщ:

Каб вы спасліся тут, то нада вядро маку і мёду ўмесце. Мак цярэць, талоч і цярэць з мёдам і есці. Вы саўсем з крыві сышлі. Вы тады паправіцеся і ўстанеце. А як не будзеце гэтага ўпатрабляць... За фронтам вам гэтага не дадуць. Вайна.

Вот. Так я і папраўлялася. Прынясло мне насяленне вядро маку за

адзін дзень, а мёд свой быў, пчолы свае былі. Вот так. Я толькі на дзевяты дзень прышла к памяці, стала есці гэта і на пяты месяц толькі стала хадзіць. Вот...»

Яна нас частавала потым, зноў жа ціхая і добрая. І шафёра вышла паклікала. Замацаванне добрых пачуццяў сустрэчы,— можа, адзінай у нашым, усіх нас разам, жыцці.

Каля ганка, перад зялёнай далінай, цвіў бэз. А салаўёў — калі мы выйшлі, не было чуваць. Можа, што сама поўдзень, сонца зусім разагнала шчодры пасля ўчарашняга дажджу туман, можа, і таму, што ўсё-такі палавіна чэрвеня, а то і проста выпадковасць, перадых.

А выпадковасць гэта ці заканамернасць— тое, што выжыла, уваскрэсла яна, Акуліна Сямёнаўна Іванова? На бяду катам, супраць якіх пасля сведчыла на двух працэсах? На радасць людзям, што любяць дабро,— на незвычайную, сцішнаватую радасць?..

## ПАЦАЛАВАЦЬ АПОШНІ РАЗ...

### 1

**Любоў Сямёнаўна Іванова.** Семдзесят пяць гадоў. Гарбачова Расонскага раёна.

«...У партызанах мужык мой не быў, ён быў на фронце...

Гэта мне трэба сюды гаварыць? (Паказвае на мікрафон.) Проста, кажаце, гаварыць? Я і буду проста гаварыць.

Быў такі час, што прышоў вораг у дзярэўню. Так мы плакалі ды гаравалі, але жылі на месце, а ўжо як вораг прышоў, дык мы з Лідай — у мяне такая падружка была — у лес пашлі. У лясу цягаліся. Яна — настаўніца, у яе двое дзяцей было, а ў мяне адзін Віця.

А тут сабіралі, стралялі, вешалі...

Калі я з бежанцаў прышла, дык на маёй хаце было напісана: «Партызанскі, бандзіцкі дом». Во, мой сынок, так было напісана! Жэня, мой большы сын, прышоў з парцізанаў — тапаром высякаў: нельзя было сцерці, а некрасіва было напісана на хаце, каля парога.

Сабіралі тут людзей, стралялі...

У брата ў мяне сем душ узялі — брата, братавую і іхніх тры дочкі і ўнучка... У мяне была адна сястра, і яе ўзялі. Тут яны ўжо распараджаліся, і стралялі, і палілі...

Тут во яма была, і там яма была. Самі сабе людзі капалі ямы. А патом аўтаматам перавялі. Семдзесят чалавек было там. Калі мы з лесу

вярнуліся, то выкапалі іх, перавязлі на кладбішча.

Пытанне: — А як вы па лесе з сяброўкай вашай, з дзецьмі вашымі хадзілі?

— Хадзілі, сынок мой, хадзілі... Усё раскажу. Канашонкі ад нас недалёка. Прыбягаець мой хлопец большы. Вечарам. Яму толькі пачаўся шаснаццаты гадок, і яго ў партызаны прынялі. Гаворыць:

— Мама, немец у Канашонкі прышоў!..

Ён цяпер пахаваны ажно ў Алітусе. А звалі яго Жэня. Жэня Іваноў Ягоравіч. Дайшоў ён ажно да Алітуса, і там убілі яго. Я ўжо два разы на магілу ездзіла...

Ну, а тады сказаў сынок мой:

— Мама, немец у Канашонках!

Трапкі мы свае сабралі. Запрог ён каня і завёз у лес, у балота. Мы з падругай Лідай зямлянку выкапалі, у зямлянцы гэтай нядзелю сядзелі. А з харчамі ж як? У нас была картошка закопана. А снег жа быў! Ноччу хадзілі мы картошку тую з ямы даставаць. Варылі яе там. А патом сабраліся ў ноч, пашлі праведаць у дзярэўню. Нікога няма. Мы ўдзвёх прышлі з Лідай у дзярэўню. Рабят у яе двое, і ў мяне адзін мой, Віця. Дзяцей пакінулі ў зямлянцы, а самі пайшлі. Ходзім па дзярэўні — нікагутка няма, толькі адзін... Ну, як гэта? І па-нашаму, і па-вашаму — бык. Бальшой-бальшой бык і з цэпам[20]. З цэпа сарваўся. Паглядзела я ў хлеў, там у мяне аставаліся авечкі. Нікога няма. Хата — цэлая. Мы паглядзелі і пайшлі. Ну, а заўтра, рашылі, пойдзем яшчэ раз дамоў. Нікога нет — не будзе немцаў.

Пераспалі мы ноч у зямлянцы. Які там сон на сырой зямельцы? Бо там жа ў нас нічога не было. От, можа, трапка была якая. А раненька выбраліся і дамоў.

У яе там хата была такая маленькая. Фельчарская вашабітка была, а яна, Ліда, патом прыехала з Віцебска і там жыла. І супу наварылі мы нейкага. А потым глядзім: снег белы-белы, і відаць, што людзі так ідуць — як цёмная хмара, чалавек ад чалавека, як вот ад гэтай сценкі да гэтай. Ехалі дарогай, а патом тут у нас возера, дык і па гэтаму возеру ідуць — плотна-плотна!..

А мы толькі што прышлі ў хату і паселі. Каб нас заспелі там, у лесе, у зямлянцы — так бы нам і ўсё было.

Мы як сядзелі ў хаце, так і суп наш і ўсё асталося. І рабяты гэтыя галодныя. Мы ўжо і есці не хацелі. І сядзім...

Уваходзіць паліцай. А ў яе былі галёшы, мокрыя палажыла на каптур, сушыць. Ён галёшы бярэ і за пазуху. Мы нічога не гаворым. Ага. За пазуху палажыў, а тут сяйчас уваходзіць немец.

— Матке, матке, матке!.. Парызан у вас ёсць?

— Нет у нас партызана.

— А вы, — гаворыць ён чыста на рускі язык, — вы ўжо прачышчаныя?

[20] Цэп *(дыял.)* — ланцуг.

А мы сядзім і калоцімся: і ў яе сын у атрадзе, і ў мяне...

Так яны ў лес і пайшлі ад нас.

А этат паліцай спужаўся, як немец прышоў. Захінуў трохі гэтыя галёшы. А мы ўжо маўчым.

Потым глядзім у акно — адтулечка едуць нашы людзі. На вазах з дзецьмі бабы, старыя... Яны ўжо гэта прачышчаныя. Ідуць, ідуць... І коні, і каровы, і людзі ідуць. А я кажу:

— Ну, Ліда Іванаўна, і мы пойдзем умесце.

Мой хлопчык так забалеў, крывавым паносам. Трэба гарачая яда, а ён не мог без гарачай. Так аслабеў. А ейныя, Лідзіны, здаравее рабяты. Дзяржу я гэтага свайго за руку і не знаю, што з ім дзелаць... Тут ідзець адна, Анюта Сцяпаніха. Яна дзета там у Латвіі жыве цяпер. А я вяду малога і гавару:

— Анютка, вазьмі майго Віцю. Можа, маё жыццё тое застанецца. А я, — гавару, — пайду куды мае глазы глядзяць. Людзі прачышчаныя ідуць, і мы ззаду за імі пойдзем, як прачышчаныя. Ліда ідзець з рабятамі сваімі, а мой валіцца...

А ў яе, у тое Анюты, значыць, дачка была, дзеўка гадоў шаснаццаць. І гэты мой партызан, Жэня мой, і гэтая дзеўка — яны, як у школу хадзілі, то яны падружвалі. Гэта Клаўдзя яна, дай бог ёй многа лет жыць і сягоння! Як я так сказала на яе матку, то матка мне нічога не сказала, а Клаўдзя гэтая падышла, майго Віцю за руку і павяла ў хату. А ў яго крывавы панос быў, ужо ён ісці не можа...

А снег!.. А куды ж ісці? Невядома. А я падымуся — ды аб зямлю: дзіця — адзін глаз быў ва лбе, ды і той астаўся... Яна, праўда, мая падружка Ліда, мяне пад Руку:

— Як-небудзь шагу прыбаў, як-небудзь шагу прыбаў!..

І мы сюды во... Адсюль вуліца якраз, той вуліцай нашай і — на шашу. Адтуль немцы едуць і едуць на конях. І шкапы, і свіней, і авец вязуць з-пад Старыны. Старына гарыць, і Куляшова гарыць — усё, усё гарыць!.. А мы адсюль ужо напроціў плывём.

А з нашай ды дзярэўні быў паліцай. Ну, не паліцай, але ён тожа быў не савецкі чалавек. Я толькі яго і баялася. Так мяне тут ніхто не знаець, а ён знаець. Ну, думаю, еслі ўжо ён сустрэціць мяне, то мне не жыць...

Але ўжо нада ісці. Не, чым ужо тут пападаць у рукі саўсем, на якую віселыніцу, то лепш ісці. Ідзём мы. Ідзём удзвюх, у яе рабяты з ёю, і мы ідзём. Яна мяне пад руку падвяла трохі, бо я ўжо не магла, — ад таго, што рабёнка кінула.. А густа-густа коні так ідуць, адзін за адным, сані за саньмі. Каторыя людзі ідуць, каторыя едуць. Кароў вядуць. А нас на сані ніхто не бярэ. А я ўжо сані падпіхваю — учасніца!.. (Смяецца.) А Лідзіных рабят на сані тожа не бяруць... А немцы, а паліцаі напроціў нам едуць ды едуць. Яны ўсё едуць, густа, густа, а

мы напроціў. Прыехалі туды, пад Байдзіна пад наша, нас астанаўляюць:

— Што, вы — прачышчаныя?

— Прачышчаны.

— У вас нет партызан?

— Нет.

— Ну, то едзьце.

Павярнулі мы — яны адсюль, а мы так у дзярэўню.

А сумёт! А снег!.. Выехалі на азяро. Марыя Калдубей нам у ліцо гаворыць:

— З-за вас нас застрэлюць. Вы з намі не едзьце. Яны паехалі на тую старану, а мы самі не знаем куды... З гэтай маладзіцай, і двое рабят ужо. Ну што ж. У мяне быў палушубак пакрыты, а на галаве — так ужо, знаеце, без памяці — белая простынь. А снег!.. Я гавару:

— Ну, Ліда Іванаўна, застанёмся мы тут у снягу гэтым!..

Ужо вечарэець. Падышлі пад Вярусялімку, селі. А дзяўчонка гэтая спаць хоча. Мальцу было гадоў дванаццаць, а дзяўчонцы гадоў дзесяць. Селі мы так удзвюх з ёй радам. Тады гэтую дзяўчонку... А яна толькі што яе пераабула, здзела нейкія там валёнкі, а баціначкі абула. Я гэтую дзяўчонку — галаву к сабе прыхінула, а яна — ногі. І тады гэты мальчышка сеў у кучачку. Прастынёй — я адвязала з галавы — накрыліся. А мы гэта прышлі к азяру, нада цераз азяро, лес у нас тут недалёка. Ну, і сядзім. Сядзім. Гэтая дзяўчонка дрэмлець, а яна яе пад бакі б'ець усё. А знаеце — на снягу і не прастудзіліся...

Усталі потым — пойдзем цераз азяро. Усе мокрыя, а тады абмерзлі, ідзеш, і шуміць усё каля цябе. Яна за руку гэтую дзеўку, а мальчышка ідзе. Цераз азяро прайшлі, там лясок нешырокі, а там ляснік жывець. Пойдзем к лесніку к гэтаму ўжо. Ідзём па лесе, а немцы як кінуць ракету — відна-відна! — стаім на месцы, а пацямнеець — ідзём.

Прыйшлі, а тут ужо байня яго недалёка, пойдзем у тую байню, бо ў хаце, можа, немцы, мы ж не знаем. Стаялі, стаялі — ужо дужа да цёмнага. У байню пайшлі. А самі — усё мокрае. Госпадзі, не нада і гаварыць, якое гора!.. (Плача, а суседка, каб супакоіць яе, пытаецца: «А ў чыю вы байню?» — «У чыю ж, — адказвае яна, — у леснікову».) Глядзім — ляжыць ахапак дроў. А я і спічак купіла, летам, у Троіцу яшчэ, і так у піджак ушыла. А гэта ж ужо калі было — зімой, і ўсё я гэтую каробачку насіла. І затапляць байню нам якраз дровы ёсць. І якраз у акно леснікавай хаты нашы дзверы. «Ну што ж, — гаворым, — еслі толькі немцы, а мы затопім, то ўжо ж недалёка...» Але так даў бог, што не было ў іх немцаў. У лесніка. Ну вот, затапілі. Я гэтыя дзверы закрываю.

Рабяты на зямлі пазаснулі. Дровы не гарàць. Я глазы спорціла, глазы мае засадзелі. А дровы гэтыя толькі тлелі. Трохі яны грэлі гэтую байню. Дровы сатлелі, і дзірачку мы такую кінулі, каб ішоў дым. Ну, тады рабят на палок з зямлі пацягалі, яна каля іх, а я так на

каменку, яна цёпленькая была, лягла на каменку, уся мокрая, і заснулі мы.

Ну, а назаўтра даў бог, што сняжком абкінула гэтую байню. Нада ж ужо нам уставаць, ісці к гэтаму чалавеку. Я гавару:

— Ліда Іванаўна, еслі немцаў нет, то мы дзірачку гэтую адкрыем — і відна будзе, што слядоў нет, што яны не хадзілі.

Сядзелі-сядзелі, глядзелі-глядзелі — нет... (Плача.)

Ну, пойдзем. Праўда, немцаў няма. Там Анюта ў сенях сядзела, етага мужчыны сястра... (Плача.) Налілі нам міску капусты і бульбы. Можа, тры дні не еўшы былі. Нейкі гарох быў: Ліда трохі гароху ўзяла, рабяты там жавалі.

А ў Скарбунах ужо яцы пабілі баб. І паехалі са Скарбуноў. А ў мяне глазы садзяюць — не віжу нічога. Прышлі мы ў Скарбуны, а там дзеўкі плачуць: маладых не білі, а толькі старух пабілі. Тады папрасіла я мыла. Мне далі, і я прамыла глазы. Пашлі мы ўжо ў Вераціна. Прышлі ў Вераціна — у брата майго толькі так во шатаюцца аканіцы. У хату я ўвайшла, а там нікога — пуста: усіх пабілі... Ой!..

Ну, што ж... А ў мяне ж, мой сынок, сэрца б'ецца, — адзін рабёнак, глаз ува лбе, і той застаўся там... Віця. Цяпер я ўвідзела б яго — пацалавала б толькі — і ўсё... І не страх мне... (Плача.)

А ейныя рабята з ёю.

І я пайшла сама. Іду і не знаю, куды іду... Іду..Ў Гарбачова. Прышла, сустракаю аднаго чалавека. Ён гаворыць:

— Не ідзі, Сямёнаўна, там цяпер якраз самы пурым[21] ідзець. Ніяк не ідзі. Пападзеш — там цяпер сама расправа ідзе...

Прышла я ў соснік і стаю. А што ж я выстаю?..

Потым сястру сваю сустрэла. Сястра мая радная, памершы ўжо. Я ёй сказала, у якой хаце мой мальчышка. Тады яна пайшла, узяла мальчышку і апяць назад. І так даў бог, што немец нічога, — як стаяў вартавы, так нічога ёй не сказаў, і яна прайшла міма. Як увідзела я сыночка — ну, цяпер усё!..

І гэты сынок у мяне адзін. А той, што быў у атрадзе, таго ўбілі. А гэты ў Кавалях прарабам работаець. (Плача.) Іваноў Віктар Ягоравіч...»

**2**

**Алена Халімонаўна Бандарчук.** Шэсцьдзесят два гады. Алексічы Хойніцкага раёна.

«...Дагналі мяне на сваім агародзе. А прыехалі яны, мае даражэнькія, гадзін у адзінаццаць. У мяне было дзіця маленькае, хлопчык быў. Яно сабе спіць, а дзяўчынка большая глядзела яго. Я хацела малое грудзьмі пакарміць. Потым хапіла дзіця і пабегла. Іду я, а тут суседка мая са сваім свёкрам едзе і крычыць да мяне: «Алена! Алена!..» А ўжо немцы едуць,

[21] Пурым — яўрэйскае рэлігійнае свята; па звычаю ў гэты дзень усе носяць адзін аднаму падарункі.

машыны гудуць. Пачалі людзі бегчы, і я іду, бачу — у канцы сяла загарэлася хата. Я пабегла туды, і свёкар мой за мною. А дзеці мае большыя дома былі. Іду я, а машынка такая шэранькая ідзе, і ў ёй два немцы ў чорных шапках сядзяць. Каля дуба яны завярнуліся, уехалі ў вёску, спыніліся і пабеглі. Потым бачу я — на кагосьці яны вінтоўкі панастаўлялі. Дык я і закрычала:

— Стась, б'юць!..

Пытанне: — А вёску яны акружылі?

— Мамка мая, я нічога не бачыла. Бачыла толькі тых двух. Бачыла я толькі, як яны вінтоўкі панастаўлялі.

А мае дзеткі маленькія — усе ка мне. Людскія дзеці, казалі людзі, пазасыналі, а мае — ка мне. У мяне хлопчык быў адзін паўгода, а другі гады тры, і яшчэ суседні адзін, і я з імі паўзу, а потым як азірнуся, дык немцы ідуць за мной. Вінтоўкі панастаўлялі, ідуць, ідуць... Хацелася мне ў каноплі дапаўзці. А кулі свішчуць: сюды-туды, сюды-туды... Хлопчык мой большы ўпаў і крычыць:

— Ах, мамо, мамо, вонь у вас кроў!..

І я ўжо бачу, што я ляжу ў пяску і ў роце ў мяне пяску багата, а потым бачу, што хлопчыка ранілі і шапачка ў яго зляцела. І бачу я, што ён красненькі быў, а ўжо яго губачкі жоўтыя-жоўтыя, і гаварыць не можа. А меншы, як я з ім упала, дык пачула, як у грудках яго захрапло. Храпянула, і — усё. Ужо і нямашака ўжо...

А гэтыя кулі ўсё свішчуць. Мяне ранілі, як я паўзла, дык невядома, каторая куля. Зроду я такога не бачыла, як яны шусь-шусь, сюды-туды кругом мяне, а адкуль яны, я не бачу. Бо я паўзла. А як галаву падніму, дык бачу, што тыя двух ідуць за мной і ўсё страляюць...

А далей ужо ўсё: і я не паднялася, і хлопчыкі мае паканчаліся. Падышоў ён да мяне, узяў мяне за руку вышэй локця — галава мая прыпаднялася, ляп аб зямлю, і кроў з мяне цячэ. І яны зеркнулі на мяне і пайшлі.

Прыпаднялася я толькі, каб хлопчыка майго цераз разору пацалаваць, але ўжо я не дам рады...

І вот, бачу я ўсё гэта, — усё роўна як сёння, хоць урэмя прайшло, — як ён ляжыць, і шапачка яго звалілася...

Чую я, што хата гарыць, трашчыць агонь. Усё сяло ўжо гарэла. Потым чую: суседка на маму маю крычыць:

— Бабо, яны вунь туды пабеглі!

І мама мая ка мне прыбегла. Бяжыць ужо яна і галосіць. А я ўжо сазнання ніякага больш не знала.

Потым матка мая і сёстры мае гаварылі, як я яго цераз разору пацалаваць хацела, але ніяк не дам рады — не паднялася... Толькі помню, як мяне везлі на возе па разорах, як мяне трэсла. А яны яшчэ кажуць, што я сама на воз узлезла, бо яны забралі мяне, мае браты і матка, і дзяцей маіх падабралі. Тут яшчэ адна жанчына кажа, што як везлі мяне з дзеткамі, дык вунь як кроў цякла...

А баба адна казала, што як білі, дык мая дзевачка большая вельмі прасілася:

— А не беце, не беце мяне, у мяне ж бацькі няма!.. Яна была з трыццатага году, дванаццаць гадкоў. А было ў мяне тады дзяцей чацвёра, а свёкар быў пяты, майго хадзяіна бацька, а я ўжо шостая. Дзяцей усіх пабілі, і свёкра, а мяне ранілі. Яны мяне за малым богам не забілі. Я гэта не ведаю, як я не захліснулася, бо ўжо духу ў мяне не было. Так страшко было!.. Асабліва як блізка. А ён яшчэ падышоў дый за руку ўзяў мяне. Не ведаю, за якую руку, мажа, за етую, бо я вот так з хлопчыкам паўзла…

Тады ж усе людзі баяліся: як немцы ў сяло, дык людзі ўсе — з сяла!..

А ў мяне, мае дарагенькія, толькі чэрап прабілі…

Адна рана і цяпер яшчэ не зажывае.

Браты мае зрабілі мне хатку, а потым, як мужык з фронту прыйшоў, дык яшчэ болей дабавіў.

І ўжо я, мае дарагенькія, нічога вам больш не магу расказаць. Я няграматная, а пасля таго, як мяне стралялі, я ўжо і ўсё расцярала. Гэта толькі што ў мяне хадзяін добры. После вайны ў мяне яшчэ трое дзетак.

Разышліся нашы дзеці па свеце, а мы з дзедам жывём. Дзед мой паехаў сягоння, дома няма.

Пытанне: — Аколькі людзей забілі ў Алексічах?

— Я вам, мамка мая, не магу расказаць. Людзі расказваюць, што бытта душ семсот…»

**АКЦЫЯ, АПЕРАЦЫЯ, ЭКСПЕДЫЦЫЯ...**

Гродзеншчына, калі прыехаць сюды з Віцебшчыны або з Палесся, выдаецца краем палявым, абжытым. Лясныя абшары захаваліся тут адно ўздоўж Нёмана і яго прытокаў. Бярозу Нёманскую абняла Налібоцкая пушча, а Шчара прытуліла да правага берага Ліпічанскую. Ужо ад самага Слоніма паўз гэты бераг цягнуцца, дзе тонкім шнурком, а дзе і шырокімі палосамі, дубовыя гаі. Далей ад рэчышча дубняк мяшаецца з сасною і елкай, збіваецца ў ніштаватыя бары, якія толькі на подступах да паселішчаў рассыпаюцца дробнымі кудзеркамі ці, натрапіўшы на балота, гразнуць там і, стаўшы карлікавымі бярэзнікамі ды сасоннікамі, гібеюць у хмызняках багуну-дурнап'яну.

Паселішчаў тут мала, хіба што недзе над самаю рэчкай прытарнавалася да берага дзівачка-вёсачка са шматзначнаю назвай Вялікая Воля, колішняя прыманка для прыгонных сялян, для неспакойных, бунтарных душ, якім нясцерпна муляла ярмо прыгону і якіх цягнула схавацца ад панскай апекі ў гэтую лясную глухамань. Зманлівыя словы Вялікая Воля, Малая Воля раптам зніжаюцца на заземленых назвах вёсачак Капцi, Гародкі, Галынка... Свавольніца Шчара звыкла кідаць сюды, направа, жоўты пясок ды рудую дзындру. Нагнала пясчаных выдмаў — вунь на дзесяткі кіламетраў — цэлыя пустыні, сям-там парослыя нізкім камлюкаватым сасоннікам. Наносы ўрадлівага мулу ды глею асядалі злева, таму левы бераг Шчары ад веку густа заселены, дагледжаны — луг ды поле, вёскі, пасёлкі, фермы. Нібы хто зверху нацерусіў уздоўж даліны гэтых сялібаў. Хаты і клубы, школы, сельмагі, прыватныя хлеўчукі, прыгрэбнікі, свіронкі і калгасныя кароўнікі, свінарнікі, паркі машын, майстэрні, склады. Сціплае, як старая казка, індывідуальнае жытло сялян; маштабнае на меру краіны і эпохі грамадскае калгасна-саўгаснае будаўніцтва.

Васілевічы, Паўлавічы, Ніз, Востраў... У свой час гэта былі натуральна ўпісаныя ў краявід зялёныя паселішчы. На аселіцах і на ростанях дарог стаялі тут волаты-дубы, ліпы і клёны — пасланцы язычніцкіх святых гаёў, парламенцёры ў адвечнай вайне паміж двума багамі — Палевіком і Лесавіком. Сёння гэтыя вёскі забудоўваюцца акуратна, па плану.

У гэтых мясцінах жыў і працаваў на рубяжы мінулага і нашага веку сусветна вядомы фальклярыст Міхал Федароўскі. З такіх сёл, як Дубраўка, Трахімавічы, Васілевічы, Паўлавічы, Ніз, ён чэрпаў вялікім каўшом народныя беларускія песні, казкі, прымхі і прыказкі, што склалі сем вялікіх тамоў кнігі «Люд беларускі», упрыгожылі славянскую фальклярыстыку.

Зямля тут узгоркавая. Зводдаль ад рэчкі, дзе на кіламетр, а дзе і на два і на тры наўпрасткі цераз узгоркі і

даліны, шыбуе дарога. Ад самага Слоніма да... невядома дакуль, напэўна, да бацькі-Нёмана, туды, недзе пад Орлю. Чалавеку, які будзе ехаць па гэтай дарозе на аўтамабілі, можа часам здавацца, што ён бачыць Шчару з птушынага лёту, так уразіць яго несамавіта выгіблівы жолаб, які выгуляла сабе за вякі гэтая гарэзлівая шаляніца.

На кожным узгорку хочацца пастаяць і палюбавацца, як хораша і суладна могуць жыць і тварыць чалавек і прырода, калі твораць яны паводле законаў розуму, сумлення, харáства.

Дарога не мае тут спачынку. І ўвечар, і ўначы ёй трэба несці варту жыцця — лічыць пакуты, радасці і надзеі турботнага дня, таго, што адыходзіць, і таго, што мае нарадзіцца. Дарога, як стужка нейкага цыклапічнага магнітафона, прасмыкваецца паміж скатамі грузавікоў, якія сунуцца адзін за адным са Слоніма ў вёскі на начлег. І запісваюцца на стужцы-дарозе падзеі дня. Пішуць на гэтай стужцы пратэктары аўтамашын, матацыклаў і трактараў, пішуць абады рыпучага воза, на якім стары калгасны вартаўнік падвозіць зялёны корм да калгаснае фермы, пішуць і пісклявыя калёсікі дзіцячай каляскі, якую шчаслівая маладзіца ў белых туфельках выкаціла на вясковую вуліцу гэтым ціхім адвячоркам першы раз у жыцці.

...Зімою 1942 года тут, над Шчараю, угору і ўніз ад Слоніма, здарылася такое, што дарога — сведка гэтых здарэнняў — перастала разумець, па якім яна ідзе свеце і ў які свет вядзе — у той ці ў гэты... Нават каб здарыўся цуд, каб набыла дарога дар мовы, дык не здолела б уразумела расказаць нам пра тое. Яна пыталася б у нас тлумачэння прычын, так, як пытаюцца людзі, сведкі падзей, тыя, чые галасы мы запісалі, а потым знялі з сапраўднай стужкі сапраўднага магнітафона, каб падаць іх літарамі і словамі.

«...Як, кажаце, для мяне пачынаўся гэты дзень? Яны прыйшлі да нас у суботу, немцы. Называлася гэта — акцыя супраць партызан...»

Расказвае Пётр Іосіфавіч Саўчыц, у вёсцы Гародкі:

«Прыязджаюць немцы. І адразу ачапілі вёску: паставілі тут кулямёт, потым і там паставілі — укруга ачапілі. Ходзіць солтыс з немцамі і зазывае ісці на праверку пашпартоў. І трэба толькі абавязкова забраць з дому сямейны спіс. Бо тады так было, што над дзвярыма павінен быў быць спіс сям'і. Пачалі людзі сходзіцца там, дзе яны сказалі. Яны вынеслі стол, лаўку паставілі. Правяраць, значыцца.

Я сам падышоў таксама. І забыўся гэтага спіску, халера яго ведае. Кажу солтысу:

— Спіс забыўся.

А немец кажа па-польску:

— Нех ідзе пшынесе.

Прыйшоў я дадому, узяў гэты спісак. На стале стаяў табак у кансервеннай банцы. Узяў з сабою. Сто год бабка мая, яна заставалася на койцы. Кручу я папяросу і кажу:

— Бабо, мусіць, заб'юць нас?

А яна мне:

— Унучак, уцякай у лес!

Дальбог. Але як ты пойдзеш? Калі я пайду, дык яны тых паб'юць там...

Прыйшоў я туды, а гэты ацэп, што там быў, пачаў сыходзіцца. Як пачаў ён сыхо-дзіцца, дык увесь маладзёж — фюк! — наўцёкі. Засталіся адны старыя. Дык немец выйшаў і кажа па-польску:

— Што вы, дурныя? Чаго вы ўцякаеце? Хто вас біць будзе? Кантроль ідзе.

А солтысаў брат кажа:

— А можа, мы яшчэ горай наробім. Ідзіце сюды, назад.

І пачалі сыходзіцца.

Як пачалі сыходзіцца — гэты немец бярэ ў людзей пашпарты і нясе на стол. Раскаталі ліст на стале і нешта там карандашом чэркае, на паперы. А хто там ведае што.

Немец, калі забраў усе нашы пашпарты, спытаўся ў солтыса па-польску:

— Чы бэндон вольнэ мешканя до пшэноцованя?

— Бэндон.

Як толькі ён сказаў гэтае «бэндон», дык... немец хутка адступіў назад два крокі, а салдаты пачалі біць па ўсіх — і па людзях, і па солтысу. У немцаў так было дагаворана паміж сабой. Замест каманды.

Была адна такая маляшчая калечка, укленчыла яна, давай хрысціцца, спяваць. Нічога не памагло...

Я паспеў выбегчы, дабегчы да рэчкі і паўз беразе папоўз. Ранілі мяне — метраў сто пяцьдзесят адбегся. А жонку забілі. Бацька і сястра таксама там засталіся на месцы, забітыя...»

У вёсках Баравікі, Акунінава, што ляжаць каля Слоніма ўверх па Шчары, яны правялі тую ж «акцыю» інакш, выбарачна. На акунінаўскіх хутарах вынішчэнне людзей пачалося, калі яшчэ і партызанскія атрады не паспелі арганізавацца.

Жыхар Акунінава Іван Ігнатавіч Рубец успамінае:

«...Пачалі з тога канца, вот як вы ехалі, ад Слоніма, і сагналі ўсіх у гэты канец вёскі. Хадзілі па хатах, шукалі, дзе хто схаваны, нават былі старыкі і жанчыны, каторыя не маглі ісці,— іх дабівалі ў хаце...

Тут адзін быў какой-та... не магу сказаць вам, рускі, ці немец, ілі паляк,— ну, канешна, ён быў у нямецкім. І вось ён пытаў у насялення:

— Можа, хто ў Германіі ёсць у вас? Можа, хто пастаўку здаў немцам?..

І так ён некалькі сямей узяў ды адпусціў. Панімаеце? З гэтае таўпы.

Потым з Бытані прыпёрся на легкавой машыне нейкі эсэсавец. Такі

рослы, здаровы мужчына. Пракраціў — нікога нікуды. Ніякіх ні бумажак, ні справак.

Нас адагналі метраў, можа, на семдзесят ад дарогі к саду. І перва-наперва палажылі дваіх: аднаго старыка і другога... быў астаў-шыся ваеннапалонны. Іх многа было ў вёсцы. Не прымак, а не было дзе дзецца гражданіну. Здаровы такі, да часу рабіў у каваля малатабойцам. Яны з краю неяк, наш стары і гэты ваеннапалонны, стаялі. Узялі пала жылі іх на зямлю і прыстрэлілі тут.

Калі прыстрэлілі, то таўпа паглядзела якое дзела, і кінулася — хто куды. Але тут круга саду і круга вёскі сядзелі засады, ку ляміты стаялі. Куды б ты ні пайшоў, цябе— скрозь спатыкала. Хто ўцякаў — ніхто не ўцёк.

Я трымаў дзіця, каля двух гадоў была дзевачка. Мяне параніла ў руку, сюды во Рабёнак у мяне з рук выпаў. Я адбегся мет раў, можа, якіх сямі-васьмі. Такая ёсць там яма старадаўняя. Я ўпаў у гэтую яму. І ра зам упала дзяўчына з Акунінава, ды так плотна легла, і я не ведаў: яна жывая ці не Я спытаў:

— Маруся, ты жывая?

— Жывая.

— Маўчы, не аказвайся. Еслі жывая — не шавяліся.

А з гэтай стараны другая легла, таксама самастаяцельная дзеўка. Я не знаў, што яна жывая. Еслі бы знаў, то ўпрадзіў бы таксама. Калі гэта ўсё прыціхла... яны ха дзілі дабівалі. Вот падходзяць к нам. Падходзіць ён і нагою ў бок ёй як даў, яна пра-цярпела... На мяне наступіў і пайшоў да гэтай. Гэтай стукнуў дзеўчыне — яна схапілася:

— А! — кажа.— Паночку, я вам нешта скажу!

— А, ты скажаш!

І матам на яе. Рускім матам. І ёй з пісталета ў лоб. І пайшоў далей.

Навутра прыехалі немцы, сабралі тых, што былі імі выпушчаныя, і заставілі капаць магілу і ўсіх звезці ў яму і засыпаць зямлёю.

А вот хутары ў нас былі, то год раней яны там людзей не расстрэльвалі, а зганялі адну-дзве сям'і ў памяшканне і паджыгалі. Жглі жыўцом. Колькі было хутароў, дык яны ўсіх і папалілі. Па ўсіх хутарах адна-часова.

У нас гэта было дваццаць другога снеж-ня сорак другога, а хутары палілі зімой сорак першага...»

Пра трагедыю вёсачкі Баравікі мы пачулі ад **Марыі Рыгораўны Кулак**, памятлівай і гаваркой жанчыны, якая з дакладнасцю судовага пратакола абрысавала ўсё: і адбор, і расстрэл, і ўласнае перакананне, што гэта ёй давялося пакутаваць за тое, што яна яшчэ падлеткам палюбіла камсамол, Савецкую ўладу, якая была там, недзе далёка за польска-савецкай мяжой, і тады, у падполлі, хавала Сяргея Прытыцкага.

«...Ну, рана ўсталі — бачым: акружаны, няма куды ўцякаць. Сядзім у хаце, пачалі яны хадзіць па хатах, выганяць на сабранне. Зайшлі і сказалі:

— З малюткамі! Усе з малюткамі!

Ну што ж, мы сабіраемося і ідзем на тое сабранне. І нас ставяць тутака во, дзе цяпер магіла, усіх у рад. І праходзіць і пытаецца:

— Дзе монж?

Ну, каторыя гавораць: «Вот, стаіць». Дайшло да мяне, а ён, мой Антон, пайшоў да сястры, за сем кіламетраў, пайшоў малаціць жыта. А ў мяне чатыры месяцы было рабёнку. Я так і кажу.

— Калі?— пытаецца, гэта, па-польску.

— Учора,— кажу я (ён пайшоў тры дні раней, а я кажу ўчора).

Але не, не выкінулі мяне з гэтага раду.

А потым выклікалі актывістаў, каторыя за Савецкую ўласць былі. Актывістаў — з сям'ёю, усіх.

— Пераходзьце на той бок! Дайшла да мяне вочарадзь.

— Актывіст Кулак Антон Раманавіч! З радзінаю перахадзі!

Пераходжу я туды з тым дзіцем. Стаю. Да партызанскіх сем'яў нас усіх далучаюць. А кулямёты так стаяць усе! Тыя людзі — як заплакалі! Усялякімі галаскамі, як пчолы. Яны — як касанулі! Усё...

Як касанулі па нас, я ўспела накланіцца. А на мне такі ватовік быў тоўсты. Парвала мне куляй ватовік і так мяса закаціла, што рукою не накрыць. Каб яшчэ чуць, дык яна б у мяне сюды выйшла, куля. Я ляжу жывая, і дзіця жывое. А я так жму яго ліцом, а яно крычыць. Чуствую, што задушваю, сэрца баліць. І я жывая, і дзіця жывое... Пушчу вальней, яно закрычыць.

А потым пастралялі трэцюю групу.

Што ж, ходзіць, падымае, каторыя, можа, яшчэ не кончыліся...

А яны ходзяць з пісталетамі і дабіваюць. Дайшоў да мяне, чуе, што дзіця крычыць, а на мяне ён не падумаў, што я жывая: валасы ў мяне панясло і хустку, і тутака кроў... У тое дзіця бахнуў і мне пальцы прастрэліў. Як дзяржала я яго за лічыка, так і ў мяне пальцы ён прастрэліў. І дзіця сціхла, кроў на мяне, чую, свішча на твар...

А каля мяне ляжала яго, Антонава, сястра. Яшчэ храпла. Ён яе паднімаў. Яна села, і так ён яе дастрэліў. І пайшоў ад мяне — далей і далей, і ўсё дастрэльваў.

Ляжу я, ляжу, а тут ужо дыхаць няма чым. Тут у мяне кроў, і завалена я ўся людзьмі, сваёю сям'ёю, і не магу дыхаць. Потым чую: машыны адыходзяць, адыходзяць усё...

Ну, устала я. Сталі людзі падыходзіць тыя, староннія, не пастраляныя. Глядзяць — ляжаць людзі пастраляныя: сталі плакаць каторыя. Тады Я давай падымацца. Падні-

маюся, і не вылезці: уся завалена, уся ў крыві...

І маму маю забілі, і сястру забілі, усіх, усю маю радню. А на ранак што? Пераначавалі — як карчэ. А я зайшла ў адну хату, мне троха закрылі гэтую рану, перавязалі ды кажуць:

— Ідзі, Мар'я, а то праз цябе і нас нем-цы паб'юць.

Ну, то я з гэтай хаты ў другую іду нанач. Ноч пераначую, кажуць:

— Ідзі ўжо ў трэцюю хату, бо, кажа, мы баімося.

Так я тры ночы прахадзіла, а на чацвёртую ён прыйшоў, і ўжо я гэта... І завёз ён мяне ў бальніцу, у Слонім.

Завязлі мяне. Што ж гаварыць тым немцам у бальніцы?

Але завязлі гэтакі во кусок сала, збанок мёду, дык яны р-а-д-ы, і палажылі. Як толькі прыехала, а яны мяне, раз-два, раздзелі, руку забінтавалі, плячо ўбінтавалі і — у бальніцу.

Ляжу адзін тыдзень, другі тыдзень ляжу, і ўсё прыязджаюць у бальніцу, і ўсё дапытваюць, хто які.

Ноччу забіраюць і расстрэльваюць. Страшна, страшна!..

Страх мяне ўзяў, і наказваю: «Прыязджай, забірай!»

Бо прыдзе, думаю, вочарадзь і да мяне ўжо.

Ён прыехаў.

Яшчэ проціў той ночы, што я начавала, прывязлі дзеўчыну з Галынкі. І ў бальніцу прыехалі яе брадь — расстрэльваць. Але як-та ёй связь сказала, і яна ўцякла з бальніцы. Ой, як паднялася тая бальніца ўжо! На тую дзяжурную!.. Хацелі яе павесіць або застрэліць, што яна прапусціла, каб тая ўцякла.

А потым, на другую ноч, ляжаў ваенны ранены, наш ваенны. Ён усё да мяне прыходзіў, распытваўся, распытваўся. А я баюся гаварыць. Але ён ані шагу ад мяне. Усё: «Цётка, так як там партызаны?» А я яму гавару, але і баюся, бо хто яго знае...

А потым я прыехала дадому, і ён прыходзіць: уцёк таксама. Далі яму ўсё — і боты пад бальніцу прынеслі, і пайшоў з бальніцы. Праз дзве нядзелі прыходзіць ён.

— Ну вот, а я,— кажа,— ужо ў партызанах!

Прыехала я з той бальніцы — ні паліць, ні варыць, ні адзецца.

Завёз мяне Антон да сястры, за сем кі-лametраў, і была я там да самага апрэля месяца, там ляжала.

Разам са мной тады забілі восемдзесят шэсць чалавек...»

Вёска Васілевічы. Партызан тут не было. Іх стаянкі былі на правым, лясістым, беразе Шчары, а сюды, на густа заселенае левабярэжжа, яны прыходзілі толькі начамі, як у зону дзеяння і забеспячэння. Дабрацца да партызан і ўступіць з імі ў бой акупанты не кваліліся. Тут, як і ў іншых мясцінах, яны пусцілі ў ход д'ябальскую тактыку: абвінаваціць у існаванні партызан насельніцтва, убіць

клін паміж мірнымі жыхарамі і партызанамі.

Акупанть? загадалі па ўсіх шчароўскіх сёлах пад пагрозай смерці не пускаць партызан у хаты, не даваць есці, не размаўляць з імі. Але хіба можа маці не пусціць у хату сына, жонка мужа, сястра брата, ды і проста чалавек чалавека? Не можа, вядома, покуль не перастаў чалавек быць чалавекам. Такім чынам, акупанты стварылі сітуацыю, у якой усе людзі станавіліся вінаватымі толькі таму і толькі за тое, што яны — людзі.

Паслухаем, як тут праходзіла крывавая «акцыя».

Расказвае Марыя Фёдараўна Сасноўская.

«...Ну вот, гэта перад коляды прыехалі да нас сюды біць нас, у сераду. Калі гэта было — я не ведаю, я няграматная.

Мы сядзелі ў хаце ўсе. Мой муж паехаў у горад, павёз — яшчэ мы былі вінаватыя — пастаўку. А дзве старэйшыя дачкі пашлі да суседа з кудзеляю, прасці. А я з гэтымі меншымі хлопцамі была дома. У мяне гэта было шасцёра дзяцей, а я сама сёмая. Дзеці меншыя забаўляюцца, а немец прышоў у хату... Не ведаю я — немец ён ці не немец, але ў нямецкай адзежы.

— Здрастуйце! А дзе хадзяін?

— Паехаў у горад.

— Ну, то збірайцеся на сабранія.

— На якое сабранія?

— Будзеце бачыць якое.

— Мае дзеткі малыя, босыя, голыя, холадна ім будзе.

Бо бедна мы жылі. Дзеці малыя: аднаму тры гады, гэтаму во пяць лет, і тыя папрыходзілі дзяўчаткі, ужо ўсе сабраліся, сем чалавек у хату. Ну, я за гэтага, закруціла, нясу. А тога меншага, што тры годы, старшая дзевачка нясла. А ён кажа:

— Замыкайце халупу і ўсе выходзьце. Ну, мы ўсе сабраліся і пайшлі. І прывялі нас пад Адама, пад мост. І тут усіх выганялі. І мы стаялі мо паўдня. Ажно холадна стала, дзеці пачалі дрыжаць, плакаць. Тут — едзе таксі з горада. А паўнамочаны быў у горадзе. І Экарт. Гэта паўнамочаны і Экарт прыехалі на таксі.

Мы стаім на гэты бок моста, ад Адама, а таксі стала на той бок. Зараз павылазілі яны, і Экарт будзе пытацца:

Паўнамочаны, якія гэта людзі? Што ты сабраў усіх?

А ён:

— У-у-у! Ушысткі бандыты!

Мае дзеткі маленькія — і «бандыты»!..

А Экарт ізноў будзе пытацца:

— А дзе ж тыя паліцэйскія пастра-даўшыя, спаленыя партызанамі?

— А-а, Сонечка, — будзе крычаць солтыс,— ідзі сюды!

Там другая, трэцяя... Вызваў нешта чалавек пяць... паліцэйскіх сямей...

А што з намі рабіць? Хацелі нас загнаць у Адамава гумно, папаліць. Адкрылі гумно тое, паглядзелі, што там поўна збожжа, яшчэ не змалочанае, і

сена, — не памесцяцца, нешта дзвесце чалавек. Старыя, малыя, хлопцы, дзяўчата, усе разам, хто толькі быў дома. Не памесцяцца. Закрылі гумно. А паўнамочаны кажа:

— Іх на цмэнтаж[22] ганіце, там убіваць. І пагналі нас усіх, як авечак, на надворак. Закрылі. Кругом немцы нас абступілі. Пачалі нас па дзесяць чалавек усё выганяць.

Я — сем душ — ішла на тры вочарадзі. Адразу мяне з гэтым хлопчыкам — я яго на руках нясу. А пасля на другую вочарадзь два і чалавекі, на трэцюю таксама. Са мною ўсе не ішлі, бо ўсе людзі круціліся тамака, плакалі, косы ірвалі...

І тады пагналі нас на могліцы. А я яго пад сябе, закруціла і ўпала на яго (паказвае на сына, што сядзіць побач), калі пачалі страляць. Чую, ужо мае нагі няма, ранена ўжо нага. А я ўжо... чую: кроў кап-кап-кап...

І пашпарт я паказвала, што нічога мы не вінаваты. Малая мая сям'я яшчэ, недарослая...

І гэта яму пуля праз вуха і праз шыю, тры раны. І чую я, кроў кап-кап-кап. І пашпарт мой увесь быў у крыві.

Ну вось, нас перабілі, пасля другіх гналі. Сталі, пастаялі, кажа:

— Ушысткім капут.

Пастаялі, пакурылі і пайшлі.

Ямаў яны не капалі. Прама прыжануць дзесяць чалавек, паложаць на зямлю... І мы гэта лажымося... Вядома, каб чалавек не бачыў гэтыя кулі. І гэтак усё ў галаву, у галаву...

Калі маіх дзяцей пабілі потым — я ўжо не бачыла і не чула, бо не паднімалася.

Усіх перабілі, адно адна жанчына... Дзяцей яе пабілі, яна бачыць, што іх пабілі, а сама скінула валёнкі і бягом у Парэчча. Тыя ўжо не гналіся за ёю і не забілі. Але ўсё роўна сохла-сохла яна і памерла.

А тады ўжо назаўтра пазганялі падводаў, мужчынаў, выкапалі яму такую велькую, як капец, і тады ўсіх гэтых трупаў пацягалі і пазакрывалі. Не з нашай вёскі мужчыны, вераб'ёўскія і разанаўскія. У нас не было падводаў. Нашы каторыя мужчыны былі, то яны паехалі на вывазку ў лес. Адно жанчыны былі дома...»

Кажуць, што блізкасць лёсу робіць людзей душэўна падобнымі адзін на аднаго. Калі гэта праўда, то сын Марыі Фёдараўны, **Сасноўскі Аляксандр** — ідэальная ілюстрацыя такой заканамернасці. Падабенства іх настолькі прыкметнае, што пачынаеш думаць, можа, тады, на могілках, калі маці другі раз падарыла Сашу жыццё, можа, тады і набыў ён гэтае дзіўнае падабенства. Штосьці несамавітае ёсць і ў прамаце характару, і ў манеры гаварыць напрасткі, кароткімі сказамі, як ісці па раллі з цяжкою ношай на плячах. А хада скіравана ўсё да яе, да маці. Нават цяпер, праз трыццаць гадоў пасля таго:

---

[22] Cmentarz *(польск.)* - могільнік

«…Тады было пяць год. Я помню, як мы сядзелі з братам маленькім у хаце. Зайшоў немец — мы папалохаліся. Ды да маткі схапіліся ўдвох. Ён пастаяў, сказаў матцы збірацца…»

А там, на могільніку, у часе расстрэлу, калі маці прыкрыла Сашу сабою, хлопчыка захлынула гэта спракаветнае адчуванне мацярынскай апекі, пачуццё бяспечнасці ля яе грудзей. Саша прыгадвае.

«…А я ўсё на матку сваю:

— Дахаты,— гавару,— пойдзем.

А матка возьме мяне за руку, сцісне:

— Ляжы, не аказвайся.

Калі ўсіх перабілі, пашлі ў дзярэўню тыя немцы. Давай па хатах хадзіць, куры браць, парасёнкі, пачалі грабіць. Чуваць было нам на могілках, як яны грабілі тут усё.

Ну, а як паехалі, мы ўсталі. Холадна было. Я голы быў во так. Маці з большай дзеўчыны пальцішка зняла, гэта я яго адзеў, пакінуу матку і бягом дахаты. Прыбег, сеў на надворку і чакаю — прыдзе матка…

Ужо немцаў няма, немцы паехалі ў горад, сяло пустое, толькі дзверы скрыпяць — вецер усхадзіўся, проста страшна так…

Ну, я сядзеў, сцямнела ўжо, а матка не дайшла да свае хаты, а да маткі свае зайшла. А там, у той хаце, суседка была, гадоў восемдзесят старушка, дык мама мая пытаецца:

— Можа, бачылі, як хлопчык які тут бег?

— Бачыла, кажа, бегнейкі.

— Пайдзіце, бабка, яго прывядзіце.

Прышла бабка, за руку мяне цягне:

— Хадзем да нас.

А я ўпіраюся, не хачу ісці. Кажу:

— Адкрыйце мне, я пайду ў нашу хату.

Ну, а яна мяне за руку і павяла туды. Дзве нядзелі мы там так ляжалі, ніякай перавязкі, нічога. Баяліся ехаць да доктара: білі нас немцы і зноў да іх ехаць,— даб'юць, страшна ўсё-такі. А потым усё-такі рашылі— ці так, ці так, а трэба ехаць.

Паехалі. У Слонім, туды, у бальніцу бацька завёз. Месяц мы ляжалі ў бальніцы. А ўрачы гэтыя ў бальніцы нічога не ведалі, дапытваюцца: «Дзе вы былі, на фронце?» Вёску нашу не спалілі, а ў Слоніме не ведалі, што нас пастралялі.

Месяц мы паляжалі ў бальніцы і зноў дадому прышлі…»

Уратавала маці Сашу Сасноўскага. І вырас ён дужым і спраўным, стаў трактарыстам у родным калгасе «Савецкая Беларусь». Высокі, здаровы, з бясхітраснаю праматою ў блакітных вачах і валявою ўпартасцю ў прамой моцнай шыі. Толькі між густымі брывамі затоена нейкая збянтэжанасць: ён, як і маці, тужыцца і ніяк не можа адказаць на пытанне: чаму такое было з ім? Расказваючы, ён нібы ўвесь час пытаецца…

Вось і суседка Сасноўскіх, Тэкля Пятроўна Гарасімчык, б'ецца над гэтым пытаннем.

«...Тут я і нарадзілася, тут я і замуж пайшла. І раскажу я тое самаё... У тысяча дзевяцьсот сорак другім годзе, шаснаццатага дзекабра была серада. Я выпаліла ў печы, усё гэта... пакарміла дзяцей і стала мясці хату. А муж быў у гумне, архаваў ці ячмень, ці авёс. Ну вот, прыходзіць немец у хату:

— Цурык, цурык!..

— Куды, пане?

— Туды, на сабранне.

— Адной мне?— пытаюся.

— Не, і дзеці бяры. Кіндэр, кіндэр!.. Ну, і што... У мяне было тры годзікі хлопчыку. Я ўкруціла так яго, накрыла.

Пагнаў ён нас. Прыгнаў да моста. І мужа пагнаў з гумна. Муж уперад пайшоў, а я ўжо з дзецьмі за ім. З намі была Ганузя і Маруся Майсеева, дзве старушкі. Прыгналі сюды пад мост, каля Адама Гарасімчыка. Акружылі нас, уставілі нас ва двары. Хацелі спачатку ў сарай, каб сажэч жывых, але тут ужо не было ім як: поўна было накладзена, толькі адзін ток гуляў, з аднаго боку сена, а з другога — жыта немалочанае...

Ну, і ўсё дажыдаліся гэтага солтыса-людаеда. Прыехаў ён з горада на таксі, з тым начальнікам-немцам. Давай гаварыць:

— Дзе тут твае спалёныя людзі?

Ну, стаяў яго зяць з сям'ёй, ён за заця:

— Во гэта мае. Больш я нікога не хачу.

Я з дзіцем на руках, дзяржала хлопчыка, дзіця зашчаміла мяне за шыю і не дало мне нідзе аглянуцца:

— Мамачка, мамачка, не кідай мяне. Будзем разам, нас немец пастраляе разам.

Тры годзікі было.

— Не,— кажу,— сынок, не кіну, не кіну.

Муж мой узяў яго ў мяне, а ён:

— Не, я да мамкі, да мамкі.

І мой свёкар стаяў, восемдзесят лет, у той самай групе. І дзевер, і залоўка з малым, і я з дзіцем. Гэта нас гналі ўсіх. А дзіця гэтае ўчапілася проста як клешч. Пагналі. Прыгналі на кладбішча і гавораць: «Падай!» Я тут упала з дзіцем, а муж мой — пабег уцякаць за раку. І яшчэ адзін старычок, Малец. Пабеглі яны ўдваіх. Гэты старычок быў лягчэйшы, перабег, а мой муж — не ведаю, ці ён заваліўся ў раку... дабег да яго немец, у яго ўсё страляў і забіў там яго. І ён ляжаў там тры дні.

Я на могілках ляжала, не чула, ці каго стралялі, бо ў мяне сэрца забілася, і не помню... Я пасля ўжо ачнулася — нікога няма, толькі вакол трупы ляжаць... Я падняла галаву — ой, ужо не бачу нічога на адно вока, мне ўсё тут запухла. Куля тут во папала і праз вока выйшла. Я паднялася, зноў упала, бачу: дзіця ляжыць нежывое. Я гавару яму: «Косцік, Косцік», а ён нічога, ужо нежывы. Тут свёкар забіты, тут залоўка ляжыць. Ятроўка забітая з дзіцем. Я паднялася і зноў упала...

А ўжо вечарэе. А майго свёкра дом каля могілкаў на хутары стаіць. Я паднялася ўсё-такі, падзяржалася за кусцік трохі. Усё на мне скарэла, у крыві. Кінула тое каўдзёрка, што дзіця было ўкручана, і папаўзла. Прыпаўзла я да дому гэтага, упаўзла ў дом — нікога няма. Я лягла тут на каравацъ, ляжала, ляжала, ужо мне ўсё шуміць... А потым уваходзіць у хату... А я думаю, што гэта заходзіць мяне забіваць. Адно ж прыходзіць Кацярына Хатунчык да мяне проста, да ложка. І яе дзяцей трое забілі. А яна пайшла карове тады даваць якраз і так засталася. А Любу, ятроўку яе, з дзеткамі разам забілі. Цяпер яна мне гаворыць:

— Ты жывая?

— Жывая,— адказваю.

— Хадзем,— кажа яна,— я цябе завяду ў сваю хату.

Падняла яна мяне, пад руку ўзяла, накрыла мяне радзюжкай і павяла мяне ў свой дом. Я тут упала каля дома свайго і ляжала,— нідзе нікога нямашака. После яна ўсё-такі мяне падняла і правяла ў Пападзічкову хату. А там жыў солтысаў зяць. Адчыняе яна хату і вядзе мяне туды. А яны крычаць:

— А куды ты яе вядзеш?

А я ўсё помню, толькі не бачу нічога во гэтым вокам, бо запухла ўсё. А маці ў яго старая гаворыць:

— Во, каб за яе яшчэ і нас пабілі.

Яна памерла. Каб яна жыла, дык я б ёй у вочы сказала. Яны сабраліся ды з тае хаты пайшлі, а я засталася адна. Ляжу. Цёмна ўжо, нікога нідзе, цішыня... А потым адчыняюць хату і ўваходзіць Малашка і на мяне гэтак:

— Ты жывая?

— Жывая,— адказваю.

— Хадзем я цябе да сябе занясу...

Мяне ўзяла ў радзюжку і занясла Герасімчык Малання да свае хаты. І яна мяне ўсю ноч, гэта, глядзела. І муж яе Мікалай. Памёр ужо ён. А яна яшчэ ёсць жывая.

А на ранькі і гэты солтыс прыехаў. А гэты солтыс быў Малашын дзевер.

— А што,— кажа ён,— жывая, засталася яшчэ...

А яму кажуць:

— Ну, і жывая. І няхай жыве.

І яшчэ засталіся ў мяне дзве дочкі і сынок. Сыну было сем год, і ён быў у сястры. Так і застаўся. Адна дочка, Таня, з катораю я цяпер жыву, уцякла. Пад печку схавалася з цёткай. Чатыры разы прыходзілі ў хату іх шукаць, а яны пад печкай картопляю прыгарнуліся...

А на ранькі прыехала мая сястра, забрала мяне і павязла ў бальніцу. А выйшла з бальніцы, так трэба было работаць, тады ж яшчэ калхозаў не было. З дзеткамі я так і работала патроху. Хадзіла, абвязаўшы галаву. І цяпер яна яшчэ ўсё баліць, дваццаць восем год прайшло, а яна ўсё баліць...

І работала я, і пастаўкі ўсе здавала, і радавалася, што хоць Савецкая ўлада прышла і што хоць лягу ды сплю спакойна...»

Тэкля Гарасімчык руплівая, удумлівая жанчына. У сённяшніх умовах з такіх выходзяць добрыя настаўніцы, узгадавальніцы моладзі. Ёй рупіць дайсці да канца, да карэння, да прычын... Тэкля Пятроўна была сведкай абвінавачання на судзе над фашысцкімі злачынцамі і іх памагатымі. На тым судзе апраўдваўся солтыс: «Не я вас біў, гэта акцыя біла...»

Тэкля Пятроўна сказала настойліва, цвёрда сказала:

— Не акцыя біла, а вы!

Дзяўчына ў паэзіі ўсіх народаў свету выступае як істота пяшчотнай чысціні. Беларуская песня ўвасабляе яе ў вобразе белай бярозкі, каліны ў цвеце, пялёсткаў ружы ў ранішняй расе.

А вось два дзявочыя лёсы, апаленыя агнём і смерцю. Марыя Скок з Паўлавіч і Яўгеня Бардун з Ніза. Марыя ў той час ужо ўбіралася ў дзяўчыну, а Яўгеня была яшчэ дзіцем, як і Саша Сасноўскі.

Марыя Скок пачынае свой расказ разважаннямі.

Ёсць у яе гаворцы ноткі гордасці. Ёсць і высокае разуменне непарушнасці той сувязі партызан з народам, якая тады была. Ёсць і глыбокае ўсведамленне таго, што трагедыя сяла не можа быць вытлумачана барацьбою акупантаў супраць партызан. Сёння ўжо вопытны чалавек, яна разумее, што ўся справа ў карэннай ненармальнасці, звыроднасці фашызму.

«...Парцізанам памагалі. І зналі, што да дабра не дойдзе. Але бароліся...

Ну, што... Нас сазвалі пашпарты мяняць. Гаворадь: «Ідзіце пашпарты мяняць». Туды, дзе крыж стаяў.

І да гэтага некалькі разоў прыязджалі. І на калені стаўлялі нас, і палохалі. І кулямётамі білі па вярху, і пад расстрэл стаўлялі, і запальвалі, і гаварылі: «Зарубіце сабе на насу, што вам гэта непаздаровіцца». У канцы канцоў прыехалі і гавораць: «Ідзіце пашпарты правяраць». Пайшлі з пашпартамі. Каторыя малодшыя мужчыны, тых у старонку. А жанчын з дзецьмі...

Была ў два канцы хата, нас сагналі туды, пастанавілі патруле і ў сенях, і пад вокнамі з гранатамі. І давай па восем, па дзесяць чалавек выганяць. І там расстрэльваць.

Во гэтак во: за адну руку дзяржыць, падвядзе пад яму і ў затылак б'е... Там у іх чатырох чалавек было, каторыя расстрэльвалі, пазакатваны пасюль во рукава і дзяржаць ліворверы ў руках. Адзежа на каторых была лепшая, дык яны здымалі і ў кучу скідалі. З жывых яшчэ, да расстрэлу. Падвядуць да ямы і— у затылак. Сто два чалавекі са мной было ў той магіле. Са ста двух чалавек — адна. Мяне зразу...як выстралілі, то я ўпала і без чуўсцвія была, а пасля дайшла да сазнання. Дык яны во — у ладошкі!..

Вечарэла ўжо. Каб дзе пад ніз, дык дзе я там устала б, а то наверсе ляжала.

Парасстрэльвалі і ў ладошкі пахлопалі.

— Вот,— гаворацць,— капут вам!

Я гэта помню ўжо. Я гэта да памяці дайшла. Відаць, яны яшчэ хацелі гранаты кідаць, але потым нешта пагергеталі і пайшлі.

Ой, што было піску, енку!.. Там многа жывых людзей падушылася. Але не было іх каму раскапаць. І прасіліся: і «ратуйце нас!», і «спасайце нас!», але не было каму.

А яшчэ і да бою здзекаваліся: і віламі паролі, і нагамі хадзілі, і білі — ой!.. Дзеці малыя былі, то па жывых нагамі хадзілі. А некаторыя зналі, што немцы яйца любяць, нясе каторае дзіця яму яічак ды просіцца, каб не забілі. А ён як дасць яму нагою, дык яно і перакуліцца —і з нагамі па ім пайшоў.

У мяне самой чатыры браты забілі і мацеру. Залезлі пад печ, схаваліся. Кожнаму смерць страшная вачавідная. Дык яны спаролі віламі так, што не было дзе голкай ткнуць. Пад печкай. Гэта ўжо даставалі адтуль, а не хацела гэта дзетвара вылазіць.

Мяне і самую віламі спаролі. А потым пагналі расстрэльваць. І вот я ляжала да двух часоў ночы. У гэтай магіле. Я помню — адну цётку сцягнула на бераг, другую сцягнула, і сама... Я ранена была, у мяне крыві ўжо налілося поўна запазуху, аж пад пояс, і сама аслабела — што са страху, а што цэлы дзень...

Колькі ўцякалі, колькі хаваліся!.. Мала калі ўдома там бывалі. А на тую бяду — дык дома засталіся.

Ну... А цяперака я баюся ўставаць. Вы-лезу з гэтай магілы, папоўзаю, папоўзаю, папоўзаю круга і зноў улезу, на гэтыя мёртвыя лягу. А душна! Колькі народу! Воздух такі цяжкі, кроў тая кіпіць, як у катле. Думаю я, дзе ж тыя немцы? Баюся ўставаць. Спаўзу і апяць лягу на гэтыя мёртвыя.

А потым — пайду, што будзе! Пайшла, пайшла гэтымі кусцікамі пад Шчару. Думаю: «Пайду ўтаплюся, абы яны не здзекаваліся. Усё роўна».

Адзін хлопчык, гадоў яму, мусіць, шэсць — устаў, і знаў ён, прыпомніў, дзе гэта бацьку пагналі,— у другую хату пай-шоў. А яны сустрэлі яго, у картафляную яму завялі... Увесь у крыві, ранены, а яны ў картафляную яму завялі і дабілі. А дзевачка сядзела — мацеру забілі, а яна, чатыры годзікі, сядзела і ўсё прасілася:

— Мама, годзе спаць, уставай, ідзем дадому!

І таксама расстралялі.

Думаю: «Пайду я ўтаплюся, абы я не бачыла гэтых іх, і іхняй смерці».

Пайшла. Мне кажацца, што іду я, іду... Ішла, ішла, так саслабела, што зайшла аж у Кабаке: вунь там дзярэўня, па-за рацэ. Зайшла, і мне стала — кругом, кругом Шчара. Ужо ў галаве закружэнне стала.

І думаю: «Пайду тапіцца». І палезла, палезла і перайшла на той бок Шчары, і помню, што я не ўтапілася. У якое

месца папала і як ішла? Уродзе, я на калені станавілася і паўзла... У калючую провалаку ўбілася. Выпутвалася, выпутвалася, ледзьве з той провалакі вылезла...

Зайшла ў гэтую дзярэўню Кабаке, а ўжо саслабела, не магу. А там, дзе кусцік, дзе слупік,— мне здаецца, што гэта ўжо немец стаіць.

А там на выганку адзін домік стаіць. «Зайду, — думаю, — прыадчыню дзверы, спытаюся, ці немцаў няма...» Зайшла я, гляджу: бяллё вісіць. Думаю: і тут пабілі. Я прыадчыніла дзверы, пытаюся:

— Немцаў у вас няма?

А гаспадар гаворыць:

— Няма.

А як угледзелі, што я ўся ў крыві, растропана, нарабілі крыку. Увайшла ў хату. І пайшоў адзін дзядзька шукаць па сяле, можа, дзе ёду, бінту.

Пайшоў той дзядзька, прынёс бінту і ёду. А я так напіталася гэтага духу цяжкага, што блявала, блявала... Ён мне стакан водкі даў. Выпіла — нічога не памагло. Папяросу даў — нічога. А я ўся мокрая, мокрая — во, па вушкі, і ўся ў крыві. І баяцца дзеці мяне.

Далі мне матрасік нейкі, дзіцячы, я каля парога лягла. Дзе я буду ляжаць — уся мокрая, уся ў крыві. Устала ў тры часы ночы, пайшла.

Пайшла. Аблава ішла, а мне трэба цераз гасцінец ісці. Зайшла я аж у Мельнікe, на хутарэ. Зайшла пад адну хатку. Так ужо саслабавала і села на прызбе. Устала цётка на ранку, я падышла:

— Ці няма ў вас, цётка, немцаў?

Гаворыць:

— Няма. Ну, ідзі ў хату.

Я пайшла, а яны пытаюцца:

Што, гэта ў вас, можа, выбілі?

А я баюся гаварыць... Пасядзела я трохі ў хаце і пайшла.

Пайшла я ў лес. Гэдакая мокрая, і холад, і так аслабела — пад елачкаю задрамала. Задрамала і — немцы ідуць! Там лясок невялікі. А забіралі маладзёж яны ў Германію тады. І немцы гавораць. А там тры дзядзькі, такія во, як я, бегалі, хаваліся. І яны тожа пачулі нямецкі разгавор, тожа бягуць. І чую я, што трэскат, думаю: «Немцы!» Яны з таго боку ідуць, а я з гэтай гарушкі, і бягом, і да гэтага самага дзядзькі ў гумно. Прыбегла на падворак, а гэты дзядзька кажа:

— Дзе цябе падзець? Усё роўна будзе — і цябе расстраляюць і мяне. Зачыню я цябе ў гумне, — кажа, — ужо як знойдуць — заб'юць, як запаляць — згарыш, а можа, шчасце будзе, то застанешся.

А там у яго гарох накладзены роўна з бэлькаю і так во адстаў ад сцяны, і я пад самы ніз за той гарох залезла. І ўжо чую: немцы па надворку ходзяць, ужо, як гусаке, гергочуць кругом гэтага гумна. А потым дзверы адчыняюцца. У гэтага дзядзькі самагонка стаяла, цэлая бутэль выгнана на таку. Брата яго ў Германію забіралі: ён прыйшоў, узяў гэтае самагонкі, пайшоў, угасціў

іх, з сабою ім даў — брата забраў. І паехалі яны, не traслі. Так я і асталася.

Асталася. Пасядзела да вечара, у лес пайшла. Цэлы тыдзень пад карчом у лесе сядзела, галодная. Забалела гэтай... дзезянцерыяй. Поўзала ракам дзве нядзелі.

Мацеру маю і аднаго брата, што ў школе быў, застралілі з вінтоўкі, а тры тут, на вуліцы. Пяцьдзесят пяць чалавек на вуліцы забілі, яшчэ і гранаты кідалі на іх.

Пака немцы не адступілі, то мы ніколі дома не былі...

Цяпер у мяне трое дзяцей. Сын у калгасе трактарыстам, два гады вучыўся ў Слоніме. А дачка вышла замуж і ў Слоніме жыве...»

Мажная, усмешлівая Марыя Скок, у ад-розненне ад некаторых нашых расказчыц, доўга ўваходзіла ў тэму, спынялася, набіраючы духу або аціраючы слязу. Яе дабрадушны твар пасвятлеў толькі тады, калі мы, зашпіліўшы футляр магнітафона, пацікавіліся яе дзецьмі і пахвалілі сапраўды вельмі мілую яе нявестку. Мы і сфатаграфавалі іх, такіх розных лёсамі родных жанчын.

З **Яўгеняй Бардун** у вёсцы Ніз нас завочна пазнаёміў дзед **Лявон Алізар** з вёскі Ніз, да якога мы, па аднолькавай справе, заехалі раней, чым да яе.

Спачатку Лявон Сідаравіч гаварыў нам пра аднаго мясцовага паслугача фашыстаў.

«А-а,— грэбліва цягнуў стары,— той, што выдаў нашу вёску? Паліцай!.. Ён цэлае жыццё сваё такі быў. Ён і пры Польшчы ўродзе займаўся паліцікай — і сюды, і туды... Раз падлажыў ён аднаму хлопцу чырвоны флак... над дзвярыма ў сенях заткнуў у стрэху, каб відзён быў гэты флак. І хлопец той праз яго чатыры гады пры Польшчы ў турме сядзеў. Правакатар быў...»

Дабрадушны, марудлівы дзед Алізар ніяк не можа падабраць належных слоў, каб растлумачыць такое.

Карнікі аддзялілі маладзейшых мужчын ад жанчын, старых і дзяцей, загадалі ім сабраць харчы і лапаты, накрэслілі, дзе капаць яму.

Тыя адмовіліся. Тады ім загадалі запрэгчы коней і на вазах павезлі «той маладзёж», мужчын ад шаснаццаці да сарака гадоў, у Германію. А старэйшых мужчын, усіх жанок і дзяцей сагналі ў адну хату і выводзілі невялікімі групамі за гумно ды расстрэльвалі з пісталетаў у патыліцу,— кожны немец-канваір свайго падканвойнага...

Ужо ўпачатку дзед Алізар гаварыў ды здзіўлена паглядаў на магнітафон, а калі дайшоў да таго правакатара, паліцая Бяляўскага, неўразуменне яго ўзрасло. У голасе расказчыка было: сапраўды, людзі добрыя, не магчыма нармальнаму чалавеку дабрацца толку ў паводзінах вылюдка. Хіба звар'яцець самому... Ды і ўвогуле нялёгка сёння перадаць нармальным людзям, што дзеялася ў той, прынесены ворагамі, шалёны дзень, калі і сам ён,

Лявон Сідаравіч, недастрэлены, ледзь ацалеў.

Дзеду Лявону перашкаджаюць унукі, а зрэшты, можа, яны і выручаюць яго з клопату, адганяіоць ад яго ўсякія ўспаміны. Іх ажно трое ў яго на доглядзе ў гарачую пару касавіцы. Тры малыя анархісты завялі ў хаце свой парадак. Абараняючыся ад сваволынікаў, дзед, відаць, папрыбіраў аздобы і ўвогуле ўсе тое, што можна дастаць рукою, пабіць, зламаць, скінуць. І чысты пакой Алізаравай хаты выдаецца нейкі пусты і неабжыты: дзве сасновыя лавы цягнуц-ца ўздоўж сцен, як два промні ад покуця, у якім высока пад столлю вісіць адзінокі абразок богамаці з такім самым жэўжыкам на руках, як меншы дзедаў унук. Лавы парэзаны сцізорыкамі, падзёўбаны сякераю, пакрэмзаны цвікамі, ножкі іх расхістаны. Зводдаль ад лаў стаіць стол, які менш кранула самадзейнасць галапузых распуснікаў. А дзед як і не бачыць тут непарадку. Калі дайшло да фатаграфавання, ён з дзіцячай усмешкай папрасіў:

— А з унукамі можна?..

Выйшаўшы з намі на вуліцу, ён паказаў рукою на поўнач, у другі канец вёскі:

— Там, злева, каля крамы, новы добры дом. То гэта Яўгені Бардун.

— Мусіць, муж цесля?

— Няма мужыка. Толькі дзеці. А хату калгас памог зрабіць.

Мы не засталі Яўгені Адамаўны дома, яна была на рабоце, на сенакосе за Шчарай. На трэці дзень, у нядзелю, таксама давялося чакаць яе з таго сенавання да самага абеду.

Убачыўшы нас на двары, гаспадыня падышла з граблямі на плячы. Невысокая, ладная, яна была б нават па-свойму прыгожая, калі б не лішне шырокія ад нежаноцкай працы плечы.

Пачуўшы, чаго мы завіталі да яе, Яўгеня села на траву і расплакалася...

«...Спачатку прышлі немцы ў хату,— пачала яна потым.— Забралі бацьку. Бацька наш быў хворы, дык неяк адпрасіўся: «Пусцеце, я хворы жалудкам». І яны яго адпусцілі. І сказаў тады паліцман нямецкі — ён жыў у тым канцы вёскі,— што нікуды вы не ўхадзіце, будуць пашпарты ў вас правяраць, і ўсё. У нас дзяўчата яшчэ ўсе малыя былі, нікога ў партызанах не было, адно бацька памагаў танк выцягваць партызанам з ракі. Ну, бацька і баяўся, што ён, значыць, выцягаў Саветам танк гэты, баяўся, што немцы падазраюць і могуць яго забіць.

Потым заходзіць у хату паліцман і немец і выганяюць. І сагналі ў адну хату, а многа нас было, палавіну сяла сагналі.

І пачалі выводзіць.

Зразу трох мужчынаў, а потым і бацьку ўжо ў другой тройцы вывелі. Проста прышоў немец і «драй», «драй» — на пальцах паказвае. Самі людзі

выходзілі, бо дзе ж ты дзенешся, ён гранату паказвае — выходзь...

Ну, і бацька выйшаў у другой тройцы. Маці паглядзела... што бацьку павялі ўжо, а дзеткі малыя, яна за сваю сям'ю і нас, малых, павяла за бацькам.

Павяла за ім... Старшыя дзве сястры былі ў мяне, а маці нясла маленькага. Дзіця. Было яму год. А сястра ўжо нясла другое, два годы хлопчыку было.

Даводзілі нас да сарая. Тады я забегла неяк наперад сястры. Немец ей у патыліцу стрэліў, а яна мяне з ног збіла, і я так засталася. Яна на мяне ўпала так во — ад шыі да пояса, а на ногі — другіх людзей куча навалілася. Людзі да мяне ўсё падыходзілі, іх стралялі, яны на мяне валіліся. Але галава мая была наверсе, не пад людзьмі, і так я і ўцалела. І ўжо як тут пабілі, дык сталі біць на другім канцы вёскі. А я ўжо ляжу.

Засталося тры хлопцы раненых, мае равеснікі " раненыя, у трупах. Я падняла голаву — яны плачуць, раненыя, кроў цячэ з іх. І я аказалася да іх, чуць галаву прыпадняла. Але не ўстала, бо мне не было як устаць: на мне трупы велькія ляжалі. Я аказалася, і тут ляціць немец. Даляцеў да іх і з вінтоўкі проста падабіваў.

А акурат бацьку майму на нагу стаў, ранены што ляжаў. І тады яшчэ стаяў, стаяў. Відаць, і мяне ён дагледзеў, што я яшчэ жывая... І як я не аказалася ў той момант?

Ляжала я, ляжала — ужо сцямнела. Ён мяне не дабіў. А так як хто жывы быў, то ўсіх падабіваў. Дзеці малыя пад трупамі падушыліся. Адна дзяўчынка была, то бацька потым нідзе на ёй раны не найшоў.

Тады ўжо гудуць машыны, едуць немцы:.. Я ўжо, мусіць, у вобмарак упала... Немцы ўжо сталі ад'язджаць, пішчаць свінні, куры крычаць, яны ўжо ловяць. І чую — нехта падышоў да трупаў і гаворыць... Мужчына адзін з сяла падыходзіць і кажа:

— Хто жывы — уставайце, немцы паехалі!

Бацька мой пазнаў яго па голасе, падняўся і кажа:

— Ну, я жыў.

І яшчэ адзін мужчына, Лявон Алізар. Дык бацька кажа яму:

— Ты ідзі дахаты, вазьмі хлеба, а я яшчэ пагляджу сям'ю сваю...

І ён пачаў глядзець. Кажа:

— Усе мае дзеці ёсць, адной толькі дзевачкі няма, шэсць лет, але яна не магла ўцячы, бо яшчэ дзіця.

Стаў ён глядзець, і я аказалася. Дык мне ўжо ногі людзьмі паперадаўлівала, усе косці... Людзей страляюць, а мне куля косці не зачэпіць, толькі мяса павырывае. Косці на нагах відны былі, проста не магла хадзіць зусім.

Ну, і бацька мой гэтак абамлеў над гэтай горбай.

І тут прыбягае той Алізар. Бацьку траслі, мяне паднялі з тое горбы і паняслі ў лес.

Я ўся ў крыві, як паставяць мяне на снег, дык ногі мае ўсе хістаюцца, мне ж іх паперадушвалі, горба вялікая ляжала на мне.

Заняслі ў лес. Там хутары гэтыя былі, а людзі паўцякалі ў лес. Сядзелі, касцёр клалі. Угледзелі, што мы ўсе ў крыві, што мяне нясуць у крыві, нейкае дзіця... Яны ўсе паўцякалі.

І стаў на іх ужо гукаць бацька мой, што мы людзі свае. Так што мяне ўжо абсушылі. І бацька мяне адаслаў у Талькаўшчыну, каля Слоніма, там у мяне цётка была. Ну што, яны мяне там нядзелю хавалі. Гэтыя раны ўсе паразгнойваліся... Страшна. Лячыцца не было чым...

Бацька мой пажыў трохі, а потым пасля вайны ад ран тых і памёр, гангрэна падпала ў нагу.

А я гэтак і асталася. Мне тады, як білі, шэсць гадоў было, сёмы...»

Вёска Вялікая Воля знаходзіцца ў нізоўі Шчары, якая цячэ тут з поўдня на поўнач. Ад Вялікай Волі да Акунінава будзе больш за сотню кіламетраў, гэтая адлегласць па-казвае на маштабы таго злачынства, якое, паводле слоў Пятра Саўчыца з Гародкаў, называлася ў фашыстаў «акцыяй супраць партызан». У фашысцкіх справаздачах акцыя гэтая называлася «Гамбург».

У Вялікай Волі ацалела пяць чалавек дарослых і чацвёра дзяцей. Адзін з ацалелых дарослых — Іван Іосіфавіч Павачка. Гэты разважлівы і добры па натуры чалавек ужо не раз сведчыў пра злачынствы акупантаў. Яго паказаннйі ўключаны ў акт Дзяржаўнай Камісіі Казлоўшчынскага раёна па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў акупантаў у 1941-1944 гг. і апублікаваны ў асобнай кнізе. Там запратакаліраваны агульны ход падзей і акалічнасці злачынства. Іван Іосіфавіч адзначыў тады, што 16 снежня 1942 года па загаду нямецкага афіцэра па прозвішчу Сзук была загнана ўся сялянская жывёла з Вялікай Волі ў мястэчка Казлоўшчыну. Неўзабаве ў вёску ўварваўся другі карны атрад фашыстаў, які сагнаў усіх жыхароў у адно месца і падзяліў іх на дзве групы, адну групу — 156 чалавек, сярод якіх быў сведка, яго жонка і двое дзяцей, карнікі прыгналі да кар'ера, з якога раней да вайны бралі пясок, калі будавалі мост цераз Шчару. Карнікі загадалі людзям легчы і расстрэльвалі іх з кулямёта.

«Першая кулямётная чарга,— гаворыць Іван Павачка,— прайшла па галовах ляжачых, і быў смяротна паранены мой сын Міхаіл, а мне куля на левай руцэ адарвала сярэдні палец, а безыменны і мезенец раздрабіла. Мой сын паспеў сказаць: «Тата, мне баліць»,— і кончыўся».

З другой групы, у сто трыццаць чалавек, ацалелыя расказвалі, што іх адлучалі па дванаццаць ды гналі ў лес і там расстрэльвалі.

Расказаўшы на нашу просьбу жахлівую гісторыю нанова, Іван

Іосіфавіч згадзіўся нават завесці нас на месца расстрэлу і паказаў, як ён у той зімовы дзень ляжаў тут пад кулямётным агнём.

Цяперашні расказ яго мы перадаём з усёй дакладнасцю.

Як і многія іншыя ацалелыя жыхары «вогненных вёсак», Іван Іосіфавіч пачаў гаворку з разважанняў пра фашысцкую версію — «барацьбы супраць партызан» :

«... Немцы сабралі вялікую сілу на лясы. Партызанам яны нічога не зрабілі. І з гэтай усёй нянавісцю нападалі на мясцовае насяленне.

Мы ўцякалі ў лес. Зіма была. З дзецьмі. Ну, у лесе — не месца: мароз быў, холадна. Пайшлі мы ў вёску Капце. Заехалі немцы і кажуць: «Ідзіце дадому». Ну, мы, вядома, павінны былі ісці бо, тут усё пакінулі: і коней, і каровы.

Прышлі мы дадому, сядзім, бачым — ідуць. Сусед мой гаворыць:

— Дзень добры, пану.

А яны:

— Дзень добры, пане бандыце.

Разграбілі яны ўсё наша, забралі ўсю нашу скаціну. І чалавек пятнаццаць увялі з сабой у абоз.

Сядзім мы. Нікога няма. І не згледзелі, як награнулі немцы ізноў. У кожную хату заходзіць немец і наказвае нам, каб кожны на тры дні харчоў браў. «Мы вас вывезем». Хто паспеў што ўзяць, а хто і не паспеў.

Снег ляжаў, а аднаго старога вялі босага, без рубашкі і без шапкі.

Паставілі тут усіх нас на калені. Нас білі прыкладамі і таўклі нагамі... І раптам пачуўся грукат цяжкіх машын. Прышло дзевяць машын, а ў машынах поўна немцаў. Па чалавек, мажа, дваццаць, а можа, і больш. Маладыя немцы, на галовы нацягнуты каскі.

З адной машыны вылез афіцэр, даў каманду, і нас павялі пад сільным канвоем. З правай стараны ехалі машыны, а з левай — ішлі немцы.

Не дахадзя да таго месца, спынілі, і трох немцаў пайшлі з кулямётам. Паставілі кулямёт на ўзгорачку, двох там засталіся, а трэці вярнуўся і махнуў рукою.

Прывялі нас у лагчыну, перад тым кулямётам, і сказалі лажыцца. Мы лажыліся, хто з кім. Ну, я лёг з сямілетнім хлопчыкам, трымаў яго на руцэ, прытуліўшы, а жонка з трохлетняю дачкою. Калі мы леглі — шапка з мяне звалілася, і я яе на галаву больш не клаў.

Немцы ад нас адышліся... Ага!— немцы адышлі ў сторану і заляглі кругом. А гэты немец, кулямёт каторага на ўзгорачку стаяў, узяў гэты кулямёт і падышоў да нас метраў на дваццаць. Там была яма, дзе нямецкая бомба ўпала. Улез ён у гэтую яму, укленчыў і паставіў на беразе ямы кулямёт. Тады немцы адышліся ад нас, і ён пацягнуў першую вочарадзь па нашых галовах.

Я як ляжаў на левым баку, так мне вот так па пальцах, а хлопчыку ў галаву. І ён яшчэ ўспеў толькі сказаць:

— Ой, тата, баліць!

А я гавару:

— Ціха, Мішка, не будзе балець. Больш ён не аказаўся.

Пяць вочарадзей выпусцілі. Мне папала ў правую ногу, абпаліла мне падошву і так прарэзала нагу. Сільна мне балела. Варушу — варушыцца, але боль — не вытрымаць. Усё роўна як крапівою мне хто па пальцах.

Пасля сталі дабіваць, хто стагнаў. Увесь мой твар быў абліты кроўю, і вельмі з мяне дух гнала. Падышоў немец, нагою мне ўдарыў у галаву — галава мая так зашаталася, але я вачэй не расплюшчыў.

Сталі самі засыпаць зямлёю. Зямля была мёрзлая, груды гэтыя, пясок. Паабівалі мне твар...

А за плячыма ў мяне ляжаў — гадоў, можа, яму шаснаццаць — хлопец. Ён нідзе ранены не быў. Усхапіўся на ногі і просіцца:

— Паночкі, не беце мяне! Забілі маю мацеру і сёстры, пусцеце мяне жывога.

Яны што-та па-нямецкі, што-та паміж сабою пагаварылі, раздаўся выстрал з пісталета, і ён мёртвы ўпаў на мяне.

Пяску нямнога насыпалі, і я стаў душыц-ца. Думаю, буду вылазіць, хай дабіваюць, бо цяжка вельмі душыцца. Увесь мокры, як з рэчкі. Раз прыпадняўся, потым другі раз, і ўжо я беспрытомны. Потым неяк на-пружыўся — ну, тады я быў сільны, малады,— прыпадняўся, тыя груды расхіліліся, і мне стала лягчэй дыхаць.

І ляжу я, слухаю, не чутна, каб кідалі... Колькі ляжаў — не ведаю. Потым яшчэ паварушыўся, высадзіў твар і чую — ужо ў тым канцы стрэлы чутно. Паляжаў я, пакуль сцямнела. На ногі не ўздымаўся і гавару:

— Уставайце, хто жывы. Немцаў ужо няма, пайшлі.

Ніхто не аказаўся. Нас было тут, у гэтым канцы вёскі, сто пяцьдзесят душ, а толькі я адзін застаўся... Парваў на сабе рубашку, абкруціў рану і пайшоў у лес...

У лесе я праляжаў трое сутак. «Ну,— думаю,— пайду ў дзярэўню Капце, калі заб'юць,— хто-небудзь зямлёю прысыпле, бо як у лесе памру, то звяры косці толькі будуць цягаць». Прышоў я рана ў вёску Капце і не пазнаў яе — яна ўжо мне перамянілася, зусім другою стала. Ведаю я, што тут Капце, сабакі брэшуць з Малой Волі, але Капцёў не пазнаю. Пастаяў я і зноў пайшоў у лес.

Потым знайшоў я нашых, каторыя паўцякалі з Казлоўшчыны, сустрэліся мы з імі. Прышлі мы з суседам у Капце, і там я ўжо астанавіўся.

Лёг я ў Віктара Касача і праляжаў шэсць дзён. Потым Копаць Аляксей, які служыў кагда-та ў польскай арміі санітарам, зрабіў мне перавязку...»

Прайшло больш за дваццаць пяць гадоў паміж тым першым, запратакаліраваным, і вось гэтым,

запісаным на магнітафонную стужку, расказам Івана Павачкі, але час не сцёр у памяці расказчыка вогненных і свін цовых слядоў. У расказе 1971 года Іван Іосіфавіч разважае пра тое, што карнікі, маўляў, не змаглі разбіць партызан і «з гэтай нянавісцю» ўзяліся помставаць на мірных жыхарах. У тыя дні ён не мог ведаць, што 11 лістапада 1942 года галоўнае камандаванне фашысцкай арміі выдала спецыяльны сакрэтны дакумент — «Інструкцыя пра абыходжанне з бандытамі і іх памочнікамі», у 83 пункце якога рэкамендавалася: «У абыходжанні з бандытамі і іх добраахвотнымі памочнікамі праяўляць крайнюю жорсткасць... Сама жорсткасць мер і страх перад пакараннем павінны ўтрымаць насельніцтва ад дапамогі і садзеяння бандам». Услед за гэтай інструкцыяй начальнік генштаба вермахта Кейтэль выдаў загад. У пункце першым гэтага загада ён напісаў, што прытрымлівацца міжнародных пагадненняў і прынятых звычаяў вядзення вайны — не трэба. «Гэтая барацьба не мае больш нічога агульнага з салдацкім рыцарствам або палажэннямі Жэнеўскай канвенцыі... Таму войскі правамоцныя і абавязаныя без усякіх абмежаванняў выкарыстаць у гэтай барацьбе любыя сродкі, у тым ліку супраць жанчын і дзяцей, абы гэта прынесла поспех». Другі пункт: «Ніводзін немец, які ўдзельнічае ў барацьбе з бандамі партызан, не павінен быць прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці або пастаўлены перад ваенна-палявым судом...»

Івану Павачку, вопытнаму пажылому чалавеку, інтуіцыя падказала слушна — карнікам наперад дароўвалася ўсё. Яны аказаліся няздольнымі ваяваць супраць партызан і пад выглядам іх білі жанчын, дзя-цей, старых...

У архівах захавалася «Паведамленне № 28» паліцыі бяспекі і СД аб выніках карных экспедыцый «Гамбург» і «Альтона» ў раёнах Баранавіцкай і Брэсцкай абласцей ад 22 студзеня 1943 года. Непасрэдныя вер-хаводы карнікаў выхваляліся перад вышэйшымі інстанцыямі сваімі «подзвігамі», вы-давалі забітых мірных жыхароў за партызан. Вось два ўрыўкі з «Паведамлення».

«...Аперацыя «Гамбург» у раёне гор. Слоніма.

Гэтая аперацыя была адною з найбольш паспяховых аперацый, праведзеных да гэтага часу ў Беларусі. Дадзеныя разведвальнай каманды паліцыі бяспекі і СД былі такія дакладныя, што ўдалося выявіць кожны лагер. У шматлікіх баях было забіта 1676 партызан. Затым было расстраляна западозраных у сувязях з партызанамі 1510 чал. Былі захоплены шматлікія трафеі, у тым ліку 4 браневікі і 8 супрацьтанкавых ружжаў, велізарная колькасць жывёлы і збожжа. У населеных пунктах, размешчаных у раёне аперацыі,

акрамя таго, было знішчана 2658 яўрэяў і 30 цыганоў. Страты немцаў , склалі 7 забітых і 18 раненых».

Аперацыя «Альтона» ў раёне Косава — Быценя.

Гэтая аперацыя была праведзена з мэтай разгрому вялікага партызанскага атрада, які прарваўся на поўдзень пасля аперацыі «Гамбург»... «Партызаны страцілі забітымі 97 чал. Потым у гэтым раёне было расстраляна 785 чал., западозраных у прыналежнасці да партызан, 126 яўрэяў і 24 цыганы. Захоплены значныя трафеі: жывёла і прадукты харчавання. Зброі і боепрыпасаў захоплена невялікая колькасць...».

На самай справе ў раёне Слоніма карнікі нават не сутыкнуліся з партызанскім атрадам. Яны накінуліся на бліжэйшыя мірныя вёскі.

## ЗВЕР ПАЛЮЕ НА ЧАЛАВЕКА

«...Ідзеш, ідзеш, ідзеш, ідзеш, чуеш — тут трэсне, дык ты ў другі бок. А яны ў лесе лавілі, па балоце... Па гразі ідзеш да пояса, чабохаешся, а бо-о!.. Не дай божачка! Казалі:

— Будзем раз у дзень есці, але каб толькі з балота вылезці...»

(З расказу **Ганны Тарасевіч.** Ікань Барысаўскага раёна.)

Чалавека гоняць, выжываюць з вёскі, з горада — у лес. Потым ідуць на паляванне. На жанчын, на дзяцей палююць.

Звяры ідуць аблавай на людзей.

Расказвае **Ганна Паўлаўна Бурак.** Лісна Верхнядзвінскага раёна.

«...У лесе мы там з нядзелю прасядзелі. Муж гаворыць:

— Паедзем мы бліжэй к дому. Там адзін сусед, гаворыць, пераехаўшы, дык яны ў дзярэўню ходзяць, картошкі прыносяць, зернят прыносяць, мелюць, калатуху варэць, ляпёшкі пякуць. Вот і мы, гаворыць, паедзем туды.

Ну што я, я ж адна не ўпруся, што я зраблю адна з дваімі дзецьмі? Ну вот, прыехалі, налажылі воз сена, павёз ён, і дачка паехала з ім.

— Я, — гаворыць, — пайду дамой, можа, прынясу картошкі.

Ну вот, яны паехалі, а я асталася так з дзецьмі сваімі. Прыехаў, апошні воз сена налажылі. Ён на мяне гаворыць:

— Няхай рабяты едуць са мной, а то паследняе будзем забіраць, дык не будзе як ім сесці...

Там і дзежкі былі з жырамі, там усё было. І недзе будзе сесць. А па азяру ісці — ужо быў насліг на азярэ, вада бальшая.

— Ногі, — гаворыць, — змочаць, а дзе яны тады будуць сушыць, недзе будзе сушыць.

Ну, а я думаю: няўжо ж ён ужо горш хочаць. Я ўзяла гэтых рабят, усадзіла яму на сена, яны і паехалі. Ён гаворыць:

— Прыедзем, згрузім, а тады або я, або Клаўдзя да цябе прыедзем.

Ну, вот яны і паехалі, а я асталася. Жджу-жджу-жджу — іх нетуці. І сонца зашло — усё іх нет, і цёмна стала — усё іх нет. Я ўжо — у паніку, плачу. Што ўжо, значыць, даўно нетуці, што ўжо іх нет. Пайшла к суседу, стала расказваць. Яны гаворацьь:

— Ясна, што іх нет, ужо іх немцы ўлавілі, там бы яны не сядзелі. Ну, і вот раніцай, чуць свет, прыбягае гэты мой большы хлопчык ка мне. І гаворыць:

— Мамка, нас немцы ўлавілі. І дзедушку ўлавілі, — гаворыць, — і Віцю, і там, — гаворыць, — Кузьму з рабятамі ўлавілі, старуху адну... А я гэта прышоў, бо найшлі дзвюх кароў і загадалі адну карову мне вясці, а другую — другой дзевачцы. Ну, я, — гаворыць ён, — думаю: «Павяду гэтую карову да балота, а тады, — гаворыць, — за сані прывяжу, а сам — у лес». Едзем ціхонечка, прывязаў за сані, а немец назад не глядзіць. Прывязаў гэтую карову і — ходу, у кусты, і пабег. І гэтая дзевачка так сваю карову кінула і пабегла за мною. Падбег, — гаворыць, — пад дзерава, і паваліўся, і лёг...

Ацец мой быў глухі, а меншы хлопчык гаворыць на яго:

— Дзедушка, а нашага Шуры ўжо нетуці. І плачаць. А немец гаворыць:

— Не плач, — гаворыць, — мальчык, заўтра будзе і Шура ўмесце, і мамка будзець, усе будзеце ўмесце...

Ну, і вот, гаворыць, ён вочарадзь з аўтамата пусціў, гэты немец, якраз у тую сторану, дзе мы ляжалі, у тое дзерава. Еслі б, гаворыць, на адну чвэрць ніжэй, ён быў, гаворыць, мяне ўбіў бы. Дзве пулі папаў у тую сосну.

Ну, і тады яны ўжо пастралялі і паехалі, а ён, хлопчык, знаў, што там на адным астраве два мужчыны капалі зямлянку сабе, ну, вот ён і пабег туды: можа, іх там найду. Прыбягаець туды, а яны, гаворыць, коні выпрагшы, пакурваюць у праспакойнасці. А я як закрычаў на іх:

— А дзядзечкі, скарэй будзем уцякаць! Ужо немцы, — гаворыць, — улавілі і павязлі і дзедушку, і Кузьму, і рабят.

А яны скоранька запраглі, адзін, гаворыць, дзядзька ўзяў мяне да сябе на сані, у ногі ўшчаміў, і, як маглі толькі гэтыя коні бегчы, так яны іх гналі. Выскачылі на азяро, ужо ў палавіну азяра, і немцы з гэтымі ўжо людзямі на азяро выехалі і пачалі з

кулямёта па іх страляць. Але яны ўжо іх не даставалі, толькі гэтымі асколкамі, лёдам абсыпалі іх. Тады яны выехалі к берагу, паставілі аўтамат... не, кулямёт і сталі па іх страляць. Але ўжо іх не даставалі, яны ўжо далёка былі. Ну і вот, яны ўжо тады паехалі к нам, і так ён вот ужо ка мне прышоў і расказаў, што так случылася.

Тады я на суседзяў гавару:

— Ну, раз іх ужо сягоння ўлавілі, то заўтра нас уловяць. Яны сюды прыдуць.

Ну, і так палучылася. На зорачку яны прышлі к нам, гэтыя немцы.

Нас многа там сабралася. Ну, і вот не маглі ніяк вапрос рашыць. Адзін гаворыць:

— Паедзем за азяро, за Ліснянскае. А другі гаворыць:

— Не!..

Пытанне: — Гэта вы так гаворыце?

— Суседзі. Там жа многа было, можа, сотні дзве.. Ну, і тады ўжо яны так давалтузіліся, і ўжо сонца стала ўсходзіць, ужо на азяро не выедзеш; відно, немцы ўсё роўна заб'юць. І тут чуем з-за гары шорах нейкі. Шэрань бальная была, і шорах бальшы. А людзей многа, не дабіцца толку ніяк. Крычаць:

— Сціхніце! Сціхніце! Хоць узнаць, які звук!

Вот. Тады нескалькі хлопчыкаў пабегла на гару, і я ў тым чысле пабегла на гару, і мой хлопчык гэты большы пабег са мною. Ну, чалавек нас з дзесяць пабегла. Толькі мы на гару ўзбеглі — і тут пад намі такі густы-густы соснік. І тут немцы. Ідуць з-пад гары. Мы тады закрычалі і рукамі замахалі на гэтых, што ўжо немцы. І яны як стаялі пад гарой, так і пусціліся ўдоль балота. А мы па гары пабеглі. І вот мы па гары беглі, а ўжо немцы — іх штукі тры бегла за намі — па-руску ўжо крычалі, па матушке на нас, і стралялі, а мы ўсё беглі. На мне быў палушубак надзеты, я расшпілілася, і полы гэтыя махаліся, і куля папала мне ў палу, разрыўная. Тут вырвала клок. Я тады палушубак здзела і кінула. Усё роўна я з ім нікуды не збягу. І ў каго былі якія там хатомкі за плячамі з сухарамі — усё пакідалі. І пабеглі так, як стаём. Прыбеглі к аднаму азяру:

— Ці па балоту аббягаць, ці цераз азяро? А я гавару:

— Не, пабягом лепш прама цераз азяро. Пака будзем путацца — тут яны нас і насцігнуць.

Пытанне: — А як называлася возера?

— Карасіна. Вот. Так перабеглі ўжо мы гэтае азяро. Я первая пабегла, і за мною ўсе пабеглі. Выйшлі на прыталак. Гэта дзела было перад Пасхай, прыталкі былі. Стаём. Абціраемся, што з нас пот ліецць з усіх. І ўдруг нам наперад едуць немцы, на пары канях. А куды нам дзецца? Уперад ісці — тут лес рэдкі зусім, яны нас тут уб'юць. Назад ісці — там страляюць і людзі крычаць, палюць, дым стоўбам ідзе.

Прама страх невазможны! Куды дзецца? І раптам глядзём — ляжыць ад нас так вот ёлка лахматая, заваленая ў балота. Я гавару на аднаго мальца:

— Давай пад гэтую макаўку ляжам, ты з аднаго боку, а я з другога.

А гэтыя ўжо мальчышкі, каторыя былі... Вот такі ельнічак быў, дык яны яго паднялі, і пад ніз палезлі, і там сядзелі. А мы з тым мальцам пад макаўкай: ён з аднаго боку лёг, а я з другога. Адна толькі кофта была астаўшыся ў мяне, прытом красная, і платок на галаве цёплы быў. Я зняла платок з галавы і накрыла вот так плечы, каб не відалася, што красная. І рукі голыя, і галава голая, і каленкі голыя. Чулкі аб'ехалі, не было калі падцягнуць. І так у снег лягла, у гэтым снягу я ляжала... І цэлы дзень мы адляжалі. І вот яны, калі пад'ехалі да нас, гэтыя немцы, — сталі. Ну, мы гаворым, што цяпер тут будзе наша смерць... Злезлі з саней і пачалі глядзець, ці ёсць сляды... Харашо, што нікуды мы з гэтай праталкі не збяжалі. Паглядзелі, паглядзелі яны — нетуці нідзе слядоў абратна, пагаркалі па-свойму, выцягнулі папяросы, закурылі, запахла іхнімі гэтымі сігарэтамі, і селі на полі: ад нас, можа, метраў трыста ад'ехалі і здзелалі засаду. Коні выпраглі, агонь разлажылі, выстрал далі. А мы ляжом, ні з месца, нікуды не можна выйсці. І яны нам відаць. Ну, і вот мы ляжалі цэлы дзень. Як не страляюць — тады нам начынае мароз перабягаць па спіне, як толькі выстраляць — так сразу жарка, жарка стане, што кіпятком хто-небудзь абварыць. Ну, і вот так ляжалі поўны дзень, да самага сонца. Сонца зайшло. Тады яны коней запраглі, выстрал далі і падаліся. А мы тады ўжо паляжалі з паўчаса, усталі, і рукі — што граблі, і ногі ўжо проста дзвіжэнія нетуці... У снягу адляжалі босымі-голымі нагамі...

Ну, і мы тады пайдзем ужо гэтых рабят сабіраць. Сталі гэтых рабят сабіраць, сталі крычаць на іх. Якія блізка былі, тыя папрыбягалі, а мой як збег — абратна назад, цераз азяро; прыбіўся да чужых людзей, і ён ужо там і быў. Я стала крычаць на ўсю галаву. На мяне крычаць:

— Не крычы, а то прыдуць немцы і ўсіх паб'юць!

— Няхай ідуць, — мне ўжо ўсё роўна, жызнь неінцярэсна, я ўжо, гавару, адна асталася. Няхай, гавару, ідуць.

Ну, і яны не ўчулі, не прышлі к нам.

А мы пойдзем ужо тады, абратна паглядзём, дзе яны ўжо гэта нас... Дзе кінулі мы сваіх коней, павозкі. Выходзім ужо тады па сляду, след у след.

Да. Тады на гару ўзышлі, чуем — у балоце які-та шорах. Захрускла гэта суčча. Мы абратна паразбягаліся па лесу куды хто, слухаем. Чуем — гавораць па-руску.

— Гэта, — гаворым, — нашы.

Тады абратна ў кучу сабраліся туды, у балота. Аж там з Вялікага Сяла тры чалавекі... Адзін з нашай дзярэўні, а два з Вялікага Сяла, дзе каля Асвея, такі Сямён ёсць з сынам. Ну, тады мы прышлі к ім, пагаварылі, як хто адкуль ужо ішоў, а пра ежу ж — і толку нету. Двое сутак нічога ў роце не было. І ні ў каго нічога. Гэты ўжо чалавек гаворыць, Бельскі:

— У мяне ёсць гароху прыгоршчаў двое.

Дык ён нам па жменыцы ўсім раздзяліў, той гарох, і вось мы той гарох з'елі і пайшлі туды, дзе мы ўжо кідалі сваё ўсё. Прыходзім туды — коні пабітыя, сані паламаныя, падушкі ўсе параспусканыя.— белы-белы ўвесь чыста лес! У каго было сала ў дзежках — усё паадкрывана і гэтай патрутай перасыпана, і бумажкі гэтыя з мухамі нарысованыя на пакеціках, што яны ўжо перасыпаны... А людзі ўсе пабітыя, пасцягваныя ў груды, аблітыя бензінам і так гарадь, што настаяшчыя дровы, аж прышчыць — як гарадь! Ну, і вот мы тады там пабылі...

Пытанне: — А людзі гэта з вашай вёскі?

— Адусюль былі, з усяго сельсавета былі з'ехаўшыся. Вот. І ўсе там пагіблі. Ну вот, тады, мы ўжо ідзём — пойдзем пад дом. Ідзём адзін за адным — гэта ўслед, чалавек дзесяць, і слова ні адзін нікому не гаворыць. Нада спыніцца — тады я за цябе вазьмуся, а ты за другога, за трэцяга — так усе і астанаўліваемся. Паслухаем — нідзе нічога не чуваць. Тады таўкнеш адзін аднаго па вочарадзі, так і пашлі. Такі наш страх быў, так мы не маглі гаварыць, што колькі людзей ляжыць і ўсе гарадь...»

І гэта, *такое* — не дні, не месяцы, а на працягу гадоў.

Ганна Бурак працягвае свой горкі расказ.

«...Ну вот, пабеглі ў лес. Завязаўся бальыыы бой. Ужо нам дзецца недзе было. Немцы адступалі. Мы тады...

Пытанне: — Гэта як набліжаўся фронт?

— Немцы адступалі, нашы наступалі на іх. Гэта ўжо ў сорак чацвёртым было. Ну вот, нам дзецца недзе, і мы тады пабеглі ў азяро. Такое глыбокае, бузянае. Мы ўлезлі ў гэта азяро і за курганне гэтае, за папарадь дзяржаліся і ляжалі ў гэтым... Ну, па роўнае горла ў вадзе былі. І к нам як прывяжуцца жабы. Такія бальшыя, страшныя — не абараніцца. Возьмеш у руку — я-ак бросіш яе ад сябе падалыпа. Мінут пяць нет, абратна прыпаўзаець к табе, «ква-ква» крычыць.

Мы абратна яе адкінем. Вот так ляжалі да вечара, у гэтым азярэ.

Тады ўжо ўчулі, што машыны ідуць і наша радыё гаворыць. Мы засмяяліся, рады сталі — нашы паехалі! Наша радыё гаворыць.

Вылезлі з гэтага азяра і пашлі, пашлі ў дзярэўню Малашкава. Там не ўзнаць — быў пясок жоўты, а стаў чорны ад гэтых ад снарадаў. Ну, тады

прышлі з Малашкава на Залугу. З гары мы ўжо наблюдалі, што ў Лісна робіцца. Тут бальшое дзвіжэніе па бальшаку ішло, а якое — мы не знаем. Ну, і каля балота была рож пасеяна. Мужчыны гаворац:

— Нада ісці паглядзець, чые сляды — нямецкія ці нашы?

Пайшлі, паглядзелі і гаворац:

— Гэта немцы.

Гэта ўжо нашы іх пагналі. І пайшлі мы. Дагаварыліся, каб па адной каляі ісці, каб не папасці на міну. Нямнога адайшлі ад гэтай дзярэўні — ляжыць немец забіты.

— Ага, — гаворым, — папаўся хоць адзін!.. Стаім мы на гэтай на гарэ... Ой, спутала!.. Падыходзім мы гэта ўжо сюды, к Лісну, дзе піларама, там стаяла кухня нашых краснаармейцаў. Яны нас увідзелі — прыбеглі, нас абнімаюць, цалуюць, і мы іх цалуем і плачам, рады, што ўжо сваіх увідзелі. А яны гаворац, што мы, гаворац, ідзём ад самага Неўля і нідзе, гаворац, не відзім гражданскага чалавека, кроме ваенных. Гаворым, што мы тожа не з гэтай дзярэўні, мы дзевяць кіламетраў адгэтуль. З гэтай дзярэўні яшчэ ніводнага чалавека не было — усе ў палоне, каторыя жывыя былі. Ну, і вот яны нас тут чаем напаілі, накармілі, па шынялю нам далі, па рубашке па вязанай нямецкай далі...

Ну, іх там было набіта, гэтых немцаў, што страшна. Ішла «кацюша», па іх як ударыла, дык яны без памяці ў азяро. І ў азярэ было многа, і па палянке было многа, дык жара была, лета. Мы іх тады пабіралі ўжо на месцы і закопвалі, каб ужо не было ніякага заражэння...»

А жыхароў вёскі Гарадзец Быхаўскага раёна звяры лавілі з рознымі «паляўнічымі» хітрыкамі, жудаснымі і здзеклівымі. Пра тое расказвае **Марыя Гаўрылаўна Кавалёва.** Яна выратавалася. І яшчэ некалькі чалавек. А чатырыста шэсцьдзесят жанчын, дзяцей звяры тады... упалявалі...

«...Ну вот, мы былі ў лесе. Як толькі немцы ў сяло, дык тагды — цёмная хмара — людзі ў лес збягаць. Ну, тагды аднажды ўсе выбраліся туды. Тут Клённе спалілі, Студзёнку тут спалілі — ну ж, людзі баяцца. Ну, і пабеглі ўсе ў лес: і дзяцей, і курэй, і свіней, і ўсіх туды...»

Тым больш што вёску Гарадзец фашысты ўжо спрабавалі забіць — яшчэ ў 1943 годзе. Тады партызаны ўратавалі. Пра гэта нам расказвалі ў Гарадцы жанчыны. А як яно было дакладна, мы даведаліся ў хаце калгаснага брыгадзіра **Пятра Ісакавіча Арцёмава** — былога партызана. Жыве ён у Студзёнцы.

Партызаны 425-га партызанскага палка, калі ім паведамілі сувязныя, што ў Гарадцы ўсіх людзей загналі ў некалькі хат і збіраюцца паліць, кінуліся туды. Партызаны ўжо ведалі, колькі немцаў і паліцаяў, дзе пасты, «і таму не нужна было рассрэдатачвацца па дзярэўні». А камандаваў якраз

мясцовы жыхар Платон Максімавіч Цагельнікаў. «Немцы — каго пабілі, хто ўдраў». Прыбеглі да тых хат з закалочанымі вокнамі, дзвярмі. Людзі спачатку баяліся адгукацца. Бо, можа, усё яшчэ немцы, паліцаі ў Гарадцы, можа, іх гэта галасы...

Тады выратавалі, выратаваліся. Але спазнаўшы такое, жыхары Гарадца па другой трывозе адразу перабраліся ў лес.

«...Жывем там, — працягвае свой расказ Марыя Гаўрылаўна Кавалёва, — а ў Гарадзец жа ходзім бульбу капаць. Узяць што-небудзь, хлеба спеч. Хаты ж стаялі. На жорнах дзета намелеш і прыдзеш ноччу ў Гарадзец, спячэш і — ношку назад у лес. Ну, і так во... Тут аднаго злавілі:

— Дзе людзі?

— Дзе ж людзі — у лесе.

Ён і прывёў туды. Ну, як прывёў, яны давай браць баб. Некаторыя паўцякалі, а некаторых — пабралі. Ну, і ў Гарадзец. І Замошша, і Гуту, і Сялібу, і бежанцаў. Бежанцы тут смаленскія і ўсякія... Ага, хазяін уцёк, і я ўцякла. Ну, уцякла, у балоце пасядзелі... І, словам, немцы далі каня сястрэ маей і — ідзі. Яна вяла дзяцей у хату маю. Яшчэ адны там былі...

І немцы кажуць:

— Едзьце, забірайце адзежу.

Усё ж там, адзежа ж там пааставалась, толькі дзяцей забралі, кароў прыгналі ў Гарадзец. І яны, нашы, крычаць... Раёва гэтая:

— Лёні-і-к, хадзі дамоў! І я таксама.

— Ну во, Манька, — кажа мая сястра, — паедзем дамоў, мы ў хаце ўжо, печ вытапілі, дзяцём бўльбы напякла, дзяцей спаць паклала.

Ну, мы едзем, адзежу ўзгрудзілі, едзем. Ага, холадна было: на Пакрава, восень. Ну, і мы едзем дамоў, сяйчас як выязджаем — тут ужо людзі стаяць. Людзей вывелі ўжо. Тых, што запёрты былі: пабралі іх, прывезлі ранша, чым нас, тых людзей. Як толькі мы пад'ехалі, яны нашага каня забралі і сюды, на двор, к хазяіну. А нас у гэты табун. А мая сястра:

— Ай, пан, а кіндары? Кіндары, а божа ж мой, дзе мае кіндары!

А яны ў хаце. Даводзіць яе да нас, к нашай хаце:

— Быстра, быстра!

Немец так. А жэншчына, што ездзіла па адзежу, ета крычыць... Тут яе матка. Чацвёра ці пяцёра ў яе было дзяцей, Яна крычыць:

— Ма-а-ма, вядзі дзяцей!

Маці як вывела дзяцей — яна з хаты, а мая сястра ў хату, а сестрыны дзеці — на печы спяць. І ён прычыніў і павёў нас.

Пытанне: — Асястраасталасяўхаце, з дзецьмі?

— Ага. І яшчэ некаторыя жэншчыны асталіся ў хаце. Ну, ладна. Прагналі на канец сяла. Сюды во, як едзеш во з Быхава, дзе астаноўка там, сюды прыгналі. Сяйчас прыгналі, ну, і тут паставілі. Паставілі, ну, і стой тут. Божа ж мой, дзеці крычаць. Ага. Яны

пайшлі на другі бок вуліцы, і сяйчас — раз, выстрал! А гэтыя дзеці: «А-а-а-а!» — крычаць. Дык адна смаленская баба — чацвёра дзяцей — дык яна кажа:

— Дзетачкі, чаго вы крычыцё, памучуць трохі, пастрашуць і пусцюць.

Ну, тут і мы ўжо, мы тут ужо каніцелімся:

— А бабачкі, а любачкі, а што дзелаць, куды пагонюць?

— Нікуды не пагонюць, — заяўляе паліцэйскі, — паб'ём, папалім. Усё вам!

Ну, і тут во яны яшчэ раз выстралілі. Цераз выстрал гэтыя людзі сталі ўжо каніцеліцца. Яны сяйчас заварочваюць:

— Ком, рус, ком, ком у хату!

Увагналі нас сюды ў хату ў гэту. Там, праўда, у гэтай хаце мосту не было. Тады, як бамбёжка была, дык вырывалі масты, гэту падлогу і ўсё гэта. Думалі: «Паедзем у лес і пасядзім, а вайна кончыцца, дык прыедзем, хоць зямлянку якую з тых дошак здзелаць». Мосту там не было. Ну, і нас сюды. І вочарадзь — р-р-р-р! З кулямёта ў дзверы. Каго ўбілі, каго ранілі. Дзверку закалочваюць і запальваюць дом еты.

Там адзін кажа:

— Цётка Манька, хадзі во тутка свіціцца. Ямка такая — бульбу сыпалі.

— Свіціцца! Дай-ка мы будзем драць гэту зямлю. А я ўжо ранена. Мне ўжо некуды. Уся во так у крыві. Босая. Пакроўка, сняжок ужо, босая і ўся ўжо во так у крыві, голая ж! А божа ж мой! Давай мы так калупаць, давай. Ды ўжо прыщемкам, так во на змярканні.

— Лезь, чаго не лезеш!

Я палезла. Вылезла! І ён за мной. Дык я ўжо як вылезла, папаўзла ў ямкі — там колесь кірпіч дзелалі. Дык я ямкамі і там на агарод, там двор — я туды. Божа ж мой, — сабака!.. Ну, як сабака — я на агарод і попаўзкам, попаўзкам... Стажок стаяў — я пад гэты ста-жок рачочкам. І ўжо ў мяне ўсё... Во тут вырвала кусок, і цяпер рана ёсць тая. Ну, і ляжу. Думаю... Толькі ляжу, чую — кулямёт коціцца: тр-тр-тр. І немцы. Думаю, ну ўсё. Адтуль вылезла... Тут паміраць ужо буду. Ну, чую, крычыць Мархвачка тая, вечарам і крычыць:

— Лю-ю-дцы! Хадзіце дамоў-у-у, паны-ы завуць! Пытанне: — Гэта яны прымусілі крычаць?

— Прымусілі. Узялі і павялі. І загадалі: «Гукай усіх людзей». І яна крычыць:

— Людцы! Хадзіце дамоў, паны завуць!..»

На такую справу — каб лепей загнаць, выманіць з лесу, упаляваць людзей, у звяроў былі свае сабакі — паліцэйскія. Іх людзі так і празвалі — «бобікамі».

Расказвае **Вольга Паўлаўна Грамовіч** з Кліннікаў Докшыцкага раёна.

«...Мы ўсе сабраліся і паехалі ў лес. У лясу сядзелі тамака. Тады паехалі гэтыя немцы. Тут адзін быў паліцэйскі з нашай вёскі. Два было іх. Сяйчас яны прыскочылі... Зналі, дзе мы схаваліся. Прыскочылі:

— Едзьце дамой, вас ніхто трогаць не будзе. Не сядзіце ў лясу. Яны вас чапаць не будуць, толькі тыя будуць біць сем'і, каторыя ў партызанах.

Гэта Харчонак быў Кастусь, ужо ён памёр... Войніч Макар быў. Гэта яны нас агіціравалі, каб мы дамоў прыехалі. Каб мы ў лесе былі, то, можа, і засталіся б. Але яны ад нас не адсталі, пакуль мы дамоў не сабраліся.

Прыехалі мы дамой, а тут ужо немцы наехалі ў нашу вёску. Тут ужо ў нас было два ў партызанах. Дык адразу гэтыя сем'і забралі. А нас гэта не трогалі яшчэ.

Сядзяць дзяўчаты, сабраўшыся на вуліцы. Тут прышоў народнік[23] і пытаецца:

— Тут Сушко Юля ёсць?

Ніхто нічога — маўчаць. Тады яна сама гаворыць:

— Ёсць.

— Ах, гэта вы?

— Я.

Так яна сама. Іхніх пагналі бацькоў, дык яна не ха-цела адна аставацца.

— Выхадзі!

А тады яшчэ пытаецца:

— А Сушко Зося?

— Ёсць.

Дзеўкі ўжо бальшыя.

Усе яны ночку пераседзелі на тым дварэ, а вот раненька, часоў у пяць, гонююць іх. Якраз каля нашай хаты, сюды на луг. А там пуня стаяла. Якраз мамін родны брат забраны быў. Мама мая як толькі ўвідзела, так і абамлела.

— Мамачка, — кажу я, — нам усім гэтак будзе. Ну што ж, паб'юць — нічога не зробіш. Гады найшлі, то паб'юцьужо...

Павялі іх туды, дзе будыніна стаяла, загналі ў тую будыніну. Перш пабілі іх, а тады запалілі той будынак. З аўтамата. Толькі тры разы перавялі.

Тое ранне яны якраз і выбраліся ад нас.

Пайшоў народнік па лошадзь. А там мая цёця была. Білі яе і не дабілі. Яна ў палажэнні была. Жывая яшчэ была. Каля купелі[24] там ляжала. Народнік гэты прышоў за лошаддзю, а яна кажаць:

— Дзеткі мае, за што ж вы мяне білі, за што ж вы нас білі? Мы ж людзі бедныя, што ж мы так папалі. Мы ж гаравалі, жыць хочам, за што гэтак пабілі? Ай-яй-яй! Сямейку маю ўсю пабілі і мужа забілі. Дабіце вы ўжо і мяне, каб я на гэтым свеце не была.

Во так... Так во...

І вот той «бобік» — а немцы яшчэ не паехалі — пайшоў заявіў, і адзін прышоў, дабіў яе. Цёцю маю.

Забілі, коні пазапрагалі, сабраліся і паехалі.

[23] «Народнікамі» іранічна называлі ўласаўцаў.

[24] Купель *(дыял.)* — сажалка.

А мы ўжо тагды пашлі глядзець, дзе хто ёсць. Можа, дзе хто жывы.

Жывога нікога не аказалася. Толькі адна яна была выпаўзла, і яе забілі.

Ваду насілі... Вядома ж, гарацъ людзі! Тушылі іх. Адзежу якую збіралі, на кладбішча занялі іх і пахавалі.

Вот і ўсё.

Мой тата тожа на агародзе быў.

Узялі сундук вялікі, сабралі, што ад іх засталося, у той сундук і на кладбішча завязлі...»

Чалавек, на якога абрынуўся фашысцкі «новы парадак», абжывае лес. Робіць і абжывае норы, ратуючыся ад звера ў мундзіры.

Расказвае **Зінаіда Іванаўна Путронак** з Барковіч Верхнядзвінскага раёна.

«...У лесе мы пастроілі зямлянкі. І жылі там да экспедыцыі.

Калі пачалася экспедыцыя зімой, то часць партызан прарвалася за фронт, і часць насялення з імі пайшла. Мы ж засталіся. Тры сям'і нас жылі ў балоце, пака экспедыцыя. Экспедыцыя радам ішла, але нам якраз удалося. Толькі мы зайшлі ў балота, і прайшоў снег. Гэта якраз перад Новым годам было. У сорак трэцім, мабыць, зімой. Скот мы не бралі. Толькі нас было чатырох, маці і тры сястры. Там яшчэ дзве сям'і. Тры сям'і нас. Без ската выйшлі ў гэта балота. Снег прайшоў — сляды завеяла, і экспедыцыя радам ішла ноччу. Помню — Новы год сустрачалі немцы, стралялі, салют давалі ў дванаццаць часоў. Новы год. І мы ўсё — і разгаворы слышалі, і выстралы, усё слышалі, але асталіся. Немцы не дагадаліся. А хто вёз на канях і скот з сабою, тых усіх экспедыцыя дагнала і расстраляла. Мы после вышлі, кагда ўсё ўціхла, прайшлі па лясу — жуткая была карціна. Мы прашлі да сваіх зямлянак. Ляжалі трупы, коні, каровы, парасстрэльваныя, — жуткая карціна была...

Другая экспедыцыя ішла летам. Гэта, па-мойму, ужо ў сорак чацвёртым. Летам ужо мы сядзелі ў тайніках. Прышоў з партызанскага атрада Арлоўскі, помню яго фамілію, выступіў перад насяленнем і расказаў, як строіць гэтыя тайнікі. Пастроілі мы тайнікі. Каждая сям'я строіла сабе тайнік. Штоб можна было толькі сесці ўсёй сям'ёй. Зразалі дзірванкі акуратненька. Абчэрціш так вось квадрат. Дзірванкі клалі, пясок увесь выкапвалі, каб можна было сесці, яму такую выкапвалі. У карзіны пясок, аднасілі далёка і пад мох хавалі. Немцы ўжо ведалі, што такія тайнікі сушчаствуюць, і, калі ішла экспедыцыя, яны шукалі. Гэта ўсё мы шчацельна маскіравалі: пясок, потым накладалі досак тоўстых, каб не зыбаліся, і назад роўненька, дзірванок у дзірванок складывалі. Усё як было — назад на гэтыя доскі. Потым па дзірванцах чашуёй засыпалі. Точна як наўкол лес расце. І ўстрайвалі, штоб дыхаць можна было. Пад бальшое дзерава, окала бальшога дзерава выкапаць, а пад корні каб прасвет

быў, некалькі іх. Як сядзіш, штоб воздуху нямножка, дыхаць. Там жа доўга сядзець нельзя было, толькі той мамент, пака пройдзець экспедыцыя. Патом вылезеш з гэтага тайніка — чалавек жоўты-жоўты, вобшчам — галавакружэнне. У зямлі, поўнасцю ў зямлі.

Другая экспедыцыя калі ішла, у нас быў тайнік. І Кухаронак такі жыў, і Чагак. Яны з Боркавіч. Удраўшы былі ад немцаў у парцізанскую зону. Ішоў гэты Кухаронак па лясу і якраз найшоў на нямецкую цэп, на экспедыцыю, на самых на немцаў напаў. І расцяраўся, ну, і назад, бягом у свой лагер. А немцы толькі засмяяліся, таму што яны зналі, што з усіх канцоў усё ацэп-лена, тры цэпі ішлі.

Ён адразу як прыбег — замахаў: «Немцы ідуць!» Мы тут касцёр пагасілі, які быў... Зямлянка ў нас навярху была, як адкрыта жылі. І мы адразу ўсе ў тайнік. Як толькі ў свае тайнікі ўлезлі... Такую дзверку дзелалі на завесах, палачкай падпіралі і ўлазілі туды. Ляжаш і нагамі туды ўсунешся... Усе ў тайнікі ўлезлі, і тады за гэтую палачку возьмеш і апусціш. Прышлі немцы, зямлянку ўзарваліі Мы разгавор чулі нямецкі, вешчы якія былі — яны разбрасалі. Прайшлі па самаму нашаму тайніку — хруп-хруп-хруп ветачкі пад нагамі ў іх...

Мы гэтыя тайнікі рабілі так шчацельна, што было там нас тры сям'і, усе ведалі прыблізіцельна, дзе чый тайнік, а часамі самі не маглі знайсці, штоб падняць гэтую дзверку. Адзін у аднаго.

І вот Кухаронак, кагда прайшла гэтая экспедыцыя, ён першы вылез з тайніка і рашыў прыйці даць нам сігнал, што немцы пайшлі. І знаў, дзе наш тайнік, і не найшоў. Слышым, ён ходзіць, кліча нас па фаміліі, вызывае, што немцы, значыць, прайшлі, а мы не верым: а раптам немцы заставілі яго паказаць наш тайнік. А патом прыпаднялі дзверку, паглядзелі праз шчэль, што гэта Кухаронак адзін, ніякіх немцаў няма, і мы вылезлі самі.

А Чагак не ўспеў тайнік зрабіць поўнасцю, ён яго замаскіраваў, а дзверку гэтую, на завесах, праз каторую нада ў тайнік лезці, ён не ўспеў зрабіць. Пагэтаму яны ўскочылі ў тайнік усе, ялушачку ўзялі ў рукі, селі ў гэтую... Ну, чалавеку толькі каб сесці... І ялушку гэтую бяруць. І дзяржалі. Дык яны ні жывыя ні мёртвыя сядзелі, усё відзелі праз гэтыя веткі. Сядзяць і відзяць, як немец дайшоў, пачці ўжо вот-вот нагой устаць, астанавіўся, пасматрэў. Яны ўжо ўсё, гаварылі, падгатовіўшы былі: еслі ўжо немец стане — ён абваліцца ў іхнюю яму, дык яны какія-то там вяроўкі падгатовілі, каб адразу яму рот закрыць, штоб ён і не крыкнуў і не піснуў...

Так мы дзве экспедыцыі і прасядзелі...

Як Красная Армія прыйшла, дык усе ўзрослыя пабеглі ад радасці, а нас, дзяцей, пакінулі, а мы сядзём і не ведаем, што рабіць. Празднуюць

тамака ўзрослыя, салдаты гавораць, што многа прайшлі, а толькі тут мірнае насяленне ўстрэцілі. Усё было ўсюды папалена.

Часа цераз два ўзрослыя вазвраціліся і нам, дзецям, аб'явілі, што нас асвабадзілі — пара выхадзіць з лесу...»

Палююць на людзей, забіваюць цэлыя вёскі, і раптам... Дзяўчынка, лежачы сярод трупаў у сваёй хаце, чуе:

— О, пахне хлеб, цёплы! Даставай яго а печкі, а то я галодны, як звер!

«Як звер!..» Гаворыць, але сам, мабыць, усё яшчэ лічыць, што толькі апетыт у яго «звярыны». А сам ён чалавек, нават — «звышчалавек». Той, каго са зверам нельга параўноўваць, — пакрыўдзіш звяроў.

І зноў — услед за вогненнай людской памяццю — вернемся у тое жудаснае мінулае, якое для ўсіх нас звяры-паляўнічыя ў фашысцкіх мундзірах хацелі зрабіць самой будучыняй. Паўсядзённай рэальнасцю гатовы былі зрабіць для мільёнаў людзей.

Расказвае Ганна Андрэеўна Яцкевіч з Кандратавіч Лагойскага раёна.

«...Быў мой, але цяпер яго нямашака, майго чалавека. Ён хаваўся з хлапчуком малым. Прыйшоў дамоў, лёг спаць. Дождж пайшоў. Я пайшла картошкі ў ямцы дастала — во так недалёка. Вылезла з ямкі, паглядзела — нігдзе нікога нямашака...

А тут быў мужык адзін, інвалід, едзе ён конна і кажа:

— Кідай картошку — мы ўжо акружаны.

Я ўскочыла ў хату ды кажу на яго... Ён спаў, і малое дзіця з ім, хлопчык, цяпер ён ужо ў арміі. Быў у арміі, а цяпер ужо адслужыў, дома. Дык я да яго, з калыскі хваціла, ды такі платок бальшы быў — на яго, абхінула. А тады яшчэ была дзевачка, і большы хлопчык, і муж ужо. Яны хаваліся з лошаддзю, дык цяпер на печ узлезлі — грэліся ўжо. Кажу ім, што злазьце з печы, што мы ўжо акружаны. Ён саскочыў з печы. І гэты хлапчучок большы. І кінуліся мы ў гэты бок — будзем хавацца недзе. Аж тут ужо акружаныя мы...

Адтуль мы ўжо ў сваю кварціру прышлі. Што ж будзем рабіць, дзе хавацца? Яшчэ сусед прыйшоў адзін:

— Што ж будзеце рабіць?

— Не ведаем, куды ўжо кідацца, ужо акружаны.

Прышла суседка, таксама пытаецца, што мы рабіць будзем.

— Нічога, — кажу.

Падпаліла ў печы, уставіла гаршчок картошкі... А нашто яна мне?.. Ужо без памяці я. І пайшлі яны, сусед з суседкай. Узялі машынку[25] і пашлі — таксама ў печы падпальваць.

Потым муж глядзіць праз акно — так у вёску, а потым кажа:

— Ну, баба, будзем уцякаць: ужо ідуць немцы адтуль і гоняць народ.

[25] Крэсіва.

Тады мы ў гэты бок... Было яшчэ акно прыстаўлена, дык ён выняў тое акно — кулаком во так выбіў, ды гэтага хлапчука малога... Сам вылез, а тады гэтага хлапчука малога ўзяў і перад сабой... Тут сад быў бальшы, пад школу, дык ён у гэты сад. А я яшчэ паглядзела цераз акно — ужо нікога няма, хата расчынена... І пашлі мы ў гэты сад, а тады ў лес. Ён выткнуў галаву:

— Нікуды ўжо ў лес няма як. Ужо хата гарыць. Ну, дзе дзецца?

І там ужо немцы стаяць, дзе я брала картошку, пры гэнуй яме. І тут немцы, і там немцы. Дык ён і будзе казаць, мой муж:

— Няма нам кудыўжо ўцякаць...

Лазіна была такая бальшая, і маленькія адростачкі гэтай лазіны. І мы туды ўчацвярых — два хлапчукі, і гэтае малое, дык мы яго калышам на руках, каб ён не плакаў. А большы во так ніц, сагнуўшыся, пры нас. А дзевачка большая — тая ад нас... Тут жыта было. Хацела на лог, дык па ёй стрэлілі, і яна ў жыта.

Сядзім у гэтым кусце ўжо ўчацвярых. Мы во так сядзім у гэтай лазіне, а во так недалёчка сцежка. І па гэтай сцежцы немцы ідуць, і во так аўтаматы нясуць, але глядзяць туды, у лес. Мы сядзім пад нагамі. Я кажу:

— Будзем уцякаць?

А ён кажа:

— Не паказвайся.

А трава бальшая, во так по пояс, і мы сядзім так.

Я не помніла нічога. Школу палілі ўжо, людзей білі, — ну, не помніла я нічога, што гэта паляць, б'юць... Ён яшчэ помніў — мужчына, дык ён яшчэ болей трохі...

Меншы хлапчук давай плакаць... Ужо вакол нас хаты гараць, за дымам мы не бачым нічога, а гэты хлапчук давай плакаць:

— Крупак! Ён кажа:

— Не будзе месца тут нам.

Гэты большы папоўз па траве ды яму агрэсту — такі во, як цяпер, залозачкі — нашморгаў яму і кажа:

— На еш! Хай табе зарве.

Ён, гэты хлопчык, агрэст той есць, з'еў увесь ды плача. Вядома ж, нашча.

Ну, а ўжо тут папалілі кругом каля нас, у тым канцы гарыць, і страляюць там, і ўсё.

Ён выйшаў, трошкі паглядзеў, кажа:

— Не месца нам тут. Дзіцё плача. Давай на лог туды з ім.

Я яго перакінула во так цераз плечы і пайшла на той лог. А тады ўжо там Мошчанка гарыць — ужо дым пад Астрошыц. Я тады лесам во так, а тады, і там крапужына, равок такі ёсць на гарэ, — у гэта крапужына з гэтым дзецям... А тут я ўжо не ведаю, хто дзе. Ён шукаў большай дзяўчыны — па жыце, усюды... Каня забілі нашага, ён знайшоў у жыце. А гэтае дзяўчынёха ўжо бегла з жыта... Там

сястра ў другой дзярэўні, дык яна бяжыць і плача... А тады вышла жэншчына і кажа:

— Не плач, дзеўчына: матка тут во з дзіцем.

Я яе пакінула там, а сама прыбегла паглядзець, што тут. Скаціну пагналі, усё пагналі. А карова была яшчэ толькі ацялілася, дык яна ўцякала з поля. А я і думала, што яна ўцячэ ад іх, ад немцаў. Дык я вышла наўзгорак, гляджу...

А ён кажа:

— Не глядзі на карову, давай дзе пойдзем на нач. А я кажу:

— Ну, куды ж пойдзем — пойдзем туды, дзе дзіця.

Пайшлі мы, пераначавалі ў гэтай дзярэўні, назад прышлі — ну, што ж рабіць, няма чаго ні есці, нічога ж няма. Тут яшчэ картошка была, дык мы ўзялі картошкі, будзем варыць.

Толькі сталі варыць на гэтым пагарэлішчы — адтуль немец паўзець, з хвойнічка... Ён гэта паглядзеў і кажа:

— Няма месца тут, будзем кідаць гэтую картошку... І пайшлі мы. А яшчэ я схавала была малака збаночак у дровы. І яны не згарэлі, дровы гэтыя. Мы за гэты збаночак — у жыта, і гэтаму хлапчучку далі. Ён і галаву мыў, і ёў — усё там (смяецца). Дзіця! Каб хаця не плакаў.

Ну, і праседзелі гэтак да вечара. А тады ўжо ўвечары... Дзярэўня тут, тры кіламетры. Дык ён кажа:

— Цямнее. Пайдзем мы ў гэтую дзярэўню, там, можа, пусцяць начаваць.

Там мы ўжо начавалі, у той дзярэўні. А яны тут яшчэ і назаўтра... Яшчэ дзве хаты не спалілі — чакалі, што збяруцца людзі яшчэ. Ну, дзе ж хто пойдзе ў гэтую хату? Ніхто не пайшоў. Назаўтрае яны зноў прышлі, тут і стралялі, бралі і свіней, і курэй яшчэ ла-вілі, і хаты гэныя дзве спалілі тамака...»

Паслухайце яшчэ **Алену Ільінічну Батура** з Засоўя Лагойскага раёна.

«...Паміж сабой яны нічога не гаварылі. Толькі з маткай. Пыталіся, дзе сыны...

Пайшлі ў другую хату, да суседа. А я засталася адна. Што ж мне рабіць? Злезла я з гэтай печкі. Там, чую, стрэл у суседа. Мама ляжыць так во забітая, кроў фантанам б'ець. Брат і сястра забітыя на койцы, фантанам кроў б'ець. Што ж мне рабіць? К жызні я яшчэ страмілася. Судзьба такая на свеце. Я тады адчыніла пограб, дошчачкі дзве, узяла ўлезла ў пограб гэты і закрылася сама сабе. Калі я туды ўлазіла, то ўвідзела, што адна хата гарыць... Наверна, будуць жа і гэтую паліць. Дымам мне будзе хужа душыцца — лепш хай яны мяне стрэлам! Давай вылезу. А як я залезла ў гэты пограб, то матка ляжала во так забітая на палу, а ў мяне была блузка белая, то яна зацякла крывёю. Плечы зацяклі крывёю. Я і не чула — после абгледзелася ўжо. Я вылезла і ўлезла ў

гарод. Так во дзве градкі былі, мама буракоў пасадзіла там. Я ў баразну ўлезла, ніц лягла, выпрасталася — няхай тут ужо... Чую — яны там у суседа страчаць... Кажацца, каб зямля праваліласа, ды каб гэта глыбжа. Пасля чую — ідуць паліць нашу хату.

— Во, — гавораць, — наверна, удзірала, у агародзе ўбілі.

Чую ж я гэта, чую, але не павярнуся, не магу... Як яны будуць во так стралаць... Я ж бачыла, як матку білі... Не павярнуся, ні галавы не павярну — убівайце і што хочаце! Ляжу, ляжу так... Яны пайшлі, хату падпалілі. Хата гарыць, на мяне іскры... Мне ўжо трудна. Іскры валяцца. Дзе ўжо кофтачка сухая — яна тлеець. Я вазьму так во зямлю і там во аблягчу. Пасыпаю, і лёгка мне. Чую — тут ужо каля пояса мне пячэць, тлеець. Я абратна гэтай рукою... А яны во заняліся суседзямі, пайшлі да суседзяў хату паліць. Ой, як трудна, трудна! Чую — яны гавораць, і па-нашаму, і гергечуць усяк... Няма як мне выпаўзці. А пасля яны ў трэцюю хату пайшлі, біць. Патом я так во, так во, як гавораць — па-пластунску, локцямі, локцямі, як вужака якая, выкацілася з гэтых град, укацілася туды, дзе картошка пасаджана. І ляжу ў разоры, тожа ў баразне. Стрэлы. Пулі — ціў-ціў-ціў! Дзярэўня гарыць, бярвенне валіцца, іскрыць... Ой, канец свету. Я думала, што я ўжо асталася на свеце адна. Гэта — канчэнне свету. Канчэнне свету, а я адна, — што я буду адна рабіць? Мне страшна ўжо адной жыць... Я думаю, што і ва ўсіх вёсках так, і ўжо канчэнне свету, і больш народу не будзе. Ісвету не будзе.

Ляжала я, ляжала, пака гэта ўсё не пагарэла. Пасля ўжо, як сонца з паўдня звярнулася, села я ўжо. Ціха стала — ні пулі не свішчуць, нічога... Гляджу — Амлішава, другая дзярэўня гарыць. Усё, думаю я, канец свету... Што мне рабіць? А яшчэ во дзярэўня Гарэлае — не гарыць. Думаю: пайду я туды, там людзі ёсць. Сабралася і пайшла. Ішла па дзярэўні босая, голая, у.крыві гэтыя плечы ў мяне былі... Туды за рэчкай гэтае Гарэлае. Мінула я дзярэўню сваю... Уся дзярэўня гарыць, гэтыя трупы скліраць, гараць сінім агнём — людзі гараць. Паглядзіш — і мне ўжо адна пуць: іду ў гэтую дзярэўню цэлую...

Азірнулася я — за мной дзядзька бяжыць. Як я аглянуся — ён рукою махне і махне, а я — яшчэ, я — яшчэ! А дзядзька гэты за мной. Ён бяжыць, а мне здаецца, што немец у камбінезоне. За куст схавалася. А ўжо змаглася, не магу... Са страху, з усяго тамака... За куст захінулася — ну, тут ужо мянеўб'юць... Вочы так во закрыла і сяджу... Падыходзіць гэты дзядзька.

— Хто гэта? — кажа.

Гляджу — знаёмы, Няверка Уладзя.

— Ай, — кажа ён, — як ты адна асталася? Ашчапілася я за яго, а ён:

— Ціха, не плач. І я толькі з жонкай застаўся, усю сям'ю пабілі. І матку

забілі. А я праз акошка ўцёк. Пайдзём на Мнішава, на балота.

А Амлішава гарыць тое... Усё згарэла, амлішаўцы ў балоце сядзяць. А мая цёця была ў Амлішаве. Я рада гэтаму дзядзьку, што яшчэ на свеце чалавек ёсць! Ды яшчэ падказваець, што яшчэ і цёця мая ёсць, у балоце сядзіць... І пайшла я з тым чалавекам туды, у балота. Прышла, праўда, цёцю сваю знайшла з сям'ёю, і сталі мы ўжо... Ой, ой, як ужо трудна было...

Ужо ў балоце я агледзелася, што ўсе мае плечы ў крыві — ужо ад маткі і ад брата, ад сястры. З краваці капала, лілося. Маміна кроў мяне і спасла, толькі маміна кроў. Каб была гэта не кроў, то і маглі б яны мяне шкуматнуць.

Жыла я адна, адна, а потым замуж вышла, і замуж мой плахой — мужык жулікаваты, мяне бросіў, дзяцей бросіў, трое дзяцей, тры дзевачкі. І я змагаюся, іх вучу, дабіваюся. Праўда, первая замуж вышла, дзесяць класаў кончыла і замуж вышла — радзі мяне вышла замуж.

— Мама, — кажа, — будзем меншых вучыць. Я табе буду памагаць пад старасць.

Харошая яна, у Лонве жывець. Адна ў тэхнікуме, а меншая — восем кончыла і таксама хоча вучыцца. Асталася я адна — з-пад пуль вышла, з гэтае крыві, дык хай хоць дзеці мае жывуць, каб яны ў людзі пашлі...»

Расказвае **Вольга Фамінічна Гайдаш** з Першамайска Рэчыцкага раёна.

«...Чатырнаццатага мая сорак трэцяга года немцы спалілі нашу вёску. Мужа майго ўзялі партызаны каў-пакоўцы восенню сорак другога года, і два тыдні пасля гэтага мы пераехалі ў лес. За Каўпаком у нас пайшло чалавек восемдзесят. У лесе мы, партызанскія сем'і, сядзелі ўсю зіму. Пасля нам прыйшлі сказалі:

— Хто ў Каўпака, то вы не бойцеся — вас расстрэльваць не будуць.

Сказалі гэта нам свае людзі, а людзям гэтым — немцы. Ну, мы і папрыязджалі дадому. Я таксама ў лесе з канём была. Пераначавала я ў брата, а потым прыходзіць матка мая, свякруха, і кажа, што прыходзілі з паліцыі і казалі, каб я дома была заўтра, у дзесяць гадзін, і каб нікуды не ішла. Ну, мне страшна стала, што ганяюцца за мной. Я пабыла і зноў пайшла на сяло. Прыходжу з сяла ўжо ўвечары. Зарэзала аўцу. У лес уцякаць пачала зноў збірацца... Луплю тую аўцу ў адзінаццаць гадзін. Прыходзяць, стукаюць вечарам. Святла тады не было, капцілка. Яны пастукалі, я спалохалася, расцяралася. У мяне дзяцей было трое: сын з трыццаць пятага года і дочка з трыццаць сёмага, а меншанькая — з трыццаць дзевятага. Тая сядзіць каля мяне, а мне дзецца недзе. Я баялася, бо яны ганяліся за адзежаю майго гаспадара: у яго былі боты хромавыя і кожанка.

Забраць хацелі ад мяне. Страх мне стаў. А тут падпечча ў нас, дзе куры заганяюць. Свякруха пайшла адкрываць сенцы, а я пад тую печ, бо баялася. А дзеці большыя, што былі на печы, не ўбачылі, дзе я. А меншанькая сядзела. А матка:

— Вот была толькі што, а дзе дзелася, не ведаю. Яна думала, што я за ёю выскачыла на двор, яна і не бачыла, што я пад печ схавалася...

— Ну, дык скажы ёй, каб яна заўтра ў дзесяць была дома.

Яны паехалі, а я тады каня запрэгла, мяса тое, аўцу нялупленую, на воз і ў лес. Двое дзяцей са мной паехала, а меншанькая з бабай засталася. Матка не пусціла яе. Яна і так у лесе тым намерзлася. Назаўтра ў дзесяць гадзін яны прыехалі, забралі маці маю і дзіця. Яна яшчэ ім песенькі пела, дзіця тое... Чатыры гады дзевачцы было. І тут яерасстралялі разам з усімі. Трынаццаць душ тады забілі, старых жанчын і дзяцей...

А ў маі месяцы, трынаццатага, прыехалі да нас у лес і сказалі... Мы там у лесе сядзелі, стары араў, дык яны таго старога паклікалі і сказалі:

— Хто ў лесе сядзіць — аб'яві ім, каб ехалі дамоў, бо ў лесе пастраляем.

І па лесе яны пахадзілі, каго захапілі ў куранёх, пастралялі — дзяцей малых і старых. Людзі перапалохаліся: сабраліся ўсе, паехалі ў вёску, ноччу. Проста як абоз ішоў з таго лесу. Уранні прышлі дадому. Прышла я да суседа, ён друг наш быў, і пытаюся:

— Што будзем, Брэль, рабіць? А ён кажа:

— Хто куды хоча, а мая сям'я нявінная, не буду я адвячаць за кагота.

Яго з сям'ёю тады забралі: і ён, і дзеткі яго ўсе пагарэлі.

Ну, сталі гнаць худобу, цяляты. Людзей пазганялі. Тут адна старая засталася, таксама партызанская сям'я. Яна з сяла прыбегла сюды на наш канец, Халіха гэтая. Я пытаюся:

— Цётка, партызанскія сем'і зганяюць асобна ці ўсіх людзей разам?

А яна гаворыць:

— Усіх зганяюць у сараі, у хаты, хто партызанская сям'я, а хто і не партызанская.

Ну, я стаю з дзецьмі, на вуліцы. Каля хаты свае, каля дзвярэй стаю. Прагналі яны адну кучу, прагналі другую. Сястры маёй дачка была ў Германіі, дык сястра пісьмы дзяржыць, а я ў яе пытаюся:

— Куды ты, Тацяна, пойдзеш? А яна кажа:

— Ты хавайся, а я пайду туды: у мяне пісьмо е, дык мо ў Германію мяне забяруць?

Дочка яе была ў Германіі, а дзве дома былі, а сын быў у партызанах. Яна думала, што яе пісьмы тыя спасуць. Іх там у хаты пазаганялі, а я дзе стаяла — стаю, чакаю. У мяне вось такая думка была: узяла і выпіла я добра і думаю, каб білі нас у хаду. І дзяцей так настрапаліла:

— Сынок і донька, будзем уцякаць, штоб білі нас, а не так.

Немцы цялят вязуць па вуліцы, а потым толькі трох ідуць і жанчын гоняць, бабулек. Адзін, такі малады, відна, чысты немец. Падыходзіць да мяне. А мой пацан… Шапка на ём — шлём такі быў, пуп зверху. Краснаармейская. Дык немец за той пуп узяў, шапку падняў над галавой, потым зноў надзеў. Ручка хлопчыкава ў мяне ў гэтай руцэ, а дочкі — у гэтай. Немец яму зноў зняў і зноў надзеў шапку. А тады трэці раз яго вось так пад паху падхапіў і падняў. І мне вот здаецца, што ён кіне і заб'е яго. Паставіў. Зноў тую шапку падняў і зноў апусціў. Дык я тады кажу:

— Пан, я пайду рабёнка свайго вазьму.

У мяне ўжо тады рабёнка не было, але мне так на вум узбегла. Дык ён засмяяўся і кажа:

— Ідзі!

Сам сабраўся і пайшоў. Дык мы ў двор свой. Ну, у хату зайшлі — няма чаго браць. А я думала, што ён сцеражэ і ўб'е нас. Кошка была з кацянятамі за печкай. Я тую кошку з кацянятамі ўкруціла ў хустку і вы-ношу на двор. Гэты мой сын паглядзеў і кажа:

— Мама, ужо няма нікога, паехалі. Давай астрагу паставім у калодзеж і пахаваемся.

Паставілі мы астрагу, улезлі дзеці, і я ўлезла, і так мяне відна.

— Не, так мы прападзем, дзеці!

Выскачылі мы на агарод. Там у нас бліндаж быў. Але ў тым бліндажы ўжо суседка сядзіць, чатыры душы. І тут яшчэ жанчына бяжыць з дзеткамі, у яе маленькае дзіцятка. І тая — туды. Сталі крычаць тыя дзеці. Ну, мы і вылезлі адтуль. Вылезла я са сваімі дзецьмі, ажно бачу — бягуць за гэтаю жанчынаю ўдагонь, утрох. Немцы. Бягуць, — ну, мне ўжо некуды дзецца. Я ў разору вось так. І дзеці мае ў разору паміжградамі пападалі. Яны ў той бліндаж, выгналі тую жанчыну. Дзве дочкі ў яе; і была там жанчына чужая. Збілі іх і пагналі ў вёску. А ў вёсцы ўжо стогне зямля, гарыць, крычаць!.. Так усё прама — ажно сумна ля-жаць. Той хлопчык уцёк назад у бліндаж, думаў, што я ў бліндажы. І суседа другога ўцёк. Ну, яны ў бліндаж не палезлі, бо я ім сказала, каб ішлі ў разору, бо з блін-дажа павыганяюць. Яны ў разоры палеглі. Маіх двое і я. Усіх пяць нас у разоры. Перабеглі цераз нас. І кошка ж тая з кацянятамі ляжыць каля мяне, і кукла, што я сабіралася ў Германію. Яечкі, сала кусок і хлеба луста. Яны тую маю куклу нагой кашканулі і, значыцца, пабеглі. Я сама сабе думаю: «Ці яны падумалі, што мы бітыя?» Яны прабеглі. Потым зноўку бягуць, хаты па-ляць, хлявы ўжо, сараі нашыя. Гарыць ужо дзярэўня. Ужо дым. Тут у мяне ў галавах стог саломы стаіць, і я ўжо расцяралася, як ён стаў тую салому паліць зажыгалкай… На мне тая тужурка-кожанка і боты

хромавыя, бо падумала я, што згару сама і ўсё на мне згарыць. Я расцяралася, а дзеці спяць — мае двое і чужыя. Мае рукі во так пазакладаныя за галаву былі, дык рука ўпала. Ён на маю руку стаў, перайшоў... І сабраліся яны, пайшлі. Салому запалілі. А дзеці ля-жаць — пазасыналі. Толькі ўжо як салома загарэлася, і хлеў наш загарэўся, і полымя стала прыпякаць — дзеці гараць: і рубашкі на іх, і косы гараць. Мой ужо ўвесь абгарэў хлопчык, крычыць:

— Ой, мама! Я не магу ўжо ляжаць!

— Ляжы!

А тут шляшок, во гэта вулачка наша каля школы. Мы туды павярнулі, дык па нас б'юць, страляюць, пу-лі сыплюцца, як боб. Мы зноў там ляжалі, гэты мой хлопец устаў... Тут такія копчыкі каля нас, дык я іх туды паперанасіла. Ужо сонца заходзіла. Вечар. Ціхі такі. Шулы стаяць — гараць, а мне ўсё здаецца, што гэта немцы стаяць. Папераходзіла я сюды, а тут у мяне на дварэ конь стаіць. Толькі сухары ўкраты ў мяне з возу.

Я ўжо тады, увечары, пайшла шукаць, хто ў лесе застаўся жывы...

Хлопчыку майму было восем, а дзяўчынцы шэсць, сёмы год. А меншанькую расстралялі, я вам казала.

Што яна ім спявала, дык гэта чула жанчына, суседка. Яна была, бачыла, як свякруха мая і на воз садзілася і пршчалася. А меншанькая, чатыры годзікі было, сказала:

— Дзядзі, не бярыце мяне з бабуляй, я вам спяю тую песеньку, каторая «Пасею гурочкі».

Яна спела ім, стоячы на акне, і яны яе забралі і застрэлілі...»

## ЧЫНГІСХАН З ТЭЛЕГРАФАМІ

«...Я буду так расказваць. Мы жылі: свёкар, свякруха і залувіца. У залувіцы ўжо дзеці былі, і ў мяне дзеці былі. Свёкар запрог каня і нас адвёз у лес. А свякруха засталася, адна-адным у хаце. Сама яна засталася, бо ўжо была старая і нямоглая.

Паехаў свёкар з лесу паглядзець, а яе ўжо ў хаце няма...

А яны ўзялі яе ды ўкінулі ў калодзеж, невялікі такі быў. Жывую. Толькі ў яе была во тут, у галаве, дзірка прабіта, як яна галавою ўпала. І тады, якое было ў нас у хаце шуплацце — усё ў тую студню пакідалі: і посцілкі, і польты, і падушкі — усё на яе пакідалі ў калодзеж. І такое было бервяно дубовае, дык яны ім зверху тое шуплацце прыціснулі, каб яно не ўсплыло. А тады былі калёсы такія, два каткі, дык яны перавярнулі адзін каток і ўсадзілі туды, у калодзеж, а тады ўзялі зямлёю замуравалі — нідзе нічога не відна, адзін каток тырчыць...

Тры тыдні праляжала, як адзін дзень. У нядзелю яе ўкінулі, і ў нядзелю мы яе адкапалі».

(**Ганна Капшай.** Пагулянка Рэчыцкага раёна.)

«...Гэта было рана, іх яшчэ немцы стралялі на пасцелях. Аднаго, Дзянісава Макара, семнаццаць раз стралялі — у ногі, у рукі, пака гэта насмерць убілі. І ўсіх астальных стралялі не адразу. Убівалі — каб больш мучыўся».

(**Аліна Сцяпанава.** Роўнае Шумілінскага раёна.)

«...Маму маю, маю свякроўку, пераняў у акне. І як пачаў абухам біць!.. Яна спужалася, пад печку забілася і там сядзела да самага вечара. А потым у акно палезла — уцякаць. А ён — абухам. Сякерай, абухам у плечы. Яна заваліцца, паднімецца, а ён — ізноў...»

(**Усцiння Волкава**. Жары Ушацкага раёна.)

«...Мяне тры разы на ступу клалі. Плечы мае былі чорныя, як кацёл. Відзелі людзі. Ну, такая была ступа, як даўней крупы таўклі. А яны тую ступу абярнулі, цябе грудзьмі на яе паложаць, а рукі назад, накрыж, і дзяржалі, і цябе білі. Тры разы клалі і білі. «Дзе партызаны?» Загналі нас у хату. Перада мною шэсць чалавек забілі. Што яны не рабілі! На ступу паложаць, галавой к парогу. Выразалі цела... Жалеза награвалі і прыкладвалі... Шэсць чалавек забілі перада мной. Гадоў па пятнаццаць-шаснаццаць. «Партызаны! Вы нам спаць не даеце!»

Я чуць жывая была. А калі ўжо апомнілася, гляджу — разбягаюцца людзі, хаты гараць...»

(**Марыя Гладыш**. Мосар Ушацкага раёна.)

«...З нашай вёскі ўлавілі дзяўчыну. Яны над ёю надругаліся. На могілках потым знайшлі яе. Ужо нежывая ляжыць, і цукерка... у зубах... А другую забілі ў садзе. Во так ляжыць —

дагары, прыкапана,— после мы агледзелі. Сукенка ўся падраная на ёй...»

(**Ганна Дзядзёла**. Відокі Верхнядзвінскага раёна.)

Бабулі, якая гэта расказвала, за восем-дзесят гадоў, яна ляжала ў ложку, ужо зусім нямоглйя. Дачка яе, Барбара Ясюкевіч (у хаце прымак), і суседка Наталля Падгайская, якія добра памятаюць тыя дні, удакладнілі шэптам пра тую цукерку... Бабуля не змагла сказаць: ці па душэўнай далікатнасці, ці з-за памяці беднай пакутніцы.

«...Як яна крычала! Усе млелі. Тут жа вот, у байні, быў такі вялікі гвозд, сантыметраў мо дваццаць. Дык яны ўзялі той гвозд ды ёй у грудзі... Самаковачным гваздом — у грудзі...

А цётку маю на штыках паднялі...»

(**Ганна Грабоўская**. Латыгава Верхнядзвінскага раёна.)

«...А яшчэ і да бою здзекаваліся: і віламі паролі, і нагамі хадзілі, і білі — ой!.. Дзеці малыя былі, то па жывых нагамі хадзілі... А некаторыя знaлі, што немцы яйца любяць, нясе каторае дзіця яму яічак, ды просіцца, каб не забілі. А ён як дасць яму нагою, дык яно і перакуліцца — і з нагамі па ім пайшоў...»

(**Марыя Скок**. Паўлавічы Слонімскага раёна.)

Тут прыгадаем яшчэ і расказ Акуліны Івановай[26] — як фашысцкаму афіцэру мала было сваімі нагамі душыць пакладзеных у хляве на гнаі дзяцей, жанчын, старых, і ён прывёў каня...

Прымітыўнае, ручное зверства — спрад-вечная крывавая работа нелюдзяў.

А было яно, зверства, у новым, удасканаленым выглядзе, узброенае сучаснай тэхнікай.

Былі міны.

Расказвае бабуля **Акушэвіч, Аляксандра Навумаўна**, з вёскі Стаўпішча Кіраўскага раёна.

«...Там было чалавек дзвесце з розных вёсак. У камеры. Са мной дзве дзевачкі было, пляменніцы. А нашы самалёты наляцелі. Дык яны нас і замініравалі. Пастралялі і замініравалі.

А я была не ўбітая. Ранена ў абее нагі. У адну папала і гэтую пераламала. Дык я прытварылася як убітая. Так выцяглася. Кроў на мне — тых, што забілі...

Адзін нас страляў з аўтамата, а другі свяціў. А потым паглядзелі, што ўсе забітыя, і прынёс гэта... І кладзе... А я думала, гэта мо якая бляха,— я ж не ведала, што гэта міна.

Ну, мы ўжо ляжым. І яшчэ са мной было дзве, таксама не забітыя: адна жанчына і мая пляменніца, меншанькая. Жанчына ўстала і гаворыць:

[26] Гл. раздзел “Сцішнаватая радасць”

— Знаеш, яны адступаюць!

А я гавару:

— Ляжыце моўчкі. Маўчыма.

Дык яна на чардак узлезла.

Ну, а я ўжо ляжала, пакуль нашы прышлі.

Чую — дзверы адчынілі. Адчынілі, паглядзелі і пайшлі. Гэта ўжо нашы — красныя. Я стала войкаць, стала гукаць. Адна жанчына з імі была, яна цераз парог галаву і кажа:

— Ой, воечкі! Жанчына жывая!.. Мамаша, не станавіцеся на провад, у вас тут замініравана!..

Яны на парог узышлі, заплакалі. Нашы ўжо. А я дзевачку пабудзіла, каторая жывая, меншую. Яна спала. Пяць гадоў ёй было.

Нашы яе паклікалі:

— Дочачка, ідзі к нам!

А яна:

— Адыдзіце, немцы! Вы маю мамку забілі, я к вам не пайду.

Дык салдаты яе ўзялі неяк цераз міну. Міна ж ляжыць!.. Я толькі чую, што яны гавораць пра гэта. Ляжу і калачуся.

Яны кажуць:

— Падай, мамаша, рукі і скінь бітых з сябе.

Дзе ж я іх скіну!..

Адзін узяўся за мяне, а той узяўся за гэтага, а трэці зноў за гэтага і давай цягці. Як пацяглі, дык гэтая нага, што пераломана,— у ету міну, у еты провад. Як у провад, дык гэтая міна — хлоп! Разарвалася. Тых усіх і параніла трох. А я ўжо крычу:

— Ногі паадарвала!

Я вады прашу, а ён кажа:

— Вады няма.

Яны яе патруцілі, немцы.

— Не, мамаша,— гавораць мне, паглядзеўшы,— вашы ножкі цэлы.

Перавязалі мяне і тых салдатаў, і нас павезлі...»

Было радыё.

Яно не толькі каардынавала работу карнікаў як сродак сувязі — яно іх тады і весяліла.

У вёсцы Святая Воля Івацэвіцкага раёна быстрая цётачка **Аўдоцця Ермаловіч**, у вайну дзіця, а цяпер сама ўжо маці, нават удава з малымі неслухамі, расказвала нам пра гэткую весялосць. Жанчына плакала, успамінаючы, як яны, некалькі малых, схаваліся ў драўляным зрубе пустога, амаль даверху засыпанага калодзежа, абраслага высокім быльнягом, і чулі крык і плач і страляніну — наверсе, у вёсцы, дзе засталіся іх мамы, бабулі, брацікі і сястрычкі, якія самі яшчэ не ўмелі ўцякаць.

Немцы ўключылі ў сваёй машыне радыё, яно грымела нейкай музыкай, галёкала нейкія песні, і дзеці чулі праз гэтую весялосць не ўсё. Не ўсё яны таксама бачылі. Быструю Дзянку, як называлі Аўдоццю Іванаўну змалку, падсадзілі па сценцы калодзежнага зруба, і яна бачыла,— яна дагэтуль бачыць,— як немцы, адных людзей пастраляўшы, мылі ў вялікім цэбры закасаныя рукі, выціралі іх белымі

ручнікамі, а потым зноў пачыналі расстрэльваць.

А радыё іх весяліла...

Былі самалёты.

Пра паядынак старэнькай, нямоглай жанчыны з баявым самалётам «люфтваффэ» расказвала нам **Зінаіда Путронак**, сакратар сельсавета ў вёсцы Боркавічы Верхнядзвінскага раёна. Тады ёй было дзевяць год, і жыла яна ў роднай вёсцы Ваўкі, дзе адбываўся той паядынак.

«...Не паспелі мы да гэтага лесу даехаць, як наляцела другая парція самалётаў і па-чалі паліць хаты. Якой-та жыдкасцю. Варашылава бабуля... Яе сын цяпер у Міёрскім раёне пражываець. А тады быў на фронце. Сям'я вялікая была. Было сямёра дзяцей... Яна засталася адна і да паследняга сваю хату зашчышчала. Яны тры разы палілі, а яна ўсё пяском тры разы тушыла... Ну, потым яна ўжо не змагла. Нізка-нізенька самалёт спусціўся і падпаліў. І яна ўжо была абгарэўшы, сіл не было, і яна пайшла. У нас называлася такая Старасека — лес. А вёску ўсю нашу спалілі...»

У вёсцы Лозкі Калінкавіцкага раёна, дзе забіта 476 чалавек, супраць бабуль, дзяцей, жанчын і ўсіх іншых няўзброеных, мірных людзей быў выкарыстаны бронецягнік. 22 чэрвеня 1942 года. Гэта было вельмі зручна: лясная вёска расцягнулася каля самай чыгункі, на аўтаматны стрэл ад яе.

Расказвае **Кацярына Крот**, што была тады маладою дзяўчынай.

«...Ну, я той дзень... У мяне сястра была і бацька, маці не было. Мы жылі ўтраіх...

Не магу я расказваць... (Плача.)

Тады я з сястрой была на рабоце. Стрэл адкрыўся. Чуем — поезд ідзе, стрэл адкрыўся. Мы прышлі дадому...

От характар — гаварыць не магу...»

Калісьці, можна здагадвацца, валявая і энергічная, яна прыкусвае губу і змаўкае, каб не расплакацца зноў.

Гаспадыня хаты, у якой мы сядзім, Вольга Века, мала старэйшая за расказчыцу, сама перажыла той жахлівы «стрэл».

Апроч ваеннага гора, аднаго для ўсёй вёскі, ёсць у яе яшчэ і нядаўняе, ужо толькі сваё: загінуў малады, адзіны сын. Электраманцёр. Цягнулі высакавольтную лінію, і на яго «ўпаў слуп». Фота вясёлага, бравага юнака павялічана разам з даўнейшым фота маці, калі яна, Вольга Іосіфаўна, і сама была маладая, вясёлая. Гэты падвойны партрэт, нібы здымак шчаслівай пары або, яшчэ больш падобна, дружных сястры і малодшага брата, вісіць у міжваконні пад белым вышываным ручніком. Умудроная даўнім і новым горам жанчына, гаспадыня стаіць каля свае халоднай белай кахлянкі,

залажыўшы за спіну рукі, якія цяпер не пагрэеш, і на плач сяброўкі, што госцей прыйшла з другое вёскі, дзе замужам, нягучна, але на ўсю глыбіню разумення, сур'ёзна кажа:

— Ты не плач. Пацярпі. Трэба цярпець. О, як жа ён умее гэта, наш народ!.. Сяброўка супакойваецца пакрысе і ўжо гаворыць зноў.

«Там гэты канец, дзе людзей білі, ужо гарэў поўнасцю. Ужо вёску палілі з поезда. Нас на вуліцу павыходзіла, можа, чалавек пяцьдзесят, і гаворым:

— Дзеўкі, уцякайма ў лес!

А сястра мая гаворыць, што не пойдзе. Бо гаварылі людзі раней, што і з самалёта будуць страляць, і ўсяляк страшылі, але — не стралялі...

І вось сабралі нас і вядуць проста ў той агонь. Мы просімся, а яны нас цераз вуліцу вядуць у двор, і ўжо там хлеў падпальваюць. І так мне хочацца, і так жа мне хочацца ўцячы!.. Адзін раз я паспрабавала. Жыта было пасеяна каля самай вуліцы, дык я хацела туды, а немец замеціў, крыкнуў і вінтоўку наставіў. І я пашла. Ідзём, ідзём, а там, дзе ўжо яны палілі, сільна многа немцаў відаць. Дайшлі мы да сярэдзіны, дзе ўжо мы жылі, сям'я наша, а тут стаяла хата незгарэўшая і абгароджаная, як і трэба. І падружка ішла са мною. Дык яна гаворыць:

— Давай сюды ўцякаць!

А на гэтую сторану вецер кланіў, дык усё пагарэла і садоў не засталося. А іду я, можа, метраў дзесяць наперад. А потым вось так азірнулася назад. Тая дзяўчына пабегла сюды, а я сюды. Тыя два немцы — яны мяне не замецілі, і трэці не замеціў. Я і пабегла ў двор, а там ужо ў картоплю, у жыта і — папаўзла.

А тых усіх павялі.

Я адпаўзла так метраў, можа, са сто ад вёскі і ляжу ў жыце, думаю: «Што ж яны там будуць з імі рабіць?» Праўда, я далекавата была ад іх, адтуль, дзе іх палілі,— метраў, можа, з чатырыста, а можа, і больш. Ляжу я і слухаю, а іх там з аўтаматаў: та-та-та-та — строчаць, строчаць з аўтаматаў, як завялі ўжо ў хату. Ляжу я, ляжу, а потым бачу — гарыць ужо хаты і вёску ўсю асвяціла. Відна стала, бо ўжо цямнець збіралася.

А поезд так і хадзіў па пуці: сюды-туды, сюды-туды. Як ён біў па сялу! З кулямётаў ды з усяго. Аж тое жыта косіць!..

А я ў разоры ляжу. Бо я чула, што мужчыны гавораць, як на вайне — у ямку трэба. Ляжу я к пуці галавою, а поезд, здаецца, коціцца ў нагах. Так перапужалася, што не чуствую нічога. Ляжала, ляжала я, ужо цямнее. Чую: машыны пагулі на Васілевічы. І поезд пайшоў. Той, што страляў.

Я тады ў жыце ўстала, вярнулася на сваё селішча і пагукала, можа, дзе хто ёсць. Аніхто не адзываецца, толькі тавар раве, ды каты мяўкаюць, ды сабакі брэшуць... Дзе ж дзецца? Куды ж ісці?.. Пайду я забяру тое барахло, што кінула, і пайду ў лес.

Падыходжу я туды — багацтва ўжо ляжыць, а людзей няма, і ўжо цямнее. Сустрэла дваюродную сястру, і яна сказала мне, што людзей папалілі...»

Бронецягнік — тэхніка баявая, толькі прыстасаваная для забойства мірнага насельніцтва.

Была і тэхніка спецыяльная...

З яе работай, дакладней — са слядамі гэтай работы, мы пазнаёміліся ў вёсцы Кас-цюковічы, кіламетраў з трыццаць ад Мазыра, уверх па Прыпяці.

Расказвае малады чарнявы мужчына ў цяльняшцы пад расшпіленай кашуляй. Прыпяцкі бакеншчык **Андрэй Казак**, у хаце якога мы адразу тут прыпыніліся.

«...Мне восем гадоў было. Я помню так: Падышлі машыны, к нам напроці, дзе вот мы жывом на цэнтры. Падышла машына з халабудай. Стала. Там гэта, у гэтай халабудзе, знаходзілася бочка. Кожны падыходзіў ды па кружцы пілі чаго-та. Там і немцы, і паліцаі былі. Наверна, гарэлку.

Народ сагналі ўвесь і пачалі зганяць на бераг.

Мы малыя былі, нас матка за рукі дзяржала. Матка чаго-та сказала на аднаго паліцая. Ён вінтоўку наставіў і хацеў: моў, я цябе прыкончу! Тутака мы пачалі галасіць.

Ну, мы ў той спісак не папалі, дзе бытта партызанскія сем'і. Таму мы засталіся. Нас вывезлі адсюль.

А калі мы потым вярнуліся ў сяло, каб накапаць картошкі ці жыта сваё зжаць,— усё тут было спалена.

Патом пачалі калодзежы глядзець: гэта ўжо было пасля вайны.

Немцы людзей у душагубках травілі на беразе, а потым прывозілі і скідвалі ў калодзежы. Тут чатыры такія калодзежы. Душагубка — машына спецыяльная была, закрытая, і газам атраўлівалі...

Немцы спачатку людзям сказалі, што будуць прывозіць малых дзяцей, сірат, каб у нас яны, у Касцюковічах, жылі. Дык мы думалі, калі яны прыехалі, што гэта яны вязуць тых дзяцей. А яны не дзяцей нам везлі, а прыехалі ды нас загубілі...»

Больш памятае **Дар'я Гусак**, *тады* — ужо дарослая.

Людзі з сяла былі выгнаны на бераг Прыпяці, што і тады спакойна плыла сабе ў сваю вечнасць па раздоллі зялёнай даліны, унізе ад Касцюковіч і далекавата, калі хадзіць на раку пехатой.

«...Нас, партызанскія сем'і,— расказвае Дар'я Несцераўна,— паставілі на беразе асобна. Мужчын і жанчын асобна. Яшчэ ў мяне сястра была, з дваццаць чацвёртага года. Маці папрасіла аднаго паліцая:

— Мой даражэнькі, ты маіх гэтых дзевак забяры куды-небудзь, усё роўна нам ужо магіла.

Дык ён нас дваіх узяў туды, дзе збіралі адпраўляць у Германію.

Як мы ўжо ішлі, дык бачылі — разбіралі ў вёсцы калодзезі, ужо іх падгатаўлялі на людзей... А гэтыя душагубкі, знаеце, яшчэ толькі пад'ехалі. Такія яны, як вот ездзяць нападобіе кузні ў нас. З МТС. Толькі ў гэтых цвет цёмна-зялёны, а там, як бы вам сказаць, салатавы. Такія нейкія вілюхі. Іх дзве было: адна на беразе, а другая ўжо тут пад'ехаўшы, к калодзежу.

Яны, знаеце што, сядзелі на беразе, мужчыны, іх пасадзілі ў рад па шэсць чалавек, на каленцах... То адзін яшчэ аглянуўся так,— гэта Грыша Адамоўскі,— а немец падышоў і прыкладам як дасць сюды па шыі, дык ён вот так абвесіў галаву, і кроў пайшла з носа, з рота. І ён больш не падняў галавы.

У мяне маці і бацька засталіся там...»

Нейкі Іван Рачыцкі, чорная душа, перад вайною спрытны прыстасаванец, што залез быў, калі браць па ягоных маштабах, даволі высока, дапамагаў карнікам распазнаваць у натоўпе касцюкоўцаў партызанскія сем'і і тых, каго ён лічыў памочнікам партызан.

«...Дык адных астаўлялі, а другіх выводзілі,— расказвае яшчэ адна цётка, значна старэйшая, **Дар'я Мінаўна Карась**.— А тых, што пакінулі, а потым забілі,— тым гаварылі, што іх павязуць кацерамі.

Толькі іх не павезлі тымі кацерамі, а чатыры калодзежы напхалі. Вот у гэтым адны жанчыны, у гэтым адны дзеткі. Там два калодзежы — адны мужчыны... Яны падзялілі іх.

Як прыязджала наша камісія, руская,— раскопвалі. Дык тут адны мужчыны. Голыя, голыя! Раздзявалі іх. Бацька адзін прышоў, сына свайго пазнаў, ён наверсе быў, і пахаваў на могілках. Цэленькія ўсе былі, не пазгорбленыя і нічога. Словам — яны травілі. Бо як кідалі б жывём, дык чалавек курчыўся б, гнуўся б у вадзе, а то яны цэленькія, роўненькія. Ляжалі, як іх пакідаў, так і ляжалі...»

Карнікі стараліся, каб іх работа была чыстая», каб яе ў вёсцы тады ніхто, апроч х саміх, не бачыў. На беразе Прыпяці людзей саджалі ў тыя «салатавыя аўтобусы», у кожным з якіх змяшчалася да шасцідзесяці чалавек. У дарозе да вёскі людзі душыліся выхлапным газам, каля калодзежаў іх гаспадарліва раздзявалі і голых кідалі ў прадонне. Усё рабілася настолькі спраўна і ціха, што тыя, хто заставаўся тым часам каля ракі, стоячы на каленях і тварам ад вёскі, нічога не бачылі і не чулі. Тыя ж, хто быў у той дзень асуджаны не на смерць, а толькі на часовае выгнанне з роднай вёскі

або на вываз у Нямеччыну, былі ўжо выгнаны і вывезены з Касцюковіч.

І усё ж Дар'я Гусак, калі яе міма гналі, заўважыла, як рыхтавалі для людзей калодзежы, бачыла і той «салатавы аўтобус»... Бачыла, аднак не ведала, што тут да чаго, і разабралася толькі пасля, значна пазней, калі над тымі карнікамі, якім не ўдалося ўцячы або замесці сляды, адбыўся суд і на судзе тым пабывалі людзі з Касцюковіч.

Выраз «Чынгісхан з тэлеграфамі» належыць А. І. Герцэну. Сімвал нелюдства бачыўся яму ў палавіне мінулага стагоддзя ўзброеным ужо не толькі рукамі ды нагамі, шаблямі ды лукамі, але тэлеграфамі, параходамі, чыгункамі, стрэльбамі Мінье і ракетамі Кангрэва...

Знішчаючы мірнае насельніцтва, фашысцкія чынгісханы розных рангаў карысталіся і метадамі сваіх папярэднікаў, і новай, дасканалай тэхнікай. Былі ў іх аўтаматы, міны, аўтамабілі, радыё, бронецягнікі, самалёты і супернавінка — іхняе вынаходніцтва — Sonderwagen або Gaswagen, душагубка, рухомая памочніца канцлагерных газавых камер.

Альберт Шпэер, міністр узбраення і ваеннай прамысловасці трэцяга рэйха, адсядзеўшы дваццаць гадоў, адмераных яму на Нюрнбергскім працэсе, напісаў «успаміны». У гэтай кнізе пра свайго друга і фюрэра ён гаворыць так:

«Гітлер быў першы, хто здолеў прымяніць тэхналогію для мэтаў масавага злачынства».

Колькі пакут, колькі жахлівай антычалавечнасці стаіць за словамі гэтага кампетэнтнага сведчання!..

## «СЕЛЕКЦЫЯ»

Прыходзіць чарговы эшалон з «перасяленцамі» з Балкан ці з Усходу, людзей выгружаюць, рабуюць іх рэчы ў казну рэйха, саміх гоняць калонамі ў лагер і, выстраіўшы, разводзяць у два бакі: каго адразу ў крэматорый, у полымя, а каму яшчэ, покуль голад не з'еў іх мускулы, працаваць на карысць фашысцкай Германіі.

«Селекцыя» — так гэта называлася ў асвенцімах і майданаках.

Мэты, якія фашызм здзяйсняў на фабрыках смерці, у канцлагерах, рэалізоўваліся таксама і ў беларускіх вёсках. І тут — з аднаго боку масавае знішчэнне «непатрэбнага» насельніцтва, а з другога — паляванне на рабоў, лоўля людзей для працы ў Германіі.

«Селекцыя», адбор: каго забіць адразу, спаліць сёння, на месцы, а каго заўтра — цяжкай працай, голадам у Германіі. Мэты — тыя самыя, што і ў лагерах смерці. Толькі прыёмы, метады — дапасаваныя да ўмоў, калі ахвяры, людзі, не акружаны дротам, калі навокал поле, кусты, партызанскі лес...

**Стэфа Пятроўна Каваленя**. Осава Салігорскага раёна.

«...Вайна была, мае мілыя. Мужчыны спасаліся, а мы, бабы, думалі, што мы будзем жыць, што гэта мужчынам трэба спасацца. Я бачу, што вельмі едуць падводы. Кажу:

— Ты ўцякай, а я буду з дзеткамі.

А ён і збег, схаваўся. Далей едуць, прыехалі, акружылі, ацапілі — ужо нам некуды. Забралі нас. У мяне шасцёра дзяцей было. Бальная ляжу. Мяне прышлі і выганяюць. А ў мяне дзіцятка ў грудзёх было, маленькае. І ўсе дзеткі дробненькія. Адзін цяпер жыве, а тыя пагарэлі. Забралі нас, павялі ў гумно. Зайшла я туды, а хазяін там — злавілі, занялі недзе...

Адсюль нас пагналі ў Заброддзе. Забродскіх папалілі раней, мы не бачылі. Загналі нас у сарай. Узялі яны гэтых людзей і становяць. Каторыя з дзеткамі — тых у адну сторану, а гэтых, каторыя свабодныя, здаравейшыя — тых у другую. Дык тых пагналі. а нас — там гуменца было такое,— нас туды. А тыя, каторыя здароўшыя былі, гаворацъ:

— Нашто нам дажыдацца, каб нас забілі, уністажалі, давайце дзверы ламем. Дык каго заб'юць, а хто ўцячэ.

А яны, мабыць, пачулі. Нейкі пераводчык там быў. Яны сяйчас дзверы адкрылі:

— Хто жалаюшчы на работу?

Ну, гэтыя пайшлі. А я куды з дзеткамі пайду, дзеткі ў мяне дробненькія. Сама нягожа была.

Пераначавалі мы там з дзеткамі. І яны чуць свет давай нас разводзіць. Чалавек па дзесяць. Бяруць і вядуць. А куды — мы не знаем. І бачым, павялі ў тую старану і там загарэлася. А яны ідуць па нас. Яны завядуць, ды паб'юць, ды падпальваюць. Ну і мяне з дзеткамі завялі. Майго брата жонку з дзеткамі. Майго бацьку. Тожа гэтак... (Доўга плача.) Пулямёт у кожнага...

Ідуць і страляюць... Мы так пападалі, ляжым, ляжым... Я бы ў якую яму залезла — не чутно. Нас яны ўслед не падпальвалі. Мяне ў ногу ранілі, а я нічога не чувствавала. Мяне бы хто паднімаў, паднімаў угару... Няма нікога. Я падняла галаву. Ой, у хаце яны яшчэ! Я абратна так упала. Потым ходзяць і адзін аднаму:

— Ну што, усіх пабілі?

А другі кажа:

— Алес, усіх.

Ляжала я, а яны пахадзілі, пахадзілі, пайшлі. Яны пайшлі, я ўстала, знайшла брата жонку, так за голаў пакалаціла: «Аўдоцця! Аўдоцця!» — яна не адзываецца. Паглядзела, што яны ўсе нежывыя ляжаць. Што мне рабіць? Страшна гарэць жывой. А ў мяне кроў цячэ. Думаю, усё роўна ж мяне паймаюць. А яшчэ снег быў. Уцяглася туды, за хату. Вышла туды — за корчыкі, за корчыкі, папаўзла на чатырох. Кроў... Думаю, усё роўна ж мяне паймаюць. А дзярэў-ню падпалілі, гэтае Заброддзе. А патом прыбілася на балота трохі, там са мной дзевачка была. Яе маці і ўсіх дзяцей забілі, а яна засталася. Гарохава Івана дачка. Мы з ёю ў стог — трошкі выскублі ды паселі, а ногі мае замёрзлі, у баціначках сядзела ў той вадзе. Раніцай сядзім мы, я ж ніку-ды няварта, аслабела, нага ранетая. Анюта кажа:

Хадзем. А я кажу:

— Дзіцятка, ідзі куды хочаш. Мне няможна. Я, кажу, пагіну тута.

Бачу, перад намі стог загарэўся. Бачу, а яны едуць паўз нас. Абоз. Дзевачка:

— Ой, уцякайма?

А я кажу:

— Не, позна.

Мы, як тыя гусі, паабскубаліся і сядзім у стозе, як на тым свеце...»

«Забродскіх папалілі раней, мы не бачылі»,— кажа Стэфа Каваленя. І там таксама была «селекцыя». Хто малады, здаровы, тых пагналі з сабой. А астатніх...

**Ганна Іванаўна Берніковіч** бачыла, што і як было ў Заброддзі. Гэта тая самая «дзяўчынка Анюта», з якой разам ратавалася Стэфа Каваленя.

«...Тады я яшчэ ў чацвёрты клас хадзіла. Прывялі нас у сарай і пасадзілі на калені. На каленах паселі. Патом:

— Лажыцеся!

Паляглі ніц.

Ды ў мяне два браты было, адзін у мацеры на руках быў, а другі большанькі, дык я ля сябе пасадзіла. І дзве сястры ў мяне было тожа, дык яны ля мацеры сядзелі. Дык я так як ляжала — чутно, што стралялі, і ўсё... І вышлі... Ну, я заплюскана ляжала. Дык я чую: з мацеры налілося крыві на мяне. Галава мая ўся мокрая была. Патом гэты ад мяне брацікa ўсё адсоўваў. (Плача.) Дык я за руку яго падсунула... Я ляжала, пакуль прыняслі салому. Ляжу і думаю: «Во гэта ж пабілі, і бітыя ўсё знаюць». Ляжу і сама

сабе так думаю... Вобшчам, біты знае чалавек... Чую — салома зашамацела. Ляжу і сцепануся — нічога не баліць. Думаю, гэта ж нічога і не баліць. Біты чалавек і ўсё знае. Патом яны падпалілі. Я ляжала, пакуль мне ў руку запякло. Адзежа стала гарэць на плечах, на галаве. У руку як запякло, я ўсхвацілася і выбегла на двор.

Расплюшчылася, паглядзела — гарыць усё кругом. Пабегала, пабегала, думаю, куды бегчы, што рабіць. Немцы ж яшчэ тут — заб'юць. Я ў стопку. Пазіраю — немец. Падышоў, набраў нейкага сена. А мне відно ў шчылячку. Кінуў. пад страху. Страха загарэлася. Толькі я на двор выскачыла — шарнула ўся страха, упала. Усё! Я пабегла ў лес.

Там я абтушылася ўся, у снег лягла — яшчэ снег быў. Далей я паднялася, бачу, які-та чалавек ідзе ка мне. Падышоў да мяне, папытаў, чаго, як. Я расказала.

— Ты,— кажа,— пасядзі, дзевачка, а я прыду вечарам цябе забяру.

Дзе ж я буду тут сядзець. Ноч ужо абнімае. Не, думаю я, пайду. Я знаю сваё сена там на балоце — і ў стог. Пайшла я, там паплакала. (Плача.) Сяджу і плачу. Далей з Восава жанчына. Падышла ды кажа:

— Я думала: тут багата людзей.

Яе раніла ў нагу. Пераначавалі мы з ёю ў стозе. Есці ж хочацца, галодныя. Я кажу:

— Пашлі, у нас сала закопанае ёсць. Раскапалі сала, пазіраем: немцы ў том сяле, у Красным Возеры. Пашлі мы ў другі стог, у чужы. Рана прасануліся. Тая жанчына гаворыць на мяне:

— Ты,— гаворыць,— спіш? Не спі, паглядзі — уперадзе стагі гарацы.

Устала я — праўда, гарацы. Кругом па балоту гарацы...»

Пра такое ж — **Марыя Сямёнаўна Жураўская.** Жылін Брод Слуцкага раёна.

«...Я жыву ў гэтым канцы, а мама жыве ў тым канцы. І тады я з дзіцем пайшла да мамы. Можа, мы пралі там, можа, што другое — я ўжо і забылася. Сядзім і чуем — страляюць... А нам і не ў галаве, што там страляюць. А потым кажу я:

— Пайду я дадому...

Я пайшла дадому. А мой хазяін дровы рэжа на дварэ. І гаворым мы, чаго гэта там так страляюць... А потым глядзім — цераз поле ідзе ланцуг немцаў. Нам ужо не было куды ўцякаць... Можа, мы і маглі б уцячы, але ж чалавек думае: «Мы ж не вінаваты. Што ж яны нас душыць будуць ці біць». А майго дзіцяці не было, у мамы было дзіця. Як пашлі яны па дзярэўні, дык адразу зайшлі і к нам. Хазяіна, Паўліка майго, уродзе бы забралі... Не, не тады забралі, хлушу я ўжо. Дзіця прынеслі хлопцы мне, мае браты. У тым канцы бралі маладых у Германію, дык мая мама кажа:

— Нясіце вы Мані дзіця, а то і яе забяруць.

Бо што ж я, маладая яшчэ была, з 1922 года.

І вось прышлі яны Паўліка забіраць у Германію. Мы з яго мацераю плачам, просімся, каб не забіралі. А немец на мяне... Я ўжо сём класаў кончыла і ўжо трохі панімаю, што яны гаворацъ панямецку. Каб я, кажа, дзіця кідала з маткай, а сама ў Германію, і тады будзе «гут». Як мы ні прасіліся з маткай, як мы ні плакалі, усё роўна забралі Паўліка і пагналі на дзярэўню. Потым вышла я... Быў адліжны цёплы дзень, я гэтае дзіця ўкруціла і вышла. Сустракаю знаёмага паліцая і кажу яму:

— Федзя, што гэта будуць рабіць?

— А я нічога не ведаю.

Я іду, усё роўна іду. Паўліка гоняць, і я ззаду іду. І яшчэ раз пытаюся ў паліцая, а ён яшчэ раз кажаць, што нічога не ведае. Свой хлопец, можа, мяне і праважаў не раз... А потым кажа:

— Калі хочаш, дык гані кароў.

За трэцім разам толькі мне сказаў. Сталі нас зганяць у адну хату, да Косціка Ціхана. Прышла я і кажу свайму мужу і дзядзьку:

— Мусіць, нешта з намі будуць рабіць. Бо мне Бараноўскі сказаў, каб гналі каровы...

Гэта цяпер ужо людзі жывуць раскошна, а тады ж, вядома, як было. Штаны латаныя. Паўлік кажа:

— У Германію павязуць, дык ты хоць пабяжы штаны мне лепшыя вазьмі.

Я і пабегла, бо мы недалёка ад Ціханаў жылі, наўскос.

— І табаку вазьмі, і есці што вазьмі.

А мы сагласіліся з яго мацераю, што дзіця ў яе пабудзе. Маці кажа:

— Як вы так застанецеся, то і будзеце жыць.

А ён кажа:

— Я нікуды не пайду, усё роўна ўцяку. Гэта мой хазяін.

І мы так бегалі, бегалі, то табаку, то таго, і дзіця маё засталося ў разрыве. Я бегчы, а немец як крыкне: «Альт!»— дык я вярнулася і дзіця тое ўзяла на рукі.

Стаю я во так каля дзвярэй, а ён у мяне дзіця з рук, немец, і аддаў другой. Гэта была Яся Карповіча цётка. А мяне за дзверы:

— Да Германіі будзе гут.

Пагналі мы тыя каровы. Снегу многа было. А мы не ідзем па дарозе, а збоку. І так ужо я прыстала, так прыстала. А Паўлік кажа:

— Баба, хоць і не можаш, а шавяліся. Зараз дойдзем да лесу.

Мінулі мы за мастом паваротку, дайшлі да моста, а тут гэтыя танкі... Ці гэтыя машыны ідуць... Бачым — падводы едуць па Пераходах, а якія падводы — мы не ведаем. Можа, немцы, можа, хто там, чорт яго ведае. Тут далей мужчыны сталі прыглядацца. Яшчэ двух з намі ішло... Я ж і кажу, што тады ніякая хвароба не брала. Можа, два кіламетры чалавек босы па снезе ішоў. А цяпер — трошкі што і ўжо... А потым убачылі, што гэта

сваe на падводзе. Пайшлі мы, паглядзелі, што няма нідзе нічога, і кінуліся ў лес...

А потым я зайшла на мамін двор. Я ж ведаю, колькі душ трэба каб было. Колькі чалавечых недагаркаў. А паглядзелі — няма. Бацькуто мы ўродзе бачылі, што яго забралі з канём, а мая мама — я ж не ведала дзе.

У Косціка Ціхана ў хаце лішняе дзіця было забіта і спалена. Можа, гэта і маё? Можа, яго Косцікавы дзеці куды пад печ зацягнулі ці куды...»

**Алена Казіміраўна Камінская.** Ціхань Слуцкага раёна.

«...Снегу было многа, мароз быў вялікі.

А потым ішоў карацельны атрад. Астанавіўся ў нас, у Ціхані. Потым пайшлі на Гандарэва, на Чырвоную Старонку, Лявішча, Падстарэва, Старэва... Папалілі, пабілі, скот пабралі. Людзей у Германію пабралі маладых. А старых пабілі. І дзяцей.

Ну, што яны яшчэ рабілі?..

Чалавек іх дванаццаць ці дзесяць зайшлі да нас. Халаты — у крыві. Бабы пыталі старыя ў іх:

— Што вы рабілі так?

— Гусям галавы адсякалі, — кажуць яны. Во, так яны гаварылі.

Ну, нас вызвалі на вуліцу, ціханцаў, выстраілі так у рад, паставілі з аднаго боку пулямёт на нас, з другога боку пулямёт. Ішоў афіцэр з немцам і адбіраў маладых у Германію. А мы так з дзецьмі асталіся ў гэтым раду. Потым загадалі нам сабраць падушачку, адзяяла, на тры дні есці, і паліцаяў паставілі ў калітках, каб гэтыя ўжо не заходзілі, каго ў Германію адабралі. Ну, мы так вынеслі ім на вуліцу есці, усё сабралі. Іх пагналі, маладых, у Германію. Забралі скот.

А гэтыя дзесяць ці дванаццаць немцаў заехалі ў Лазараў Бор. Паехалі туды, глядзім — гарыць. Стрэлу нарабілі. Там людзям сказалі, што як сустрэнуць немцаў са сталом, хараша сустрэнуць, дык яны паліць не будуць. Яны іх сустрэлі сталом ужо, акуратна. Яны ўсё пабралі, той стол перавярнулі, а людзей пазаганялі ў хаты, спалілі, а скот пабралі. Маладых у Германію адабралі і пагналі...»

Вось так усю Беларусь хацелі перат варыць у лагер смерці. Толькі замест калючых дратоў — ланцугі, «ацэп» карнікаў з усіх бакоў, набітыя людзьмі хаты, свірны, хлявы — гэта ўжо «вясковыя крэматорыі». І называлася яно не па-лагернаму, не «селекцыяй», а ўсяго толькі: «сход», «сабранне», «праверка пашпартаў»...

**Ірына Іванаўна Лапатка**. Лочын Асіпавіцкага раёна.

«...Ну, а тады ходзіць гэты немец і — на вуліцу! Гоніць на вуліцу. Усіх да адной душы на вуліцу. Ну, мы, праўда... Я дзевачку за руку, і булка хлеба ляжала на шкафчыку — я за гэту булку пад паху і на вуліцу. Мы ж думалі, што пастрояць і зноў, можа,

пусцяць.

А яны пастроілі ў рады, у тры рады, і пагналі на калхозны двор. Там зноў пастроілі ў два рады... у тры рады таксама. Усіх, усіх! Усіх павыганялі: з бані, з магазіна, з клуба — усіх, усіх. А тады ходзяць і выбіраюць. Вот паглядзіць у вочы і — за плячо ці за руку выцягне. І выцягне, у другі рад ставіць.

Дык я на дзевачку кажу:

— Налечка, бяжы да бабушкі і стой. А мы з Кацяй уцячом.

Ятроўка так называлася. І ў яе трое дзяцей. Ужо намярэнне было, што нас на Пагарэлае пагоняць, а там вялікі лес, дык я кажу:

— Мы ўцячом. Лесам будуць гнаць, дык мы ўцячом.

Ужо сяло гарыць. Дзверы ў нас адчыненыя, у хаце, дык наклалі саломы, нацягалі немцы, і ўжо з дзвярэй палае агонь. І тады яны пагналі нас. А гэтая дзевачка мая плача:

— Не хачу.

Стала ля бабы і стаіць ужо, плача. Паліцай ідзе.

— Чаго ты, дзевачка, плачаш?

— К маме хачу.

— А дзе твая мама? Ідзі к маме.

Яна прыбегла, я яе за руку, і камандуюць нам:

— Упярод!

Пагналі нас. А гэты вот стары быў, наш сусед, дык ён не можа ісці, дык яны яго палкай, палкай! Потым адна старуха была.

І тую палкай. І дзеўка, мусіць, дзевятнаццаць ці дваццаць гадоў, дык яна пад ельнікам ляжала, схавалася. Дні два там ляжала. А тады вясна халодная была, у маі, ці што. Гэта ўжо паследні год быў. Дык яны к той дзеўцы і паспіхалі ўсіх, і мы іх больш ужо не бачылі. Ну, а нам скамандавалі:

— Упярод!

А ўсіх, каго павыцягвалі з радоў,— назад у сяло. У дом іх нагналі, і ў сенцы. І яшчэ ў два дамы...

А калі вярнуліся з лесу тыя, што былі ў лесе, дык яны ўжо гарэлі. Дык яны багры бралі, яны іх тут варочалі — пазнавалі, кожны свайго.

Хавалі потым. Вот тут памятнік стаіць. Многа, многа — мусіць, дамы чатыры нагналі!..

А нас гналі на Пагарэлае спачатку, сямей дзесяць з дзецьмі. Потым прашу дзевак:

— Дзеўкі, уцячыце каторая. Парцізаны ж не ўсе прападуць, хоць скажаце, хто жывы, а хто...

Дзяўчат некалькі там ішло з намі. І ніхто, тады ніхто не ўцёк. Тады нас на Буду загналі і закрылі ў сарай. А мужчын аддзялілі і ў варыўню запёрлі. Дык мужчын там многа было, а памяшчэнне малое, дыхаць не было чым, дык яны паталок узарвалі. Ну, а нас загналі ў сарай, усе начавалі. Ну, а назаўтра выгналі, і зноў пастроілі, і зноў таксама выбіралі. Шчэ нашых сем жэншчын з дзецьмі выбралі.

П ы т а н н е: — Што-небудзь пыталіся ці проста так: паглядзіць і

выбірае?

— Так вот паглядзіць і за руку выцягне ці за каўнер выцягне — ужо гэта пагоняць у Лапічы. Дык многія просяцца. Тут у нас адна жэншчына была, ужо старая, дык яна кажа:

— Паночак, я ўжо старая, я не дайду ў Лапічы.

Сама ў агонь... А некаторую сілком выцягне — чорт іх ведае! Я не знаю, як яны пазнавалі...»

Куды, у якую шарэнгу прасіцца, людзі не ведаюць. І многія — самі ў тую, якую якраз асудзілі на смерць, на спальванне. А катам вунь як весела гуляць «у ката і мыш»: ну, ну, бабка, гары, калі сама просішся!..

«...Дык тых у варыўню загналі, а нас павялі ў Лапічы. Іх спачатку ў варыўню загналі. Пасля казалі, пагналі ў Палядкі і там спалілі. Сем жэншчын з дзецьмі. А адна дзевачка бальшая была і пры ёй чэцвера меншых, дык яна сама просіцца, кажа:

— Паночак, я не данясу. Адно пры ёй невялічкае было.

— Ну, дык станавіся тут! І яе, тую дзевачку з дзецьмі, тожа загналі і спалілі. Не ведала і папрасілася....»

Гэта яны любілі — павесяліцца, «працуючы». У Збышыне Кіраўскага раёна забілі ўсіх, каго знайшлі, а жывымі пакінулі дзвюх старэнькіх жанчын, па семдзесят гадоў, а адна яшчэ і сляпая была: «Няхай жывуць — Савецкаму Саюзу на расплод будзе!..»

Гэта іх так ап'яняла — улада над жыццём і смерцю людзей, цэлых сем'яў, цэлых вёсак. Шурупчыкі велізарнай нялюдскай машыны, механічныя выканаўцы волі “вышэйшых” тут яны цешылі сваю душу ўладай над іншымі — адчувалі сябе «арыйскімі багамі», што самі сабе выбіраюць чалавечыя ахвяры.

Іншы раён, іншая вёска, іншы расказ...

«...Сядзелі мы ў той хаце, мо два часы, а мо і больш. У крайняй хаце. Адале ўжо два ідуць. Адзін перагаворшчык, а другі так высокі немец. Накульгваў на правую нагу. Палка ў яго была. Дзяржыць палку гэтую разінавую... Ну, знаеце... Як адчынілі хату — сталі ў дзвярах і пазіраюць. Паглядзелі, паглядзелі, сем'і паліцэйскіх адразу вычыталі і вывелі. Іхняе родства. А нам ужо ўсім, значыць, паложана пагібаць... Ну, тамака ў нас быў па тыдню стараста. Адзін чалавек быў стараста, другі быў стараста, трэці... І тут ён падышоў і стаў прасіцца:

— Пусціце мяне з сям'ёю...

Ён як быццам бы ім служыў. Можа б, яны яго і пусцілі, але тут жонка падыходзіць і гаворыць:

— Паночкі, пусціце, нас партызаны сёння абідзелі — кабанчыка забралі...

Немец гаворыць:

— Дык што — ты партызанам кабана аддала!

Палкай выцяў па галаве, у першую вочарадзь забралі і павялі іх... Павялі,

а куды павялі — ніхто ж не ведае. Падыходзіць другі чалавек:

— Пусціце мяне. Камендант — мой сродсценнік. У Старобіне.

Доўга ён ім нешта стаў гаварыць, а ім цярпення няма — ім ужо ахвота біць, а ён усё гаворыць. Зноў яны палкаю па галаве, і гэтага забралі, і сям'ю, і тожа павялі...

А мая дзевачка стаіць старэйшая... У мяне чэцвера было дзяцей, а бярэменная я ўжо была пятым. Падбягае яна:

— Папачка, усіх людзей вядуць, усе просяцца, а ты не просішся. Хоць бы ты, папка, папрасіўся! Гэтая ж во хата будзе гарэць — будуць нашы вочкі выскакваць... А ты, папачка, нікога не просіш...

А бацька гаворыць:

— Дочка, акціву свайму во як далі, а нам ужо і бог вялеў пагібаць.

— Ну, папачка, ну, папрасіся!..

І да гэтага перагаворшчыка... Яна яшчэ і ў школу не хадзіла, малая была.

А гэты перагаворшчык паглядзіць, паглядзіць па людзях...

А мая ўсё просіцца:

— Папачка, папрасіся!..

Праўда, муж падышоў ды гаворыць:

— Гаспадзін перагаворшчык, я хачу што-та вас папытаць...

Мільм мае, я ж гавару — ці гэта судзьба такая, ці што...

— Я, — гаворыць мой,— чалавек не здзешні, наезджы, спецыяліст па найму, кузнец. Я ж калі жыць буду, то пользу якую дам, што вам за інтарэс, калі вы мяне заб'еце... .

Ён што-та пагергеча таму немцу, а той зіркнуў вачыма і гаворыць:

— А многа ў цябе кіндэраў?

Мой кажа:

— Во стаяць.

Ну, гаворыць:

— Кузнец, усё роўна ты ж адзін дзень толькі пажывеш.

А мой кажа:

— Старая пасловіца — як топіцца, то і за брытву хопіцца. Добра і пяць секунд пажыць.

То, мае мільм, біў людзей, вішчаў, а то, бачыце, як уціх?..

— Ну,— кажа,— бяры сваю жонку, дзяцей і ідзі!

Ці то судьба такая, ці то шчаслівы хто з дзяцей?..

Калі мы ішлі з хаты, дык ён кажа:

— У іх многа кіндэраў — яго ў абору. Многа дзяцей — жалка выпусціць...»

**Марыя Яфімаўна Маголіна**, ад якой мы, у вёсцы Загліннае Салігорскага раёна, пачулі гэтую гісторыю, усё ж, схітрыўшы назаўтра, уратавала сваіх дзяцей. «У абору» яны не трапілі, а пасля вайны і яшчэ пяцярых нарадзіла: яна — і цяпер яшчэ жанчына маладжавая — Маці-гераіня.

Але, бачыце, як той «з палкай» разважае і адчувае: якраз як і трэба фашысту. Не дзяцей пашкадуе, а пашкадуе, што іх «замнога» ў гэтага каваля, якога ён хацеў адпусціць, па

той прычыне, што, можа, спатрэбяцца яго рукі. А ў чалавека, аказ-ваецца, вунь колькі малых! «Біялагічны патэнцыял»... Не, «у абору», у агонь іх!..

Што там казаць пра каваля, яны вунь і старасту, які ім служыў, і таго забіваюць заадно з усёй вёскай — па той жа прычыне: дзяцей замнога!

Гэта ўжо ў іншым месцы — у Разліцці Барысаўскага раёна, пра што расказала **Анастасся Дзмітраўна Шыла**.

«...А старшына наш... ці стараста,— чорт яго ведае,— дык гэты хацеў з імі ехаць. А яны плюнулі на яго і не ўзялі: дзяцей многа... Старасту першага і забілі, Лявона...»

Калі і былі пачуцці ў гэтых фашысцкіх «звышжывёлін», дык «пачуцці наадварот».

Але наступае час расплаты і тады...

На Віцебшчыне было: яшчэ адзін такі — таксама падзяліў вёску на «патрэбных рэйху» і «непатрэбных», на жывых і мёртвых і вёз ужо на машынах «нямецкіх рабоў», а тут спынілася калона, крык: «Партызаны!» І ззаду і спераду. Дык гэты «бог» — брык і ляжыць! Вываліўся з кабіны, самлеў. Адразу забыўся, што ён нейкі там «звыш», што смерць — яго «добрая сяброўка». Бо гэта ўжо не чужая смерць, а свая!..

Да іншых расплата прыйшла пазней. Усялякія словы пра «загады зверху» і сваю нязначнасць, мізэрнасць, «салдацкі абавязак» — таксама былі потым. А пакуль што:

«...А тут ужо ў гэтую дзярэўню немцы заходзяць. Мы ідзём дамоў, аж тут ужо па дварах ходзяць немцы. Толькі я прыбегла дамоў, аж гоняць ужо на сабранне. Гоняць на сабранне, пытаюцца, колькі гадоў. У мяне мачыха была. Яна кажа:

— Яна яшчэ малая дзяўчына... Выганяюць з хаты ўсіх на сабранне. Падышлі мы туды ўжо з сяла...

Адзін быў картавы малец. І ён галосіць, і бабы галосяць усе, дык ён ругаецца, камень схапіў і на гэтых, на паліцаяў.

А паліцай адзін:

— Во — дурны, а хоча жыць!..

І матам на яго. Па-руску, і чыста гаворыць.

Падагналі нас у канец дзярэўні і хацелі кідаць у яму. Яма была сілосная. Але яны гавораць:

— Пагонім далей.

І пагналі нас да рэчкі, і пачалі адбіраць. Каторых у Германію, а каторых...

Адабралі нас некалькі чалавек, а тых пагналі.біць ужо...

Нас, маладых ужо, пагналі ў дзярэўню назад. Ходзяць усе, разгаварваюць па-руску, па-нямецку. Мы стаім на дварэ там на адным. А там дзве бабы схаваліся... гэта баба і два пацаны. Праўда, яны... Немцы чыстыя. Не разгаварваюць. Там разгаварваюць далей, а яны па-нямецку. Вот. я тое слова помню

цяпер, як я чула:

— Ком раус! Ком раус!..

А яны сядзяць пад краваццю, гэтыя бабы. А яны іх выцягваюць. З дзецьмі: два мальчыкі і дзве жэншчыны. Выцягваюць яны іх вон, і мы стаім гэта на дварэ. Немцы стаяць каля нас, каб мы не паўцякалі. Ах!.. Тады пагналі іх на двор, і толькі чуем — пок! А гэтыя дзеці: «Ай-яй-яй!..» Пок! — другі раз, і гэтыя зноў гвалту. І чатыры разы выстралілі, і забілі іх. Забілі іх, а нас, усю маладзёж, якую аставілі, пагналі...»

Расказвала **Марыя Фёдараўна Верхаводка.** Іканы Барысаўскага раёна.

У той жа вёсцы — **Цімафей Мікітавіч Тарасевіч**:

«...Мая хата была каля могілак. Жану з дзяцьмі забралі і пабілі там. А я ў падводы паехаў. Прыехаў дамоў, а тут ужо ўсе пабітыя. Калі забівалі, я тут не быў. Нас было чалавек пятнаццаць у падводах. Прыехалі, а ўвесь груд гэты — пабітыя і спаленыя... Усё чыста пабілі, нікога не засталося. Дзе ж людзі? Пайшлі шукаць. Аж яны так во, як гарэлі, налакціўшыся, то воласы абгарвалі, а галовы, як капуста, белыя качаны.

Сот каля сямі пабілі. Тут яшчэ немцы дарогу расчышчалі, што партызаны лесам завалілі,— узялі з Гарэлага пяцьдзесят мужчын, дык потым і іх застрэлілі,— яны ішлі дамоў і зайшлі сюды, дык яны іх пераняли і пабілі. Каторыя ўцякалі, дык і на полі пабілі. Пасля знаходзілі па кустах.

Патом ехалі з Плешчаніц, чужыя падводчыкі, і тых пераняли тут, і тых сюды, пабілі...»

Гэта ўжо так уцягнуліся ў справу, што і пра «селекцыю» забыліся.

Так і пайшлі б. Па ўсёй Зямлі...

## НЕСХАДЗІМАЕ ГОРА

Ішлі дажджы. У канторы саўгаса «Ухвала» Крупскага раёна нам сказалі, што, пакуль не падсохне, у вёску Узнаж даехаць нельга. Але мы не маглі адмовіцца ад гэтага маршруту. Пакладіся на вопыт Сашы Пяхоты, які ўжо каля двух тыдняў вазіў нас на аблвыканкомаўскім «газіку», пера-адольваючы цяжкасці дзе спрытам, а дзе зразумелым у партызанскага сына энтузіязмам.

Як толькі мы збочылі з гравійкі ды пачалі заглыбляцца ў лес, стала ясна, што людзі нас папярэджвалі нездарма. На перціым кіламетры лясной дарогі стаяў скасабочаны трактар, перакошанай трубою клічучы на падмогу. Безнадзейна ўграз транспарт з хлебам. Буханкі, прыкрытыя брызентам, сцерагла маладая, румяная магазіншчыца.

— Да Узнажы далёка?

— Ой, на тым канцы свету! Не даедзеце, дзядзечкі! Вяртайцеся лепш!..

А дождж ліў і ліў, роўны, ціхі, спорны, як увосень. Нават калі ненадоўга праяснялася і праз кудзелю аблокаў праглядвала сонца, з неба ўсё роўна капала.

Мінулі, аб ехаўшы загуменнем, вялікую, добра забудаваную вёску са свойскаю назваю Гумны. А далей зноў пайшлі лясы, балоты, грэблі, гразкія брады. І нарэшце — паляна, як шматфарбная даматканая посцілка, — зялёная цімафееўка з рудымі плямамі састарэлага шчавука. На паляне — Узнаж. Вёска шэрая, благавата забудаваная, як на тутэйшы лясны край, дзе будаўнічы матэрыял пад рукамі. Можа, што дождж, але Узнаж здалася нам не падобнаю на іншыя аднаўленыя вёскі, дзе звычайна людзі стараюцца будавацца з размахам, і гэтым сцвярджаючы сваю жывучасць. Не было тут зялёнай абсады, вуліца выглядала не ў меру шырокай і пустой.

У трэцім ад канца двары чуўся рух: гэта чалавек, да якога мы прыехалі, **Пётра Сакавец,** ставіў тэлевізій-ную антэну. Дапамагалі яму два хлопцы ў куртках-балоннях. Мы папрасілі Пятра Уладзіміравіча ўлучыць і нам крыху часу.

«...Гэта было ў сорак другім годзе. Увосень. Ужо картошку капалі...

Ну, я быў у Лажках. Пасвіў там. Прыйшоў дамоў. А тут былі партызаны, у нас стаялі. Сталі ехаць парты-заны па сяле і крычаць: «Немцы едуць, уцякайце!» Я тады пабег сюды, у дзярэўню, у Лажкі дзярэўню...»

Пётра Сакавец расказвае пра ўцёкі, што часта паўтараліся. Аказваецца, бяда здарылася не тады, не той раз. Мужчыны з Узнажы часта ўцякалі вось так па сігналу партызан або па трывозе, якую паднімалі самі жыхары. Уцякалі ў суседнюю вёску, што яшчэ глыбей у лесе. І памяць расказчыка, тады яшчэ пастушка, усе тыя страхі і ўцёкі збіла ў адно. «Той раз» вылучыўся

толькі варожым падманам. А падман у народзе помняць асабліва.

«...Яны тады сабралі не ўсіх людзей, — прыгадвае расказчык. — Яны сказалі, немцы: «Каго дзе ў лесе зловім — будзем расстрэльваць, а калі дома, дык не». Бабы пайшлі, сваіх мужыкоў паззывалі ўсіх. Тады яны ізноў ноччу наехалі. Іх у сарай зачынілі і давай расстрэльваць. Ну вот...»

«Ну вот»... Часта мы чулі яго ад мужчын, ад жанчын — там, дзе чалавечай мовы не хапала, каб выказаць бездань жаху.

Пятрова жонка **Ганна Яфімаўна** родам з тых Лажкоў, куды пастушок уцякаў хавацца. Яна належыць да таго тыпу вясковых жанчын, у якіх гады і нягоды не разбураюць здаровага хараства. Маршчыны, што леглі на яе твары, як бы падсвечаным густымі валасамі, толькі прыбавілі яму больш выразнасці. Яна на-многа старэйшая за мужа, але з выгляду здаецца нават маладзейшая. І памяць на падзеі ў яе свяжэйшая, і расказ жывейшы, хоць Ганну Яфімаўну таксама не назавеш лішне гаваркою.

«...І прышлі мы ў гэты дзень, калі немцы Узнаж ацапілі, вот у гэта балота, пад самы бераг, у журавіны. Утраёх: дзве дзеўкі і жанчына. З Лажкоў мы, зусім з другое дзярэўні.

Слышым — ужо немцы гіргочуць на беразе. Пайшлі ўжо яны па лесе кругом. А ў лесе зямлянкі былі тут во, на берагу. Там сядзелі з дзецьмі. Узнацкія. Гэты самы... (Паказвае на мужа.) Бацька яго — дзевяць дзяцей было, і ўсіх прывёў у зямлянку. Вот мы слышым — немцы гіргочуць. Мы тады — ходу дамоў.

Толькі мы прыбеглі туды дамоў... З кілометр мы беглі туды па балоце. І так гэтыя пацаны сыплюць ужо за намі, бягуць. Вот гэты Пеця, Ганна і там была яшчэ адна... Кажуць:

— Ужо немцы ацапілі Узнаж, і не знаем што. Будуць біць...

Гэта было вечарам, часоў каля пяці. Патом ноч пераначавалі, чуем урана — крык тут, каровы равуць. Баба адна была, Макарыха — крычыць нешта... Ну, што ж такое? Трэба ж падпаўзці людзям, паслухаць. Мужчыны, старэйшыя ў Лажках, папаўзлі па балоце, па багульніку. Паслухалі. Кажуць:

— Расстрэльваюць!

Крык, плач — усё кіпіць там. Падаждалі мы гэты дзень, суткі гэтыя. Усё гэта ўспакоілася — нада ж схадзіць, падгледзець, што там такое. Падышлі мужчыны сюды, паглядзелі. Ціха, толькі лётаюць чорныя гракі стадам, крычаць... Нікога нет. І каровы ходзяць яшчэ. Некалькі кароў...

Вот. І ўжо тады мальчуганы тыя былі дома, пабеглі сюды паглядзець: ужо нікога не было. Выехалі ўсе. Валяліся тут яшчэ... Партызан убіты быў, каля зямлянкі ляжаў, казалі.

Патом к гэтай магіле падышлі. Пуня тут была калхозная. Яны іх зачынялі... К яме гэтай вялі... Да ямы вялі,

раздзявалі, голых, бедных!.. І кажушкі ляжаць во. Хто ў чым хадзіў, тое валяецца. У яму лажылі і ўбівалі. І нямножачка зямлёй прыкідалі. Зямля гэтая раскяпілася.

Вот лічна быў мой брат, прыходзіў глядзець сюды. Дык кажа:

— Лучыначкай пастукаеш — сантыметры на два зямлі толькі было на іх. Прама яшчэ шавялілася гэтая зямля...

Гэта на другі дзень толькі хадзілі яны. Нікога не было. Каты толькі каўкаюць, кароў некалькі ха-дзіла...

А потым праз некалькі дзён... Запалілі гэтую дзярэўню. Яна гарэла... А яго хата — вось гэтага (паказвае на мужа), яго бацькі хата, дык тая стаяла. Яго бацькі брат быў у Неманіцы, ён пачуў і падышоў сюды, калі дзярэўню не палілі яшчэ. І кажа:

— Давай гэтага мальца хату на бярвенне раскідаем. Можа, калі што каму будзе.

Узялі яе раскідалі, дык яна ў бярвенні доўга валялася, пакуль гэты хлопец — ён жа малы быў яшчэ тады — вырас, і ўжо... (смяецца) пажаніліся мы. Аж у пяцідзесятым годзе злажылі гэтае гнільё, і сенечкі нейкія трохі новыя прымазалі, і сядзім. А цяпер во новую строім.

Пытанне: — Скажыце, колькі тут забілі людзей!

— Трыста шэсцьдзесят душ... Тут было... Хлопцы былі, хлопцы! А дзеўкі!.. Я яшчэ сама што паплакала... Хлопцы ж былі такія!.. Нашы яшчэ... А гэта што ўжо мне? (Паказвае на мужа.) На восем гадоў малодшы. Ну, нічога. Пака капаемся. Такое ўжо жызні харошай то няма, але самі сабою добра жывем...»

Карнікі хацелі тут, у Узнажы, зрабіць уражанне, што знішчаюць толькі тых, хто звязаны з партызанамі. «Звязанымі» аказаліся ўсе, а найбольш, вядома, мужчыны.

У пасёлку Ухвала засталіся сведкі таго, больш выразнага, дзялення на «звязаных» і «не звязаных».

**Марыя Лукашэвіч,** загадчыца сталоўкі на мясцовым торфазаводзе, расказаіла нам, што яе, тады падлетка, карнікі таксама дапытвалі як сувязную партызан. Потым яны выгналі ўсіх жыхароў Ухвалы на пустыр за сялом і ганялі шарэнга за шарэнгай — пратоптвалі шлях для сябе, ачышчалі ад партызанскіх мін. Выбуху не было. Тады загадалі ўсім сесці на кукішкі, збіді аднаго старога, які ўжо не мог так сядзець, і пачалі выбіраць «вінаватых», «звязаных».

«...У маёй дваюраднай сястры, — гаворыць Марыя Віктараўна, — быў муж камуніст, нават не муж, а брат мужа, не ён сам, — яны адразу за яго і павялі. А хлопчык быў Віця, адзінаццаць гадоў. Дзед і бабуля кажуць:

— Хадзі к нам.

А той, бацька, гаворыць:

— Не. Дзе я, там і ён.

Так вось і пабралі людзей, вельмі нявінных людзей, і паставілі іх на

левую сторану. А нам сказалі разыходзіцца.

Калі мы адыходзілі, усе яны крычалі: «Прашчайце! Прашчайце!»

Ну, мы ішлі без памяці...

...Там было сто пяцьдзесят чалавек. Яма была глыбокая — калодзеж стары, без вады...»

...Над Мсціжам свяціла сонца. Шчодрае летняе сонца адбівалася ад пабеленых парканаў і сцен, ад блакітных з жоўтымі каёмкамі аканіц, падобных на крыллі дзівосных матылёў.

Мсціж — гэта зборная назва дзвюх вёсак на Барысаўшчыне, проста Мсціж і Мсціж-Валокі, з якіх утварылася своеасаблівае мястэчка.

На развілцы дарог, каля будынка сельсавета, узвышаецца абеліск — помнік на брацкай магіле мсціжаўскіх мужчын, расстраляных у кастрычніку 1942 года.

Пра гэта нам перш за ўсё расказаў дзед **Аляксандр Лісічонак.** Яму ўдалося ў той страшны дзень загадзя ўцячы ў лес. Памяць у Аляксандра Феліксавіча прытупляецца, але неяк разумна і паслядоўна, як пад-сыхае голле ў старога дуба — абломліваюцца драбнейшыя галінкі, а стрыжань цвярдзее.

«...Тут было так. З-за фронту ехаў партызанскі атрад. І вот яны распалажыліся тут начаваць, у нашай дзярэўні. Гэта было дзела ў суботу вечарам. У мяне якраз засталіся пераначаваць дзве партызанкі. Яны хазяйку папрасілі, каб яна ім прыгатовіла. «Мы заўтра ў сем часоў паедзем». Але былі яны назаўтра — ужо і абед прайшоў.

У меня сын быў у атрадзе і зяць быў у атрадзе. А брат мой жыў на другой старане. У яго хаце партызаны ўліваліся ў гэты самы атрад. Прысягу прымалі. Мясцовыя і немясцовыя. Якраз гэта дзела было ўжо ў абед.

А як пайшлі яны ад нас, — на Мсціж напалі немцы.

Мой яшчэ адзін сын, было яму трынаццаць лет толькі... Ён цяпер трактарыстам работаець. Ён мне расказваў, што немцы ганялі тады ўсіх мужчын, на вуліцы пасадзілі іх і — каб ніхто дажа нічым не павярнуў. Сядзелі. А ў аднаго рабёнак быў маленькі, ён там з рабёнкам што-та, значыць, дык яго адразу і забілі. За тое, што пашавяліўся. А рабёнка бросілі...

Ну, а потым усіх мужчын пагналі туды, дзе ў нас ларок стаяў, дзе цяпер наша масцярская, швейная там, дапожная. У гэты ларок набілі ўсіх людзей — жывых яшчэ. А каторыя не памесціліся — яшчэ ў сельса-вет, дзе цяпер помнік стаіць. Туды загналі ў сарай, астатніх мужчын.

Тут хлебапякарня была, дык з таго ларка людзей па аднаму выводзілі і стралялі ў тым склепе.

А тых запалілі...»

Потым мы слухалі непасрэдных сведак трагедыі, мсціжаўскіх жанчын, — усхваляваныя, часам падобныя на галашэнні жаночыя ўспаміны.

Бабулі і цёткі сабраліся на лаўцы каля хаты. Сышліся, нібы на памінкі ці на жалобны сход, каб яшчэ раз перабраць супольна ўсе падзеі таго чорнага дня. Спачатку гаварыла адна Ядвіга Глот: «...У нядзелю рана хлеб партызанам у нас збіралі. А потым я паснедала і пайшла на поле з маёй большай. Каноплі пайшла я слаць. І тады мы сцелем і бачым: ідуць два партызаны. Ішлі ў сяло... А потым дачка кажа:

— Мамо, глянь, чаго гэта людзі так бягуць.

Калі я глядзь — аж бягуць там па агародах, па загуменню. Народ гэты ўвесь.

— Ай, — кажу я, — дочка, там ужо ў нас, мусіць, немцы ці не ёсць.

Мы кінулі тую пяньку і пабеглі.

І беглі мы. Сабака быў каля мяне. Бяжым, аж во там недалёка ўжо цэп ідзёць. І людзі ўжо валяцца. Ужо б'юць людзей. Я кажу:

— Ну, дочка, заб'юць нас.

А ў мяне трое дзяцей засталося дома. Хлопец і дзве дзевачкі.

— І дзяцей паб'юць, і нас паб'юць тутака...

Але, праўда, не. Толькі сабаку майго забілі каля нас. Я кажу:

— Ну, сабаку забілі, і нае заб'юць.

Не, нас прапусцілі — якраз во тут каля току. Я на тым баку жыла, там мая хата была, дзе цяпер агарод. Я прыбягаю на двор, ажно мае дзеці пад плотам сядзяць. Тады я кажу:

— А бацька дзе?

Калі я з дому ішла, дык мой брат з ім сядзеў і яго сястра.

— Яны, — кажуць, — пабеглі ў лес. — Дзеці мае так гавораць.

Я ў хату ўвайшла і сяджу ўжо з дзяцьмі. Адзін прыходзіць. Аўтамат наставіў.

—Дзе муж? А я кажу:

—Там, дзе і вы.

Так я яму кажу. А ён:

— А чаму хлопчыку толькі год? (Малы быў у мяне.) Чаму кіндэр малы?

А я кажу:

— Што, толькі з мужам можна, а без мужа не?

А ён:

— О-о, матка!

Ну, і ён тады ў хату зайшоў. Абышоў, абышоў, а та-ды кажа: «Воды!» А я думала, што «вон!». Я тады хапаю дзяцей, выходжу вон, а ён кажа:

— Не, матка, воды дайце, рэнкі мыць.

Ну, я тады вады ў таз наліла, палаценца павесіла. Ён рукі памыў. І тады вядзе мяне ў другую палавіну, за перабойку, каб я кравацъ паслала. О, халера! Яшчэ чаго!.. Аж гэта яны раненага прынеслі ў хату. А гэта ўрач, мусіць, быў. Бо ён жа перавязку яму робіў. Таму немцу. Тады я яму паслала. Праўда, ён сказаў прынясць усё чыстае, пакрышку з кравацi, толькі просціну я пакінула. Яны палажылі, перавязалі. І сяйчас яго панеслі на ношах апяць...

Ну, а я віжу — гарыць ужо Андрэеў ток. А тады да-вай ужо з хаты

выносіць — караўкі якія, адзежа. Сюды — у сад.

А тады ўжо мяне па дзяцей не пускаюць у хату. Я стала прасіцца, што ў мяне ж дзеці малыя ў хаце. Яны мяне пусцілі. Я гэтых траіх дзяцей узяла і выйшла на вуліцу.

Ну, тут мужчын у адзін рад паставілі, а баб — у другі. Мужчын наперадзе пагналі, а нас ззаду. Некаторыя пахаваліся, а мы...

Мужчын пагналі ў адзін бок, а нас у магазін заперлі. І сядзелі мы там ад нядзелі да серады. А ў сераду ўжо рана самалёт прыляцеў і нас ужо выпусціў. Прыйшлі дамоў.

Ну, што прыйшлі — калі ўжо ўсё пабіта, папалена...

Пытанне: — А як выйшлі, дык што вы тады бачылі?

— Ай-ай-ай! Як мы толькі выйшлі, дык адзін цераз аднаго ляцелі. Самі не зналі, куды нам бегчы. Вы знаеце — сядзелі ад нядзелі да серады. Не пілі і не елі. А дзеці малыя. Я ж не ведаю — год майму мальцу быў ці яшчэ не. Ён цяперака жыве ў Пінску, мой сын.

Пытанне: — А потым вы пайшлі на тое месца, дзе мужчын палілі?

— Даставалі мы іх. Хто каго пазнае, той таго і да- стане. Мы свайго брата дасталі толькі во так — ад паясніцы па калені...»

Пабіты мужчыны, гаспадары, бацькі, браты, мужы, сыны...

Гавораць пра гэта, падключыўшыся да гутаркі, Кацярына Глот і Барбара Барбуха. Першая — стрымана-разважлівая, а другая — ціхая, задумлівая па натуры, якая сядзела, як бы нічога не чуючы, з апушчанай і падпёртай далонямі галавою. Цяпер яны гавораць ледзь не разам, дапаўняючы адна другую. Гавораць пра тое, як тады было з мужчынамі.

«...Як іх увагналі, — гаворыць **Кацярына Глот,** — то мы ж не замецілі, як увагналі...

У нядзелю нас запёрлі, а ў панядзелак прыходзіць туды немец і перагаворшчык, і вот перагаворшчык гаворыць:

— Скажыце, дзе якія партызанскія сем'і? Ну, усе маўчаць.

— Хто скажа, таго мы пусцім дамоў. Не будзе сядзець. Будзець жывы.

Хто ж гэта, кажаце, выдасць?..

Чаму? Аўдоціна Манька і яшчэ адна пайшлі паказваць гэтых партызанскіх сем'яў. Перш-наперш прывялі к маёй сястры двор.

— Вот, — кажуць, — яе мужык і тры сыны ў партызанах...

Ну і што... Там былі лужыны крові... Яе збілі. А пасля яе прывялі і партызанку збітую прывялі з ёю. Маю сястру як пырнулі, дык яна і паляцела. А потым падышла ка мне і кажа:

— Не прызнавайся ж, што ты мая сястра, бо і мяне заб'юць, і цябе заб'юць.

Ну, дык яна так у куточку сядзела, а я ў другім во з дзецьмі сядзела. І партызанка ля яе сядзела...

А потым не забілі, не вывелі яе, а разам нас усіх выпусцілі. Ну што ж,

яна прыйшла і, мусіць, месяцы два ці тры пабыла ды і памерла. Збілі саўсем...»

«...Яны б нас спалілі, — гаворыць **Барбара Барбуха,** — але вот рана асвабадзілі. Самалёт прыехаў, у сераду прыляцеў, спусціўся во каля магазіна, дзе прадуктовы. Гэта нямецкі быў самалёт. Вылезлі два чалавекі і ідуць сюды. Прыйшлі, і стаў адзін расказваць. Гэты гаворыць, немец, а перагаворшчык будзе гаварыць:

— Вот благадарыце во гэтаму начальніку: ён вас асвабаджае. А так бы вас сягоння ўжо не было.

А старушка адна, старэнькая, вось гэтай жанчыны свякроў (паказвае), як ён сказаў спасібаваць, дык яна мах на калені ды хацела яму руку, відаць, пацалаваць — бог яе ведае, што гэтай старой... Мы ўжо свету не відзелі. А ён ёй... як дзяржаў такую палку, дык ён гэтай старой — палкай. Гэты асвабадзіцель. Тады яна, гэтая баба, чуць паднялася, старая. І людзі беглі цераз яе. Божа, божа!..»

**Марта Лашкевіч,** бабуля гадоў пад восемдзесят, прыгадвае перадсмяротны час свайго мужа.

«...Ён ішоў глядзець коней, і з хлопчыкам. Сына майго таго нету, у армію пайшоў і не вярнуўся. Бацька кажа:

— Ты малы, а я стары, нас з табой чапаць не будуць, давай пойдзем каня прывядзём.

А яны ўжо акружылі дзярэўню. А тады кажа:

— Не, сынок, мы ўжо не пройдзем, відаць, паглядзі, як ужо нас акружылі.

А хлопчык во трошкі большы за гэтую дзевачку быў.

— Вернемся, — кажа бацька, — дамоў. А тады да суседа зайшлі, і кажа:

— Знаеце, мусіць, ужо мы пагібнем цяпер. Нас акружылі ў кружок.

А сяйчас уваходзіць немец і кажа:

— Вон!

Гэтых мужчын. Там мужчын са трох сабралася. Мужчын гэтых на вуліцу. Як паставілі яны іх, дык бацька гэтаму хлопчыку кажа:

— Ідзі ты, сынок, дамоў, ідзі ў хату. Мяне, — кажа, — заб'юць.

А гэты хлопчык яшчэ пабег аж вунь за сяло, а потым ён вярнуўся і папаў у гэты магазін. Гэта ўжо з намі. І там сядзела пяцёра дзяцей, і яшчэ гэта мая залвіца. І гэта ўжо нас выпусцілі.

А муж мой у агонь папаў якраз. Часць іх пабілі, а часць спалілі...»

Такіх вёсак, дзе карнікі знішчалі *толькі* мужчын, вельмі няшмат сустрэлася нам у тых раёнах, дзе мы пабывалі. Звычайна забівалі спачатку мужчын, а следам за імі ўсё астатняе насельніцтва. Але былі і іншыя «варыянты».

У вёсцы Осава на Клічаўшчыне жывуць **Анастасся Змітраўна** і **Мікалай Фядосавіч Галацэвічы.** Ён — ціхі, руплівы кравец, яна — растаропная і энергічная гаспадыня ў хаце. Ад іх першых мы пачулі расказ пра трагедыю іх роднай вёскі Люцін, з

якое яны перасяліліся сюды, у Осава, пасля вайны. Мужчына як мужчына: пачаў гаварыць як з пратакола, суха і скупа. Жонка перахапіла ініцыятыву. Сямейная пара жыве, мабыць, так дружна, што ў іх няма праблемы, каму гаварыць, каму слухаць: думаюць адно, а выказвае той, хто першы паспее.

Мы і падаём гэты сямейны расказ, як ён запісаўся: расказвалі то муж, то жонка ўперамешку.

Перабівае жонка:

— Высялілі ўсіх на выган. Усё з кварціры, хто сумеў, вынес, а хто не сумеў — не вынес.

Вот мы сядзім на выгане і глядзім. Яны очань харашыліся, на сябе глядзелі, што красіва ім ляжыць адзёжа. Так яны на сябе паглядвалі. А гаворація яны — непанятна, што яны гавораць. Во калі немец гаворыць, дык панятна, што гэта немец. А то ён не можа ні па-нямецкі, ні па-рускі.

Ну вот, мы там сядзім, думаем, што яны будуць з намі рабіць. Яны паставілі вакруг нас пулямёты ва ўсіх гэта так чатырох вуглах. І мы сядзім. Потым яны сказалі так:

— Ідзіце, жэншчыны, дамой, і дванаццацілетнія рабята. Ідзіце дамой і ганіце вашых курэй, гусей, свіней, кароў. Тады мы пусцім вашых атцоў.

Атцоў яны ўжо вакуіруюць у школу. Ну, мы і пайшлі дамой.

А яго (паказвае на мужа) пагналі ў школу.

Ну, мы, — якая там была жывёла, канешне, не жалка, хоць бы пусцілі хазяіна, — усё гэта ўзялі і пагналі. Яшчэ наша карова ўзяла ды хацела ўцячы. Мы ж ужо баяліся страху, дык мы яе не пусцілі ў лес. А загналі яе туды прама, дзе школа. Думаем, ну калі карова наша там, дык хазяіна выпусцяць.

Патом жа яны не пушчалі. Але ён сам неяк сумеў, выбраўся праз каровы.

Мы дома сядзім і глядзім, што будуць рабіць. Адзін немец зайшоў і гаворыць: «Зніміце вот гэтыя часы!» Мы ўзялі іх знялі. Не, не гаворыць, а проста паказвае. І дзецкі матрас яшчэ ляжаў на палу. Дык ён паказвае: «І ета ўбярыце». Мы і ета ўзялі і выташчылі на двор. Як выносілі, дык і маятнік і ўсё там парушылі. Некаторыя паліцэйскія падыходзілі, паварочалі іх, тыя часы, пакруцілі і бросілі, не ўзялі.

Ну, дык мы і сядзім на гэтым двары і думаем: «Ці пусцяць гэтых нашых гаспадароў, ці не». А хаты там, дзярэўню запалілі.

Патом падходзіць адзін немец, заходзіць у дом, у нас было тры сталы ў хаце, гэтыя ўсе тры сталы злажыў у кучу, чым-то абліў і запаліў. А патом выйшаў на двор, з тэй стараны такімі пулямі стрэліў і з гэтай стараны, запаліў. І дом гэты гарыць. Мы з сынам старэйшым Яўгенем — ён цяпер у Бабруйску жыве — сталі ваду насіц,ь, дык яны па нас страляць і гэтага хлопца ранілі. Ён упаў. Ну, а я

перастала ўжо насіць, залівацъ дом, як гарэў.

Мужчын яны ўвагналі ў школу. Ну, і там ужо іх не стралялі, а запалілі школу, і ў школе — Значыць, прыехалі, — пачынае м у ж, — дзярэўню ацапілі і заходзяць у каждую хату і сяйчас жа і паляць... яны ўсе гарэлі. Каторыя ў вокны ўдзіралі, яны ўсех стралялі. Школа ад нас з паўкіламетра...

М у ж:

— Ну, загналі нас, а патом жанчын дамоў адправілі. Загналі, кругом ацапілі, і стаім там, на замок закрылі. А нас, маладзейшых, — на двор, кароў жа трэба загнаць. Вось нас, маладзейшых, і выбралі. Мы падышлі к падводчыку і пытаем:

— Што яны будуць дзелаць? Кажуць:

— Нічога мы не знаем, ганіце кароў, а самі ў лес уцякайце.

Ну, мы кароў пад лес падагналі і бегчы, а яны па нас з аўтаматаў. Але кароў столькі — дык яны высока. А мы пасагнуліся — і тут лес радам...

Пытанне: — А вы, жанчыны, потым прыйшлі на тое месца?

Жонка:

— Ну, канешне. Я думаю: «Можа, дзе ён гарыць?» Я ж не знала. Можа, дзе ўцякаў, можа, дзе гарыць.

Так, адцягвала я некаторых мужчын. Некаторыя гарацъ, ляжаць людзі, дык я за яго, рыззё гэтае раскіну ды ташчу яго, каб не згарэла цела. Пахараніць хоць бы.

Не засталося ніводнага, каб жывы, семдзесят шэсць чалавек згарэла...

У Люціне жанчыны сышліся ў хату да настаўніцы-пенсіянеркі Марыі Аляксандраўны Пашкевіч. Было якраз свята, зручны дзень для суседскіх адведкаў. Спачатку, відаць, суседак вяла сюды звычайная ў вёсках цікаўнасць: даведацца, што за госці прыехалі на машыне да старой настаўніцы. Пераступалі парог вясёлымі, віталіся, жартуючы, але, уцяміўшы, пра што тут ідзе гаворка, спахмурнелыя, заставаліся ў хаце надоўга.

Зайшлі да настаўніцы Марыя Ананіч, Вольга Максімчык, Аляксандра Тарэлка — жанчыны сярэдніх га-доў. Прыйшла і васьмідзесяцігадовая Вольга Яўменаўна Галацэвіч з пучком зёлак і траў у спрацаваных старэчых руках. Было Купалле, спрадвечнае свята сонца, росквіту жыцця, свята кветкі шчасця...

Спачатку выгаварыла свой боль гаспадыня, потым далучаліся адна за другою суседкі. У канцы, расхваляваныя, гаварылі ўсе разам: жалобнае і страшнае жаночае галашэнне па мужчынах — бацьках, мужах, братах, сынах...

**Марыя Аляксандраўна Пашкевіч.**

«...Я працавала тут і да вайны. У мяне была кватэра ў вёсцы, сельсавет аплачваў, дваццаць пяць рублёў. У мяне трое дзяцей: сын дваццаць сёмага года (вось у гэтым годзе пойдзе на пенсію з арміі), дачка дваццаць

восьмага года і яшчэ дачка трыццаць сёмага года. Я ўдавою засталася з 1937 года. Муж мой... язва жалудка ў яго была. Аперыравалі яго ў Рагачове два разы — памёр. Прышлося самой выхоўваць дзяцей. Пераехала ў Люцін.

І чуем ужо — сёла немцы жгуць: тут Орліны, ад-сюль кіламетраў пяць. І яшчэ, за ракою. А дырэктар школы гаворыць:

— Я, вераятна, уеду к мацеры жыць.

— Ну, — гавару я, — а мне ж няма куды ехаць.

І жыву я адна ў школе, ва ўсёй школе: калідор ба-а-ль-шой! І класы так. І каб сказаць, што я баялася, дык не. У мяне ніякага страху не было. Выйду калі-небудзь на вёску, гавораць: там сажглі, там сажглі...

Гэта было, мушу я вас сказаць, у 1942 годзе, відаць, у пачатку апрэля. Дзеці спалі. Я прачнулася. Гляджу ў акно — што-та ўсё на агародах. Рэчы. Ну, якія тагда былі рэчы. Цяпер, знаеце, народ добра жыве, а тады — якія там рэчы! Сундукі — вось што. Да... Так я гавару на дзяцей:

— Дзеці, што-та неспакойна ў вёсцы.

Знаеце, не ўспела я так сказаць, як чую па калідоры: шах-шах-шах! Ідуць! І якраз ідуць у мой, гэта, клас.

— Матка, цурык!

А я нават, ізвініце, не адзелася. І дзеці былі не адзеўшыся.

— Матка, цурык!

Ну, — вораг! Трэба ісці. І гляджу, ужо бегаюць яны па вёсцы, людзей гэтых усіх зганяюць. Сагналі ўсіх мужчын, сагналі ўсіх гэтых жанчын. І вось, значыць, так: паставілі мужчын на адну сторану, а жанчын — на другую.

Выходзіць адзін фашыст, малады. А я таксама з жанчынамі. Нічога не ўзяла, толькі паліто — на начную рубашку. І дзеці — толькі пальцішка, не надзявалі касцюмаў ніякіх, не ўспелі. Дзеці кажуць:

— Мамачка, ужэ канец жызні.

І вот выходзіць фашыст паміж радамі, малады, бландзін, па-рускі очань харашо разгаварвае. Гаворыць:

— За то, што, значыць, вас очэнь часта навяшчаюць партызаны і... тут румку водкі, значыць, — мы далжны сжэч вашу дзярэўню.

Ну, усе мужчыны стаяць, і жанчыны стаяць.

— Ну вот, — гаворыць той, — прэдлагаю такія вам условіі: падганіце сюды короф, — так і гаворыць, — короф, овец, свіней, значыць...

А школа была агароджана.

— Падганіце сюды, тагда мы мужчын выпусцім. Панятна?

Ну, жыць кожнаму дорага. Мужчыны асталіся, а жанчыны — бягом, пабеглі на вёску і прыгналі гэтых «короф», «овец», «свіней» — усё сюды прыгналі на школьны двор. Паставілі яны тут часавых, а гэтых усіх мужчын, семдзесят шэсць чалавек, усякі ўзрост — і сярэдні, і зусім

старыкі, загналі... гэта быў сёмы клас — вось сюды. І пад замок. А жанчынам гавораць:

— Ухадзіце!

Патом — спецыяльна ў іх гэтая карацельная камісія ці атрад — і кожную гэтую... кожную халупку бегалі і паджыгалі.

А мне ж некуды ісці. Я асталася там, ад школы метраў так пяць, каля сарая. Села я каля сарая, і дзеці каля мяне — мне ж нет куды ісці. Узяць — нічога я з сабой не ўзяла. Толькі дочка вось гэтая, дваццаць восьмага года, гаворыць:

— Мама, я збегаю. Я гавару:

— Не бяжы. Яны падумаюць, што мы імеем звязь з парцізанамі.

Бо яны ўсё гаварылі: «Пачаму матка адна жывёць? Дзе мужык?»

Але дочка гаворыць:

— Мама, я зайду, можа, схвачу хоць падушку. Яна ўзяла тры небальных падушачкі і выскачыла.

Сядзім.

Значыць, тры чалавекі па вуглах давай школу паджыгаць. Бегаюць, бегаюць! А там народ, гэта ж людзі, жывыя людзі!.. Я ж гавару, у гісторыі да сіх пор гэта не слышна, каб такое зверства. Людзі пішчаць да невазможнасці. Крык невазможны быў.

Усё ўжо вакол узялося агнём. Адзін праходзіць і гаворыць:

— Гут!

Гэта значыць — харашо. Не, не мне гаворыць, а па-між сабою. Вёска ўся як ёсць гарыць. А мы сядзім з дзецьмі тут. Гэта было зранку, можа, гадзін дзесяць-адзінаццаць. А быў яшчэ сняжок.

— Гут, гут!..

Людзі гараць, народ крычыць. Проста невазможна, ужас!..

А я сяджу... У вушах, у галаве — проста страшна, што робіцца... Бачу — адзін фашыст — конь харошы, высокі такі, але без сядла, — едзе ка мне. Дзеці... Хлопец гэты худы быў такі, тошчы, з лёгкімі ў яго нешта было блага:

— Мама, нам усё цяпер будзе.

А немец узяў гэтую падушачку і хоць бы слова мне сказаў — павярнуўся і паехаў. Давольны ўжо мае дзеці. Ад'ехаўся гэты, другі, вы знаеце, едзе... Едзе другі! Яшчэ адна, знаеце, падушка ляжыць. Другі таксама ўзяў і паехаў. А мне — каб слова сказалі...

Ну, а народ гэты крычыць усё!..

Скот яны забралі, пагналі ў Елізава. А ў вёсцы ўсякія былі, саўсем прастарэлыя, слабенькія — дык яны іх на хаду так убівалі. Многа па вёсцы ляжала.

Ну, паехалі яны. Некаторыя людзі з дзярэўні сталі прыходзіць. І гавораць:

— Ну што, Аляксандраўна?

А ўмяне ў галаве ад ужаса, значыць, трашчыць... Потым я на сына гавару:

— Сын, туалеты гэтыя асталіся. Здымай дзверы, накрывай, ізвініце, гэтыя дзіркі, і будзем тут жыць.

Ну, і пасяліліся мы там, у туалетах. Дзень сядзім... А калодзежы ўсе

атраўленыя, есці нічога нет. Дочка мая нічога і не просіць, знаеце, сядзім. Другія дык пайшлі к сваім родзічам у суседнія вёскі, а мне дык не-куды. Сяджу я. Ноч пераначавалі. Назаўтра прыйшлі дзеці ка мне, дзевачкі, хадзілі ў другі і трэці клас. Дзеці дырэктара торфзавода. Нехта ім сказаў: «Марыя Аляксандраўна ў туалеце жывёць, не знаю, што з ёю дзелаецца. Ілі яна ўжо саўсем сазнанне пацярала, ілі, гаворыць, што?» Прыходзіць дырэктарава, значыць, жана і гаворыць:

— Марыя Аляксандраўна, дакуль вы будзеце здзесь сядзець?

Прыгласіла яна к сабе, торфзавод яшчэ цэлы быў, далі яны мне куток, прынеслі есці.

А ў галаве, у вушах трэск невынасімы, невынасімы... Ну, а жывы ж чалавек — усё жыве, есці ж хочацца. Ну, і я скажу вам праўду — па сёлах хадзіла. Куды прыду — знаюць мяне... (Плача.) Людзі жалелі...»

**Марыя Ананіч.**

«... Хлопчык быў у мяне, дзесяць гадоў. Я гавару:

— Мой хлопчык, будуць зганяць, будуць нас біць. Ну, і сталі нас зганяць. Прыйшоў немец, я стала кросны ў хату ўносіць, шкада ж красён, дык я за іх. А ён мне рэвольвер у грудзі і кажа:

— Кінь!

Я кінула. Ён мяне за шыю — на выган. Гоніць і за шыю во так, паказвае, куды ісці. А дзіця маё за мяне ўзялося. Прыходзяць на выган і матка мая, і бацька, і сталі мы ўмесце. А тут ужо вот гэты пасёлачак гарыць.

Ну што, стаім мы на выгане. Падышла... Тут маладзіца адна была, падышла яна к паліцэйскаму ці к немцу, дык ён яе кіем па галаве.

Стаяў тут Даніла такі, на пасёлку жыў, дык гаворыць:

— Жанчыны, мужчыны, паб'юць нас, бо ўжо яны параз'ядаліся і паб'юць нас тут на выгане.

Усе ў плач, у плач — і бабы, і дзеці... Мы стаім ужо сваёй сямейкай: тата з мамай, я з хлопчыкам. А паліцэйскія:

— У школу, у школу! А жанчыны дамоў! — Гавораць: — Ідзіце, ганіце цяпер свае каровы і што ў вас ё, а мы мужчын паганялі і папушчаем іх дамой.

Я гавару:

— Мамачка, гані ты сваю карову, а я сваю, мо тату пусцяць.

Я пайшла сабе дамой, а яна — сабе. Ну, і потым тут стаў выстрал. Усе кажуць: «Паб'юць мужчын». Мама прыбегла, голасу нарабіла:

— Спалілі бацьку!..»

**Вольга Максімчык.**

«...Мароз, мароз быў бальшы. А нас пагналі на выган. Мужчын управа, жанчын — улева. Тут былі мужчыны нашы, каторыя былі яшчэ ў тую вайну, — панімалі па-нямецку. Пераводчык сказаў, што мужчын папалім, калі ўсё не згоняць.

Ну, што мы? Дзе гусь якая была, дзе кура — усё палавілі. У нас хаця бацькі і не было, дык хаця б самім жывымі

быць. Загналі мы і сваё. Свінню толь-кі паросную не загналі. Прышоў немец, наставіў пісталет:

— Гані!..

Мужчына адзін гаворыць:

— Дайце мне гэтых кароў, я паганю.

А мы не даем: нас саміх пастраляюць. Думаем: «Гэта на могілках будуць нас страляць». Пабралі гэтых кароў і гонімтуды. Курэй папрыносілі... Паліцэйскія адсякаюць галовы курам, а гэта ўсё на воз, на воз.

Была тут адна красівая дзяўчына, дык немец сха-піў — весці яе туды, у школу, дзе мужчыны, дзе палілі. А другі немец не даў.

А патом запалілі і школу...

І хаты згарэлі. Асталіся толькі платы...

Пайшлі мы туды — толькі косці. Чыя нага — угадвалі. Цераз нядзелю адкопвалі, знаходзілі: хто — хто...

Вот так мы і асталіся...»

**Аляксандра Тарэлка.**

«... 5-га, гэта была Паска. Нам партызаны перадалі, што гарацъ суседнія Сталяры. Ноччу прыбеглі:

— Уцякайце, будуць паліць Люцін!..

Усе ўсё павыносілі і папрыходзілі к кладбішчу, га-ворацъ:

— Нічога няма, будзем гуляць тут — Паска...

А тут едзе са Сталяроў парцізан, Багдановіч Якаў быў.

— Уцякайце, — кажа, — бо ўжо едуць, цераз рэчку перапраўляюцца, гэтыя немцы і паліцыя.

Мы прыбеглі, ужо чуем, ужо, як палкі ломяць, — страляюць!.. Мы і пабеглі. Відзім здалёк — гарыць Люцін.

Прыбеглі бабы потым. Кажуць:

— Папалілі!..

Мы ўсе парасцяраныя, плачам: «Што рабіць?» Патом хадзілі, усё раскопвалі. Нашлі: па калена так ножка беленькая, харошанькая ляжала — усё глядзелі мы. Жэншчына пазнала, па кальсонах:

— Гэта, гаворыць, мая работа, саматканая... Гэта майго, гаворыць, нага.

Ён быў брыгадзірам у калгасе, Ананіч Пракоп.

— Гэта, — гаворыць, — майго хазяіна нага...»

**Вольга Галацэвіч.**

«...І сказалі:

— Забірайце сваё хазяйства і вядзіце ў школу!..

А хазяіна ў калону і на выган. Ён і пайшоў. Пайшоў без шапкі, без нічаго, тады ж холадна было. За ім немец пайшоў.

І нявестка была з малым рабёначкам, дык і калысачку на выган узялі...

Паставілі мужчын у школу, а мне далі падводу дзяржаць. Вот я і дзяржу. Наставілі пулямёт каля мяне. Я і дзяржу каня. Патом, як толькі хто ў акно прыгне — пулямёт туда выстраліць. Чалавек і ляжа. Чалавек некалькі так было.

А я дзяржу каня. Патом ён завярнуў пулямёт сюды, дык я і пусціла. Не помню нічога ўжо...

Ну, а патом, калі ўжо ўсіх спалілі, дзярэўня згарэла, усё згарэла — нічаго-о, на бляху ўсё зрабілася. Ну што, далі мне падводу ту самую:

— Едзь на завод!

І сеў са мной пулямёт і немец. І едзем.

Дык у мяне нічога жывога не было. Толькі так зубамі калаціла. Думаю: «Усё ўжо мне будзе...»

Прыехалі к мосту, ён забраў каня і як стаў страляць нада мною, дык я не помніла, у якую сторану мне ісці. Ну, я ўсё-такі ішла, ішла, ішла і пайшла сюды на кладбішча.

Прышла. Ну што ж, я тутака? Заначавала. Я і не баялася. Я ўжо і не помню нічога: і холадна, і голадна... І я ўжо тут і была.

Назаўтра ўсталі: няма нідзе нікога і нічога, усё ўжо.

І так ужо і асталіся гараваць: і мучаліся — і па лясах, і па палях, і ўсюды. І голыя, і галодныя, і босыя, і ўсякія...»

Бабуля з зёлкамі ў руках на прыполе змоўкла. А маладзейшыя сама разгаманіліся. Не паспявалі мы разабрацца, улавіць, запісаць, хто гаворыць. Так і даём, уперамешку, як гаварылі яны, адна за адной, адна адну перабіваючы:

— ...Вельмі многа раз нападзенне было, вельмі! Яшчэ прыйшлі, абнялі ўсю дзярэўню, якія мужчыны былі, хто ў зямлянцы — усіх да аднаго забралі і зноў на завод пагналі. Такое ўжо было гора, што нікому такога гора не было...

— Хлапца тут зноў убілі, трох мужчын убілі — гэта ўсё после таго, калі ў школе папалілі...

— Вельмі нападзенне было бальшое на Люцін. Знаеце: завод і лес. Нідзе нічога не бачым. З Біркава, з завода, адусюль — ды на Люцін!.. Дзявацца не было дзе. Што прыдбаў у хату, якога каржа, драніка якога адкапаеш ды калі прыгатуеш — і то схопяць...

— Дзе ж мы гатавалі? На цяпле, на дварэ. Не было дзе ні леч, ні стаць — вельмі, вельмі нісхадзімае гора было...

— Адусюль нападзенне! Адусюль — і з завода, і з Заполля, з Біркава — адусюль. Ды ўсё ў Люцін, усё ў Люцін. Вельмі бальшое было гора...

— Першыя дні, пакуль парабілі гэтыя зямлянкі — запаляць кастры. Сцяпан гэты выйдзе: «Уставайце, фабрыка ўжо работае». Ну, шуцяць ужо, ну што ж рабіць? Есці няма чаго. Хто дзе якія стрэлкі са шчаўя, жолудзі — усё сабіраем, ядзім. Босыя, ой!..

У хату старой настаўніцы прыйшлі дзеці з букетамі кветак. Разам з жанчынамі і дзецьмі ідзём да брацкай магілы, на былое пажарышча школы, у якой да вайны вучыліся люцінскія дзеці, якая стала потым вогні-шчам жахлівай смерці іхніх бацькоў...

Ціха стаяць над магілай бярозы. Замоўклі і дзеці.

Недзе тут сядзела тады са сваімі дзецьмі настаўніца, амаль непрытомная ад жаху глядзела на страшны агонь, чула перадсмяротныя крыкі людзей...

Недзе тут праходжваўся з аўтаматам, грэўся каля агню той забойца-фашыст, дзелавіта паўтараючы:

— Гут!Гут!..

## НОВЫЯ ДЗЕЦІ

«.. .Я ў другой групе ішла. Тыя людзі — як заплакалі! Усялякімі галаскамі, як пчолы. Яны — як касанулі! Усё... Як касанулі па нас, я ўспела накланіцца, і яна скальзанула — валасы так панясло і хустку, і тутака кроў... Я ляжу жывая, і дзіця жывое. А я так жму яго ліцом, а яно крычыць. Чуствую, што задушваю, сэрца баліць. І я жывая, і дзіцё жывое. Пушчу вальней, яно закрычыць...

А яны ходзяць з пісталетамі і дабіваюць. Дайшоў да мяне, чую, што дзіця крычыць... У тое дзіця бахнуў, і мне пальцы ён прастрэліў.

І дзіця сціхла, кроў на мяне, чую, свішча на твар...»

(З расказу **Марыі Кулак.** Баравікі Слонімскага раёна.)

Страляючы ў натоўп, білі па грудзях, па галовах. Дзеці, што не на руках, ціснуліся да ног, да каленяў бацькоў. Сярод тых, хто заставаўся жывы, падалі жывыя ў груды мёртвых — найперш дзеці. Колькі іх — так і закапана жывымі, і кінута ў калодзежы, у полымя — жывымі!..

«...Мужчына адзін з сяла падыходзіць і кажа:

— Хто жывы — уставайце, немцы паехалі! Бацька мой пазнаў яго па голасе, падняўся і кажа:

— Ну, я жыў.

...І ён пачаў глядзець. Кажа:

— Усе мае дзеці ёсць, адной толькі дзевачкі няма, шэсць лет, але яна не магла ўцячы, бо яшчэ дзіця.

Стаў ён глядзець, і я аказалася. Дык мне ўжо ногі людзьмі папрыдаўлівала, усе косці...»

(З расказу **Яўгені Бардун.** Ніз Слонімскага раёна.)

«Ёсць» — значыць, няма, забітыя. Вось так страшна перавярнулася ўсё ў свеце, у жыцці таго чалавека.

Няма, не засталося нікога з ранейшай сям'і. З усёй вёскі (ці нават некалькіх вёсак) засталіся жыць некалькі чалавек, і яны зноў пабраліся сем'ямі. «Мы з ім пабраліся, пажаніліся сіротамі», — кажа Вольга Мініч пра сябе і свайго цяперашняга мужа, у якога ў Хвойні таксама ўсіх спалілі.

Так і ў Вольгі і Мікіты Гайдашоў з вёскі Першамайск Рэчыцкага раёна...

У Аляксандра Заўэра з вёскі Булкава Акцябрскага раёна...

І зноў — дзеці. Калі маладымі яшчэ пабраліся.

Іван Рубец з Акунінава Слонімскага раёна: «Шэсцера было — шэсцера і ёсць...»

А часта нават і болей, чым было, чым адабрала вайна, смерць, лютасць ворага.

Некаторыя, не, многія падкрэсліваюць самі, напамінаюць нам (ці сабе зноў і зноў!), што вось было ў яго, у яе, у іх было столькі дзяцей, дык і цяпер столькі ж — нават больш.

Хацелася ўсіх «вярнуць» — і сыноў і дачок...

Калі мы слухалі тых людзей, бачылі тое трывожнае бацькоўскае ці мацярынскае новае шчасце — святое іх шчасце! — мы, вядома, не пыталіся, ці можна «вярнуць».

Але ўвесь час помнілася:

«...Аднаўляе Бог нанава Іова, дае яму зноў багацце, мінаюць многія гады, і вось у яго ўжо новыя дзеці, іншыя, і любіць ён іх — Госпадзі: «Дык як мог бы ён, здаецца, палюбіць гэтых новых, калі тых ранейшых няма, калі тых страціў? Успамінаючы тых, хіба можна быць зусім шчаслівым, з новымі — як раней, як бы новыя ні былі яму мілыя?»

Гэта з «Братоў Карамазавых» Дастаеўскага...

І гэта век мінулы, дзевятнаццаты — таксама не мірны. Але каб столькі людзей спазналі гэта, каб такое чыталася ў вачах, на тварах, у голасе столькіх вяскоўцаў!..

Тыя пакутлівыя, «дастаеўскія» думкі, праблемы сталі раптам горкай паўсядзённасцю...

Першая сусветная вайна: працэнт мірнага насель-ніцтва ад усіх забітых — 13;

другая сусветная вайна — каля 70;

Карэя — 84;

В'етнам — каля 90.

Гэта падлічана амерыканскім прафесарам Куімсі Райтам.

Так, жыццяздольнасць, стыхійная моц народа — як гэта важна!

Людзі, пра якіх тут гаворка, не проста «вяртаюць» сабе дзяцей. Яны жыццю вяртаюць жыццё.

Але чаго няма ў іх, у нашых людзях, дык гэта бяспамяцтва. Ні ў голасе, ні ў вачах — калі расказваюць яны пра сённяшні свой дзень, пра новых дзяцей.

Можа, мае ў нечым рацыю і старац Засіма, калі выказвае надзею (але і няўпэўненасць) Дастаеўскага:

«Успамінаючы тых, хіба можна быць зусім шчаслівым?.. Аднак можна, можна: старое гора вялікаю таямніцай жыцця чалавечага пераходзіць паступова ў ціхую замілаваную радасць...»

І ў гэтым — праўда чалавечая.

І яе прачытаеш у вачах, на тварах людзей. Але і другое таксама — тое, што глыбей. Што выказаў, нават выкрычаў, як нясцерпны боль — не ціхім голасам Засімы, а крыкам Івана Карамазава, — пясняр беларускага вясковага люду, наш раманіст Кузьма Чорны. Бо тут ужо век XX, яго маштабы. Тут лёс цэлага народа. І боль, пакуты людзей зусім рэальных, такіх блізкіх памяці, сэрцу (раман «Вялікі дзень»):

«Ксёндз з амбоні расказваў, як Бог выпрабоўваў веру Іова. Ён напусціў на яго ўсялякія няшчасці... Ён ведаў, што гэта Бог яго так карае, але не пакінуў ма-ліцца Богу, і хваліў Бога, і не ўзняў слова на Бога. Бог за гэта вярнуў яму ўсё... і дзеці ў яго другія нарадзіліся, якраз гэтулькі, колькі было тых, што памерлі. І гэта ж тысячы год гаворыцца людзям, і няўжо ніхто не падумаў ні разу, што не можна так гаварыць чалавеку, бо гэта вялікая няпраўда... Каб я завёў другую сям'ю і каб зноў вярнулася да мяне маё жыццё — і каб дом новы, і каб хлеб свой, і каб зноў сын малы выбягаў мне насустрач, дык у доме я магу другім жыць, на кані я магу і другім ездзіць. А дзіця маё — той жа жыў, глядзеў на свет, ведаў, што я яго бацька! Дзіця будзе другое, а не тое, якое мела пакуту, і пакута гэтая асталася на векі вечныя, бо яна была і *ніхто ўжо не зробіць так, што яна не была*».

Чуеш, чуеш гэта ў самых ціхіх галасах людзей! Да цэлага свету звернутае.

**Праскоўя Адамаўна Арлоўская** з Гарадзішча Лагойскага раёна.

«...Соня першая была, Міша, Ванька і Лёнік быў. Лёніку было дзевяць месяцаў, меншаму, а Соні, мусіць, ужо гадоў было з трынаццаць. Старэйшай. І Мішу было дзевяць год ».

Падыду я дзяцей будзіць, а ён: «Не чапай». Не ведаем, што рабіць. І там гарыць, і там гарыць — усюдых гарыць... А ўжо бягуць і да нас у белых халатах, а ноч — відная. Ай, што ж мы будзем рабіць? А ў нас ды ў хаце пол быў стары і легары гэтыя зыбаюцца. Дык мы з ім гаворым, а як яны ў хату, дык ён скоранька ды ў тую яму. А я стаю. Ужо ж яны не будуць мяне чапаць. Адзін у парозе з вінтоўкай стаіць, а другі падышоў так во ды кажа:

— Агонь палі!

Праўда, яны самі, мусіць, запалілі гэтую газовачку маленькую... А гэтае

маё малое, дзевяць месяцаў, што ў калысцы, прачнуўся і стаў плакаць. Я падышла, узяла яго на рукі. Узяла гэтае дзіцянё. А я ж як стаю ў гэтым пінжачку... Ды зімой. Добра, што ўзяла хустку, такая во была пяньковая вялікая. Дык я яго прыціснула к сабе. І гэтая Соня, большая, прачнулася. Я і міргнула: «Соня, ідзі ты са мной». А тыя ўспаліся — ніяк не пабуджу іх. І падыйсці да іх баюся. А мяне ўжо так цягне за парог — ну, я ўжо не магу...

Выйшла ж я ў сенцы з гэтым дзіцем... Не магу... Гэты прапусціў, што стаяў... Не магу ў хату вярнуцца — усю калоціць... Я далей яшчэ на двор — ніхто не бяжыць за мной. Я за хлеў яшчэ. А тады чую ўжо — гарыць хата, і стрэл, і ўсё ўжо там. Трашчыць і гарыць. Сяджу я ў гэтых кустах, блізенька каля хаты. Ой, ой, ой — не магу ж я вытрымаць, калоціць усю... Чую — Соня мая плача за хлевам... Жывая выскачыла з хаты...

Выскачыла я ў гэтыя кусты, а там суседка, Стэфка. Ды кажа:

— І майго ж Грышку забілі, і дзіця забілі!.. Добра, што ты ўжо хоць з гэтым дзіцем засталася, а ў мяне ж дык нікога няма.

Іду я... Там такая баня была. Іду я да гэтай бані, гляджу — тады і мой ужо вылез з ямы, кажа, што ха-та загарэлася, а ён вылез з ямы, атушыў гэтую хату і дзяцей паўкладаў у гэтую яму — Мішу і Ваньку. Забілі. І Соня ранена была. Яны ўсе ляжалі на кравацi. Яны як сказалі: «Лажыся!», дык яна з печы саскочыла і лягла. І праз яе толькі пуля прайшла. Яна і цяпер бальная.

А яны агледзелі, што наша хата патухла, і абратна да гэтай хаты і падпалілі. Хата гудзіць прама, дык ён тады выскачыў з тае ямы, дзе хлопчыкаў паклаў, і праз акно.

Тады ён пайшоў... Там гэта склеп быў. І я туды прыбегла з дзіцем... Тут мне сабралі хто што, — хто хустку з галавы кінуў, хто якую адзежыну, — я тое дзіця ўкруціла. Іду ж ужо я ў Сялец. А тут муж гаворыць, што яшчэ ж і наша Соня жыва. Я і сама чула, што яна плакала, але ж нідзе не найду я тады... Прышла я ў Сялец, ажно мая Соня ў Сяльцы. Людзі баялі-ся ж таксама: яна запёрта ў хаце сядзіць.

—Мамачка, я ж ранена.

—А што ж рабіць з табою? Дзе ты ранена?

—А я ж не знаю. Я ж бегла голая і босая. Я ж бегла ў Сялец і ўсё памарозіла, у адной рубашачцы бегла. Я ж змарозіла і рукі і ногі. Мяне ўвярцелі, і я тутака ляжу. Агледзелі, што я ранена, дык з акон сарвалі занавескі, перавязалі мяне... Мамачка, едзьце куды-небудзь, а мяне потым заберыцё. Тут жа нікога нямашака.

Ну, я, праўда, паехала ў Прудзішча, мяне падхвацілі там. А мой муж паехаў у Вясніно, там мая радня. Назаўтра мы сабраліся... Прыехалі мы ў Вясніно, а тады і туды наехалі *яны.* Там аднаго забіралі ў паліцыю. А я ж як у тым

страху была, дык я таксама ўцякала. Гэтую маю дзяўчыну, Соню, прывезлі партызаны ў Вясніно, да мае радні. Распухшы гэткая, бедная, рада, што мяне ўбачыла. Мы з ёю паплакалі...

А тут зараз наехалі *яны.* I тут месца няма. Я гэта за дзяўчыну, за хлапца малога, Лёніка, укруціла яго ў пасцілку, як пабегла — дык паваліласе на лёд і гэтае дзіця забіла... А божа мой міленькі, а што ж мне рабіць ужо! Не магу жыць — сама дзіця забіла! Яшчэ і цяпер не магу жыць, як прыпомню... Несла я потым, несла, а развярцелі тую пасцілку — нежывое дзіця... Хоць ты самой кладзіся ды памірай...

Ды неяк вось засталася жывая і сама дагэтуль жы-ву. А як прыпомню — дык нашто я жыву?..»

**Сцепаніда Міхайлаўна Дардынская.** Жылін Брод Слуцкага раёна.

«...Ну, і давай забіраць усё імушчаства. Пазабіралі гэта ўсё. I мужчын там, жанок, каторыя малодшыя — уродзе гэта ўжо гнаць скот і гэта ўсё. А потым у кожную хату і давай убіваць. У мяне шэсцера дзяцей было, але яны не тое што дзеці — і дваццаць сёмага года, і большыя. Большы сын стаў гаварыць, ён быў у ваенным бушлаце, ён кажа:

— Мама, ідуць нас біць.

Пака я глянула ў акно, дык яны ўжо на кухні. Трох прышло ўжо ўбіваць. Дзеці меншыя да мяне, а я на яго кажу:

— Хоць бы ты скрыўся дзе, а то забяруць у Германію.

А яны як прыляцелі, дык на яго: «Парцізан!» — ды к яму, а другі — ка мне. Дык я, як убіваў таго сына, дык я во так глянула на яго, на сына... I дзеўчына ў мяне на руках, дык ён на мяне страляў, не пацэліў ужо ў галаву, ды во сюдою пуля прайшла і во дзе засела. I дзевачка ў мяне тры гады, была на руках. Дык я не знаю, ці я яе задушыла, калі ўпала, але я ўжо не чула нічога больш ніякага. Сталі дзеці крычаць, стаў ён стралядь у гэтага большага хлопца ды ў мяне — дык я ўжо не помню тады... Да памяці дайшла, паглядзела гэтыя дзеці па хаце — вядома, пабітыя. Пасядзела ды зноў лягла. Ды ўжо ляжала. Крыві было многа ў хаце. Яны прыходзяць у хату абратна. Тыя ці не тыя — я ўжо не знаю. Нешта пагергеталі і пайшлі. Яны, мусіць, не замецілі, што я жывая, яны б дабілі. Выпаўзла я ў садок ды і села пад хатай. Вядома, і кроў з мяне льецца... Патом прышлі яны ў хату ды нечым як стукнулі — ужо і гарыць хата. Я сядзела, сядзела, ужо і крыша на мяне кідаецца, і галава мая абгарэла, і адзежа мая гарэла. I няма мне дзе дзявацца. Ужо нікога, цішыня.

Думаю, можа, дзе хто застаўся. Іду ў палавіну засценка, дык хлапчучок ляжыць забіты на полі, уцякаў. Гэта Болесяў хлапчучок, а потым — Крываносаў хлапчучок, ранены. Ды кажа:

— Цётачка, спасайце мяне. Я кажу:

— Дзіцятка маё, я і сама не магу, у мяне кроў льецца, зубы павыбіваты. Кажу, паляжы, можа, я каго ўгледжу.

А за рэчкай, глянула — іх, як авец, стаіць, гэтых немцаў. Дык яны як сталі па мне страляць з пулямётаў. Дык я ўпаду, здаецца, я так ужо ўцякаю, — а я на адном месцы ўсё. Упаду ў гэтую ваду, у рэчку, ды там і прабыла, пака сцямнела. Нашы мужчыны гэтага хлапчука падабралі, у склеп палажылі. Ён там і памёр. А некаторыя жыўцом дзеці гарэлі, каторыя малыя — не стралялі. Ой, я і не ўспамяну, колькі нас пабілі ў нашых Пераходах. Я тады там жыла. Усе і пагіблі. Не там пабілі, дык у партызанах яны памітрэліліся, то на фронце. І вёскі зусім няма...»

**Надзея Аляксандраўна Няглюй.** Чырвоная Старонка Слуцкага раёна.

«...А яны акружылі дзярэўню і нас ужо нікуды не пускаюць. А мужчын узялі скот гнаць. Каторыя маладыя былі. Жанчын ніводнай не ўзялі, толькі мужчын. Мужчыны сабіраюцца скот гнаць, а мы ўжо знаем, што з намі будзе...

Я прыбегла ў сваю хату, а гэты немец мяне адкінуў — не хадзі, сядзі ўжо там. Я ўжо баялася куды-небудзь ад дзяцей бегчы, у мяне чэцвера дзяцей. Каб мяне ўжэ дзе на вуліцы не забілі, а каля дзяцей забілі. Ну, і так сядзімо мы. Гэтыя мужчыны ўжо ходзяць, скот павыганялі. І гэтых мужчын адправілі ўжо з засценка. А мы ў той хаце засталіся. Ну, і яны ўвахо-дзяць. Пахадзілі, пахадзілі, пахадзілі. А мы кажам:

— Паночкі, што вы рабіць будзеце з намі? Беце нас, толькі дзяцей нашых не беце. Павыкідайце на двор, і ўсё.

А мароз быў, зіма такая была. Ну, а яны што — гаворацць па-свойму, не пазнаеш, што яны гавораць. А потым пашлі. Прышлі апяць. Скамандавалі — мы пападалі на пол. Тады ж матрасы былі, дык яны з гэтых матрасаў павытрэсвалі салому на пол, каб яна гарэла, гэтая салома... Мы так пападалі: дзевачка мая так вось, у мяне ў галаве, а хлопчык так во. А старэйшы мой — далей, і ўсё плакаў: «За што нас будуць біць?..» Плакалі, крычалі...

Гэтыя немцы прыдуць у хату, а мы на коленцы пастанем і просім, каб нашых дзяцей не білі. За што іх біць, што яны вам вінаваты? Старэйшаму хлопчыку было дванаццаць год. А меншай дзевачцы было пяць, самай меншай. Ну, а яны ўсё адно нічога да нас, не панімаюць, смяюцца... А потым уваходзяць біць...

Адзін вымае наган, а другі з аўтаматам. Мы пападалі, і пачалі яны нас біць, ляжачых...»

* * *

Калі ехаць з поўдня на Капыль — навокал чарназёмнае прыволле Случчыны! — здалёк убачыш дзве вёскі: адна ўздоўж другой — глядзяць адна на адну з пагоркаў. Вялікія Прусы і Малыя Прусы...

Пры ўездзе ў Вялікія Прусы на чорным полі бялеюць высокія пліты помніка, здалёк бачныя. Прозвішчы, што выбіты на тых плітах, — дзесяткі разоў адно і тое ж прозвішча паўтараецца, і толькі імёны інакшыя — у сучасных Вялікіх Прусах гучаць рэдка. Не толькі сем'і, але і карэнні цэлых сялянскіх родаў былі знішчаны.

Сярод зусім новых прозвішчаў сённяшніх жыхароў вёскі ўсё яшчэ, аднак, трымаецца і тое, што смерць, многа раз паўтарыўшы, запісала на тых вялізных плітах.

Жыве ў Вялікіх Прусах Марыя Фёдараўна Кот. Летам тут жыве. На зіму — як у вырай — яна і яе ці-хі, белы дзядок Іван Сільвестравіч разлятаюцца. Яна — у Мінск, да *свайго* сына, ён — у Капыль, да *свае* дачкі.

Яны, як і многія, пра каго мы расказваем, ужо не маладыя «сіротамі пабраліся», сталі жыць разам пас-ля таго, як пабілі іхнія сем'і. Але сын, але дачка — іх шчасце! — засталіся ў яе, у яго.

Кожную вясну, як з выраю, вяртаюцца старыя — у свой садок, на свой агарод, пад родную страху Вялікіх Прусаў.

Хоць і вунь якая страшная памяць пад той страхой жыве — раптоўна громам будзіць уначы, воўкам кідаецца пад ногі, калі пойдзе чалавек па вуліцы сярод старых дрэў, каля даўніх калодзежаў...

Перш чым прыехаць да Марыі Фёдараўны Кот — ужо знаёмай нам, — мы пабывалі ў яе нашмат маладзейшай сяброўкі ў Капылі і запісалі тое, што Марыя Мікалаеўна Нагорная расказала нам у прасторным ды зацішным памяшканні дзіцячай бібліятэкі, якою яна загадвае.

Тое, што адбывалася з Вялікімі Прусамі, дзве гэтыя жанчыны бачылі, перажылі кожная па-свойму. Марыя Фёдараўна Кот у самым пекле была — увесь час у вёсцы. Марыя Мікалаеўна — разам з тымі, хто хаваўся ў недалёкім лесе: зблізку бачылі, чулі, перапакутавалі тое забойства вёскі, суседзяў, сем'яў. Памяць абедзвюх жанчын неяк асабліва праўдзіва і жудасна паглыбляюць адна другую, як люстры, пастаўленыя адно супраць аднаго.

«...Ну, мой дзень, 26 верасня 1942 года, — успамінае **Марыя Нагорная,** — пачаўся з таго, што мама мя-не разбудзіла гадзін у сем раніцы і кажа:

— Бяжы хуценька да сястры і скажы, што немцы едуць.

Першым жа дзелам за сваіх хапаюцца. А яе муж быў у партызанах. Дзеці маленькія. Ну, я і пабегла да яе.

...У нас па суседству быў адзін чалавек, Пупейка. Ён цяпер у Мінску жыве, пенсіянер. А тады ён жыў у Прусах. З нашай вёскі было многа інтэлігенцыі — настаўнікі, інжынеры, урачы. І вот папрыбягалі назад у сваю вёску, калі вайна пачалася. Яго бацькі там жылі, і ён там жыў у вайну. І ён намнога вышэй стаяў усіх астальных нас, пруслян, разумеў усё... Па

прафесіі ён быў эканаміст ці бухгалтар, я ўжо добра не памятаю. Там у нас гараж стаяў за сялом, дык ён кожную раніцу выходзіў, залазіў на вышку і праглядваў тэрыторыю, ваколіцу, — як там немцы, едуць ці не едуць. А дарога гэтая, што з Цімкавіч да Капыля, добра праглядваецца. З тое вышкі.

Дык вот у тую раніцу, — расказвалі людзі, — ён узлез на тую вышку, паглядзеў і ўбачыў вялікую пераправу па гэтай дарозе Цімкавічы — Капыль. І бачыць, што паміж Прусамі, Вялікімі і Малымі, немцы акопваюцца ўжо. Ён вярнуўся ў сяло і гэтую трывогу ўсім перадаў. Немцы едуць з-пад Цімкавіч! Яшчэ ж трэба было і гаварыць, адкуль едуць, каб знаць, куды ўцякаць. Прусляне былі заўсёды начаку, бо вельмі часта прыходзілася ўцякаць. Па той прычыне, што многа было ў партызанах. Амаль з кожнае хаты быў хто-та ў лесе. Людзі баяліся, асабліва ўжо тыя, чые былі ў партызанах...»

Капыль, дарога з Цімкавіч... Далей, як пісаў Кузьма Чорны, у «гаворцы людзей чуваць Нясвіж, Слу-цак». З гэтымі мясцінамі звязана моўнае багацце выдатнага беларускага празаіка, таксама як і багацце народных характараў у яго раманах, тыпаў сялян — цягавітых, шчодрых, сціплых і сардэчных... Такімі асабліва бачыліся яны, калі вайна і фашызм разлучылі пісьменніка з роднымі мясцінамі. Пішучы ў Маскве аб мужных земляках-партызанах, якія змагаюцца з жорсткім і бязлітасным «жалезным зверам», цяжка хворы Кузьма Чорны ўвесь час жыў думкай і трывогай: а што там, а як яно там, дзе засталіся ўсе яго «прататыпы» — яго народ.

«Учора ўночы паведамілі ў зводцы, што ўзялі Цім-кавічы, Вялікую Раёўку, Жавалкі, — чытаем запіс ад 2 ліпеня 1944 года ў «Дзённіку» Кузьмы Чорнага, — родныя мае мясціны. Як мая душа рвецца туды! Яна заўсёды там. Там жывуць усе мае персанажы. Усе дарогі, пейзажы, дрэвы, хаты, чалавечыя натуры, пра якія калі-небудзь пісаў. Пішучы пра Скіп'ёўскае Пераброддзе, я думаю пра Скіп'ёва каля Цімкавіч, паміж лясамі Скіп'ёўшчынай і Ліхадзеўшчынай, мілае Малое Селішча, харством якога захаплялася мая маці-нябожчыца».

Што толькі не пераЖылі, чаго не пабачылі гэтыя людзі і гэтыя мясціны, асабліва дарагія Чорнаму, чаго не спазналі ўсе нашы вёскі, пасёлкі, гарады — некаму абавязкова блізкія, родныя — за доўгія-доўгія ночы, што былі, як дзень, ад пажараў, і дні, што былі чорныя ад гора-бяды!

Вунь якім чорным і доўгім бачыцца вераснёўскі дзень Вялікіх Прусаў у памяці дзвюх жанчын са Случчыны.

**Марыя Нагорная.**

«...Ну, я і пабегла. Прыбягаю туды, адразу не ў хату, а ў гумно. Бацька мой малаціў там, бо ў сястры ж няма каму. Малаціў і збіраўся ехаць сеяць. Я прыбегла туды і кажу:

— Папа, трэба ўцякаць!

Ужо было дастаткова сказаць, што трэба ўцякаць, і людзі збіраліся і ўцякалі. Як я сказала, дык ён адразу ж кінуў веяць, зачыніў гумно і са мною ў хату. А сястра падпальвае ў печы: дровы паложаны, і саломку падпіхае. Дзеці паўставалі ўжо. Як я толькі ўбегла ў хату, дык яна гаворыць:

—Што, зноў уцякаць? Я гавару:

—Ізноў.

— Ну, — сказала яна, — дык і бяжы дадому, бо нам бліжэй да лесу.

Я выскачыла на вуліцу. І бацька са мною. Па дарозе сустракаем яе старэйшага сына. Яму было толькі дзесяць гадкоў тады. А ён прыехаў з начлегу, каня вадзіў пасвіць. Каня прывёў да дзеда, бо дзед жа робіць на кані, а сам ужо бег дадому. Ну, мы яму гэта паведамілі, што немцы з-пад Малых Прус едуць, — ён зразу за намі, следам туды к лесу. Прыбегла я дадому, бачу — дома ўжо нікога няма, усе на агародзе, напраўля-юцца к лесу.

Мама гаворыць:

— Скарэй давайце, бо ўжо ўсе людзі паўцякалі. Я чакаю вас.

І мы ўсе пабеглі.

Прыбеглі туды і адразу не хаваліся далёка. Не зналі, што яшчэ і ў лесе трэба хавацца. На краі стаім і глядзім. Хто яшчэ бяжыць, хто ўжо хоча назад ісці... Мы ўсё чакаем, чакаем... Мабыць, ужо гадзін адзінаццаць было — няма сястры, не прыбегла яна. Ні дзеці, ні яна.

Ну, мама гаворыць:

— Пайду. Чаму ж яна не прыйшла? Не ўспела, ці што? Пайду пагляджу.

Сэрца ж мацеры не выдзержывае. І яна вярнулася ў сяло. Да дочкі. Не аказалася яе. А па суседству з імі жыла якраз вось гэтая Кот Марыя Фёдараўна, пра якую вы пытаецеся. І аказалася, што яны не ў лес паўцякалі, а ў кусты — там на другім канцы вёскі былі кусты балотныя. Усе людзі з таго канца ў асноўным ту-ды ўцяклі. І вось гэтая Кот вярнулася, — ну, знаеце, паглядзець гаспадарку, ці што. Бо так жа пакідалі ўсё, як каго дзе што сустрэла. Яна вярнулася, а мая мама ідзе ў тыя кусты, каб гэта забраць сям'ю ў лес, да нас. А Кот кажа:

— Чаго табе ісці? Дзеці там сабе гуляюць...

А к гэтаму часу ўжо вельмі сталі страляць на лес з мінамётаў. А лес жа вялікі — цягнецца ад Прус на Какорыцы, на Пацейкі... Мама выбегла-такі за сяло, каб у тыя кусты папасці, і думае, што страляюць па лесе, і праўда — у кустах будзе спакайней. Вярнулася яна назад сялом і да лесу напраўляецца. Сустрэла Станевіча. Малады хлапец, потым ён стаў партызанам, а на гэты момант яшчэ ў сяле быў. Брат яго быў у партызанах.

Дык ён гаворыць:

— Чаго ты, цётка, бяжыш? Не трэба ўцякаць. Вунь ужо з-пад Сцяпур партызаны ідуць.

Бо як яны на горку падняліся, дык бачаць, што ад Сцяпур ідуць цэп'ю... Маці старая, нявопытная, але ўсё-такі паглядзела, — бачыла ж яна партызанаў, і сын жа свой быў у партызанах, — дык яна і гаворыць:

— Ну, Пятрок, якія ж гэта партызаны, яны ж усе ў касках! Дзе ж тыя партызаны касак набяруць?

— І то праўда!

У нас да лесу метраў сто — сто пяцьдзесят. Дык яна паўзла, бо такая ўжо страляніна адкрылася! І ад Малых Прус, і са Сцяпур — кругом! Увесь выган прастрэльвалі, нельга было ісці на ўвесь рост. Прыбегла ў лес, ужо ж каб нас як шукаць. А людзі ж ужо адзін другога пільнуюцца. Ужо сталі адыходзіць ад берагу ды ўжо далей у лес, а там ёсць такі роў вялікі і над ровам маладыя ёлкі, засцілаюць роў, дык мы ўжо ў той роў пахаваліся. Усе людзі. Вось яна ўжо прабіраец-ца к тому рову. Сустрэла адну дзяўчыну, суседку нашу, схаваную, і кажа:

— Чаго гэта ты, Вольга, так хаваешся? А тая гаворыць:

— Хавайцеся і вы, цётка, бо ўжо немцы ходзяць па дарогах.

Прышла, знайшла нас. Потым цэлы дзень нічога не ведаем. Мужчыны залезуць на высокае дрэва, глядзяць. Ціха. Ніхто не ведае, што робіцца ў сяле, і выходзіць — ніхто не выходзіць, таму што відно, што ходзяць немцы, выганяюць скот... А што болей робяць — невядома...»

**Марыя Кот.**

«...Так ацапілі — чалавек ад чалавека чатыры метры, так во ішлі. Падышлі да нас:

— Паднімайся!

Паднялі ўсіх з таго картафляніка, вінтоўкі панастаўляўшы... І пагналі нас пад дарогу, што з Цімкавіч на Сцяпуры. На дарозе пасаджалі, і прыхрдзіць адзін, помню, — карта на грудзях, аўчарка гэтая. Канечне ж, нейкі начальнік ужо нямецкі. А мы сядзім, чакаем, што будуць там біць. Дык не. Начальнік сказаў, што ідзіце дамой і забірайце з поля лошадзі дамой. Хто ж тыя лошадзі павядзе, — на чорта яны, калі мы ўжо знаем, што біць будуць. Ну, і прышлі ўсе дамой. Праўда, хто сумеў, у каго які доцік быў, дык той схаваўся. А нам дзе? Я ўжо там патупала, патупала, дзе ж дзецца? А па абедзе я вышла на вуліцу — невазможна! Пулі лятаюць ужо. Ужо яны прыходзяць — «яек». Ужо яны бачаць, што няма тут партызанаў, а яны кругом дзярэўні акапаліся. Няма дзе людзям дзявацца.

— Хадзем у гэтую глінабітку.

У нас глінабітка была, дзядзька адзін зрабіў, дык мы кажам, што пулі там не будуць даставаць... Яна была на загуменні за сялом, далекавата ад будынкаў. Адтуль ім відно было, што гэта глінабітка і што людзі шавеляцца. І давай пуляць у гэтую глінабітку. Усе вокны павыбівалі. А мы ўжо за сценкамі. Чалавек, можа, нас дваццаць пяць было, а можа, і больш. І

раненыя былі дзве, Саша Дарашкевічава і Маня. А потым яны прыходзяць пад вечар. Ужо сонейка стала закатвацца. Прыходзяць і: «Выхадзі!» — нарабілі крыку. Мы вышлі. Яны думалі — можа, партызаны. Бачаць — адны бабы і дзеці...

— Вараці назад!

Мы і вярнуліся назад.

— Лажысь! Пашпарта! Дзеньгі! Гэтыя жанчыны:

— А паночкі, а дарагія!..

А яны: «Лажысь!» — і ўсё. І страляюць з аўтаматаў.

Там печ была, і печка, і стол стаяў. Пападалі. Праўда, я ўпала пад стол са сваёй сям'ёю. А другія туды пападалі, далей за печку. І вот яны нас перастрачылі. Меншанькая мая:

— Ой, мамачка!..

Глянула я — а ёй сюды папала, у пераноссе. Толькі захрапла. А другой, старшае,— што во гэтая, на фатаграфіі,— яе і не пачула, як забілі. Адзін перастрачыў і пайшоў таму памагаць, за печку. Я ўзяла так во і зірнула.

Жанчына не дае адсунуць кравать, там дзеці яе, а ён б'е яе наганам па галаве. А ён краваццю таўчэ тых дзяцей, тых людзей. Бо не адразу ж усе кончыліся. Хрыпацяць, енчаць гэтыя людзі. Дзеці тыя пішчаць, госпадзі!..

Глянула я, а ён замеціў, што я жывая. Дык ён падышоў. З наганам. Сіні-сіні — вот я бачу, як агнём, агнём мяне па твары! Я ляжу ў дзецях сваіх, а ён усё мне... порах гэты... і пулі ўсё — шуг! шуг! — б'юць. Страляў — колькі ўжо яму хацелася, біў з таго нагана. Потым за ногу мяне і пацягнуў па крыві сярод хаты, па крыві, што людзі там... Пацягнуў і сам ужо пасвістаў, пасвістаў у хаце і пайшоў.

Вышаў з хаты, а глінабітка гэтая была чарапіцаю крыта, яе трудна было ўпаліць. А ў сенях той дзядзька сена злажыў, бо не меў сарая. Дык ён тое сена ўпальвае. Упальваюць сена і ўсё свішчуць там, гавораць, і лаюцца, і ўсяляк...

А патом мой хлопец падняўся. Гэты, што цяперака паехаў недзе на курорт, казаў, — мой Жорж. Азваўся і ідзе ў парог. Я думаю: можа, гэта абратна ён, немец? Я ўжо не гляджу, ляжу ў гэтай крові... Потым чую — шалопае, дайшоў у парог... Дай жа я азірнуся, хто там шалопае. Зірнула, а гэта ж мой хлопец! Дык я кажу:

— Жоржык, куды ж ты, дзіцятка маё? А ён кажа:

— Мама, а вы жывыя? Хацеў — хай і мяне!

— Жывая, дзіця маё... Ідзі, дзіцятка, лажыся на гэта самае месца. Можа, яно шчаслівае. Можа, мы і астанёмся.

Ён прышоў і лёг на тым месцы, дзе ляжаў. Можа, цераз мінутку... Пачулі ж усё ж такі яны! Улятае адзін у хату. І крычыць:

— Паднімайсь!

Тры разы крыкнуў так. Але ён нас не паварочваў. А там людзі храпуць, даходзяць... Ну, невазможна цярпець! Пабегаў і ў печ, і пад печ глянуў, шкафчык стаяў — і ў шкафчык паглядзеў... Гранату пад печ кінуў... Пасвістаў, пасвістаў і пайшоў...»

**Марыя Нагорная.**

«...Стала ўжо вечарэць, сонца садзіцца пачало... Не зайшло яшчэ, але ўжо села, мужчыны рашылі: «Пайшлі!» Паглядзець, што там робіцца. Сабраліся некалькі чалавек. І я пайшла з імі: бацька ж пайшоў, дык і я пайшла з імі. Выходзім на самы ўжо край, а тут літаральна метраў за дзесяць немцы... Запалілі задалку — прыкурвалі, ці што. Яшчэ не цёмна было, але ў лесе прыцемкі. І мы тады ізноў як кінуліся назад — урассыпную кінуліся, хто куды. Адно мы свае, утрох засталіся, бацька, маці і я. І згубілі гэтага пляменніка нават майго.

Пытанне: — А немцы стралялі па вас?

— Стралялі. Яны ж у лес баяліся ісці, а думалі, што можа, гэта партызаны. Але яны за намі не пабеглі, а толькі абстралялі. А мы схаваліся і сядзім, ды ўжо адны, нікога больш мы не нашлі. Ужо і добра сцямнела, ужо і зарава — стала гарэць. І столькі страху, такі трэск чамусьці, што нам усё здаецца — нехта едзе на жалезным ходу... А ніхто не едзе. Аказалася, што гэта гараць дамы, ад чарапіцы...»

**Марыя Кот.**

«...А яны там палілі — колькі ім хацелася, і ўпалілі ўсё-такі. Крыша ўсе-такі ўгарэлася, хоць і чарапіцаю крыта. А самі пайшлі. Згарэла гэтае дзерава, якое пад чарапіцай было, і ўпала гэтая крыша... Дык гэты мой хлопец гаворыць:

— Мама, а мы згарымо...

А шкла няма ў вокнах, адны рамы. Павыбівалі. А я гавару:

— Ну, дзе ж мы дзенемся? Яны ж усё свішчуць яшчэ.

Яшчэ стаяць наводдалек, ім там можна яшчэ стаяць. Потым згарэла гэтая крыша, упала, а мы ляжымо. І не чутно, каб яны крычалі ці свісталі каля гэтай глінабіткі. А паталок гэта — трэсь, трэсь — трашчыць... «Ну што ж, — думаю, — не пабілі, то пакалечыць, як упадзе, і кончана будзе». Устала я і гавару:

— Ну, цяпер уцякайма! Уцякайма, вылазьма! Паднялася я з гэтай зямлі, а так во кравацъ ляжала пад акном. Я гэта стукнула ў тую раму і гляджу. Чуем, што недзе крычаць, страляюць, людзі пішчаць... А гэтак, а гэтак! А каля нас няма нікога, цішыня.

— Уцякайма цяпер!

Жора вылез, а я схапіла меншую, ёй было дзевяць год... Узяла, паднесла пад гэтую кравацъ, палажыла, сама пералезла цераз яе... Гарыць і на ёй плацце, і на мне гарыць... Вымаю гэтую дзяўчыну. Замчала ў тую яму, дзе там глінабітку рабілі, палажыла... І зноў жа лезу па тым самым агні — па

большую... Гэта ж, думаю: як упадзе столь — дык ужо ж згарыць! Хай то пабілі, дык яшчэ і згараць!.. Улезла я абратна, ускарэбкалася ў гэтае акно. Дастала большую. Яна была рослая, не такая, як я, малая. Дачка! Ёй тады было ўжо гадоў семнаццаць... Пацягнула. Дык яно такое маладое, мяккае! Яшчэ цёплае дзіця, хістаецца — я ж яго не падніму. А ўсё ж такі набралася сілы такой, што падняла. Падцягнула яе да краваці, тады на кравать, на падаконнік, сама цераз яе — і зноў жа сцягнула. Кажу:

— Жоржык, памажы ты мне яе. Кажа:

— Не памагу, мама, бо я ранены. Я ж вам нічога не памагу.

Я яе зацягнула ў ямку ды лістамі... Лопух там такі разросся ўвосені... Прыкрыла я іх, мінутачку перадыхнула. І мне так страшна там — невазможна! А ўжо так шарэла. Ужо было пагарэла, бо там яны раней падпалілі...

— Цяпер, — кажу, — то ўцякайма!..

Там плоту кусочак было і картафлянік, — прапаўзлі мы паўзком туды ўжо. А чутно ж — каля нас людзей няма, а там пішчаць, крычаць! Госпадзі! Каму руку павыкручвалі ды ногі... Гэтай Вольцы Варчаковай, як мы кажам, дык ёй садралі ўсю кожу — ну, проста калошаю! Ды руку выкруцілі — гэтак мучылі...

А мы ўцякалі. Я яшчэ гэтак рукамі праграбла ў градўсах землю — палажыла хлопца, гэта Жоржа, падыспад, а сама к яму на ногі, неяк голаву палажыла, і паляглі мы... Трошкі паляжалі, і так ідзе машына пад гэтую глінабітку... Нельга ж праехаць па сяле, гарыць, дык яны ішлі пад гэтую глінабітку. Ехалі. А ўжо цёмна. Адкрылі барты і пашлі з батарэйкамі шукаць, дзе хто што выносіў. Нясуць і ўсё бразь у кузаў, а мы ляжымо... А свінні, бяда на іх, чуюць, што мы ляжымо, дык усё рох-рох... Ляжу і думаю: еслі замецяць ды падыйдуць — заб'юць!.. Пасвяцілі батарэйкамі — ну, не далей як вось да стала, але нас не замецілі. Пазбіралі, колькі ім чаго трэба, і паехалі...»

**Марыя Нагорная.**

«...Апоўначы мы вышлі. Старэйшыя, яны ж хвалююцца і за скот, што там пакінулі, каровы не доены цэлы дзень, гэта ж таксама нядобра. Пайшлі. Прыходзім у сяло. Нічога, ціха. Дайшлі да свайго пляцу, дзе гарыць хата. Карова таксама на сваім участку: і скаціна адчувае небяспеку. У агародзе стаіць. Маці хацела падаіць яе. А тут бягуць людзі зноў. Яшчэ ж не ведаем мы, што пабілі людзей... Бягуць людзі з сяла, тыя, што аказаліся там раней. І адзін, Беразоўскі, гаворыць:

— На чорта вам тыя каровы! Немцы ж яшчэ ў сяле, а вы тут з каровамі!..

Зноў мы кідаем усё і бяжым у лес. У гэтым канцы, ад лесу, немцаў не было, а ў тым — былі.

І вот тады ў лес прыбег Кавальчук. Ён быў там, у вёсцы, калі білі, і ён

многае расказаў. Не ўсё, але што ён бачыў. Ён не ведаў, што ўжо ўсіх пабілі, а думаў, што толькі некаторых...»

**Марыя Кот.**

«...І так я ўжо змаглася, штр нічога не магу. У галаве шуміць — нічога не чую... А потым чую ўжо — крык, плач... Гэта ўжо хто астаўся дзе ды вышаў паглядзець на трупы... Плакалі людзі. Хто з лесу прыйшоў. Ноч. Гэта як ужо яны паехалі. І бяжымо мы, бо хто яго ведае, чаго яны плачуць... Потым хацела я падняцца, але хісталася, хісталася... Вазьму і ўпаду. Гэты хлопец бачыць, што я не ўстану, — ён мяне за руку, падняў, я пастаяла, перайшлі мы трохі, можа, ша-гоў дзесяць, я зноў упала. Упала, ён мяне падняў, і гавару ўжо:

— Завядзі ты мяне.

А ўжо вочы пазліпаліся зямлёю і кроўю, я не бачу нічога, так пазамазвала ўжо, як грабла зямлю... Ён мяне завёў, цераз вуліцу там равок ёсць, дык памыць хоць вочы, каб бачыла, куды ісці. Вот я памыла гэтыя вочы ўжо, прамыла, а ўсё ў крыві, уся адзежа на мне ў крыві. Ен мяне завёў, там цераз вуліцу равок ёсць...

Дык ужо ж уцякаюць людзі. Бяжыць Волька Удовінява, што хадзіла ўсё партызанам з Мінска дастаўляла... З сястрою сваёю Маняй. Дык яны:

— Цёцечка, мілая!

Дык я кажу, што нас з сям'і толькі дваіх засталося, ды і то ранены Жорж.

— Перавяжыце яго.

А чым жа я дам, калі ў мяне ўсё ў крыві. І гавораць яны:

— Цёця, уцякайце, бо ў Прусках[27] гаварылі, у Свентахоўскага, што будуць ізноў прыязджаць!

А тут стаіць з Прусак дзядзька, родственнік наш, — прыбеглі ўжо мяне глядзець... А братавую маю ўжо свінні ядуць, абгрызлі...

А мая гэтая родственніца гаворыць:

— Хадзем перанясем яе дзе-небудзь у яму...»

**Марыя Нагорная.**

«...Дачакаліся мы раніцы. Стала віднець. Людзі ўсе паціхоньку, паціхоньку сабіраюцца на краі і выходзяць-такі з лесу. Раніцай іх, немцаў, не стала. Выехалі. Набралі, што ім трэба, скаціну і дзе якое дабро ў людзей, і паехалі.

Выходзім мы на выган, а тут і партызаны з'явіліся. Двое. Відаць, у разведку. На конях. А яшчэ не ведаюць усёй трагедыі, што ўсіх гэта людзей пабілі.

Цяпер ужо кінуліся ўсе ў сяло, на свае ўчасткі — хто дзе ёсць жывы ці няма. Помню, што ідом і сустракаем свайго пляменніка. Бяжыць ён. Аказваецца, пабыў ужо на сваім участку. Плача... (Плача.) Пабеглі мы туды. Праўда, ляжыць, на вуліцы... Абгарэлая такая... Людзі абгарэлыя такія страшныя! Нельга расказаць, не бачыўшы...

[27] Малыя Прусы.

Ну, і ўсё. Засталося ў сяле чатыры хаты. І два-тры гумны, можа, не больш.

Партызаны, як з'явіліся, сказалі, што небяспечна тут, трэба і астальным хавацца. Так яно і палучылася, мы пайшлі. Ні коней, ні кароў. Пехатою пайшлі мы да Руднага.

Была ў нас такая жанчына, Нюша Салагубава. Маладая, адна, маці-адзіночка з дзевачкай маленькай. Яна была яшчэ жывая. І вот расказваюць, што нейкім цудам застаўся адзін клуб. Хата проста была такая. Нюша была раненая, прасіла вельмі піць, дык нехта з людзей занеслі яе ў гэты клуб. Бо не думалі, што немцы зноў прыедуць дапальваць. І вот яны прыехалі. І дзіцятка было, таксама жывое. Укінулі гэтае дзіця ў калодзеж... А яе самую паролі, калолі — страшна! І запалілі ўжо хату...

А мы ў Рудным у полі пад стогам жывём. А потым мама гаворыць, што трэба неяк у Прусы дабірацца, — там жа людзі валяюцца, і дачка...

— Пайду я.

А бацька... Такое нервнае патрасенне ў яго, ляжыць, трасецца... Хворы. А маці пайшла ў Прусы, і з ёю пайшла яшчэ племянніца, мая дваюрадная сястра. Каб ужо смялей. Яна з другога сяла, з Агароднікаў. Прыходзяць яны туды, а немцы зноў прыехалі, пабылі ў нядзелю, а цяпер і ў аўторак прыехалі. Усё вывозілі, што маглі вывезці. Немцы зноў! І ім няма дзе дзецца, яны кінуліся да лесу, дабеглі пад гору, а там лубін, нейчая палоска. Дык яны ў той лубін і схаваліся. А пад вечар немцы паехалі.

Прыехалі партызаны — скідаць гэтыя косці, дзе што засталося. Мама расказвае, што адзін такі, Янкоўскі, лічыў, лічыў людзей... Дзе тут палічыш, калі ўсе параспадаліся, адны костачкі... Ён толькі сказаў: запомніце, хто жывы застанецца, што ў гэтай магіле пяцьсот чалавек. Гэта каго сабралі, а так жа пахавалі, хто дзе каго знайшоў. І нашых: выкапалі ў саду яму і ўсіх ужо закапалі. І сястру, і двое яе дзяцей, і цётка яшчэ, бо яна была ў яе...

...Яе Вольга звалі, Гуліцкая. Прыходзяць. Адна яна ў хаце. Страляюць. Упала.

«— Упала, — гаворыць яна, — і ляжу, але чую, што адно прастрэлена, не мёртвая, жывая... Гляджу ў акно. А хата яшчэ не чутно, каб гарэла. Дзе ж яны паварочваюцца? Гляджу ў акно... Яшчэ паглядзелася ў люстра: страшна, уся ў крыві... Зноў лягла на тое самае месца».

А ў яе хату загналі яшчэ двух хлопцаў, прускіх, з вуліцы загналі ў хату. Яе ў зале білі, а іх ужо на кухні. Так ужо страшна яны канчаліся, храплі. Можа, што маладыя? А потым заходзяць і да яе ў залу. Можа, хацелі паздзекавацца... За ногу яе і пацягнулі ў агонь. Пакуль што гарыць толькі хлеў. Дык яны рашылі іменна цяпер, у гэтую мінуту кінуць яе ў агонь. За ногу і пацягнулі, гаворыць. Галава

баўтаецца. Усё, гаворыць, строюся, каб тым бокам, дзе не ранена. Бо ў яе была прастрэлена шыя і галава так во... Прыцягнулі да хлява. Блізка ж не падыйдуць, бо агонь — гэта ж не касцёр. Разматалі, адзін за руку, другі за ногу, і — туды. Але ўсё-такі ў агонь яе не дакінулі. Радам яна ўпала. А за дымам ім не відаць. Паапякалася яна. Але адпаўзла, у агарод, у бульбу, на сябе зямлі, сяго-таго, і так во асталася жыць... Гадоў дзесяць як яна памерла. У Мінску. А сын яе жыве, працуе на трактарным.

Пытанне: — А сын быў тады з ёю?

— Дзеці паўцякалі. Бо ўцякалі так, як хто мог — дзеці сабе, бацькі сабе. Такая паніка была. І пад Сцяпуры ўцякалі, і пад Скіп'ёў, толькі пад Малыя Прусы не ўцякалі: думалі, што немцы з аднаго боку ідуць. А яны з усіх чатырох бакоў, акружылі. Бо там не пра-глядвалася: то кусты, то тое... Хто куды ўцякаў, то ўсіх і палавілі. Быў адзін выхад — на лес. Чаму? Таму, што яны лес акружылі не ад сяла, а далей, лясок застаўся ў ацапленні.

Мала там людзей нас схавалася... Цяпер у нас у Прусах не прусляне, а ўсё наезджыя...»

Памяць людзей, якая запісана на белых сярод чорнага поля плітах каля Вялікіх Прусаў; вогненная памяць вёсак, што сабрана ў гэтай кнізе; памяць народная пра ўсё, што прынесла і пакінула на зямлі і ў людзях вайна, — гэта і пакута, і трывога, але і надзея на тое, што нарэшце на прамочанай крывёю і слязьмі «ад кары да цэнтра» (Ф. Дастаеўскі) планеце мір не будзе ўсяго толькі падрыхтоўкай да новай «крывавай лазні».

**НЕ МАГУ... НЕ ЎМЕЮ...**

І жах, і жаль раптам вярталіся з далечыні ваенных дзён, і жанчына сціналася неяк, змаўкала ці плакала...

У адных мы прасілі прабачэння і яшчэ раз спакваля вярталі іх да неабходнасці расказаць.

А іншых не асмельваліся больш непакоіць — гэта старых, нямоглых.

Такіх выпадкаў было нямала.

Не менш здаралася і такога, што і старая і маладзейшая гаварылі па сціпласці менш, чым маглі б, а то і сапраўды не ўмелі. Адна нават з гэтага пачала:

— Каб гэта ўмеў ды спрытна расказаў!..

Аднак і ў гэтых «нямоглых» ды «няўмелых» кароценькіх расказах ёсць тое, што тоіць у сабе вялікі змест...

**Ефрасіння Макеева,** 94 гады. Роўнае Шумілінскага раёна.

Яе якраз забіралі з участковай бальніцы ў Казьянах. Прыйшоў калгасны «газік» — па яе і па маладзенькую маму; старую белыя сёстры ды санітаркі вывелі пад рукі, а маладой падалі ў машыну «канверт» з яе першынцам.

Мы, як параіў урач, бабулю тут не трывожылі, вырашыўшы заехаць да яе дахаты, пазней.

Гадзіны праз тры, пабываўшы ў іншых вёсках, мы заехалі ў Роўнае. Ефрасіння Ягораўна сядзела на сонейку перад хатай, а каля ног яе пацiўквала, паклёўвала чародка кураняг.

Вось усё, што яна расказала:

«...Забралі ўсіх, выгналі з хаты нас, пагналі туды за Дражакі, у лес. Прама на міны, усёй дзярэўняй гэтай. А потым — у пуню. Сем'і ўжо выбіралі партызанскія. І майго ўзялі хазяіна, і павялі. Ну, я чую, што ўжо стрэлілі, недалёка. Дык я крыкнула, а мне па галаве (плача) як даў плеццю. Казак.

А тады дамоў адправілі.

Толькі па аднаму з кожнай сям'і застрэлілі. Разулі нас усіх, усё пабралі ў нас.

Прышлі дамоў — ні лыжкі, ні кацялка, нічога нет. Бярыся, баба, з чым хочаш...

Тады, цераз два дні, кажацца, яна паехала (паказвае на дачку), яшчэ дзеўкі былі, кабылёшка была карослівая нейкая, — сцягнулі гэтых бітых... Аж і мая старэйшая дачка там...

І тады трое даччыных, і двое сынавых — пяцера дзетак пад голым небам было...

Пытанне: — Вы гаворыце — казакі; там што — казакі былі, уласаўцы?

— Там і казакаў, там і немцаў поўна было...»

**Матруна Акуліч,** 82 гады. Прыбылавічы Лельчыцкага раёна.

«...Набралася я гора, хлопчыкі, адтаго мне і няма дабра...

...Як сталі яны па мне страляць, дык я ўпала. Яны мяне прыглушылі, бо каб

не прыглушылі, дык і зусім забілі б. А то прышлі, перавярнулі і кажуць: «Капут!»

А азвацца мне не можна было. Гэта ж я ў крыві ляжу так. У ногу мяне ранілі. Дык я гэта вокам луп — яны вуллі разбіваюць. Тамака ў садзе былі вуллі, мёд...

Паляжала я ды раком, раком папаўзла... Там канаўка была, яна замерзла, а не было снегу. Дык я думаю: « Куды ж мне ісці?..» Прымусам так, як без памяці, іду...

Прышла я на куране, у лес, а там ужо дзеці абгаласілі мяне, бо там сказалі, што па мне стралялі.

Бо я, хлопчыкі, у сяло хадзіла, думала: можа, картоплі вазьму... А мае дзеці, двое дзяцей, у куранях былі. Дык я як ускочыла ў курэнь, дык дзеці — за мяне...»

**Фядора Голік,** 77 гадоў. Апанаскавічы Ушацкага раёна.

«...Я толькі гоман чую, а памяці ў мяне — што гаворацъ, нічога не чую.

Што ж я магу сказаць? Я толькі скажу, што родная сястра была, свая кроў, і гаварыць я пра яе не магу... Як яна ляжала пад вуглом, і толькі куркі клявалі яе кроў...

А ў мяне быў сынок у арміі. А другі быў — яшчэ толькі ў школу не хадзіў, восем гадоў было. І тры дзеўкі было.

І я ў хаце. Сядзела толькі і ў акно глядзела, як яны, немцы, ехалі. Думаю: выйду. Чую: хлопнулі. Гэта, гавару, яе забілі. Сын, што быў у атрадзе — за тое.

А ўжо як Красная Армія ішла, так салдаты пыта-юцца:

— Мамаша, а ці рада ты, што мы ідзём?

— Як жа не рада, калі і сынок мой недзе ў арміі. А яны гавораць:

— Мамаша, віцебскіх нет. А ідзём мы толькі масквічы і сібіране. Ну, мамаша, калі ты давольна, што мы ідзём, то пусць твае дзяўчаткі сядуць з намі і паабедаюць.

А яны ж, вядома, як дзяўчаты, самняваюцца. А я кажу:

— Дзеці, сядзьце. Радуйцеся, што Красная Армія прышла і нас ад нячыстых выбавіла... І так пралілі крыві сваёй сколькі. Нада жыць».

**Марыя Канановіч,** 73 гады. Акунінава Слонімскага раёна.

«...Вот так, ведаеце, расказваю, і сэрца такое трывожнае, што не магу...

Ну, павыганялі, пазганялі. У мяне ўжо дзяўке былі дарослыя, тры было. Адной васемнаццаць, а другой шаснаццаць... Узяла я паўвядзернічак і выйшла, а яны ў тры рады ішлі, гэтыя паразіты, задамі ішлі, па вуліцы і тудэю ішлі. Я ўжо выйшла, неяк сэрца чуствавала маё. Думаю, можа, не пойдуць. А потым вярнулі мяне:

— Ідзі, варочайся назад!

Я вярнулася ў хату, а яны:

— Дакументы, дакументы! А я ўжо на дзеці кажу:

— Схавайцеся хоць адно дзе.

—Ой, мамо, як цябе заб'юць, дзе ж мы падзенемся! Ад мамы — дзяцей... Забіраюць.

А мужык кажа:

— Нічога так не страшна, як ужо смерць ідзе за табою.

І ўжо ўсіх павыганялі, пайшлі. Усе енчылі, крычалі, маленькія і старыя, усе...

А я ўжо ў крыві ўся. Гэтак во неяк па брові куля праляцела і вот тут праляцела, зубы павыбівала. І ляжу. То нагамі дабівалі, штурхалі нагамі. Хто яшчэ не кончыўся...

Пабілі ўсіх чыста, каторыя беглі. Крыві было...

Каб не зналі вы, сыночкі, гэтага, каб ужо больш не было».

**Анастасся Скрыпка,** 73 гады. Асвея Верхнядзвінскага раёна.

«...Патом нас акружылі і выгналі на дарогу. Такая вот была дарога крыжавая: так і так дарога, на гэтую дарогу выгналі. Якое-та начальства, з такімі во высокімі шапкамі. Ну вот. Што-та яны пагаварылі паміж сабою. Мы ж іхняга не знаем. А яны толькі гаварылі: «Партызан капут». Гэта мы панялі ўжо, што партызанскія, наверна, сем'і паб'юць. Нас нада расстраляць — гэта мы панялі.

Ну вот, нас гналі, гналі па такой баявой дарозе, а тады такая ў лес маленькая дарожка. Нам скамандавалі ўлева. Мы кагда павярнуліся ўсе ўлева — па нас сталі страляць. Мы ўсе паваліліся, хто жывы, хто нежывы.

Мяне ранілі ў ногу. Адна вот тут ішла пуля, гэта мінавала, толькі варатнік, платок пабіла, пальто. Адна была ў спіну — у сухарах асталася. Там я яе нашла. (Смяецца.) Такую вінтовачную, длінную найшла.

Пытанне: — А ўпаўшы, вы чулі, што не забітыя?

— Не, я ўпала, а тады ў мяне была яшчэ падчарыца з рабятамі. Мальчышка крыкнуў. Толькі «ай!» ён сказаў і ўпаў. Мы ж валіліся ўсе. Яны ж нас у тыл стралялі, мы не відзелі. Галавы не падымай. А дзяўчына сказала: «Мама, ужо мяне ранілі!» Я радам ішла, а вот так упярод, а яна ззаду. А мая падчарыца гаворыць на дзяўчыну: «Цішай!» А яны ідуць. Думаю — вот ужо расстраляюць. Але мяне не чапілі, значыць, я як ляжала, так і ляжала.

Потым немцы адышлі, а мы ўсталі і пайшлі».

**Вольга Гардзяёнак,** 73 гады. Жары Ушацкага раёна.

«...У суботу наляцелі на сонных — дык хто куды ўцякаў.

Як сталі біць, гнаць той канец, дык мой з мальцам зваліўся за печ і з дзяўчынай за печ схаваўся. А я каля вакна стаяла. Тады гляджу — брата гонюць біць. І я стаю каля акна, гляджу. Братаву гналі біць, а потым яна неяк назад пашла, а потым зноў схапілі, пагналі...

Загарэлася дзярэўня. Я схапіла свой сундук з адзежай — вон цягнуць, і крычу на свойга:

— Памагай цягнуць, бо згарым! А ён кажа:

— Буду гарэць, абы толькі немцы не забілі мяне! Не вылязаў. А я схапіла сундук на парог, а там майго мужыка сястра бегла і кажа:

— Усіх пабілі, толькі мы з табой жывыя засталіся.

І я павалілася на ганку. А хата стала гарэць. Тады я паднялася.

А муж тады схапіў рабят з-за печы ды ў кусты пабег, уцякаць.

А перайшлі першыя немцы, дык я думаю — пайду, можа, адкапаю каго. А муж мяне дагнаў, схапіў ды ў баню запёр. Выскачыў з куста — за мяне ды ў баню ўкінуў. А я крычу ў той бані: «Ратунку!» І нічога не ведаю.

Як перайшлі другія немцы, дык ён мяне выпусціў.

Ну, вот і ўсё. Пераажылі ўсё.

Пытанне: — У вас тут многа забілі людзей?

— Многа. Семдзесят. У адзін дзень білі, у яму пазганялі і пабілі».

**Матруна Буднік,** 72 гады. Рудня Акцябрскага раёна.

«...Прыйшоў немец. Я была ўдава, і ў мяне пяцера дзяцей было. Немец рыжы, помню, узяў палку ды мяне ў машыну кідае з дзецьмі. Гоняць. Кінулі ў машыну і вязуць туды. Ага, у Азарыцкі лагер.

Прывезлі і паскідалі. Дык каторыя бабы не здалелі, дык яны прыстрэльвалі па дарозе. А я іду з дзеткамі, а дзевачка ўпала, — вось Саша яна, яна цяпер поезд прапускае тут на дарозе, стрэлачніца. Дык яна ўпала на дарозе, а яны коньмі топчуць, а яны нарочна калёсамі едуць па ёй. А яна між калёс папала і асталася жыць. Я выцягнула яе мокрую, мокрую. Гэта перад Пасхаю — вада, снег...

Пасадзілі нас за калючай провалакай. Яму бальшую выкапалі, дык якое дзіця не здалее, бо не кармілі нас там, дык яны жывых туды і кідалі.

Ідом — пераступім пабітага, ідом — пераступім на мёртвага...

Дзевачка мая — цяпер у Віцебску, і зяць мой там, — дык яна просіць:

— Мама, дайце піцця, піцця!

Я, дзеткі, нагнулася снегу ўзяць, а ён мяне па плячах прыкладам. Дык яны:

— Ой, мама! Піцця не хочам, не будзем прасіць, толькі хай не б' е.

Дзеці хлеба просяць, дык яны тады вінтоўкаю. А калі падымеш галаву, дзе ён ідзе, — страляе... Так вот ляжалі на снягу дзве нядзелі, не еўшы.

А потым аслабанілі нашыя. Такія яны, ой, ідуць, такія маладзенькія — не салдаты, а дзетачкі. Яны ж, як снарад падае, не крычаць, што «вайна», а крычаць «мама». Паабрасталі. І я сяжу, плачу, і яны ідуць. Рады, есці хочуць нашы дзеці, дык яны ў кацялок набралі вады і тры сухарыкі вынялі

мне, у тую воду на-мачылі і даюць — дзецям есці.

А мы калі ўбачылі, што нашыя, дык зразу не верылі...»

**Ганна Васілеўская,** 67 гадоў. Гарэлае Докшыцкага раёна.

«...З таго канца сталі біць, а я з адной старушкай у хату забегла. Я не дабегла да свайго дома, а к ёй на двор. Яна спалохалася, старушка, рукі дрыжаць, і хаты не можа адамкнуць. Дык я адамкнула, і яна ўбегла ў хату за мной, села каля мяне, а я за простынь, пад койку.

Немец падышоў — трах, яе забіў, а сам адышоўся і запаліў.

І я сяджу, гару. А тут кругом поўна немцаў — няма як выйці ўжо. Усё гарыць.

А тады адышліся немцы, я тады выпаўзла ў гарод і далей, далей — папаўзла і пабегла аж у другую дзярэўню...»

**Ева Горб,** 66 гадоў. Пузічы Салігорскага раёна.

«...Яны паехалі туды ў лес, кажуць, акружылі там людзей і не пусцілі іх на гала з лесу выйці. А там быў раней маёнтак, у будынак у той, у хлеў увагналі... І я да вечара не знала, што іх няма.

Ну, так стаў гарэць агонь, што да неба стоўб чорны. Ну, гэтыя ізвозчыкі — усякія ёсць людзі, — еты цягне дабро людское, што засталося, а другі, з латышоў ён, кажа:

— Ой, кабетка, за што ж вашы людзі загінулі, і старыя, і малыя, і з дзеткамі, і з калыбелькамі...

Я не знала, дзе я дзелася, а далей гэта чую...

І ўсяго я засталася. Семсот восемдзесят душ спалілі ў адным хляве — яшчэ памешчыкаў быў хлеў.

З сяла ўсяго тры чалавекі засталося. Ды яны паўміралі ўжо.

А мы гэта з пасёлка».

**Алена Лапаць,** 62 гады. Гарэлае Докшыцкага раёна.

«...Адна я засталася... (Плача.) Я ўжо забылася шэсць раз, як гэта было...

Сям'я ў нас была... Ну, быў яшчэ і бацька і маці, і сястра была ў мяне. Сястру нашу забілі — мы яе не найшлі. Яна пашла ў другую дзярэўню, у Клінніі. Ну, а я засталася. І мы тут з жанчынай... Пацяруха Марфа была. І мы з ёю ўбеглі ў хату сначала, як палілі. Яны хадзілі па дзярэўні і білі, у кожную хату заходзілі. Мы ўскочылі ў хату. І яшчэ жанчына другая, Пацярухі Піліпа жонка, і мы ў яму ускочылі. Ды ўжо гарыць хата. Мы ўвідзелі, што гарыць, — выскачылі праз акно. Дык гэтая Пацярухава жонка засталася тут, ля будынку, а мы выскачылі ў ячмень.

Падыйшоў.

Мы — ляжалі адна за адной.

Яе ўбіў на месце, а мяне раніў у руку, і во праз шыю куля прайшла.

Вот і ўсё...»

**Параска Козік,** 60 гадоў. Бабровічы Івацэвіцкага раёна.

«...Была бярэмянная. Маленькі — тры гады. А хлопчык, сем гадоў, сам уцёк у лес.

Прыйшоў у хату немец:

—Матка, дай палатна на анучы. Не ўзяў.

—Матка, дай малака. Не піў.

—Матка, сёння вас будуць убіваць.

Голая, як была, у адной спадніцы ўцякла з хаты. Яны з вінтоўкамі за мною.

— Ідзі туды, дзе б'юць!

А я ў алешнік. Бачу — свякроў забілі. Бегла па кабылу. Лезла я пад дрот, учапілася. Стралялі — спадніцу ўсю мне пажэглі. Гэта, думаю, мая жысць.

Немцы хадзілі — пастушкоў шукалі, дабіваць. Пацанят. Мой хлопец сядзеў за карчом.

Радзіла ў лесе. Зрабілі мне мужчыны будку. Пад снегам начавала. Як радзіла, два дні не было чаго есці. Знайшла казляка, упякла яго, дала малому ў роцік — узяў і ўціх. Каб цяпер гэта — век бы не выседзеў. Муж-чыны буду зрабілі, хто што прынясе. Усю зіму сядзела. Яго пакармлю, а сама так страдала.

У лесе былі, пакуль не кончылася вайна.

Гэта, што там радзіла, у Целяханах цяпер, ужо дом сабе збудаваў...»

**Зінаіда Рута,** 55 гадоў. Асвея Верхнядзвінскага раёна.

«...Нас злавілі ў лясу. Дзвесце пяцьдзесят чалавек. Бо немцы шчыталі: «дзвесце пяцьдзесят». Усіх у рад выстраілі і пусцілі па нас аўтамат. Кагда аўтаматы прайшлі па нас — мы ўсе пападалі. У мяне дочка на руках — убілі. Дзевачка, два годзікі было,

Пытанне: — Калі яны вас выстраілі, дык нешта гаварылі вам?

— Пастроілі ў рад па чатыры чалавекі і пусцілі аўтаматы. А калі пусцілі аўтаматы, мы ўсе пападалі. Я ў плячо ранена, у наге пуля ў мяне. А дочку ўбілі. Дочку — за ўтарым разам, кагда пусцілі аўтаматы, дочку ў вісок папалі. А я сама ранена сюды, гэтая старана ў мяне была ўся чорная. Абпалілі, калі з аўтаматаў стралялі.

Пытанне: — А як вы потым выйшлі адтуль?

— Ну, я не адна засталася. У нас тут Скрыпка ёсць. Я была так нагой павярнуўшы, а яна стала мяне будзіць:

— Зіна, Зіна, уставай! Ты жыва ілі нет?

Я стала да сазнання дахадзіць. Усталі мы. Кагда мы ўсталі, у нас што было... Астаўшыся шэсць чалавек. Жывых з гэтых усіх. З шасці чалавек два ўмерла. Адна ўехала на Сібір...

Пытанне: — Калі вы ўсталі — немцаў ужо не было?

— Не было. Мы тады пайшлі далына ў лес ужо. Гэта ж ноч ужо была. Цёмна ноччу. Мы пайшлі пад куст, пераначавалі...»

**Марыя Баўтрук,** 52 гады. Юзафова Верхнядзвін-скага раёна.

«...Каб гэта ўмеў ды спрытна расказаў!..

...Мы сталі ўсе ісці, беглі, а яны стралялі. Каторых ранілі. Вот і маіх раніўшы тожа былі. Мае цёткі там былі. А тады ўжо, у лес забегшы, там ужо немцы дагналі. У мяне братавая была, у яе дзеці. Ну, і немцы сказалі вярнуцца сюды назад во, у дзярэўню. Вярнуліся.

Мне было тады гадоў, можа, васемнаццаць. Мы пайшлі як маладзёж, а яны вярнуліся, іх абманулі, А мы далей у лес пабеглі.

А яны вярнуліся з сем'ямі, у іх рабяты былі, усе нашы дзеравенцы. Ну, атады гэта... запёрлі ў зямлянку. Маю братавую, двое рабят у яе было... Тады загналі за Дзежы, там кар'еры. Усіх гэтых нашых дзеравенцаў, што былі дома. Іх раздзявалі, аблівалі...

Я сваю братавую хадзіла іскала. І сястра хадзіла іскала. Двое рабят... Там толькі ляжала адзёжа параздзяватая. Мы сваіх пазнавалі... Я пляменнікаў сваіх адзежу пазнала. А людзі спалены былі. Дзе хто ляжаў. А потым іх закопвалі. Ну, прыдзеш, паглядзіш — спалены чалавек, і ўсё...

Як па падшчоту, то загінула тут сто дваццаць пяць чалавек. І радам вот дзярэўня, Кабыльнікі, там саўсем спалілі. Толькі два чалавекі, мужчыны, былі на фронце, засталіся. Да вайны Юзэфова бальшое было. А ўжо як пасля экспедыцыі вярнуліся, то адна баба ды двое рабят, а так усе не вярнуліся, усе пагіблі яны...»

**Галіна Чаравака,** 49 гадоў. Яскавічы Салігорскага раёна.

«...Прыехаў карацельны атрад, і началі паліць. Як сталі паліць, дык мы павыходзілі на двор. Запалілі напярод свёкраву хату. Мы павыходзілі на двор, а яны давай заганяць у хату. Гэтыя дзеці ўзяліся за юбку ды так крычаць, так крычаць, а яны:

— Швэк, швэк! — у хату, і ўсё. — Вы ўсе партызаны, мы вас усіх уністожым!..

На хутары ў нас было тры хаткі. Са мной было трое дзяцей і мае на руках.

— О калі, — гавару, — дзеткі, нам смерць!

Дзеці крычаць што не дай бог. Патом гналі гэтую худобу ўсю. Кабан уцёк. Яны давай кабана страляць. А я нічога не помню, так расцяралася. Адна і чацвёра дзяцей. Ну, давай яны кабана страляць. А свёкар, як сталі кабана страляць, дык ён упаў за плотам. А покуль яны кабана стралялі, мы давай адходзіць і ў лес увайшлі.

Дзеткі голыя былі. Страляюць. Я кажу:

— Дзеткі, падайце. Яны падалі.

А на хутары нікога не засталося. Адну маці забралі карову гнаць, а рабёначак яе застаўся. Дык мой старэйшы гаворыць:

— Мама, давай забяром і яго. Я кажу:

— Бяры, калі будзеш насіць.

У мяне ўжо свой быў, паўтара года, рабёнак на руках. Аднаму было тры года, а хлопчыку чатыры. Яшчэ аднаму шэсць год...

А ў лесе двух хлопцаў убачыла. Калі ўвайшла ў лес — так рада: дзе б якога свежага следу ўгледзець. Я крычу:

— Коля, Адам, ці вы дзе больш людзей не бачылі? Пад ёлкай я дзяцей паклала, і двое сутак мы сядзелі. Цэлыя суткі яны нічога не прасілі. А ўжо на другія суткі сталі прасіць:

— Мама, цёця, мы хочам есці. Потым гавораць:

— Наша бабушка столькі хлеба партызанам пякла, у сенцах ляжаў. Няўжо там няма?..»

**Аляксандра Глушаніна,** 45 гадоў. Іканы Барысаўскага раёна.

«...А каля яе засталася дзевачка, сем лет. І вот, вядома, дзіця... Як ускочылі, яна як стала крычаць, дык і дзевачку дабілі...

А ў яе ногі былі бальныя, яна не магла ісці, дык яны прышлі ў ногі пастукалі і сталі нацягваць саломаю.

Нацягнулі саломы, самі адышлі, распалілі на дварэ касцёр, узялі гармонік і сталі іграць.

Стала вечарэць.

«Ну, будуць паліць...»

Стала вечарэць, яна тады падпаўзла да плота, і рассунула гэты плот, і ўцякла ў картошку.

Тутка пусцілі яны сышчыка, гэта сабаку, аўчарку. А яна ўбіла ў кажух ліцо, каб не дыхаць...

Прайшло некалькі мінут, і гэтую аўчарку яны пазвалі к сабе. Свіснулі.

«Ну, я тады, — кажа яна, — папаўзла ў кусты. Цёмна стала, баюся ляжаць у кустах — проста на абмежку лягла і ляжу».

Раніцай апяць сталі страляць. Яны сталі ўжо гарэлаўцаў біць.

«Зра я адпаўзлася ад сваіх людзей — тут пагібну...»

Але ўсё ж такі гэта абышло яе, і яна засталася жывая.

Гэта мама была мая — Алена Глушаніна...»

## КАПАЦЭВІЧЫ

«...Гэта было 11 феўраля 1943 года. Прыехалі немцы ўмесце з ізменнікамі ўбіваць людзей. У нас быў МТС да вайны, там жылі рабочыя, — каго страчалі на вуліцы, каго ў даму, дзе каго папала, там і ўбівалі. МТС гэтая ад нас недалёка. Мы чулі стрэлы. После гэтага запалілі іхнія дамы. Быў дым, і людзі панялі, што там б'юць людзей. Яны абстралялі нашу дзярэўню. Нашы людзі як хто сумеў: хто ходам, хто на валах, хто як сумеў — ушлі ў лес. Гэта было пад вечар. Часоў мо ў пяць, мо ў чатыры. Яны прышлі сюда. Яны пахадзілі, паглядзелі, людзей няма, і пайшлі ў лес шукаць нас.

А ў мяне рабёнак быў — трэці год ужэ, сын, сястра дваццаць трэцяга года і маці. Нас яны не знайшлі. Забралі ў другім баку.

Сказалі гэтым людзям:

— Ідзіце дамой, мы прыехалі на парцізан. Еслі вы будзеце ў лесе, усё роўна мы вас найдзем, будзем убіваць і зжыгаць вашы дамы. А хто будзе дома, будзе жыць.

Паначавалі яны, пабылі, але людзі ўсё раўно не верацць, не ідуць. Дык яны паехалі ў Западнюю. Дарог у нас харошых не было. Потым наляцелі з гэтай Западняй, вярнуліся — на конях яны былі — і ў кожны дом.

Мы жылі ў калхозных яслях, нам далі ўрэменна. У другую палавіну гэтага дома ўехала іх чатырнаццаць чалавек. Заехалі ў дом, распалажыліся і — ніхто нікуда. Ні з хаты, нікуда. І пулямёты вакруг, таму што яны, мабыць, ужо планіравалі, што будуць убіваць людзей.

Я гавару на мужыка:

— Уцякай! Можа, жэншчын хапаць не будуць, а мужыкоў будуць браць і біць.

Ён выйшаў, і яго вярнулі.

Пытанне: — А яны з вамі не гаварылі?

— Яны ўвайшлі да нас, у іх былі гранаты такія, з дзеравянымі ручкамі, і водка руская, вот такія сотачкі. Яны селі і пачалі выпіваць. На мужыка кажуць:

— Ідзі выпі! Ён кажа:

— Я не хачу. Дык ён гаворыць:

— Глупый, што — рускай не хочаш папробаваць? Так, па-руску гаворыць, я вам чэсна гавару, што па-руску. А я гавару:

— Ідзі, бо заб'юць.

У іх было на фуражках: бляшкі такія, чэрап галавы. Знакі такія, іхнія. Гаварылі па-руску і па-ўкраінску. Выпівалі, потым адзін паставіў на галаве кружку, а другі з вугла б'е па гэтай кружцы.

Пытанне: — Страляе?

— Страляе ў хаце. Я гавару:

— Што вы дзелаеце, рабёнак жа баіцца! Пакінулі страляць. Я ўзяла вядро. А ваду мы бралі каля сарая, дзе потым убівалі. А адзін падыходзіць, такі хрыплівы голас:

— Пастаў вядро. Я гавару:

— Не пастаўлю.

— Пастаў вядро.

— Не пастаўлю.

Ён за вядро і гаворыць:

— Пайдзём са мной.

Я гавару:

— Я нікуда не пайду.

Ён за наган:

— Відзіш, хто я такой? Як дам, дык і галава паляціць.

Я пачала крычаць. Мужык выскачыў, муж з хаты, гаворыць:

— Што такое?

Дык ён:

— Гэта твая жана? — І адпусціў.

После гэтага ўсе яны вышлі на вуліцу, кідалі гэтую гранату. Пераначавалі, навутра — гэта было 15-га... Праўда, яшчэ скажу. Вечарам прышоў адзін з іх. Быў халат на ём белы, але пятна крові. На гэтым халаце. І на мяне гаворыць:

— Маладая, пасцірай халат. Я гавару:

— У нас мыла няма, пагарэўшыя, у нас недзе купіць...

Дык ён гаворыць:

— Я прынясу мыла, пасцірай мне халат. Мне назаўтра нужан ён.

Я ўжо воляй-няволяй стала сціраць гэты халат. Пасцірала халат, павесіла над печкаю, і ён сеў ля мяне. Ды гаворыць:

— Маладая!..

Паглядзеў і так гаворыць. Я пытаю:

— А вы адкуда?

— Я — рускі.

Да якога-та года жыў у Расіі, а потым — забыла куды — выслалі. Гаворыць:

— Я жанаты, но я цяпер раўнадушна не магу жыць з жаной, я нервы пацяраў за вайну.

Я пытаю:

— Чаго ж вы пацяралі нервы?

— Да, вайна. Усім дасталась.

Дык я думаю, што ён, можа, скажа, ды пытаюся:

— А што з намі будзе?

Дык ён:

— Ды нічаго, парцізанаў паганяем, а вы астанецеся на месце.

Раніцай забег, схапіў гэты халат. Я вам гавару, сабіраліся, як чэрці! Па-быстраму, па-быстраму, абуваліся і ўсё, што ўгодна, і выскачылі на вуліцу. І відно, што ў сараі, — гэта метраў сто было ад нас, — што стаялі там падводы. І калі яны пабеглі з дома, то падводчыкі маментам выцягвалі сані з сарая і коней выводзілі. Панімаеце, гэта я ў акно відзела. І мы так паглядзелі з мужам і гаворым, што будуць убіваць у сараі. Нада ўцякаць. Ён гаворыць:

— Давай, пайшлі. Я гавару:

— Ты ўцякай.

Прайшлі мы за дрывамі, і ён пайшоў, адышоў трохі ад мяне, дык там гавораць:

— Хазяін, варацісь, а то стралять буду.

Дык ён усё роўна ідзе ўпярод. А я махаю — уцякай! А той зноў:

— Варацiся, а то ўбіваць буду.

І ён вярнуўся. Вярнулісь мы ў хату, а наш дом, яслі тыя, стаялі насупраць вуліцы, і было відна, што па вуліцы людзі ідуць таўпой. Гоняць ужо, гоняць сюды, пад нас. Ідуць таўпой — і малыя, і бальшыя, і ўсякія. Нам ужо тут дзявацца негдзе. А наш дом яшчэ не займалі. Сястру маю, дваццаць трэцяга года, забралі гатовіць для іх есці, у другі дом. Мы гаворым:

— Нет ужэ спасення, давай уцякаць!

Ён — у вакно, даў у раму і на мяне гаворыць:

— Я буду пацана несці, а ты — за мной. І толькі прыгаць, а я яго так схваціла:

— Куда ж ты! Кругом пасты. Ён мне:

— Давай усё роўна ўцякаць. Хай лепш у патыліцу. А я гавару:

—Давай здзяром паталок.

Мы сталі на печку, гэтыя доскі ўзарвалі, ён узлез на паталок, я падала дзіця і сама ўспрыгнула туды, на той чардак. А маці наша ходзіць па хаце, дык я гавару:

— Мамачка, давайце сюды. Дык яна гаворыць:

— Я не палезу.

І тут ужо падходзяць пад дом. Панімаеце, позна разгаварываць. Я разоў пяць паўтарыла. Мы гэтую дырку закрылі і засталіся на чардаку. Муж гаворыць:

— Разве тут спасенне, спасення нет. Давай уцякаць.

Я гавару:

— Няма куды ўцякаць.

— Жывымі гарэць! Ці знойдуць, здзявацца будуць. Дык я гавару:

— Ну, што ж, уцякай, жыві хоць адзін. Дык ён:

— Я буду ўцякаць, знаць буду, што ты тут пагібла, прыду пахараню.

Мы з ім папрашчаліся. Ён назад у гэтую дырку, у вакно і пабег. Бег мінут пяць, ціха было, зразу адзіночныя былі выстралы, а патом аўтамат. Я думаю: усё кончылася, не выпусцілі. А малога я не дала, ён астаўся са мной.

Калі забілі ўсю старую дзярэўню, быў перарыў, пакуль падагналі з новай. Потым падагналі зноў гэтых людзей і зноў страчылі там гэтыя аўтаматчыкі. А я глядзела, давала страх пацану: паднясла яго к гэтай шчэлі і гавару:

— Еслі ты крыкнеш — відзіш, як людзей убіваюць, баба наша пайшла, цёця наша пайшла — і цябе ўб'юць!

Яму трэці год быў. І ён не крыкнуў.

Перабілі і новы пасёлак. Патом неслі нейкую флягу. Не знаю, што ў ёй было, но факт той, што гэты сарай аблілі нейкай жыдкасцю і запалілі сарай. І зноў вярнуліся ў гэтыя яслі. У суседа мандаліна была, і пайгралі, і выпівалі. Я на чардаку была, а яны ўнізу танцавалі, прыстуквалі. Патом выйшаў адзін з іх і сказаў:

— Запрагай!

І паехалі на Заглiннае. Не ўсе паехалі. І ў гэты самы дзень, гэта шаснаццатага феўраля, убілі Заглiннае.

А гэтыя пераначавалі і па парадку сталі паліць дзярэўню, забіраць скот і ўсё, што ім хацелася. І падышлі пад яслі. Я думала, уцяку ноччу. Днём была адлёга, а ноччу мароз. І часавыя гэтыя як ходзяць, дык пад нагамі ў іх снег хрусціць, і чутно. Калі б адна я — папаўзла б, а дзіцё, думаю, разбужу, яно закрычыць. Патом падыйшлі яны пад гэтыя яслі. А яслі былі крыты дошчачкай. Яны палілі дзярэўню — падыйдуць і стрэляць зажыгацельнай пуляй. Але гэтая дошчачка не загарэлася. У нас ляжаў у калідоры лён, і яны ў гэты лён стрэлілі. Дым пайшоў і праз гэтую дырку такая дымавая завеса, што я бачу — гарэць буду жывая. Дык я — праз дырку назад у хату, у акно, і, калі я ўдзірала ў акно — у пацана ўжо гарэла пальто.

У лесе я шукала людскіх слядоў. Я шчытала, што ніхто не застаўся ўжо, што ўсіх убілі.

Я і плакала, я і гукала. Мне здавалася ад страху, што нікога ўжо няма на зямлі, што ўсе ўбітыя. Сколькі я хадзіла — я і сама не знаю...»

Так забівалі, забілі адну з палескіх вёсак — Капацэвічы на Старобіншчыне.

І так памятае пра тое **Ганна Міхайлаўна Грыцэвіч.**

Калі судзілі былых карнікаў, якія ў складзе эсэсаўскага батальёна Дзірлевангера забівалі, палілі людзей у беларускіх вёсках, адзін з гэтых нелюдзяў успамінаў, як гэта ў яго было «першы раз».

«...У вёсцы немцы і нашы былі пастроены ў дзве шарэнгі. Як я помню, спераду стаялі немцы, а за імі — мы. Наш афіцэр праз перакладчыка (прозвішча я не памятаю) загадаў, каб мы выконвалі ўсе распараджэнні нямецкіх салдат, а хто не выканае, той будзе расстраляны. Кожны немец прапанаваў таму, хто стаяў ззаду, ісці разам з ім к хаце. Каля кожнай хаты спыніліся па два чалавекі, немец і наш, тады афіцэр падаў каманду зайсці ў дамы. Я разам з немцам зайшоў у пяты ці шосты дом, а ўсяго ў гэтай вёсцы было дваццаць пяць ці трыццаць двароў. У хату я ўвайшоў першы і ўбачыў за сталом старога і старую, гадоў ім было па семдзесят, а побач з імі сядзеў хлопец гадоў пятнаццаці. Немец мне паказаў: «страляй» — рукой на тых, што сядзелі ля стала, паказаў. Я са сваёй вінтоўкі зрабіў тры выстралы, у кожнага па разу выстраліў. Страляў я ва ўпор, і яны ўпалі на падлогу. Пасля мяне па іх даў аўтаматную чаргу немец і сказаў: «Капут».

— Канец, усё! — пра забітых сказаў той фашыст, але нібы таксама і пра свайго памагатага. Бо і яго ж гэта быў канец. На аднаго чалавека стала менш, на аднаго карніка, фашыста — больш.

Капацэвічы — гэта была вялікая палеская вёска. У сённяшніх Калацэвічах — сённяшняе жыццё. Толькі, здараецца, — як напамінак — прывязуць аднекуль былога паліцая, пакажуць людзям:

— Пазнаяце?

І да нашага «газіка» ў некаторых вёсках падыходзілі, падбягалі: «Дзе яны?», «Хто?», «Казалі, зноў паліцаяў прывезлі...».

Хаваўся ён ажно дваццаць пяць ці трыццаць гадоў. На людзях і ў сваёй сям'і жыў, але чым жа было для яго ўсё тое, што іншых радуе, што для іншых — шчасце: добрыя дзеці, жонка? *Яны ж не ведаюць!..* Добрая праца, набытак, нават імя, можа, і нядрэннае сярод тых, з кім працуе. Стараецца ж перад тымі, хто раптам заўтра *даведаецца!..* Як пячэ ўсё гэта — жахам!.. Пачуюць усе знаёмыя і дзеці яго, што ён карнік, забойца дзяцей, жанчын...

«...Мы з маткаю пайшлі ў гэту абору, у гэты сарай.

Праўда, куча ляжыць людзей, ну, што там, ці гэта людзі, ці гэта якія мяшкі — я ўжо не разбіралася, што там такое ляжыць.

Адна сям'я прасілася, стаяла на калідоры, я гэта відзела, а ўтарую сама расстрэльвалі. Мужчына быў салідны такі, у яго рабёнак на руках. Яму як далі — рабёнак паляцеў з рук, а яму яшчэ раз у патыліцу, тагда ён упаў. А тыя ўсё яшчэ прасіліся ў калідоры.

Я ўсё стаяла і назірала. А напроціў мяне стаяў з наганам — адзін вот так, як вы сядзіце. Я апусціла во так рукі, а ён адходзіць, і адходзіць, і адходзіць— мо каб ён страляў, дык ён папаў бы ў мяне. Адходзіць, адходзіць, я стаяла, стаяла, а далей во так рукі (паказвае) і ўпала. Упала, каб ужо нічога не бачыць...»

(З расказу жыхаркі Капацэвіч **Вольгі Сцяпанаўны Вядзерка.)**

На судзе адзін з былых карнікаў нагадаў, як аднойчы яго родны сын сказаў, гледзячы тэлефільм: «Я б сам іх сваімі рукамі...» Пра забойцаў, фашыстаў сказаў... Былы карнік нават замахнуўся тады на сына. Быў вельмі п'яны — гэтым жонка і дзеці вытлумачылі незразумелыя яго паводзіны.

А потым даведаліся...

Многія з падсудных клялі тых, у каго калісьці стажыраваліся, хто камандаваў імі. Малых і буйнейшых сваіх фюрэраў — камандзіраў рот, узводаў — Поля ды Пляца, Цымермана ды Сальскі, батальённых камандзіраў Зіглінга ды Дзірлевангера. А вышэй былі паліцэйскі генерал Готберг ды самыя галоўныя карнікі — гімлеры, гітлеры...

Ды толькі і самі яны, хоць і выканаўцы, але не «дробныя», калі ўдзельнічалі ў такім. Рабілі ж, выраблялі разам з тымі пляцамі ды зіглінгамі вунь што!..

Гэта — з расказу капацэвіцкага жыхара **Кузьмы Лук'янавіча Агіевіча.**

«— Хазяін?

Я кажу:

— Хазяін.

— А дзе матка?

— Адкуль я ведаю, дзе матка.

— Забірай з сабой дзяцей.

Двое дзяцей было па два гады, а адно — шэсць месяцаў. Хлопчык яшчэ быў, восем лет. Дык таго жынка адправіла за бацькам паліцэйскага, сказала яму:

— Можа, ты будзеш жыць, дык хоць маё дзіця спасі.

Ён не сусед, а проста ішоў па сяле, а ў яго такі самы хлопчык быў, яны ўмесце дружылі... Яны як сказалі мне: «Забірай дзяцей», дык я адразу віжу, што гэта дзела к канцу прыходзіць. Я гавару, што як жа траіх дзяцей вазьму! Дык яны ўзялі на вуліцы дзвюх жэншчын, ды ім па аднаму дзіцяці, а я трэцяга ўзяў — і нас пагналі.

Патом па дарозе мяне адзін дабраволец[28] вызваў... А на мне былі хромавыя сапагі. Вызваў з таўпы народа, завёў мяне ў хату, садраў з мяне сапагі і даў галошы фабрычныя, гаворыць:

— Дайдзёш!

Загналі нас на плошчу, дзе памятнік цяпер стаіць, і вот на гэтай плошчы, значыць, адбіралі чалавек па пяць, па тры, такімі парціямі, і заганялі ў кароўнік. Тут жа радам. Ага. А ў гэтым кароўніку стаяў ён і расстрэльваў людзей.

Калі папаў я таксама ў тую абору, мяне там раніла...

Пытанне: — Вас заводзяць туды, а вы яго не бачыце, таго, што стралящь будзе?

[28] Так называлі здраднікаў з ліку былых ваеннапалонных.

— Чаму не? Ён стаіць і камандуе: «Дальпа, дальша!..»

А трупы ляжаць. Як толькі адышоў ад сцяны, дык ён з аўтамата — шах!..

Ну, а я якраз прыгнуўся, і мне на галаве пуля толькі сарвала кожу. Ну, я ўпаў. Дзіця ў мяне было — дзіця ўбілі. А тыя ж — я не ведаю дзе. І старэйшы хлопчык мой да мяне папаў, пакольні паліцэйскага бацьку таксама туды загналі і расстралялі. Дык хлопчык мой ка мне папаў і пры мне быў. Ну, я ляжаў... Ляжачаму мне папала яшчэ чатыры пулі. Пяць пуль я панёс у аборы. Але касці нідзе не пабіла, толькі ўсё ў мякаці.

Ну, мы паляжалі, пакуль гэта ўсіх перабілі людзей, і патом яны вышлі.

Ну, асталіся некаторыя падросткі. Яны, значыцца, падняліся і гавораць:

— Ужо няма нікога.

Дык голас жа ж мы знаем свой! Я прыпадняўся. І яшчэ адзін мужчына падняўся:

— Ты жыў? Я гавару:

— Жыў.

— Бегчы можаш?

— Магу.

Ну вот, мы падняліся і пабеглі. Басяком. Галошы там засталіся. Вядома ж, яны толькі ваткнуты былі на ногу. І я басяком кілометра тры па снезе прабег. А потым ужо жанчыны за мною беглі і мужчыны. І мне жанчына адна зняла галошы, яна была ў валёнках з галошамі, другая — юбку, я ногі паабверчваў, мы пашлі дальша. І там начавалі.

Нас тады вышла з аборы дзевятнаццаць чалавек.

Пытанне: — А колькі там засталося?

— Забілі чатырыста дваццаць шэсць чалавек. Пробавалі некаторыя мужчыны пабег дзелаць, але іх на хаду... Гяны ва ўсім гэтым шчоце...»

Як здзівіўся, спалохаўся адзін з былых карнікаў, калі яго прывезлі ў сённяшнія Капацэвічы — пастарэлага ўжо, азызлага, — а яго пазнаў **Мікалай Іванавіч Рудзеня.**

— Ну што, прышла вочарадзь? — спытаўся ён у карніка. — Памятаеш, ты штурхаў мяне пад таго немца, што страляў, а я табе сказаў: «Прыдзе вочарадзь і да цябе!..»

«...Па хатах размясціліся, у каторых былі малыя сем'і, і там яны жылі ноч гэтую, — расказвае Мікалай Рудзеня, — у мяне ў хаце не былі. У суседа былі. У мяне яны паставілі толькі коней у сарай. А ў мяне якраз жыў брат, з сям'ёю жыў, дык яны толькі коней у мяне паставілі. Тая хатка была ўжэ на замку, а ў мяне было і так поўна — дзве сям'і.

Пытанне: — А пра што яны ўвечары гаварылі з людзьмі?

— Што яны там гаварылі — не магу я сказаць, бо я туды не хадзіў. Ну што, яны? — яны пазіралі так, каб штонебудзь зрабіць... Каб якую дзевушку маладую паймаць... Такія працадуры былі, канешне... Рабілі. Насілавалі...

Кагда ўжо запалілі жэншчыны ўсе ў печах, гатовіць заўтрык, яны пачалі ўжо зганяць народ. Прадлагалі такім способам:

— Будзем дзелаць праверку пашпартоў.

А ў нас жа тады пашпарта былі. Ага. Куды ж тут пашпарты, калі з маленькімі дзецьмі!.. Ужо тут не да пашпартоў, тут панятнае дзела.

Зайшло ка мне чалавек шэсць. Выганяць з хаты. У мяне было тры дзевачкі. Адной быў сёмы год, другой — трэці, і месяц адной дзевачцы было. І ацец, семдзесят пяць лет, быў. Жынка, ацец і я. Ну, пагналі. Прыгналі сюды во на вуліцу, дзе памятнік сяйчас. У каго абдзіралі з ног, што хорошае, заводзілі ў памяшчэнне і знімалі сапагі. Ну, прывялі ўжо сюды ў таўпу, і, значыцца, разрашыў аднаму бацьку паліцэйскага — сын у паліцыі быў — забраць сваё родства з гэтай таўпы. Ну, кагда ён пачаў адводзіць — кожнаму ахвота жыць... Тут ужо страляюць, б'юць, плачуць у гэтым сараі... Наадводзіў ён поўна. А яны паглядзелі, што многа, і абратна яго ў таўпу...

Пытанне: — Аёні суседзяў набраў?

— Кожны ж прасіўся. Свае людзі. Думаецца, палічаць, што радство, можа, і астануцца жывыя. А яны абратна іх вярнулі... Бралі па чатыры, па пяць, па шэсць... Так пападала, вобшчам, што сем'ямі.

Калі ўжо мяне ўзялі... Атца ўзялі, ужо ўзялі расстралялі... І кагда мяне ў сарай вялі, то адзін — цяпер яго паймалі і судзілі — крэпка ствалом

таўкануў у плечы. І кагда я сказаў: «Прыдзе вочарадзь да цябе!» — дык я тады паняў, што ён рускі. Па-нашаму ён мне... А так яны ўсе ў нямецкай форме. У чарапах у гэтых. Ну, карацельны атрад. І калі яны ўтаўкнулі мяне ў сарай і палажылі, я папаў якраз на атца. І лажылі так, каб галава была ўвярху. І вот калі яны палажылі — пачалі стралядь. Мне папала дзвюма па галаве, трэцяю рэзанула так (паказвае), — яна і сяйчас сядзіць у мяне... Я ляжаў на баку, і глаз левы быў у мяне адкрыты: я слядзіў за імі, што з гэтага будзе. Яны, кагда ўжо ўсіх пабілі, пачалі дзелаць праверку. Многія во так... Асобенна пацанам папала. Плачуць:

— Дабі!..

Крычаць, лаюцца — усяляк там было. У гэтае ўрэмя, кагда яны прайшлі па праходах, — крові было многа, яны ўсе ўмазаліся ў кроў. Адзін наш папробаваў выскачыць (паказвае), вот гэтага Агіевіча Кузьмы нябож, — і тут жа як падняўся, так яго і дабілі.

Ну, я ляжаў, мяне праверылі, вярнуліся назад, і мне крэпка сюда ўдарыў у нагу. Ён пачаў слухаць — пачуў дыханне, яшчэ тры разы стрэліў, але ўжо не папаў у мяне... Стрэліў абратна слухае... Нахіліўся блізенька...

Потым яны што-та пагаварылі, паднеслі нейкую флягу з гаручым, пачалі абліваць гэты сарай, вышлі... А часавы стаяў з другога канца.

А ў гэта ўрэмя Кузьма падняўся бегчы. Яму харашо — яму толькі ў мякаць папала. І ў гэта ўрэмя я падняўся, мне бяжаць нельга было. Выскачылі мы на вуліцу, часавы крыкнуў: «Стой!» — і выстраліў уверх і сам схаваўся.

Ну, мы пабяжалі ў лес, я нямнога прайшоў, паваліўся, патом абратна ўстаў, дабраўся да кустоў, пасядзеў, паеў хлеба нямнога, патом абратна падняўся, папробаваў, дайшоў да падонка, дзе сена набрата было, і там паваліўся.

І кагда ўжо вот цяперашні яе мужык (паказвае на Ганну Грыцэвіч) дзелаў разведку, хто дзе астаўся, — вот ён мяне знайшоў, партызан, здзелаў мне перавязку, забралі ў лес, у зямлянку.

Пытанне: — Дык цяпер вы напомнілі? Таму, які гнаў вас...

— Сказаў: «Ну што, прышла вочарадзь?» Ну, што ён цяпер?.. Глядзіць».

**РАЗЛІЦЦЕ**

Лясная вёсачка ў Барысаўскім раёне. Расказвае **Юлія Сушко,** жанчына адзінокая, шэсцьдзесят тры гады.

«...Вот яны як ехалі, — а я ў тым канцы жыла, — пяць машын, дык часць разгрузілася і пабяжалі па шашы, а часць да лесу пабяжала.

А я са сваёй дзевачкай хацела ў кусты. Муж быў у партызанах. Толькі прышоў з Фінляндыі, пабыў год, а тут ізноў вайна пачалася.

Хацелі мы ў жыта, а гэты немец бяжыць:

— Да старасты, да старасты!

Ну, мы знаем, дзе староста жыве. Я дзевачку за руку, але не да старасты, а во дзе была калхозная будоўля. Але ён нас прагнаў. Тут стаіць упоперак вуліцы, а тут ачапілі — на адну сторану з пулямётам і на другую.

Тады я кажу:

— Бабачкі, хадзем прасіцца. Падышлі мы і кажам:

— Паночкі-любочкі, няўжо вы нас паб'яце? Мы ж нічога не вінаваты, што дзе ў партызанах, ці што...

А яны гавораць:

— Вас жывых будуць у агні паліць. Но толькі мы нічога не дапаможам.

Ілі яны паліцаі, ілі яны ўкраінцы?

— Кланяйцеся, — гавораць, — каменданту. Падайце на ногі.

Я спрашываю:

— Які камендант? Ён гаворыць:

— Срэдзі народу ў плашчы стаіць. Мы да таго каменданта:

— Паночак-любочак, мусіць, нас будуць біць? А ён як крыкнуў:

— Вам усім капут!

Загадаў расчыніць дзверы ў пуні.

Тут мама мая радам стаяла каля пуні. Думаю: «Пабягу, скажу, што будуць жывых паліць». Аж яны пуню расчынілі. Думаю: «Нас будуць першых паліць».

І тады сталі ўжо разбягацца, а яны сталі з пулямётаў касіць.

І вот я выбегла сюды за кусты. Аж мяне ранілі. Тут во разрыўною пуляй усё вырвала. Тады я платком перавязала. І стаяць удвух немцы. Я:

— Паночкі, дабіце мяне, мне дужа трудна!.. (Плача.)

— Ідзь,— кажуць,— у кусты, ідзь у кусты!

І тады я яшчэ з гарачкі іду, а тут дзеўка суседняя мне на ногі ўпала. Я кажу:

— Волька, я цябе не пераступлю.

А ёй у галаву якраз... А я ў кусты, аж там і мая дзевачка да мяне прылучылася, восем год. А другую маю ранілі ў нагу. Праскочыла нас: дзяцей штук пятнаццаць і бабы. А ўсіх выбілі.

Тады мая дзевачка бачыць, што кроў льецца ў мяне, — у гэтых дзевачак платкі ўзяла і адразу стала заматваць... Ямку пракапала, мне вады дастаць...

Вечарам прышлі яшчэ бабы, іх тры засталося...

А тады партызаны мяне вынеслі. Нейкі армячок быў, паслалі на насілкі і вынеслі мяне. Партызаны, ага. Палажылі там у кустах. Усё ж спалілі. А камароў!.. Тады я паляжала тры дні, і пашлі па мне чэрві. (Плача.) Бацька стары прыехаў з падвод і завёз у вёску да сябе. І гэтак там ляжала. Ён пашоў ёду, марганцоўкі прынёс, і Маньку прывязлі, якая цяпер робіць урачом. Дванаццаць метраў бінту было, дык яна сказала чыстым бінтам здымаць бруд...

Усю радню нашу выбілі. Было тры сястры... Асталася — хустачкі на галаву не было...

Сорак восем было гаспадарак. Чалавек сто восемдзесят — усіх пабілі. Асталося чатыры бабы і два мужчыны. Адзін у ячмені лёг, а другі ў калодзеж ускочыў. Спачатку зруб туды абярнуў, з калодзежа каторы, а тады і сам на яго скокнуў. Каб не ўтапіцца. І ў падводах, каторыя былі. Мой тата стары. Але яны ўжо ўсе паўміралі...

Штыхамі дзетак маленькіх паролі...

А потым, як ужо наша армія ішла, нашы ў плен іх узялі. І шанавалі. Мы пайшлі глядзець, дык яны сядзяць каля агню, павычосваліся... Пленныя! Дык мы кажам:

— Каб вас у агонь паўкідаў, як вы нашых дзяцей кідалі!..

Так яны і пасунуліся ад агню далей...»

Пасля, у той самай хаце, пра тое самае расказвала Настасся Шыла. Семдзесят шэсць гадоў. Высокая, суровая, гучнагалосая, як прарочыца. Але, расказваючы, сяды-тады нервова засмяецца... І пачала з такога смеху — сцішнаватага:

«...Ха-ха-ха! Па парадку кажаце? Я ўжо баяла гэты парадак. Прыязджалі ўжо следавацелі і да вас...

Ну, як было... Казалі людзі, што падарвалі машыны, пяць вёрст адгэтуль, а потым забілі народніка на пуці. А мы былі ў лесе, каля ракі, і яны нас, немцы, знайшлі там. Гэта як першая блакада была. Гэтага забітага прывязлі ў дзярэўню і сказалі пахараніць. Мужчын у нас многа было, яны зрабілі гроб і абабілі белым. Тады яны пастаялі каля гэтага гроба і сказалі:

— Ляжа вас дзвесце чалавек.

Народнікі гэтыя. Я сама стаяла. Поўна людзей на вуліцы было. Дык я і чула, як яны казалі. Не зману.

Тут каля Сінічына самалёт спусціўся... Два іх спусцілася, але я ўжо буду казаць, што адзін. Бралі нашых мужчын у падводы. Усіх пабралі і майго хазяіна ўзялі. Я з дзяцьмі. Пяцёра ж дзяцей. І ночы я не спала, і дзень хадзіла...

Аж яны і прыехалі біць. Я ўстала. Сем машын іх прышло. А тут уздумалі, што будуць забіраць у Германію. А мой хлопец адзін ужо ўзрослы. Дык я кажу:

— Ну, дзеткі, паехалі, пэўна, пагоняць ужо ў Германію ці паб'юць.

Палажыла большага сярод меншых, а сама за вядро і пайшла. А бабы, суседкі, і будуць казаць:

— Вот нам цяпер смерць. А я кажу:

— Бабы, не валнуйцеся, бо ў Саёх занялі, але не пабілі.

Во як я бабам гаварыла. Яны ад мяне пайшлі. А ўжо мяне немец і злавіў, бо я ішла ўжо да сястры, да Марылі. А ён даганяе мяне і крычыць:

— Капут, капут!

Тады я іду, аж ужо нашых сагналі. Яны вось і плачуць некаторыя, а мы вось з гэтай Юлькай. (Паказвае на гаспадыню, Юлію Сушко.) Ён стаіць, на вінтоўку апёршыся... А ўжо ўсе нашы прышлі. І дзеці мае. Пяцёра дзетак ка мне прышло. Я во так іх згарнула, — яны ж яшчэ невялікія, — а мой хлопец, большы, узяў і пабег! Уцёк. Ён на кладбішча ўцёк. І неяк прабраўся, і другога пазваў, і ўцёк. Ну, а гэтых чацвёра ля мяне.

Юлька гэтая падышла яшчэ і кажа:

— Пан, ці нас заб'юць? А я кажу:

— Што ты просіш гэтага калка? Стаіць вот. І нічога не гаворыць.

І мы адхінуліся.

Калі я гляджу — аж ужо стаіць лёгкавушка і яны, чалавек шэсць, стаяць. Ды гэтыя плашчы вялікія, ды рукавіцы чорныя...

Дык мы во гэтак падышлі, а я думаю: «Не пайду наперад, бо заб'ецьʼ».

А старшына наш (смяецца)... ці стараста, — чорт яго ведае, — дык гэты хацеў з імі ехаць. А яны плюнулі на яго і не ўзялі: дзяцей многа... Старасту першага і забілі, Лявона.

Ён паваліўся, а я не лезу наперад. Аж гляджу — пабеглі ўсе, дык і я па полі... Вуліцай во так, у жыта. І я бегла. І братавая мая бегла. Мы ўдзвёх з ёю. Дык яна павалілася і ляжыць. А я глянула во гэтак... Ці паверыце вы мне? Я ж не маню, — я глянула, што яна ляжыць, і я пабегла, у плот ушчамілася, за хлеўчыкі, і засталася я жывая. Тры сялібы перабегла. За хлявы. Густа была будоўля.

Тады я гляджу — ажно мая дзяўчынка, во гэтачкая, бяжыць! Бяжыць з таго жыта. Ужо яны радзей стралялі. Дык я тады за гэтую дзяўчыну ды кажу:

— Ай, дачушка, ужо ж нам усё! А чацвёра ж дзе яшчэ?

Тады я схапіла гэтую дзяўчыну, а з ёю так во ватовачку, а сама ў жыта. А яно счарнела ўжо, маё дзіцятка, на мяжы...

І я пералежала ў жыце з гэтай дзяўчынай.

Як ужо білі!.. Ай, білі!.. Лес шумеў і зямелька стагнала, як білі! Хто дзе...

Колькі нас адбеглася? Бабы дзве толькі. А то ўсё дзеці. Яны пусцілі з пулямётаў у рост, а дзеці маленькія, і засталіся, гадоў па пяць, па шэсць каторыя.

Я была здаровая, дык я бегла, я б цяпер так не пабегла...

Пытанне: — А вашы дзеткі?

— А мае дзеткі недзе чацвёра. Толькі адна каля мяне. Меншая самая. Яны там, немцы, доўга стаялі. Я во так падсунулася да мяжы, каб паглядзець, а яна:

— Ай, мамачка, не кідай мяне!..

Я падсунулася — аж мая хата, роўна акон, гарыць!.. І паехалі яны, бачу я. Тады я пабегла і знайшла... Каго я знайшла? Крысціну. У яе на руцэ дзяўчыну забілі. Кулю Цыганаву знайшла. І дзяўчынку Шурку. Вот колькі нас. Пабеглі мы ў лес. А тады я ішла, дзяцей гукала, аж во гэта, раненая... (Да гаспадыні.) Ты, Юлька, ляжала, а я цябе знайшла. Знайшла яе, каля яе было чацвёра... А гразь такая!

— Хто там? — кажу я. — Хадзіце ка мне! А яны кажуць:

— Вы хадзіце к нам!

Вядома, невялікія дзяўчата. Я ўзяла к ім прышла. А во гэтая Юлька ляжыць, чуць жыва. Я так нагнулася, кажу:

— Ах, Юлечка!

А яна ўзяла ды хліп-хліп... А дзяўчына гразі ўзяла ды на яе. Гэта там вада такая была — адна гразь. Сёмы годзік дзяўчынцы было, а маці, Юлька гэта, стане што папала гаварыць, дык яна вады на яе. Так ратавала яе. Пракапала ямку і брала з яе ваду. Юлька голая ляжала, дык яна ёй на грудзі вады, на твар...»

Разліцце — вёсачка «бесперспектыўная». Так нам сказалі на двух узроўнях, у сельсавеце і ў раёне. Прапанавалі цёткам з гэтых сумных хатак перабірацца ў цэнтр калгаса, гарантавалі, як гэта робіцца, дапамогу, а яны — не хочуць.

Дзіўна? Не вельмі.

Гадоў некалькі перад гэтым на Гродзеншчыне нам здарылася сустрэць штосьці падобнае. Куды там падобнае — курную хату!.. Не ў музеі ці на карціне, а ў Лідскім раёне, на тэрыторыі багатага саўгаса «Малое Мажэйкава». Саўгас пабудаваў двухпавярховы дом, а бабку з курнай хаты ніяк не маглі ўгаварыць перайсці ў кватэру з усімі выгодамі. Дырэктар напісаў яе сыну ў Ленінград, на Кіраўскі завод, што саўгас аплоціць камандзіроўку, абы толькі хлопец угаварыў маці не ўпарціцца. Цэлая казка, калі хто недаверлівы... Ашто ж у бабкі была за прычына не пераходзіць? Старая ліпа перад акном, а пад ліпай — крынічка... Так яна, бабка, сама гаварыла.

Разліцце — нейкія тры хаты, хлявочкі, платы, агароды... І лета сваёю раскошай сумоты такой не прыкрашвае. Бабулю Настассю Шыла дачка была забрала ў Казахстан, дзе яна працуе бухгалтарам, але старая там не прыжылася. Тут трымаецца, а пры ёй, як пры маці, і Юлія Сушко. Для гэтай вернасці роднаму кутку знешніх прычын асаблівых няма. Старэюць хаты, старэюць маці. Над тым калодзежам, у якім быў схаваўся адзін з двух ацалелых мужчын, зруб зноў струхлявеў і сам, кавалкамі ды парахнёй, абвальваецца ў недалёкую ды падазроную ваду.

«Заўтра якраз трыццаць год з таго дня», як загінуў яе сынок, і яна туды пойдзе, на тую магілу, і «буду дзень там плакаць»...

Таму і з Разліцця нікуды перабірацца не хоча, і ад дачкі таму вярнулася — з той цалінная выгоды.

## ПАМЯЦЬ

Быў на Случчыне засценак Падлявішча, прыгожы засценак, двары шырокія, у садах, як у вянках, дамы на высокіх падмурках, крытыя гонтай. Калгас тут хутка ўвабраўся ў сілу, і назву вёсцы далі новую, савецкую — Чырвоная Старонка.

Яшчэ ў тыя гады пасадзіў Кандрат Лапец на сваім пляцы бярозу. Не для пажытку, для красы. І любаваўся дрэўцам чалавек, не падазраючы, што неўзабаве яно стане помнікам на яго магіле.

28 студзеня 1943 года карнікі напалі на Чырвоную Старонку, Гандарэва, Старэва, Лазараў Бор і іншыя вёскі і вёсачкі наваколля. Папалілі іх, моладзь пабралі ў Германію, а старых пабілі. Партызанскі сувязны Іван Лапец, Кандратаў сын, прыйшоў на сваё пажарышча, знайшоў нежывога бацьку і, аплакаўшы, пахаваў на падворку пад бярозай, як здавён хавалі людзей, забітых громам. Пасля вайны Іван Кандратавіч пабудаваўся на другім баку вуліцы, старое котлішча пустуе. Ад той бацькавай бярозы насеяліся дрэвы-дочкі, яны абкружылі магілку гаспадара. Надмагільны камень, пастаўлены сынам, згубіўся паміж жывых абеліскаў-бяроз.

У вёсцы Казіміраўка на Мазыршчыне пажылая, смуглявая жанчына з вялікімі, як на старых іконах, вачыма падвяла нас да шэрага

каменя пад яблынькай у агародзе. Там магіла яе сям'і, замардаванай фашыстамі. Пра трагічную пагібель родных і сваё выпадковае ацаленне Улляна Казак расказвала неяк надзіва стрымана і паслядоўна, хоць папярэджвала нас, што находзіць часам на яе зацьменне, забыццё. Калі мы фатаграфавалі яе тут, каля яблынькі, жанчына стаяла спакойна, як бы не бачыла нас, а потым падняла некалькі яблыкаў з муравы і падала нам — частуйцеся. Сцішнавата выглядала гэтае нечаканае запрашэнне прычасціцца да памяці нябожчыкаў. Але для нашай шчырай субяседніцы, сялянкі з сухімі, пацямнелымі ад працы рукамі, усё тут было, відаць, натуральна. Тыя, што тут ляжаць, садзілі яблыню, пра іх яна напамінае сонечнымі пладамі.

У свой час давялося нам бачыць на брэсцкім Палессі абгарэлыя дубы на котлішчах вёскі Тупічыцы на беразе Бабровіцкага возера. Не шмат засталося гэтых дрэў-ветэранаў: толькі тыя, што раслі наводшыбе ад сяла, далей ад пажарышча, толькі яны захавалі ў тоўшчы магутных камлёў пад бранёю кары рэшткі жыццёвай сілы. Ім паабпальвала голле, агонь павыядаў чорныя дуплы ў падсохлых ствалах, — яны зеўраюць абвугленымі праймамі, уражваюць удзень, палохаюць уначы. Гэтыя абвугленыя галіны-рукі, абгарэлыя карнявішчы-ногі і ствалы-тулавы надаюць сілуэтам дрэў выраз трагедыйнай велічнасці...

І ўсё ж не толькі ў гэтым сутнасць.

Тупічыцкія дубы сталі помнікамі не толькі таму, што яны судакраналіся з агнём і трагічным лёсам тых гаспадароў, што загінулі тут. Помнікамі зрабіла і робіць гэтыя маўклівыя дрэвы пашана жывых, памяць нашчадкаў. Людзі, тыя, што засталіся, што цудам уцалелі, і тыя, што пераехалі сюды з блізкіх і да-лёкіх сёл ды гаспадарыць на другім беразе возера ў вёсцы Бабровічы, а таксама дзеці іх, што нарадзіліся ўжо ў мірны час, — яны шануюць тупічыцкія дубы, як прынята шанаваць памяць пра сваіх продкаў. Ніхто не смее падысці да дубоў-ветэранаў з пілой ці сякерай.

Помнікі чалавек стварае для людзей. А з чаго яны — не так істотна: з жывых, зялёных дрэў ці з моцнага граніту, бронзы, бетону або, можа, з гучнага слова ці ўзнёслай мелодыі, якія не горш за граніт могуць захаваць на векі вечныя памяць і думку пра жыццё, смерць і несмяротнасць.

Уражваюць, палохаюць і адначасна супакойваюць, узвышаючы душу, помнікі-дрэвы. Нам, людзям, бачыцца ў іх пратэст зямлі, голас-крык маці-прыроды супраць сляпое жорсткасці. І ў гэтым глыбінным пратэсце — супакаенне нашай душы: прырода заадно з намі, яна супраць смерці, яна — за чалавечнасць.

А побач з помнікамі-дрэвамі чалавечыя помнікі-манументы, мемарыяльныя дошкі, абеліскі, крыжы, рэквіемы, элегіі, эпітафіі і народныя паданні,

сказы, успаміны, усё гэта — за жыццё і чалавечую годнасць супраць смерці і прыніжэння.

Вось на вялікай паляне, што зарастае маладым сасоннікам, зазіхацеў на сонцы, як белы неспадзяванак, велічны мемарыял. Тут была вёска Расоха, адна са шматлікіх у Беларусі, ды і тут, у Асіповіцкім раёне, не адзіная партызанская сталіца, лясная «Масква». Тут былі хаты, потым зямлянкі, тут быў партызанскі могільнік і могільнік мірных людзей, пабітых ворагамі ў часе блакад. Карнікі разбуралі і зямлянкі, знішчалі і надмагільныя знакі, наспех пастаўленыя людзьмі па сваіх блізкіх. Калі блакады зніматліся, тыя, хто застаўся жывы, вярталіся ў Расоху, аднаўлялі магільныя курганкі і насыпалі новыя. Пасля вайны родзічы паставілі некаторым з ахвяр фашысцкай навалы бетонныя або нават гранітныя абеліскі з партрэцікамі на эмалі. З гэтых самаробных наіўнапрасцецкіх абеліскаў глядзяць, усміхаючыся, маладыя хлопцы і дзяў-чаты, якім толькі б сысціся ў круг, распаліць агонь і заспяваць песню! А навокал лес, прыцішаны сасновы пошум.

І мабыць, захацелася заказчыкам і выканаўцам агульнага мемарыяла на месцы вёскі Расоха, каб савецкія хлопцы і дзяўчаты, партызаны і іх сяброўкі, гаспадары і гаспадыні, якія давалі ім гасцінны кут, абмывалі і абшывалі, кармілі іх і турбаваліся за іх жыццё, каб усе яны разам, калісьці такія жыццярадасныя, цяпер гаварылі з жывымі. І яны гавораць. І слухаюць гаворку жывых.

Найбольш вымоўныя на жалобных помніках — прозвішчы тых, што загінулі. Калонкі аднафамільцаў на дошках мемарыяла. Дзесяць, дваццаць і сорак аднолькавых... Хіба можна паставіць побач з гэтым нейкі надпіс? Але гэта прыкмячаецца толькі потым, калі спадае высокае хваляванне, навеянае гэтым помнікам у глухім, далёкім лесе.

Адхонныя прыступкі перад узгоркам, над імі на тэрасе пяць квадратных, сіметрычна расстаўленых бетонных скрыжаляў, запоўненых барэльефамі і надпісамі. На цэнтральнай пліце два маладыя шыракаплечыя партызаны ахоўваюць ад ворага жанчыну з малым хлопчыкам. У розныя бакі глядзяць узброеныя людзі — вораг можа з'явіцца адусюль. У аднаго юнака рука сціснутая ў кулак... Так, хоць не заўсёды хапала партызанам сілы абараніць свае сем'і і ўсё насельніцтва ў зонах дзеяння, аднак усё, што маглі, рабілі, — папярэджвалі, прымалі баі, давалі прытулак уцалелым, лячылі параненых і хворых. Было вострае адчуванне абавязку ратаваць людзей, а ў насельніцтва — адчуванне еднасці лёсу са сваімі хлопцамі-партызанамі, са сваімі заступнікамі і мсціўцамі.

Мабыць, найбольш хвалююць тыя выпадкі, калі чалавек у сваім

натуральным імкненні ўшаноўваць памяць блізкіх, знаходзіць агульную мову з прыродай, з яе гатоўнасцю быць помнікам чалавеку, які пры жыцці сваім яднаўся з ёю дзень за днём у працы. Літоўскі скульптар Г. Якубоніс глыбока адчуў сілу гэтай жывой сувязі працоўнага чалавека з прыродай. Славуты мемарыял у вёсцы Пірчупіс ён склаў з гранітных валуноў, узятых проста з навакольнага поля. Паставіўшы пяць ярусаў гранітных глыбаў, мастак высек у іх незабыўны вобраз Маці, літоўскай сялянкі, простай і велічнай у сваім горы, мужнай у жалобе.

Постаць маці — найбольш часты вобраз на брацкіх магілах памардаваных фашыстамі людзей і ў нас, на Беларусі. Гэта найвымоўнейшая постаць. Яна жывою сувяззю злучае пратэст чалавека з пратэстам прыроды супраць смерці. І як бы ні быў выкананы вобраз маці — з прафесійным майстэрствам, у бронзе, граніце, мармуры, — як, напрыклад, у вёсцы Засоўе на Лагойшчыне ці на котлішчы вёскі Пераходы на Случчыне, — або з аматарскай наіўнасцю і непасрэднасцю ў сціплым бетоне, як у Лозках Калінкавіцкага раёна, — вобраз гэты нязменна хвалюе самой прысутнасцю на памятнай жалобнай мясціне.

Лагойшчына. Насупраць вёскі Жардзяжы з асфальту Мінск — Віцебск збочвае глухі лясны тракт, які вядзе ў былую вёску Дальву. Там, дзе сасновы бор расступаецца сонечнымі палянамі, што некалі, напэўна, былі полем, усюды абапал дарогі ляжаць крушні камення. Адшліфаваныя вятрамі, яны падобны на велічэзныя бульбіны. Мясцовасць лясістая, патайная. Сасоннікі, нібы роты салдат, што строем спусціліся з узгоркаў і раптам, як па камандзе, замерлі.

У такім вось часцерніку размяшчалася некалі стаянка-схованка сялян вёскі Дальва. Яны хаваліся там ад фашыстаў у чэрвені 1944 года.

Калі заглыбіцца ў тутэйшую баравіну, дык адчуеш сябе як бы ў сярэдзіне гіганцкага аргана, дзе сярэбраныя трубкі — ствалы соснаў, аброслыя мяккім, сівым лішайнікам. Серабрацца камлі над сакавітай зялянінай ягадніку, а вышэй чалавечага росту срэбра пераходзіць у мядзяную чырвань. Над усім вісне цёмнае скляпенне густых кронаў. Здаецца, краса, бяспека і ўтульнасць назаўжды сышліся ў гэтых цудоўных барочках.

У чэрвені 1944 года сюды набліжаўся фронт, ішла блакада. Дальвінцы, папярэджаныя партызанамі, сышлі з вёскі ў лес. Карнікі, выйграўшы бой на шашы, хлынулі ў партызанскую зону.

Пра гэта нам расказвае Мікалай Пятровіч Гірыловіч, адзіны ацалелы жыхар Дальвы, сёння радыёінжынер, а ў тыя дні вясковы хлапчук.

«...Нанач спыняліся, акопваліся, а днём ішлі зноў прачэсваць лес.

Раніцаю бацька павёў пасвіць каня, кіламетры два ад вёскі. Маці разбудзіла мяне падмяніць яго, нават і правяла туды. Бацька з маткай пайшлі дамоў. Я пасу каня, а праз некаторы час пачуліся стрэлы і выбухі — там, у вёсцы. Я спярша ўзяўся распутваць каня, ён быў спутаны жалезным путам, — дык правазіўся некаторы час, а потым кінуў і без каня пабег у вёску. І ўбачыў я — дагарае дом Васіля Кухаронка. Па жыце я пабег у свой дом, а гітлераўцы ўжо садзіліся на машыны і ад'язджалі ў кірунку Жардзяжоў. Я ўбег у хату. Як толькі пераступіў парог — пасцелі раскіданы, лыжкі ляжаць на стале раскладзены... Мне стала страшна. Я падняў крык, стаў клікаць бацьку і маці, але ніхто не адклікаўся. Я пабег да таго дома, які гарэў. Агонь перакінуўся ўжо на другія хаты. Я бегаў вакол, крычаў, клікаў на падмогу, але — нідзе нікога. Цішыня. Толькі трэск агню...

Я тады пабег назад туды, да каня, распутаў яго і прыехаў верхам у вёску. Выгарала амаль уся Дальва, толькі там, дзе стаялі ліпы, упыніўся агонь. Паглядзеў я — нідзе нікога, і павярнуў у летнюю стаянку, у тую схованку. Там застаў аднаго чалавека з Крутой Гары. Той спалохаўся мяне, але потым я аклікнуў яго, аказваецца, ён з Плешчаніц уцёк ад немцаў. Мы з ім пераначавалі ў зямлянцы, а назаўтра пайшлі ў вёску Становішча. Я знайшоў там сваякоў, і з гэтымі сваякамі мы прыйшлі ў Дальву. Тады я пабачыў, што сапраўды спалілі ўсіх людзей. Пабачыў спаленых...»

Гэта было роўна за дзесяць дзён да вызвалення. Ужо з дапамогай савецкіх салдат жыхары суседніх сёл раскапалі жахлівае папялішча Кухаронкавай хаты і знайшлі ў склепе пад хатаю і пад друзам печы трупы, а на папялішчы косці сарака чатырох жыхароў Дальвы. Тут быў і даваенны старшыня калгаса Пётр Гірыловіч з жонкаю, бацька ацалелага трынаццацігадовага Колі.

Брацкую магілу тады наспех абгарадзілі жэрдкамі, пасля вайны Прусевіцкі сельсавет паставіў жалезную агароджу, саўгас — абеліск. А цяпер, у чэрвені 1973 года, мы пабачылі, як ставіўся новы помнік.

На шырокай паляне, дзе некалі была Дальва, над зялёным, ціхім наваколлем узвысілася постаць Маці з дзіцем.

Удумліва, засяроджана працуе аўтар мемарыяла, скульптар Уладзімір Церабун, студэнт-выпускнік Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута. Дапамагаюць яму дзевяцікласнік з недалёкага адгэтуль Аколава Толя Янкоўскі і Мікалай Гірыловіч, які на выхадны прыехаў з Мінска.

Мікалай Пятровіч расказвае, што ініцыятары пабудовы помніка — камсамольцы Аколаўскай школы і Беларускага дзяржаўнага камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачанні, дзе

працуе і ён, Гірыловіч. Сродкі на помнік збіраў Лагойскі райком камсамола. Свой уклад у гэтае будаўніцтва прыслалі нават школьнікі Саратава, якім давялося быць тут на экскурсіі.

Аўтар помніка, сціплы і негаваркі смаргонскі юнак, растлумачвае, што вобраз Маці не мае прататыпаў. Пазней, успамінаючы гэтую размову, мы шкадавалі, што малады скульптар не сустрэў на сваім шляху цёткі Філімені Цвірка са спаленай вёскі Старэва на Случчыне. Высокая, з мужным і адкрытым позіркам праўдалюба, яна выглядала як жывы помнік, калі не галасіла, а на былінны лад сла-віла былых старэўцаў:

— А колькі мы тут партызан папакармілі, ды колькі мы ў разведку папахадзілі. Мы ж раней самыя вострыя беднякі былі, ды мы ж самы першы ўстанавілі калгас, нашу савецкую ўладу. Ды было ж нам ужо і жыць добра. Ды зглуміў жа тут адзін у трыццаць сёмым годзе мужыкоў нашых. А сыны іхнія, дзеці на-шы, колькі ў партызанах папахадзілі, ды колькі ж іх, смелых, пагінула...

Цётка Філіменя гутарку вяла пра тое, каб паставіць харошы помнік на магілках партызан і жыхароў Старэва. І не здагадвалася, што ў гэты момант сама падыходзіла на галоўную фігуру, прататып для гэтага помніка.

Масавыя трагедыі абавязваюць да масавага народнага ўдзелу ў асэнсаванні і захаванні іх памяці.

Прыгадваецца літоўская вёсачка Аблінга. Дальва — адна з самых апошніх савецкіх вёсак, знішчаных ужо разбітым, адступаючым ворагам. Аблінга была адным з першых савецкіх паселішч, жыхары якой палі ад рук фашысцкіх катаў. Гэта здарылася на другі дзень вайны, 23 чэрвеня 1941 года. Партызан тут яшчэ, вядома ж, не было.

На старонках кнігі, напісанай заходненямсцкімі вайсковымі спецыялістамі ў пачатку 50-х гадоў, пануе ўсё той жа фашысцкі міф: «Дзеянні партызан былі прычынай таго, што першапачатковая мяккасць немцаў замянілася нянавісцю». У Аблінзе не было партызан — туды прыйшла фашысцкая нянавісць. Быў бой перад абедам 22 чэрвеня, трымалі яго з немцамі рэгулярныя войскі — пагранічнікі і чырвонаармейцы. Але ў захопнікаў была версія пра віноўнікаў-партызан, загадзя змайстраваная на фашысцкіх фабрыках ідэалагічнай хлусні. «Для іншых, за граніцу, — давяральна гаварыў сваім падручным Гебельс, — наша прапаганда павінна моцна падкрэсліваць, што Германія хоча мірнага ўрэгулявання ўсіх існуючых праблем... Віну за тое, што мірным шляхам гэтага не ўдалося дасягнуць, трэба спрытна звальваць на тых, хто супраціўляецца справядлівым патрабаванням Германіі».

Ад савецка-германскай граніцы да Аблінгі дваццаць кіламетраў. Гітлераўцы ўвайшлі ў вёску пасля

абеду, а на змярканні пачалі зганяць людзей у драўляныя баракі. Загінулі ўсе жыхары вёскі — сорак два чалавекі.

Трыццаць гадоў насіла ў сабе гэтую трагедыю народная памяць, пакуль яе не апладніла творчасць. Задума помніка прыйшла народнаму разьбяру з Клайпеды Майорасу. Вясною 1972 года ён падзяліўся ёю са сваімі калегамі, разьбярамі з Жэмайціі і другіх мясцін Літвы. Летам у калгасе «Восьмае сакавіка» быў арганізаваны творчы лагер, з'ехалася дваццаць восем народных разьбяроў, — увекавечыць трагедыю Аблінгі. Калгаснікі навакольных сёл падшукалі і прывезлі трыццаць тоўстых дубовых калод, а разьбяры ператварылі іх у вобразы. Кожны браў сабе заданне ўвекавечыць аднаго чалавека або адну сям'ю. Трыццаць дубоў-помнікаў паўстала з жывога чалавечага болю, са святой памяці. На схіле кургана Жвягінай ажылі і сышліся сяляне даваеннай Аблінгі, нібы на народнае свята-гулянне, толькі на тварах не хапае святочнай вясёласці. Звычайна растаропны весялун, сват таксама не весяліць гасцей. У трагічным здзіўленні прыўзняў ён плечы, выцягнуў рукі, нібы пытаецца: «Чаму стала магчыма такое?..»

Аблінга і Дальва — два рубяжы ў часе, самы пачатак і самы канец крывавай акупацыі, два рубяжы, якімі пазначана ажыццяўленне фашысцкай палітыкі вынішчэння народаў.

Гэта Гебельс, услед за Гітлерам, цынічна заяўляў, што «ўвесь гэты сметнік малых народнасцей, якія яшчэ існуе ў Еўропе, павінен быць як найхутчэй ліквідаваны. Мэтай нашай барацьбы павінна быць стварэнне адзінай Еўропы».

Засмучаны і дакорлівы выраз на твары літоўскай жанчыны, высечанай у граніце Якубонісам, — Маці з Шрчупіса, створаны скульптарам Селіханавым вобраз селяніна з Хатыні, беларуская Маці з Дальвы, дубы-скульптуры Аблінгі і абгарэлыя дубы Тупічыч над Бабровіцкім возерам гавораць, крычаць усім сумленным людзям на зямлі, папярэджваюць, заклікаюць да пільнасці.

Археолагі кажуць, што сляды першабытнага чалавека — прылады працы і посуд. Але памяткамі грамадскага жыцця людзей з'яўляюцца, відавочна, печ і калодзеж. І ў спаленых ворагам вёсках заўжды заставаліся — як два сімвалы былога, крывава растаптанага жыцця — печ і крыніца, напаміны пра хлеб і ваду.

Мы каля помніка ахвярам фашысцкага зверства ў вёсцы Брыцалавічы Асіповіцкага раёна. Аўтары мемарыяла — маладыя скульптары Крохалеў, Андрэеў і Саляніцкі. На ўскраіне дубровы, за якою бруіцца маляўнічая Свіслач, на пагорку пастаўлены абеліск. Абапал яго — шэсць мемарыяльных дошак з бетону, ад абеліска проста на сяло вядзе выкладзеная каменнямі сцежка,

на ёй пастамент з палявых валуноў, і на пастаменце — хлапчук-падлетак.

Абеліск нагадвае адзін з тых цагляных камінаў, што зламанымі шарэнгамі стаялі ў вайну на папялішчах спаленых ворагам беларускіх вёсак. Цераз адкрытыя чалеснікі і выбітыя юшкі ў чорныя жэрлы камінаў урываўся вецер і граў, як на арганах, бясконцы рэквіем па гаспадарах. І чулі гэты жалобны рэквіем уцалелыя людзі. Сцішана было на душы, ноччу ім сніліся пamардаваныя родзічы, знаёмыя, суседзі, яны прыходзілі, як здані, у сне і прасілі па-чалавечы аддаць зямлі іх абгарэлыя косці.

Нам, збіральнікам гэтых успамінаў, прыгадваецца вёска Лазавая, у Асіповіцкім раёне, сіласныя ямы ка-ля саўгаснай фермы і дзве ўжо немаладыя жанчыны, якія працавалі на сіласаванні.

Гэта сяброўкі, уцалелыя ад фашысцкага знішчэння, — **Вольга Грышановіч** і **Настасся Трапанок.**

«...Прыедзем у лес, — расказвала Вольга, — нагалосімся ў лесе, зноў на папялішча прыбяжым — прыснілася нам: «Што вы нас не пахавалі?..» Колькі раз прыбягалі. Раскапаем, нойдзем, апяць гэту магілку прыкапаем.

...Цераз год адзін дзед... Яму прыснілася жонка: «Чаму ты мяне не пахаваеш? — кажа яна ў сне. — Я ж пад печам, у мухаморы!..»

Народная мараль казала калісьці, што не знойдзе спакою на тым свеце душа, не аплаканая людзьмі. Вось і цяпер, пасля гэтай гвалтоўнай пагібелі, стары нават у сне адчуваў патрэбу споўніць над роднымі і блізкімі свой чалавечы абавязак.

Аплаквалі і хавалі пабітых па старадаўняму звычаю. Не знаходзілася ў пагарэльцаў часта нават дошак на дамавіны. Клалі нябожчыкаў у шафы і куфры, якія ўцалелі, бо ў іх было звычайна закапана ад ворага палатно, адзенне... Хавалі і без дамавіны, ледзь знаходзілі посцілку ці хустку, каб прыкрыць вочы і рукі. Так было, пра такое мы чулі ў розных кутках Беларусі.

І ў Хатыні, і ў Брыцалавічах скульптарыператварылі комін у абеліск, які трывожна нагадвае людзям пра жудасць перажытага.

Абеліск — комін... Высокі роўны чатырохкантовы слуп, усярэдзіне пусты. А бакі з прабоінамі, як у сапраўдным коміне пасля пажару. Толькі прабоіны гэтыя ўтвараюць узор — стылізаваную галіну лаўра. Гэта вам, пакутнікі, працаўнікі зямлімаці, ад тых, каму лёсам выпала ўцалець і прадоўжыць жыццё роднай вёскі, роднай зямлі. Цераз проразі-лісты відаць полае нутро абеліска, яно адсвечвае белізною — гэтае незвычайнае жарала коміна. Ноччу там загараецца электрычнае святло і лаўровыя лісты свецяцца, гараць на зорным фоне начнога неба.

Дзве грані абеліска запоўнены маёлікавымі барэльефамі, якія лаканічнаю мовай сімвалаў расказваюць пра

перамогу жыцця над смерцю, пра хараство чалавека, занятага адвечнаю працай хлебароба.

Непадалёку ад абеліска старая сасна з буслянкай на вершаліне. Сасна-векавуха засохла. Можа, ад старасці, можа, ад пякучага гора яе землякоў-людзей... Буслянка, як цярновы вянок пакуты, каранує яе парудзелую галаву.

Буслы ахвотна водзяцца ў гэтых мясцінах, — пойма Свіслачы. Як даўней, як спрадвеку, вучаць яны кружному лёту цыбатых, яшчэ чарнаногіх буслянят. А вечарамі стаяць, падбіраючы пад крыло то адну, то другую натруджаную за дзень нагу. Стаяць бусляняты моўчкі. Гэтая сасна, буслянка і жыхары яе — працяг мемарыяла. Не толькі сасна, але і чародка дубоў, што цягнецца ад сасны пад рэчку. Дубы на пясчаным пагорку растуць буйна, дакапаліся карэннямі да сокаў поймы і шчодра гоняць лістоту, прыкрываюць гірлян-дамі жоўтыя выдмы і шэрую бетонную роўнядзь масіўных мемарыяльных дошак, на якіх выбіты 676 прозвішчаў ахвяр фашысцкай расправы. І зноў жудасныя калонкі аднафамільцаў: Баразна, Баразна, Баразна... Дзесяткі людзей аднаго роду, аднаго кораня...

Стаіць зводдаль ад сасны і коміна-абеліска выліты з чырвонага бетону хлопчык-падлетак, адзін з брыца-лавіцкай дзетвары, якое перад вайной шчодра нанасілі ў сялянскія хаты буслы. Вялікая была вёска — больш за дзвесце двароў, і ў кожнай хаце былі дзеці, многа дзяцей...

«...Я толькі як увайшла ў гэты сарай, — успамінае ацалелая жыхарка Брыцалавіч **Ганна Патапейка,** — яны крыкнулі:

— Кіндэр брасай!..

І тыя дзеці ішлі, пабраўшыся за плацце. І чужыя, і мае. Чацвёра ж маіх, а тое несла на руках. Як увайшлі, так яны і застрачылі...

Стралялі, стралялі. Пастралялі, а тады ўжо рагочуць:

— Рус свіння капут!..

І яшчэ пастраляюць, нагамі варсаюць.

Ну, я і ляжу так. Як паляцела, так во і ляжу. А кроў жа: паразрывала ж усё...

Потым пайшлі яны ў другі сарай, што ўпоперак... Пайшлі, яшчэ там рагочуць, страляюць усё там, гергечуць.

Ідуць сюды! Што тут рабіць? Падымуся!.. Як падымуся, дык кроў цюрчыць адусюль... Ну, ізноў лягу туды. Ляжу. Ну, яны так прыйшлі, яшчэ хто стогне — павялі вочарадзь цераз нас і пайшлі. Хляп, хляп — вароты пазачынялі і пайшлі ў школу...»

Маладыя скульптары таксама чулі расказ Ганны Патапейкі і расказы іншых ацалелых жанчын пра трагічны лёс дзяцей з Брыцалавіч — жудасныя расказы... Але выбралі з іх адзін. Пра хлопчыка, які — у студзені 1943 года, калі тут карнікі распраўляліся з мірнымі жыхарамі, — вырваўся з

адрыны, дзе гарэлі людзі, і пабег па ўзгорку. Ды там і застаўся, там яго дагнала куля...

А мастак увекавечыў хлопчыка — застылым у трагічным недаўменні...

Аўтар помніка мог чуць і расказ **Уліты Альховік** — расказ несамавіты, што нават спакушае на містычную трактоўку падзей. Непрытомная ад жаху, цяжка параненая жанчына ўбачыла ноччу такое:

«...Во тут куча людзей ляжала, — кажа Уліта Кандратаўна, — во, поўны двор жа ж, уся ж дзерэўня ляжала. I на дварэ і ў сараі. I апусціўся вот еты месяц — нізенька, нізенька. I стаіць на месяцы чалавек. У шалашы[29] белым... Не то што нехта мне так казаў — я сама з сарая відзела гэта. Праз шчэлку. I рамянём падпяразаны, шапка зімовая і ў ботах. На етым меся-цы стаіць. Над бітымі...

Я тады вельмі расцерана была. Не ведала, дзе мне дзецца. Дзве дочкі расстраляныя, мужа расстралялі, а два хлопчыкі — не ведаю, дзе яны...

На месячыку стаяў... На самым месячыку. А нізенька вельмі круг апусціўся!.. А ён на месяцы стаіць!.. Вот проста так абыкнавенны чалавек, рамянём падпяразаны, белы шалаш на ём і штанэ чорныя, у ботах і шапка зімовая...

Я трое сутак сядзела ў сараі з бітымі. Ну, усё роўна што бітых людзей сцерагла. На кожным вугле страж стаяў. Абойдзе во так кругом сарая і во так вуха прыкладзе ды гэта слухае, ці дышуць людзі... А там мо хто і жывы быў, дык ужо дайшоў. Я каб яшчэ адны суткі пасядзела, дык ад воздуху зайшлася б. Ужо так асмягла, піць — трое сутак не піўшы...

А яны з дзярэўні ўсё вывозілі на машынах. Я праз шчэлку ўсё бачыла. I бруднае бяллё, і чыстае, дзе што аставалася ў хатах...

Ну, а тады ўжо яны, бачу я, збіраюцца ехаць — ужо аблеялі сарай бензінам, запалілі. I тады неяк прачыніліся вароты... Дык я думаю: «Як ужо мне кіпець у гэтым агні, дык я выйду на двор, няхай у плечы страляюць». Яны сюды-туды па дварэ, а я так во цераз агарод — і пайшла! Я тады ўздумала, што кажуць:

«Калі цябе спасціг не такое няшчасце — ідзі і не аглядайся!..» Дык, ведаеце, я во так спіной да іх, так во, у лес дайшла, не аглядалася. А яны на дварэ яшчэ сюды-туды бегаюць.

Ну, там ужо прыйшла я ў лес. Рука паранена, дык скамячыла палец гэта, пацягну — не адрываецца... А там партызаны ўжо. Доктар зрабіла мне перавязку...» (Плача.)

Расказы ацалелых пакутнікаў з незвычайнай сілай выяўляюць жахлівую неўразумеласць злачынстваў, якія абрынуліся на мірную вёску.

Яшчэ раз вернемся да расказу **Ганны Патапейка.**

«...Ну, і як паехалі яны, фашысты, на парцізанаў ды як зайшлі ў зямлянку — іх узарвала. Чалавек мо дзесяць...

[29] У халаце.

Ну, як узарвала іх на тых мінах, дык яны вярнуліся ды акружылі наша сяло... Ужо не глядзелі ні дзяцей, ні старых, усіх, усіх сагналі нас. Вот сюда, дзе гэты памятнік, у сарай нас сагналі. Калгасны быў сарай, вялікі... Гэта ўвечара было, калі зганялі, дзень малы, дык увечара. Зганялі нас, а мароз, мароз! Сільны! Якраз жа Каляды былі, самы сільны мароз быў, і снег быў бальны. Уцякаць — дык вельмі ж трудна ўцячы. Прама снег такі, як увойдзеш, дык і ног не зменіш.

Сядзім, сядзім, назаўтра ўжо. Віднее...

— Ну, што, — гавораць, — ну, што будзе? Нешта ж не пушчаюць нас. Ну, — гавораць, — гэта будуць вы-ганяць кароў ды ўсё сабе забіраць: куры, каровы, а тых ужо будуць гнаць, маладзёж, дык нас не выпушчаюць, штоб не плакалі маткі, ды ўсё там...

Гэта мы так рашаем.

Ну, і сядзім, пазіраем у вокны... Ну, так часоў у два — ідуць. Ідуць, ну, слава богу, будуць нас выпушчаць! Ідуць, іх многа ідзе, і начальства ўжо, бачым, ідзе. Ну, пушчаць будуць. Э-э-э, як толькі адчынілі сарай — «Ідом, ідом на вуліцу!..» Выйшлі на вуліцу, яны нас завярнулі туды на шлях. Ну, як завярнулі на шлях, ужо мы панялі: што-та ўжо зробяць нешта. Ужо сталі бабы плакаць, крычаць ужо...

Загналі туды, дык ужо бачым: і шапкі ляжаць, і сумкі тыя — нашых мужчын... Тады ўжо мы панялі, што будуць і нас... Што-та зробяць: запаляць ці расстраляюць. Ужо ў вокны паўстаўлялі кулямёты, у кожнае акно.

...Сталі яны ў акно стукацца:

— Дайце нам чалавека.

Яны ўжо так парасстралялі, што хазяйка была, варыла ім есці, дык і тую... І нямашака каму варыць ім есці. Жанчына там з намі была, па-нямецку гаварыла. Выйшла яна з дзіцём, дык яны за рабёнка — выкінулі, а яе павялі.

І тады сталі вадзіць. Чалавек па дваццаць — страляць».

Збудаваць у Брыцалавічах помнік-мемарыял — такую думку падаў старшыня калгаса, былы франтавік Іван Баразна, малодшы брат якога камандаваў партызанскім атрадам, што дзейнічаў у гэтых мясцінах.

Атрад складаўся пераважна з брыцалавіцкіх хлопцаў. Іх сем'і сталі першымі ахвярамі карнікаў. Самі яны, партызаны, адрадзілі вёску пасля вайны: паразбіралі абгарэлыя каміны, пабудавалі новыя хаты, паачышчалі студні...

Студні спаленых вёсак...

Мабыць, больш чым абеліскі-коміны ў Хатыні і Брыцалавічах, уразіла нас трагічнай тугою відовішча калодзежнага жураўля, дакладней, аднаго толькі шула, «сахі» гэтага жураўля, раздвоенай рагуліны, якая тырчыць у неба. «Саха» студні — адзінае, што засталося ад цэлай вёскі Макаўе Асіповіцкага раёна.

Засталіся яшчэ ад Макаўя выбеленыя дажджамі валуны ды некалькі здзічэлых яблынь. Другую студню, што была на краі вёскі, аднавілі, над яе зрубам бяздумна гойдаецца смык жураўля, пазвоньваючы на ветры бляшаным вядром. Гэтая студня непадалёку ад пастуховай хаціны, у якой гаспадарыць дзед Аятон Паўловіч, былы партызан і адзіны ўскосны сведка трагедыі вёскі.

«...Гэта ў самыя маразы было, у сорак трэцім годзе, — расказвае ён. — Раніцай ацапілі вёску. Я з лесу бег дамоў. Тут па мне — страляць, а я кінуўся ў снег, удраў. Я хацеў сям'ю забраць у лес. У мяне двое дзетак было. Ну, па мне сталі страляць, і я ў лес і круціўся, значыць, па лесе... Стаялі яны тры дні. Тут нельга было ніяк ткнуцца, паткнуся — ракетай засвяцілі, пачалі страляць па мне.

Нас ужо некалькі чалавек сабралася было.

Прыйшлі — усё тут пагарана... Мы на трэці дзень падбіралі іх, харанілі... Да вайны тут сорак чатыры двары было. Я тут старажую. І сенакос ахраняю...»

Стары стаіць на вялікай, засеянай цімафееўкаю паляне, якая была калісьці вёскаю. З такою простай, дамавітай назвай Макаўе. У яго памяці яшчэ захоўваецца малюнак былой вёскі, хаты, двары, прозвішчы людзей... Сцеражэ Антон Мікалаевіч міражы свайго юнацтва. Расказваючы пра былое сяло, ён у нейкім забыцці паказвае пальцам на чатыры валуны, апісвае дом, які колісь стаяў на гэтым фундаменце, паказвае на тры бярозы сярод паляны, гаворыць пра зруб, які тут стаяў і якому выпала стаць брацкай дамавінай для макаўян.

На просценькім абеліску, аброслым кустамі бэзу, напісана, што вёску гэтую фашысты спалілі 8 студзеня 1943 года, забілі больш за 270 яе жыхароў, а таксама людзей з іншых вёсак, што ўцякалі ад карнікаў хавацца сюды, у лясную мясціну.

З усіх, убачаных намі ў розных кутках Беларусі, багатых і сціплых помнікаў на брацкіх і адзінокіх магілах з дзён акупацыі адзін уразіў нас паасабліваму.

Ён стаяў у Ліпічанскай пушчы, на Дзятлаўшчыне, каля шэрага, сумнага хутара Яблынька, які вырас пасля вайны на пажарышчы, сярод вялізнай пустыннай прагаліны. Мы бачылі той незвычайны помнічак улетку 1971 года, пакуль яго яшчэ не замяніў другі, сучасны, багацейшы. А той быў вельмі просты, вясковы — каменная пірамідка з іржавым чыгунным крыжам, і стаяў ён — і ў гэтым яго незвычайнасць — на нізенькім цэментаваным калодзежным крузе...

У глыбіні калодзежа засыпана сялянская сям'я. Надпіс на помніку, ужо тым часам не вельмі выразны, гаварыў, што ў прадонне ўкінуты — хто ведае, ці забітыя папярэдне для большай зручнасці, ці, можа, і жыўцом, пад страшны плач і крык, —

Іван Пархач, сорак восем гадоў, жонка яго Агата, сорак сем, дачка Зіна, васемнаццаць, сын Міхась, шаснаццаць, і меншая, Марыя, чатырнаццаць... Было гэта снежня 1942 года. Помнік паставілі пляменніца і зяць. Тыя, хто пасяліўся пасля на гэтым горкім котлішчы, пабудаваўшы хату далей ад калодзежа.

Усхваляваў нас нават не так помнік, як людскі абавязак паставіць яго ціха, асцярожна, каб не парушыць спакою нябожчыкаў.

У іншых мясцінах пра такое ж нам гаварылі іншыя помнікі і людзі.

У вёсцы Касцюковічы Мазырскага раёна ажно чатыры магілы-калодзежы, у якіх пахаваны жыхары вёскі, задушаныя ў «газвагенах», душагубках, якія, пачынаючы з 1942 года, выпускаліся ў Берліне па заказу Гімлера. Пра жахлівыя падзеі ў Касцюковічах нам расказвалі вельмі нямногія ацалелыя жыхары гэтай вёскі. Цяпер магілы-калодзежы забетанаваны, у скляпенні ўмураваны мармуровыя дошкі, на адной з іх напісана, што тут ляжаць дзеці, на другой — жанчыны, на трэцяй і чацвёртай — мужчыны...

І абеліск у лесе, у жыце — колькі іх па ўсёй Беларусі!..

Вось на Віцебшчыне, у Шумілінскш раёне, на дзевяці кіламетрах мы бачылі іх пяць. Стаялі яны адзін за адным, чатыры помнікі, справа і злева ад прасекі, называючы былыя вёскі Дражакі, Ямішча, Шчамілаўку, Зазер'е. Пяты, самы высокі, абеліск стаяў на паля-не сярод жытняга хвалявання. Надпіс на ім гаварыў, што тут быў хутар Зуева, дзе ў першыя гады акупацыі размяшчаўся Сіроцінскі падпольны райком партыі. Першае пасяджэнне гэтага палітычнага і баявога штаба партызанскага руху Сіроцінскай зоны адбылося ў 1941 годзе. Хутар быў спалены ў 1942-м...

Зямля Беларусі тоіць мужную і трагічную памяць. Не знайсці на ёй мясціны, якая не чакала б помніка ад людзей, — ад Брэста да Оршы, ад старажытнага Полацка да Турава была яна здратавана фашыстамі, курчылася ў пакутах і грымела помстай. Калі бачыш, як полацкая Сафійская царква, што памятае дні Усяслава Чарадзея і іншых герояў «Слова аб палку Ігаравым», сёння старанна адрэстаўраваная, углядаецца ў «Курган бессмяротнасці», насыпаны на другім беразе Дзвіны, дык адчуваеш іх — гістарычныя далечы роднай зямлі.

Памяць народная працягвае судзіць і караць фашысцкіх нелюдзяўзабойцаў. Мемарыялы ў Хатыні і Аблінзе, у Лідзіцэ і Арадуры, у Дальве і Брыцалавічах, безліч помнікаў — вартавыя той памяці...

## ХАТЫНЬ І ХАТЫНІ

Стары трымае хлопчыка як быццам над усёй зямлёй. Такое каменнае і такое мяккае цела мёртвага хлопчыка. Вочы старога чорным прадоннем сведчаць, штб тут адбылося — у Хатыні. І пытаюць у цэлага свету: дык што ж тут было, няўжо гэта праўда, людзі, — тое, што з намі было, што з намі рабілі?..

«...І мяне павялі ў той хлеў... Дачка, і сын, і жонка — ужо там. І людзей столькі. Я кажу дачцы:

— Чаму вы не адзеліся?

— Дык сарвалі з нас адзежу, — кажа дачка.

Ну, прыгоняць у хлеў і зачыняць, прыгоняць і зачыняць. Столькі людзей нагналі, што і не прадыхнуць ужо, руку не падымеш. Людзі крычаць, дзеці гэтыя; ведама, столькі людзей і страх гэтакі. Сена там было, салома, карміілі яшчэ, трымалі кароў. Зверху і падпалілі. Падпалілі зверху, гарыць страха, агонь на людзей сыплецца, сена, салома загарэліся, душацца гэтыя людзі, так сціснулі, што і дыхаць ужо няма як. Няма як дыхнуць. Я сыну кажу:

— Упірайся ў сцяну, нагамі і рукамі, упірайся... А тут дзверы расчыніліся. Расчыніліся, а людзі не выходзяць. Што такое? Аж там страляюць, страляюць там, кажуць. Алё крык такі, што стрэлу таго, што стуку таго і не чуваць. Ведама ж, гараць людзі, агонь на галовы, ды дзеці — такі крык, што... Я сыну кажу:

— Праз галовы, праз галовы трэба!

Падсадзіў яго. А сам па нізе, паўз ногі. А на мяне бітыя і наваліліся. Наваліліся на мяне бітыя тыя, і прадыхнуць нельга. Але варушыў плячыма — тады я здаравейшы яшчэ быў, — стаў паўзці. Толькі да парога дапоўз, а страха і абвалілася, агонь на ўсіх... А сын выскачыў таксама, толькі голаў яму трохі абсмаліла, валасы абгарэлі. Адбег метраў пяць — яго і пала-жылі. На ім людзі пабітыя — з кулямёта ўсіх...

— Уставай, — кажу, — яны паехалі, паехалі ўжо! Стаў яго выцягваць, аж у яго і кішкі ўжо... Спытаў яшчэ толькі, ці мама жывая...

Не дай бог нікому, хто на зямлі жыве, каб не бачылі і не чулі гора такога...»

Гэта — з расказу жыхара былой вёскі Хатынь Лагойскага раёна **Іосіфа Іосіфавіча Камінскага.**

Людзі з суседніх вёсак і з далёкіх гарадоў і краін, спыніўшыся каля скамянелага ад гора і гневу бацькі з дзіцем на саслабелых руках, бачаць попельна-шэрыя каміны, з якіх, як са званіц, злятае медны гул. Удары званоў надтрэснутыя, кароткія, як заціснуты боль. Чорныя, як з магільных пліт, каменныя дарожкі вядуць людзей да каменных веснiц, назаўсёды расчыненых, да цёмных высокіх комінаў-званіц з напісанымі на іх прозвішчамі і імёнамі былых

гаспадароў... Камінскі, Камінская, Камінская... Яскевіч, Яскевіч, Яскевіч... Іотка, Іотка... Навіцкі, Навіцкая... 50 гадоў, 42, 31, 17, 12, 3, 1, 1, 1... Дзеці, дзеці, дзеці...

Ці не гэта меў на ўвазе фюрэр нямецкага мілітарызму, калі ў 1937 годзе, гаворачы пра забеспячэнне Германіі харчовымі прадуктамі за кошт Усходу, кінуў злавесна незразумелую фразу: «...Дзіця з'ядае хлеба больш за дарослага» ?..

Праз нейкія пяць гадоў жанчына з палескай вёскі Слабада на Петрыкаўшчыне Алена Булава, не ведаючы тых слоў шалёнага дыктатара, на свае вочы ўбачыла іх рэальны сэнс:

«...Людзі вішчаць, крычаць!.. Божа мой, людзі плачуць! Страшна было — каб вы пачулі. Ну, проста страх! Некаторых у хаты заганялі, а нас проста так білі, акружылі і так білі — на нашай вуліцы...»

А яна, адна з усёй вёскі ўцалелая жанчына, будзе пытаць некага праз наш, паднесены да яе старэчых вуснаў мікрафон, будзе здзіўляцца за ўсіх людзей, за ўвесь свет:

«Я гэта падумаю, дык мне страшна... Я ж жыла ў тыя войны, як тыя войны былі. Ужо не маладая... Што гэта, што гэта за такое было ў іх — я не ведаю. Гэта звярэ былі, а не людзі. Гэта не людзі, гэта — звярэ былі».

Гітлераўская прапагандысцкая машына ўся была скіравана на тое, каб «вызваліць» карыслівага абывацеля ад усіх «хімер цывілізацыі», ад усяго, што звязана з сумленнем, гуманізмам, культурай. За гэта яму абяцалі месца ў «новай Еўропе» — недзе наверсе.

«Той, хто далучаецца да мяне, — шаманіў фюрэр «тысячагадовага рэйха», — заклікаиы стаць членам гэтай новай касты. Пад гэтым кіруючым пластам будзе згодна з іерархіяй падзелена грамадства германскай нацыі, пад ім — пласт новых рабоў. Над гэтым усім будзе высока стаяць дваранства, якое будзе складацца з асабліва заслужаных і асабліва адказных кіруючых асоб... Шырокім масам рабоў будзе зроблена ласка быць непісьменнымі. А мы самі пазбавімся ад усіх гуманных і навуковых забабонаў».

Гэта, так сказаць, — будучыня на тысячу гадоў, якую фашызм абяцаў свету. На мове ваенных загадаў, зваротаў гітлераўскага камандавання да салдат яно гучала так:

«У цябе няма сэрца, нерваў, на вайне яны не патрэбны. Знішчы ў сабе жаль і спачуванне — забівай усякага рускага, савецкага, не спыняйся, калі перад табой стары ці жанчыны, дзяўчынка ці хлопчык, — забівай, гэтым ты выратуеш сябе ад пагібелі, забяспечыш будучыню сваёй сям'і і праславішся навекі».

Пазбавіўшыся ад таго, што чалавека зрабіла і робіць чалавекам, ад таго, што называлі яны «гуманнымі і навуковымі забабонамі», фашысты

сталі нават не звяр'ём, як з горыччу называе іх Алена Булава, а нечым яшчэ больш дзікім і непараўнаўча больш небяспечным. Прэтэндэнты на званне «звышчалавека» парабіліся «звышзвярамі»...

...На высокіх комінах — прозвішчы забітых фашыстамі сем'яў. Коміны гэтыя — на месцы былых хат, двароў, яны ўзвышаюцца на пагорках і звонам, такім вечным, але і такім сучасным, трывожна-сённяшнім, як бы вымерваюць глыбіню, самыя глыбіні чалавечых душ — тых людзей, хто жыве сёння, хто прыйшоў, прыехаў сюды. Гэтак гукам вымерваюць глыбіню акіяна. А прыходзяць, прыязджаюць сюды і дзеці і старыя, з-за Урала і з Захаду, з Польшчы, з ФРГ, са ЗША... І людзі з іншых беларускіх Хатыняў, зямля якіх тут пахавана ці назва якіх напісана на хатынскай сцяне, а таксама з тых беларускіх вёсак, назвы якіх не абазначаны, але лёс якіх — таксама хатынскі...

І кожны чуе гэты звон, і ў кожнага — сваё рэха, свая памяць пра мінулую вайну. Свая ці сваіх бацькоў, дзядоў...

Але пасля Хатыні яна робіцца вастрэйшай, павінна такой рабіцца — чалавечая памяць. Бо тое, што адбылося тут, што рабілася ў беларускіх вёсках, датычыцца ўсіх, і пра гэта павінны ведаць усе. Бо лёс у чалавецтва — адзін. Будучыня ў чалавецтва — адна.

Гэта па-асабліваму адчуваюць тут, у Хатыні, многія.

«Цяжка адчуць поўнасцю глыбіню пакут другога, калі сам не зазнаў бязмежнасць трагедыі, — піша амерыканскі журналіст Майкл Давідаў. — Я прыйшоў да вываду, што дадзеныя аб цяжкіх выпрабаваннях Беларусі выходзяць за межы маёй здольнасці спасцігнуць і ўсвядоміць трагічнае. Чацвёртая частка яе насельніцтва забіта, і восемдзесят працэнтаў яе тэрыторыі ператворана ў попел. Як уявіць такое? Гэта было б падобна да цяжка ўявімай карціны: больш за пяцьдзесят мільёнаў амерыканцаў забіта і ўся наша краіна разбурана, за выключэннем яе ўсходняга ўзбярэжжа».

У нямецкага фашызму былі свае маскі. Часовыя. Адна — для Францыі. Другая — для Нарвегіі, трэцяя — для бельгійцаў. Яшчэ адна — для славакаў ці балгар...

Сапраўдны, без маскі выскал гітлерызму бачылі ў схаваных за калючым дротам Майданаках ды Асвенцімах...

Але чым далей германскі фашызм забіраўся на ўсход, тым менш ён хаваўся за маску «еўрапеізму». Тут ужо ён выйшаў з-за калючых дратоў, выпаўз з гестапаўскіх сутарэнняў, тут ён адкрыта кінуўся на вёскі і гарады — на мільёны людзей, на дзяцей, на жанчын і старых, на беларусаў, украінцаў, рускіх, на ўсіх, хто па іх

тайных планах не павінен жыць, «займаць жыц-цёвую прастору »...

«Наша задача не ў тым, каб германізаваць Усход у старым сэнсе гэтага слова, г. зн. прышчапіць насельніцтву нямецкую мову і нямецкія законы, а дамагчыся таго, каб на Усходзе жылі людзі толькі сапраўды нямецкай, германскай крыві», — ужо адкрыта, у друку, выказваўся Гімлер у жніўні 1942 года.

Але і гэта, як ні шырока, як ні жудасна маштабна такое рабілася — і яно было толькі пачаткам. Калі мець на ўвазе фашысцкія планы «канчатковага ўрэгулявання» ў маштабах цэлых кантынентаў...

Што рыхтаваў свету, чалавецтву фашызм у першай палове XX стагоддзя, аб гэтым сёння людзі ведаюць.

Але жывуць сярод людзей тыя, хто можа расказаць, як гэта рэальна было і як гэта было б, калі б здарылася самае жудаснае і фашызм вырваў з рук чалавецтва будучыню.

Што б мы ні ведалі, ні чыталі пра фашызм, гэтыя людзі фашызм убачылі бліжэй за нас, убачылі зусім ужо зблізку, — выскал *«звышзвера» ў той момант, калі ўжо нішто не стаяла паміж фашыстам і яго ахвярай і той адкрываўся ўвесь, з усім, што ў ім было і чаго больш не было...*

Хатынь — сімвал забітых фашыстамі беларускіх вёсак. Тут загінула ў агні 149 жыхароў. У другіх Хатынях — больш, у некаторых — менш. Чым вымераць пакуты нават адной сям'і, дзе боль маці, бацькі ў мільён разоў памножаны на боль і жудасць іх дзяцей, якія побач... Спытайцеся ў любой жанчыны: колькі чалавек забілі ў вёсцы? — і заўсёды пачуеце, што «шмат! шмат!». Ці тысячу, ці сто, ці дзесяць забілі, спалілі — гаворыцца з аднолькава вялікім болем, вострым шкадаваннем. Гэта — народнае разуменне, адчуванне, стыхійна гуманістычнае.

А калі не адна, а сотні сямей — 1843 чалавекі! Як у вёсцы Боркі.

Гэта была вялізная вёска на Бабруйшчыне, а да-кладней, некалькі вёсак-пасёлкаў, якія аб'ядноўвала жыццё аднаго калгаса.

А ў той ліпеньскі дзень 1942 года іх аб'яднала смерць.

У цяперашніх Борках, пасляваенных, жывуць зусім іншыя людзі. І толькі некалькі чалавек — з ранейшых, забітых. Яны вам і раскажуць, як было ў той дзень.

Некаторыя і сёння задыхаюцца, як ад невыноснага цяжару, калі пачынаюць свой расказ. Ад немаладой ужо, хваравітага выгляду жанчыны **Марыі Пііпаўны Закадынііцы** мы пачулі ўсяго некалькі фраз: не хапае чалавеку дыхання, каб сказаць яшчэ нешта. Памяць сціскае горла...

«...Я ўжо не магу нават і гаварыць, што не яны дужа і білі, і хлопчыкаў маіх. У мяне трое было... Дык я кажу: Не хадзіце за мной...» Я ўжо гэтых дзяцей кідаю на беразе, а сама ў

возера, у ваду, дзеці гэтыя плачуць, а я ў ваду, ну, думаю, утаплюся, і ўсё. Не, потым дзяцей гэтых узяла і ляжу, ляжым, а аднаго ў руках дзяржу, як бачым: ідуць зноў немцы...

Не, не падышлі. І я ляжала, ляжала...

Пытанне: — Аяны хадзілі з хаты ў хату?

— Бяруць і ў хату, калі на дварэ' — і ў хату! І ў кожнай хаце так. І маю сястру, і маці, і ўсіх маіх... А по-тым хаты спалілі. А потым у лес пайшлі, хто застаўся, і там жылі, дзеці мае траву елі.

Багата людзей пабілі, ой багата! Шчытайце, усю дзярэўню».

У **Анастассі Іларыёнаўны Касперавай** і здароўя трохі застаяося, і бачыла яна больш. Памятае жанчына надзіва дакладна і многа. Ясныя вочы, светлы адкрыты твар, расказвае яна гучна, нараспеў — і чым далей, тым гучней...

«...Ну, як началося... Мы ляглі спаць. Вутрам мая мама вышла на двор і гавора:

— Знаеш што, дачка, узбудзі хазяіна.

А мой хазяін, калі едуць немцы, — мы жылі на тым пасёлку, — удзірае. Гэта мой хазяін устаў, выйшаў на двор, заходзіць назад у кварціру і гаворыць:

— Ужо нельзя ў лес выйсці. Ужо ацапілі кругом нас.

Ну, мы ўжо і сядзім. Толькі вутра стала — сяйчас матыцыкл ідзе па вуліцы. Проста адзін так. Абыйшоў усе пасёлкі. У нас тут, мусіць, сем было іх, пасёлкаў. Ён вакруг усе і абыйшоў. Я кажу:

— Што-та будзе. Мой хазяін кажа:

— Гатуйце вы снеданне.

Ну, мы ў печы запалілі. У мяне трое дзяцей было, хазяін і мама. Я пайшла па ваду, узяла вядро, а калодзеж во тут у нас. Цягаю ваду — што-та паўз мяне пулі свішчуць: «і-і-і-і», вот проста: «ці-і-ў!» Яны, мусіць, на апушцы лесу былі і мяне ўжо бралі ў бінокль і па мне, мусіць, стралялі. Ну, я набрала вады і прышла.

— Знаеце што, прама на мяне страляюць. Проста пулі паўз мяне ціўкаюць! Ну што ж, — кажу, — у нас ужо так было, што людзей бралі, можа, зноў будуць браць, можа, куды зганяць будуць?..

Саветуемся ў кварціры, не знаем што. І відзім: па той дарозе, з таго Дзяржынскага пасёлка народ ідзець. Паліцэйскія вядуць свае сем'і...

Пытанне: — У вас паліцэйскія былі ў Борках?

— Гарнізона не было, а паліцэйскія былі. Тут яны сабіраліся, свае і адусюль. Тут ужо яны хаваліся, ці не знаю, баяліся партызан. Хаваліся дзе па хатах.

Ну, дык мой хазяін кажа:

— Павялі дзяржынскія паліцэйскія свае сем'і. Патом мы чуем, што палучыўся выстрал у школе.

Каля школы такі выстрал, што проста страшна! Мой хазяін вышаў на

вуліцу і другі сусед. Сядзім. І сяйчас ідзе машына. А ў мяне етая, ятроўка, як вам сказаць, гуляе, дык ятроўка кажа:

— Знаеце што, мусіць, і нас паб'юць.

І прышоў яе мальчык. І абутыя ногі яго ў лапцях, у гэтых, у разінавых. У вайну абувалі ў разіну. Дык яна кажа:

— Сынок мой, сынок, што ж ты ў гэтую разіну абуўся. Твае ж дужа будуць ножкі доўга гарэць. Ў разіне.

А я кажу:

— Што ты гаворыш, Вольга, што ты гаворыш! — кажу.

— Чуствуяцца, што будзем гарэць, што нас паб'юць.

А я ёй кажу:

— Не-а!

Вот скажэце: можа, сэрца... Я вот як чуствую, што жыва буду. Я ёй адвячаю:

— Мы, — кажу, — жывы будзем. А яна кажа:

— Я чуствую — паб'юць.

Пытанне: — А колькі таму хлопчыку было?

— А лет так, можа, восем. Тады, бачым, машына прыходзіць. І адразу гэта машына паварачваецца арудзіем, ці як яго. І мы так гэта заплакалі і кажам:

— Ой, будуць біць, біць, мусіць, па дзярэўні. Спугаліся. А мая свякроўка кажа:

— Пайду, мусіць, яны па яечкі прышлі, дык пайду я, — кажа, — хоць яечкі сабяру ды аддам ім.

Ужо адкупліваліся. Душу... Яна пашла, і ета з хлопчыкам — услед. Як яны пашлі, і к нім пашлі тры немцы. І ў іх, у свёкра палучыўся выстрал. Мы во так, як за частаколам, жылі. Як палучыліся выстралы ў іх кварціры, мы плакаць усе сталі.

— Не плачце, — кажа мой хазяін. — Гэта не па вас машына прышла, а па мяне.

Ён думаў, як раней забіралі.ў нас мужчын у лагер, так і цяпер. А я яму адказваю:

— Па каго яна ні прышла, а нам усё адно плакаць. Тады ён гавора:

— Ну, пільнуйма, можа, гэта яны курэй б'юць. Можа, у хляве кабана, вышлі, б'юць.

Не-а, і кабан выскачыў, і куры ходзяць. Не, свёкра сям'ю пабілі. І сяйчас як пабілі — ідуць утрох к нам. Вот жа радам так. К нам прышлі...

Гэта — як каму жыць нада. Ідуць, і мы так усе рукі стала ламаць, што ўжо трэба расстацца з светам з естым, ідуць жа... Падышлі к калітцэ к нашай і так нешта цоп... Не, не так. Ішлі яны і нешта вярнуліся на ганак. Мусіць, там яшчэ не забілі душу. Мы ўжо понялі самі пасля. Яны гэта.. Душа адна... Ета дзевачка, яна, мусіць, як аджыла — прыглушылі, ці што, — яна заплакала. Назад вярнуліся, і чую — выстрал палучыўся, — яны дабілі етую дзевачку. І пайшлі назад. А мы ўсё адно стаім, дажыдаем. І самі расцяраліся і не знаем, што дзелаць. Патом ідуць яны назад — прама к нам

у калітку. Ідуць і сталі ля каліткі. А мы так на іх у акно смотрым, а яны на нас — і так плачам мы! Патом яны нешта... А задні адзін загергетаў, па-нямецку гаварыць стаў — і пашлі назад цераз вуліцу. Бо там крайні астаецца яшчэ двор. Яны мінаюць яшчэ двор. Дык яны пайшлі ў той двор, а ў тым дварэ, мы знаем, што нікога няма, там ужо выйшлі, уцяклі з таго двара. Дык я кажу... Не, ён кажа:

— Валечка, — гэта ў нас дачка, — схадзі паглядзі, што ў дзеда ё.

Яна пайшла — яна не магла атцу адмовіць і пайшла. Гэта калі яны пайшлі ўжо. Паглядзела: а там усе пабітыя, дзевачка тая, мусіць, хацела ў дзверы, яны яе тут і ўбілі. Як бяжыць наша Валечка:

— Татка мой!.. (Лезець цераз забор і так во!) Папачка мой!..

Паказвае нам: уцякайце! Ускочыла ў хату:

— Пабілі ўжо ўсіх, папачка, у дзедушкі. Уцякайма, папка!..

А дзед, кажа, ляжыць каля стала, і так цераз усю комнату кроў цячэ...

Я ў ету руку ўзяла хлопца, а ў ету — дзеўку і пайшла. І заходжу ў суседні двор.

А дзеці ж пабачылі ўжо бітых, дык яны:

— Мамка наша родная, спасі нашу жызнь, дзень нас дзе.

Кажу:

— Дзеткі мае, жыта малое, ні бытьніку нідзе няма яшчэ, дзе ж я вас, дзеткі, схаваю.

Позняя ж такая вясна была. Яно не парасло яшчэ нідзе нічога. І кажу:

— Я не магу вас, дзеткі, схаваць... Як сумееце, так і спратайцесь.

А жана таго суседа просіцца ў свайго:

— Уцякайма! Уцякайма! Сенечка, уцякайма! А ён гавора:

— Не, нікуды не пайдзеш, — і ўверчвае рабёнка, платок вязаны бальшы, а на нас кажа: — А вы выйдзіце.

Ну, як «выйдзіце» — можа, і нас пабілі б там разам з імі — ну, як «выйдзіце», мы і пайшлі. За гэтых двое дзяцей і пайшла. Разламіла гэткі высокі частакол, перележла з дзецьмі, цераз адзін двор выйшла на вуліцу. Там стаіць жэншчына.

— Цётачка, — кажу, — нашых бацькоў пабілі, а куды ж мы дзенемся?

А яна кажа... Ваабшчэ, нарвалася на самастаяцельную жэншчыну. Яна кажа:

— Знаеце што, пабяжымо ў лес, я пабягу па сваіх сыноў, і пабяжым у лес.

— Ну, — кажу, — пабяжым.

Я яшчэ ў двор зайшла, яшчэ зайшла, заходжу ў гэты двор — гоняць мяне з гэтага двара:

— Ідзі, ідзі ад нас!

Уродзе гэта іх паб'юць за маіх дзяцей. Я кажу:

— Мне ўжо дальна некуда ісці. Я ўжо нікуды не пайду. Я ўжо астаюся ў вас.

Яны выскачылі, паглядзелі, а ў іхняга дзядзькі — цераз вуліцу так жыў — восьмера душ сям'і… І там етыя дзетачкі і матка выйшла і селі на агародзе сваім і вот так ручачкамі прасіліся, парасстаўлялі, а ён іх вот так падрад страляе, страляе — усіх пастраляў… Дык хазяйка пабачыла гэта, ускочыла ў двор і гавора:

— Ну, уцякайма цяпер, цётка!

Яна гнала мяне, а гэта бачыць, што робіцца, дык і яны: «Уцякайма!» Сабраліся, вышлі. Дык і тая жэншчына, што па сыноў пабегла, ідзе, і дачка мая большая бяжыць. А там вада была такая, яміна бальшая, дык яна, мая дачка з яе сынам, упалі ў гэтую яму ды давай тапіцца, а яна стаіць ды кажа:

— Не тапіцеся, дзеткі мае, не тапіцеся!

А немец як пастраляў тую сям'ю, давай па іх біць. Яны тады з вады тае ды да нас, дзе я. І мы ўсе — уцякаць.

Пытанне: — Яны самі тапіліся, хацелі ўтапіцца?

— Самі ўжо ўтапіцца, са страху, дзеці гэта нашы, а маці: «Не тапіцеся, дзетачкі мае, кажа, вылазьце». Дык немцы сталі, гэтае, страчыць, адтуль… Ну, мы папрашчаліся ўжо тутка на дварэ, яны са сваімі і я са сваімі, мы прашчаліся, бо нас жа ўжо паб'юць. Ужо з естай стараны машына, і ўперадзі часавыя стаяць на апушцы лесу.

Пытанне: — Ачутно, што ўсюды страляюць?

— Страля-я-юць! Па ўсіх пасёлках стральба ідзе…»

Забіваюць. Сям'ю за сям'ёй. Хату за хатай. Машына працуе, машына, кожны шурупчык якой — таксама быццам бы людзі. Ідуць па вуліцы двухногія, прыглядаюцца, каб не прапусціць хату, «душу» — старанна працуюць. Аб нечым жа паміж сабой размаўляюць на чалавечай мове, і ў кожнага ў чарапной каробцы 10 млрд. клетак мазгавога рэчыва. Усе «законныя» дзесяць мільярдаў.

«…Прыходзяць у хату, — сведчыць, успамінае **Ганна Мікітаўна Сініца,** — а ў нас так былі дзве хаты і адны дзверы вот так сюдой выходзяць, і тут печка. Дык як мама ля печкі бралася ўжо нам снедаць даваць, стаяла, і яны ўвайшлі толькі — іх тры ішло к нам, — і так адзін з вінтоўкі выстраліў. Выстраліў у яе. А я стаяла во так — за дзвярыма ў другую палавіну, — ім не было як мяне ўбіць, дык яны як у яе выстралілі, а яна перайшла яшчэ ў тую хату і цераз парог упала. Толькі: «Дзеткі!..» Як яна ўжо ўпала, я тады закрычала і ўзляцела на печ. Ужо ж дзецца негдзе. Я на печ, і етыя за мной — брацiха з дзевачкай, і суседняя дзеўка, і сястра мая. І я павалілася паўз сценку так во, а тады паўз мяне сястра, а етыя ўжо так — на нас паляцелі. Пулі разрыўныя былі — сталі ля печкі во так, сталі і стралялі. Прама на печ стралялі. Адзін — з краваці. Ну што — пастралялі, пастралялі, тады буфет у нас гэты быў. Яны ўсё па

століках лазілі. Што ўжо яны шукалі, я не знаю.

Як яны вышлі з хаты, так я тады: што мне, думаю, здзелаць. А ў нас вакол печы быў ход — бацька ў нас столяр быў, дык ён там доскі лажыў і ўсё, вокны дзелаў. Я яшчэ не думала, што яны будуць паліць, дажа і не думала. А баялася, што з печыбудуць скідаць гэтых бітых. Дык дай я залезу за печку. Лягла ў гэта запечча. Тады думаю: не, не буду я тут, а то мяне тут заб'юць. Я думала, што гэта наш адзін пасёлак паляць, а дзед жа тут жыў на Хватаўцы... Дык я думаю: дзед прыдзе і ён тады мяне забітую не найдзе тут. Тых панаходзе, а мяне не. Вылезу я назад. Праўда, я зноў вылезла, на сваё месца лягла. Ну, і ляжу.

Прыходзяць зноў гэтыя немцы. Зноў па хаце гэтымі сваімі падковамі — ходзяць усё, ходзяць. Што яны шукалі? Праўда, адзеяла ў нас было пухавое. Забралі яго адразу. А так яшчэ нічога тады не бралі. Патэфон стаяў. Паігралі, нашу пласцінку паслухалі: «Полюшка-поле» была пласцінка. Пасвісцелі і пайшлі.

Паляжала, паляжала. Думаю — не, буду неяк выбірацца. Яны ўжо хату паадчынялі, хлеў адчынілі, карову выгналі. Паглядзела я ў адно акно, у другое...»

**Якаў Сяргеевіч Стрынатка** — памятае, сведчыць:

«...А стральба: та-та-та!.. Патом гляджу: ідуць двое ў суседні двор. Не — тры немцы. Яны Уладзіміра гэтага, Дабравольскага, за каўнер і ў хату. Я гавару:

— Што такое?

Ну, яны там ужо страляюць вочараддзю.

Пастралялі, патом другая хата была, новая. Бачым, пайшлі ў тую хату. Там пастралялі. Ну, і бачым — сюда ідуць.

Вот яны прыходзяць сюда. А мы як сядзелі: хазяін за сталом, я — р-раз адскочыў ад яго, каб адлучыцца. Сеў на пасцель. Чуем, яны ўсё: га-га, га-га. А ў хаце філонскія дзверы. Адчыняюцца. Ён старуху — сюда, патом як пхнуў, яна бегла, бегла, чуць не паваліласся. Толькі нешта стала гаварыць, а ён з аўтамата: тр-тр-тр! А я ўжо... А ў мяне цёмна-цёмна ў вачах, я ўжо не знаю. Сяджу на пасцелі. А той сын хазяіна — раз, устаў над сталом, дык яны: тр-тр-тр! Той туды ссунуўся. А тады яны на мяне, я — валюся...

Калі я валіўся, дык пуля во сюда ў плячо, сюда і сюда — чатыры пулі ў мяне. Я так і мёртвы быў.

Колькі я там ляжаў, не знаю. А патом усхапіўся. А ў мяне галасавыя звязкі паўрадзіла, дык я хачу: «Я — жывы!» А яно не гаворыцца, нічога не гаворыцца. Думаю, нада хавацца. А не знаю, што ў мяне яшчэ і рука перабіта. Каб не ўбачылі з акна, я — раз на каленцы. І тады чую — у-ух, у мяне рука! Я руку так сюда і папоўз пад печ. А падпечча гэта якраз напроці акна. Думаю, ногі відна. А там мост стары, хата старая была, я масніцу падымаю...

А, праўда, вот яшчэ што. После мяне забілі старыка. Я бачыў яшчэ, як яго піхалі, а ён у дзверы ўпіраўся. Дык калі я ўжо прачнуўся, дык гэты стары ляжаў якраз каля мяне, ногі ўпоперак гэтай масніцы. Калі я лез назад з падпечча, ён ужо здубеў, ногі гэтыя... Дык я яго адсунуў і масніцу падняў, і, руку дзяржаўшы — туда, галавой проста. Як бадануў туда ў пясок, во да сех пор улезла ў пясок. Давай гэта левай рукой пясок з вушэй, з зубоў. Тады знаю: трэба мне закрыць маснічыну. Я давай левай рукой, давай — хлоп на месца. Там нейкая была карзіна плеценая, поўная яец і накрытая зверху пакуллем такім. А мяне то ў дрож, то ў холад, то ў дрож, то ў холад! Патом чую — абратна ідуць.

— Ох, как мне гэта, — гавора, — на бацінкі апеціты харошыя!

Гэта ён пра бацінкі, што ў маладога на нагах, — ён у Фінляндыі быў, калі вайна была, і прынёс свае з арміі. Так гэта пагаварылі і патом, чую, умануліся, пайшлі адсюль.

Цераз некаторы час ідуць яшчэ. І глядзяць: кагда я пад печ гэтую поўз, у мяне кроў сцежку здзелала, дык яны думалі, што там, і гранату — туда! Кінулі гранату. Дык яна як жахнула, дык аж куры закудахталі. А дым ка мне з гэтай самай, з гранаты. Дык мне ўжо ў яме аж недзе дзявацца...»

Гэта — у хатах. А тыя, што вырваліся, бягуць па полі — тых даганяюць кулямётныя чэргі.

«...Ну, дык мы пайшлі, — працягвае гучна, усё гучней Анастасся Касперава, — а яны як пачалі за намі страляць услед, дык, вы паверыце, папар быў паворaны, па гэтаму папару беглі — так білі, колькі нас там ужо сямей вышла, мусіць, тры ці чатыры, — і так б'юць, што дажа бег з намі сабака аднаго хазяіна, дык так, бедны: дзе пуля ўрыецца, ён — туды... Вот яны білі, білі, так з усіх старон — і з той стараны людзі бегчы сталі, і з естай, і спераду. А ўперадзе бег у нас сын той жэншчыны, ён службу ўжо адслужыў, дык ён махнуў, што «лажыцеся!». І чую, як ззадзі ў мяне ўпалі. Адна жэншчына гавора, прашчаецца:

— Сынок мой, прашчай!

Дык я вот так паднялася, зірнула — праўда, ён ляжыць, яна на каленцах над ім. Патом бачу — уперадзі той зноў падняўся і скамандаваў, махнуў нам і сам падняўся, бо ён ужо бача, што яны нас жывых возьмуць. Ну, мы ізноў пабеглі. Так я бягу, так я і вяду ўжо гэтых дваіх дзяцей — хлопчыка і дзевачку. Меншых. А яны так сыплюць, так сыплюць! Ета дзевачка вырвала ў мяне руку і пабегла ўперад у лес. Пабегла. А мы ўжо з гэтым хлопцам маім. Як дабеглі — я ўжо ранена, але я не знаю, што я ранена, — бяжыць дзевачка з лесу назад ка мне і кажа:

— Мамка мая! Я думала, цябе ўжо забілі, дык і я назад іду, каб і мяне забілі. — І кажа: — А што ў цябе?

А-а-а, гляджу, што ўжо... І шагам пайшла ў лес. Ужо не стала бегчы, так ужо сэрца маё... Я і пайшла. Вот і ўшла, і сям'я гэтая ўшла, і дзеўка мая старшая...

Пытанне: — А той, што камандаваў вамі?

— І той увайшоў у лес. Ждановіч Міша. Патом ён быў у парцізанах. Бегла нас дванаццаць чалавек, а чатыры на ходу ўбіла. Як ускочылі ў лес, Міша стаў нам перавязкі рабіць. Мне зрабіў перавязку, патом сястры сваёй. Стаім. Такая стрэльбішча ідзе — невазможна цярпець. Адкуль вазьміся — хазяін мой! Скок ка мне.

— Ой, — кажа...

Гэта ён кроў убачыў, што гэта я ранена. Да гэтага я нічога не помніла, а тут мне так ві-і-дна, што хазяіна ўбачыла! Бо думала: што ж я буду рабіць з дзецьмі без хазяіна!

Мы так сядзелі, сядзелі, страшна так — б'юць, страляюць, страшна, страшна! Ну куды ж нам? Пасядзелі, пасядзелі, пайшлі мужчыны нашы — як жа шашу перайсці? Пайшлі шашу глядзець. Перайшлі гэтую шашу, сядзелі, сядзелі ў тым лесе, камары, камары — невазможна, засякаюць нас, ні агня няма, нічаго ў лесе, ускочылі як стаім. Пайшоў хазяін, знайшоў пастухоў там з другой дзярэўні. Тыя ўжо нам далі агню, спічак. Спічкі ўжо тыя ўскраснулі, агонь разлажылі, хоць куромель ад камароў — нельзя дзецца дзе. Голад жа ў лесе, дык хазяін пойдзе куды, а іх абстраляюць...

Пытанне: — Колькі ў Борках забілі людзей?

— Людзей, мусіць, тысяча восемсот, кажуць, там напісана на помніку: тысяча восемсот сорак тры.

Пытанне: — Дык яны хадзілі з хаты ў хату і так забівалі?

— З хаты ў хату. А ў той дзярэўні — Закрынічча — сабіралі ў адну хату, у другую і білі. А нас так пабілі — па хатах. Пабілі, а потым запалілі.

Пытанне: — А паліцэйскіх як?

— А паліцэйскіх у школу, не ў школу, а ў сарай у школьны, і спалілі. Жыўём, жыўём і з сем'ямі.

Пытанне: — А многа тых паліцэйскіх было, што спалілі?

— А чалавек дзесяць было іх тут...»

Вось так забівалі, забілі самую вялізную з беларускіх Хатыняў — больш за 1800 жанчын, дзяцей, мужчын вёскі Боркі Кіраўскія.

Пасля нападу на Савецкі Саюз галоўнае ўпраўленне імперскай бяспекі ўзялося за распрацоўку «генеральнага плана «Ост», палажыўшы ў аснову «ўказанні», «ідэі» верхаводаў фашысцкага рэйха — Гітлера, Гімлера, Розенберга і іншых.

Сам план «Ост» не знойдзены: ён, відавочна, знішчаны. Захаваліся дакументы, якія каменціруюць, дапаўняюць, ацэньваюць гэты план.

Вось вытрымкі з аднаго такога дакумента, які выходзіў з «Усходняга міністэрства»:

«1/214, дзяржаўнай важнасці

Зусім сакрэтна! Дзяржаўнай важнасці!

*Берлін. 27.4.1942.*

Заўвагі і меркаванні па «Генеральнаму плану «Ост» рэйхсфюрэра войскаў СС.

Яшчэ ў лістападзе мне стала вядома, што галоўнае ўпраўленне імперскай бяспекі працуе над Генеральным планам «Ост». Адказны супрацоўнік галоўнага ўпраўлення імперскай бяспекі штандартэнфюрэр Эліх назваў мне ўжо тады прадугледжаную ў плане лічбу — 31 млн. чалавек ненямецкага паходжання, якія будуць перасЕлены...»

«Усходняе міністэрства» ў асобе начальніка аддзела каланізацыі доктара Ветцэля, падлічыўшы і пералічыўшы палякаў, украінцаў, насельніцтва Прыбалтыйскіх савецкіх рэспублік і назваўшы тэрыторыі, якія трэба неадкладна каланізаваць, дае «сустрэчную лічбу». Апетыт канібалаў расце — 31 млн. ужо мала.

«Такім чынам, агульная лічба насельніцтва пералічаных абласцей (якія мяркуецца адразу ж засяліць нямецкімі каланістамі. —*Аўт.)* складае 51 млн. Колькасць людзей, якія згодна з планам будуць выселены, павінна быць у сапраўднасці значна вышэйшай, чым прадугледжана. Толькі калі ўлічыць, што прыкладна 5-6 млн. яўрэяў, што жывуць на гэтай тэрыторыі, будуць ліквідаваны яшчэ да правядзення высялення, можна згадзіцца з названай у плане лічбай — 45 млн. мясцовых жыхароў ненямецкага паходжання. Аднак з плана відно, што ў названыя 45 млн. чалавек уключаны і яўрэі. З гэтага, такім чынам, вынікае, што план зыходзіць з яўна недакладнага падліку лічбы насельніцтва.

...Калі ўлічыць, што на тэрыторыях, якія разглядаюцца, застанецца 14 млн. мясцовых жыхароў, як прадугледжваў план, дык трэба выселіць 46-51 млн. чалавек».

У гэтую лічбу не ўваходзяць рускія і беларусы, а з імі, — можна ўявіць, якія Асвенцімы і Хатыні меліся наўвазе!..

У прыведзеным дакуменце ёсць спасылка на аднаго з супрацоўнікаў ведамства Розенберга, прафесара доктара Абеля. «Абель бачыў толькі наступныя магчымасці вырашэння праблемы: або поўнае знішчэнне рускага народа, або анямечванне той яго часткі, якая мае выразныя адзнакі нардыцкай расы. Гэтыя вельмі сур'ёзныя палажэнні Абеля заслугоўваюць вялікай увагі. Справа не толькі ў разгроме дзяржавы з цэнтрам у Маскве. Дасягненне гэтай гістарычнай мэты ніколі не азначала б поўнага вырашэння праблемы. Справа заключаецца хутчэй у тым, каб разграміць рускіх як народ»...

Ёсць у гэтым дакуменце і раздзел «Да пытання пра беларусаў»:

«Згодна з планам прадугледжваецца высяленне 75 працэнтаў беларускага

насельніцтва з займаемай тэрыторыі. Значыцца, 25 працэнтаў беларусаў, па плану галоўнага ўпраўлення імперскай бяспекі, павінна быць анямечана».

Што азяачае гэтае «высяленне» — Беларусь пазнала на вопыце сотняў сваіх Хатыняў. Гэта ж чакала і тыя 31 і 51 млн. чалавек, а затым і новыя сотні мільёнаў людзей, якіх падлічвалі і пералічвалі акуратныя чыноўнікі крыважэрнага германскага імперыялізму.

Па «Генеральнаму плану Ост», па гітлераўскіх планах «канчатковага ўрэгулявання ў Еўропе», згодна з фашысцкай дактрынай «барацьбы за жыццёвую прастору на Усходзе», — ды ці мала варыянтаў было таго стратэгічнага, імперыялістычнага, людаедскага «плана». З яго ж вынікалі, да яго прымыкалі і розныя канкрэтныя, «тактычныя» планы барацьбы з «актыўнымі элементамі», з непазбежным супраціўленнем савецкіх людзей акупацыі, рабункам, знішчэнню. Гэтыя канкрэтныя діланы павінны былі служыць і служылі ўсё таму ж галоўнаму плану: пад выглядам барацьбы з партызанамі — знішчаць, знішчаць, знішчаць насельніцтва. Каб на потым меней працы засталося…

У вёсцы Баканіха на Віцебшчыне, калі жыхароў сагналі ў хату, да іх зайшоў афіцэр. Трохі памарадзёрнічаў: забраў у каго што лепшае з адзення, выкінуў за дзверы. А пасля і яшчэ пра нешта ўспомніў. Стары Архіп Жыгачоў так расказвае: «Тагда афіцэр гэты ўзяў і папрашчаўся з намі. Гаворыць:

— Да свідання. Давайце спасіба сваім гэтым партызанам!»

Мабыць жа, з крыўдай сказаў, з упэўненасцю, што гэта перад ім, эсэсаўцам, вінаваты нехта — тыя дзеці, жанчыны! У іх, можа, браты, бацькі, мужы — партызаны. А як жа: ехаў праз цёмны, густы лес, праз балота прабіваўся, надрыжаўся пад сваім мундзірам з грознымі эмблемамі смерці, увесь час азіраючыся, чакаючы партызанскай засады. І для яго той агульны «план», што ішоў зверху: рабіць так, каб на ўсходніх землях дзяцей, жанчын, мужчын стала менш на столькі або столькі працэнтаў, той расісцкі план у мазгаўні і пад мундзірам такога вось карніка набываў афарбоўку нават ужо самаабароны. Ён ад партызан ратуецца!..

І камандаванне, выдаючы свае жорсткія загады, і яно, бачыце, ратуе сваіх салдат, свае камунікацыі… Урэшце і вышэйшыя фюрэры, тыя таксама пачыналі крыўдаваць на насельніцтва Беларусі і іншых акупаваных тэрыторый. Як жа, вунь сам бог, сам творца накіроўвае волю, інтуіцыю, руку фюрэра, указвае яму, што і як трэба рабіць:

«Само прадвызначэнне як бы хацела паказаць нам туды дарогу… Агромністая імперыя на ўсходзе даспела ўжо да распаду».

«Творца ўсклаў на нас абавязак гістарычнай рэвізіі яшчэ нябачаных маштабаў...»

А тут нейкія партызаны, нейкія там «неарыйцы» перашкаджаюць, супраціўляюцца і на фронце і ў нямецкім тыле, не хочуць, каб сцерлі з карты іх Радзіму, каб «высялялі» на той свет іх сем'і, іх дзяцей. Колькі не аднаго гневу, жорсткасці, але ўжо і крыўды на «гэтых» рускіх, на «гэтых» беларусаў, украінцаў, палякаў, на ўсіх, хто не захацеў паслухмяна скарыцца лёсу, які для іх вызначыў «божы абраннік» — фюрэр. Новыя і новыя загады, накіраваныя на знішчэнне цэлых народаў, цяпер набываюць усё больш характар антыпартызанскі. Фашысты ўсё настойлівей, але дарэмна, стараліся віну за свае планы і свае справы ўскласці на тых, хто перашкаджаў ім гэтыя планы рэалізаваць. На партызан.

І тыя, колішнія іх нахабныя, ідыёцкія скаргі — скаргі катаў на свае ахвяры — працягваюцца, дарэчы, і сёння. У мемуарах, даследаваннях многіх заходніх генералаў (былых і новых), гісторыкаў, палітыкаў, літаратараў, што зноў і зноў пішуць пра «незаконнасць дзеянняў партызан», скардзяцца на дзяцей, жанчын і іх бацькоў, мужоў, братоў — на партызан, якія абаранялі Радзіму, свой лад жыцця, жыццё і будучыню сваіх дзяцей. А заходненямецкі прафесар К.Г. Пфефер, той нават заяўляе, што гітлераўцы пакінулі «нядрэнную памяць па сабе ў савецкага народа». Бачыце, нават гэтак! Праўда, скардзіцца Пфефер, апошнія гады вайны «былі амаль усюды засмучаны беззаконнымі дзеяннямі партызан».

Вунь колькі крыўды і шкадавання! Не менш, чым у таго бандыта ў афіцэрскім мундзіры, што знішчыў жыхароў вёскі Баканіха. Не забыўся, забраў, што лепшае было на людзях (каб не прападала «імперскае дабро»), і, перш чым запаліць хату з людзьмі, зусім па-пфеферaўску папракнуў: — Гэта вам за вашых партызан!

А ўжо як крыўдуюць на свае ахвяры збеглыя здраднікі, «бобікі» — паліцаі, старасты, бургамістры, уласаўцы, бандэраўцы, кіраўнікі «беларускай рады»! У іх, аказваецца цяпер, таксама былі свае «планы», таксама разлікі, калі яны дапамагалі гітлераўцам знішчаць сваіх землякоў, савецкіх людзей. Яны хацелі з дапамогай немцаў «толькі» выбіць бальшавіцкі дух з народа. І не іх, маўляў, віна, што занадта «цела» і «дух» моцна трымаліся адно другога. «Ну, і гінь, калі ты такі!» — гневаліся яны на народ.

Іх рукамі нямецкія фашысты таксама нямала народнай крыві пралілі. Дзе толькі было магчыма, яны хаваліся за гэтых здраднікаў. З выпадку стварэння так званай «беларускай рады даверу» акупантамі выказваліся, напрыклад, такія меркаванні, такія разлікі: «...рускія будуць глядзець на гэты факт, як на фіктыўны крок, але затое гэта дасць

нам магчымасць усе мерапрыемствы... праводзіць іх рукамі і ўскласці на іх усю адказнасць...»

Але часам здаралася, што тая машына знішчэння, якую яны абслугоўвалі з усёй стараннасцю здраднікаў, садыстаў, адшчапенцаў, хапала, зацягвала ў свае зубцы і іх саміх. Як у тых жа Борках, дзе спалілі і паліцаяў.

Пра гэта расказвае **Ганна Мікітаўна Сініца:** вунь з якой пагардай да подлай тупасці фашысцкіх памагатых.

Пытанне: — А што там было, калі паліцэйскіх збіралі?..

«— Ага. У нас ніводнага паліцэйскага не было на пасёлку. А з Дзяржынскага адзін. Ну, і хадзіў ён па вуліцы, а мой брат ужо хацеў спрасіць, што гэта будзе, чаго акружылі. Кажа:

— Косцік, Косцік, што гэта такое?..

Дык ён і не стаў разгаварваць. Ён жа думаў: «Нас павязуць у Германію, а вас будуць біць, дык зачэм я буду з вамі разгаварваць». Ну, ім сказалі, што: «Забярыце вашы сем'і, і мы вас увязём у Германію». І яны свае сем'і ўсе пазбіралі і прывезлі к школе. І тут іх тады — што: узялі, гэтыя сем'і ўсе і іх саміх, запёрлі ў сарай у школьны і падпалілі. Вот яны жывыя і па-гарэлі. Нас хоць палілі нежывых, білі, а іх жывых спа-лілі. Вот так.

Пытанне: — Казалі нам, што раней гэтыя паліцэйскія ўцяклі, калі павялі іх на партызан?

— Ад Клічава аднекуль уцяклі. Хадзілі ўжо на парцізан, а тады ўзяЯі адтуль ды ўцяклі. Вот тады, як яны ўцяклі, немцы, мусіць, падумалі, што тут уся звязь імеецца з парцізанамі, і яны ўсіх гэтых паліцэй- скіх і пабілі.

Пытанне: — Яны ўцяклі са страху ці, можа, і праўда сувязь мелі з партызанамі?

— А, не мелі яны ніякай звязі! Патаму што яны заўсёды так грազіліся, кідаліся на людзей, што дзе ж яны мелі звязь. Прыдзе к нам, прымерна, начаваць. У нас бабы адны. І толькі, кажа, заікніся каму-небудзь, што я тут, дык я цябе ўб'ю. Хаваліся, каб парцізаны іх не пабралі...»

* * *

Боркі Кіраўскія выбілі 15 чэрвеня 1942 года.

За некалькі месяцаў да гэтага ў сакавіку 1942 знішчылі шмат вёсак разам з людзьмі ў Акцябрскім раёне. Там, на Акцябршчыне, цэлы раён сціснулі пятлёй з некалькіх дывізій і забівалі ўсіх людзей — вёску за вёскай.

Аж да вызвалення Беларусі Савецкай Арміяй працягвалася такое ў маштабах усё больш злавесных і пагрозлівых для самога існавання нашага народа.

У абласцях і мясцовасцях, якія на нямецкіх картах лічыліся «армейскім тылам» (Віцебшчына, Магілёўшчына, Гомельшчына, усходняя частка Мінскай вобласці), да гэтых «акцый», «экзекуцый», «масавых кампаній»,

«ачыстак», «асобных мер», «фільтрацый» — розныя былі ў іх назвы — звычайна прыцягваліся буйныя армейскія часці, цэлыя дывізіі.

А на захадзе рэспублікі, асабліва ў тых раёнах, якія былі ўключаны або павінны былі потым быць уключанымі ў будучы «германскі рэйх», справай «высялення» і «перасялення» карэннага насельніцтва пастаянна займаліся спецыяльныя групы, каманды. Вядома, і іх прыкрывалі армейскія злучэнні, а ў часе блакад Белавежскай пушчы і іншых мясцовасцей — у гэтым удзельнічалі цэлыя дывізіі вермахта.

На Нюрнбергскім працэсе неабвержна даказана не-пасрэдная віна, адказнасць за шматлікія акцыі генацыду не толькі спецыяльных часцей СС, СД і жандармерыі, але і армейскіх падраздзяленняў, армейскага камандавання. Яны рабілі адну справу, толькі ў вермахта былі яшчэ першачарговыя клопаты на фрон-це, а спецыяльныя каманды дзейнічалі так, быццам ужо наступіла пара «канчатковага ўрэгулявання», г. зн. як бы пасля перамогі. І таму дзейнасць гэтых каманд, груп, спецыяльных часцей можна разглядаць як рэпетыцыю таго злавеснага «канчатковага ўрэгулявання ў Еўропе» (знішчэння славянскіх і іншых народаў), на якое, калі б Гітлер перамог, ён кінуў бы цэлыя арміі.

А пакуль, акрамя таго, што знішчэнне тысяч і тысяч мірных жыхароў ужо адбывалася, працягвалася сіламі армейскіх і спецыяльных часцей, у ходзе гэтых акцый нешта рабілася і на будучае — планамерна і з маньяцкай настойлівасцю. Выпрабоўваліся метады «масавых экзекуцый». Адшукваліся варыянты, уліч-валіся «памылкі» і недакладнасці. (І ўвесь час пісаліся, пасылаліся ў Берлін скрупулёзныя справаздачы.) Вывучалася псіхалогія ахвяр. І выканаўцаў таксама.

Дык зноў вернемся да жывых сведчанняў, да непасрэдных сведак.

Вось як забівалі вёску Ніз Слонімскага раёна. І як на хаду мянялі і шукалі зручны прыём, каб людзі «без лішніх клопатаў» (для катаў) сталі пад кулі, пад расстрэл. У Асвенцімах гэта ўжо было наладжана, адрэгулявана, як машына (фіктыўныя «лазні», «лазарэты» для новых эшалонаў ахвяр і г. д.). А тут жа ні калючай агароджы, ні «лазняў» гэтых, і забойцы вынаходзяць кожны раз новыя спосабы ашуканства, каб забіць па магчымасці ўсіх, каб ніхто не ўратаваўся.

Расказвае **Лявон Сідаравіч Алізар.**

«...Гэта было 16 снежня 1942 года. Прыехалі так гадзін у... Яшчэ не ўзышло сонца — гадзін у восем або сем. Машына была, паставіла каравул вакол дзярэўні. Зайшлі да солтыса. Солтыс быў мясцовы, з солтысам хадзілі па дамам і гаварылі, што будуць ва ўсіх правяраць дакументы. Ну, канешне, дакументаў не правяралі, а толькі сабіралі возраст мужчынаў вышэй шаснаццаці і ніжэй сарака

пяці. Еслі сорак шэсць, то ўжо не бралі. Гаварылі, што пойдзем на работу, бярыце лапаты і хлеба. Бярыце ў сумкі хлеба. Вышлі. Сабралі ўвесь маладзёж, сярэдні возраст, вышлі за дзярэўню. І тагда астанавіліся па край дарог, на сярэдзіне, і разрысавалі план такі во: буквай «Г». Канешне, тагды кажды паняў, што будзе нехарашо. Пачалі хто закурваць, хто сюда-туда, і не капалі ямаў. З хлебам былі ўсе, у сумках хлеб. Сказалі, хлеба браць на два дні. І пасля ішла машына легкавая з лесу. Ня-мецкая, прыехаў начальнік-немец. І сказаў на гэтую ўсю маладзёж:

— Запрагайце коні, паедзем.

Ну, канешне, гэта ўсё маскіроўка была. То плуг, то барану палажылі на воз, пазапрагалі коней, пасаджалі людзей. Я таксама запрог каня. Адзін хлопец сеў, а ў мяне паглядзелі дакументы і сказалі — «дадому». Два немцы былі, адзін гаворыць — «едзь», а другі — «дахаты». Ну, канешне, зганялі нас у хаты — у чатырох месцах. Вёска наша — хат пяцьдзесят і болей, можа быць, а ўбілі дзвесце дзевяноста шэсць чалавек.

Ну, мяне як загналі ў гэтую хату, там ужо ўсе сабраныя былі. Мужчын сабіралі ўродзе на работу, а жэншчын — у хаты, да бою. Дзяцей... Ну, мяне прыгналі самага астатняга, стаяў у дзвярах. Ужо больш не было... Сто пяцьдзесят чалавек было ў гэтым доме. Ну, можа, мінут дваццаць, больш не было, як я пастаяў у гэтым доме, і тут вызываюць трох. Пайшлі. Выйшлі, і яны нас павялі за сарай. Вышлі за сарай, і тут адразу ў іх быў дагавор: немцаў трох і нас трох. Сказалі:

— Кленч!

Як сказалі «кленч», тут пад адзін звук — з пісталетаў. У галавы. У мяне во так: у затылак, а тут во выйшаў, вылецеў. І тагда ўжо пачалі падводзіць больш. А мы ўжо там... Гэтыя двух — адразу ім папалі і нават не паварухнуліся. Але мяне не адбілі ад памяці. Каб я не помніў, то мяне дабілі б, іменна што я помніў. Зашумела ў галаве — усё роўна як мне далі поўху. Я зваліўся, упаў ніцма, дух утаіў і не варушыўся. Тут, можа, цераз мінут пару, пачалі валіць ужо. Як падыдуць тыя людзі за сарай, угледзяць, што мы ўжо ляжымо, толькі войкнуць «ай!». І б'юць іх. Я толькі думаў тое, што, як пачнуць дабіваць, хто зразу зваліцца, могуць і мяне дабіць. Як толькі прыдзе за сарай, павернецца, дык яны б'юць. Па галасах я не пазнаваў, каго прыводзілі, бо я быў не ў сваім канцы дзярэўні, а там, ад Слоніма, куды мяне былі загналі. Як толькі выйдзе сюды — «татачка!», «мамачка!» — і тут б'юць, страляюць. Навалілі, канешне, усіх перабілі.

Тады ўспакоілася, ціішыня стала. Ну, ляжаў я да часоў дванаццаці ночы. Тут пайшлі, пачалі лазіць па трупах свінні. На галавето ў мяне ляжалі людзі, а ногі былі свабодныя... На галаве ў мяне ляжалі, і я не пазнаваў, каго прыводзілі, чутно толькі было, як войкалі дзеці, а так не пазнаваў.

Пачалі лазіць свінні, кроў сабіраць, перайшлі мне на нагах, я ўжо пачустваваў, што немцаў няма, і пачаў вылазіць.

Вылез з гэтых трупаў, падняў галаву, і тут яшчэ адзін, Бардун, быў, таксама... Таксама ўстаў. То ён найшоў яшчэ дзевачку пад мацераю. Яе нямнога ранілі, яна жыве, гэтая дзевачка. Так гадоў мо дзесяць ёй было. У трупах ляжала. Яшчэ адзін дзядзька быў, у доме хаваўся, падышоў, паглядзеў, што мы варушымся. І павылазілі, і пайшлі ў лес. Ну, канешне, сняжок пайшоў, я тады ўстаў, у забітай жэншчыны ўзяў платок цёплы, галаву закруціў, раны свае, і пайшлі ў лес.

Пайшлі ў лес, снег цэлы дзень ішоў. Прахадзілі да вечара, а вечарам прышлі сюды, паглядзець, што тут ёсць. Ну, канешне, прышлі ў дзярэўню... Я ўжо нічога... Усё мне апухла, нічогане слышаў, так брыў, кроў ішла, ні кушаць нічога, толькі папіць. Прышоў дамоў, трупы развярнуў, панаходзіў свае дзеці. Чэцвера забітых, адна дзеўчына і тры хлопцы. І жонка...»

У Гародках, што ў Дзятлаўскім раёне, — там ужо інакш рабілі. Прыехалі, ачапілі вёску, абставілі яе кулямётамі: нікуды не ўцячэш. І тады пачалі хадзіць па хатах і загадваць, каб людзі ішлі на праверку пашпартоў. І трэба толькі, успамінае каваль **Іван Вікенцьевіч Гародка,** забраць з дому пасямейныя спіскі. У заходнебеларускіх вёсках, бліжэй да «рэйха», быў уве-дзены такі кантроль: на кожнай хаце — пайменны спіс сям'і. Каб нікога чужога! Вынеслі стол, лаўкі паставілі — зусім «мірная» бюракратычная акцыя...

«...Самі сталі з адбяспечанымі аўтаматамі, — рас-казвае Іван Гародка. — І немец пытаецца ў солтыса па-польску:

— Ці будуць кватэры для нас?

Солтыс кажа:

— Будуць.

І яны тады, у той момант, давай страляць. Пакуль ён не сказаў пра гэтыя кватэры — яны не стралялі. Гэта знак у іх быў такі, каманда. А солтыс не ведаў. І яго таксама забілі. І братоў яго, і жонку, і дзяцей...

Як яны давай страляць, дык я давай бегчы. Мы траёх тады спасліся...

А потым вёску нашу спалілі. У Гародках забілі тады трыста шэсцьдзесят чалавек. А ў нашай сям'і бацьку забілі (маці памерла раней), тры сястры забілі, і брацік быў яшчэ малы...»

А ў Хаценаве Смалявіцкага раёна яшчэ па-іншаму зрабілі: прыйшлі, разбрыліся па вуліцы, але так, што каля кожнай хаты аказалася па тры карнікі. У вёску людзей пускалі, пакуль не набралася «даволі», «колькі трэба». Тады — дзве ракеты, і кожная тройка ўвайшла ў «сваю» хату і забіла «сваю» сям'ю.

«...На кожным двары паставілі па тры чалавекі — каб у гэты ж мамент выбіць людзей. Каля кожнай хаты.

Столькі іх тады наехала! Скаціну яны ўжо выбралі, пагналі. Гэта ўжо другія, а яны далі дзве ракеты — у тым канцы і ў тым. А потым у хату ўваходзяць і выбіваюць дзяцей і ўсіх, якія там старухі... У мяне вот убілі матку, убілі жану, убілі трое дзяцей. Сын быў з трыццаць шостага, дачка з трыццаць восьмага і з саракавога адзін, маленькі быў. У кутку гэта... патроны там і ўсё... Усё там ляжала. Я прышоў потым і толькі трупы свае закапаў. Папалілі. Толькі каторыя не згарэўшы. Жонка, матка яшчэ... А дзяцей — адны косці пазбіралі.

Сто восемдзесят чалавек забілі».

(**Іван Васільевіч Ліхтаровіч** з Хаценава.)

У Засоўі на Лагойшчыне карнікі пераначавалі, на-ладзілі нават вечарынку пад губныя гармонікі, а раненька пайшлі па хатах: маці, жанчыны ўжо завіхаліся каля печы — іх першых стралялі, а затым заходзілі туды, дзе спалі дзеці...

Вось як расказвае пра гэта **Сабіна Пятроўна Шупляцова:**

«...Прышлі немцы ў нашу дзярэўню, і тут яны пераначавалі, а раненька — яшчэ некаторыя людзі і спалі — пачалі біць. А ўвечары яны нікому нічога не казалі. Білі па хатах і ў тых людзей, у каго начавалі, таксама пабілі, — пайшло заадно. Я была ў суседзяй. І гаварылі, што ў Германію будуць браць, а хто з маладзёжы ўцячэць, то паб'юць старыкоў. Не хацелася, каб гэта пастрадалі нашы старыкі. Ну вот, я да адной дзяўчыны пайшла: калі ўжо ў Германію прыдзецца ехаць, дык каб ужо ўдваіх. Толькі мы трохі пабылі ў іх, ажно ідуць немцы. Ужо біць. Ідуць утраіх к ім у хату, а адзін немец стаяў на вуліцы. Я ішла, а ён папытаўся ў мяне толькі, дзе мой дом. А я кажу: «Вунь».

Пытанне: — А на якой мове ён пытаўся?

— Ну, гаварыў-то ён па-нашаму, але відаць было, што немец, гаворка яго не такая. Я пайшла дамоў, а яны гэту бабу пагналі і забілі там. Глядзім — гарыць сяло. Давай жа мы будзем ужо ўцякаць. І вот мы бяжым вуліцай. А там немец увідзеў, што мы бяжым,— за хатай ён хаваўся — пулямёт укапаны быў. Мы гэта немца ўвідзелі і другой дарогай пабеглі. Дабеглі да пуні. Там рэчачка. Тады два хлопцы кажуць на маю ўжо матку:

— Цётачка, давайце будзем тапіцца.

Там рэчачка невялічкая была. А мая маці кажа:

— Дзеткі, будзем прасіцца, а можа, як адпросімся. Немец выстраліў па нас і вярнуўся. А тады ж ужо з пулямёта як сталі страляць па нас!

Мяне ранілі былі. Ну, і мы паляцелі ў балота...

Хлопцы яшчэ былі малыя. І рэчка невялічкая была — цяпер яе ўжо зусім няма».

У Студзёнцы Быхаўскага раёна — акружылі раненька, праехалі па вёсцы на машынах, нават з гарматамі, да паўдня пабылі каля ветрака

наводшыбе, а тады ўжо строем пайшлі па вуліцы. Па два, па тры адлучаліся ад калоны, ішлі ў двары.

— Заходзь у хату! Лажыся!..

Забіўшы паўтысячы жыхароў Студзёнкі, пераехалі ў суседні пасёлачак Студзянец. Пакуль мылі каля студні рукі, садзіліся піць-есці, працавала авіяцыя: Студзёнку палілі з самалётаў, якім карнікі перад гэтым далі сігнал з гарматы.

Карнікі, вядома, маглі і самі запаліць, як звычайна і рабілася. Але захацелася вось так. Праверыць, што больш эфектыўна. Ды і псіхалагічны момант — паказаць тэхніку, моц. Паказалі і вярнуліся ў Студзёнку, дапальваць тое, што ад авіятэхнікі не згарэла.

* * *

У Быхаўскім раёне ёсць вялікая вёска з прыгожай назвай — Красніца. Мы туды прыехалі ў сонечны ліпеньскі дзень 1972 года — праз трыццаць год пасля таго, як вёску гэтую забілі. Красніца жыве, як жыве сёння і Хірасіма. Але жыве і памяць — аб уласнай смерці памяць. І дзень той для ацалелых жыхароў Красніцы — успышка жудасці, пакуты, перад якімі астатнія месяцы і гады ваеннага ліхалецця нават губляюцца. «Да» і «пасля», а над усім — той ліпеньскі дзень 1942 года.

«...Яны ішлі цераз дзярэўню, не трогалі нікаго. З таго вунь канца цераз кладбішча. Толькі адзін пабег уцякаць, дык яго ўлавілі:

— Ты парцізан?

— Не.

Ну, яго і пусцілі. З такой паліцікай, каб ета ўспакоіць людзей было. Да. Ну, заселі яны. З'ездзілі яшчэ ў Быхаў узнаць, каторую Красніцу — Первую ці Утарую — біць. У Быхаве ўтачнілі, прыязджаюць, ацапілі ўсю дзярэўню. З вінтоўкамі, з кулямётамі ўстанавілі немцаў. А ў дзярэўні былі і паліцаі. Бо калі заганялі ў хату, дык яны па-руску:

— Ану, у хату захадзіце!

Ну што, нездагадлівы народ быў. Ідуць, і ўсё. Пытанне: — А яшчэ не было блізка такіх выпадкаў, каб забівалі?

— Раньша не было яшчэ. Да гэтага дажа не слышна было.

Да. І сталі ў хаты заганяць. Заганяюць і далей ідуць, а ўслед ужо запальвалі. Хаты гэтыя з народам. Гарэць хаты. І з лугу людзі ідуць, сена вязуць, а немцы смяюцца гэтыя, каторыя там ахраняюць, часавыя гэтыя. Смяюцца толькі, што самі ідуць на гібель. А людзі ж не знаюць. Адзін з адным гавораць, што «гэта з парцізанамі б'юцца, давай быстрэй уцякаць, а то будзе і тута...» А калі немцы толькі прыехалі, камендант аб'ясніў, каб на полі ні ската, ні саміх, нікаго штоб не было. Ні ў лясу, ні на полі. Таму што з парцізанамі будзе бой і будуць усіх убіваць. А ў дзярэўні не

будуць трогаць. Ну, усе і кідаліся ў дзярэўню.

Бягуць, бягуць і бягуць. А таго не знаюць, што яны бягуць, а іх — у хаты заганяюць, б'юць. Да. І палюць. Вот і ўсё.

Пытанне: — Ну, а вы? Вас таксама?

— Нас шэсць чалавек ішло з косамі. Ну, і іх ішло восем.

— Кідайце цераз забор косы, — загадваюць.

Ну, мы і бросілі. Як бы на цяперашні розум, дык развярнуў бы гэтай касой — не справіўся б мяне застрэліць, як яму галаву ссек бы касой. Дурныя, можна сказаць, былі. Вот і ўсё. Не вучаныя. Не здагадваліся, што гэта робіцца.

Пытанне: — Аяк яны адзеты былі?

— У форме. Ага. Ну, дык мы ідзём з луга, а часавыя смяюцца. А чаго яны смяюцца, мы ж не знаем. Сустракаем па вуліцы гэтых, каторыя заганяюць і б'юць. Гаворাць:

— Стоп! Назад заварачвайце! Брасайце косы цераз забор.

Ну, і бросілі. А тут гарыць. Пытанне: — А крыкі людзей чуваць?

— Не чуць нічога. Нічаго не чуць, а толькі стральба і ў гэтым канцы гарыць. Да. Ну, нас завярнулі і кажуць:

— Захадзіце ў гэту хату.

Мы заходзім у хату гэтую, а тут поўна ўжо загната. Людзей. І зразу ж гранату нам сюды — шарах! Граната ўзарвалася. Крык! Закрычаць — утарая! Трэцяя! Ну, кагда трэцяя, тагда ўжо ўсё. І замоўклі.

Пытанне: — А вы як у гэты момант?

—Я замеціў, што ён у дзвярах чаку з гранаты вынімае — я ж быў на вайне ўжо. Я ж у Фінляндыі быў на вайне, дык я знаю аружыя.

— Лажыцеся!.. Гранату кідае!

Я сам толькі ўспеў кінуцца, каторыя ляглі, каторыя не — ён ужо кінуў гранату. І мальчык, катораму жывот вырвала — граната перад ім узарвалася, — ён бросіўся на мяне. Яго галава на маю галаву папала. І кагда ўжо трэцюю гранату яны кінулі, узарвалася — усё, цішына стала. Дым гэты сышоў нямнога — захо-дзе адзін, немец ці паліцай, і правярае каждага. І з вінтоўкі дабівае. Гэтага мальчышку — ён яшчэ жывы быў — пацягнуў, ён лыпнуў вачамі, дык ён яму ўдарыў, а яго галава была вышэй маёй, і мне толькі фуражку прабіла. А самаго не затрывожыла. І з етай групы вышла нас два не ранетых, я тожа не ранеты быў, ета не раненне, што шапку прабіла, валасы выскубнула. Да, і два ранетых вышла. А ўсе пагібшыя ў гэтай групе. Там народу, можа, сорак ці пяцьдзесят чалавек было — я не магу точна сказаць.

Пытанне: — Вы доўга ляжалі?

— Не, як яны тольківышлі... Я сазнанне не губляў, я слышу: выходзіць... вышаў... пайшоў... разгавор, пайшлі на вуліцу... Да, як на вуліцу пайшлі, я падымаюсь. Кругом паглядзеў — няма нікога, усе ляжаць! Ціхонька гавару:

— Ці ёсць хто жывы? Да. Другі гавора:

— А я жывы. І другі кажа:

— Я ранеты, але жывы.

Што рабіць? Да. Давай на чардак. Мы на чардак усхваціліся. Там дыра была. Да, я наблюдаў. Яны пашлі **ў** адну хату. Пасля далей. Я гавару:

— Будуць паліць, усё, мы пагарым тута.

— Ды не будуць!

— Ды як не будуць, дым ідзець жа, гарыць што-та. Ну, саскочылі і — у гарод. Ячмень быў. У ячмень гэты. Да. І там поўзалі да гэтаму ячменю. А там праз лужок у жыта.

Пакуль часавы адвярнуўшысь быў. І ў лес.

Пытанне: — А ў вас сям'я была?

— Усіх пабілі. Адным словам, сродства, братніх дзяцей, сёстры і браты ў мяне, — пагібла ў тое ўрэмя ў мяне дваццаць пяць чалавек. І жану ўбілі...»

Так гэта бачыў **Палікарп Мікалаевіч Шакуноў.** Мы яго сустрэлі на красніцкай вуліцы, вёў каня з пашы, можа, як тады, трыццаць год назад, — мы яго спынілі, спыталіся, хто мог бы расказаць, «як білі»...

— Ёсць, засталіся людзі. Я застаўся. Адамкнулі нам клуб, і пакуль Палікарп Мікалаевіч расказваў, збіраліся яшчэ жыхары ранейшай, забітай Красніцы. Прыходзілі па аднаму. Садзіліся ўздоўж сценкі, каля акон і моўчкі слухалі тое, што бачылі, перажылі і самі.

857 чалавек тады забілі ў Красніцы...

**Пётр Юр'евіч Перапечын.**

«...Я быў малы. Нас было ў маці чэцвера малых. Брат дваццаць шостага года, каторы астаўся жывы, сястра трыццаць трэцяга і трыццаць сёмага — брат. Ацец умершы ў трыццаць сёмым годзе. Брат старэйшы пайшоў хавацца ў ячмень, а ў гэта ўрэмя бяжала Бабкова Марыя. Яна цяпер у Магілёве жывець. Дзяўчына. Выскачыла. Мы ў адным класе вучыліся з ёй. Бегла і крычала:

— Уцякайце, хавайцеся, б'юць усіх падрад!

Я маці стаў прасіць, гаварыць, што, значыць, пайдзём хавацца. Маці што-та, ілі расцяралась яна, ілі што:

— Нікуды, — гаворыць, — не пойдзем.

Ну, тагда я стаў прасіць, каб меншага брата ці сястру аддала, штоб мне пайсці ўдваіх. Яна не пусціла, гаворыць:

— Ідзі, еслі хочаш, адзін, раз табе нада так.

Ну, і патом, у ета ўрэмя, кагда мы... Убачылі мы ўжо, што падзвігаюцца сюды, мы на свой двор зашлі там к сараю, селі паўз забор: я самы крайні сеў. Заходзяць двое. Адзін гаварыў па-нямецку, адзін па-руску, каторы гаварыў па-нашаму — гэты з вінтоўкай. А той з пісталетам. Стаў на

праходзе. Зайшоў той, каторы гаварыў па-руску, ён, канечна, дабраволец.

— Ідзіце ў хату, лажыцесь.

Ну, матка тут на каленкі, усе мы радам там, давай прасіцца там. «Паночкі, галубочкі» — там усё гэта... Ну, патом ён, значыць, хацеў мяне прыкладам ударыць. Я зразу сабраўся і пайшоў уперадзі. Пайшоў уперадзі, за мной сястра, трыццаць трэцяга года. Я як ішоў, — у нас дзве хаты было, — на ўтарую хату прайшоў, а маці з маленькім, трыццаць сёмага гэты, — у той хаце. Ён адразу... Маць убілі насмерць зразу. Брат доўга мучыўся. Патом зайшоў — сястру зразу насмерць. А мне сюда вот у плячо ўдарыў, сюда пуля вышла. Як ляжаў, закрыўся і глаза закрыў. Кроў пайшла, я ляжаў, ну, хто яго знае, прэдпалажэнне — кнігі чытаў жа — кроў ёсць, думаю: скора я памру ці не? Ну, патом яны,.. Там стаяў атцоўскі яшчэ, ну, па-нашаму, як чамадан такі, сундук такі. Яны там, што лучшае было, выкінулі, пасматрэлі ўсё, перакапалі, ка мне сюды ў кроў выкінулі. Ну і выйшлі з хаты яны тады, пайшлі, значыцца. Я ўстаў, сястру гэтую перавярнуў — мёртвая. Матка ляжыць — тожа мёртвая. Я яшчэ брата на рукі ўзяў, панасіў. Ён тожа кончыўся. Я яго матцы на руку палажыў, у акно паглядзеў — нікога няма.

Толькі выхажу на двор — яны выпускаюць наш скот. Ну, карова там была, авечкі. Выганяюць іх на двор. Толькі яны, значыць, замецілі — я цераз забор пераскочыў. Яны яшчэ раз выстралілі. Ну, і бег, якраз набег на гэтага большага брата ў ячмені. Ён мяне пала-жыў, і я больш ужо не ўстаў. Раны сталі балець, і больш не ўстаў. Ну, вобшчам, скот яны выгналі, прасігналілі, значыць, кагда паліць. Запалілі. Патом, значыць, згарэў наш дом.

Усталі мы, гэты брат мяне падняў, суседзі сталі падхадзіць. Ну, і пайшлі ў лес...»

Вось так, адзін за адным, садзяцца да мікрафона жыхары Красніцы — калісьці забітай вёскі. Услед за Пятром Перапечыным — зноў жанчыны: Ева Тумакова, Ніна Князева. Па нейкаму асабліваму шчасцю гэтыя людзі і яшчэ некалькі дзесяткаў краснінцаў ураталіся ў той дзень. Каты зрабілі сваю справу: 857 чалавек застрэлілі, спалілі. І ўсё ж не так «чыста», як умелі і вучыліся рабіць. Тут яшчэ толькі асвойвалі прыёмы, метады. Бо былі мы на месцы і такіх вёсак, знішчаных у 1943 і ў 1944 гадах, калісьці вялікіх, шматлюдных (Макаўе Асіповіцкага раёна, Ямішча — Шумілінскага, Пузічы — Салігорскага і інш.), дзе ніводная жывая душа не ўратавалася. Ніводзін, хто б мог расказаць. Поле, жыта, помнік у бярозавым гаёчку — цэментная пірамідка з трохзначнай лічбай забітых, спаленых і нябачныя жаваранкі, што спрабуюць сваім шчэбетам запоўніць пустэчу...

Асаблівую пустэчу, якой няма, мабыць, і ў самай пустой пустыні.

Красніцу забівалі ў ліку першых (у гэтай мясцовасці). Праўда, даходзілі чуткі пра вёску Студзёнку (таксама Быхаўскага раёна), што быццам бы выбілі там усіх людзей. Але, аказваецца, цяжка чалавеку ў такое паверыць. Нават шмат чаго пабачыўшы, перажыўшы.

Карнікі ўсё гэта ўлічвалі: калі людзі ўжо моцна напалоханы, дакладна ведаюць — дык адзін «падыход»; але зусім інакшы, калі забойцы маглі разлічваць на такі вось стан: чалавек бачыць, што б'юць, забіваюць усіх падрад, а ўсё не верыць, што магчыма гэта...

У Магілёве мы адшукалі **Марыю Бабкову** — тую колішнюю дзяўчынку, крык якой быццам разбудзіў многіх: «Забіваюць жа людзей!» Цяпер у Марыі Віктараўны іншае прозвішча — Паўлава, па мужу. У старым драўляным доме, адрас якога нам далі ў Крас-ніцы, яе мы не знайшлі: пераехала ў мікрараён Юбілейны.

Звычайна мы спачатку чалавека бачым, чуем, а ўжо потым даведваемся, што з ім было: з яго расказу. А тут мы павінны былі сустрэцца з жанчынай, загадзя ведаючы пра яе лёс, яе «гісторыю». І мы міжволі пры-глядаліся да яе, быццам пазнавалі, — прыглядаліся да невысокай жанчыны са смуглявым худым тварам, што стрымана глядзела на нас, слухала, чаго гэта прыехалі да яе здалёку людзі. Красніца?.. Так, яна туды часта ездзіць, бывае там. Хоць сама даўно ўжо ў горадзе жыве, працуе на млынакамбінаце. Муж — слесар. Вунь і дачка ўжо вырасла, гэта яна там на кухні гучна, па-маладому, смяецца — з мужам сваім, такім жа маладым. У іх там свая размова, свае інтарэсы, а маці — калі гэта людзям патрэбна! — села перад на-шым мікрафонам:

«...Калі немцы ацапілі дзярэўню, мама была на сенакосе, а мы — брат мой і тры сястры — дома. Недалёка ад нас была школа. Калі прыехалі, яны спачатку сталі біць гэтых, бежанцаў. Яны там жылі ў школе, некалькі сямей, і іх сталі страляць. А ў нас там побач жыў сусед, ён быў дома. Дык страляюць гэтых у школе, а пулі па дзярэўні так — фіў, слышна, як лятаюць. Я тады пайшла к яму:

— Ой, — гавару, — дзядзя, што-та дзелаецца, ці б'юць, ці што.

А ён:

— А, панікёрша! Хто цябе тут будзе біць!

Там яны пастралялі ў школе і пачалі хадзіць. Два немцы той сторанай вуліцы ідуць, а два — па гэтай. Па хатах: два туда і два сюда. Наша хата была трэцяя ці чацвёртая. Вот яны ў адзін дом зайшлі, было там закрыта, у другі зайшлі.

Старуха бяжала — у яе дочкі на балоце былі, — з унучкай была. Прыастанавілася і гаворыць:

— Пайду дальша.

У трэці зайшлі, пабілі ўсіх, хто там быў. Пытанне: — Вы чулі, як стралялі?

— Не. Мы не чулі. Яны ўвайдуць і там страляюць. А мы ўсё матаемся: то к дому свайму, то к суседу.

— Мужчыны, што ж нам дзелаць?

Страшна, б'юць! У мяне сястра і брат былі старшыя, а я сярэдняя. Ну, тагда — ідуць к нам! Ой, два немцы!.. Там былі і паліцаі, а гэтыя — з бляхамі на грудзі. Страшныя такія. Ужо яны пабілі суседзяў і к нам ідуць. Я: «Ой, дзядзя, глядзіце, па хатах ходзяць, б'юць, сюды ідуць!» Ну, мы тут сталі і стаім. Я ў сваём доме не была. Дзве сястры там было — убілі. Ідуць сюды! А мы з братам тут. Брат после хваробы быў зусім слабы. Еслі б ён быў здаровей, і ён бы бяжаў. А ён быў зусім слабы. Паліцэйскі і гаворыць:

— Ідзіце ў хату!

— Ой, — усе закрычалі. — Што дзелаць?

Мы ўсе тагда — гэты мужчына, у яго была сям'я, пяць душ, я шостая — сяйчас мы ўсе ніц, палажыліся на пол і сталі крычаць. Ну, я ўжо не помню, хто там як крычаў. Яны сяйчас — вінтоўкі там, ці кулямёты, і давай у гэтых людзей страляць. Як яны першы раз выстралілі... Якраз каля акна стаяў сундук... Як яны першы раз стрэлілі, я тады на сундук, з гарачкі, ці што, на сундук, а вакно гэтае адкрывалася — я ў вакно. Рукой таўкнула і на вуліцу пабегла. Калі я пабегла, два немцы з другой стараны ішлі, — пабілі ў другой хаце і ішлі, — яны пагергеталі, а я ў дзярэўню, у той канец. Яны яшчэ там не праходзілі, яны толькі тут пачалі. Я пабегла, людзі стаяць, усё спрашваюць:

— Што там, Маня, што там? Я гавару:

— Ой, уцякайце, б'юць немцы!

Тады хто куда — табунамі! Пабеглі хавацца, хто куды. А тых, хто на балоце былі, мацi нашу, тых загналі таксама ў хату і гранаты кідалі, а каго спалілі.

А дочка таго хазяіна таксама за мной кінулася ў вакно, а немец ёй у плячо, і яна назад у груду ўпала.

Але засталася жыва, у Брэсцкай вобласці жыве.

Людзі гавораць, што, калі я бегла, мяне ўзнаць не маглі: чорная-чорная, страшная. Я часам езджу туды, мне гавораць:

— Ну, ты нам жызь спасла. Стаялі б і ждалі, па- куль падайдуць немцы.

А мы потым у рож схаваліся.

Тады яны затрубілі, сігнал далі і паехалі...»

* * *

У Хатыні — могільнік звыш 600 забітых беларускіх вёсак. І гэта далёка не ўсе тыя вёскі, куды фашысты прыходзілі, прыязджалі, каб вынішчыць, спаліць усіх — ад старога да дзіцяці, дзе выконваўся план «абязлюджвання тэрыторыі»,

«пашырэння жыццёвай прасторы на ўсход».

Беларускіх вёсак, дзе карнікі спецыяльна забівалі людзей, — 4885. Падалёкане поўных падліках, больш за трыста тысяч мірных жыхароў было спалена жывымі, забіта, замучана ў тых вёсках.

І амаль столькі ж населеных пунктаў (4315) «проста згарэлі». Таксама ад гітлераўцаў, але жыхароў там не пабілі.

Калі пабываеш, як мы, у большасці раёнаў, у многіх вёсках, запісваючы іх ваенную, вогненную памяць, і пасля чытаеш справаздачы карнікаў, дакументы, раптам узнікае і такое адрозненне: «проста згарэлі». Бо ў Хатыні фашысты яшчэ і «працавалі», больш таго — «эксперыментавалі».

Беларускія Хатыні — гэта падрыхтоўка да рэалізацыі планаў і мэт, якія датычыліся не толькі нас, не толькі савецкага народа. І нават не адных толькі славян.

Выпрацоўваліся метады, рыхтаваліся спецыялісты на «канчатковае ўрэгуляванне» — вынішчэнне цэлых народаў ва Усходняй і Заходняй Еўропе і на іншых кантынентах. Вядома, пасля разгрому галоўных праціўнікаў фашысцкай Германіі.

«Калі вайна будзе выйграна, тады, я вам ужо гаварыў аб гэтым, пачнецца наша праца, — злавесна на-гадваў сваім падручным Гімлер у кастрычніку 1943 года на нарадзе групэнфюрэраў СС у Познані. — СС разам з сялянамі і мы сумесна з нашым сябрам Баке пачнём займацца засяленнем Усходу, велікадушна, без усякіх абмежаванняў, не пытаючыся ні пра што, з размахам і рэвалюцыйным напорам, дык на працягу 20 год мы прасунем граніцу нацыі на 500 кіламетраў на Усход...

...Мы будзем дыктаваць Усходу нашы законы. Мы будзем прабівацца наперад і паступова падыдзем да Урала». Вось такія маштабы меліся на ўвазе «пасля перамогі». Але і яны — першы крок да сусветнага панавання «арыйскай расы».

«Усходняя палітыка» генацыду была сфармулявана Гітлерам яшчэ ў 1932 годзе:

«Усходнія тэрыторыі стануць вялікім эксперыментальным полем па ўстанаўленні новага грамадскага ладу ў Еўропе, і ў гэтым вялікае значэнне нашай усходняй палітыкі».

«Эксперыментальным полем» выбрана была перш за ўсё Беларусь. Таму, у прыватнасці, што ў гаспадарчых адносінах гэты край лясоў і балот, з пункту гледжання нацыстаў, — не самы «каштоўны». Значыць, якраз яго ператварыць у вялізны «загон», куды будуць пераганяцца цэлыя народы на «каранцін», «асобую апрацоўку »...

Вось вытрымкі з рапарта адной з камандаў, занятых прыёмам эшалонаў і «размяшчэннем», «уладкаваннем» яўрэйскага насельніцтва, прысланага з Заходняй Еўропы. (Па плану Гітлера такім жа шляхам затым павінны былі

пайсці, перасяліцца ў Беларусь» і «за Урал» галандцы, бельгійцы і іншыя еўрапейскія народы, чые землі збіраліся засяліць нямецкімі каланістамі.)

Група СС «Арльт» *Мінск, 3 жнійўня 1942*

РАПАРТ

Работа рэшты людзей тут у Мінску па-ранейшаму тая самая. Транспарты яўрэяў праз даволі раўнамерныя прамежкі часу прыбы-ваюць у Мінск і перадаюцца нам. Так што ўжо 18 і 19.6.42 мы зноў займаліся капаннем ям...

26.6 — прыбыў чаканы транспарт з рэйха.

27.6 — мы зноў вярнуліся ў Мінск. Наступныя дні былі заняты чысткай зброі, прывядзеннем у парадак амуніцыі.

2.7 — зноў пачалі падрыхтоўку да прыёму транспарту з яўрэямі, капанне ям.

10.7 — была кінута супраць партызан латышская каманда ў лес пад Койданава. Пры гэтым быў выяўлены склад боепрыпасаў. І раптам нас з тылу абстралялі з аўтаматаў. Адзін латышскі саслужывец быў пры гэтым забіты. Праследуючы банду, расстралялі чатырох чалавек.

17.7 — прыбыў транспарт яўрэяў, адпраўлен у маёнтак.

21, 22 і 23.7 — капалі новыя ямы.

24.7 — зноў транспарт яўрэяў (1000 чал.) з рэйха.

З 25.7 па 27.7 — капалі новыя ямы.

28.7 — вялікая акцыя ў мінскім гета. 6000 яўрэяў дастаўлены да ям.

29.7 — 3000 нямецкіх яўрэяў дастаўлены да ям.

Наступныя дні зноў заняты чысткай зброі, падгонкай амуніцыі. Пазней мая група нясе дзённую службу па ахове будынка турмы...

Паводзіны людзей здаровыя, па-за службай добрыя і не даюць поваду для асуджэння.

*Унтэршарфюрэр СС*

Эшалоны з Захаду ішлі, акупаваную Беларусь усё большператваралі ў раён «асобай апрацоўкі» мільёнаў людзей. Прывезеных. А разам з тым і мясцовага насельніцтва. Планавалася так «па-асобаму апрацаваць» не меней трох чвэртак саміх беларусаў. Заадно і павучыцца, лепей авалодаць «тэхнікай абязлюджвання», падрыхтаваць «кадры». Мела значэнне ў іх разліках і тое, што ва ўяўленні гімлераў і розенбергаў «беларусы найбольш бяскрыўдны і таму самы бяспечны для нас народ з усіх народаў усходніх абласцей». Разлік на гэта, на пакорлівасць, «рахманасць» беларусаў вельмі хутка фашыстам прыйшлося перакрэсліць — і з якой яшчэ панікай у іх штабах. Сотні тысяч беларускіх партызан, цэлыя раёны, недаступныя для акупантаў, армія «Цэнтр» амаль увесь час на «галодным пайку», бо чыгуначны рух перарываецца, а затым — у 1943 і 1944 гадах — нябачаныя ў гісторыі войнаў адначасовыя

партызанскія ўдары па ўсіх камунікацыях — «рэйкавая вайна»!

Насельніцтва фашысты працягваюць знішчаць, цяпер — пад выглядам барацьбы з партызанамі і нават — «самаабароны». Але партызаны перашкаджаюць яшчэ шырэй разгарнуць «працу», партызан столькі, што на задуманае выкананне «плана» ўжо не хапае сіл: прыходзіцца абараняць ад партызанскіх атак дарогі, гарады, важныя аб'екты... Спецыяльныя групы, каманды (пад прыкрыццем і з удзелам армейскіх часцей) з маніякальнай настойлівасцю працягваюць «працу», хоць вайна ўжо яўна прайграна. Яны ўсё «ўзбагачаюць» метады, рыхтуюць кадры, рыхтуюцца да нечага яшчэ больш нялюдскага і злавеснага, эксперыментуюць.

Слова гэта — «эксперымент» у наш век усё часцей успыхвае злавесным сэнсам.

Хірасіма, Нагасакі — гэта ж таксама «эксперымент».

Існуюць дакументальныя кінакадры аб тым, як выбіраліся аб'екты першых атамных бамбёжак.

Мясцовасць, тапаграфія, пажадана, каб была такаяітакая...

Будынкі — вось такія...

Насельніцтва — столькі...

«Гэтым патрабаванням адпавядаюць (рука з каляровым алоўкам шукае на карце) гарады... Хірасіма (крыж)... Нагасакі (крыж)».

Нацысты не валодалі такой зброяй. І ў гэтым шчасце чалавецтва. Прыходзілася ім разлічваць на «звычайную». І на спецыяльныя каманды, і іх трэба было для «плана» ўсё больш і больш, вопытных, абучаных на практыцы — бо маштабы меліся на ўвазе не меншыя, чым у атамных маньякаў, — дзесяткі, сотні мільёнаў запланаваных забойстваў.

І на жудасным шляху да гэтай мэты «канчатковага ўрэгулявання ў Еўропе» (а затым — і ва ўсім свеце) — трагедыя беларускіх Борак, Красніцы, Брыцалавіч, Княжаводцаў, Студзёнкі, Паршчахі, Хатыні...

Сотні і сотні Хатыняў, справаздач, «эксперымен-таў»: «аперацыя Боркі (Маларыцкія)», «аперацыя Боркі (Кіраўскія)», «аперацыя Красніца», «аперацыя Збышын»...

Экспедыцыі ў цэлым называліся ў іх інакш, звычайна не па назве асобнай вёскі ці мясцовасці, а вось так здзекліва-«паэтычна»: «Фрулінгсфэст» — Вясновае свята, «Зумпффібэр» — Балотная ліхаманка, «Зумпфблютэ» — Балотная кветка, «Нордполь» — Паўночны полюс, «Эрнтэфэст» — Свята ўраджаю, «Штэрнэнлаўф» — Зорны шлях, «Шнэехазе» — Заяц-бяляк, «Фён» — Альпійскі вецер, «Вінтэрцаўбэр» — Зімовыя чары, «Вальдвінтэр» — Лясная зіма, «Кугэльбліц» — Шаравая маланка, «Цаўбэрфлётэ» — Чароўная флейта, «Майгэвітэр» — Майская навальніца, «Цыгойнэрбарон» — Цыганскі барон, «Фрайшутц» — Вольны стралок і г. д.

Але забойства Красніцы, Борак, Брыцалавіч, як і кожнай з Хатыняў,

было звычайна асобнай аперацыяй — з асобай задачай і справаздачай аб паводзінах ахвяр і саміх катаў, аб праліках ці «тактычных знаходках», «адкрыццях».

У адной і той жа мясцовасці спецыяльныя каманды рэдка забівалі вёскі аднолькава: калі адных збіраюць, зганяюць у гумно ці хлеў пад выглядам «сходу», «праверкі дакументаў», дык у суседніх вёсках ужо хо-дзяць з хаты ў хату і забіваюць на месцы. І гэта таксама — з улікам вопыту і дзеля ўзбагачэння вопыту...

У межах агульнай «задачы» быў поўны прастор для садысцкіх імправізацый. Загадаюць людзям памаліцца (Доры Валожынскага раёна) і спаляць іх. І яшчэ вось так паздзекуюцца...

**Юліян Рудовіч.**

«...Сказалі ўсім ісці ў царкву памаліцца Богу, і нас адпусцяць дамоў. У царкве немец падышоў да мяне:

— Аддай кіндэр матцы, а сам — вэк!

Узяў за каўнер і выкінуў на двор. І ўсіх, хто не з дзецьмі, — выходзь! І хто кіне дзіця, у царкве кіне — можа выходзіць. Пушчалі, пушчалі, хто кіне... Але ж не кожная маці можа так здзелаць. Ну, мая не кінула, не кінула... Не знаю... Але нехта павінен у жывых астацца, калі так, праўда ці не? Калі так, нехта павінен астацца! А мая не захацела, асталася з малым. Немцы царкву падпалілі, мы ўсе, каторыя на двары, чуем, як людзі там лётаюць. З кулямётаў усіх перарэзалі — агонь толькі...»

Ці ўкінуць старую, нямоглую жанчыну ў калодзеж (Пагулянка Рэчыцкага раёна), а на яе — набытак хатні, колы, бервяно...

І зноў пішуць «справаздачу» — пераможную, урачыстую, з усведамленнем, што выконваюць «місію». А як жа, яны не проста забойцы, яны служаць «ідэі», «вялікай Германіі», «фюрэру», рызыкуюць атрымаць кулю ад партызан, змагаючыся за «новы парадак»!

А зверху ідуць заахвочванні, узнагароды, адны каты ставяцца ў прыклад другім.

Асабліва прыдатным да такой працы аказаўся Оскар Дзірлевангер — яго Гітлер вылучыў чынамі і ўся-кімі «крыжамі», якія толькі былі: ад «залатога» да «рыцарскага».

Вось «вяхі» яго біяграфіі, вельмі тыповыя: 1932 г. — уступае ў нацысцкую партыю; 1934 г. — за злачынства: распуста з асобамі маладзей за 14 год — 2 гады турмы... Пасля набыцця адпаведнага карніцкага вопыту ў Іспаніі і Польшчы ён з'яўляецца ў Беларусі з такой атэстацыяй, што прайшоў падрыхтоўку, якая перакрывае, судзімасць за «браканьерства». Так называлі вышэйшыя чыны, да самога Гімлера ўключна, з усмешкай узаемаразумення, тыя эсэсаўскія забавы «з асобамі маладзей за 14 год»... У загадзе, з якім Дзірлевангер прыехаў

з Любліна ў Беларусь, сказана было, што ён «роўны сярод нас». «Роўны» адразу пачынае расці, рабіць кар'еру — ужо на крыві дзяцей і жанчын беларускіх. Схільнасць да «браканьерства» застаецца. Кавалер залатога, рыцарскага і г. д. крыжаў любіў павучаць сваіх малойчыкаў: я, маўляў, не супраць таго, каб вы спалі з рускімі дзеўкамі, але пасля гэтага ты павінен застрэліць яе...

Больш за сто дваццаць тысяч — столькі людзей забілі, спалілі жыўцом «рыцары» дзірлевангераўскай банды ў Беларусі. Боркі Кіраўскія, Збышын, Красніца, Студзёнка, Капацэвічы, Пузічы, Макаўе, Брыцалавічы, Вялікая Гарожа, Гарадзец, Доры, Іканы, Загліннае, Вялікія Прусы, Пераходы... Сто пяцьдзесят населеных пунктаў спаліла разам з людзьмі каманда Дзірлевангера толькі ў Магілёўскай і Мінскай абласцях. Нямала і ў іншых, асабліва ў Віцебскай і Гомельскай.

Гэты забойца не толькі пісаў справаздачы, але асабіста ездзіў у сталіцу трэцяга рэйха і прывозіў адтуль узнагароды, загады аб узбуйненні брыгады, радасную ўпэўненасць садыста-ката, што галоўныя забойцы ведаюць пра яго, спадзяюцца на яго стараннасць.

Расхвальваючы ў сваіх загадах Дзірлевангера, начальства пісала пра тое, што ён «падае прыклад радасці ўдзелу...» у масавых забойствах людзей. «Радасці» — і не менш! Вось чаго хацелі, чаго патрабавалі ад забойцаў-выканаўцаў тыя, хто планаваў — знішчыць трыццаць мільёнаў славян. Напачатку — трыццаць...

У Нюрнбергу, на працэсе ваенных злачынцаў, адбыўся такі дыялог паміж судом і адным з дасведчаных саўдзельнікаў тых спраў, які добра ведаў тайныя планы фашысцкіх верхаводаў, — з Бах-Зелеўскім, начальнікам штаба баявых часцей па барацьбе з партызанамі пры рэйхсфюрэру СС.

І. В. Пакроўскі, савецкі абвінаваўца: Ці ведаеце вы што-небудзь пра існаванне асобай брыгады, якая была сфарміравана з кантрабандыстаў, заўзятых злодзеяў і выпушчаных на волю арыштантаў?

Бах-Зелеўскі: У канцы 1941 г., пачатку 1942 г. для барацьбы з партызанамі ў тылавой групе «Цэнтр» быў вылучаны батальён пад камандаваннем Дзірлевангера. Гэтая брыгада Дзірлевангера складалася ў асноўным са злачынцаў, што мелі судзімасць, афіцыйна з так званых злодзеяў, але пры гэтым яны былі сапраўднымі крымінальнымі злачынцамі, якіх асудзілі за крадзеж з узломам, забойствы і г. д.

І. В. Пакроўскі: Чым вы растлумачыце, што нямецкае камандаванне тылу з такой гатоўнасцю павялічвала колькасць сваіх часцей за лік злачынцаў?

Бах-Зелеўскі: На маю думку, тут ёсць адкрытая сувязь з прамовай

Генрыха Гімлера ў Вевельсбургу ў пачатку 1941 года, перад рускай кампаніяй, дзе ён гаварыў аб тым, што мэтай рускай кампаніі з'яўляецца: расстрэльваць кожнага дзесятага з славянскага насельніцтва, каб паменшыць іх колькасць на 30 мільёнаў. *Для вопыту і былі створаны такія нізкапробныя часці, якія фактычна былі прызначаны для выканання гэтай задумы.* (Курсіў наш. —*Аўт.)*

І. В. Пакроўскі: Ці можаце вы шчыра і праўдзіва сцвярджаць, што мэтай мерапрыемстваў, якія праводзіліся ўзброенымі сіламі ва ўстаноўленых немцамі акругах, было памяншэнне славянскага і яўрэйскага насельніцтва на 30 мільёнаў чалавек?

Бах-Зелеўскі: Я прытрымліваюся той думкі, што гэтыя мётады сапраўды прывялі б да знішчэння 30 мільёнаў чалавек, калі б гэта працягвалася».

* * *

**Марыя Хамук,** у той час бяздзетная маладзіца, салдатка, муж якое трапіў у нямецкі палон з польскага войска ў верасні 1939 года і быў у тую пару, як акупанты знішчалі Боркі, у Германіі.

«...Нас було трынаццаць душ сэм'і. Мы ўсі палажылыся спаты. А хтось стучыць у хату. Моя свэкруха ўстала ды кажа:

— Уставайтэ, дзіткі, бо то смэрць наша... А як могла вона знаты, то ніхто не знае.

Нас занялі дзесяцёра. Мой свікар узяў хліб, а німэць узяў той хліб вырваў і на палаткы, і мы ўжэ бачым — штосьці будэ для того...

Гналы нас у сэло на сабранне, пасадылы ў гародзі, сыдимо мы, сыдимо, а потым прыходзяць німцы, выклікаюць ад васімнаццаці лет до сарака пяці. І вы-клікалы, поставылы по чатыры чалавікі і кажуць: «Ужэ будуць у Германію браты...» Патом мы дывимо-ся: ідэ машына, бэрэ збірае копачкі[30], выносяць з хат. Кажуць, шо ўжо будуць тых біць, расстрэльваць — от так там ўсякага, хто дэпутатам, хто такі, а хто такі... А хто ж надзіяўся, шо ўсіх людзей будуць расстрэльваты? Ніхто нэ думаў...

Мы ждэмо, ждэмо. Кажэмо: «Вот прыйдуць».

А мы ўсі ў гародзе сыдимо, нас много людзей. Топіро[31] ждэмо, і дождалыся.

І давай. Топіро німцы тут, ідуць, і хто нэ здужаў, вазылы, хто здужаў іці, по трыццаць чалавік гонылы туды, на могілкі.

А то ўжэ дайшла очарэдзь, а я ўсэ аставалася ззаду, аставалась-такі ззаду. Ужэ засталося мало шо людэй. Ужэ думаема: «Шо будэ, то будэ, ідэмо ўжэ ўпэрэд». Не можам цярпець, ужэ нэрвы нэ стрымліваюць. Мы пошлы. Нас чалавек трыццаць гнаў до могілак. Прыгнаў — лежала одэжа ўся скінутая. Так мы думалы — дожд такі сільны,

[30] Копачка *(дыял.)* — лапатка для капання бульбы.
[31] Топіро, уласна допіро *(укр.)* — толькі што.

сільны ішоў, так мы думалы, шо лю-ды побыты лежаць на такім грудэві. Мы доходым туды, а то одэжа, народ увесь роздзягнены быў, у ямку голых усіх гоныла быты.

Топіро нас положылы ніцма, коло тое одэжы.

І зноў кажэ по-польску:

— Уставайтэ, хто мае пашпорт, отдайтэ!

А там у нас, за німцом, прыкладалы пальцы до пашпорту.

Мы, хто падаў той пашпорт, хто нэ падаў, хто дома забуўся ўзяты того пашпорта. Хто ж там тагды помніў...

І патом гаворáць по-польску:

— Скыдайтэ одэжу з сэбэ.

Я просылася, шчоб мэні хоч погыбнуты ў одэжы.

— На мясо тобі жамчугы? — гаворыць. — Усэ скідай.

Вон дэ во, паціркі два радочкі ў мэнэ булы, бусы, жамчугі.

І патом я стала зноў просытыся. Думаю, у мэнэ родыны нэ мае тут у Борках, — одна родына тут, шо я выйшла замуж, а другая родына, ацец і маць у другой дэрэўні булы на Барысаўцы. Тую тожэ ўсю выстрэлялы дэрэўню... Як стала я просытыся! Кажу, шо ў мэнэ чоловік у Германіі.

— А пісьма е?

Кажу:

— Дома е.

Думаю, як ужэ додому завэдэ, як нэ найду тых пісем... А іх і нэ було, тых пісем, я ёму так мутыла, коб мэні остатыся.

А патом кажэ по-польску:

— Вэзь своє убранне!

Стала я адыходыты, голая, у одной рубашцы, судзіўкі на мне нэ було. А він потым по-польску гаворыць:

— Вэзь своє убране. Толькі, — кажэ, — чужого не чапі.

І посадылы мэнэ ўжэ под тым такім бар'яком, под сасною. І такі сільны дождж пайшоў...

А тых людзей, шо за мною гналы, і такія маленькія дзіты, то позабывалы на моіх очах... Дзітэй маткі распавывалы, і він гэць такіх голых носыў у ямку...»

Яўхіма Баланцэвіч была ў тую пару таксама салдаткай, як і Марыя Хамук, і яе муж быў у палоне з польска-нямецкай вайны. На руках у маладзіцы аставаўся шасцігадовы сын, а побач з ёю была старэнькая маці, з тых мацярок, якіх народная песня называе дарадчыцай у хаце. Яўхіма Парфёнаўна гаворыць:

«...Як шчэ гналы до школы, то ўсэ людэ так казалы, можэ, шчэ ў Германію повэзэ, але ўжэ як помінулы тую школу, то людэ кажуць: «нэма нас», «поб'юць нас»...

Одын — ёго звалы Кальчук. Як паіхала машына краем, ён пабачыў німціў, выскачыў праз акно і пачаў уцікаты ў кусты. Добіг до кустоў, і там ёго забылы. Німцы сталы з машыны по ёму стралягы.

І прыіхалы назад, тая машына, у агарод і гаворaць:

— Нашу машыну абстралялы, а вы гаворытэ, што партызанаў нет. А нашу машыну абстралялы.

А хто ж страляў? Мы ж усі ў агародзі... Прышла ёго маты рыдна і гаворыць на дочку тую:

— Нэма, дэтыноньκа, нашого Йвана.

І вот тодзі мы ўсі сталы плакаты. Колі нэма Йвана, кажэмо, нэма і ўсіх нас. Ёго забылы над канавой. Пытанне: — Аён сапраўды страляў па машыне?

— Ніхто нэ страляў на іх, толькі так воны казалы, коб мы нэ розбіглыся ў агародзі, што от «у нашу машыну стралялы ».

Пытанне: — Апартызаны ўвас тут былі?

— Не. Мы нэ бачылы тут. Партызаніў мы тут ніколы, ніколы нэ бачылы. Толькі одын чоловік, як білы, быў з нашай дэрэўні ў партызанах. Радзіюк Уладымір.

...Ой, загнаў тую маладзёж... Потым ужэ машыны сталы ходыты, залізка[32] збыраты ў дзярэўні. Назбіралы тых залізкаў і далы той маладзёжы, коб ямкі копалы. Накопалы тыя ровы, я нэ бачыла як. Чула — з кулямёта сёк, чулы той звук, як стралялы.

Але што ж, сыдымо, дажыдаемо пары: ужэ нікуды нэ ўтэчэш.

І ўжэ пабіў іх, і тогды даваў ужэ браты старэйшых парубкіў, мужчын. Повыбраў тыя мужчыны і то гоніў, то возыў там — усяк було.

Побыў іх, тогды давай ужэ выбіраты бабоў. Мэнэ тожэ туды завэзлы на вазу. Хто нэ здужаў ісці, хто ідзе, хто сыдыць. Я вот ужэ і нэ помню, колькі нас душ сыдзіла на возе... І хлопчык мой зо мною. І моя маты — ужэ як мы пад'іхалы до тых могілак, то думалы, што там людзі набіты, а то адзёжа лежала.

Довозыць нас — а то адзёжа, што абдзірае... Застаўляе нас роздзягатыся, ужэ будэ быты. І то ўжэ раздзягаемося... А на мэнэ, знаетэ, моя маты родная кажэ:

— Просыся, дэтыноньκо.

А мой, знаетэ, чоловік быў у плену ў Германіі. І кажу:

— Панэйку, нэ бійтэ мэнэ, мій чоловік у Германіі, у плену. У Германіі, кажу, а ў мэнэ, о дэ, і хлопчык...

А він одразу і кажэ:

— А пісьма ў тэбэ е?

Кажу:

— Ныма.

— А пашпорт у тэбэ е?

— Е.

А ў мэнэ ў кішэні буў якраз пашпорт, узяла... Ён на мэнэ, той што застаўляў тую судзеўку абдзіраці, кажэ:

— Ты стой, будзь задня.

Я і стою. Ужэ пошла моя сэстра замужня і дзеўчынка, і маты адыходзіць, шчэ дзеўчына была, чатырнаццаць год, зноў брацiха з двумя хлопчыкамі, одному — чатыры,

[32] Залізко *(дыял.)* — рыдлёўка.

другому — два... Воны пошлі од мэнэ, а я ўжо думаю: «Як я пойду на тую смэрць?..» Я астаюся сама. Стою я, знаетэ, сама. Стою і стою. Ужэ і пагнаў іх, параздзягаў іх. Я дыўлюся так во, як воны раздзягаюцца. І параздзягалыся і пошлы туды. Вот так туды, за могілкі. Бо то по той бок могілак раздзягаў, а по той біў людэй, то нэ було відно тых ровіў, там, дэ я стояла.

А после той німэць кажа на мэнэ:

— Іды, сядзь на дылях.

Бо то могілкі абгароджаны такія булы.

Я пошла сіла, узяла таго хлопчыка, ото напротыў таго груда, што судзеўка ляжыць. Дыўлюся: тыя падганяе, тыя роздзягаюцца, тыя адганяе туды — ужэ біты, тыя прывозьщь, то прыганяе, во!.. Я так о дыўлюся, як народ той разбіраецца...

І бэз шапкі, толькі ў одных сорочках, рукавы закасаныя. І займае тыя люды, і ўжэ жэнэ до рова стрыляты... Німцы ў одных сорочках крамных і бэз шапкі — гэць! З пісталетамі. Я сама бачыла. А горылку пылы, знаетэ, а горылку пылы! По чыкушцы бэрэ, з кармана выймае, чыкушку роскольıхае і глыткoм — одразу... Він, мусьщь, затым, коб смеласць тая была...

Я так, знаетэ, сыджу, сыджу... А пасля чатыры німцы, во такія чэрэвоватыя, мурдастыя, у пагонах, з казыркамі. Посталы надо мною і штось, знаетэ, пагергаталы, пагергаталы одын до другого і пошлы від мэнэ. Пошлы. Нычога не сказалы...

Майго мужа два браты пагыбла і бацько. І ў мэнэ, знаетэ, родыны забылы: два браты, бацько і маты, і ў одного брата двое дзітэй, і ў другога двое дзітэй, і сэстра замужня, дзіўчына... Вот ужэ я зараз пашчытаю, кількі душ... Вы знаетэ, і забулася, кількі душ... Два браты... Пятнаццаць з маго роду пагыбла, з чалавікавага тожэ пагыбла два браты і бацько, а маты і бабушка асталыся. І я во, і хлопчык...»

Гэтыя мірныя людзі, апынуўшыся перад стваламі аўтаматаў, шукалі выйсця. Сваіх родзічаў, якія трапілі ў нямецкі палон з польскага войска, яны выдавалі за людзей, якія нібыта знаходзяцца на рабоце ў Германіі. І часам гэты падман дзейнічаў. Раз'ятраныя павальным забойствам, карнікі часам сяго-таго адпускалі. Мабыць, каб паказаць і пераканацца, што і яны — «фюрэры», «богі».

Дарэчы, муж Яўхімы Парфёнаўны Баланцэвіч, даведаўшыся пра жахлі, вы лёс сям'і і вёскі, рызыкнуў уцячы з палону і, уцёкшы, супрацоўнічаў з партызанамі, а потым уступіў у рады Савецкай Арміі і загінуў ґераічнай смерцю ў барацьбе з гітлераўцамі.

Паслухаем працяг расказу **Марыі Ліхван,** якую мы пакінулі з дзецьмі на страшным солтысавым агародзе, сярод старых мужчын, жанчын і дзяцей, пад наглядам карнікаў. Яна расказвае:

«...Ах, то выходьщь одын, мусыць, то пэрагаворшчык. Кажэ:

— Мар'я Ліхван ёсць?

Моя сусідка кажэ: «Панэйку, я Мар'я Ліхван», тая кажэ: «Я Мар'я Ліхван». А я ўсё думаю: «Пусць. Як ходылы по хатах пысаты, він мэнэ вызывае — будэ быты...»

Выходжу я, і дві дзіўчынкі зо мною, а та, шчо з 1940-га году, то тую маты майго чалавіка ўзяла на рукі, і хлопчык зо мною; так і ідэмо мы. Ідэмо, а він так во ўзяў маю свэкруху за плэчы і бэрэ назад адпыхае. А я кажу:

— Пан, то матка моя і цурка моя!

— Ё, ё.

А тыя, што панабыгалы, то зараз німцы прыкладамы іх і назад адагналы.

Ну, выходымо, выходымо мы, думаю: «О, господы, чого ж мы?»

А то прышлы ўжэ з таго ліваго сэла, ну і майго чалавіка сэстра прышла, са сваім свікарам прышла. Майго чалавіка сэстры сын буў у німців, у Нэмэччыне, у плену буў.

Пытанне: — З польскага войска?

— Ага.

І воны сталы просыты, шчо такія і такія. Тыя спысалы на бумажку, і то нас во вызывалы, мы выйшлы. І я кажу:

— Ну, шчо ж, як я выйшла? Выйшла з дэціма, такія дзіты. Ну, шчо я сама?.. Коб чалавіка, — кажу... То хай мэнэ ўжэ б'юць.

А мого чалавіка сэстры свікар кажэ:

— Стойма; будэма просыты, каб твайго чалавіка вызвалы.

Падышлы мы до німціў. Кажэ:

— У якую очэрэдзь забралы?

— У перву.

— У-ут! Юж далёко на рабоце.

Ужэ він забыты буў. Мій чалавік. Вот.

І ўзялы нас, і завэлы. Там у мэнэ буў дваюродны брат, ёго тожэ тогдзі расстрэлялы... Завэлы до той хаты. Упустылы мэнэ. Чэтвэро тых дзітэй. Я плачу ў той хаці. А во свікар мой астаўся. Хто астаўся, таго больш нэ пустылы. Кажэ:

— Нэ плач, нэ плач, твой Ігнат астаўся, уцік він. Мы.бачылы, шчо ўцікаў він.

— Дэ ж він уцік, — кажу я, — колы я дойшла, шчо він ужэ нэ ўцік.

І вот там мы сыдзілы. І такія булы немцы, шчо і там булы. Прышлы до хаты, прышлы і пытаюцца:

— Чаго вона так плачэ?

І ўзяў мою дзіўчынку, шчо з саракавога, і прытуліў до сэбэ і даў канфету. І так плачэ, плачэ, плачэ...

А одын чалавік наш, баравіцкі, трохі знаў по-нэмэцьку гаварыты. Кажа:

— А вот жэншчына асталася, асталіся дзіты, як боб, одно другого нэ подоймэ, а чалавека забілі.

І так той німэць плача. Посыдыць, посыдыць і зноў на двір пойдэ. Як стануць ужэ там стрыляты, зноў до

хаты прыйдэ. Чы то нэ німець, можэ? Чы то я нэ знаю, шчо такое...

Пытанне: — А ён са зброяй быў?

— Не, у яго нэ було аружыя. Пытанне: — А форма нямецкая?

— Німэцька, німэцька.

І вот мы сыдзілы, доўго сыдзілы... Ужэ сонэчко так заходыць...

...Мы скотыну, каровы гналы ў Мокраны, то так во було, як сказаць, — шчэ кроў шла, шчэ нэ закопаны булы...»

Простая жанчына, нягледзячы на смяротны страх і асабістае гора, усё ж заўважыла тады і запомніла на ўсё жыццё адну праяву чалавечага спачування сярод азвярэлых забойцаў.

Пра таго расплаканага немца ўспамінае таксама **Яўхіма Баланцэвіч:**

«...Одын німець зайшоў до хаты і ламаў на собе рукы. Я бачыла сама. Так подывытся на той народ, так во пакалыхае галавою, адвэрнэцца і платочком вытыраўся. І ўсі бачылы — тыя, шо і побытэ потым людэ. Кажуць:

— Дывысь, як плачэ...

І ён не выстаяў, дэсь выйшаў у солтысавы сіні і ўпаў. Сам упаў. І тоды, як побачылы ёго, одразу одвэзлы. Німцы одвэзлы.

Пытанне: — На падводзе?

— Не, легковою ёго одвэзлы»...

Зманіў у справаздачы обер-лейтэнант Мюлер, — аказваецца, не па падазрэнню на жаўтуху быў адпраўлены ў Брэст адзін яго падначалены. Зрэшты, і схлусіў Мюлер без асаблівай рызыкі. Найвышэйшы яго начальнік Гімлер настойваў, каб называць праявы чалавечнасці — слабасцямі, значыць, нядужасцю. Выступаючы на нарадзе обер-групэнфюрэраў СС з акупаваных усходніх зямель у Познані 4 кастрычніка 1943 года, Гімлер хваліўся сам і хваліў сваіх падручных за тое, што яны пазбавіліся сумлення, як чалавечай слабасці. Гімлер гаварыў менавіта пра такіх голінгаў, мюлераў, каспераў, пельсаў: «Большасць з нас павінна ведаць, як выглядаюць 100 трупаў, якія ляжаць у рад, або 500, або 1000. Вытрымліваць усё гэта да канца і ў той жа час — за выключэннем паасобных фактаў праяўлення чалавечай слабасці — заставацца прыстойнымі людзьмі — вось што гартавала нас».

Рэспубліка «самых бяскрыўдных славян», як спачатку лічылі «планіроўшчыкі» народных лёсаў у фашысцкім Берліне, паказала сябе краінай усенароднага партызанскага руху. Амаль паўмільённая ўзброеная армія народных мсціўцаў Беларусі разам з партызанамі другіх рэспублік стварыла сапраўдны «другі фронт» у тыле нямецкай арміі. Каб справіцца з гэтым гневам народным, з полымем усенароднай вайны, у фашыстаў сілы ўжо не было, і чым далей, тым меней яе застава-лася, той сілы. Затое злосці, лютасці сапраўды набіралася больш. Злосці на ўсіх, хто аказаўся

мацнейшым, чым гэта «планавалася» ў фашысцкім рэйху, хто не хацеў ні «перасяляцца», ні «высяляцца», ні станавіцца пакорлівым рабом акупанта. Злосць іхняя таксама забівала — самых мірных, безабаронных. Працягвалася знішчэнне насельніцтва ў вёсках і гарадах,ператварэнне ў зоны пустыні цэлых раёнаў — асабліва на Віцебшчыне, на поўначы Мінскай вобласці... Фашысцкія тэарэтыкі «абязлюджвання» ператварыліся ў слуг таго «плана», які самі ж прыдумалі. Але і вар'яцтва палітычнае ўзнікае не само сабой, а на пэўнай глебе.

Яшчэ ў дваццатыя гады пачаў падбіраць і дрэсіраваць сабе кадры палітычных авантурыстаў, пагромшчыкаў, гвалтаўнікоў аблудны агітатар з баварскіх піўных, яфрэйтар першай сусветнай вайны Адольф Гітлер. Ён вынюхаў у нямецкім мяшчанстве помслівы дух рэваншызму, а ў вайсковай касце пыхлівую ваяўнічасць. У асяроддзі прамыслоўцаў і фінансістаў, напалоханых прывідам «чырвонай рэвалюцыі», ён убачыў эканамічную сілу, якая гатова яго падтрымаць і будзе фінансаваць падрыхтоўку да агрэсіі. З'яднаць у адзін кулак нацысцкай дыктатуры ўсе гэтыя сілы і рынуцца на заваёву «жыццёвых прастораў» на ўсходзе — так нахабна і груба вылажыў палітычны авантурыст сваю праграму і «абгрунтаваў» яе звярынымі прынцыпамі барацьбы за існаванне і натуральнага адбору: «У барацьбе бачу прызначэнне кожнай істоты». «Сіла — гэта найпершае права». «Капіталісты выйшлі наперад, дзякуючы сваім здольнасцям і па прынцыпу адбору, што яшчэ раз даводзіць вышэйшасць іх расы; яны маюць права кіраваць іншымі».

Гітлер строіў свае планы не на адным баламутным крыкунстве. Разбойныя дактрыны падмацоўваліся ў яго палітычным тэрорам, ён сколаціў ваенізаваныя атрады нацысцкай партыі СА і СС, даў ім заданне авалодаць вуліцай, а цераз вуліцы і плошчы вёў шлях да ўлады.

Выбраных у партыйны апарат Гітлер узвышаў да нябёс, ставіў над людзьмі, называў «рыцарскім ордэнам правадыроў». Прэтэндэнту на правадырства дастаткова было вызваліцца ад чалавечага сумлення, прызнаць грубую сілу законам жыцця, навучыцца слепа падпарадкоўвацца загадам дужэйшага, не сумнявацца, не крытыкаваць, каб быць залічаным у касту правадыроў і трапіць на пасаду мікрафюрэра ў які-небудзь з раёнаў акупаваных зямель.

Спачатку, калі Гітлер толькі пачынаў палітычную авантуру, дык вышэй за ўсё цаніў у сваіх «партайгэносаў» разбойную ініцыятыву, задзірыстасць, раіў мець сваім дэвізам выраз: «Калі ты не немец, я раскрашу табе галаву». А ўжо ў 30-я гады, калі ён падышоў да рашаючага кроку — захопу ўлады, —

то ўзяў сваіх спадручных на ланцуг, патрабаваў сляпога паслушэнства. «Кожны член партыі павінен рабіць тое, што яму загадвае фюрэр. Фюрэр — увасабленне ідэі, і толькі ён ведае яе канчатковую мэту».

І тут ужо «сістэма», «арганізацыя», якую багацеі паклікалі да жыцця, фінансавалі, якой дапамагалі ўмацавацца, набыла пэўную самастойнасць, ператвараючы і гаспадароў у сваіх слуг, у шурупчыкі жудаснай, таталітарнай машыны: пасля камуністаў, сацыял-дэмакратаў, прадстаўнікоў навуковай і творчай інтэлігенцыі, знішчаных ці загнаных за ка-лючы дрот, фашысцкая машына з такой жа бязлітасцю пачала трушчыць косці кожнаму, хто хацеў бы зберагчы сваю асабістую незалежнасць, самастойнасць.

Напорыста і планамерна стварылі нацысты культ сілы. Улада для іх была ідэалам, нейкаю асобаю формаю ўласнасці, асабліваю каштоўнасцю.

Далучэнне да ўлады, размеркаванне ўлады і спажыванне яе рэгулявалася спецыяльнымі рытуаламі.

Рытуал панавання — гэта масавыя відовішчы, мітынгі, пагромы, оргіі, у часе якіх Гітлер і яго зграя публічна абжываліся ўладай, заражаючы ўладаманіяй абывацеляў, ператвараючы дробных мяшчан у агрэсіўных авантурыстаў. У меру таго як попыт на панаванне хваравіта разрастаўся, фашысцкая зграя кінула кліч да міжнароднага разбою — аншлюс Аўстрыі, акупацыя Чэхаславакіі, Польшчы, Даніі, Нарвегіі, Бельгіі, Галандыі, Францыі і г. д. Усё гэта новыя залежы ўлады, новыя сеансы ўладарніцтва. Пры гэтым яны рыхтавалі нямецкага буржуа і абывацеля да галоўнага акта — агрэсіі супраць СССР.

Нядаўнія шаўцы, каўбаснікі, піўвары, крамнікі, канцылярысты — стандартная буржуазная драбната, гарадскія і вясковыя люмпены, прайшоўшы апрацоўку нацызмам, слеплі і глухлі ад бляску і бразгату атрыбутаў безгранічнай улады, якімі надзялялі іх паплечнікі фюрэра, пасылаючы наводзіць новы парадак на акупаваных савецкіх землях. У гэтых мікрафюрэраў вочы зацягваліся папяровымі бельмамі, на якіх былі толькі словы загадаў і дырэктыў. У гэтых марыянетак выраслі папяровыя вушы, цераз якія не пранікалі іншыя словы, акрамя загадаў фюрэра. Фюрэр назваў гэты, перавернуты дагары дном, свет пачаткам новага свету, новым парадкам у Еўропе. Апрацаваны атрутай нацызму абывацель на пасадзе мікрафюрэра слепа верыў у гэта і працягваў разбурэнне цывілізацыйных асноў, сеяў гвалт, жорсткасць, жах і смерць.

І хоць гітлераўская ваенная машына пасля Сталінграда і асабліва пасля Курска ўжо безнадзейна кацілася да межаў Германіі, «план» вісеў над мазгаўнёй не толькі гэтых дробных, але і самых буйных «фюрэраў». Наколькі

яны былі нават «здзіўлены», што ўсё ідзе не па іх планах, паказваюць сведчанні, прызнанні гітлераўскіх генералаў-«мемуарыстаў» (Гудэрыяна, Тыпэльскірха і інш.).

Вось што напісана ў мемуарах аднаго з лідэраў сакрэтнай службы Гітлера — у кнізе Вальтэра Шэленберга «Гаворыць шэф нацысцкай контрразведкі», выдадзенай у Парыжы ў 1957 годзе:

«Калі атрыманая інфармацыя не адпавядала іх уласным канцэпцыям, яны проста адкідвалі яе. Што ж датычыцца вышэйшага кіраўніцтва, дык тут справа выглядала яшчэ горш. Так, напрыклад, да канца 1944 года Гітлер ігнараваў любыя неспрыяльныя звесткі, нават калі яны заснаваны былі на фактах ці проста здаровым сэнсе».

Гітлер, напрыклад, амаль да самага канца ніяк не верыў, што ёсць, існуе магутная Савецкая Армія, якая гоніць немцаў на захад. Ён жа яе знішчыў яшчэ летам 1941 года і нават аб'явіў пра гэта на цэлы свет. А раз аб'явіў — так яно і ёсць. У сваё слова такія дыктатары вераць як у справу канчатковую і незваротную. Не, ва ўсім генералы вінаватыя, іх бяздарнасць і здрада, бо не могуць жа «гэтыя рускія» гнаць «яго» армію, тым больш што Савецкай Арміі фактычна ўжо няма!

«Логіка» маньяка была дзяржаўным мысленнем фашысцкай імперыі, і не дзіўна, што і паплечнікі Гітлера разважалі і дзейнічалі ў тым жа кірунку. Калі справа, напрыклад, датычылася партызан ды і наогул усёй сітуацыі на акупаваных землях.

Улетку 1943 года Гімлер разаслаў начальніку карных груп, вышэйшым начальнікам СС і паліцыі Украіны, а таксама «сярэдзіннай Расіі» загад Гітлера пра тое, што «вобласці паўночнай Украіны і сярэдзіннай Расіі павінны быць ачышчаны ад усякага насельніцтва». Тут мелася на ўвазе і беларускае Палессе, якое немцы ўключылі ў «рэйхскамісарыят Украіны».

«Сярэдзіннай Расіі» ў немцаў ужо не было, а Палессе яшчэ трэба было нанова адваяваць — ад партызан, каб прыступіць да выканання гэтага чарговага людаедскага загаду. Але загад напісан, і фюрэры чакаюць, што нейкія сілы выканаюць яго дакладна. Былі ж сілы для гэтага...

Праз нейкіх 10 дзён Гімлер гнеўна паўтарае свой загад — бо штосьці сапсавалася ў «машыне», недакладна працуюць яе звенні і «шурупчыкі-людзі». І зноў былы аграном Гімлер выкладвае свае (і свайго фюрэра) ідэі пра барацьбу з партызанамі з дапамогай кок-сагызу. Але найперш — планы помсты насельніцтву, якое ўсё яшчэ жыве і збіраецца перажыць і «планы» гітлёраўскага Берліна, і саміх аўтараў усіх тых людаедскіх загадаў і намераў.

Рэйхсфюрэр СС Аператыўнае ўпраўленне №39(168)43 *20 ліпеня 1943*

САКРЭТНА

1. Начальніку паліцыі бяспекі і СД.

2. Начальніку карных груп па барацьбе з бандамі.

3. Вышэйшаму начальніку СС і паліцыі сярэдзівнай Расіі.

4. Вышэйшаму начальніку СС і паліцыі паўднёвай Расіі.

5. Начальніку галоўнага гаспадарчага і ўпраўленчага аддзела СС.

Пэўны час таму назад я выдаў загад аб тым, што на ўсходзе павінны быць усталяваны лагеры, у якіх мы будзем гадаваць дзяцей эвакуіраванага бандыцкага насельніцтва, рабіць з іх прыдатных да працы людзей, якія пазвей будуць уяўляць сабой добрую рабочую сілу для нямецкага народа. Як мне здаецца, вырашэнне гэтага пытання не надта пасоўваецца наперад. Разам з тым я атрымліваю ад начальніка паліцыі бяспекі і СД ад 10.7.1943 г. прапанову аб ізаляваным утрыманні жонак бандытаў разам з іх дзецьмі ў спецыяльным лагеры Траўнікі. Гэтая прапанова, на маю думку, не з'яўляецца рашэннем праблемы.

Я прашу адпаведных начальнікаў галоўных упраўленняў і обергрупэнфюрэраў СС разам абмеркаваць і правесці ў жыццё наступнае выдадзенае мною распараджэнне.

Фюрэр загадаў, каб *бандыцкія тэрыторыі* паўночнай Украіны і сярэдзіннай Расіі былі канчаткова і без астатку ачышчаны *ад насельніцтва.* Гэта павінна быць зроблена на працягу наступных чатырох месяцаў. У будучым гэтыя тэрыторыі трывала застаюцца недаступнымі для засялення бандытамі, таму што там яны не будуць мець нічога для пражытку — ні сховішча, ні харчовых прадуктаў. З другога боку, я думаю, што мы не павінны пакідаць гэтыя тэрыторыі неасвоенымі — у сэнсе атрымання пушніны і выкарыстання зямлі. Уяўляю сабе перш за ўсё дзве магчымасці.

1. З сіламі, дастатковымі для падтрымання бяспекі, мы займаем на некалькі тыдняў тую ці іншую тэрыторыю. Разам з намі прыбывае персанал лясного ўпраўлення, а з ім — рабочыя-дрэвараспрацоўшчыкі. На працягу гэтых тыдняў праводзіцца вырубка ў ахоўваемых лясах, і, што, можа, самае лепшае, драўніна вывозіцца на нізкарослых рускіх конях: або на чыгунку, або, калі яшчэ стаіць лета, да водных шляхоў, па якіх яна будзе сплаўляцца.

2. На землях, якія акажуцца прыгоднымі, мы пачнём вырошчванне кок-сагызу або іншых раслін, якія нам могуць спатрэбіцца, але якія не ўжываюцца людзьмі ў ежу. Я маю на ўвазе, напрыклад, каноплі (не лён) ці алейныя культуры або развядзенне вярбы (для снарадных кашоў). Магчыма, знойдуцца і некаторыя іншыя такога роду расліны. Але перш за ўсё я думаю пра вырошчванне, пры наяўнасці добрай зямлі, кок-сагызу. У

гэтым сэнсе тут можна было б ужыць спосаб дзеяння, як пры выкарыстанні лясоў для атрымання драўніны.

Пры вырошчванні гэтых культур я не баюся разбурэнняў ад рук бандытаў, бо нават вялікая колькасць людзей, якія тым не меней апынуліся б на пазбаўленай спажыўных прадуктаў тэрыторыі, маглі б знішчыць пасеўныя плошчы толькі вытраўліваннем раслін, пераворваннем або вытоптваннем. А гэта наогул вельмі складаная справа, і яна магла б быць лёгка выяўлена і спынена кантрольнымі аблётамі.

У тыя дні, калі для апрацоўкі глебы або збору ўраджаю патрабуецца шмат рабочай сілы, тэрыторыя займаецца намі і туды ўвозяцца жанчыны і дзеці для выканання сельскагаспадарчых работ.

Таму я лічу мэтазгодным, каб жонкі бандытаў і ўсе сабраныя дзеці былі расселены ў вёсках на ўскраінах бандыцкіх тэрыторый і заняты там карыснай працай: напрыклад, пляценнем кашоў і таму падобным. Яны павінны, аднак, атрымліваць рацыён прадуктаў харчавання, дастатковы толькі на некалькі дзён, і ім не павінны выдзяляцца ніякія сельскагаспадарчыя ўгоддзі ў памерах большых, чым гэта патрэбна для пракорму саміх сябе і дзяцей. У час збору ўраджаю павінна быць удзелена ўвага таму, каб усё сабранае складвалася намі ў бяспечных месцах, каб банды ніякім чынам не маглі харчавацца за кошт раскрадання прадуктаў ці іх разгублення. З другога боку, дастатковае дзённае харчаванне рабочых шляхам выдачы ім дзённага рацыёну павінна праводзіцца выключна па рускай акорднай і стаханаўскай сістэме.

Я спадзяюся, што групэнфюрэр СС Глобачнік правядзе гэтую работу як самую першачарговую ў сярэдзіннай Расіі. Оберштурмбанфюрэр СС *Г. Гімлер*.

Тое, што раней і зусім нядаўна выглядала злавесна, усё больш ператвараецца ў мітусню раз'юшаных і перапалоханых пацукоў, якіх вось-вось спасцігне расплата. Усё менш у фашысцкіх кіраўнікоў магчымасці помсціць насельніцтву акупаваных зямель. Тым больш — думаць пра «канчатковае ўрэгуляванне».

І тым не менш яны працягваюць выконваць той свой першапачатковы план «Ост». Рушацца ваенныя стратэгічныя і тактычныя планы, надзеі на перамогуі на хуткае сусветнае панаванне, на тысячагадовы «трэці рэйх», а яны вунь як стараюцца забіць... ну, хоць яшчэ адно дзіця — рускае, беларускае, украінскае, польскае...

Што тут — аўтаматызм нейкага бяздумнага жудаснага механізму? Не, не толькі. У нейкіх штабах і ў нечых мазгах усё гэтамела цалкам «рацыянальны» сэнс, служыла плану яшчэ больш глабальнаму.

Пангерманізм, — а гітлерызм, нацызм можна разглядзваць як

асабліва злавесны этап у развіцці і дамаганнях даўняга пангерманізму, — заўсёды кіраваўся наступным: нават прайграючы вайну, зрабіць як мага большую шкоду сумежным краінам, народам. Асабліва — іх «біялагічнаму патэнцыялу», каб «наступным разам» іх было менш, а немцаў больш...

Адзін з пангерманістаў, Клаус Вагнер, яшчэ ў 1906 годзе ў сваёй кнізе «Вайна» прапаведаваў:

«Давайце смела арганізуем масавае прымусовае перасяленне еўрапейскіх народаў. Нашчадкі будуць нам удзячныя. Неабходна будзе ўжыць меры прымусу. Гэтыя народы трэба загнаць у рэзервацыі, дзе мы будзем трымаць іх ізаляванымі, каб мы маглі атрымаць прастору, неабходную для нашай экспазіцыі».

Голас, інтанацыі, фразеалогія — цалкам розенбергаўскія... Або вось яшчэ — з выступлення другога пангерманіста, Генрыха Класа, які прарочыў у 1913 годзе:

«Мы павінны закрыць нашы сэрцы для літасці...

...Малыя краіны, накшталт Галандыі і Бельгіі, страцілі сваё права на існаванне...

Мы павінны праводзіць агрэсіўную палітыку. Францыя павінна быць знішчана раз і назаўсёды. Няхай вайна будзе для нас свяшчэннай. Мы павінны вітаць яе як лекара нашай душы... Мы чакаем фюрэра!, Цярплівасць, цярплівасць, ён з'явіцца».

А ў 1943 годзе — ужо ад імя таго цярпліва чаканага фюрэра — фельдмаршал Рундштэд вучыў слухачоў Берлінскай ваеннай акадэміі:

«Знішчэнне суседніх народаў і іхніх багацтяў зусім неабходна для нашай перамогі. Адна з сур'ёзных памылак 1918 года заключалася ў тым, што мы не знішчалі грамадзянскае насельніцтва варожых краін, бо неабходна, каб немцы заўсёды, прынамсі ўдвая, пераўзыходзілі па колькасці народы сумежных краін. Таму мы абавязаны знішчыць, прынамсі, трэцюю частку іх жыхароў...» Нават фактычна прайграўшы вайну, яны яшчэ ўсё забівалі — жанчын, дзяцей... Яшчэ хоць адно рускае, беларускае, украінскае, польскае дзіця... І аўтаматызм у гэтым — кашмарны аўтаматызм фашысцкай машыны знішчэння. У кожным паасобным выпадку. А ў цэлым — зноў план, зноў разлік. На далёкую будучыню.

І калі ўлада іх жорсткасці, вар'яцтва звузілася да ўласна нямецкай тэрыторыі, той самы «план» іхні павярнуўся ўжо супраць нямецкага насельніцтва. Не забіваць, не вешаць, не тапіць і не паліць яны не могуць — гэта іх форма існавання. І не толькі думка пра тое, каб выратавацца ці каб працягнуць яшчэ месяц, тыдзень, гадзіну, а вось гэтая іх прырода забойцаў праяўлялася ў тым, што і Германію яны гатовы былі, хацелі і стараліся ператварыць у «зону

пустыні». Іншых зямель для такой «працы» ў іх ужо не засталося.

«Фюрэр нямецкага народа», здыхаючы, вось так падзякаваў Германіі:

«Калі мы прайграем вайну, няхай загіне і народ. Такі лёс непазбежны. Няма чаго задумвацца над асновамі найпрымітыўнейшага існавання. Наадварот, лепш самім знішчыць гэтыя асновы, да таго ж уласнымі рукамі. Народ аказаўся слабым, а будучыня належыць больш моцнаму ўсходняму народу. Апроч таго, тыя, што застануцца, уяўляюць нязначную вартасць, бо вартасныя пагінулі».

І загадаў — апошні раз шалёны ўкусіў — затапіць водамі Шпрэе тысячы нямецкіх жанчын, дзяцей, што ратаваліся ў берлінскім метро.

І гэта быў для фашызму зусім лагічны канец, вынік. «Фюрэры» кляліся інтарэсамі нямецкага насельніцтва і ўсё, што рабілі, усе зверствы свае клалі на «алтар» усё тых жа «інтарэсаў немца». Бо яго рукамі ўсё і рабілі. Але не выцягнуў ён іх крывавую калясніцу з той прорвы, у якой яны апынуліся. Не атрымалася сусветнага панавання «новай касты». Тады — прыстрэліць і яго, немца, забіць і нямецкі народ — як загнанага каня страляюць. Непатрэбен. Адпомсціць і яму за тое, што яны, «фюрэры», здохнуць, а нямецкі народ застанецца жыць. Гебельс помсліва верашчаў перад сваім канцом:

«Нямецкі народ заслужыў долю, якая цяпер яго чакае... Але не аддавайцеся ілюзіям: я нікога не прымушаў быць маім супрацоўнікам, гэтаксама як мы не прымушалі нямецкі народ... Цяпер вам перарэжуць глоткі. Але калі нам суджана адысці, то хай жа ўвесь свет скаланецца».

Вось што такое Хатынь, што такое беларускія Хатыні! Як і Лідзіцэ, Арадур, яны — сімвал нацысцкіх зверстваў. Але і нешта большае. Гэта ўжо — сапраўдны выскал фашызму, які ад многіх краін Еўропы да часу быў схаваны.

Беларускія Хатыні — гэта нешта настолькі злавеснае, што людзям планеты нялёгка да канца ўсвядоміць і да канца адчуць нават пасля Асвенцімаў і Бухенвальдаў. Беларускія Хатыні — гэта тая рэальнасць, практыка, якую фашызм рыхтаваў цэлым краінам і кантынентам, але шырока распачаць паспеў толькі тут.

Велізарнымі ахвярамі савецкі народ заплаціў за тое, каб іншыя народы не зазналі тысяч сваіх Хатыняў.

Гэта павінны разумець тыя, хто прыходзіць сюды — у Хатынь. Пра гэта нема крычыць рэзкая, цёмная фігура старога з такім каменным і такім мяккім целам мёртвага хлопчыка, пра гэта крычаць назвы былых вёсак на страшным «могільніку вёсак» — адзіным на ўсёй Зямлі.

## ЗМЕСТ

БАРБАРКА
МАЦІ І СЫН. СЫН І МАЦІ
ГАРЫЦЬ РАЁН
Я ТАКСАМА З ВОГНЕННАЙ
ТРЫЦЦАТЫ
БЕЗ ДЗЯЦЕЙ
МУЖЧЫНЫ
ЗВЫШ ДЗЕСЯЦІ
ДЗВЕ СТАРАСЦІ
КНЯЖАВОДЦЫ
ЗБЫШЫН
ВЯЛІКАЯ ГАРОЖА
ДЗІЦЯ БЯЖЫЦЬ РАЗОРАЮ
СЦІШНАВАТАЯ РАДАСЦЬ
ПАЦАЛАВАЦЬ АПОШНІ РАЗ...
АКЦЫЯ, АПЕРАЦЫЯ, ЭКСПЕДЫЦЫЯ...
ЗВЕР ПАЛЮЕ НА ЧАЛАВЕКА
ЧЫНГІСХАН З ТЭЛЕГРАФАМІ
«СЕЛЕКЦЫЯ»
НЕСХАДЗІМАЕ ГОРА
НОВЫЯ ДЗЕЦІ
НЕ МАГУ... НЕ ЎМЕЮ...
КАПАЦЭВІЧЫ
РАЗЛІЦЦЁ
ПАМЯЦЬ
ХАТЫНЬ І ХАТЫНІ

**Адамовіч А., Брыль Я., Калеснік Ул.**

Я з вогненнай вёскі... – Мн., Маст. літ., 1975 – 448 с., з іл. і 2 гібкімі пласцінкамі.

Гэта кніга-дакумент, у якой сабраны запісаныыя аўтарамі сведчанні ўцалелых жыхароў з сотняў беларускіх вёсак, спаленых фашыстамі разам з людзьмі.

© OCR: Камунікат.org, 2010 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год